ПАМЯТЬ







ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНЫЯ ХРОНІКІ ГАРАДОЎ І РАЁНАЎ БЕЛАРУСІ

ШМАТТОМНАЕ ВЫДАННЕ СТВАРАЕЦЦА ПАВОДЛЕ РАШЭННЯ ЎРАДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

ГОРАЦКІ РАЁН

МІНСК
«ВЫШЭЙШАЯ ШКОЛА»
1996

ББК 63.3(4 Беи)
П 15
УДК 947.67

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ:

А. А. КРЫВЯНКОЎ, У. М. ЛІЎШЫЦ, Р. І. МАСЛОЎСКІ, А. Л. ПЕТРАШКЕВІЧ, М. П. ХОБАТАЎ

РАЁННАЯ КАМІСІЯ ПА СТВАРЭННІ
ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНАЙ ХРОНІКІ:

А. А. КРЫВЯНКОЎ (старшыня камісіі), В. Т. ГУЛЕВІЧ, І. М. ЖУК, У. М. ЛІЎШЫЦ, Р. Я. МАКЕЕЎ, В. У. НЯМЫКІН, П. І. ПАНАСЮГА, В. Я. РЭНДАЎ, І. М. СТАЛЬМАШОНАК.

АРГАНІЗАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНЫ ЦЭНТР
ПА ВЫДАННІ ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНЫХ ХРОНІК ПАМЯЦІ
ДЗЯРЖАЎНАГА КАМІТЭТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПА ДРУКУ:

А. Л. ПЕТРАШКЕВІЧ (кіраўнік цэнтра), У. І. ЛЕМЯШОНАК (галоўны рэдактар), А. П. ЯРОХІН (галоўны метадыст), М. З. БАШЛАКОЎ (вядучы рэдактар)

Рэдактары:

Г. П. БЕРЛІНА, С. А. КАГАДЗЕЕВА, Р. І. МАСЛОЎСКІ (вядучы)

Мастак Э. Э. ЖАКЕВІЧ

Распрацоўка мастацка-тэхнічнага афармлення серыі В. А. РАГАЛЕВІЧА

Рэцэнзент доктар гістарычных навук У. І. ЛЕМЯШОНАК

9470670000—041
П ——————— 62—96
М 304(03)—96

ISBN 985-06-0180-9

© Выдавецтва «Вышэйшая школа», 1996

Гарадзішча, помнік археалогіі.

10 -12 тыс. гадоў назад на тэрыторыі сучаснага раёна з'явіліся першыя пасяленні людзей.

XII ст. Першыя пісьмовыя звесткі, якія датычацца тэрыторыі раёна.

1497 г. У «Літоўскай метрыцы» ўпершыню згадваюцца Горы.

1544 г. У «Літоўскай метрыцы» ўпершыню згадваюцца Горкі.

Царква Ушэсця.

1619 г. Л. Сапега даў жыхарам Гор і Горак прывілей на самакіраванне.

1676 г. У Горках было заснавана праваслаўнае брацтва. Пры ім існавала школа.

1708 г. Падчас Паўночнай вайны Пётр I знаходзіўся ў Горках.

1717 г. Горы-Горацкае графства набыў паплечнік Пятра I А. Меншыкаў.

У гісторыка-этнаграфічным музеі.

1772 г. Горацкая зямля ўвайшла ў склад Расійскай імперыі.

1812 г., 14 ліпеня. Французскія войскі захапілі Горкі.

1812 г., 8 лістапада. Стаўка Галоўнага камандавання размясцілася ў мяст. Раманава. Пачалося вызваленне Горацкай зямлі ад французскіх захопнікаў.

1840 г. Пачала працаваць Горы-Горацкая земляробчая школа.

Вучэбны корпус Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі. На пярэднім плане помнік Дз. М. Пранішнікаву.

1848 г. Пачаў працаваць Горы-Горацкі земляробчы інстытут.

1861 г., 26 снежня. Царскі ўрад прыняў рашэнне мяст. Горкі перавесці ў стан павятовага горада і ўтварыць Горацкі павет.

1862 г. У Горках сфарміравалася падпольная студэнцкая арганізацыя.

1863 г., 24 красавіка. Паўстанцы на чале з Л. Звяждоўскім захапілі Горкі.

Помнік І. І. Якубоўскаму.

1864 г., 24 чэрвеня. Царскі ўрад прыняў рашэнне аб пераводзе Горы-Горацкага земляробчага інстытута ў Санкт-Пецярбург.

1867 г., жнівень. Урадам зацверджана палажэнне аб гербе горада Горкі.

1902 г., студзень. У Горках была арганізавана сацыял-дэмакратычная група.

1903—04 гг. У Горках узніклі першыя гурткі сацыялістаў-рэвалюцыянераў.

Музей савецка-польскай садружнасці.

1904—05 гг. У Горках узнікла арганізацыя Бунда.

1917 г., снежань. У Горках і павеце перамагла Савецкая ўлада.

1919 г., 7 красавіка. Горацкія сярэднія сельскагаспадарчыя ўстановы рэарганізаваны ў Горацкі сельскагаспадарчы інстытут.

1919 г., 10 кастрычніка. Пачала працаваць Беларуская секцыя студэнтаў Горацкага сельскагаспадарчага інстытута.

Брацкая магіла падпольшчыкаў і ахвяр фашызму.

1921 г. Пачаў працаваць чыгуначны ўчастак дарогі Орша—Крычаў, які прайшоў праз Горкі.

1924 г. Пабудаваны будынак чыгуначнай станцыі «Беларускія Горкі», з 1930 г. — «Пагодзіна».

1924 г., 17 ліпеня. Утворана Аршанская акруга. Горацкі павет увайшоў у яе склад.

1925 г. У Горках створаны літаратурны гурток, які ўваходзіў у аршанскую філію «Маладняка».

Помнік выкладчыкам, студэнтам, рабочым і служачым Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі.

1925 г., 5 жніўня. Аб'яднаны Беларускі інстытут сельскай гаспадаркі (г. Мінск) і Горацкі сельскагаспадарчы інстытут. Утворана Беларуская акадэмія сельскай гаспадаркі імя Кастрычніцкай рэвалюцыі.

1926 г., 1 мая. Пры БСГА адкрыты першы ў СССР нядзельны двухгадовы універсітэт для сялян. У 1930 г. рэарганізаваны ў калгасны універсітэт.

1930 г., 22 кастрычніка. Выйшаў першы нумар раённай газеты «Ленінскі шлях».

1941 г., 12 ліпеня. Горкі акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Горкі, праспект Інтэрнацыянальны.

1943 г., жнівень. Створаны Горацкі падпольны камітэт КП(б)Б.

1944 г., 26 чэрвеня. Горкі вызвалены воінамі 70-й стралковай дывізіі пад камандаваннем М. М. Калеснікава.

1949 г., 13 лістапада. У гарадскім скверы адбыўся мітынг, прысвечаны адкрыццю бюста двойчы Героя Савецкага Саюза І. І. Якубоўскага.

1953 г., 1 верасня. Пачала працаваць музычная школа з двума аддзяленнямі: фартэп'янным і народных інструментаў.

У Горацкай конна-спартыўнай школе.

1957 г., кастрычнік. Адкрыты раённы Дом піянераў і школьнікаў.

1958 г., студзень. Пабудавана высакавольтная лінія электраперадач ад Оршы да Горак.

1959 г., 5 жніўня. Адкрыта паветраная авіяцыйная лінія зносін паміж Горкамі і Мінскам.

1967 г., май. Закладзены новы парк імя 50-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Народны студэнцкі ансамбль «Радасць».

1974 г., красавік. Здадзены ў эксплуатацыю будынак аўтавакзала.

1975 г. Адбылося ўрачыстае адкрыццё мемарыяла «Смуткуючая маці». Запалены агонь Славы.

1982 г., 29 кастрычніка. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Горкі аднесены да катэгорыі гарадоў абласнога падпарадкавання.

1984 г., 14 снежня. Заснаваны раённы гісторыка-этнаграфічны музей.

Верхняе возера.

1987 г. Пачаў працаваць гарадскі стадыён.

1990 г., 25 верасня. Адкрыты раённы Дом рамёстваў.

1993 г. Створана раённае краязнаўчае таварыства.

1994 г., 8 кастрычніка. У Горках пачала дзейнічаць царква «Милосердие».

ДА ЧЫТАЧА

Гэтай кнігай працягваецца серыя гісторыка-дакументальных Хронік Памяці, якая выдаецца ў Рэспубліцы Беларусь па рашэнні ўрада. Іх паяўленне выклікана патрабаваннем часу. Складаны працэс адраджэння і развіцця беларускай нацыі, яе культуры, пабудова незалежнай дэмакратычнай дзяржавы шчыльна звязаны з беражлівымі адносінамі да гістарычнай спадчыны.

Кніга створана на аснове навуковых даследаванняў, разнастайных дакументаў з дзяржаўных архіваў, шматлікіх публікацый у газетах, кнігах, успамінаў удзельнікаў і сведак падзей, якія адбываліся ў жыцці Горацкага раёна.

Апрача матэрыялаў па гісторыі раёна, асаблівая ўвага ў кнізе нададзена ўвекавечанню памяці загінуўшых у Вялікую Айчынную вайну, адлюстраванню неўміручага подзвігу абаронцаў Радзімы. Безумоўна, стваральнікі хронікі не могуць гарантаваць поўную вычарпальнасць прыведзеных матэрыялаў. На жаль, засталіся яшчэ невядомыя салдаты, што спачылі на зямлі Беларусі, імёны далёка не ўсіх рэпрэсіраваных у гады сталіншчыны ўстаноўлены. Але пошукавая работа не спыняецца з выхадам кнігі, з'яўляюцца новыя звесткі, даследаванні, а значыць, і новыя імёны.

У пошуку, зборы і падрыхтоўцы матэрыялаў да хронікі прымалі ўдзел мясцовыя краязнаўцы, работнікі архіваў, музеяў, супрацоўнікі дзяржаўных органаў і ўстаноў, ваенкаматаў, навукоўцы, рэдактары выдавецтва.

Раённая камісія па падрыхтоўцы кнігі «Памяць» і выдавецтва «Вышэйшая школа» вельмі ўдзячныя ўстановам, арганізацыям і прыватным асобам, якія дапамаглі ў зборы, падрыхтоўцы, удакладненні матэрыялаў і выданні гісторыка-дакументальнай Хронікі «Памяць. Горацкі раён».

2 Зак. 2613



Горацкі раён размешчаны на паўночным усходзе Магілёўскай вобласці. Утвораны 17.7.1924 г. Плошча 1,3 тыс. км^2. Населеных пунктаў 177, у тым ліку горад Горкі — цэнтр раёна. 12 сельсаветаў: Аўсянкаўскі, Будскі, Горскі, Горацкі, Добраўскі, Копцеўскі, Ленінскі, Маслакоўскі, Паршынскі, Рудкаўшчынскі, Ракцянскі, Саўскі. 2/3 тэрыторыі раёна занята Аршанска-Магілёўскай раўнінай. На паўночным усходзе адгор'і Смаленскага ўзвышша. 75 % тэрыторыі размешчана на вышыні 190—200 м над узроўнем мора, 20 % — ніжэй за 190 м.

Сярэдняя тэмпература студзеня —8,2 °С, ліпеня + 17,8 °С. Ападкаў 640 мм за год. Вегетацыйны перыяд 183 суткі. Цэнтральную частку раёна перасякае р. Проня з прытокамі Парасіца, Быстрая, Вербаўка, Галыша. На захадзе цячэ рака Бася з прытокамі Пална, Галубіца; на ўсходзе прытокі ракі Быстрай — Рамасцвянка, Лебедзеўка, Дняпрэц. На паўночным усходзе пачынаецца р. Мярэя. Карысныя выкапні: торф, пясок, гліна. Пад лесам 1,8 %, сельскагаспадарчымі ўгоддзямі — 82,4 % тэрыторыі раёна. У раёне 11 калгасаў і сельскагаспадарчых аб'яднанняў, 7 саўгасаў і аграгандлёвых прадпрыемстваў, якія спецыялізуюцца па мяса-малочнай жывёлагадоўлі, агародніцтве і льнаводстве, вырошчваюць збожжавыя культуры і бульбу. Працуюць прадпрыемствы па вытворчасці будматэрыялаў, харчовай і лёгкай прамысловасці, дзяржаўнае прадпрыемства «Прэма», міжгаспадарчае прадпрыемства «Дняпрэц», доследная станцыя БСГА. Па тэрыторыі раёна праходзіць чыгунка, аўтамабільная дарога Орша — Мсціслаў. Выдаюцца раённая газета «Ленінскі шлях» і шматтыражная газета «Советский студент» (БСГА).

АД ЧАСОЎ ПЕРШАБЫТНЫХ

1917

АРХЕАЛАГІЧНАЯ СПАДЧЫНА ГОРАЦКАЙ ЗЯМЛІ

Першапачатковае засяленне і асваенне людзьмі вярхоўя р. Проні ў многім залежала ад мацерыковых абледзяненняў. Мяжа апошняга з іх 17—18 тыс. гадоў назад праходзіла каля г. Оршы, дзе таўшчыня лёду дасягала больш за 100 м. Перад фронтам ледавіка шырокай паласой распасціралася пустыня. Халодны клімат, без прыкмет жыцця азёры, блізкасць ледавіка не спрыялі тут жыццю чалавека ў эпоху палеаліту — старажытнага каменнага веку. Толькі пасля адступлення ледавіка, пацяплення, фарміравання сучаснай рачной сеткі, прыкладна 10—12 тыс. гадоў назад, на тэрыторыі цяперашняга Горацкага раёна з'яўляюцца першыя пасяленні — паляўнічых на паўночнага аленя. Археалагічна гэта падмацоўваецца распаўсюджваннем грэнскай і свідэрскай культур у Верхнім Падняпроўі.

Па меры адступлення ледавіка насельніцтва грэнскай культуры рухалася на поўнач, асвойваючы новыя землі.

Важнейшым тэхнічным дасягненнем гэтага часу было вынаходніцтва лука — самай дасканалай хуткастрэльнай дыстанцыйнай зброі старажытнасці, якую чалавек выкарыстоўваў на працягу тысячагоддзяў.

Наканечнікі стрэлаў былі касцянымі або крамянёвымі. Асабліва паказальныя грэнскія асіметрычныя чаранковыя наканечнікі, якія апрацаваны рэтушшу па адным краі і маюць выразку на другім. Узброеныя лукам і стрэламі паляўнічыя на паўночнага аленя былі піянерамі асваення рэгіёну, прылады працы з крэменю (скрабкі, востры, праколкі, разцы, нажы, тапары і інш.) служылі ім для апрацоўкі шкуры, косці і дрэва. Помнікі грэнскай культуры генетычна звязаны з пасяленнямі позняга палеаліту на паўночнай Украіне, што сведчыць аб тым, што рух насельніцтва на поўнач першапачаткова ішоў па Дняпры, Сожы і іх шматлікіх прытоках, адным з якіх была р. Проня.

Адначасова з носьбітамі грэнскай культуры ў Верхняе Падняпроўе з басейна Вісты і вярхоўя Прыпяці пранікаюць свідэрскія плямёны, іх рух па Нёману і Заходняй Дзвіне аж да вярхоўя Волгі тлумачыцца міграцыяй паўночнага аленя за адступаючым ледавіком. Адметнай рысай крамянёвага інвентару свідэрцаў было шырокае выкарыстанне наканечнікаў стрэлаў вербалістай формы.

У эпоху мезаліту (10—7 тыс. гадоў назад) тэрыторыя сучаснага Горацкага раёна была пакрыта глухімі лясамі, у якіх вадзіліся ўсе зараз вядомыя віды жывёлін.

Шырокае распаўсюджанне атрымала паляванне з дапамогай лука і стрэлаў, што дазваляла паспяхова паляваць на

зубра, лася, мядзведзя, ваўка, лісу, зайца, вадаплаўную дзічыну і г. д. Важную ролю адыгрывалі рыбалоўства і збіральніцтва.

Неабходнасць апрацоўкі дрэва ў лясным краі стымулявала вытворчасць прылад для сячэння — тапароў і цяслоў, кліноў, якія выкарыстоўваліся пры будаўніцтве жылля, гаспадарчых пабудоў, для нарыхтоўкі паліва, вырабу драўляных прылад працы, паляўнічых і рыбалоўных прыстасаванняў, сродкаў транспарту (чоўнаў) і інш.

У сваю чаргу спецыфіка гаспадарчай дзейнасці першабытнага чалавека, якая была звязана з міграцыяй жывёлы, паспяваннем пладоў, нерастам рыбы, здабычай крэменю, спрыяла з'яўленню шматлікіх сезонных паселішчаў.

Стаянка мезалітычнага часу была знойдзена ў 1,5 км на паўднёвы захад ад в. Вялікія Шарыпы на першай надпоплаўнай тэрасе левага берага р. Проня. Дзве невялікія рачулкі Пнеўка і Маханаўка, якія ўпадаюць у Проню, ствараюць мыс, на якім у 1985 г. В. Ф. Капыцін і В. Е. Кудрашоў на плошчы 40×100 м выявілі прадукты расшчаплення крэменю (пласціны, адшчэпы), скрэблападобныя вырабы, востры. Асобныя вырабы з крэменю знойдзены каля в. Пнеўшчына, на правым беразе р. Рамясцвянкі, пры ўпадзенні ў яе р. Лядня.

Важным вынаходніцтвам эпохі неаліту быў гліняны посуд. Першыя пасудзіны востраднай формы выраблялі спосабам налепкі або стужачным, што дазваляла складаць любыя формы і не абмяжоўваць памеры посуду. Прыкмета неалітычнай керамікі — арнаментацыя — сведчыць аб эстэтычных густах стваральнікаў.

У эпоху неаліту мелі месца буйныя ўдасканальванні ў вырабе каменных прылад. У вялікай колькасці сустракаюцца прадметы паляўнічага ўзбраення: буйныя крамянёвыя лістападобныя наканечнікі дзідаў і дроцікаў, касцяныя кінжалы з крамянёвымі ўкладышамі ў пазах, разнастайныя наканечнікі стрэлаў. Значная частка іх выраблялася з адколаў: шматлікія скрабкі, нажы, праколы, радзей — разцы. Характэрныя сякучыя прылады: сякеры, цяслы, долаты. Асноўным матэрыялам для іх вырабу па-ранейшаму быў крэмень, але пры гэтым выкарыстоўваліся і іншыя пароды каменю: кварцыт, дыярыт, якія апрацоўваліся шляхам шліфавання, пілавання, свідравання.

У II тысячагоддзі да н. э. тэрыторыя сучаснай Беларусі ўступіла ў бронзавы век — час адкрыцця і ўжывання металу, прыкметнага прагрэсу ў развіцці вытворчых сіл. На жаль, гісторыя раёна ў гэты перыяд да сённяшняга дня застаецца слаба вывучанай. У эпоху бронзы ў Верхнім Падняпроўі рассяляюцца плямёны, якія займаюцца земляробствам і жывёлагадоўляй. Як яны самі сябе называлі, мы, напэўна, ніколі не даведаемся. Археолагі называюць іх плямёнамі сярэднедняпроўскай культуры. Яны адносяцца да культуры шнуравой керамікі або культуры баявых сякераў, плямёны якіх размяшчаліся на шырокай тэрыторыі ад басейна Эльбы і Одэра на захадзе да Верхняй Волгі на ўсходзе, Сярэдняга Падняпроўя на поўдні, Швецыі і Данііі на поўначы. Гэтыя плямёны, па меркаванню даследчыкаў, з'яўляліся прадстаўнікамі старажытных індаеўрапейцаў — продкаў славян, балтаў і германцаў.

Пасяленні сярэднедняпроўскіх плямён часцей за ўсё размяшчаліся ў поймах рэк, на пясчаных узвышшах і па краі надпоплаўных тэрас, гэта значыць, у мясцінах, найбольш прыгодных для жывёлагадоўлі і земляробства, што і садзейнічала развіццю гэтых асноўных заняткаў.

Знаходкі вырабаў з бронзы ўказваюць на тое, што сярэднедняпроўскія плямёны былі знаёмы з металургіяй. Аднак месцанараджэнні меднай руды на тэрыторыі Верхняга Падняпроўя адсутнічаюць. Такім чынам, першыя мясцовыя металургі выкарыстоўвалі тую сы-

равіну, якую атрымлівалі ў выніку абмену.

Дрэва апрацоўвалі бронзавымі і каменнымі свярдзёлкамі і клінападобнымі сякерамі, цясламі і нажамі. Каменныя сякеры свідравалі пустой у сярэдзіне касцяной трубкай з прымяненнем мокрага пяску. Пасля свідравання вырабы паліравалі на паліравальных плітах з пясчаніку. Каменныя прасвідраваныя сякеры — самая частая знаходка на тэрыторыі раёна.

Па-ранейшаму шырока выкарыстоўваўся для вырабу прылад працы мясцовы мелавы крэмень шэрага і цёмна-шэрага колеру. З яго выраблялі скрабкі, нажы, свярдзёлкі і інш. Звяртае ўвагу дасканаласць апрацоўкі наканечнікаў стрэлаў трохвугольнай формы з выразкай у аснове.

Кераміка, як і раней, выраблялася ўручную. Але значна змяніўся характар арнаментацыі, кампазіцыі сталі больш складаныя, адрозніваліся і дасканаласцю малюнка ў выглядзе адбіткаў вяровачкі і ўціскання «у ёлачку». Шырока практыкавалася апрацоўка шкур, на што ўказваюць шматлікія знаходкі нажоў і скрабкоў.

Вывучэнне помнікаў сярэднедняпроўскай культуры прымусіла адмовіцца ад памылковага ўяўлення аб тым, што паўночныя раёны Верхняга Падняпроўя з'яўляліся глухім кутком, дзе старыя неалітычныя традыцыі ўтрымліваліся доўгі час. Насельніцтва, якое жыло тут, нейкі час існавала з сярэднедняпроўскімі плямёнамі, а потым было асімілявана прышэльцамі — носьбітамі больш прагрэсіўнага гаспадарчага ўкладу — жывёлаводамі і земляробамі.

У першай чвэрці I тысячагоддзя да н. э. насельніцтва сучаснага Горацкага раёна ўжо магло атрымліваць жалеза з мясцовых балотных руд, вырабляла з яго больш складаныя прылады працы. Знаёмства з металам не толькі пераўтварыла ўсю матэрыяльную культуру, яно зрабіла сапраўдную рэвалюцыю ў жыцці чалавека.

Змены ў гаспадарчай дзейнасці насельніцтва прывялі да змен у грамадскім ладзе. На змену старажытнай родавай арганізацыі прыходзіць патрыярхальна-абшчынны, або вялікасямейны ўклад. Змена форм гаспадаркі і частыя ваенныя сутыкненні, якія былі звязаны з накапленнем лішку прадуктаў, прывялі да змены ў тыпах і размяшчэнні паселішчаў. Замест ранейшых стаянак па берагах рэк пачалі будаваць умацаваныя гарадзішчы. Іх узводзілі на высокіх пляцоўках на мысах пры зліцці двух яроў або рэк. Прыродная непрыступнасць гарадзішчаў дапаўнялася штучнымі ўмацаваннямі ў выглядзе земляных валоў (часцей за ўсё з частаколам па грэбню), равоў і драўляных агароджаў. Сістэмы ўмацаванняў з земляных валоў і равоў захаваліся да нашых дзён.

У I тысячагоддзі да н. э. паўночна-ўсходнюю Беларусь засялялі плямёны днепра-дзвінскай культуры, старажытныя балты, продкі літоўцаў і латышоў. Са старажытных гарадзішчаў у раёне найбольш вывучаны два: каля вёсак Горы і Мікадзімава. Шматгадовыя раскопкі гэтых помнікаў далі разнастайны археалагічны матэрыял.

Рэшткі гарадзішчаў захаваліся ў г. Горкі, каля вёсак Ваўкоўшчына, Завідаўка, Курганне, Маслакі, Малыя Шарыпы, Паршына, Паляшчыцы, Сенькава, Шаўнева, Ярцаўка. Сярод іх можна выдзеліць гарадзішчы на правым беразе р. Лядня ў 1 км на паўднёвы захад ад Мемарыяльнага комплексу савецка-польскай баявой садружнасці ў в. Леніна, дзе яшчэ ў дарэвалюцыйныя гады былі знойдзены срэбны бранзалет з рознымі выявамі птушак і срэбныя завушніцы, якія былі ўпрыгожаны дутымі шарыкамі і сканню. Вырабы эпохі Кіеўскай Русі — завушніцы, бранзалеты, грыўны візантыйскай работы — знойдзены і на гарадзішчы каля в. Шаўнева.

У 1873 г. каля в. Пнеўшчына на правым беразе р. Лядня (правы прыток р. Рамасцвянкі) быў выяўлены унікаль-

Знешні выгляд гарадзішча ў г. Горкі.

ны помнік. Гэта пірамідальнай формы гранітны валун, вагой каля 500 кг, даўжынёй да 1 м, у шырыню і вышыню да 0,75 м, які знаходзіўся на вяршыні кургана, складзенага з каменю. На паверхні валуна былі нанесены знакі вышынёй 130—140 мм, шырынёй 6 мм і глыбінёй 4—5 мм на адным баку ў выглядзе суцэльнага надпісу, а з другога боку бязладна раскіданых на паверхні. А. М. Дандукоў-Корсакаў лічыў надпіс рунічным, а А. Мюлер (Аўстрыя) — фінікійскім — «Помнік Ваала. Тут мы яго выдаўблі (высеклі)». На другім баку надпіс з найбольшай колькасцю знакаў застаўся нерасшыфраваным.

У другой палове I тысячагоддзя н. э. на Верхняй Проні з'явіліся крывічы. Яны былі аднымі з самых шматлікіх усходнеславянскіх плямёнаў, якія напярэдадні ўтварэння Кіеўскай Русі займалі абшырныя прасторы «на верх Волгі і на верх Дзвіны, і на верх Дняпра». На тэрыторыі Горацкага раёна помнікамі пахавання крывічоў з'яўляюцца паўсферычныя курганы — насыпы вышынёй 0,5—3 м і дыяметрам 6—12 м. Курганы размяшчаюцца невялікімі групамі, радзей сустракаюцца адзіночныя ці ўзвышаюцца блізнятамі. З імі звязаны легенды і паданні. Яны нагадваюць нам аб суровым і гераічным часе, аб бітвах і ратных подзвігах, аб людзях, якія пахаваны там, — продках сучасных беларусаў. Курганы захаваліся каля вёсак Лугіны, Маслакі, Нежкава, Паршына, Светлая, Студзянец. Па звестках за 1873 г., курганоў было значна больш, у тым ліку каля вёсак Анікавічы, Асіповічы, Нівішчы.

Для крывічоў у X—XIII ст. быў



Знешні выгляд курганоў у в. Асіповічы.

характэрны пэўны тып жаночых упрыгажэнняў — скроневыя бранзалетападобныя кольцы з завязанымі канцамі. Дыяметр кольцаў — 5—11 см. Іх насілі каля скроняў на скуранай галаўной павязцы звычайна па тры з кожнага боку. Акрамя кольцаў у жаночых пахаваннях знаходзяць пацеркі і падвескі, пярсцёнкі і бранзалеты, шыйныя грыўны і спражкі. У мужчынскіх пахаваннях сустракаюцца нажы, сякеры, дзіды, розныя спражкі. Як у жаночых, так і ў мужчынскіх пахаваннях заўсёды прысутнічае гліняны посуд.

Курганы над нябожчыкамі насыпаліся да XIII ст., а затым пад уплывам хрысціянства насельніцтва пачало хаваць памерлых па сучаснаму абраду.

Археалагічныя сведчанні аб славянах дапаўняюцца візантыйскімі і арабскімі пісьмовымі крыніцамі. Так, візантыйскі гісторык сярэдзіны VI ст. Пракопій піша, што славяне адрозніваліся магутным целаскладам, высокім ростам, вялікай сілай. Аб славянах паведамляе і візантыйскі імператар Маўрыкій у сваёй працы «Страцегікон», якая была напісана ў пачатку VII ст.: «Жывуць славяне ў лясах, пры рэках, у балотах, пры азёрах — мясцінах непрыступных, жывуць яны разрозненымі плямёнамі... Плямёны славян вядуць аднолькавы вобраз жыцця, маюць аднолькавыя норавы, любяць свабоду і не выносяць іга, рабства, падпарадкавання. Яны лёгка пераносяць спёку і холад, нагату цела і ўсе магчымыя нязручнасці і недахопы». Аб сіле і храбрасці нашых продкаў гаворыць і арабская крыніца: «Славяне народ такі магутны і страшны, што калі б ён не быў раздзелены на мноства родаў, ні адзін народ у свеце не памерыўся б з імі сілаю».

У X — XI ст. тэрыторыя сучаснага Горацкага раёна ўваходзіла ў склад Кіеўскай Русі. Да гэтага часу сфарміравалася старажытнаруская (ці ўсход-

неславянская) народнасць. Станаўленне старажытнарускай дзяржаўнасці і народнасці суправаджалася бурным развіццём эканомікі і культуры, аб чым сведчаць вядомыя нам помнікі пісьменнасці.

Працэс кансалідацыі зямель вакол асобных феадальных цэнтраў прывёў да адасаблення княстваў, якія ўваходзілі ў састаў Кіеўскай Русі. Адным з першых у XI ст. аддзялілася Полацкае княства. Землі па рэчках Сож, Проня і верхняму цячэнню Дняпра ўвайшлі ў склад Смаленскай зямлі.

В. Капыцін.

Гарадзішчы ў в. Мікадзімава і каля в. Шаўнева

Са старажытнага часу вярхоўі рэк Басі і Проні былі заселены чалавекам, аб чым сведчаць шматлікія археалагічныя помнікі. Сярод іх каля 20 гарадзішчаў — умацаваных пасяленняў эпохі ранняга жалезнага веку і ранняга сярэдневякоўя, якія захаваліся на тэрыторыі Горацкага раёна.

Адно з найбольш даследаваных гарадзішча ў в. Мікадзімава (за 0,6 км на паўднёвы ўсход ад вёскі на левым беразе р. Быстрая). Яно пабудавана на высокім мысе паміж двума ярамі. Паселішча з'яўляецца гарадзішчам-сховішчам трэцяй чвэрці I тысячагоддзя н. э., пад якое было перабудавана больш старажытнае гарадзішча днепра-дзвінскай культуры.

Мікадзімаўскае гарадзішча мае магутную сістэму абарончых збудаванняў. Вал, які аплыў, дзеліць пляцоўку на дзве часткі памерам 40×36 м і 48×48 м. Яны ўзвышаюцца над поймай ракі Быстрая на 12—18 м. З боку поля гарадзішча ўмацавана валам вышынёй 4,5 м пры шырыні 20 м. У мысавой частцы ёсць яшчэ два валы, а паміж імі і пляцоўкай — западзіна.

Помнік вядомы з 1903 г., яго абследавалі ў 1936 г. А. Д. Каваленя, у 1978 г.— В. І. Шадыра. Пачынаючы з 1986 г. археалагічны атрад Магілёўскага абласнога краязнаўчага музея пад кіраўніцтвам А. А. Седзіна праводзіць археалагічныя раскопкі на Мікадзімаўскім гарадзішчы.

У ходзе раскопак на пляцоўцы ў цёмнашэрым культурным слоі (які ўтварыўся ў выніку чалавечай дзейнасці) і мацерыку выяўлены сляды доўгай кругавой пабудовы слупавой канструкцыі. Яна падзялялася на асобныя памяшканні, аб чым сведчаць рэшткі бярвенняў і размяшчэнне ям ад апорных слупоў. У жыллёвых памяшканнях знойдзены ачагі, якія складзены з камянёў. Пабудовы і драўляныя абарончыя збудаванні былі знішчаны пажарам. Сустракаецца вялікая колькасць вугалю і абгарэўшыя бярвенні.

Галоўным заняткам насельніцтва былі жывёлагадоўля і земляробства. Знойдзены шматлікія косці буйной рагатай жывёлы, коней, свіней, а таксама адзінкавыя — сабакі і дробнай рагатай жывёлы.

У культурным слоі сустракалася зерне розных культурных раслін: ячменю, проса, пшаніцы, гароху, бабоў кармавых, аўса, жыта.

Магутнасць культурнага слоя дасягала, а ў асобных месцах і значна перавышала 1 м. Пры яго даследаванні атрымана вялікая колькасць розных рэчаў, якія даюць нагляднае ўяўленне аб матэрыяльнай культуры насельніцтва міжрэчча Верхняга Сожа і Дняпра ў эпоху вялікага перасялення народаў. Гэта важны перыяд у жыцці плямёнаў Усходняй Еўропы.

Самымі шматлікімі знаходкамі з'яўляюцца фрагменты ляпнога посуду. Яны маюць прамы ці адагнуты наверх венчык, на некаторых ёсць налеплены валік з косай насечкай. З гліны таксама выраблены прасліцы біканічныя для прадзення.

У калекцыі рэчаў даволі шмат прадметаў узбраення — лісцепадобныя, полымяпадобныя і двухшыпныя наканечнікі коп'яў; наканечнікі дроцікаў, трохлапасныя чаранковыя наканечнікі стрэлаў для лука. Аб выкарыстанні коней для верхавой язды можна меркаваць па знаходках шпор і цугляў. Акрамя таго, маюцца і іншыя жалезныя вырабы — нажы з прамой спінкай, шылы, спражкі, пінцэты, рыбалоўны кручок, фіцільныя трубкі і інш. Атрыманне жалеза з балотных

Знешні выгляд гарадзішча ў в. Мікадзімава.

руд, яго кавальская апрацоўка, а таксама бронзаліцейная вытворчасць былі найбольш складанымі заняткамі і яны існавалі на гарадзішчы. У калекцыі шмат крыц, шлакаў, льячак, ліцейных формачак, кавалкаў белага металу і бронзы аморфных абрысаў. З бронзы выраблялiся бранзалеты, скроневыя кольцы, званковыя падвескі, пальчатыя фібулы і іншыя ўпрыгажэнні. Асаблівую цікавасць уяўляюць пальчатыя фібулы. Яны сустракаюцца вельмі рэдка. Адна з іх мае ў даўжыню каля 10 см, упрыгожана завіткамі, галоўка паўкруглая з пяццю пальцамі (промнямі). Фібулы выкарыстоўваліся ў якасці заплічак і адначасова служылі ўпрыгажэннямі. Маюцца срэбныя бранзалеты і падвеска, а таксама больш за 200 шкляных і паставых пацерак рознай расфарбоўкі, формаў і памераў, а таксама выкарабленых з бурштыну.

У наваколлях Мікадзімава ёсць і іншыя помнікі. Некаторыя з іх існавалі адначасова з вышэйназваным пасяленнем.

Раскопкі на Мікадзімаўскім гарадзішчы працягваюцца. Напярадзе новыя адкрыцці, якія раскрыюць яшчэ адну старонку старажытнай гісторыі Горацкага раёна ў эпоху вялікага перасялення народаў.

А. Седзін.

* * *

Адным з помнікаў археалогіі ў Горацкім раёне з'яўляецца гарадзішча каля в. Шаўнева Горскага сельсавета. Гарадзішча было выяўлена яшчэ ў пачатку XX ст. вядомым беларускім краязнаўцам Е. Р. Раманавым, які шмат зрабіў для вывучэння старажытнасцей Магілёўскай губерні. Яно размешчана на 8—10 метраў над узроўнем рэчкі. Гарадзішча мае трохвугольную форму, яго памеры 60×45 м, яшчэ да сённяшняга дня захаваліся рэшткі абарончага вала вышынёй да 3 м.

Гарадзішча здаўна прыцягвала да сябе даследчыкаў. Яшчэ ў канцы мінулага стагоддзя на ім быў знойдзены скарб срэбных рэчаў: завушніцы, спражкі, бранзалеты,

грыўны. У наш час гарадзішча неаднаразова абследавалася археолагамі, але раскопкі на ім не праводзіліся. У 1978 г. яно разам з другім гарадзішчам, размешчаным у самой в. Шаўнева, было ўзята пад ахову як помнік археалогіі рэспубліканскага значэння. Нягледзячы на гэта, у 1986 г. гарадзішча ў в. Шаўнева было поўнасцю знішчана, калі пашыралі дарогу на в. Ходараўку. У 1989 г. другое гарадзішча, на беразе р. Каменкі, было моцна пашкоджана кар'ерам.

Невялікія археалагічныя даследаванні, праведзеныя ў 1991 г. (было вывучана 140 м^2 плошчы, пры магутнасці культурнага слоя ад 0,4 да 0,8 м), далі вельмі цікавы матэрыял.

У ходзе раскопак былі вывучаны рэшткі гаспадарчай пабудовы памерам 2,5×2,5 м, сцены якой былі слупавой канструкцыі. У яе запаўненні былі знойдзены нажы, накладкі ад замка, пружыны ад замка з драўляным засовам, шкляныя бранзалеты, прабой. Сярод знаходак, якія датуюцца канцом XI — XIII ст., шырока прадстаўлены прадметы ўпрыгажэнняў — бронзавыя бранзалеты, шпілька, медны пярсцёнак, шарападобная бразготка з лінейнай шчылінай. XII — пачаткам XIII ст. датуюцца шкляныя бранзалеты рознага колеру — зялёныя, сінія, бірузовыя, жоўтыя, іх хутчэй за ўсё прывозілі са Смаленска, а таксама з Кіева і Віцебска. Шматлікія знаходкі прадметаў штодзённага карыстання — нажы, прабоі, вушкі ад катлоў, шпількі, ключы ад вісячых і розных замкоў, дэталі да іх, якія датуюцца другой паловай XII — XIII ст. Касцяныя вырабы прадстаўлены шматлікімі двухбаковымі наборнымі грабянямі XII — XIII ст., нешматлікім рыштункам конніка і каня: абломак шпоры, спражкі, наканечнік стралы з квадратным сячэннем, які выкарыстоўваўся для прабіцця кальчужных ці іншых абарончых даспехаў. Самай шматлікай катэгорыяй знаходак з'яўляецца бытавы посуд. Значная колькасць гаршкоў арнаментавана — у асноўным узор нанесены ў выглядзе хвалі ў спалучэнні з насечкамі, сустракаецца таксама і лінейны. Знойдзены гаршкі, пакрытыя палівай. Яны, безумоўна, належалі заможнаму чалавеку і прывозіліся сюды з буйных рамесных цэнтраў. Цікавыя фрагменты гаршкоў з вузкім горлам, упрыгожаных налепнымі валікамі і арнаментаваных у выглядзе насечак. Гаршкі такога тыпу былі характэрныя для паўднёва-заходніх зямель Кіеўскай Русі. Шмат донцаў ад гаршкоў. На некаторых з іх ёсць клеймы, у тым ліку і клеймы накшталт знака Рурыкавічаў. Магчыма, на гарадзішчы існавала свая вытворчасць посуду, але дакладна аб гэтым мы пакуль гаварыць не можам. Знойдзены толькі кавалкі соплаў ад горна.

Цікавай знаходкай з гарадзішча Шаўнева з'яўляецца невялікі фрагмент шкляного посуду, упрыгожанага каляровым арнаментам. На жаль, сам арнамент поўнасцю аднавіць немагчыма — ад яго захавалася толькі некалькі ліній, нанесеных жоўтай, чырвонай і сіняй фарбай. Такі шкляны посуд у Кіеўскую Русь паступаў з краін Блізкага Усходу ці Візантыі. З паўднёварускіх зямель прывозілі шыферныя праселкі, якія выкарыстоўваліся пры прадзенні нітак.

Невялікая вывучаная плошча і значная пашкоджанасць гарадзішча не даюць магчымасці пакуль што гаварыць аб яго функцыянальным прыстасаванні. Але знаходка на ім скарбу срэбных рэчаў, наяўнасць вырабаў, належачых знаці, дазваляе меркаваць, што перад намі рэшткі буйной феадальнай сядзібы другой паловы XII — XIII ст.

А. Мяцельскі.

З СІВОЙ ДАЎНІНЫ

Першыя пісьмовыя звесткі, якія непасрэдна тычацца тэрыторыі Горацкага раёна, паходзяць з XII ст., калі гэтыя землі ўваходзілі ў склад Смаленскага княства. Тагачасныя княствы падзяляліся на больш дробныя адзінкі — воласці, цэнтрамі якіх былі ўмацаваныя двары (пагосты) ці драўляныя замкі. Такія воласці падпарадкоўваліся княжацкім намеснікам з ліку найбольш значных баяр.

У 1136 г. смаленскі князь Расціслаў Мсціславіч вызначыў з падпарадкаваных яму валасцей дзесяціну на карысць новазаснаванага смаленскага епіскапства. У ліку валасцей, частка даніны з якіх павінна была ісці ў склад дзесяціны, названа і воласць Басея. Гісто-

рыкі і археолагі лакалізуюць яе ў вярхоўях ракі Басі. Такім чынам, гэтая воласць займала заходнюю частку сучаснага Горацкага раёна[1].

У той жа грамаце прыгадваецца воласць Мярэцічы, якая займала вадазбор ракі Мярэі. Напэўна, яна ўключала ў сябе і самыя вярхоўі гэтай ракі — сучасны Ленінскі сельсавет Горацкага раёна, дзе ў больш познія часы знаходзіўся феадальны маёнтак Раманава.

Асноўная частка раёна, у парэччы Проні і яе доплываў, была, відаць, занята іншай воласцю, цэнтрам якой мог быць старажытнарускі замак ля сучаснай вёскі Горы. Археалагічныя раскопкі сведчаць, што ў XII — XIII ст. гэта быў значны, добра ўмацаваны цэнтр. Сярод знаходак ёсць днішча гаршка з кляймом у выглядзе так званага двухзубца — радавога знака княжацкай дынастыі Рурыкавічаў[2]. Такія гаршкі, напэўна, выраблялiся ў княжацкай майстэрні, якая магла знаходзіцца непасрэдна ў замку ці на неўмацаваным пасадзе побач з ім.

Вышэйзгаданая грамата князя Расціслава не называе той воласці, цэнтрам якой мог быць замак у Горах. Гэта сведчыць, што на той момант Смаленск не атрымліваў з яе даніны. Так магло быць у выпадку, калі воласць не кіравалася намеснікам, а належала князю непасрэдна на ўмовах асабістай уласнасці (гісторыкі называюць такі від уласнасці даменам).

Беларускі археолаг А. Мяцельскі выказаў меркаванне, што замак у Горах можна атаясаміць з горадам Ізяслаўлем, які прыгадваецца сярод гарадоў Смаленскага княства ў другой палове XII ст. Паводле гэтай версіі, у XIII ст. замак прыйшоў у часовы заняпад, а калі пазней адрадзіўся, то атрымаў новую назву — Горы, пад якой ён і вядомы ў больш познія часы[3]. Гэта не выключана, але магчыма і тое, што замак з самага пачатку меў назву Горы, а ў тагачасныя дакументы чамусьці не трапіў.

На мяжы XIII і XIV ст. Смаленскае княства ўвайшло ў склад Вялікага княства Літоўскага (ВКЛ), якім тады кіраваў вялікі князь Вітаўт. Апошні смаленскі князь Юрый Святаслававіч страціў уладу ў 1401 г., пасля чаго Смаленск падпарадкоўваўся намеснікам Вітаўта. Пры Вітаўце распачалася практыка шырокай раздачы дзяржаўных валасцей і асобных сёл з іх складу ў прыватную ўласнасць вялікакняжацкім васалам — князям і буйным баярам (якія на польскі лад пачалі называцца панамі). Раздача зямель яшчэ больш паскорылася пры пераемніках Вітаўта — яго малодшым браце Жыгімонце Кейстутавічу і стрыечным браце Свідрыгайле Альгердавічу, якія ў 1430-я гады вялі жорсткую міжусобную барацьбу. Імкнучыся мацней прывязаць да сябе прыхільнікаў, абодва шчодра надзялялі іх зямельнымі маёнткамі.

Недзе ў гэты час (і, верагодна, у сувязі з гэтымі падзеямі) змянілі свой статус Басейская і Горская воласці. Як вынікае з больш позніх звестак, абедзве гэтыя воласці перайшлі ва ўласнасць да князя Івана Сямёнавіча Пуцяты з роду князёў Друцкіх[4]. Гэты князь вядомы тым, што разам са сваім старэйшым братам Іванам Бабаем быў актыўным прыхільнікам Свідрыгайлы, уваходзіў у склад яго рады спярша ў бытнасць Свідрыгайлы вялікім князем (1430—32 гг.), а потым у час вайны з Жыгімонтам, калі ўладу Свідрыгайлы прызнавала ўсходняя частка ВКЛ. Вельмі падобна, што менавіта з рук Свідрыгайлы Іван Пуцята атрымаў дзве вялізныя воласці, што зрабіла яго адным з буйнейшых землеўладальнікаў.

Іван Пуцята апошні раз упамінаецца ў 1440 г., калі ён знаходзіўся пры двары Свідрыгайлы ў Валынскім княстве. У тым жа годзе быў забіты вялікі князь Жыгімонт, пераемнікам якога стаў чатырнаццацігадовы пляменнік Свідрыгайлы Казімір Ягайлавіч. Ён, напэўна, прызнаў за Іванам Пуцятам і яго нашчадкамі права на валоданне набытымі вотчынамі.

У Пуцяты засталося чацвёра сыноў, якія падзялілі паміж сабой бацькоўскія ўладанні. Нашчадкі двух з іх пазней выступаюць як саўладальнікі Горскай і Басейскай валасцей (гл. схемы *1* і *2*). Гэта і дазваляе нам меркаваць, што абедзве воласці належалі ўжо Пуцяце, хаця непасрэдных упамінанняў пра іх няма да канца XV ст. (увогуле ад гэтага стагоддзя засталося вельмі мала дакументаў).

Такім жа ўскосным чынам высвятляецца, што маёнтак Раманава са складу Мярэйскай воласці не пазней сярэдзіны XV ст. перайшоў у рукі іншай прыкметнай асобы таго часу — князя Юрыя Сямёнавіча Гальшанскага (памёр каля 1457 г.) ці яшчэ яго бацькі Сямёна Лютага, які загінуў у час міжусобнай вайны паміж Свідрыгайлам і Жыгімонтам у 1433 г. Пасля смерці Юрыя Сямёнавіча і падзелу яго маёмасці між сынамі Раманава дасталося аднаму з іх — Юрыю Юр'евічу. Калі ж ён памёр без нашчадкаў, яго тры браты каля 1480 г. падзялілі маёнтак на роўныя часткі паміж сабой (схема *5*).

Першыя непасрэдныя ўпамінанні пра маёнткі на тэрыторыі Горацкага раёна захаваліся ў так званай «Літоўскай метрыцы» — архіве канцылярыі ВКЛ, у кнігі якой заносіліся дакументы аб набыцці, падзелах маёнткаў і іншых жыццёвых справах феадалаў — пераважна буйных (князёў і паноў), якія падлягалі юрысдыкцыі самога вялікага князя. У канцы XIX ст. польскі даследчык Юзаф Вольф выбраў з Метрыкі звесткі, якія тычыліся асоб княжацкага стану, і паведаміў аб іх у сваёй працы «Літоўска-рускія князі з канца XIV стагоддзя»[5].

Горы ўпершыню ўпамінаюцца ў «Літоўскай метрыцы» ў 1497 г., калі чацвёра сыноў князя Васіля Іванавіча Пуцяціча (Іван, Алелька, Дзмітрый і Міхаіл, схема *2*) судзіліся са смаленскім епіскапам Іосіфам за спрэчныя землі сваіх маёнткаў Горы і Чурылавічы (пазнейшае Чурылава), якія межавалі з уладаннямі епіскапа[6]. Ад маёнтка Горы гэтыя князі і іх нашчадкі ў далейшым тытулаваліся князямі Горскімі альбо Друцкімі-Горскімі.

Стрыечны брат князёў Горскіх Юрый, сын Міхаіла Пуцяціча, у дакументах пачатку XVI ст. названы князем Шышаўскім. Гэты тытул паходзіць ад маёнтка Шышава, які быў цэнтрам яго ўладанняў у Горскай воласці. Пазней Юрый пісаўся ўжо князем Талачынскім (ад маёнтка Талачын у Друцкім княстве), але долю ў Горскай воласці з маёнткам Шышава захаваў да канца жыцця і перадаў у спадчыну адзінаму сыну Васілю (схема *1*).

На жаль, ніякіх падрабязнасцей пра жыццё на тэрыторыі раёна ў канцы XV — пачатку XVI ст. не захавалася. Можна толькі меркаваць, што пасля пераходу маёнткаў у прыватную ўласнасць лад жыцця мясцовага насельніцтва змяніўся мала. Жыхары выплочвалі даніну — часткова грашыма, часткова натуральнымі прадуктамі (мёдам, збожжам). Галоўныя сялібы князёў Друцкіх і Гальшанскіх знаходзіліся далёка адсюль, таму падданыя нячаста бачылі сваіх гаспадароў. Ім даводзілася мець справу пераважна з княжацкімі цівунамі (ураднікамі), якія збіралі даніну і кіравалі дваровай гаспадаркай.

З пачатку XVI ст. тэрыторыя раёна стала арэнай ваенных дзеянняў паміж ВКЛ і набіраючай моц Маскоўскай дзяржавай. Апошняя ў 1514 г. пасля доўгай барацьбы захапіла Смаленск і неаднаразова пасылала свае войскі далей на захад. У 1522 г. было нарэшце заключана перамір'е, паводле якога новая мяжа паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай прайшла прыкладна так, як і зараз праходзіць мяжа Беларусі з Расіяй. Замкі ў Горах і Раманаве сталі памежнымі і ў сувязі з гэтым набылі важнае абарончае значэнне. Яны неаднаразова прыгадваюцца ў дыпламатычнай перапісцы і перамовах ВКЛ з Масквой. Пазней, падчас Лівонскай вайны ў 1563 г. Горская воласць зноў зведала жорсткае спусташэнне, калі маскоўскія

войскі часова занялі ўсё левабярэжжа Дняпра. Замак у Горах быў спалены, сяляне разбегліся падчас ваеннага ліхалецця. Аднаўленне разбуранай гаспадаркі заняло потым шмат часу.

Вяртаючыся крыху назад, адзначым, што да сярэдзіны XVI ст. адбылося моцнае раздрабненне маёнткаў на тэрыторыі раёна. Гэта было звязана са спадчынным правам, што дзейнічала ў ВКЛ. Паводле старажытных звычаяў, усе маёнткі падлягалі падзелу на роўныя долі паміж сынамі. Дачкам выдавалася грашовае забеспячэнне (пасаг). Калі ж уладальнік маёнтка не пакідаў сыноў, яго ўдава захоўвала правы на вотчыну да сваёй смерці ці новага шлюбу. Потым маёнтак адыходзіў да дачок ці сясцёр уладальніка і затым пераходзіў у спадчыну да іх нашчадкаў. Такі маёнтак называўся «мацярынскім» і падлягаў роўнаму падзелу не толькі паміж сынамі, але і дочкамі спадкаеміцы.

Адзначым, што да 1566 г. уладальнік спадчыннага маёнтка не мог адвольна прадаваць альбо дарыць больш чым $^{1}/_{3}$ яго. Астатнія $^{2}/_{3}$ абавязкова павінны былі пераходзіць да прамых нашчадкаў, а пры іх адсутнасці — да больш аддаленых родзічаў. Пазней гэтая забарона была адменена, але на практыцы ўладальнікі рэдка адступаліся ад старых звычаяў.

У такіх умовах лёс маёнтка амаль цалкам вызначаўся генеалагічнымі акалічнасцямі — колькасцю сыноў і дачок уладальніка. Так, тры сыны князя Івана Горскага (схема *2*) памерлі ў першай палове XVI ст. без нашчадкаў. Спадчыннiцай іх уладанняў (у тым ліку і часткі Горскай воласці з Чурылавічамі) стала адзіная сястра Аўдоцця — жонка пана Храбтовіча. Пасля яе смерці маёнтак падлягаў роўнаму падзелу паміж яе сынам і дачкой у якасці «мацярынскага». На практыцы, аднак, дачка Аўдоцці Багдана са сваім мужам Анікеем Гарнастаем выкупілі ў яе брата Пятра Храбтовіча яго долю маёнтка, аб'яднаўшы яе такім чынам са сваёй доляй[7].

Пляменнік Івана Фёдар Дзмітрыевіч таксама меў сястру, але, паколькі ў яго засталіся два сыны, маёнтак адышоў у спадчыну да іх, сястра ж атрымала грашовы пасаг. Пры падзеле паміж сынамі Фёдара доля ў Горах цалкам адышла да малодшага, Абрагама. Яго брат Рыгор атрымаў на кошт сваёй долі іншыя маёнткі.

Прыкладна ў той жа час памёр адзіны сын Юрыя Шышаўскага Васіль Талачынскі (схема *1*), які валодаў, апрача часткі Друцкага княства вакол Талачына, маёнткамі Шышава, Юркава, Горкі і часткай Басейскай воласці, у якой пазней знаходзіліся вёскі Сялец і Палёнка. Перад смерцю, у верасні 1544 г., ён завяшчаў сваёй жонцы Марыі з роду князёў Заслаўскіх $^{1}/_{3}$ сваіх маёнткаў (у гэтым дакуменце, дарэчы, упершыню непасрэдна ўпамінаецца будучы райцэнтр Горкі)[8]. Астатнія $^{2}/_{3}$ павінны былі адысці да дзвюх яго сясцёр. Аднак незадоўга да смерці князь Васіль пазычыў у жонкі вялікую суму грошаў пад заклад гэтых $^{2}/_{3}$. Гэта азначала, што сёстры Васіля маглі ўступіць ва ўладанне маёнткамі толькі пасля таго, як вернуць яго ўдаве пазычаную ім суму. Сёстры паспрабавалі аспрэчыць гэтае завяшчанне, але безвынікова. Тым часам Марыя ў 1554 г. паўторна выйшла замуж за пана Івана Гарнастая (схема *3*), разам з якім працягвала карыстацца спадчынай першага мужа.

Сёстрам Васіля Талачынскага засталося толькі збіраць грошы, каб выкупіць братні маёнтак (які, відаць, быў варты таго). Гэта ім удалося толькі часткова. У 1555 г. адна з сясцёр, Людміла, выкупіла было сваю частку, але з-за недахопу грошаў вымушана была тут жа скасаваць акт выкупу[9].

Тым часам адзіная дачка другой сястры, Настассі, князёўна Багдана Друцкая, пасля смерці свайго першага мужа выйшла замуж за вельмі энергічнага пана Івана Сапегу. Да таго ж і цётка Багданы Людміла перад смерцю завяшчала свае правы на гэтую спадчыну ёй і яе мужу. Сапега рашуча ўзяўся за

ажыццяўленне правоў сваёй жонкі і цешчы. Ужо ў 1554 г. Іван Гарнастай скардзіўся на пана Сапегу і княгіню Настассю за гвалтоўны захоп яшчэ не выкупленага маёнтка[10]. Пазней Іван Сапега выкупіў і адсудзіў свае законныя $^{2}/_{3}$ Шышава, Горак і Басеі, але трэцяя частка ўсё ж засталася ў руках паноў Гарнастаяў. Каля 1558 г. Настасся абвінавачвала ўрадніка Гарнастая, дробнага шляхціча Багдана Дэдэрку, што ён, збіраючы грашовыя павіннасці на карысць свайго пана, рабіў гэта і ў той частцы маёнтка Басея, што належала ёй[11].

Яшчэ адным саўладальнікам азначаных маёнткаў у першай палове XVI ст. быў князь Сямён Ямантовіч-Падбярэзскі. Ён не належаў да роду князёў Друцкіх, таму невядома, якім чынам частка іх вотчыны трапіла да яго. Магчыма, яго маці была спадкаеміцай кагосьці з сыноў Івана Пуцяты (звесткі пра яе не захаваліся, невядома нават дакладна імя бацькі князя Сямёна).

Сямён Падбярэзкі не меў дзяцей. У 1522 г., яшчэ ў не вельмі старым узросце, ён напісаў завяшчанне, паводле якога частку свайго маёнтка Басея (а менавіта сёлы Казловічы і Хамінічы, з якіх апошняе — у сучасным Горацкім раёне) завяшчаў на карысць царквы. Рэшту ж сваёй долі ў Басейскай воласці, якая ахоплівала землі на правабярэжжы Басі на стыку сучасных Шклоўскага і Горацкага раёнаў, князь Падбярэзкі завяшчаў вельмі заможнаму пану Альбрэхту Гаштаўту, уладальніку суседняга маёнтка Шклоў. Гэта было парушэннем правіла, паводле якога адчужаць можна было толькі трэць вотчыны. Каб абысці гэтую перашкоду, князь абвясціў, што ўсынаўляе пана Гаштаўта (які, дарэчы, быў старэйшы за яго).

Але гэтае завяшчанне не мела непасрэдных наступстваў, бо пасля яго складання Сямён пражыў яшчэ 18 гадоў, на год перажыўшы свайго прыёмнага сына. Другім завяшчаннем ён адпісаў спадчыну сваёй жонцы, але гэтае завяшчанне было аспрэчана яго сястрой Ульянай, якая мела ад шлюбу з полацкім баярынам Яцкам Сенькавічам двух сыноў (схема *3*). Цікава, што Ульяна была паслядоўна замужам за двума роднымі братамі, Міхаілам і Яцкам Сенькавічамі. Царкоўны суд прызнаў другі з гэтых шлюбаў незаконным, але дзяцей ад гэтага шлюбу тым не менш палічыў законнымі і паўнапраўнымі.

Ульяна выйграла працэс ва ўдавы свайго брата, і ў 1542 г. доля апошняга ў Басеі (у тым ліку і некалі запісаныя на царкву Хамінічы) была прысуджана ёй і яе сынам. Праз тры гады старэйшы з сыноў, Рыгор, без згоды свайго брата Івана падараваў іх агульную частку Басеі вялікаму князю. Іван падаў скаргу, але, відаць, безвынікова, бо ў далейшым ніводны з братоў дачынення да Басеі ўжо не меў. Праўда, крыху пазней адным з саўладальнікаў маёнтка Горы і іншай спадчыны Сямёна Падбярэзскага выступаў пан Андрэй Цеханавецкі. Гэта наводзіць на думку, што Ульяна мела яшчэ і трэці шлюб, з панам Цеханавецкім, сын якога Андрэй атрымаў ад яе частку спадчыны Падбярэзскага[12].

Між тым першае завяшчанне Сямёна Падбярэзскага ўсё ж мела нейкія вынікі, бо ўрэшце доля Басеі з Хамінічамі і іншым абшарам (там пазней узніклі вёскі Любіж, Аўсянка, Гулідаўка і інш.) апынулася прылучанай да маёнтка Шклоў — колішняй уласнасці Альбрэхта Гаштаўта. У 1542 г., калі памёр без нашчадкаў адзіны сын Альбрэхта Станіслаў, іх вялізныя ўладанні (дарэчы, самая буйная на той час латыфундыя ў дзяржаве) адышлі да вялікага князя. Сын Ульяны Падбярэзскай нагадаем, таксама падараваў Басею вялікаму князю. Напэўна, пасля таго басейскія сёлы і былі прылучаны да Шклова, які ў 1565 г. быў нанава пажалаваны пану Яну Ераніму Хадкевічу[13] і ў далейшым належаў яго нашчадкам (схема *8*).

Падобныя ж заблытаныя акалічнасці былі звязаны і з лёсам маёнтка Рамана-

ва. У першай чвэрці XVI ст. яго саўладальнікамі былі стрыечныя браты, князі Юрый Іванавіч і Павел Аляксандравіч Гальшанскія, а таксама іх стрыечная сястра Таццяна Сямёнаўна — жонка славутага военачальніка Канстанціна Астрожскага (схема *5*). Пасля яе смерці спадчыннікамі долі ў Раманаве сталі князь Астрожскі і яго сын Ілля (другі сын Астрожскага, Васіль Канстанцін, паходзіў ад іншага шлюбу і права на спадчыну Таццяны Гальшанскай першапачаткова не меў). У выніку шматэтапных абменаў з князямі Гальшанскімі Канстанцін Астрожскі сканцэнтраваў у сваіх руках ці не ўвесь маёнтак Раманава, аддаўшы ўзамен часткі іншых маёнткаў.

Калі ў 1539 г. памёр Ілля Канстанцінавіч Астрожскі, пакінуўшы маладую жонку Беату і нованароджаную дачку Альжбету, вакол яго вялізнай спадчыны (доля ў Раманаве складала толькі яе невялічкую частку) разгарнуліся даволі драматычныя падзеі. У час дзяцінства Альжбеты маёнткі заставаліся ў руках яе маці. Калі ж паўстала пытанне аб шлюбе юнай князёўны Астрожскай, на яе руку знайшлося некалькі прэтэндэнтаў, якіх прываблівала не столькі яе прыгажосць, колькі багацце. Адзін з іх, князь Дзмітрый Сангушка, не атрымаўшы згоды Беаты на шлюб з яе дачкой, у 1554 г. выкраў чатырнаццацігадовую князёўну і гвалтоўна абвянчаўся з ёй. Пасля скаргі Беаты каралю князь Сангушка за гэты ўчынак быў абвешчаны па-за законам і загінуў ад рук яе родзічаў.

Затым, аднак, ужо сам кароль Жыгімонт Аўгуст без згоды Беаты знайшоў жаніха для Альжбеты, у тым жа годзе абвянчаўшы яе ў Варшаве з польскім графам Лукашам Гурскім. Беата вывезла дачку ў Львоўскі дамініканскі кляштар, дзе забарыкадавалася з ёю ў касцёле, не дапускаючы туды графа Лукаша. Туды быў патаемна выкліканы князь Сямён Слуцкі, з якім Беата і абвянчала дачку (ужо ў трэці раз!). Аднак пасля аблогі касцёл вымушаны быў адчыніць браму графу Лукашу, і ў выніку Альжбета ўсё ж мусіла стаць яго жонкай, тым больш што князь Слуцкі хутка затым памёр (гэты сюжэт знайшоў адлюстраванне ў аповесці Вольгі Іпатавай «Чорная княгіня»).

Сама ж Беата, каб не дапусціць ненавіснага ёй Гурскага да спадчыны свайго мужа, у 1564 г. паўторна выйшла за буйнога польскага магната Альбрэхта Ласкага, якому і адпісала ўсе маёнткі (паводле польскага права яна магла зрабіць гэта). Ласкага, аднак, таксама прываблівалі толькі багацці Астрожскіх. Атрымаўшы запіс на маёнткі, ён адхіліў жонку ад усіх спраў і некалькі год трымаў яе пад дамашнім арыштам[14].

Альжбета Астрожская пасля смерці графа Лукаша ў 1573 г. разам са сваім дзядзькам Канстанцінам паспрабавала вярнуць сабе маёнткі, якія яе маці падаравала Альбрэхту Ласкаму, але апошні, відаць, захаваў фактычны кантроль над імі, а пасля смерці Беаты ў 1576 г. падараваў іх каралю. Свае правы на бацькоўскую спадчыну Альжбета завяшчала Канстанціну Астрожскаму, ад якога гэтыя правы затым перайшлі да яго зяця Крыштафа Радзівіла па мянушцы Пярун, аднаго з буйнейшых магнатаў у дзяржаве. Апошні, карыстаючыся сваім вялізным аўтарытэтам, у 1597 г. здолеў дамагчыся таго, каб кароль вярнуў яму колішнія ўладанні Беаты, сярод якіх было і Копыскае графства з далучаным да яго Раманавам[15]. З гэтага моманту на доўгі час Раманава зрабілася ўласнасцю славутага роду Радзівілаў (схема *6*).

Тым часам адным з саўладальнікаў суседняй Горскай воласці стаў старэйшы сын Івана Сапегі і Багданы Друцкай Леў Сапега — будучы канцлер Вялікага княства і адзін з яго найбольш таленавітых дзеячаў. Пры падзеле мацярынскай спадчыны ён атрымаў апрача іншага ўсю яе долю ў Горках, Шышаве і Басеі[16], астатнім братам дасталіся іншыя маёнткі. Саўладальнікамі Льва Сапегі на той момант былі сын князя Абрагама Горскага Юрый (схема *2*),

унук Івана Гарнастая Геранім і верагодны сын Ульяны Падбярэзскай Андрэй Цеханавецкі (схема *3*).

Да гэтага часу вынікі разбурэнняў, прынесеных Лівонскай вайной, былі ўжо пераадолены, хаця стары замак у Горах так і не адрадзіўся. Узамен Леў Сапега пабудаваў побач з ім новы замак бастыённага тыпу[17]. Увогуле ён імкнуўся пераадолець у сваіх уладаннях феадальную цераспалосіцу, ператварыць кожнае з іх у эфектыўны гаспадарчы механізм. З гэтай мэтай на працягу 1590-х гадоў ён ажыццявіў шэраг абменаў і купляў са сваімі саўладальнікамі, у выніку якіх Горская воласць (ці, як яе хутка пачалі называць, Горы-Горацкае графства) цалкам апынулася ў яго руках і стала адным з буйнейшых маёнткаў у дзяржаве.

У сваім маёнтку Леў Сапега правёў так званую валочную памеру — рэформу сістэмы павіннасцей, якая паступова ажыццяўлялася ў ВКЛ з другой паловы XVI ст. Раней усе павіннасці на карысць феадала вызначаліся на кожны сялянскі двор («дым») альбо нават на ўсю вясковую абшчыну з наступнай раскладкай па «дымах». Характар і аб'ём гэтых павіннасцей у розных мясцінах вельмі адрозніваўся. Валочная памера прадугледжвала пэўную уніфікацыю. Уся сельскагаспадарчая зямля маёнтка падзялялася на стандартныя ўчасткі — валокі, за карыстанне якімі вызначаліся фіксаваныя памеры грашовых (чынш) альбо адпрацовачных (прыгон) павіннасцей. Сялянскі двор у залежнасці ад колькасці працоўных рук мог атрымаць у карыстанне цэлую валоку, яе палову, $^{2}/_{3}$ альбо $^{1}/_{3}$ і нават меншую частку. Прапарцыянальна таму вызначаўся памер павіннасцей, накладзеных на гэты двор. Найбольш тыповыя надзелы на практыцы вагаліся паміж $^{1}/_{3}$ і $^{2}/_{3}$ валокі, у сярэднім — каля паўвалокі.

Калі ў маёнтку ўводзілася чыншавая сістэма, уся зямля дзялілася паміж сялянскімі сем'ямі, якія самі апрацоўвалі яе, збіралі і прадавалі ўраджай, а пану аддавалі фіксаваную грашовую суму, у дадатак да якой звычайна меліся і невялікія натуральныя паборы (дзежка ці паўдзежкі збожжа, курыца, мёд і інш.). Калі ж у маёнтку ўводзіўся прыгон, частка зямлі адводзілася пад фальварак, у якім трымальнікі кожнай валокі павіны былі адпрацаваць на сельскагаспадарчых работах некалькі чалавека-дзён на тыдзень. Увесь ураджай з фальваркавай зямлі цалкам ішоў пану.

У бібліятэцы Віленскага дзяржаўнага універсітэта захаваліся некаторыя дакументы з архіва Льва Сапегі, у тым ліку інвентар маёнтка Шышава за 1609 г.[18] Да яго на той час адносіліся 13 вёсак (Буда, Марозава, Кацялёва, Шарыпы, Сава і інш.), з якіх ішоў чынш у агульным памеры 1349 коп і 17 грошаў (капа — лічбавая адзінка ў 60 грошаў). Для параўнання: бочка ячменю тады каштавала 20 грошаў, аўса — 15 грошаў, бочка пшаніцы ці пуд мёду — 1 капу (60 грошаў). Захаваўся таксама рэестр чыншу з усіх маёнткаў Льва Сапегі за 1624 г.[19] У той час з маёнткаў Горы і Шышава разам ішоў чынш у памеры 15 692 злотых і 6 грошаў (1 злоты раўняўся 24 грошам), а з валасцей Якаўлевічы (зараз у Аршанскім раёне на мяжы з Горацкім) і Басея — 4835 злотых.

Крыху больш позні інвентар 1666 г.[20] сведчыць, што Горы-Горацкі маёнтак тады складаўся з двух войтаўстваў: Горацкага з 37 вёскамі і Горскага з 39 вёскамі. Цэнтрам першага з іх было мястэчка Горкі, у якім мелася 470 мяшчанскіх пляцаў і звыш 35 валок ворыўнай зямлі, цэнтрам другога — мястэчка Горы з 210 пляцамі і 33 валокамі. Буйнейшымі сёламі ў маёнтку былі Масалыкі (звыш 53 валок), Клядневічы (29 валок), Андрухі (25 вал.), Мядзведзева (16 вал.), Вялікія Шарыпы (15 вал.). Асноўная маса паселішчаў налічвала ад 1 да некалькіх валок зямлі. Тым не менш агульны зямельны фонд маёнтка ахопліваў звыш 1422 валок (каля 30 тыс. га).

Тэрыторыя Горацкага раёна ў сярэдзіне XVII ст.:

1 — мястэчкі; *2* — значныя сёлы; *3* — сучасныя межы Горацкага раёна; *4* — межы ваяводстваў Рэчы Паспалітай; *5* — межы маёнткаў; *6* — цэнтры маёнткаў. Лічбамі на карце абазначаны: 1 — тэрыторыі, якія належаць Шклоўскаму графству; 2 — Копыскае графства; 3 — часткі тэрыторыі Магілёўскай эканоміі. *Карту склаў В. Насевіч.*

У Шклоўскім графстве валочная памера адбылася ў 1614 г. Яго ўладальнік граф Аляксандр Хадкевіч абраў прыгонную форму гаспадарання. Быў заснаваны цэлы шэраг фальваркаў. З іх землі Басейскай воласці, што ахоплівала і частку Горацкага раёна, адносіліся да фальварка Сарціслаў. У сярэдзіне XVII ст. гэтая воласць падзялілася на Сасноўскае, Кішчыцкае і Сарціслаўскае войтаўствы. У апошнім з іх у 1650 г. упамінаюцца сёлы Гулідаўка, Ходараўка, Аўсянка, Крыўцы, Шэды, Любіж. Іншую частку колішняй Басейскай воласці займала Казловіцкае войтаўства, у якім тады ж існавалі

сёлы Хамінічы, Маслакі, Грывец і Паўна[21].

Паміж гэтымі двума абшарамі Шклоўскага графства ўкліноваўся кавалак Басейскай воласці, які належаў Льву Сапегу, а затым яго нашчадкам. Там знаходзіліся сёлы Сялец, Палёнка, Асіповічы, Анікавічы. Два паселішчы са складу гэтай воласці, а менавіта Міхайлавічы і Бася, былі падараваны кімсьці з Сапегаў Аршанскаму базыліянскаму кляштару і з таго часу заставаліся яго ўласнасцю да канца існавання ВКЛ.

Захаваліся і інвентары маёнтка Раманава за 1647 і 1648 гг., калі ён належаў унуку Крыштафа Пяруна Багуславу Радзівілу[22]. У мястэчку Раманава тады было 44 пляцы, колькасць мяшчанскіх двароў на якіх адзін інвентар вызначае ў 56, а другі — у 74. У маёнтку было 27 вёсак, з якіх частка сёння знаходзіцца ў Дубровенскім раёне. Буйнейшымі былі Стараселле (27 валок, 52 двары), Чашнікі (22 валокі, 53 двары), Сысоева (20 валок, 40 двароў), Трыгубы (16 валок, 40 двароў), Старына (15 валок, 37 двароў).

Характэрнай асаблівасцю гісторыі Горацкага раёна ў часы ВКЛ і Рэчы Паспалітай было тое, што практычна ўся яго тэрыторыя ўваходзіла ў склад некалькіх буйнейшых магнацкіх латыфундый у дзяржаве. Тут зусім не было дробных шляхецкіх маёнткаў, сфармаваліся толькі неабсяжныя ўладанні самых славутых родаў: Сапегаў, Хадкевічаў, Радзівілаў. Пры гэтым такія буйныя маёнткі, як Горы-Горкі і Раманава, былі толькі часткамі вялізных маёнткавых комплексаў, раскіданых па ўсёй Беларусі і Літве.

Каля сярэдзіны XVII ст. гэтыя комплексы адзін за адным змянілі сваіх уладальнікаў. У Аляксандра Хадкевіча, які валодаў Шклоўскім графствам, засталася толькі дачка Ефрасіння Ганна, якая была жонкай польскага пана Пракопа Сеняўскага і памерла ў маладым узросце. Шклоў пасля гэтага заставаўся ў руках удавы Аляксандра Хадкевіча, а затым перайшоў у спадчыну да сына Ефрасінні Ганны, пасля чаго некалькі дзесяцігоддзяў быў уласнасцю роду Сеняўскіх (схемы *8, 9*).

Пасля Льва Сапегі засталіся тры сыны, але ўсе яны не пакінулі нашчадкаў. Апошні з іх, Казімір Леан, паміраючы ў 1656 г., завяшчаў свае шматлікія вотчыны блізкім і далёкім родзічам[23]. У прыватнасці, Басейская воласць у ліку іншых маёнткаў дасталася яго стрыечнай пляменніцы Ганне, удаве Станіслава Нарушэвіча, а Горы-Горацкае графства — стрыечнай сястры Зоф'і, удаве князя Канстантыя Палубінскага (схема *4*).

Біржайская галіна Радзівілаў, якой належала Раманава, спынілася па мужчынскай лініі ў 1669 г. са смерцю Багуслава. Яго спадчына дасталася дачцэ Людвіцы Караліне, якая паслядоўна была жонкай двух нямецкіх магнатаў (схема *6*). Значна пазней іншая, нясвіжская галіна Радзівілаў набыла ад удаўца Людвікі Караліны князя Нейбургскага ўсе яе вотчыны, у тым ліку і Раманава.

У сярэдзіне XVII ст. тэрыторыя раёна зноў зведала спусташэнне падчас жорсткай вайны паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай. Ужо напачатку вайны, летам 1654 г., маскоўскія войскі занялі Горскі замак, гарнізон якога здаўся без бою. Спачатку насельніцтва даволі прыязна сустрэла войска расійскага цара, які абвясціў сябе абаронцам праваслаўных ад каталіцкага засілля. Хутка, аднак, стала відавочна, што маскоўцы вядуць сябе як звычайныя захопнікі, якіх цікавіць толькі нажыва. Шмат народу яны захапілі ў палон, каб пазней прадаць ці ператварыць у халопаў. Нямала горскіх мяшчан было пераселена ў Маскву.

Ужо ў канцы 1655 г. з'яўляюцца ўпамінанні пра дзеянні партызан у ваколіцах Гор. Асабліва моцная ўспышка антымаскоўскага руху адбылася ў сакавіку 1659 г., калі з суседняга Мсціслаўскага павета зайшоў казацка-сялянскі атрад палкоўніка Івана Рыдара. Гэ-

ты атрад нават учыніў аблогу Горскага замка і толькі пасля падыходу новых расійскіх войскаў адышоў назад да Мсціслава, папаўняючы ў навакольных вёсках запасы правіянту[24].

У жніўні — верасні наступнага 1660 г. асноўнае войска ВКЛ, паступова вяртаючы страчаныя тэрыторыі, заняло Шклоў і Копысь. У кастрычніку крыху на поўдзень ад Горацкага раёна на рацэ Басі адбылася вялікая бітва беларускалітоўскага войска з маскоўцамі. Аднак гэтае наступленне не прывяло да поўнага вызвалення тэрыторыі раёна. Яна апынулася як бы ў прамежкавай зоне, на якую перыядычна заходзілі вайсковыя аддзелы абодвух бакоў. Толькі ў 1665 г. было дасягнута трывалае замірэнне. Мяжа ВКЛ з Расіяй была адноўлена ў тым выглядзе, у якім яна існавала з 1522 г. — па ўсходняй мяжы сучаснага раёна.

Нягледзячы на ваеннае спусташэнне, Горы-Горацкае графства заставалася адным са значнейшых маёнткаў у краіне. У другой палове XVII ст., калі яно належала князям Палубінскім, колькасць сялянскіх двароў у ім вагалася паміж 1500 і 1700, а колькасць падданых, напэўна, — вакол лічбы ў 10 тысяч.

У 1683 і 1685 гг. адзін за адным у прыкладна трыццацігадовым узросце памерлі два браты Палубінскія, якім належала Горы-Горацкае графства. У іх засталіся дзве сястры, з якіх старэйшая, Ганна Марцыяна, была жонкай Дамініка Мікалая Радзівіла (з клецкай галіны гэтага роду), а малодшая, Ізабела, не дасягнула яшчэ паўналецця. Маёнтак Горы-Горкі стаў яе шлюбным пасагам. У 1686 г. яна выйшла замуж за пана Ежы Станіслава Сапегу, аддаленага родзіча колішніх уласнікаў Гор і Горак, сына віленскага ваяводы Казіміра Яна Сапегі (схема 7).

Свёкар Ізабелы Палубінскай у канцы XVII ст. быў бадай што найбольш уплывовай асобай у ВКЛ. Аднак яго прага да ўсеўладдзя парадзіла яму шмат ворагаў. Ва ўмовах шляхецкай анархіі, якая набірала тады моц у Рэчы Паспалітай, гэта прывяло да сапраўднай грамадзянскай вайны паміж кланам Сапегаў і іх праціўнікамі. Пацярпеўшы паражэнне ў гэтай барацьбе, Казімір Ян Сапега разам са сваімі родзічамі перайшоў у 1704 г. на бок шведскага караля Карла XII і прыняў актыўны ўдзел у Паўночнай вайне. Хаця гэтая вайна вялася галоўным чынам паміж Расіяй і Швецыяй, асноўныя баявыя дзеянні адбываліся на зямлі Рэчы Паспалітай.

У ваеннай калаверці Казімір Ян Сапега і яго сын Ежы Станіслаў, які па жонцы валодаў Горы-Горацкім графствам, страцілі кантроль над сваімі маёнткамі. Горы-Горкі, як і суседняе Дубровенскае графства Казіміра Яна, спачатку захапіў адзін з правадыроў антысапегаўскай кааліцыі Людвіг Пацей, а затым набліжаны расійскага цара Пятра I князь Аляксандр Меншыкаў. Хаця Сапегі ў канцы Паўночнай вайны паладзілі з каралём Рэчы Паспалітай Аўгустам і атрымалі палітычную амністыю, іх фінансавае становішча было моцна падарвана. Князь Меншыкаў у 1717 г. прапанаваў ім вялікую грашовую суму адступнога за Горы-Горкі, якая, аднак, не была цалкам выплачана[25].

У такіх умовах свае прэтэнзіі да маёнтка выставілі пляменнікі Ізабелы Палубінскай, прадстаўнікі клецкай галіны Радзівілаў, якія па жаночай лініі былі прамымі нашчадкамі папярэдніх уласнікаў. Пасля апалы, якая напаткала ў Расіі Меншыкава, ім удалося на пэўны час завалодаць Горы-Горацкім графствам[26], хаця сын Ежы Станіслава Сапегі Антоні Казімір і спрабаваў адсудзіць спадчыну сваёй маці.

У выніку досыць заблытаных акалічнасцяў спрэчны маёнтак быў зноў прададзены. Яго набыў каля 1740 г. віцебскі ваявода Ян Міхал Салагуб, пасля смерці якога ў 1748 г. маёнтак быў падзелены на дзве часткі (маёнткі Горкі і Горы) паміж яго сынамі.

Тым часам род паноў Сеняўскіх, ула-

дальнікаў Шклоўскага графства, таксама згас па мужчынскай лініі. Адзінай спадчынніцай засталася Марыя Соф'я Сеняўская, якая была жонкай Станіслава Дэнгофа. Хутка аўдавеўшы, яна выйшла замуж за князя Аўгуста Аляксандра Чартарыйскага, ва ўладанні якога маёнтак і застаўся да першага падзелу Рэчы Паспалітай у 1772 г., калі тэрыторыя раёна адышла да Расійскай імперыі.

Праз кароткі час, у самым канцы 1777 г., князі Чартарыйскія прадалі Шклоўскае графства аднаму з фаварытаў Кацярыны II, выхадцу з Сербіі Сямёну Зорычу. Пасля яго смерці ў 1799 г. абцяжараны вялізнымі даўгамі маёнтак адышоў да яго брата Давыда Няранчыча Зорыча, затым да пляменніка Сямёна Чарнаевіча. Пасля смерці апошняга ў 1813 г. Шклоўскае графства перайшло за даўгі да дваранскага апякунскага савета[27], а ў 1821 г., пасля смерці ўдавы Чарнаевіча, было распрададзена па кавалках. Пры гэтым адну яго частку (у тым ліку вёску Хамінічы) купіла княгіня Валконская, вёскі Маслакі, Лямцы і Шапялёўку — пан М. І. Цуката, абшар з вёскамі Шэды, Крыўцы, Ходараўка, Гулідаўка, Любіж — Д. А. Лелякоўскі[28].

З пераходам пад уладу Расіі ў 1772 г. пачаўся новы этап у гісторыі сённяшняга Горацкага раёна. На новадалучаных да Расіі землях былі зменены адміністрацыйныя межы. Тэрыторыя раёна, якая раней цалкам уваходзіла ва ўтвораны ў 1565 г. Аршанскі павет Віцебскага ваяводства, апынулася падзеленай паміж чатырма паветамі новаўтворанага Магілёўскага намесніцтва Расійскай імперыі. Як вынікае з картаў генеральнага межавання Магілёўскага намесніцтва за 1785 г. і тлумачэнняў да іх[29], радзівілаўскі маёнтак Раманава, больш дробны маёнтак Гарадзец на самай мяжы са Смаленшчынай, які тады належаў графу Пацею, а таксама большая частка маёнтка Горкі Юзафа Салагуба ўвайшлі ў Аршанскі павет. Асноўная частка маёнтка Горы Юрыя Салагуба і паўднёвая частка маёнтка Горкі адышлі да Чавускага павета, а самы паўднёва-ўсходні куток раёна (сучасны Копцеўскі сельсавет) — да Мсціслаўскага. Вузкая паласа Горацкага маёнтка з сялом Тушавая, усе землі Шклоўскага графства і маёнтка Сялец (ён тады належаў Міхаілу Лабкоўскаму), а таксама фальварак Міхайлавічы з засценкам Бася (уладанне аршанскіх базыліянаў) былі ўключаны ў Копыскі павет. Калі не ўлічваць часовыя змены ў час панавання імператара Паўла, гэты адміністрацыйны падзел захаваўся ў далейшым да сярэдзіны XIX ст.

[1] Алексеев Л. В. Смоленская зямля в IX — XIII вв. М., 1980.

[2] Бектинеев Ш. И., Левко О. Н. Средневековые Горы // Сярэдневяковыя старажытнасці Беларусі. Мн., 1993. С. 8—19.

[3] Мяцельскі А. А. Некаторыя пытанні гістарычнай геаграфіі Смаленскай зямлі XII — XIII стст. // Гістарычна-археалагічны зборнік памяці Міхася Ткачова. Ч. 2. Мн., 1993. С. 60—77.

[4] Насевіч В. Л. Род князёў Друцкіх у гісторыі Вялікага княства Літоўскага (XIV — XVI ст.) // Старонкі гісторыі Беларусі. Мн., 1992. С. 80—104.

[5] Wolff J. Kniaziowie litewsko-ruscy od końca czternastego wieku. Warszawa, 1895.

[6] Акты, относящиеся к истории Западной России. Т. 1. Спб., 1846. С. 168—170.

[7] Wolff J. Kniaziowie ... S. 137—138; Аддзел рукапісаў бібліятэкі Акадэміі навук Літвы, ф. 1, спр. 164, л. 1.

[8] Archivum książąt Sangushków w Sławucie. T. 4. Lwów, 1890. S. 395; Wolff J. Kniaziowie ... S. 537—540.

[9] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, ф. КМФ-18, воп. 1, спр. 248, л. 60.

[10] Там жа, л. 61.

[11] Там жа, спр. 247, л. 1004.

[12] Wolff J. Kniaziowie ... S. 151—153, 672—673; Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, ф. КМФ-18, воп. 1, спр. 27, л. 27; Там жа, спр. 229, л. 214; спр. 235, л. 1.

[13] Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў (далей РДГА). ф. 1526, воп. 1, спр. 1024, л. 6.

[14] Wolff J. Kniaziowie ... S. 98—106, 347—356.

[15] Sapiehowie, materyały historyczno-genealogiczne i majątkowie. T. I. Petersburg, 1890. S. 154.

[16] Там жа, s. 144.

[17] Ткачоў М. А. Замкі і людзі. Мн., 1991. С. 103.

[18] Аддзел рукапісаў бібліятэкі Віленскага дзяржаўнага універсітэта, спр. F4-36926 (А-4045).

[19] Там жа, спр. F4-34354 (А-1795).

[20] Там жа, спр. F4-34352 (А-1793).

[21] Topolska M. Dobra Szkłowskie na Białorusi Wschodniej w XVII i XVIII wieku. Warszawa, 1969.
[22] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, ф. КМФ-5, воп. 1, спр. 3550, 3551.
[23] Sapiehowie ... T. 2. Petersburg, 1891. S. 245—260.
[24] Сагановіч Г. Невядомая вайна. Мн., 1995. С. 77, 81; Ткачоў М. А. Замкі і людзі. С. 105.
[25] Троицкий С. М. Хозяйство крупного сановника России в первой четверти XVIII в. (по архиву князя А. Д. Меншикова) // Россия в период реформ Петра I. М., 1973. С. 215—248; Sapiehowie ... T. 3. Petersburg, 1894.
[26] Дзяржаўны гістарычны архіў Літвы. Ф. 1177, воп. 1, спр. 3381, 3382.
[27] РДГА, ф. 1526, воп. 1, спр. 1024, л. 8, 19 адв.
[28] Там жа. Спр. 1087, л. 371, 410, 413, 457.
[29] Там жа. ф. 1350, воп. 312, спр. 16, 94, 95.

В. Насевіч.

ГЕНЕАЛАГІЧНЫЯ СХЕМЫ ЎЛАДАЛЬНІКАЎ МАЁНТКАЎ НА ТЭРЫТОРЫІ ГОРАЦКАГА РАЁНА Ў XV — XVIII ст.

Склаў В. А. Насевіч

У схемах адлюстраваны радавыя адносіны паміж асобамі, якія валодалі найбольш значнымі маёнткамі на тэрыторыі Горацкага раёна: Горацкай воласцю, Басейскай воласцю (апошняя пазней падзялілася на драбнейшыя маёнткі — Хамінічы, Сялец і інш.) і Раманавам. Усе гэтыя воласці першапачаткова былі, верагодна, дзяржаўнай уласнасцю і былі пажалаваны князям Івану Друцкаму-Пуцяце і Юрыю Гальшанскаму ў першай палове XV ст. У далейшым яны пераходзілі ў спадчыну да іх нашчадкаў мужчынскага полу, а пры іх адсутнасці — і да жанчын. На схемах прыводзяцца не поўныя радаводы феадальных родаў, а толькі асобы, непасрэдна звязаныя з гісторыяй Горацкага раёна.



Схема 1.
Радавод князёў Друцкіх-Талачынскіх — уладальнікаў часткі Гор, Шышава і Басеі ў XV—XVI ст.



Схема 2.
Радавод князёў Друцкіх-Горскіх — уладальнікаў часткі Гор у канцы XV — пачатку XVII ст.



Схема 3.
Радаводы Гарнастаяў і Падбярэзскіх — уладальнікаў часткі Басеі і Гор у XVI ст.

Схема 4. Радаводы Сапегаў і Нарушэвічаў — уладальнікаў Гор-Горак і Сяльца ў XVII ст.





Схема 5.
Радаводы князёў Гальшанскіх і Астрожскіх — уладальнікаў Раманава (разам з Копыссю і інш. маёнткамі) у XV—XVI ст.



Схема 6.
Радаводы дзвюх галін Радзівілаў (біржайска-слуцкай і нясвіжскай), якія паслядоўна валодалі Раманавам разам з іншай спадчынай князёў Гальшанскіх у XVII — пачатку XIX ст.



Схема 7. Радаводы князёў Палубінскіх, клецкай галіны Радзівілаў і Сапегаў — уладальнікаў спадчыннага права на Горы-Горкі ў II палове XVII—XVIII ст.

Схема 8. Радавод Хадкевічаў — уладальнікаў Басейскай воласці ў складзе Шклоўскага графства ў II палове XVI — пач. XVII ст.



Схема 9. Радаводы Сеняўскіх і князёў Чартарыйскіх — уладальнікаў Шклоўскага графства ў XVII—XVIII ст.



У выпадках, калі яны пакідалі нашчадкаў, якія ўжо не мелі маёнткаў на гэтай тэрыторыі, працяг такіх родаў абазначаны стрэлкай.

У схемах ужыты скарачэнні: гл. — глядзі; ж. — жонка; кн. — князь, княгіня; м. — муж; пам. — памёр; р. — раней.

У выпадках, калі гады нараджэння ці смерці прыблізныя, яны пазначаны пытальнікам.

Дакументы сведчаць

ГРАМАТА ІМПЕРАТРЫЦЫ ГАННЫ ІААНАЎНЫ ПАДСТОЛІЮ МІХАІЛУ ПАТОЦКАМУ НА ВАЛОДАННЕ МАЁНТКАМІ ГОРЫ-ГОРКІ І ІНШЫМІ

5 студзеня 1732 г.

Божию поспешествующего милостию Мы Анна, императрица и самодержица Всероссийская, Московская, Киевская, Владимерская, Новгородская... Объявляем и ведомо чиним сею нашею грамотою и дипломом всим, которым ныне и впредь о том ведать надлежит, понеже мы к благородному графу Михаилу Антонию Потоцкому — великого княжества Литовского подстолию, нашего ордена святого Андрея кавалеру, особливую милость и благоволение имеем и для оказательства оной милости мы намерены лежащия в помянутом великом княжестве Литовском маетности, а именно: в Белой России, в Оршанском дискрикте, графство Горы-Горки, в воеводстве Полоцком маетности Улу, Поль-Езерье, да Галю, и в воеводстве Мстиславском маетность Краснополе, которыя чрез бывшаго князя Александра Меньшикова у вольной нации законным образом купленны и по силе прав речи посполитой Польской конфирмованы, а в городе Могилеве юрисдикция по Магдебурским правам за означенную в декрете сумму признана, но по бывшем князе Меньшикове оныя маетности в наше владение пришли, пожаловать ему благородному графу Михаилу Антонию Потоцкому вечным и никогда неотменяемым правом, яко же мы ныне чрез сию нашу грамоту и диплом жалуем, отдаем и даруем со всими поданными

жилыми и нежилыми, со обретающимися ныне на лицо или збеглыми издревле, с женами, детьми и со всеми их сродники, с дачею скота, с платежем денежного оброку, со всеми пахотными и к тем маетностям принадлежащими посеянными и пустыми полями, садами, сенокосами, реками, ручаями, мельницами, корчмами, лесами, прудами, с рыбною ловлей и звериною и всеми угодии, так как сии маетности в своих межах и околичностях изстари состояли. Мы же оных маетностей ленное право, власть в отказе, описи, межевые книги, декреты и прочия письма, которыя бывший князь Меньшиков получил, без всякого себя предоставленья выдать повелеваем и кгде бы не сыскал их какия доказательства, хотя в России или инде, на то ему господину графу в приисканное позоволение (sic) даем, не оставляя ни себе, ни всепросветлейшим наследникам нашим никакого протесту таким образом, штоб никто, под каким бы видим оное ни было, помянутого господина графа Михаила Антония Потоцкого в его владеньи беспокойствовать не мог. А ежели на тых маетностях явятся какие долги, которые еще прежде бывшаго князя Меньшикова покупки учинилися, то господам кредиторам оныя не на господине графе Потоцком, но на прежних помещиках, которые тыми маетностями до того времени владели, взыскивать и тако помянутому благородному графу Михаилу Антонию Потоцкому — великаго княжества Литовского подстолию, сего числа власть и вольность дается, сии от нас законним образом ему пожалованные милости, а именно графство Горы-Горки, маетности Улу, Поль-Езерье, Гале и Краснополе и Могилевскую юриздикцию содержать, в доходах с них по своему произволению располагать и оныя раздавать, подарить и продать, или своим правом уступать, кому он похочет, еже мы для вяшьчаго уверенья сею нашею грамотою и дипломом за собственноручным подписаньем и приложением печати потверждаем. Дан в Москве, Генвара пятого дня тысяча семьсот тридесять второго году.

Акты, издаваемые Виленской археологической комиссией. Т. XIII. Вильно, 1886, стр. 149—150.

«Фортеция Горская»

Гісторыя Горскага замка сваімі каранямі ўводзіць далёка ў глыб стагоддзяў, у тыя часы, калі яшчэ не існавала пісьменнасць і толькі археалагічныя знаходкі даюць магчымасць даведацца, як на месцы старажытнага гарадзішча з цягам часу падняўся замак.

Гарадзішча «Курганы», якое датуецца раннім жалезным векам, знаходзіцца ля сутокі р. Быстрая і Карчаваха, на высокім выступе берагавога плато. Гэта гарадзішча мысавага тыпу, знойдзеныя на ім кавалкі ляпнога посуду гавораць аб тым, што людзі тут жылі ў III ст. да н. э.— V ст. н. э.

Першапачаткова гарадзішча мела выцягнутую авальную форму па лініі ўсход-захад і дасягала памераў каля 180×70 м (болей за 1,2 га). Вышыня пляцоўкі над далінай ракі перавышала 10 м.

У старажытнасці па краі гарадзішча ішоў земляны вал, адрэзак якога вышынёю каля 3 м цяпер захаваўся толькі з усходняга боку. Невялікі адрэзак вала праглядаецца таксама ў паўднёвай частцы гарадзішча. На астатняй тэрыторыі вал знівілірaваны ці абваліўся.

Уезд на гарадзішча знаходзіўся ў яго ўсходняй частцы, ішоў па вузкім дамбападобным насыпу. Перад колішняй брамай і гэтым насыпам быў роў шырынёю 6—7 м. У цэнтральнай частцы пляцоўкі, бліжэй да яе паўночнага краю, захавалася невялікае ўзвышэнне, дыяметрам каля 8 м і вышынёю 0,8 м. Падобныя планавыя кампазіцыі знойдзены ў Тураве, Камянцы, Пінску і іншых месцах, яны даюць магчымасць зрабіць выснову, што гэта ўзвышэнне з'яўляецца старажытнай назіральнай вежай, якая разам з іншымі драўлянымі пачатковымі збудаваннямі магла абараняць паселішча ў хвіліны небяспекі, адтуль таксама вялося назіранне за мясцовасцю вакол гарадзішча. Падобныя вежы з'яўляюцца характэрнымі для гарадоў і феадальных замкаў на тэрыторыі Беларусі і іншых суседніх земляў.

Вынікі раскопак, праведзеных аўтарамі, даюць падставы меркаваць аб існаванні тут паселішча гарадскога тыпу, якое ўзнікла ўжо ў XII ст. На карысць гэтага сведчаць і археалагічныя матэрыялы, і плошча ўмацаванага паселішча.

У час вывучэння гарадзішча быў атрыманы цікавы матэрыял, які дазваляе нам сцвярджаць аб развіцці разнастайнага рамяства на гарадзішчы. Жыццё чалавека ў тыя далёкія часы ў значнай меры залежала ад умення апрацоўваць металы, з якіх выраблялiся прылады працы. Матэрыялы сведчаць, што жыхары гарадзішча займаліся

Знешні выгляд гарадзішча ў в. Горы.

металаапрацоўкай — знойдзены гліняныя соплы ад горнаў, у якіх выплаўлялася з руды жалеза.

Мясцовыя рамеснікі выраблялі розныя прадметы, якія былі знойдзены ў час раскопак. Сярод іх шматлікія нажы, крэсівы, ключы ад замкоў і замкі. Знойдзены жалезная патэльня, пяшня, якая выкарыстоўвалася для прабіцця лёду, фрагмент касы, сярпа. Цесляры карысталіся сякерамі і стругамі. Шматлікія знаходкі даспехаў воіна — наканечнікі стрэлаў і дзідаў, шпоры, касцяныя абкладкі складанага лука і арнаментаваныя абкладкі калчана для стрэлаў, цуглі, спражкі. Усе гэтыя рэчы датуюцца XII — XIV ст.

Сярод знаходак шматлікія вырабы з косці — грабяні, арнаментаваныя пласціны, праколкі і «жужалкі» — дзіцячыя цацкі. Аб мясцовым занятку касцярэзным рамяством сведчаць знаходкі загатовак і апрацаваных касцей.

Кераміка прадстаўлена абломкамі ганчарнага посуду XII — XIV ст. Па сваёй форме яна тыповая для посуду, які выраблялася ў гэты час на тэрыторыі сучаснай Усходняй Беларусі. Мясцовую вытворчасць посуду пацвярджаюць шматлікія знаходкі бракаванай керамікі.

Розныя знаходкі сведчаць аб трывалых гандлёвых сувязях гарадзішча з іншымі раёнамі Кіеўскай Русі і болей далёкімі краінамі. Гэта перш за ўсё шаля ад вагаў — абавязковая рэч для гандляра, знойдзеная на гарадзішчы, і срэбны злітак вагой 92,64 г., знойдзены ў Горах у 1885 г. Такія грашовыя зліткі бытавалі ў Вялікім княстве Літоўскім у XIV ст.

Шыферныя праселкі XII — першай паловы XIII ст. выраблялiся і ўвозіліся ў паўночныя княствы з Оўруча (сучасная Украіна). Шкляныя бранзалеты траплялі ў Горы з Кіева, Смаленска і Полацка. Сувязі з іншымі землямі пацвярджаюць знаходкі візантыйскіх пацерак, знаходка «кудравага» скроневага кольца, якое характэрна для Падунаўя. Аб занятках мясцовага насельніцтва гандлёвай дзейнасцю сведчаць металічныя вырабы.

Сярод знаходак з гарадзішча ёсць рэчы рэлігійнага культу. Гэта фрагмент меднага трохстворкага абразка XIV ст., медны крыж XV ст. з выявамі святых. У 1990 г. была знойдзена унікальная рэч — каменны абразок з надпісамі. Абразок вытачаны з мяккага пясчаніка і мае памеры 6×5 см. На правай паверхні выразаны крыж, з бакоў якога чытаюцца літары «ІС» — Ісус, «Х — Хрыстос». Унізе падзеленае крыжам «ІКА» — Пераможца. З ніжняга боку абразка ёсць яшчэ моцна пашкоджаны надпіс з трох радкоў. У першым радку чытаецца напісанае скарочана «Госпадзі», далей надпіс пашкоджаны. Ад другога радка захаваліся толькі асобныя, не звязаныя паміж сабой, літары. Трэці радок чытаецца поўнасцю — «напісаўшаму». Поўнасцю гэты надпіс, відаць, меў такі выгляд: «Госпадзі,



Каменны абразок з надпісам, які быў знойдзены на гарадзішчы ў в. Горы.

помозі рабу сваему се напісаўшему». Па асаблівасцях напісання літар абразок датуецца рубяжом XII — XIII ст. Каб абразок меў больш прыемны выгляд, старажытны майстар пафарбаваў яго чырвонай вохрай з дамешкай кінавары.

Гарадзішча каля в. Горы ў XII — XIII ст., безумоўна, было цэнтрам акругі і з'яўлялася буйным замкам Смаленскай зямлі, на падставе якога пачынаў расці горад. Але, як паказалі даследаванні, недзе ў канцы XIII — пачатку XIV ст. рост гэтага цэнтра спыніўся, хаця жыццё на гарадзішчы працягвалася і ў XV — XVI ст. Пісьмовых сведчанняў аб Горах XV — XVI ст. крайне мала.

У канцы XVI ст. уладальнікам Гор стаў Леў Сапега. Пры ім стары замак быў пакінуты, а яго пляцоўку ператварылі ў могілкі. Але на суседняй, больш высокай гары заклалі новы замак з бастыённымі ўмацаваннямі галандскага тыпу. Пад абаронай яго выросла мястэчка, а затым і «места» — горад Горы Вялікія, якое ў 1619 г. атрымала ад Сапегі вялікія прывілеі, запісаныя ў «Уставе».

Новы Горскі замак размясціўся на гары, ля падножжа якой з усходу і поўначы працякала р. Карчаваха. Вышыня валоў над далінай ракі і сёння перавышае 20 метраў. Замак бараніўся 7 бастыёнамі, злучанымі паміж сабою валамі-курцінамі рознай даўжыні і вышыні. Паўднёва-ўсходні бок замка, звернуты да «места» і ім прыкрытага, меў больш слабы вал (вышынёю да 3 м і шырынёю да 8 м). Гэта курціна, звернутая да горада, пры даўжыні больш за 210 м не мела ні аднаго прамежкавага бастыёна. Бастыёны размешчаны толькі па яе канцах. Перад валам, аддзяляючы замак ад «места», ляжаў абарончы роў шырынёю да 15 м і глыбінёю 8—10 м. Праход да курціны, зроблены прыблізна па яе сярэдзіне, ішоў па дамбе.

Старажытны і адзіны ўваход у замак размяшчаўся з паўночнага боку. Відаць, як гэта было ва ўсіх бастыённых замках, у Горах мелася для гэтай мэты спецыяльная 2-ярусная вежа-брама, убудаваная ў тоўшчу земляного вала.

Аналіз планавай кампазіцыі Горскага бастыённага замка паказвае, што гэты старажытны ўваход знаходзіўся пад абаронаю двух бастыёнаў, з якіх фланкіравалі перакрыжаваным агнём усе подступы да яго. Заходні напольны ўчастак замкавых умацаванняў адрозніваецца канцэнтраванай магутнасцю і прадуманасцю агню з бастыёнаў і курцінаў.

Усходні ўчастак абароны замка адрозніваецца памерамі бастыёнаў і магутнасцю абарончага рова. Апошні пры шырыні 15 м дасягае тут 12 м глыбіні. Вуглавы паўднёва-ўсходні бастыён, акрамя таго, меў дадатковы ніжні бастыён, што значна ўзмацняла ўсходні сектар абароны замка.

Агульны перыметр абароны ўмацаванняў Горскага замка крыху пераважаў 800 м. Нягледзячы на тое, што галандская бастыённая сістэма не прадугледжвае наяўнасці на бастыёнах вежаў, на валах высокіх сцен, такія на пачатку існавання новага замка, напэўна, меліся. Асобныя даследчыкі прама гавораць аб існаванні «драўлянага замка з 7 вежамі».

З архіўных звестак аб новым Горскім замку захавалася «Ревизия в замку Горском в цекгавзе армате», зробленая «року 1617 месяца мая 13 дня» слугою ваяводы Віленскага і гетмана Вялікага княства Літоўскага Льва Сапегі Кандратам Давыдовічам і прадстаўленая Горскаму гараднічаму Фёдару Дабрасельскаму. З гэтага дакумента відаць, што ў замку мелася наступная зброя і амуніцыя: «дел польных спижовых два, штурмаков железных двадцать девять, гаковниц двадцать

пять, шостая зорвана, на колках гаковниц тры, мушкетов «кобыл» семдесят, мнейших мушкетов шестьдесят семь а осьм зорваныя, шабель гайдуцких девятьдесть и одна... емалей девятьдесть и одна, барва каразиева гайдуцкая лазуровая чырвоным киром спереду подшыта, жупанов девятьдесть и девет, а дылей девятдесть, десятницких дылей чырвоных девять, дарду (коп'ё) новых десять, при них прапорце шаховане, дердов старых без древок пять, бубен пехотный, а другие бубны гусарские, хоругвов казацкая жолтые китайки, крыж чырвоны, звон новы, бердышев шесть, пил тартиевых чотыры».

Хаця ў замку, як гэта вынікае з дакумента, мелася ўсяго дзве медныя гарматы, аднак пералічаная агнястрэльная зброя была найноўшай для свайго часу і прызначалася яўна на абарону. Так, «штурмакі» стралялі галоўным чынам шротам або сечаным жалезам і лічыліся галоўнай зброяй супраць штурмуючага праціўніка. Гакаўніцы казацкія лёгкія і гакаўніцы цяжкія на колах выкарыстоўваліся для знішчэння праціўніка на далёкай адлегласці. Яшчэ больш грознай зброяй былі мушкеты, якія з'явіліся на ўзбраенні ў 1601 г. Яны па калібры былі буйнейшыя за гакаўніцы, мелі большыя зарад і дальнасць стральбы. Зараджаныя шротам або сечаным жалезам, яны наносілі нападаўшаму праціўніку вялікія страты. Маючы значную вагу, вялікія мушкеты («кобылы») стралялі са спецыяльных падставак-фаркетаў.

Колькасць агнястрэльнай зброі ў Горскім замку (без гарматаў) была такая, што ў выпадку аблогі на земляных умацаваннях стралкі размяшчаліся праз кожныя 4 м. Шчыльнасць агню для таго часу была даволі значная.

Паводле «Рэвізіі...» насельніцтва Гор Вялікіх, разбітае на «дзесяткі», абавязвалася абараняць пэўны ўчастак абароны, а значыць, яго даглядаць і рамантаваць. Больш таго, мяшчанскія і сялянскія фарміраванні нярэдка мабілізоўваліся для ўдзелу ў вайне. Так здарылася, напрыклад, у 1614 г., калі для бою пад Кадзінам (памежжа са Смаленшчынай) чакалася прыбыццё пяхоты — «горян мужыков с пищальми 150 человек».

Згодна звестак 1621 г., Горы Вялікія былі паселішчам у 172 «пляца», з «которых 46 было пустых». Сярод гараджан частка была занята на «послузе замковой»: замкавыя гайдукі, слесар, цесля і іншыя. Да сярэдзіны XVII ст. у горадзе значна павялічылася колькасць жыхароў. У 1683 г. дакументы згадваюць уласна гарадскую лінію ўмацаванняў — «паркан». Вельмі верагодна, што ён існаваў значна раней, да 1654 г. Земляныя ўмацаванні пасада захаваліся з паўднёвай часткі замчышча. Яны ахопліваюць плошчу 190×150 м. Пасад быў умацаваны валам вышынёю 1,5—2,5 м і шырынёю 4 м, які цягнуўся ад р. Карчавахі да р. Быстрай.

У 1663 г. «фортеция Горская» згадваецца, як вельмі разбураная, але ў дакументах 80-х гадоў XVII ст. ужо згадваецца замак і гарадскі астрог. Сярод розных павіннасцяў мясцовыя жыхары абавязаны былі выконваць работы па рамонту ўмацаванняў і прымаць удзел у «абароне той маентнасці».

Пазней замак страціў сваё ваеннае значэнне.

М. Ткачоў, А. Мяцельскі.

Горкі ў старажытнасці

Горкі ўпершыню згадваюцца ў «Літоўскай метрыцы» як вёска ў 1544 г. У той час яны ўваходзілі ў склад Аршанскага павета Віцебскага ваяводства Вялікага княства Літоўскага.

Блізкае размяшчэнне да такіх адносна буйных гарадоў, як Смаленск, Магілёў, Орша, дало магчымасць Горкам вырасці ў даволі значны гандлёвы цэнтр. Слава аб гандлёвым значэнні Горак таго часу разыходзілася далёка за межы Аршанскага павета. Аб гэтым сведчыць ліст ад 1565 г. княгіні Масальскай з Друі да княгіні Друцкай-Гарской (жонкі гаспадара Горы-Горацкага маёнтка), у якім яна запрашае іх на вяселле да дачкі і просіць прывезці з Горак каштоўны вэлюм, таму што ў Друі такога вясельнага ўбору для нявесты няма.

У час Лівонскай вайны 1558—83 гг. у 1563 г. Горкі былі заняты рускімі войскамі.

У 1619 г. вялікі канцлер ВКЛ Л. Сапега даў мястэчкам Горкі і Горы «Устав о вольностях» з мэтай іх эканамічнага развіцця

Горкі ў старажытнасці.

і перасялення сюды мяшчан з іншых мясцін. Устаў уяўляў сабой малое магдэбургскае права. У мястэчках дазвалялася праводзіць кірмашы, гандляваць, мелася сваё самакіраванне і суд. На рынку быў абсталяваны асобны свіран, куды купцы і гандляры, якія прыязджалі на кірмаш, маглі здаць свае тавары на захаванне.

У першай палове XVII ст. Горкі згадваюцца ўжо як горад. На пачатку вайны Расіі з Рэччу Паспалітай (1654—67 гг.) Горкі знаходзіліся пад кантролем Беларускага палка пад камандаваннем К. Паклонскага. У 1654 г. яго жыхары перайшлі на бок рускай дзяржавы. У маі — чэрвені 1655 г. атрады паўстанцаў дзейнічалі ў раёне Горак, Гор, Раманава. Звесткі аб тым, што горацкія сяляне і мяшчане запісваліся ў казацкія атрады, ёсць і ў адпісцы палкавога ваяводы Васіля Шарамецьева ў Разрадны прыказ ад 13 чэрвеня 1657 г. Пасля Андрусаўскага перамір'я (1667 г.) Горкі засталіся ў складзе Рэчы Паспалітай.

Як вядома, асабліва пасля зліцця ВКЛ і Польскага каралеўства ў адзіную дзяржаву — Рэч Паспалітую ўзмацніўся працэс акаталічвання народных мас. У процівагу гэтаму ў Горках ствараецца праваслаўнае брацтва, пры якім у 1676 г. пачала дзейнічаць першая ў гісторыі мястэчка школа. Горацкае брацтва і адчыненая ім школа вялі культурна-асветніцкую дзейнасць, змагаліся супраць апалячвання і акаталічвання.

Якім жа быў горад Горкі ў канцы XVII ст.? Паводле інвентара 1683 г. у Горках было 510 дамоў, 2 прадмесці — Зарэчча і Казіміраўская Слабада. У гэты час у горадзе працавалі рамеснікі 28 спецыяльнасцей, сярод іх ткачы, ганчары, ружэйнікі, вінакуры, гандаль праходзіў на трох рынках. Прыязджалі сюды купцы са Смаленска, Мсціслаўля, Магілёва, Шклова, Оршы. У сваю чаргу горацкія купцы, як сведчаць мытныя кнігі Масквы і Смаленска, гандлявалі ў гэтых гарадах сукном, палатном і рыбай. Ёсць звесткі аб тым, што купцы з Горак гандлявалі і ў іншых гарадах Расіі і ВКЛ. У 1695 г. Е. Сапега даў яўрэям горада прывілеі на права будаваць сінагогі і займацца

гандлем. Захаваліся і ўспаміны відавочцаў аб Горках канца XVII ст. Так, напрыклад, стольнік Пятра I П. А. Талсты, які 24 сакавіка 1697 г. прыпыняўся ў Горках на начлег на шляху ў Італію, у сваім дарожным дзённіку запісаў, што ў горадзе больш за тысячу жыхароў, пабудаваны праваслаўная царква, дзве уніяцкія, касцёл і яўрэйскі малітоўны дом. У 1698 г. сакратар аўстрыйскага пасольства У. Корб адзначаў, што горад вельмі доўгі і густа заселены яўрэямі.

У час Паўночнай вайны 1700—21 гг. Горкі апынуліся ў зоне ваенных дзеянняў. (Гэта асобная старонка ў гісторыі горада і яна даволі падрабязна асветлена ў іншых матэрыялах кнігі.) Цікава, што падзеі гэтай вайны засталіся ў назвах некаторых куткоў нашай зямлі. Так, напрыклад, узгорак, дзе была стаўка Пятра I, атрымаў назву Пятрова горка. Другі ўзгорак з той пары завецца гарой Мазепы.

У 1717 г. Горкі і маёнтак набыў князь Меншыкаў і валодаў імі да высылкі ў Сібір у 1727 г., пасля гэтага горад адышоў да царскіх уладанняў. 5 студзеня 1732 г. імператрыца Ганна Іаанаўна аддала Горкі графу М. А. Патоцкаму. У 1745 г. горад і маёнтак зноў атрымалі новага гаспадара. Ім стаў граф Л. Салагуб. 5 кастрычніка 1748 г. ён выдаў грамату жыхарам горада на будаўніцтва новай праваслаўнай Успенскай царквы, настаяцелем якой у 1776 г. быў Г. А. Курганскі, вядомы дзеяч адукацыі на Магілёўшчыне.

Палітычнае становішча Рэчы Паспалітай у другой палове XVIII ст. было вельмі складаным. Гэта скарысталі тры краіны — Прусія, Аўстрыя і Расія ў сваіх мэтах. У 1772 г. яны першы раз падзялілі гэту краіну паміж сабой. Горкі адышлі да Расіі. Пачалася новая старонка ў гісторыі Горак.

У. Ліўшыц.

Пётр I у Горках

У 1700—21 гг. Расія вяла вайну супраць Швецыі за выхад да Балтыйскага мора. Многія баявыя дзеянні ў гэты час праходзілі на тэрыторыі Беларусі.

У пачатку чэрвеня 1708 г. Карл XII выступіў з Радашковічаў у напрамку да Мінска, адтуль пачаў рухацца да Бярэзіны. На поўдзень ад мястэчка Беразіно ў сярэдзіне чэрвеня шведская армія фарсіравала раку.

Руская ж армія пасля адступлення размясцілася ў раёне мястэчка Галоўчын на рацэ Вабіч, дзе яна прыкрывала шляхі на Магілёў, Шклоў, Копысь. Тут у чэрвені і адбыўся бой. Руская армія заняла на рацэ ўсе пераправы і яе войскі расцягнуліся больш чым на 10 км па фронту. На правым флангу палкі Шарамецьева і Меншыкава, на левым — князя Галіцына. Яны былі адрэзаны балотамі ад цэнтра, дзе знаходзіўся са сваімі палкамі Рэпнін. Карл XII выкарыстаў гэта становішча і атакаваў пазіцыі Рэпніна. Рускія аказалі рашучае супраціўленне. Але сілы былі няроўнымі, да таго ж палкі Рэпніна не атрымалі дапамогі і былі вымушаны адступіць да Дняпра. 5 ліпеня рускія палкі пераправіліся цераз раку, а 8 ліпеня шведы ўступілі ў Магілёў.

Бітва пад Галоўчынам была першай пасля Нарвы. Шведы перамаглі, але з вялікімі стратамі. У гэты час Пётр I быў на шляху ў армію. Заначаваў у Горках, дзе амаль у поўным саставе знаходзіўся ганералітэт на чале з Шарамецьевым. Тут ён падрабязна даведаўся аб баі пад Галоўчынам. Рэпнін быў разжалаваны ў радавыя, бо многія яго палкі «прыйшлі ў канфузію», бязладна адступілі, пакінуўшы пушкі, а астатнія ваявалі «казацкім», а не «салдацкім» боем. Праўда, радавым Рэпнін быў нядоўга: у бітве пад Лясной ён паказаў сябе храбрым воінам і зноў атрымаў чын генерала.

Пасля бітвы пад Галоўчынам ініцыятыва ў баявых аперацыях перайшла да рускіх. Цяпер ужо шведы не мелі ніводнага поспеху. Вывучыўшы вопыт Галоўчынскага бою, Пётр складае вядомыя «правілы бітвы», у якіх дэталёва распрацоўвае ўзаемадзеянні розных родаў войск. Вялікае значэнне ён надае дысцыпліне: «Хто месца сваё пакіне або адзін аднаго выдасць і ганебны бег учыніць, то ён будзе пазбаўлены жывата і гонару».

Шведы затрымаліся ў Магілёве да 5 жніўня — чакалі корпус Левенгаўпта. У Шклове на ваенным савеце рускай арміі 6 ліпеня было вырашана адыходзіць да Горак. Шарамецьеў ва ўсіх дэталях распрацаваў парадак забеспячэння адыходу рускай арміі да Горак і мерапрыемствы для затрымання шведаў за Дняпром.

У Горках, Раманаве, Клядневічах, Расне і іншых населеных пунктах было сканцэнтравана 25-тысячнае рускае войска. Для пры-

крыцця ў раёне Горак па лініі Дняпра ад Магілёва да Шклова былі пакінуты атрады конніцы. У раёне Горак будаваліся ўмацаванні, вялася разведка за непрыяцелем, невялікія атрады нападалі на шведскія часці. Штаб-кватэра Пятра I знаходзілася ў Горках. Цар часта бываў у палках, правяраў ахоўныя збудаванні і баявую гатоўнасць войск. У Расне ён агледзеў гвардыю і драгунскія палкі.

Колькі часу прабыў Пётр у Горках? Акадэмік Е. В. Тарле ў кнізе «Паўночная вайна» піша, што Пётр I стаяў у Горках з 13 ліпеня да першых дзён жніўня. Далей ён паведамляе, што ў пачатку жніўня атрымаў сапраўдныя даныя аб прасоўванні варожых сіл да Прапойска. У той жа час, 8 жніўня, было загадана накіроўваць конныя палкі да пагражаемага пункта. Выходзіць, што Пётр быў у Горках яшчэ 8 жніўня і выехаў, відавочна, толькі дзевятага. Пётр наведваўся ў Горкі і некалькі раней, у пачатку ліпеня, калі ехаў у армію. Тут ён начаваў.

Горацкая штаб-кватэра Пятра, магчыма, знаходзілася ў лагеры, які размяшчаўся ў раёне Горацкага гарадзішча, дзе цяпер гарадская паліклініка. Гэта месца і зараз называюць Пятровай горкай.

Вядома, што цар наведаў Горацкую Георгіеўскую царкву ў час паніхіды па загінуўшых. Цяпер на тым месцы стаіць дом пад нумарам 39 па вуліцы Якубоўскага.

І яшчэ раз пабываў Пётр у Горках. Гэта было ў 1711 г., калі ён з жонкай Кацярынай накіроўваўся ў Прускі паход. 11 сакавіка цар адправіў пісьмо Меншыкаву.

А ўпершыню цар наведаўся ў Горкі яшчэ да пачатку Паўночнай вайны, у 1698 г., калі вяртаўся з-за мяжы ў Расію.

Богословский М. М. Пётр I. Материалы для биографии. Т. 1—5. М., 1940. С. 48.

Павленко Н. И. Петр I. М., 1975.

Пушкин А. С. История Петра. Сб. твораў. Т. 9. М., 1958.

Тарле Е. В. Северная война и шведское нашествие на Россию. М., 1958.

Тельпуховский Б. С. Северная война 1700—1721. М., 1946.

І. Стальмашонак.

Паплечнік Пятра I

З Горкамі звязана імя паплечніка Пятра I — Аляксандра Меншыкава. У 1717 г. ён набыў Горы-Горацкае графства. Гэтае ўладанне ў 1736 г., праз сем гадоў пасля смерці Меншыкава, было прызначана як пасаг за яго дачкой Аляксандрай, калі тая выходзіла замуж за Густава Бірона, брата вядомага сваёй жорсткасцю фаварыта Расійскай імператрыцы Ганны Іаанаўны. Сын А. Д. Меншыкава ў той час прадаў графства графу Патоцкаму за 70 тыс. рублёў і грошы ў пасаг не аддаў.

Ці выпадкова трапілі Горы і Горкі да Меншыкава? І чаму наогул рускі вяльможа, «полудержавный властелин», другая асоба ў Расіі пасля Пятра I, так ахвотна набываў маёнткі менавіта ва Усходняй Беларусі і нідзе больш за межамі Расійскай імперыі?

На гэтыя разважанні нас навяло чытанне «Истории Петра» Пушкіна — канспекта гістарычнай працы, якую ён у свой час рыхтаваў, але так і не напісаў. Вядома, што Пушкін быў кваліфікаваным гісторыкам, бо ў Царскасельскім ліцэі давалася адукацыя ў памерах гуманітарнага універсітэта. Вядома, як Пушкін старанна вывучаў гістарычныя крыніцы і аналізаваў гістарычныя даследаванні.

Дык вось, у «Истории Петра» ён пісаў: «Меньшиков происходил от дворян белорусских. Он отыскивал около Орши свое родовое имение. Никогда он не был лакеем и не продавал пирогов. Это шутка бояр, принятая историками за истину».

У святле гэтага робяцца зразумелымі некаторыя факты з біяграфіі святлейшага князя Расійскай Імперыі, генералісімуса, вярхоўнага тайнага сапраўднага саветніка, прэзідэнта Ваеннай калегіі, адмірала Чырвонага сцяга, санкт-пецярбургскага губернатара і г. д. А. Д. Меншыкава.

Аказалася, што абодва княжацкія дыпломы Меншыкава аднолькава гавораць пра яго паходжанне «из фамилии благородной литовской», г. зн. з Вялікага княства Літоўскага, якое складалася ў той час з Беларусі і Літвы (часта абодва краі тады называлі проста Літвою, не падзяляючы іх).

У снежні 1707 г. з'езд шляхты Літвы і Беларусі зацвердзіў дакумент, па якому Аляксандр Менжык (Меншыкаў) прызнаваўся «нашай айчыны княства Літоўскага сынам».

Згодна з дадзенымі самога Меншыкава, бацька святлейшага князя Даніла Менжык перайшоў на царскую службу ў час рускапольскай вайны 1654—67 гг., калі сотні тысяч беларусаў былі пераселены ў рускую дзяржаву. Даніла Менжык у Расіі збяднеў. Тут яго пачалі зваць на рускі звычай Меншыкавым.

Дваранскі род Менжык вядомы ў Мінскім, Віленскім і Рускім (з цэнтрам у Львове) ваяводствах Рэчы Паспалітай па шматлікіх дакументах XVII ст. Дарэчы, А. Д. Меншыкаў ва ўсіх дакументах і сачыненнях свайго часу на польскай мове заўсёды завецца толькі як «Менжык» і ніколі як «Меншыкаў», што ўскосна пацвярджае версію яго паходжання з Беларусі або Літвы. Сам ён таксама падпісваўся як Меншыкаў, без мяккага знака ў прозвішчы, хоць яго жонка Дар'я па рускай звычцы змякчала сваё прозвішча ў подпісах. Так што нічога дзіўнага ў гіпотэзе, якую падтрымаў Пушкін, няма. Не сумняваецца ў беларускім паходжанні Меншыкава і яго біёграф Б. Д. Паразоўская.

І вось цікава, што Меншыкаў набыў з 1711 па 1717 г. ва Усходняй Беларусі маёнткі Галі і Бікложы, Улу і Паўазер'е ля Бешанковіч у Полацкім ваяводстве, Дуброўну і Горкі ў Аршанскім павеце.

Ці выпадкова гэта? Здаецца, не. Меншыкаў яўна хацеў пацвердзіць сваё беларускае паходжанне, і, мусіць, Пушкін менавіта гэта і лічыў «пошукам ля Оршы яго радавога маёнтка».

Каб умацавацца сярод рускага баярства, Меншыкаў хацеў парадніцца з вядомымі па ўсёй Літве і Беларусі магнатамі Сапегамі, якія паходзілі з віцебскіх баяраў. Староста бабруйскі Ян Сапега па абаюднай дамоўленасці ў 1727 г. прывёз у Пецярбург свайго сына Пятра на заручыны з Марыяй Аляксандраўнай Меншыкавай (яе мастацкі вобраз увасоблены Сурыкавым у вядомай карціне «Меншыкаў у Бярозаве»).

Сама імператрыца Кацярына I, удава Пятра I, заручыла маладых. У пасаг за дачкой Меншыкаў хацеў даць свае беларускія маёнткі, у першую чаргу Горы і Горкі. Сюды ён спецыяльна ездзіў, каб мець уяўленне аб іх становішчы.

Як жа быць з гістарычнай традыцыяй, згодна з якой Меншыкаў быў «подлородным» чалавекам, чалавекам з гістарычных нізоў? Сын збяднелага беларускага шляхціца, якога фартуна ўзнесла да другога ў дзяржаве месца, для баяр быў не кім іншым, як «подлородным», ды яшчэ чужынцам па паходжанню.

Гэту традыцыю эмацыянальна падмацоўвае адпаведны вобраз царскага дзеншчыка ў кнізе А. Талстога «Петр I» і яе экранізацыях. Нельга забываць, што раман Талстога дае мастацкі, а не навуковы вобраз Меншыкава і адлюстроўвае пункт гледжання на Меншыкава адной толькі часткі гісторыкаў, якая падабалася пісьменніку па сваёй канцэпцыі: паказу цара-рэфарматара, які нібыта абапіраўся на нізы народа. Але той жа цар яскрава бачыў класавы падзел народа на дваран і падатнае саслоўе. Менавіта пры ім выбухнула народная вайна супраць прыгнёту пад кіраўніцтвам Кандрата Булавіна. І царом-дэмакратам ён ніколі не быў.

Ці можам мы цалкам прыняць «аршанскую гіпотэзу» паходжання Меншыкава? Здаецца, яшчэ не. Патрэбны далейшыя пошукі ў архівах і кнігасховішчах. Але ясна адно. Абвяргаць спробы Меншыкава даказаць сваё паходжанне з Беларусі, як гэта рабілася некаторымі гісторыкамі, ужо нельга. І гэта галоўнае. Навуковае ўяўленне аб тым або іншым персанажы гісторыі, у адрозненне ад мастацкага, заўсёды змяняецца ў залежнасці ад разумення і тлумачэння гістарычных крыніц. Гістарычная ісціна, у адрозненне ад мастацкай, ніколі не бывае завершанай. Гэтаму вучыць дыялектыка.

В. Грыцкевіч.

У СКЛАДЗЕ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ

1772 год — гістарычная веха ў існаванні не толькі Горацкай зямлі, але і ўсяго Беларускага края. У гэты год адбыўся І падзел суверэннай дзяржавы Рэчы Паспалітай паміж трыма дзяржавамі — Расіяй, Прусіяй і Аўстрыяй. Імяннымі ўказамі Кацярыны II, якія датуюцца 1,12 і 21 верасня, было аб'яўлена аб далучэнні да Расійскай імперыі ўсходніх зямель Беларусі, на

якіх былі заснаваны дзве губерні — Пскоўская і Магілёўская. Указам сената ад 23 кастрычніка гэтага ж года Магілёўская губерня дзялілася на 4 правінцыі — Магілёўскую, Мсціслаўскую, Рагачоўскую і Аршанскую. Горкі і тэрыторыя вакол яго ўвайшлі ў Аршанскую правінцыю, а з 1777 г.— Аршанскі, потым Копыскі павет.

Далучэнне да Расіі, з аднаго боку, прывяло да таго, што замест павалочнага падатку насельніцтва пачало плаціць больш цяжкі — падушны. Акрамя гэтага плацілі яшчэ земскі збор. З горацкіх вёсак пачалі браць рэкрутаў на службу ў царскую армію. Замест акаталічвання і апалячвання насельніцтва пачаўся працэс русіфікацыі. З другога боку, далучэнне да Расіі садзейнічала развіццю эканомікі, гандлю, рамяства, адукацыі.

Развіццё прамысловасці Горак і яго наваколля ў канцы XVIII ст. было вельмі ўмоўным. У другой палове XVIII ст. былі заснаваны наступныя прадпрыемствы: сукнавальня князя Я. Любамірскага ў в. Цілівічы ў 1750 г., талесны завод купцоў Гешаля Нохіма і Меера Сахерава ў мяст. Дуброўна ў 1750 г., вінакурні князя Я. Любамірскага ў фальварках Станіслава і Зарубы ў 1750 г. У 1790 г. у Горках была заснавана парусінавая, а ў 1795 г. суконная мануфактура. У канцы XVIII ст., а дакладней у 1780 г., у горадзе пражывала 992 чал. (мяшчан-хрысціян — 594, мяшчан-яўрэяў — 394). У Горках былі праваслаўная і дзве уніяцкія царквы, касцёл, яўрэйскі малітоўны дом. Праводзіліся два кірмашы ў год.

У першай палове XIX ст. працэс заснавання прамысловых прадпрыемстваў на Горацкай зямлі некалькі пашырыўся. Пачалі працаваць сукнавальні князя А. Дандукова-Корсакава ў мяст. Раманава (1819 г.), графа Р. Цукаты ў фальварку Маслакі (1830 г.), князя Я. Любамірскага ў мяст. Баева (1831 г.), А. Пракаповіча ў фальварку Стары Сялец (1843 г.), генерала А. Рэйна ў фальварку Бабінічы (1850 г.), вінакурні князя Дандукова-Корсакава ў фальварку Раманава (1821 г.), двараніна Дз. Цэкерта ў фальварку Усвяты (1836 г.), мешчаніна З. Піваварава ў фальварку Каз'яны (1846), кафляны завод дваранкі В. Чачковай у фальварку Смятанка (1850 г.). У 1814 г. суконная фабрыка графа Л. Салагуба мела 3 станкі, там працавалі 25 прыгонных рабочых, выраблялася салдацкага сукна 500 аршын і байкі 150 аршын у год.

У 1809 г. у Горы-Горацкім маёнтку была заснавана палатняная мануфактура з фарбавальняй. 4 станкі абслугоўвалі 34 рабочых. Мясцовую сыравіну выкарыстоўвалі гарбарны і вінакурны заводы. У мяст. Горы ў 1811 г. (па іншых даных у 1808 г.) пачала працаваць палатняна-парусінавая мануфактура, якая выпускала парусіну, рэвендук, брызендук, палатно. Прадпрыемства размяшчалася спачатку ў двух, а з 1828 г. у чатырох драўляных будынках. На 150 станках працавала больш за 200 чал. Работа майстроў аплочвалася грашыма або натурай. У 1830-я гады за 12-гадзінны рабочы дзень ткачы атрымлівалі 85 кап., нітачнікі — 9, сторажы — 3 кап. У 1837 г. за выбелку 80 пудоў нітак давалі 2 пуды жыта і 2 гарцы ячменных круп, жанчынам за мыццё гэтых нітак — 1 пуд жытняй мукі. За год на мануфактуры выраблялася ў сярэднім каля 150 тыс. аршын прадукцыі. Гэта прадпрыемства было адным з найбуйнейшых у Магілёўскай губерні.

Полымя Айчыннай вайны 1812 г. апаліла і Горацкую зямлю. 14 ліпеня французскія войскі захапілі Горкі. У выніку ваенных дзеянняў і ў час акупацыі французскае войска разрабавала Горацкі замак, Горкі і Горы, фальваркі Наталін, Сенькава, Сава, Рудкаўшчына, Анігоф і іншыя, шмат вёсак. Французы нанеслі вельмі значную шкоду прадпрыемствам, спалілі аранжарэю з рэдкімі для Беларусі раслінамі. У Горы-Горацкім маёнтку было забіта і памерла ад пабояў 2070 чал., 34 чал. былі захоплены ў палон,

303 жыхары маёнтка пакінулі свае дамы і збеглі ў лясы, агульная колькасць чалавечых страт у выніку напалеонаўскага нашэсця па Горы-Горацкаму маёнтку склала 2407 чал. Матэрыяльныя страты склалі больш за 3 млн руб. У гэтыя лічбы ўваходзяць і страты жывёлы, збожжа, прадуктаў харчавання. Да таго ж у Горках з ліпеня па лістапад знаходзіўся французскі вайсковы магазін для збору харчавання і фуражу. Зразумела, што рабіўся гэты «збор» сілаю.

У пачатку лістапада 1812 г. французскія войскі пачалі адступленне з горацкай зямлі. 8 лістапада стаўка Галоўнага камандавання на чале з М. І. Кутузавым размясцілася ў мяст. Раманава. Пасланыя адтуль рускія палкі пад камандаваннем генерала Ажароўскага вызвалілі Горкі.

«Пустые дома крестьян, умерших от голода, бледные, высохшие лица еще живущих наполняют душу страхом», — так апісваў Горкі сучаснік пасля вызвалення іх ад французаў.

Цяжкае становішча жыхароў Горак і сялян маёнтка пагаршалася таксама з-за безгаспадарчасці апошняга ўладальніка маёнтка графа Л. Салагуба. На адным з пагоркаў быў пабудаваны белакаменны палац, уладальнік якога не адмаўляў сабе ні ў чым.

А ў Горках — драўляныя хаткі з саламянымі стрэхамі і маленькімі акенцамі, якія пакасіліся ад часу, на Слабадзе і Зарэччы — вузкія, гразкія вуліцы, па якіх восенню і ўвесну ні праехаць, ні прайсці... «Хлебных запасов у крестьян почти не было, поэтому из-за бывших неурожаев и общей крайней бедности крестьян большая часть их без хлеба, отчего большая часть крестьянских полей осталась без обработки и обсеменения» — так характарызаваў становішча горацкіх сялян царскі чыноўнік.

З 850 сялян Горы-Горацкага маёнтка 32 наогул не мелі страхі над галавой, 280 туліліся ў хатках, непрыгодных для жылля. Даўгі ж гаспадара — графа Салагуба з кожным днём павялічваліся. Ён нават не выканаў падрад на дастаўку харчавання ў армію Кутузава, які падпісаў у 1812 г. За гэта ўрад вырашыў канфіскаваць Горы-Горацкі маёнтак у казну (ён уключаў 15 фальваркаў, 2770 прыгонных сялян і 1760 дзес. зямлі), што і было зроблена ў 1828 г. Пасля канфіскацыі маёнтка Магілёўскай казённай палатай быў састаўлены яго план.

Новы этап у гісторыі Горацкай зямлі звязаны з адкрыццём у Горках у 1840 г. земляробчай школы, якая ў 1848 г. была пераўтворана ў земляробчы інстытут. З гэтага часу Горкі сталі цэнтрам сельскагаспадарчай адукацыі на Беларусі. У 1859 г. былі адчынены каморніцка-таксатарскія курсы. З 1850 па 1865 г. скончылі земляробчую школу і атрымалі пасведчанні аграномаў і каморнікаў больш за 500 чал.

Аднак народная асвета ў цэлым да сярэдзіны XIX ст. заставалася на вельмі нізкім узроўні. Сваіх нашчадкаў багатыя купцы і паны накіроўвалі вучыцца ў народныя і павятовыя вучылішчы Оршы і Мсціслаўля. Толькі ў 1847 г. з мэтай навучання дзяцей мяшчан і іншых саслоўяў царскі ўрад адчыніў у Горках Горацка-Казіміраўскую пачатковую народную школу. Такая ж школа ў 1846 г. была адчынена ў мяст. Горы. У гэтых школах дзяцей вучылі рускаму пісьму і чытанню, закону божаму, царкоўнаславянскаму чытанню і пачаткам арыфметыкі.

Адчыняючы ў невялікім мястэчку земляробчыя навучальныя ўстановы, царскі ўрад разлічваў, што тут будуць выхоўвацца верныя яму чыноўнікі. Але жыццё ўнесла свае карэктывы ў пажаданне ўлад. Адукацыя моладзі садзейнічала фарміраванню ў студэнтаў і навучэнцаў прагрэсіўных поглядаў. Горкі сталі цэнтрам вальнадумства і рэвалюцыйных падзей усяго раёна.

Ужо ў 1851 г. з Горак высылаецца студэнт А. Ранбінскі, які, па меркаванню кіраўніцтва інстытута, аказваў «дрэнны ўплыў на моладзь».

У кастрычніку 1857 г. студэнты напалі на кватэру і канцылярыю станавога прыстава. Яны знішчылі ўсе справы і разграмілі канцылярыю. Даследаванне па гэтай справе не выявіла вінаўных і было спынена.

У гэтым жа годзе на легальных умовах адкрыўся студэнцка-прафесарскі клуб, у дзейнасці якога прымалі ўдзел вядучыя выкладчыкі інстытута. У клубе абмяркоўваліся злабадзённыя палітычныя пытанні і будучая аграрная рэформа.

У 1861 г. за ўдзел у рэвалюцыйных выступленнях у Бялынічах і Оршы з інстытута быў выключаны студэнт П. Ульяноўскі. У абарону яго больш за 50 студэнтаў з'явіліся да дырэктара і заявілі аб сваім намеры пакінуць інстытут. 21 красавіка 1862 г. студэнты арганізавалі гулянні ў фальварку Шыманоўка, што ў 1,5 вярсты ад горада. Прысутнічала каля 50-ці чалавек. Пелі нацыянальны польскі гімн, рэвалюцыйныя песні. Гулянне гэта насіла палітычны характар.

У канцы 1862 г. у Горках сфарміравалася падпольная студэнцкая арганізацыя пад кіраўніцтвам камітэта з 11 чалавек. У яго ўваходзілі С. Віскоўскі, В. Дамарацкі, В. Антановіч, П. Козел, К. Дзеконскі, Д. Кілдыш, С. Маргулец, Р. Чарвінскі, З. Міткевіч, Ф. Чудоўскі, С. Дымкевіч. Кожны член камітэта меў свае абавязкі і даручэнні. Так, С. Віскоўскі падтрымліваў сувязь з нелегальнымі арганізацыямі ў Пецярбургу, Маскве і Вільні, В. Антановіч займаўся зброяй, а П. Козел — правіянтам, фуражом і транспартам. Кіраваў камітэтам С. Дымкевіч, вядомы пад мянушкай «Біскуп». Некалькі год ён вучыўся ў інстытуце на правах вольнага слухача, карыстаўся вялікім аўтарытэтам сярод студэнтаў, кіраваў касай узаемадапамогі, арганізаваў сталовыя для бедных навучэнцаў. Для распаўсюджвання свайго ўплыву на сялян Горы-Горацкага маёнтка С. Дымкевіч разам з іншымі студэнтамі адкрыў беларускую народную школу. Навучанне было на беларускай мове па польскіх букварах і кніжках. Школа працавала на працягу чатырох год, а аб яе існаванні ўлады і не здагадваліся.

Пасля смерці С. Дымкевіча ў студзені 1863 г. камітэт узначаліў С. Віскоўскі. Ён устанавіў сувязь з Літоўскім правінцыяльным камітэтам у Вільні, ездзіў па зброю ў Пецярбург і Маскву. Атрымаўшы зброю, студэнты выязджалі за горад і трэніраваліся там у стральбе, рыхтаваліся да будучых баёў.

У сакавіку 1863 г. Віленскі камітэт вырашыў пачаць паўстанне на Магілёўшчыне. Кіраўніком яго і ваенным начальнікам Магілёўскага ваяводства быў назначаны Л. Звяждоўскі. Ураджэнец Віленскай губерні, сын калежскага рэгістратара, ён скончыў ваеннае вучылішча, затым Акадэмію Генеральнага штаба, удзельнічаў у Крымскай вайне, узнагароджаны двума ордэнамі. У 1860—62 гг. служыў у Вільні, але наклікаў на сябе «подозрение в неблагонамеренном образе мыслей и участии в сходках с преступной целью» і быў пераведзены ў Маскву, дзе ўзначаліў афіцэрскую падпольную арганізацыю 1-га Армейскага корпуса. Звяждоўскі быў перакананым прыхільнікам руска-польскага рэвалюцыйнага саюза. Ён на працягу некалькіх гадоў удзельнічаў у рускім рэвалюцыйным руху.

У першыя дні красавіка 1863 г. Л. Д. Звяждоўскі разам з баявымі саратнікамі — Я. Жукоўскім, І. Будзіловічам, З. Гайдамовічам, С. Дзержаноўскім, З. Міткевічам прыбылі ў маёнтак Ліцвінавічы Аршанскага павета, затым наведалі месцы, дзе планавалася паўстанне. Там жа на пасяджэнні былі вызначаны кіраўнікі груп паўстанцаў на Магілёўшчыне, прынята ваенная дыспазіцыя, у якой адзначалася, што характар ваенных дзеянняў павінен быць партызанскім, а галоўная мэта — прыцягнуць народ да барацьбы.

15 красавіка 1863 г. атрад Л. Звяждоўскага, які налічваў каля 40 чалавек, прыбыў у вёску Зарубы і стаў рыхтавацца да выступлення.

План Горы-Горацкага маёнтка 1834 г.

А ў Горках і вучэбных земляробчых установах і не падазравалі аб паўстанні. Дырэктар інстытута Р. Э. Траўтфэттэр на запытанне магілёўскага губернатара заявіў, што «собственно за учебные заведения опасаться нет повода, и восстание в Горках будет лишь тогда, когда оно совершится в Могилеве».

Да гадзіны ночы 24 красавіка атрад Л. Звяждоўскага ўвайшоў у горад, у якім з вайсковых часцей была толькі інвалідная каманда. На плошчы каля гасцініцы да іх прымкнулі студэнты, а таксама паўстанцы, якія прыбылі з Магілёва.

Кіраўніку Горацкага падпольнага камітэта была ўручана пастанова ад 13 сакавіка 1863 г. аб тым, што «националь-

ное правительство назначает гражданина Станислава Висковского начальником города Горы-Горки».

Удзельнікі паўстання падзяліліся на 5 груп і адначасова напалі на кватэру начальніка ўнутранай аховы, казарму, цэйхгауз, пошту і казначэйства. Паміж паўстанцамі і салдатамі інваліднай каманды завязаўся бой, у якім загінулі В. Дамарацкі і К. Пржэбольскі, трое паўстанцаў атрымалі раненні. У горадзе згарэла некалькі хат. Горкі апынуліся ў руках паўстанцаў.

Раніцай 24 красавіка паўстанцы і жыхары горада сабраліся на плошчы. Л. Звяждоўскі выступіў з прамовай, у якой заявіў, што яны змагаюцца за мужыкоў і хочуць даць свабоду народу. Ён заклікаў сялян не плаціць подаці і ўступаць у атрад паўстанцаў. Жыхарам, якія пацярпелі ад пажару, была выдзелена грашовая дапамога. Мітынг прайшоў таксама на вучэбнай ферме.

На тэрыторыі дэндрапарку інстытута з воінскімі ўшанаваннямі быў пахаваны загінуўшы В. Дамарацкі. Атрад стаў рыхтавацца да адыходу. Л. Звяждоўскі меў намер падняць паўстанне ва ўсходняй частцы Магілёўскай губерні, затым перайсці на Смаленшчыну і рухацца далей — у Паволжа.

Днём 24 красавіка паўстанцы, колькасць якіх даходзіла ўжо да 200 чалавек, забралі з вучэбнай фермы частку коней і спешна накіраваліся ўбок Крычава.

Як сцвярджае А. Дамбавецкі ў кнізе «Опыт описания Могилевской губернии», «в ночь с 23 на 24 апреля мятежники разграбили казначейство, сожгли 52 обывательских дома и убили 12 человек солдат местной команды. При грабеже казначейства взят железный сундук, в котором хранилось около 15 000 руб. казенных денег. По выходе мятежников из города, сундук, который они не умели разломать и оставили на берегу р. Поросицы, найден и доставлен с деньгами в казначейство».

Аднак Л. Звяждоўскаму не ўдалося схіліць на свой бок шырокія масы сялянства, якое ўспрыняло паўстанне як барацьбу памешчыкаў за зварот прыгонніцтва.

Калі паўстанцаў акружылі царскія салдаты, Л. Звяждоўскі 30 красавіка прыняў рашэнне распусціць атрад і прабівацца на захад невялікімі групамі. Зрабіць гэта ўдалося толькі атраду на чале са Звяждоўскім. 145 чалавек былі затрыманы і пасаджаны ў магілёўскую турму.

У чэрвені 1863 г. пачалося следства. Да крымінальнай адказнасці па справе аб паўстанні прыцягнулі 61 навучэнца і 5 выкладчыкаў. У сакавіку 1864 г. адбыўся суд, які жорстка пакараў паўстанцаў: 26 студэнтаў былі асуджаны на катаргу, 33 высланы за межы Беларусі, ва ўсходнія губерні. Большасць катаржан і высланых загінула ў турмах.

Удзел студэнтаў у рэвалюцыйным руху 1863 г., як адзначае гісторык С. Г. Цітовіч, быў «...сочувственным откликом на польское национально-освободительное восстание, выражением солидарности с революционно-демократической стороной этого движения..., способствовало также сближению поляков, русских, белорусов и других учащихся в совместной революционно-демократической борьбе».

Для царскага ўрада выступленне навучэнцаў горацкіх вучэбных устаноў паслужыла падставай для таго, каб у 1863 г. адмяніць прыём у земляробчы інстытут. Летам 1864 г. пытанне аб лёсе гэтай навучальнай установы абмяркоўвалася ў Міністэрстве дзяржаўных маёмасцей і 24 чэрвеня было прынята рашэнне аб яе пераводзе ў Пецярбург, у будынак Ляснога інстытута.

Аднак трэба адзначыць, што адкрыццё сельскагаспадарчых устаноў спрыяла эканамічнаму развіццю Горак. Так, пры Горы-Горацкім земляробчым інстытуце ў 1859 г. пачаў працаваць чыгуна-ліцейны завод, былі адчынены паштовая станцыя (1840), аптэка (1840), метэастанцыя (1841). У 1856 г. у Горках было ўжо 3830 жыхароў. З іх мужчынскага полу — 2415, жаночага —



Горкі. Млын, які знаходзіўся на Аршанскай дарозе.

1415 чал. Па веравызнанню жыхары падраздзяляліся наступным чынам: праваслаўных 1328 мужчын і 1213 жанчын, католікаў 239 мужчын і 40 жанчын, лютэранаў 34 мужчын і 12 жанчын. Яўрэяў было 845 мужчын і 811 жанчын. У Горках было драўляных дамоў 496 і адзін мураваны, дзве мураваныя і чатыры драўляныя царквы, адзін драўляны касцёл, чатыры драўляныя яўрэйскія малітоўныя дамы. Напярэдадні адмены прыгоннага права ў Горках было ўжо 4462 жыхары.

26 снежня 1861 г. царскі ўрад прыняў рашэнне казённае мястэчка Горкі перавесці ў стан павятовага горада і ўтварыць з частак Аршанскага, Магілёўскага і скасаванага Копыскага паветаў Горацкі павет. Плошча новаўтворанага павета складала 2487 кв. вёрст, насельніцтва каля 80 тыс. чал. Дзяржаўныя сяляне, якія жылі ў Горках, мелі права застацца ў ранейшым званні або перайсці ў мяшчане, але зямля іх была павінна перайсці ў Міністэрства дзяржаўных маёмасцей. Для вядзення гарадской гаспадаркі, грамадскіх і судзебных спраў у Горках была заснавана гарадская дума. У наступным годзе ў Горкі з Копысі былі пераведзены павятовы суд з дваранскай апекай, павятовае казначэйства, паштовая кантора, гарадская бальніца, інвалідная каманда, канцылярыя, маршалак дваранства і страпчага, іншыя ўстановы.

Да сямідзесятых гадоў XIX ст. цэнтр павета заставаўся няўтульным, брудным. Не было водаправода, вуліцы не асвятляліся. У 1868 г. у горадзе было 4908 жыхароў, з якіх толькі 857 чал. пісьменных (17,5 %), працавалі рамеснікі: хлебапёкаў — 13, булачнікаў — 6, маслабойшчыкаў — 4, краўцоў — 39, шаўцоў — 46, башмачнікаў — 1, мадзістак — 4, пальчатачнікаў — 1, шапачнікаў — 4, кушняроў — 5, печнікоў — 7, сталяроў — 12, меднікаў — 1, шорнікаў — 1, бондараў — 1, кавалёў — 19, шкляроў — 3, цырульнікаў — 2, фарбавальшчыкаў — 7, золатасярэбранікаў — 1, цесляроў — 15, таксама было 2 музыканты, 41 чорнарабочы, 12 прыказчыкаў.

У жніўні 1867 г. было зацверджана палажэнне аб гербе горада: «...изобразить в сём гербе, как главную эмблему города Горки, три горы, средняя выше других, а чтобы указать на занятие



Горкі. Салдацкая слабодка.

земледелием жителей города — вырастающие из гор колосья, в вольной части щита поместить герб Могилевской губернии. Щит украсить башней с тремя зубцами».

У наступныя 10—15 гадоў назіраліся некаторыя змены ў эканамічным развіцці павятовага цэнтра, паляпшэнні яго знешняга выгляду. Былі правільна распланаваны вуліцы, зраўнаваны ямы і пагорачкі, зроблены тратуары з дошак часткаю на сродкі домаўладальнікаў, часткаю на грошы, якія былі сабраны па падпісцы, на галоўных вуліцах на гарадскія сродкі ўстаноўлены 30 ліхтароў. У 1881 г. на земскія сродкі былі пабудаваны два масты праз рэкі Проня і Парасіца. У гэтым жа годзе ў горадзе была адчынена тэлеграфная станцыя. Было пабудавана каля 100 прыватных дамоў, у тым ліку і тыя, дзе крыху пазней размясціліся гарадская паліцыя і турма. Аднак будаўніцтва і змяненні да лепшага праходзілі марудна і з цяжкасцямі. Прычына гэтага — вельмі малыя сродкі, якія мела гарадская дума, да таго ж горад не меў уласнай зямлі: уся зямля, на якой ён знаходзіўся, належала казне, усе выкупныя за зямлю грошы таксама паступалі ў казну. Паводле перапісу 1897 г. у павятовым цэнтры было 6735 жыхароў (3491 мужчын, 3244 жанчын), у павеце — 122 559 жыхароў (60 356 мужчын, 62 203 жанчыны).

Не палепшыліся эканамічнае становішча, справы ў адукацыі і медыцынскім абслугоўванні насельніцтва ў па-

веце і ў павятовым цэнтры ў апошнія гады XIX ст. і ў пачатку XX ст. Напрыклад, у 1901 г. увесь бюджэт Горак складаў усяго 6617 руб. 40 кап. З гэтых грошай толькі 522 руб. адпускаліся на асвятленне вуліц і рамонт дарог. Усё астатняе ішло на ўтрыманне чыноўнікаў. У той жа час даўгі горада складалі больш за 5 тыс. руб.

У 1904 г. у горадзе знаходзіліся 10 гасцініц і нумароў, 7 заезных дамоў, 5 шынкоў, харчэўняў і чайных. Вуліцы асвятлялі 45 ліхтароў. Колькасць жылых пабудоў у павятовым цэнтры — 821, у тым ліку мураваных — 22, драўляных — 799. На адзін дом прыходзілася 8,7 чал.

Асноўная маса насельніцтва была пазбаўлена медыцынскай дапамогі. Не хапала грошай нават на прышчэпкі. У 1900 г. у павеце прывіліся ад воспы ўсяго 108 чал. — менеў, чым ва ўсіх



Горы-Горкі. Рынкавая плошча.

Горкі. Вуліца Паштовая.

іншых паветах губерні. З прычыны частых эпідэмій, адсутнасці медыцынскай дапамогі ў павеце была высокая смяротнасць. Людзі паміралі ад дызентэрыі, сібірскай язвы, тыфу. У 1904 г. горад абслугоўвалі 4 урачы, 2 акушэркі, 4 фельчары, а гарадская бальніца мела ўсяго 13 месц.

Для большасці працоўных людзей практычна быў закрыты шлях да адукацыі. У 1883 г. у Горацкім павеце было 15 пачатковых народных школ, у якіх навучаліся 662 хлопчыкі і 44 дзяўчынкі. Дадзеныя перапісу 1897 г. сведчаць аб тым, што толькі 19,4 % насельніцтва павета было пісьменным, у павятовым цэнтры — 41,3 %. Аб агульнай адукацыі моладзі сведчыць і той факт, што сярод прызыўнікоў у 1894—98 гг. непісьменных было 51 %. На рубяжы стагоддзяў у павеце ўжо налічвалася 17 школ Міністэрства народнай адукацыі, 29 — царкоўнапрыходскіх, 126 школ граматы. Толькі 30 % дзяцей школьнага ўзросту мелі магчымасць вучыцца.

Прамысловасць Горак у канцы XIX — пачатку XX ст. складалася з дробных прадпрыемстваў рамеснага тыпу. Аднак колькасць іх пастаянна павялічвалася. Так, калі ў 1888 г. дзейнічала 7 паўкустарных прадпрыемстваў, то ў 1900 — ужо 29, а ў 1904 г. — 34. На іх працавала ўсяго 160 чал., якія выраблялі ў год на 90—100 тыс. руб. прадукцыі. Праўда, некаторыя рамесныя прадпрыемствы былі вядомыя на ўвесь свет. Так, у 1900 г. у майстэрні пры аптэцы, якая належала Падзерскаму, быў вынайдзены крэм «Метамарфоза», які дазваляў выводзіць вяснушкі. Уладальнік аптэкі за гэты крэм у 1900 г. на сусветнай выстаўцы ў Парыжы атрымаў залаты медаль.

На прадпрыемствах горада і павета рабочы дзень быў 12—14 гадзін, адсутнічала элементарная ахова працы, што прызнавалі нават царскія чыноўнікі. Шырока прымянялася жаночая і дзіцячая праца. Заробак быў мізэрны. Так, чорнарабочыя мужчыны атрым-

лівалі 48 руб., а жанчыны — 36 руб. у год.

Увесь час раслі цэны на прадукты харчавання. «Ввиду страшной дороговизны предметов первой необходимости мы, рабочие, нуждаемся часто в куске хлеба, потому что наш заработок ограничен, а цены на хлеб все дорожают», — пісалі рабочыя Горацкага павета магілёўскаму губернатару.

Цяжкім было і становішча сялян. Каля 4 працэнтаў двароў былі беззямельнымі, а 13,6 % — не мелі коней. Павет быў аграрна перанаселены. Агульная плошча пасеваў у павеце ў 1890 г. складала 53 078 дзес. Каб яе апрацоўваць, было неабходна 22 749 чал. Лішак працоўных у сельскай гаспадарцы складаў 18 719 чал., або да 50 % ад колькасці ўсіх занятых у гэтай галіне вытворчасці. Не знаходзячы прымянення сваёй працы, горацкія сяляне ў пошуках крыніц існавання, накіроўваліся ў іншыя раёны царскай Расіі і нават за мяжу. Аб перасяленні ў Сібір, напрыклад, у 1898 г. хадайнічалі сяляне в. Шышава Горацкай вол., с. Юркава і в. Ульяшына Саўскай вол., в. Барсукі, с. Слабада Сватошыцкай вол. і іншыя. Хадайніцтва аб перасяленні ў Сібір і нават у Чарнаморскую губерню і на Каўказ сяляне падавалі і ў першае дзесяцігоддзе XX ст.

Цяжка жылося і навучэнцам горацкіх земляробчых і рамесных вучылішчаў, каморніцка-таксатарскіх класаў, дзе ў 1904 г. навучалася 437 чал. Кошт навучання быў высокі — 150 руб. у год. Гэта сярэдні гадавы заробак кваліфікаванага рабочага. Акрамя таго, з кожнага паступаючага бралі залог у памеры 25 руб. Нядзіўна, што многія з дзяцей рабочых і сялян кідалі вучобу. Праўда, некаторыя навучэнцы атрымлівалі стыпендыю, але на кожную стыпендыю прэтэндавалі да 10—12 чал.

Палітычнае бяспраўе, эксплуатацыя і прыгнёт будзілі да барацьбы супраць самаўладдзя.

У 70-я гады ў горадзе дзейнічалі некалькі народніцкіх гурткоў, якія былі аб'яднаны ў цэнтральны. Гэта пацвярджае заклік «Русскому студенчеству от Горецкого центрального кружка», які быў знойдзены ў Яраслаўлі. У ім горацкія рэвалюцыянеры заклікалі студэнтаў усёй Расіі «сойти с почвы своих интересов и стать в строй борцов за дело народа». У рэвалюцыйным руху канца 70-х — пачатку 80-х гадоў удзельнічаў вядомы народнік, ураджэнец Горак В. І. Бычкоў. Актыўную рэвалюцыйную работу праводзілі навучэнцы Н. Рыжкоўскі, Э. Акушка, М. Снесарэўскі, якія падтрымлівалі сувязь са студэнтамі Пецярбургскага універсітэта В. Івановым і М. Русанавым.

Некалькі разоў у Горкі да гурткоўцаў прыязджаў вядомы народнік, член выканаўчага камітэта «Народнай волі» Г. П. Ісаеў. Разам з сястрой і братам Н. і Ф. Паповымі і С. Чалоўскім, жыхарамі Горацкага павета, ён спрабаваў арганізаваць тут народніцкае пасяленне. Як лічыць гісторык С. М. Сам-

Горкі. Мікалаеўская царква.

бук, гэта была адна з нешматлікіх вядомых у Беларусі спроб арганізаваць пасяленне накшталт землявольчаскіх. Хаця вядома, што сам Г. П. Ісаеў адмаўляў свой удзел у агітацыі сялян Горацкага павета, так як лічыў гэта на Магілёўшчыне справай безнадзейнай, таму што «положение народа так ужасно, что никакая пропаганда там невозможна, немыслима даже».

Рост рэвалюцыйнага руху садзейнічаў арганізацыі гурткоў сацыял-дэмакратычнага кірунку. У 1901 г. у павеце на кафляных заводах узнікла іскраўская група. У студзені 1902 г. была арганізавана група сацыял-дэмакратаў-іскраўцаў, членамі якой сталі вучні каморніцка-таксатарскіх класаў. Яе ўзначальвалі рэпетытар А. Крэер і навучэнец П. Папоў. У маі 1902 г. адбылася першая маёўка. У Зарэцкім лесе сабралася невялікая група рэвалюцыянераў, якія абмеркавалі метады далейшай работы, пытанне аб распаўсюджванні газеты «Искра».

Праз год, 1 мая 1903 г. ужо 90 навучэнцаў і рабочых сустрэліся ў лесе. Перад пачаткам маёўкі была распаўсюджана лістоўка Арганізацыйнага камітэта II з'езда РСДРП, якая называлася «Первое мая».

На наступны дзень навучэнцы рамеснага вучылішча арганізавалі забастоўку, прад'явілі палітычныя і эканамічныя патрабаванні. Яе ўзначалілі П. Папоў, А. Крэер, А. і С. Фабрыставы, Т. Гоманаў.

Становішча навучэнцаў было некалькі палепшана, але 18 найбольш актыўных удзельнікаў забастоўкі выключылі з вучылішча без права паступаць у іншыя навучальныя установы. Частка з іх была саслана ў Сібір.

Аднак барацьба працягвалася, выкарыстоўваліся розныя прыёмы і метады яе вядзення. Так, навучэнец Д. Белкін 24 мая 1903 г. вывесіў з акна земляробчага вучылішча ліхтар з надпісам «Далоў самадзяржаўе!».

22 чэрвеня 1903 г. у Горках адбылася першая палітычная дэманстрацыя. Прычынай стала пахаванне Н. Клявіна, навучэнца рамеснага вучылішча. На другі дзень у бацькоў памерлага паліцыя адабрала чырвоную стужку з вянка, на якой быў надпіс: «Вечная память таварышу! Барацьбіту за роўнасць і свабоду! Ад аднадумцаў». Аднадумцы — гэта С. Фабрыстаў, Ф. Смірноў, Д. Ратнер, С. Быкаў, З. і Е. Канавалавы, Р. Муравін, П. Зіноўеў, І. Дзям' янаў, Л. Мілкінд.

У 1903 г. горацкія рэвалюцыянеры ўжо мелі сваю друкарню (гектограф), якая знаходзілася на кватэры навучэнцаў земляробчага вучылішча С. Радзікоўскага і Дз. Мандрыкава. На працягу 1903 г. былі надрукаваны і распаўсюджаны лістоўкі і пракламацыі «Праект программы РСДРП», «К новобранцам», «Народ и царь», «Ближайшие политические требования РСДРП» і іншыя.

У канцы 1903 г. у Горкі прыехалі 15 навучэнцаў, якіх перавялі з Казанскага земляробчага вучылішча за ўдзел у рэвалюцыйным руху. Сярод іх былі А. Лепін, К. Розенбек, Ф. Галавізнікаў, А. Ларыёнаў, І. Шышкін і іншыя. Гэты перавод садзейнічаў пашырэнню работы сацыял-дэмакратычнай групы, якая ў канцы 1903 — пачатку 1904 гг. вырасла ў арганізацыю РСДРП. Арганізацыю ў гэты перыяд узначальваў навучэнец земляробчага вучылішча К. Коранеў.

У студзені 1904 г. Горацкая арганізацыя РСДРП асабліва актыўна праводзіла агітацыю сярод сялян павета, распаўсюджвала надрукаваную на гектографе брашуру У. І. Леніна «К деревенской бедноте».

У канцы 1904 г., калі па ўсёй краіне прайшла хваля стачак і забастовак, горацкія рэвалюцыянеры актывізавалі работу, рыхтаваліся са зброяй у руках сустрэць надыход рэвалюцыі. «Молодежь, которая принадлежит к социал-демократической партии, практиковалась в стрельбе из револьверов» — такія паведамленні паступалі з Горак у канцылярыю магілёўскага губернатара.

П. Ю. Бруцэр

Акрамя іскраўцаў у Горках і павеце ў пачатку XX ст. існавалі гурткі эсэраў і арганізацыя Бунда. У 1902—03 гг. у Горках дзейнічаў рэвалюцыйна-прапагандысцкі гурток эсэраўскага кірунку пад назвай «Вечавы звон». У яго ўваходзілі 5 навучэнцаў земляробчай школы: І. П. Папоў, які ў 1901 г. быў выключаны са школы за атрыманне з-за мяжы забароненай брашуры Л. Талстога, В. К. Пятроў, А. Я. Іпатаў, Ф. К. Кірсанаў і В. Н. Тамараў, якія вучыліся ў школе пасля выключэння за ўдзел у палітычных хваляваннях з Казанскага земляробчага вучылішча. Гурткоўцы склалі і надрукавалі літаграфічным спосабам пракламацыю «Да ўсяго сялянскага люду», якую разам з іншымі друкаванымі матэрыяламі эсэраў распаўсюджвалі ў лютым і красавіку 1903 г. па вёсках Горацкага і Чавускага паветаў. Неўзабаве гурток разграміла паліцыя. Папоў быў высланы на 5 гадоў ва Усходнюю Сібір, Пятроў і Іпатаў — на 3 гады ў Архангельскую губерню, Тамараў і Кірсанаў на 3 гады аддадзены пад публічны нагляд паліцыі па месцы жыхарства бацькоў. Асобныя гурткі сацыялістаў-рэвалюцыянераў узніклі ў 1903—04 гг. У іх склад уваходзілі сяляне, рабочыя, настаўнікі, урачы, навучэнцы вучылішчаў і інш. У 1905 г. у павеце вядомы дзве арганізацыі эсэраў — у мяст. Горкі і Дуброўна. У канцы 1904 — пачатку 1905 г. у Горках узнікла арганізацыя Бунда. У яе кіруючае ядро ўваходзілі Эстрын, Нехамкін, Двоскін, браты Маклеры. Усяго яна налічвала каля 30 чал.

У студзені 1905 г. царскі ўрад расстраляў мірную дэманстрацыю працоўных у Пецярбургу. Пачалася першая руская рэвалюцыя. Яе хвалі дакаціліся і да Горак. Вестка аб «Крывавай нядзелі» ўскалыхнула горацкую моладзь. У студзені — ліпені 1905 г. у Горках прайшлі палітычныя дэманстрацыі, ініцыятарамі якіх з'яўляліся мясцовыя арганізацыі РСДРП, Бунда і сацыялістаў-рэвалюцыянераў.

У дэманстрацыі, якая адбылася ў Горках 16 студзеня, паліцыяй былі забіты два чалавекі — навучэнцы рамеснага вучылішча Фама Ерафееў і земляробчага вучылішча Пётр Бруцэр.

Расстрэл дэманстрацыі выклікаў абурэнне горацкіх рэвалюцыянераў, моладзі. Забойства двух навучэнцаў прымусіла магілёўскага акруговага пракурора зрабіць дадатковае расследаванне. У выніку было высветлена, што першы выстрал зрабіў паліцэйскі і што пры разгоне дэманстрацыі паліцыя прымяняла недазволеныя прыёмы. Аб гэтым ён 12 красавіка паведаміў Кіеўскаму пракурору і прапанаваў узбудзіць крымінальную справу супраць рада чыноў горацкай паліцыі. Аднак гэта прапанова не мела ніякіх вынікаў. Наадварот, 11 кастрычніка 1905 г. у г. Магілёве выязная сесія Кіеўскай судовай палаты судзіла арганізатараў дэманстрацыі. А. Н. Карунчыкаў быў асуджаны на два гады турмы, а астатнія — на 1 год 4 месяцы. Суд прызнаў іх вінаватымі ў арганізацыі антыўрадавай дэманстрацыі.

Трагічныя студзеньскія падзеі ў Горках не спынілі рэвалюцыйны рух у павеце.

23—28 лютага забаставаліі рабочыя кафельных заводаў у г. Копысь. Забастоўка была выклікана вельмі цяжкімі ўмовамі працы і нізкай заработнай платай, аднак палітычных патрабаванняў рабочыя не выстаўлялі. Забастоўка скончылася 25 сакавіка, калі рабо-

чыя атрымалі некаторыя ўступкі з боку ўладальнікаў.

Архіўныя матэрыялы сведчаць, што 18 красавіка 1905 г. у 10 гадзін вечара на Аршанскай вуліцы адбылася дэманстрацыя. У ёй удзельнічала больш за 50 чал. З воклічамі «Ура!», «Далоў самадзяржаўе!» дэманстранты рушылі ў парк навучальных установ. Па дарозе дэманстрацыя вырасла да 200 чал. У цёмнай алеі парку нехта выступіў з прамовай, якая суправаджалася заклікамі «Далоў царскіх слуг-сабак!», «Далоў самадзяржаўе!». 1 мая ў парку навучальных устаноў быў праведзены мітынг, а затым дэманстрацыя. 21 мая дэманстрацыя паўтарылася.

У канцы мая 1905 г. адбыўся I з'езд арганізацый РСДРП Палескага камітэта, які прызнаў Горацкую арганізацыю РСДРП паўнапраўным членам Палескага камітэта.

На падаўленне рэвалюцыйнага руху ў Горках і павеце былі пасланы казакі Іркуцкага палка і дзве роты пяхотнага Аляксандраўскага палка. Горацкія арганізацыі РСДРП і эсэраў праводзілі сярод салдат агітацыйную работу. У 1905 г. за агітацыю сярод салдат былі прыцягнуты да адказнасці навучэнцы А. Р. Ларыёнаў і Ф. Крызанковіч.

Падчас вобыску на кватэры, дзе жылі вучні земляробчага вучылішча Сцяпан Радзікоўскі і Дзмітрый Мандрыкаў, паліцыя знайшла гектограф, лістоўку «Таварышы сяляне», фарбу, паперу. У тайніку было знойдзена 190 экземпляраў розных лістовак і пракламацый. Паліцыя зрабіла засаду. Праз некалькі гадзін туды зайшоў і быў схоплены паліцыяй навучэнец Сцяпан Аляксандровіч. Пры вобыску ў яго знайшлі скрутак з лістоўкамі «Таварышы сяляне», «Да сялян і рабочага народа», «Пісьмо да рабочых і сялян», «За што мы змагаемся», «Таварышы салдаты», «Чаго хочуць людзі, якія ходзяць з чырвоным сцягам», песні «Смела, таварышы, у нагу», «Варшавянка» і іншыя.

Большасць лістовак была перадрукавана з лістовак, выдадзеных ЦК РСДРП, Палескім і Магілёўскім камітэтамі РСДРП. Частка тэкстаў лістовак была складзена горацкай арганізацыяй РСДРП. У горадзе раскідваліся лістоўкі «Праўда аб вайне».

4 ліпеня ў Горках прайшла агульная забастоўка. Паліцыя скарыстала зброю, адзін чалавек быў цяжка паранены. За ўдзел у забастоўцы нямала рабочых паштова-тэлеграфнай станцыі звольнілі з работы.

Летам 1905 г у Горацкім павеце адбываліся і масавыя выступленні сялян, якія выліліся ў парубкі памешчыцкага лесу, патраву сенажацей і пасеваў, арганізацыю забастовак батракоў, пагромы і падпалы маёнткаў.

Так, у маёнтку Гебеля 17 чэрвеня апоўдзень сяляне в. Кішыцы пры ўказанні таксатарамі мяжы лугу, якая выклікала спрэчкі, аказалі ўзброенае супраціўленне ўладзе. Паліцыя не здолела навесці парадак, была выклікана вайсковая сіла. Вайскоўцы прымянілі спачатку халодную зброю, аднак сяляне завязалі з салдатамі бойку, тады была выкарыстана агнястрэльная зброя. У выніку — 8 чал. забіты, 16 чал. паранены.

9 жніўня 1905 г. газета бальшавікоў «Пролетариат» паведамляла аб памерах і ходзе сялянскага руху ў Магілёўскай губерні ўвесну і летам таго ж года, на першае месца яна паставіла Горацкі павет.

Звесткі аб сялянскіх хваляваннях паступалі з маёнтка Стафанова, вёсак Старасельле, Асталопава, Гушчына, Саракапуды, Паршына Раманаўскай вол., маёнтка Усвяты, вёсак Масліна, Буда Халбнянскай вол. і іншых мясцін.

У канцы 1905 г. пад кіраўніцтвам эсэра А. Котава ў в. Бурая Дубровенскай вол. адбыліся выступленні сялян, якія жорстка падаўлены ўладамі — 1 селянін забіты, 4 паранены. Котаў быў асуджаны на тры гады ссылкі.

Магутная хваля рэвалюцыйнай барацьбы працоўных, якая ахапіла ўсю краіну, прымусіла цара 17 кастрычніка 1905 г. выдаць маніфест, дзе гасудар

абяцаў народу дэмакратычныя свабоды. Працоўныя Горак сустрэлі царскі маніфест з недаверам. Ужо 18 кастрычніка ў горадзе, паводле паведамленняў паліцыі, «ночью и весь день происходят демонстрации со стрельбой».

У перыяд снежаньскага ўзброенага паўстання ў Маскве з мэтай аказання дапамогі маскоўскім рабочым у Горках была сфарміравана баявая дружына колькасцю 100 чал. На жаль, прабіцца ў Маскву яна не здолела з прычыны забастоўкі чыгуначнікаў.

На пачатку 1906 г. эсэры Горацкага павета арганізавалі «Сялянскі саюз» і правялі некалькі нелегальных сялянскіх з'ездаў.

Рэвалюцыйныя выступленні працягваліся і ў 1906—07 гг. Вось пералік некаторых з іх.

У студзені 1906 г. у мяст. Ляды адбыўся мітынг сялян, на якім прысутнічалі каля тысячы чалавек.

27 ліпеня 1906 г. быў асуджаны Іван Кажанаў. Яго затрымала паліцыя ў мяст. Чэчэч Сенненскага павета. У ходзе следства высветлілася, што ён працаваў служачым горацкай пошты. У Горках уступіў у арганізацыю РСДРП. Яму было прад'яўлена абвінавачанне, што ён 4 чэрвеня 1906 г. на рыначнай плошчы ў мяст. Крычаў на сходзе, на якім прысутнічалі 200 чалавек, заклікаў да звяржэння цара. Суд асудзіў яго на 8 месяцаў турэмнага зняволення.

У гэты ж час быў асуджаны слесар горацкага рамеснага вучылішча Лейба Іофе, ураджэнец мяст. Горы. Як сведчаць архіўныя матэрыялы, 20 лістапада 1905 г. у мяст. Горы быў скліканы сход жыхароў мястэчка і воласці для чытання царскага маніфеста. Аднак Іофе перабіў прамоўцу і заявіў, што цар усіх ашуквае. Пасля мітынгу ён быў арыштаваны, у час вобыску ў яго былі знойдзены 17 экземпляраў лістовак, выдадзеных горацкай арганізацыяй РСДРП. За распаўсюджванне лістовак і пракламацый летам 1906 г. былі таксама асуджаны сяляне Горацкага павета Іван Малах і Іван Ратнікаў.

Восенню 1906 г. быў асуджаны вучань IV класа земляробчага вучылішча Харытон Еркулёў, які спрабаваў сярод салдат распаўсюдзіць лістоўку «Салдат салдату», выдадзеную горацкай арганізацыяй РСДРП.

Цікава, што навучэнцы горацкіх навучальных устаноў распаўсюджвалі лістоўкі і пракламацыі і за межамі павета. Так, летам 1906 г. паліцыяй былі арыштаваны браты Леанід і Міхаіл Харкевічы, якія распаўсюджвалі пракламацыі сярод пасажыраў парахода, які ішоў з Магілёва ў Оршу.

30 красавіка 1907 г. за горадам у лесе адбылася сходка навучэнцаў і рабочых г. Горкі. Аб гэтым даведалася паліцыя. Атрад паліцэйскіх спрабаваў акружыць сходку, але выстралам двух ракет рэвалюцыянеры былі папярэджаны і паспелі схавацца. Паліцыі ўдалося затрымаць толькі аднаго вучня Мацвея Ермашкевіча. У яго было знойдзена 6 экземпляраў лістоўкі «1 Мая», у якой гаварылася, што свята 1 Мая з'яўляецца святам будучага, святам сацыялізму. Лістоўка заклікала пакінуць у гэты дзень работу, каб пралетарыят меў магчымасць паказаць сваім ворагам, што сілы яго не паслаблі і на месцы загінуўшых і арыштаваных змагароў з'явяцца тысячы новых. Лістоўка заканчвалася заклікамі «Далоў самадзяржаўе!», «Няхай жыве сацыялізм!».

Пасля паражэння рэвалюцыі горацкія сацыял-дэмакраты растлумачвалі працоўным вялікае значэнне рэвалюцыі 1905—07 гг., заклікалі народныя масы рыхтавацца да новага ўсенароднага выступлення супраць царызму. Вядома, што ў 1912 г. горацкія бальшавікі распаўсюджвалі газету «Правда», аказвалі ёй матэрыяльную дапамогу.

У 1911—14 гг. у горадзе актыўна дзейнічала падпольная сацыял-дэмакратычная арганізацыя. У яе ўваходзілі А. і С. Фабрыставы, С. Пагодзін, П. Максімаў і іншыя. Падпольшчыкі збіраліся звычайна ў глухіх месцах горада, чыталі марксісцкую літаратуру. У кожнага былі свае абавязкі. Адны ад рукі

пісалі лістоўкі, другія іх распаўсюджвалі.

У 1914 г. пачалася першая сусветная вайна, якая прынесла народным масам пакуты і галечу. У Горках і павеце зачыняліся прадпрыемствы, раслі цэны на харчовыя тавары і прадметы першай неабходнасці. Гэта прыводзіла да абвастрэння класавых супярэчнасцей. У красавіку 1916 г. адбылася забастоўка рабочых суконнай фабрыкі барона Корфа, на якой выраблялася сукно для царскай арміі. Рабочыя патрабавалі павышэння заработнай платы. Жыхары Горак і павета прымалі таксама ўдзел у забастоўцы на будаўніцтве чыгункі Орша — Варажба. Сярод арганізатараў яе быў вучань II класа Горацкага рамеснага вучылішча А. Мартулёў.

Непатрэбная народу вайна выклікала рост антываеннага настрою сярод салдат царскай арміі, у тым ліку і ўраджэнцаў Горак і павета. Салдаты самавольна пакідалі армію і вярталіся дамоў. Горацкі павятовы спраўнік у рапарце магілёўскаму губернатару паведамляў, што толькі ў снежні 1916 г. затрымана ў горадзе і павеце 8 ніжэйшых чыноў.

З 10 чэрвеня па 15 ліпеня 1916 г. у Магілёўскай губерні праводзіўся сельскагаспадарчы перапіс. Паводле яго вынікаў стала вядома, што насельніцтва Горацкага павета складала 109 803 чал. — 47 116 мужчынскага і 62 627 жаночага полу, на 100 мужчын у павеце прыходзілася 133 жанчыны, на адну гаспадарку асоб мужчынскага полу было 2,58, абодвух палоў — 6,01. Змяншэнне колькасці насельніцтва адбылося ў сувязі з перасяленнем часткі жыхароў у Сібір, на Каўказ і іншыя мясціны і з мабілізацыяй мужчын на ваенную службу падчас першай сусветнай вайны. Колькасць гаспадарак і насельніцтва па валасцях была наступнай: Дубровенская — 1601 гаспадарка, 8744 чал. (3728 мужчын, 5016 жанчын); Халбнянская — 1221 гаспадарка, 7571 чал. (3104 мужчыны, 4467 жанчын); Сватошыцкая — 1677 гаспадарак, 10063 чал. (4303 мужчыны, 5760 жанчын); Баеўская — 1493 гаспадаркі, 9471 чал. (4063 мужчыны, 5408 жанчын); Раманаўская — 1235 гаспадарак, 7575 чал. (3163 мужчыны, 4412 жанчын); Горацкая — 1158 гаспадарак, 6297 чал. (2739 мужчын, 3558 жанчын); Саўская — 1154 гаспадаркі, 7052 чал. (2965 мужчын, 4087 жанчын); Пугляеўская — 1323 гаспадаркі, 7742 чал. (3355 мужчын, 4387 жанчын); Гарадзішчанская — 1663 гаспадаркі, 9289 чал. (3983 мужчыны, 5306 жанчын); Маслакоўская — 2068 гаспадарак, 11 661 чал. (5139 мужчын, 6522 жанчыны); Любініцкая — 1846 гаспадарак, 10 741 чал. (4724 мужчыны, 6017 жанчын); Нічыпаровіцкая — 1928 гаспадарак, 10 732 чал. (4584 мужчыны, 5148 жанчын); уладальніцкіх гаспадарак — 156.

У 1916 г. у Горацкім павеце было 33 594 кані, 38 160 галоў буйной рагатай жывёлы, 124 342 галавы дробнай жывёлы. На адну гаспадарку прыходзілася 1,84 каня, 1,35 каровы. Пасяўная плошча ў павеце складала 83830,05 дзес. Пад пасевамі азімага жыта было занята 32375,15 дзес., азімай пшаніцы — 492,86, ячменю — 7664,98, яравога жыта — 190,46, яравой пшаніцы — 2097,54, аўса — 24086,53, проса — 261,33, грэчкі — 704,71, гароху — 370, бабовых — 18,28, сачавіцы — 1,91, бульбы — 5931,46, лёну — 3804,69 дзес. Найбольш значныя пасевы азімага жыта былі ў Нічыпаровіцкай (3555,91 дзес.), Раманаўскай (3537,85 дзес.), Сватошыцкай (3381,81 дзес.), Гарадзішчанскай (3256,26 дзес.) валасцях; азімай пшаніцы ў Халбнянскай (89,06 дзес.), Горацкай (69,09 дзес.), Раманаўскай (64,18 дзес.) валасцях; ячменю ў Нічыпаровіцкай (1354,45 дзес.), Любініцкай (982,54 дзес.), Маслакоўскай (896,74 дзес.), Гарадзішчанскай (850,5 дзес.) валасцях; яравога жыта ў Любініцкай (116,68 дзес.) воласці; яравой пшаніцы ў Маслакоўскай (356,37 дзес.), Халбнянскай (302,5 дзес.) валасцях; аўса ў Нічыпаровіцкай (2801,8 дзес.), Сватошыцкай (2582,98 дзес.),

Маслакоўскай (2385,5 дзес.), Гарадзішчанскай (2312,86 дзес.) валасцях; бульбы ў Нічыпаровіцкай (789,49 дзес.), Гарадзішчанскай (597,44 дзес.), Сватошыцкай (558,58 дзес.) валасцях; лёну ў Халбнянскай (518,85 дзес.), Маслакоўскай (518,75 дзес.) валасцях.

Такімі паказчыкамі стану сельскай гаспадаркі Горацкі павет сустрэў рэвалюцыйны 1917 год.

4 сакавіка Горкі абляцела вестка аб тым, што царызм паў. У цэхі рамеснікаў, на рабочыя ўскраіны і ў студэнцкія аўдыторыі ўварвалася слова «рэвалюцыя».

Як і ўсюды ў краіне, улада ў горадзе перайшла да Саветаў рабочых і сялянскіх дэпутатаў. Кіруючае ядро Горацкага Савета складалася з прадстаўнікоў партый эсэраў і меншавікоў. Гэта не задаволіла прадстаўнікоў горацкіх сельскагаспадарчых устаноў. Па іх патрабаванню ў састаў выканаўчага камітэта Савета былі ўключаны шэсць навучэнцаў.

10 сакавіка 1917 г. у Мар'іным гаі адбылася вялікая маніфестацыя, дзе выступіў Я. В. Гарбачоў, вызвалены з арлоўскай катаржнай турмы. Удзельнікі мітынгу сабралі грошы, частка з якіх была адпраўлена бацькам П. Бруцэра і Ф. Ерафеева.

Для ўмацавання ўлады Часовым урадам была ўведзена новая пасада — павятовага камісара. 9 сакавіка па горадзе былі расклеены загады і звароты горацкага павятовага камісара, у якіх ён заклікаў прыйсці «...помогать новому правительству». Хаця ўрад быў і новы, але пры ім усё заставалася па-старому. Ні Савет, ні камісар Часовага ўрада не збіраліся праводзіць у жыццё рэвалюцыйныя пераўтварэнні. Міліцыя з навучэнцаў была распушчана і сфарміравана з былых стражнікаў і ўраднікаў. Газета «Известия Петроградского Совета» 15 красавіка 1917 г. паведамляла, што ў Горацкім павеце прыхільнікі старога рэжыму вядуць контррэвалюцыйную агітацыю супраць устанаўлення новых парадкаў.

Працоўныя Горак і павета выступілі на барацьбу з самавольствам. 29 сакавіка 1917 г. забаставалі рабочыя маёнтка Раманава, яны патрабавалі павелічэння заработнай платы.

Вясною і летам 1917 г. сяляне дзялілі землі памешчыкаў і захоплівалі сядзібы, нават салдаты царскай арміі адкрыта выказвалі сваё незадавальненне, патрабавалі заключэння міру. У вёсцы Кастрыца па закліку франтавікоў жыхары ўзнялі бунт, каб уціхамірыць яго прыбыў узброены атрад.

У пачатку чэрвеня 1917 г. забаставалі рабочыя Горацкіх механічных майстэрняў па рамонту сельскагаспадарчых машын і пракатных пунктаў, служачыя пошты і бальніцы.

Для таго каб адцягнуць рабочыя і сялянскія масы ад рэвалюцыйнай барацьбы, Часовы урад вырашыў правесці перавыбары валасных і павятовых земстваў, стварыў зямельныя камітэты. Але працоўныя практычна байкаціравалі гэтыя кампаніі. Так, у Горацкім павеце ў выбарах удзельнічала толькі 13 выбаршчыкаў з 66. У краіне наспявалі ўмовы для новай рэвалюцыі.

Абецедарский Л. С. Белоруссия и Россия. XVI — XVII вв. Мн., 1978.

Акты, документы и материалы для истории 1812 года. Т. 3. Спб., 1912.

Акты, издаваемые Виленской археологической комиссией. Т. XIII. Вильно, 1886.

Археологический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси. Т. 4. Вильно, 1912.

Без-Корнилович М. О. Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии с присовокуплением и других сведений к ней же относящихся. Спб., 1855.

Белоруссия в эпоху феодализма. Т. 1—3. Мн., 1959—1961.

Васілеўскі Д. М. Кароткі нарыс гісторыі Горацкага раёна і г. Горак/Праца навуковага таварыства па вывучэнню Беларусі пры Беларускай Дзяржаўнай Акадэміі сельскай гаспадаркі ў Горках. Т. III. Горкі, 1927.

Восстание 1863 г. и русско-польские революционные связи 60-х годов. М., 1960.

Всероссийская сельскохозяйственная перепись 1916 года. Могилевская губерния. Могилев, 1916.

Грицкевич А. П. Частновладельческие города Белоруссии в XVI — XVIII вв. Мн., 1974.

Документы и материалы по истории Белоруссии (1900—1917 гг.). Т. III. Мн., 1953.

Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Магілёўская вобласць. Мн., 1986.

Игнатенко А. П. Борьба белорусского народа за воссоединение с Россией (вторая половина XVII—XVIII вв.). Мн., 1974.

Игнатенко А. П. Ремесленное производство в городах Белоруссии в XVII — XVIII вв. Мн., 1963.

Корб И. Г. Дневник путешествия в Московию. Спб., 1906.

Липинский Л. П. Крестьянское движение в Белоруссии в 1914—1917 гг. Мн., 1975.

Ліпецкі Э. А. Горацкая арганізацыя Бунда. Горацкая арганізацыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў/Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 3.

Лучин А. П. 1812-й год. Наполеон в пределах Могилевской губернии. Ист. очерк. Могилев, 1912.

Могилев. Историко-экономический очерк. Мн., 1971.

Могилевская старина/Сб. статей «Могилевских губернских ведомостей». Вып. 1—3. Могилев, 1900—1903.

Опыт описания Могилевской губернии в историческом, физико-географическом, этнографическом, промышленном, сельскохозяйственном, местном, учебном, медицинском и статистическом отношении. Кн. 2. Могилев, 1882.

Осмоловский А. Воспоминания очевидца о польском восстании в городе Горках 23 апреля 1863 г. Могилев, 1870.

Памятная книжка Могилевской губернии на 1861 г. Могилев, 1861.

Паўстанне ў Літве і Беларусі 1863—1864 гг. М., 1965.

Первая всеобщая перепись населения Российской империи. 1897. Могилевская губерния. Т. XXIII. Спб., 1903.

Революционное движение в Белоруссии в 1905—1907 гг. Мн., 1955.

Русский архив. Вып. 2. Кн. 2. Спб., 1888.

Самбук С. М. Революционные народники Белоруссии (70-е — начало 80-х годов XIX в.). Мн., 1972.

Столпянский Н. Девять губерний Западно-Русского края в топографическом, географическом, статистическом, экономическом, этнографическом и историческом отношениях. Спб., 1866.

Цитович С. Г. Горы-Горецкий земледельческий институт — первая в России высшая сельскохозяйственная школа. Горки, 1960.

Цытовіч С. 1863 год у Горы-Горках быўшай Магілёўскай губерні/Запіскі аддзела гуманітарных навук Беларускай Акадэміі навук. Кн. 8. Т. 3. Мн., 1929.

Шыбека З. В. «Вечавы звон»/Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 2. Мн., 1994.

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, ф. 2001, воп. 1, спр. 23; ф. 2014, воп. 1, спр. 1789, 1799, 1804, 1805, 1806, 1809, 2269, 2270, 2670, 2677.

У. Ліўшыц.

Дакументы сведчаць

АПІСАННЕ ЎРОНУ, ЯКІ ПАНЕСЛІ ЖЫХАРЫ ГОРЫ-ГОРАЦКАГА ГРАФСТВА ПАДЧАС НАШЭСЦЯ НАПАЛЕОНАЎСКІХ ВОЙСК У 1812 г.

Какое сделано разорение	На какую сумму	
	руб	коп
1	2	3

1-е. РАЗОРЕНЫ ГОСПОДСКИЕ СТРОЕНИЯ И ПРОЧИЕ ЗАВЕДЕНИЯ

В Горецком замке, вмещающем в себе четыре больших дома на каменном фундаменте, из коих один главный на горе у самого саду, с флигелями по обеим сторонам и коридорами, под одной связью выломаны двери, окошки и полы повреждены, фонари выдраны. Имеющаяся в оных домах разного сорта мебель, посуда столовая серебряная, фаянсовая портилась.

Полотняные и прочие комнатные графские украшения, также и гардероб графа и графини весь разграблен, люстра и зеркала разбиты, печи испорчены, хранившиеся в погребах разные виноградные вина разграблены, ворота и ограда вокруг замка поломаны, в двух деревянных близ ворот домиках окна

Працяг табл.

1	2	3
выбиты, полы и печи попорчены, в двух деревянных погребах двери разломаны, замки испорчены, и разная деревянная посуда побрана, в каменных оранжереях окна выбиты, разные цветы попорчены и ананасы разграблены, в деревянных оранжереях полы и двери выломаны, в саду разные плодоносные деревья попорчены, а плоды с них оторваны с сучьями, в больших конюшнях стойлы и потолки выломаны, в кузницах инструменты ограблены и стыки выломаны, а горны разбиты. Все служительские дома на местечке против замка разорены, также разорен кожевенный завод со всеми принадлежностями.	51 025	
Состоящая близ оного замка винокурня с медной посудой разорена до основания.	5000	
В ФОЛЬВАРКАХ		
Наталин. В доме выбиты окна и печи повреждены, калитки выломаны, дверцы вынуты в трёх огородах, ограды и две пуни из еловых бревен совсем истреблены, ангар елового лесу сожжен, в прочих ангарах двери выломаны, а частью и полы, в винокурном заводе окна вовсе выбиты, и горны разломаны и вся фольварковая посуда и мебель из разного дерева разграблена.	3000	
Находящиеся близ оного фольварка мельница и кирпичный завод разорены.	2000	
Сеньково. В доме выломаны окошки, повреждены двери и полы. В амбарах двери на железных крюках и засовах выломаны, мебель господская и разная посуда разграблена. В винокурных заводах окна выбиты, горны разбиты, на сукновальне котелки взяты. Находившаяся близь фольварка корчма разорена и мельница с сукновальней повреждена.	7000	
Сава. В доме окна вовсе выломаны, двери и печи повреждены, холсты сатина оторваны, в амбарах двери на железных крюках выломаны. Сараи разломаны и кровли сняты, въездные ворота истреблены, в избах полы, а частью и стены разобраны.	5000	
Рудковщина. В доме окна вовсе выломаны и двери повреждены, в экономических амбарах двери и полы выломаны, в винокурном заводе горны разорены, медная посуда из оных вынута, двери и окна выломаны, мельница близь винокурни повреждена. К оному фольфарку корчма вовсе разорена.	4250	
Ленполье. В домах выломаны двери на железных крюках и засовах, замки попорчены, брёвна, приготовленные к постройке винокурни, сожжены, вся фольварковая посуда забрана.	3000	
Иваново. В доме выбиты окна и двери выломаны, печи повреждены, замки испорчены, в амбарах двери на железных крюках и петлях, равно и полы выломаны и вся фольварковская глиняная посуда разграблена.	720	
Ангофф. В доме и амбаре двери выломаны, приготовленные к устройству сего фольварка брёвна сожжены, вся посуда разграблена.	250	
Микалиново. В большом господском доме окна выломаны и печи повреждены, в амбарах двери и замки поломаны и ограда сломана.	1000	
Пуплы. Сделано такое же разорение.	700	
Прибужье. В большом господском доме, имеющем положение на горе, при самом фольварке Прибужье с основными коридорами полы и двери повреждены, оборваны со стен обои цветного атласу, окна выбиты, замки у комнатных дверей		

Заканчэнне табл.

1	2	3
обломаны, вся мебель как люстра, зеркала, комоды, кресла, стулья красного дерева и ломберные столики истреблены, печи кафельные разбиты, чашки чугунные и дверцы медные вынуты, в цветнике стеклянные окна разбиты, находящиеся вблизи самого дома рощи вырублены, в флигелях печи попорчены, окна выбиты, двери медные и чашки чугунные вынуты и полы выломаны, равно из фольварковского дома сделано также разорение, а гумно повреждено и в оном двери выломаны, на скотном дворе ворота на железных крюках выломаны и ограда деревянная, разорено в пунях и конюшнях, все железные вещи ограблены.		20 000
В замке Горском, состоящем из трех больших деревянных домов на каменных фундаментах, занавесы разной материи от окон оторваны, комнатные украшения как то: разные портреты, картины и прочая мебель разграблены, а юшки чугунные, дверцы медные из них выняты, хранившаяся в самом замке библиотека из двух тысяч книг разного сочинения, арсенал и гардероб покойного генерал-майора графа Ивана Антоновича разграблен весь без остатка, также разграблены музыкальные инструменты и ноты, составляющие полный оркестр на 42 чел. музыкантов, ворота при въезде в замок с решеткой выломаны, в погребе напитки выбраны, в оранжереях и фруктовых садах деревья поломаны, плоды с них оборваны с сучьями, все огородные овощи ограблены, на местечке служительские дома разорены, а в кузнице все инструменты разграблены.		80 000
В 35 корчмах как то: елионковской, савской, олейниковской, спирденской, лебедевской, скаковской, блажковской, волковской, лихачевской, ташевской, шеваровской, становской, каралевской, голеонковской, губинской, староприбужской, еськовской, городецкой, сазаровской, рекотской, кледневицкой, чепелинской, галышинской, будской, коптевской, воловецкой, алиохновской, цыбульской, радионовской, шарипской, колотильской, пилипской, мошковской, сеньковской и шимановской выломаны двери, окошки, печи, полы и стены: в принадлежащих к сим корчмам амбарах выломаны двери и полы, а другие корчмы и амбары вовсе истреблены.		30 000

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, ф. 2001, воп. 1, спр. 23, л. 34—35.

ПІСЬМО АПЕКУНА ГОРЫ-ГОРАЦКАГА МАЁНТКА ІВАНА НЯПЛЮЕВА МАГІЛЁЎСКАМУ ГУБЕРНАТАРУ

16 сакавіка 1813 г.

Милостивый государь мой, Граф Дмитрий Александрович! Управляющий по высочайшей воле Государя императора, находящейся во вверенной Вашему сиятельству Могилевской губернии, Горы-Горецкого имения покойного Генерал-майора Графа Соллогуба, старший его наследник граф Лев Соллогуб по занятии неприятелем Белорусского края вступил в военную службу по изгнании неприятеля из пределов России, был он Граф Лев Соллогуб послан от главнокомандующего армиями по комиссии в Кострому, и на возвратном пути

своем заезжал в имение. В пребывание свое там навидался он о положении крестьян и о всех бывших заведениях и о экономическом имуществе и представляет мне, что неприятелем все заведения в конец разорены, имущество разграблено, крестьяне также грабительством и поборами доведены до нищеты, многие число их страждает болезнями, и многое число померло, а не менее того удалилось из жительств своих по причине недостаточной в провинции;

по причине таковых крайностей на оное имение разные повинности налагаются не соразмерно против других владельцев, к тому же еще обременяется оно учрежденным в нем Депо и Лазаретами, из коих последний служит причиной распространения возникшей там заразы. Представляет при том Граф Лев Соллогуб, что он подал Вашему сиятельству прошение об оказании защиты имению и крестьянам в отношении нарядов и других повинностей и о предписании Депо и Лазарета перевести в имения не потерпевших таких бедствий.

Я имел долг опекунства, возложенный на меня Государем императором и видя из представления Льва Соллогуба, что имения и крестьяне приведены в крайнее разорение и что при всем том имение несет тягости, несоответственным его положению, обращаются к вам с просьбою, облегчить несчастных крестьян в нарядах и налогах могущих истащить последние их силы и сделать распоряжение, чтобы переведены были Депо и Лазареты в имениях не столько настрадавшие, дабы возникшая в Горы-Горках зараза не приводила крестьян в бессилие доставать им пропитание. Горы-Горецкое имение покойного графа Соллогуба порученное мне в опеку Государем императором, по особенное его императорского величества милости к семейству покойного, долженствует в, теперешнем обстоятельстве по крайней мере получать уравнение к подобным ему, и по уважении того что старший наследник Граф Лев Соллогуб по занятии неприятелем Белоруссии сказал истинное усердие и преданность к Монарху вступлением в военную службу, которую и ныне продолжает с ревностными подвигами и отличием.

В заключение повторяю Вашему Сиятельству просьбу мою и выдаче находящемуся теперь в имении покойного Графа Соллогуба Титулярному Советнику Перепелицыну свидетельство, нужного мне для представления в Государственный банк на отсрочку платежа процентов с заклатой оным под Горы-Горецкое имение суммы и для откомандования в сие имение чиновников для засвидетельствования особо того всех причиненных неприятелем разорений и той крайности в которой теперь находятся крестьяне.

С совершенным почтением и преданностью имею честь быть Вашего Сиятельства покорнейший слуга Иван Неплюев.

16 марта 1813-го года

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, ф. 2001, воп. 1, спр. 23, л. 8.

РАПАРТ ГОРАЦКАГА ПАВЯТОВАГА ПАЛІЦЭЙСКАГА ЎПРАЎЛЕННЯ МАГІЛЁЎСКАМУ ГУБЕРНАТАРУ А. П. БЕКЛЯМІШАВУ АБ ЗАХОПЕ ПАЎСТАНЦАМІ ГОРАК

25 красавіка 1863 г.

С 23 на 24 число сего апреля на рассвете в гор. Горках появилась шайка мятежников, уничтожившая поджогом значительную часть города; она ограбила казначейство и, забрав с собой начальника команды, вышла из города уже часу в четвертом после полудня 24 числа и, как удостоверяют жители окрестных деревень, направилась к гор. Чаусы. При открывшейся перестрелке с солдатами инвалидной команды, защищавшими город, потеря была с обеих сторон, но сколько именно убито, сведений положительных еще не собрано.

Об этом в. п. уездное полицейское управление честь имеет донести с присовокуплением, что вслед за сим подробное донесение будет представлено.

За исправника старший заседатель Фальковский

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, ф. 2001, воп. 3, спр. 163, л. 61.

ПРАВАСЛАЎНЫЯ ЦЭРКВЫ І ПРЫХОДЫ ГОРАЦКАГА ПАВЕТА

Романовское Благочиние	*Число прихожан*	
	муж.	жен.
М. Баево. Вознесенская	377	345
М. Баево. Параскевиевская. Приписная	—	—
С. Городец. Успенская	698	725
М. Романово. Рождества Богородицы	1580	1653
С. Шишево. Св. Константина и Елены	776	769
С. Шарипы. Успенская	528	615
С. Сава. Св. Духа	644	679
С. Чирин. Воскресенская	813	866
С. Липицы. Покровская. Приписная	—	—
С. Михалиново. Св. Духа	899	961
С. Литвиново. Петропавловская	383	406
С. Хольни. Николаевская	487	559
С. Хомино. Вознесенская	486	473
М. Ляды. Св. Духа	330	394
М. Ляды. Покровская	331	372
М. Ляды. Иоанновская	—	—
М. Ляды. Св. Косьмы и Дамиана. Приписная	—	—
С. Кисели. Успенская	243	260
	8629	9077
	17 706	

Копыское Благочиние		
Г. Копысь. Св. Духа	706	
Г. Копысь. Вознесенская	821	
Г. Копысь. Преображенская	963	
М. Александрия. Ильинская	564	609
С. Зубревичи. Вознесенская	788	870
С. Барань. Преображенская	900	981
С. Голошевка. Св. Духа	761	900
М. Кохоново. Николаевская	498	498
С. Езеры. Покровская	300	280
С. Чирчин. Успенская	427	498
С. Слободка. Преображенская	664	720
С. Тросна. Михайловская. Кладбищ.	—	—
С. Слижи. Преображенская	402	421
Д. Окуневка. Петропавловская. Клад.	—	—
	13 571	

Аниковицкое Благочиние		
С. Аниковичи. Ильинская	274	325
С. Козловичи. Св. Митрофания	723	776
С. Любиж. Петропавловская	570	643
С. Маслаки. Рождества Богородицы	790	865
С. Русаки. Св. Духа	445	459
С. Шестаки. Покровская. Приписная	—	—
С. Городище. Николаевская	508	519
С. Караси. Успенская. Приписная	—	—
С. Старое Сельцо. Покровская	500	514
С. Любиничи. Рождества Богородицы	579	658
С. Яковлевичи. Преображенская	462	492
С. Городец. Покровская	287	361
С. Славени. Успенская. Приписная	—	—
	5138	5612
	10 750	

Друкуецца па кн.: Атлас народонаселения Западно-Русского края по исповеданиям. Спб., 1864.

Як дзед Бяляс французаў чаем паіў

Вы не былі ў вёсцы Машкова? Значыць, вы не чулі і цікавай легенды аб тым, як дзед Бяляс французаў чаем паіў. Гэтая легенда перадаецца з пакалення ў пакаленне.

Аднойчы ў вёску Машкова ўвайшоў буйны французскі атрад. Большасць жыхароў паспелі ўцячы ў лес. Але старога дзеда Бяляса французы схапілі і прывялі да афіцэра.

— Ты ест Мурамец? — каверкаючы словы, запытаў ён. — Мы твая вешай на дубовы сук, — і ён паказаў пальцам у бок лесу. — А да таго ты зрабі чай, я люблю чай.

Здаравенны салдат з падбітым вокам павёў дзеда да хаты, загадаў яму запаліць печ і паставіць чыгун вады — чай для пана афіцэра, а сам сеў на парозе вартаваць дзеда.

— Чакайце, — думаў дзед Бяляс, — я вас, панове, напаю чаем, што свету не ўбачыце.

Калі вада закіпела, ён выбраў момант і перакуліў чыгун кіпятку на галаву французу. Той дзіка зароў, а дзед пераскочыў праз яго і сігануў у лес — толькі яго і бачылі.

Раз'юшаныя французы запалілі вёску.

Аднак афіцэру, які абяцаў павесіць дзеда Бяляса на дубовым суку, не давялося вярнуцца ў Францыю. Калі зімой французы пабеглі з Масквы, сяляне, узброеныя віламі-трайчаткамі, узялі ў палон кучку абмарожаных французаў, сярод якіх дзед Бяляс апазнаў і колішняга знаёмага афіцэра. Яго прывялі на папялішча, засыпанае снегам, і вадзілі ад шалаша да шалаша, у якіх юціліся пагарэльцы. Захутаныя ў лахманы бабы галасілі па памерлых ад холаду дзецях і намагаліся ўчапіцца рукамі ў твар афіцэра. Але дзед Бяляс шырокаю спіною загароджваў француза ад насядаўшых жанчын.

— Збірайцеся на сход, судзіць будзем яго па ўсіх правілах, — казаў ён.

Француза павесілі на тым самым дубовым суку, які ён раней аблюбаваў для дзеда Бяляса.

Запісаў П. Лахаданаў.

Аб лёсе музыкантаў графа Салагуба

У пачатку XIX ст. уладальнік Горы-Горацкага маёнтка, палкоўнік у адстаўцы граф Л. І. Салагуб разарыўся на спекуляцыях. Пра яго прыгонны аркестр, якім кіраваў дваранін Сіпайла, даведаліся ў Санкт-Пецярбургу. Паколькі маёнтак быў прызначаны на продаж, клопаты пра перавод музыкантаў у сталіцу ўзяў на сябе міністр імператарскага двара князь П. М. Валконскі.

У лісце да Дырэкцыі імператарскіх тэатраў ад 26 лютага 1829 г. ён пісаў «Калі Горы-Горацкі маёнтак адстаўнога палкоўніка Салагуба па сканчэнні законнага тэрміну не будзе прададзены за даўгі, дык з ліку 29 музыкантаў прызначыць 10 чалавек, што іграюць на скрыпках, віяланчэлях, альтах і кантрабасах, у тэатральную Дырэкцыю».

Пасля таго як салагубаўскіх музыкантаў прывезлі ў сталіцу, яны былі прызначаны: 10 чалавек у тэатральную Дырэкцыю, астатнія 19 у палкі лейб-гвардыі, апошнія былі пераважна музыканты, якія ігралі на духавых інструментах.

Друкуецца па кн.: Гісторыя беларускага тэатра. Т. 1. Мн., 1983. С. 222.

Горацкі павет у канцы XIX ст.

Знаходзіўся на паўночным усходзе Магілёўскай губерні, на мяжы са Смаленскай; плошча — 2487 кв. вёрст, насельніцтва 153 000 жыхароў* (на 1911 г., акрамя г. Горкі). Сярод рэк найбольш значнымі былі Днепр і Проня. На тэрыторыі павета былі 2 возеры, 2090 дзесяцін балот. Асноўным заняткам жыхароў была сельская гаспадарка. Кустарнымі промысламі ў 1881 г. займаліся 4946 жыхароў павета, у 1889 г. на яго тэрыторыі працавалі 22 фабрыкі і заводы.

У Горацкім павеце было 6 мястэчак: Баева, Дуброўна, Ляды, Росасна, Зарэчны Шклоў, Раманава і заштатны г. Копысь.

* Далей жых.

У Горацкі павет уваходзіла 12 валасцей, 6 з іх сёння знаходзяцца за межамі Горацкага раёна: Дубровенская, Любініцкая, Нічыпаровіцкая, Пугляеўская, Сватошыцкая, Халбнянская. Ніжэй прыводзяцца звесткі пра тыя воласці, якія часткай або поўнасцю ўвайшлі ў Горацкі раён.

Баеўская воласць (цэнтр мяст. Баева) налічвала 13 сельскіх таварыстваў, 38 населеных пунктаў, 802 двары*, 6302 жых. (на 1885 г.). Найбольш значныя населеныя пункты, акрамя мяст. Баева, сёлы Кісялі (18 дв., 130 жых., меліся царква, багадзельня, вадзяны млын); Міхалінава (40 дв., 308 жых., царква, багадзельня, вадзяны млын). На тэрыторыі воласці таксама знаходзіліся народныя вучылішчы Міністэрства народнай асветы (МНА) і царкоўнапрыходскія школы (ЦПШ) у вёсках Асташкавічы, Людзінічы, Куртасы, Дзям'янаўка, Кісялі; млыны ў вёсках Слатоўшчына, Казарынава, Старына, Міколенка, Асташкавічы, Кулакоўшчына, Валькова. Жыхары воласці займаліся наступнымі промысламі (на 1880 г.): кушнерскім у мяст. Баева — 2 чал., с. Кісялі — 2 чал., вёсках Карышкова — 2 чал., Сысоева (20 дв., 152 жых.) — 2 чал.; кравецкім у мяст. Баева — 4 чал., с. Міхалінава — 4 чал., вёсках Бацвінева (19 дв., 94 жых.) — 4 чал., Асташкавічы — 2 чал., Дзям'янаўка — 2 чал., Парэжэнкаў — 2 чал., Карышкова — 4 чал., Ірвяніца — 2 чал., Жалезкава — 2 чал.

Гарадзішчанская воласць (валасное праўленне ў в. Літвінавічы) налічвала 23 сельскія таварыствы, 27 населеных пунктаў, 931 дв., 6589 жых. (на 1885 г.). Найбольш значныя населеныя пункты на тэрыторыі воласці: в. Літвінавічы (63 дв., 406 жых.), с. Любіж (65 дв., 436 жых., царква), в. Ордаць (95 дв., 604 жых.), в. Чамаданы (91 дв., 569 жых.), с. Шастакі (33 дв., 226 жых., царква). На тэрыторыі воласці таксама знаходзіліся паштова-тэлеграфнае аддзяленне ў Засценках; цэрквы ў вёсках Русакі, Акунёўка, Вялікія Сліжы; вучылішча МНА і ЦПШ у вёсках Гарадзішча, Чамаданы, Сліжы, Карасі, Любіж, Аўсянка, Цімохаўка, Ордаць; прыёмны пакой у в. Гарадзішча; казённыя вінныя лаўкі ў вёсках Гарадзішча, Варкава, Ордаць; млыны ў вёсках Чамаданы, Навасёлкі, Сарціслаў, Ходараўка, Аўсянка, Душкаўка, Шастакі, Ордаць, Благаўка; лесапільны завод у в. Аўсянка. Жыхары воласці займаліся наступнымі промысламі (на 1880 г.): вытворчасцю драўляных вырабаў і посуду ў в. Рудня — 50 чал.; бандарным у с. Любіж (75 дв., 314 жых.) — 126 чал., вёсках Аўсянка (35 дв., 160 жых.) — 52 чал., Крыўцы — 28 чал., Гулідаўка (23 дв., 123 жых.) — 48 чал., Ходараўка (21 дв., 116 жых.) — 64 чал.

Горацкая воласць (цэнтр у Зарэчанскай Сотні г. Горкі) налічвала 11 сельскіх таварыстваў, 23 населеныя пункты, 643 дв., 4249 жых. (на 1885 г.). Найбольш значныя населеныя пункты на тэрыторыі воласці: Горная і Казіміраўская Сотні (Зарэчанская Сотня) — часткі г. Горкі — 300 дв., 1910 жых., с. Шышава — 36 дв., 257 жых. На тэрыторыі воласці знаходзіліся Горацкая паштова-тэлеграфная кантора; праваслаўныя цэрквы, а таксама вучылішчы МНА і ЦПШ у Казіміраўскай Сотні, Горнай Сотні г. Горкі, с. Шышава; млыны ў Зарэчанскай Сотні г. Горкі, вёсках Шыманоўка, Задарожжа, Ваўкоўшчына, Зайцава, Шалаханаўка. Жыхары воласці займаліся наступнымі промысламі (на 1880 г.): кушнерскім у г. Горкі (150 дв., 807 жых.) — 2 чал.; кравецкім у Казіміраўскай Сотні г. Горкі (150 дв., 807 жых.) — 6 чал.; вытворчасцю драўляных вырабаў і посуду ў с. Шышава (25 дв., 50 жых.) — 20 чал.; калёсным у вёсках Чашнікі (89 дв., 140 жых.) — 12 чал., Шалаханаўка (16 дв., 58 жых.) — 6 чал.; калёсным у вёсках Чашнікі — 12 чал., Шалаханаўка — 6 чал.

Маслакоўская воласць (цэнтр с. Маслакі) налічвала 21 сельскае таварыства, 32 населеныя пункты, 929 дв., 6259 жых. (на 1885 г.). Найбольш значныя населеныя пункты на тэрыторыі воласці: сёлы Маслакі (99 дв., 558 жых., меліся валасное праўленне, царква, ЦПШ, прыёмны пакой, казённая вінная лаўка, млын, лесапільны завод. У 12 в. ад сяла знаходзілася паштовая станцыя Засценкі), Анікавічы (41 дв., 250 жых., царква, вучылішча МНА, вадзяны млын), Казловічы (92 дв., 589 жых., царква, багадзельня, школа, казённая вінная лаўка), Стара-Сялец (32 дв., 196 жых., царква, вадзяны млын, школа), Якаўлевічы (46 дв., 286 жых., царква, школа, млын). На тэрыторыі воласці таксама размяшчаліся паштова-тэлеграфны аддзел на ст. Засценкі, яўрэйскі малітоўны дом у аколіцы Напраснаўка, вучылішчы МНА і ЦПШ у вёсках Ермалоўка, Лявонаўка, Сідаравічы, Хамінічы, Турлаеўка; млыны ў маёнтку Сяльцы, в. Сцяпкова. Жыхары воласці займаліся

* Далей дв.

наступнымі промысламі (на 1880 г.): абутковым у с. Маслакі — 2 чал.; вытворчасцю драўляных вырабаў і посуду ў вёсках Лявонаўка (40 дв., 219 жых.) — 65 чал., Турлаеўка (52 дв., 258 жых.) — 8 чал., Ермалоўка (33 дв., 210 жых.) — 28 чал., с. Маслакі — 10 чал.; вытворчасцю вырабаў з лыка і кары ў с. Маслакі — 290 чал., вёсках Хамінічы (56 дв., 282 жых.) — 140 чал., Ермалоўка — 100 чал., Турлаеўка — 135 чал., Чорнае (33 дв., 207 жых.) — 90 чал., Люціна (28 дв., 60 жых.) — 88 чал., Ліца (30 дв., 142 жых.) — 67 чал., Шапялёўка (38 дв., 209 жых.) — 106 чал., Міхайлавічы (7 дв., 19 жых.) — 15 чал., Пална (15 дв., 71 жых.) — 37 чал., Тушавая (18 дв., 68 жых.) — 39 чал.; калёсным промыслам у с. Маслакі — 22 чал., вёсках Шапялёўка — 38 чал., Міхайлавічы — 3 чал.; сталярным промыслам у аколіцы Напраснаўка (30 дв., 125 жых.) — 2 чал., в. Шапялёўка — 4 чал.; бандарным промыслам у с. Маслакі — 35 чал., вёсках Хамінічы — 70 чал., Сідаравічы (43 дв., 235 жых.) — 17 чал.; кавальскім промыслам у с. Маслакі — 3 чал., в. Міхайлавічы — 3 чал.

Раманаўская воласць (раней Шаўнеўская, цэнтр мяст. Раманава) налічвала 17 сельскіх таварыстваў, 32 населеныя пункты, 788 дв., 5906 жых. (на 1885 г.). Найбольш значныя населеныя пункты воласці (акрамя мястэчка): в. Шаўнева (42 дв., 269 жых., млын), с. Гарадзец (40 дв., 232 жых., царква, багадзельня, школа, млын). На тэрыторыі воласці таксама знаходзіліся паштова-тэлеграфнае аддзяленне, яўрэйскі малітоўны дом, царква ў мяст. Раманава, вучылішчы МНА і ЦПШ у мяст. Раманава, вёсках Кацярынгоф, Сакалоўка, Каменка, прыёмны пакой і казённая вінная лаўка ў мяст. Раманава, млыны ў мяст. Раманава, вёсках Стараселле, Андзекалава, Асталопава, Блажкі, Буда, Валынцава, Гушчына, Кацярынгоф, Каменка, Канюхі, Лукі, Навасёлкі, Акушкі, Аршані, Першына, Палішына, Саракапуды, Турышчава, Ходараўка, Клімацічы, вінакурныя заводы ў маёнтках Раманава і Стафанова. Жыхары воласці займаліся наступнымі промысламі (на 1880 г.): кушнерскім у вёсках Акушкі (30 дв., 179 жых.) — 4 чал., Андзекалава (54 дв., 394 жых.) — 2 чал.; кравецкім у вёсках Шаўнева — 4 чал., Андзекалава — 6 чал.

Саўская воласць (цэнтр с. Сава) налічвала 24 сельскія таварыствы, 33 населеныя пункты, 732 дв., 4924 жых. (на 1885 г.). Найбольш значныя населеныя пункты ў воласці: сёлы Сава (43 дв., 280 жых., меліся валасное праўленне, царква, багадзельня, школа, вадзяны млын, казённая вінная лаўка), Шарыпы (32 дв., 200 жых., царква, багадзельня, школа). На тэрыторыі воласці таксама размяшчаліся вучылішчы МНА і ЦПШ у вёсках Масалыкі, Красуліна, Паташы, Філіпава, Зубры, Мышкаўка, казённая вінная лаўка ў в. Рудкаўшчына, млыны ў вёсках Сенькава, Зубры, Казлы, Мышкаўка, Радзівонаўка, Маралёўка, Юркава, Цяплухі, Лугіны, Філіпава, Масалыкі, Рэкта, Ульяшына. Сяляне дзвюх вёсак займаліся кравецкім промыслам (на 1880 г.): Мацюты (22 дв., 175 жых.) — 2 чал., Шарыпы (56 дв., 396 жых.) — 4 чал.

У склад тэрыторыі сучаснага Горацкага раёна ўваходзілі часткі Гарадзецкай і Горскай валасцей Чавускага павета Магілёўскай губерні.

Гарадзецкая воласць (цэнтр с. Гарадзецк) налічвала 16 сельскіх таварыстваў, 29 населеных пунктаў, 966 дв., 5713 жых. (на 1885 г.). Найбольш значныя населеныя пункты воласці: сёлы Гарадзецк (41 дв., 202 жых., меліся валасное праўленне, царква, багадзельня, школа, прыёмны пакой, казённая вінная лаўка), Клядневічы (91 дв., 521 жых., царква, багадзельня, вадзяны млын, школа, казённая вінная лаўка). На тэрыторыі воласці таксама знаходзіліся: царква ў с. Добры Двор, вучылішчы ў вёсках Новае Прыбужжа, Старакожаўка, Старое Прыбужжа, Асінаўка, Рэкатка, Панкратаўка, Еськаўка, Стан, с. Добры Двор, казённая вінная лаўка ў в. Зубараўка, млыны ў вёсках Тушкава, Старакожаўка, Нікольск, Саф'янполле, Рэкатка, Панкратаўка, Стан, Галышына, Асінаўка, выселках Добры Двор, калоніі Анінгоф. Жыхары воласці займаліся наступнымі промысламі (на 1880 г.): кушнерскім у вёсках Старакожаўка (72 дв., 440 жых.) — 4 чал., Саф'янполле (25 дв., 125 жых.) — 4 чал., Пералогі (29 дв., 150 жых.) — 2 чал.; кравецкім у вёсках Старакожаўка — 8 чал., Старое Прыбужжа (69 дв., 382 жых.) — 5 чал., Галышына (31 дв., 184 жых.) — 6 чал., Асінаўка (12 дв., 88 жых.) — 2 чал., абутковым у вёсках Новае Прыбужжа (70 дв., 448 жых.) — 2 чал., Нікольск (52 дв., 318 жых.) — 2 чал.; вытворчасцю драўляных вырабаў і посуду ў вёсках Новае Прыбужжа — 16 чал., Старое Прыбужжа — 19 чал., Машкова (24 дв., 137 жых.) — 8 чал., Рэкатка (49 дв., 255 жых.) — 12 чал., Сахараўка (27 дв., 169

жых.) — 6 чал., Панкратаўка (32 дв., 216 жых.) — 6 чал., с. Гарадзецк — 10 чал.; вытворчасцю вырабаў з лыка і кары ў вёсках Сахараўка — 4 чал., Рэкатка — 5 чал., Машкова — 3 чал.; калёсным промыслам у вёсках Машкова — 3 чал., Панкратаўка — 6 чал., Балбечына (32 дв., 236 жых.) — 3 чал., Старакожаўка — 5 чал.; бандарным промыслам у вёсках Машкова — 3 чал., Панкратаўка — 5 чал.; такарным промыслам у вёсках Машкова — 5 чал., Рэкатка — 3 чал., Сахараўка — 2 чал.; кавальскім промыслам у вёсках Старакожаўка — 3 чал., Крукаўшчына (36 дв., 286 жых.) — 3 чал.; рамізніцкім промыслам у с. Гарадзецк — 28 чал., вёсках Міхееўка — 11 чал., Новае Прыбужжа — 27 чал., Старое Прыбужжа — 60 чал., Пералогі (29 дв., 150 жых.) — 10 чал., Рэкатка — 37 чал., Сахараўка — 23 чал., Балбечына — 34 чал., Панкратаўка — 40 чал., Стан (49 дв., 362 жых.) — 27 чал., Тушкава (41 дв., 218 жых.) — 35 чал., Галышына — 14 чал., Ермакі (17 дв., 124 жых.) — 10 чал., Равячына (18 дв., 111 жых.) — 20 чал., Язычкава (18 дв., 91 жых.) — 8 чал., Асінаўка (12 дв., 88 жых.) — 10 чал., Крукаўшчына (36 дв., 286 жых.) — 43 чал., Ярыгі (39 дв., 230 жых.) — 46 чал., Старакожаўка — 86 чал., Нікольск (52 дв., 318 жых.) — 18 чал., Еськаўка (31 дв., 219 жых.) — 14 чал., с. Клядневічы — 50 чал., калоніі Анінгоф (7 дв., 24 жых.) — 9 чал.

Горская воласць (цэнтр мяст. Горы) налічвала 18 сельскіх таварыстваў, 26 населеных пунктаў, 907 дв., 6155 жых. (на 1885 г.). Найбольш значныя населеныя пункты воласці, акрамя мяст. Горы, с. Кацялёва (20 дв., 102 жых., 2 царквы, багадзельня, школа, млын). На тэрыторыі воласці таксама знаходзіліся царква і малітоўны дом у мяст. Горы, вучылішчы МНА і ЦПШ у мяст. Горы, вёсках Буда, Каралёўка, Лебедзева, Мядзведзева, Нівішчы, Паршына, прыёмны пакой і казённая вінная лаўка ў мяст. Горы, млыны ў вёсках Азаравічы, Буда, Каралёўка, Кварцяны, Кузавіна, Лебедзева, Мядзведзева, Мікуліна, Марозава, Нівішчы, Целяшоўка, Паляшчыцы, Паршына, мяст. Горы. Жыхары воласці займаліся наступнымі промысламі (на 1880 г.): кушнерскім у в. Кварцяны (37 дв., 209 жых.) — 6 чал.; кравецкім у в. Тосна (20 дв., 140 жых.) — 4 чал., мяст. Горы (199 дв., 1004 жых.) — 10 чал.; абутковым у мяст. Горы — 8 чал.; кавальскім у мяст. Горы — 10 чал., вёсках Мядзведзева (67 дв., 428 жых.) — 3 чал., Мікуліна (28 дв., 180 жых.) — 3 чал.

У 1881 г. на тэрыторыі Горацкага павета працавалі наступныя фабрыкі і заводы: *гарбарныя заводы* Радчанкі Максіма, селяніна, мяст. Дуброўна, засн. у 1860 г.; Кароткіна Дзяніса, селяніна, мяст. Дуброўна, засн. у 1860 г.; Эйдзінава Залмана, мешчаніна, мяст. Ляды, засн. у 1845 г.; Эйдзінава Залмана, мешчаніна, мяст. Ляды, засн. у 1871 г.; Эйдзінава Нота, мешчаніна, мяст. Ляды, засн. у 1855 г.; Засценкіна Гершана, мешчаніна, мяст. Ляды, засн. у 1870 г.; *сукнавальні* Гельтцля Уладзіміра, двараніна, с. Гарадзішча, засн. у 1865 г., Станкевіч Марыі, дваранкі, ф. Малыя Сліжы, засн. у 1855 г.; Ватацы Веры, жонкі ген.-лейт., ф. Анікавічы, засн. у 1858 г.; Цукаты Рыгора, графа, ф. Маслакі, засн. у 1830 г.; Пракаповіча Аляксандра, ф. Стары Сялец, засн. у 1843 г.; Ваейкава Мікалая, двараніна, ф. Ніжнія Пруды, засн. у 1860 г.; Любамірскага Яўгена, князя, в. Цілівічы, засн. у 1750 г., мяст. Росасна, засн. у 1881 г., мяст. Баева, засн. у 1831 г., с. Міхалінава, засн. у 1876 г., с. Кісялі, засн. у 1880 г.; Рэйна Аскара, генерала, ф. Бабінічы, засн. у 1850 г.; Таварыства сялян в. Казарынава, засн. у 1878 г.; Дандукова-Корсакава Аляксея, князя, мяст. Раманава, засн. у 1819 г.; *талесны завод* Гешаля Нохіма і Меера Сахерава, купцоў, мяст. Дуброўна, засн. у 1750 г.; *піваварня* Вязнера Мардуха, купца, г. Копысь, засн. у 1848 г.; *маслабойні* ў г. Горкі Вільнера Мардуха, мешчаніна, засн. у 1861 г.; Муравіна Лейвіка, мешчаніна, засн. у 1872 г., Любізера Велька, мешчаніна, засн. у 1876 г.; Пеўзнера Іцкі, мешчаніна, засн. у 1873 г.; Чарняка Абрама, мешчаніна, мяст. Ляды, засн. у 1880 г.; *крупадзёрні* ў г. Горкі Гаўрылава Піліпа, мешчаніна, засн. у 1873 г.; Лейкіна Яўзера, мещчаніна, засн. у 1878 г.; Гурэвіча Сымона, мешчаніна, засн. у 1877 г.; Амнуэля Сора, мешчаніна, засн. у 1874 г.; Ватацы Веры, ф. Анікавічы, засн. у 1858 г.; Чачковай Веры, дваранкі, в. Лешча, засн. у 1865 г.; Шнеерсона Мойшы, мешчаніна, мяст. Ляды, засн. у 1870 г.; Слуцкага Моські, мешчаніна, мяст. Ляды, засн. у 1871 г.; Майзеля Рохлі, мешчаніна, мяст. Ляды, засн. у 1871 г.; *крупчатныя заводы* Магілёўскага Кафедральнага Іосіфаўскага Сабора, в. Церахавы Пруды, засн. у 1864 г.; Казлоўскага Сільвестра, селяніна, Мацееўшчына, засн. у 1872 г.; *драждавы завод* Чачковай Веры, дваранкі, ф. Ляўкі, засн. у 1871 г.; *крухмальны завод* Чачковай Веры, дваранкі, ф. Смятанка, засн. у

1871 г.; *цагельны завод* Брэмзена Мікалая, барона, ф. Спасок, засн. у 1876 г.; *кафельныя заводы* Чачковай Веры, дваранкі, ф. Смятанка, засн. у 1850 г.; Песельніка Іцкі, купца, г. Копысь, засн. у 1874 г.; Гінзбурга Янкеля, купца, г. Копысь, засн. у 1876 г.; Гурэвіча Мойшы, мешчаніна, г. Копысь, засн. у 1876 г.; *чыгуна-ліцейны завод* пры Горы-Горацкім земляробчым вучылішчы Ведамства Дзяржаўных маёмасцей, засн. у 1859 г.; *вінакурні* (за 1880—81 гг.) Ліўшыца Лейбы і інш., мяшчан, г. Копысь, засн. у 1872 г.; Любамірскага Яўгена, князя, ф. Станіслававa, засн. у 1750 г.; Любамірскага Яўгена, князя, ф. Зарубы, засн. у 1750 г.; Дандукова-Корсакава, князя, ф. Раманава, засн. у 1821 г.; Цэкерта Дзмітрыя, двараніна, ф. Усвяты, засн. у 1836 г.; Піваварава Захара, мешчаніна, ф. Каз'яны, засн. у 1846 г.

Усяго фабрык і заводаў у Горацкім павеце — 43, у г. Горкі — 11.

Волости и важнейшие селения Европейской России. Спб, 1886.

Список населенных мест Могилевской губернии. Могилев, 1910.

Опыт описания Могилевской губернии/Под ред. А. С. Дембовецкого. Кн. 1—3. Могилев, 1882—1884.

В. Князева.

З гісторыі вёсак

АЎСЯНКА, вёска, цэнтр Аўсянкаўскага сельсавета (з чэрвеня 1992 г.) і калгаса «Аўсянка». Вядома з XVII ст. У 1695 г.— вёска, 12 дв., Кішчыцкага войтаўства Шклоўскага графства, шляхецкая ўласнасць. З 1772 г.— у складзе Расійскай імперыі, Капыскі, з 1861 г. Горацкі павет Магілёўскай губерні. З 1878 г. маёнтак Аўсянка ва ўладанні З. Дзянісава, 194 дзес. зямлі. У 1880 г.— 160 жых., частка вяскоўцаў займалася бандарным промыслам, вырабам розных бытавых рэчаў з лыка і кары. У 1897 г.— 285 жых., Гарадзішчанская вол. У 1909 г.— 374 жых., тут знаходзіліся млын, магазін, школа, лесапільны завод. З 26.04.1919 г.— у Горацкім павеце Гомельскай, з 27.07.1922 г. Смаленскай губерні РСФСР, з 20.08.1924 г. у Любіжскім сельсавеце Горацкага раёна Аршанскай акругі БССР (да 26.07.1930 г.), з 20.02.1938 г. Магілёўскай вобласці. У 1926 г.— 76 дв., 410 жых. У 1934 г. арганізаваны калгас «XVII партз'езд». У ліпені 1941 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. З кастрычніка 1941 г. да лістапада 1942 г. у вёсцы дзейнічала падпольная група (кіраўнік В. К. Асюцін). У сакавіку і верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі вёску (82 дв.), загубілі 7 жых. Вызвалена 26.06.1944 г. На ўскраіне вёскі ў 1973 г. на ўшанаванне памяці загінуўшых у вайне 264 землякоў з вёсак сельсавета (43 з іх жыхары в. Аўсянка), пастаўлена стэла. Пасля вайны вёска і калгас адноўлены. Цяпер вёска — цэнтр калгаса «Аўсянка» (да лютага 1992 г. калгас «XVII партз'езд»). З чэрвеня 1992 г.— цэнтр сельсавета. Тут размешчаны ферма буйной рагатай жывёлы, свінагадоўчы комплекс, пры якім ёсць Дом жывёлавода, машынны двор з Домам механізатара, піларама, асфальтавы завод, а таксама цэхі: камбікормавы, па перапрацоўцы шкур і пашыву мехавых вырабаў. Ёсць гандлёвы цэнтр, Дом быту, аптэка, бальніца, паліклініка, спартыўны комплекс с басейнам, аддзяленне ашчаднага банка, аўтаматычная тэлефонная станцыя, бібліятэка, музычная і сярэдняя школы, дзіцячы сад, клуб, гасцініца. У вёсцы жыве Герой Сацыялістычнай працы, былы старшыня калгаса І. І. Мельнік (нарадзіўся 21.01.1927 г.).

БУДА, вёска, цэнтр Будскага сельсавета і калгаса імя С. Дз. Пагодзіна. У 1785 г.— вёска маёнтка Горы, 27 дв., 180 жых., Чавускі павет Магілёўскай губерні, уладанне графіні Н. Л. Салагубавай. У 1897 г.— 48 дв., 368 жых., Горская воласць Чавускага павета. У 1909 г.— 56 дв., 367 жых., млын. З 8.04.1918 г. вёска ў Горацкім павеце Магілёўскай, з 26.04.1919 г. Гомельскай, з 27.07.1922 г. Смаленскай губерні РСФСР, з 20.08.1924 г. у Кацялёўскім сельсавеце Горацкага раёна Аршанскай акругі (да 26.07.1930 г.), з 6.07.1954 г.— цэнтр сельсавета, з 20.02.1938 г. Магілёўскай вобласці. У 1931 г. у вёсцы арганізаваны калгас «Спартак». У 1940 г.— 64 дв., 417 жых. У ліпені 1941 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У кастрычніку 1943 г. карнікі спалілі 63 дв., загубілі 3 жых. Вызвалена 26.06.1944 г. Пасля вайны адбудавана, адноўлены калгас. 34 вяскоўцы загінулі на франтах вайны. З 21.04.1954 г.— цэнтр узбуйненага калгаса імя А. А. Жда-

нава (цяпер імя С. Дз. Пагодзіна). У вёсцы размешчаны 4 жывёлагадоўчыя фермы, машынны двор, магазін, аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, бібліятэка, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва, пачатковая школа, дзіцячы сад, клуб, лазня.

ГОРЫ, вёска, цэнтр сельсавета (з 20.08.1924 г.) і калгаса імя Свярдлова. Вядома з XV ст., маёнтак асобнай галіны кн. Друцкіх-Горскіх, у складзе Аршанскага павета Вялікага княства Літоўскага. У 1501 г. у час вайны паміж Княствам і Маскоўскай дзяржавай Горы наведаў літоўскі ваявода Станіслаў Белы з часткай войска. У 1508 г. адпаведна Грамаце кн. М. І. Мсціслаўскага Горы прыпісаны да існаваўшага непадалёк Нікольскага манастыра. У канцы XVI ст. мястэчка часткова ва ўладанні Сапегаў. У 1619 г. Горы атрымалі магдэбургскае права. У 1654 г. — занята і разрабавана рускімі войскамі пад камандаваннем А. Н. Трубяцкога. У 1660 г. уладальнік мястэчка кн. Палубенскі (атрымаў мястэчка і маёнтак з пасагам жонкі з Друцкіх-Горскіх) выдаў дазвол на будаўніцтва тут праваслаўнай царквы. Потым зноў ва ўладанні Сапегаў. Нядоўгі час уладальнікам мястэчка быў кн. Меншыкаў. З 1772 г. — у складзе Расіі. У 1785 г. — мястэчка Чавускага павета, 146 дв., 930 жых., уладанне кн. Салагубаў; тут размяшчаліся замак (гаспадарскі дом, які складаўся з 3-х вялікіх драўляных дамоў), млын, кузня, царква. У 1811 г. пачала працаваць палатняная фабрыка, якая ў канцы 20-х — пачатку 30-х гадоў XIX ст. была самай вялікай прыгоннай фабрыкай на Беларусі. Яна прыносіла памешчыку, а з 1829 г. казне вялікія даходы (10—15 тыс. руб. у год). У 1828 г. фабрыка размяшчалася ў 4 флігелях, налічвала 85 станкоў, працавалі 137 прыгонных сялян. Тут перапрацоўвалася пража, што рыхтавалася па хатах сялянкамі з ільну і пянькі, і выраблялася фламскае, равендучнае, паўпаруснае палатно. Аплата працы на фабрыцы была нізкай, прычым жанчыны атрымлівалі ў 2 разы менш. Толькі ў 1837 г. Магілёўская казённая палата дазволіла ўпраўляючаму маёнткам павялічыць аплату. У 1844 г. фабрыка зачынена.

У 1812 г. мястэчка і маёнтак разрабаваны напалеонаўскімі войскамі. Страты толькі па Горскаму замку склалі 80 000 руб. Была вывезена мэбля, карціны, бібліятэка (2 тыс. кніг), музычныя інструменты. У 1829 г. мястэчка і маёнтак за даўгі ўладальніка аддадзены ў падпарадкаванне Магілёўскай казённай палаты. У 1860 г. Горы налічвалі 140 дамоў, 1199 жых., тут знаходзіліся царква, яўрэйская малітоўная школа, сукнавальнае прадпрыемства (заснавана ў 1871 г.), школа (адчынена ў 1846 г.). У 1861 г. пачало працаваць народнае вучылішча. У 1880 г. — 1332 жых., у 1885 г. — мястэчка, цэнтр воласці Чавускага павета, 130 дв., 789 жых., валасное праўленне, 2 царквы, яўрэйскі малітоўны дом, школа, вадзяны млын, 11 лавак. У 1909 г. — 285 дв., 1615 жых., меліся народнае вучылішча, дзе ў 1907/08 навучальным годзе вучыліся 40 вучняў, прыёмны пакой, паштова-тэлеграфны аддзел, пажарная дружына (з 1902 г.), паштовая станцыя на шляху Горкі — Шамава, млын, казённая вінная лаўка. З 26.04.1919 г. мястэчка ў Гомельскай губерні, з 4.05.1922 г. у Горацкім павеце, з 27.07.1922 г. у Смаленскай губерні РСФСР, з 3.03.1924 г. у складзе БССР, з 20.08.1924 г. — цэнтр сельсавета Горацкага раёна Аршанскай акругі (да 26.07.1930 г.), з 20.02.1938 г. Магілёўскай вобласці. У 1930 г. арганізаваны калгас «Чырвоны Сцяг». У вёсцы дзейнічалі 2 млыны: вадзяны, з 1917 г., і нафтавы, з 1932 г. З 1930 г. працавала кавальская майстэрня арцелі «Перамога». Працаваў маслазавод, з 1933 г. — ільнозавод. У 1940 г. — 200 дв., сярэдняя школа, бальніца, аптэка, 2 магазіны, нарыхтоўчы і харчовы ларкі, Горская МТС (з 2-й паловы 1930-х гадоў). З ліпеня 1941 г. па 29.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. карнікі спалілі 180 дв., знішчылі 93 вяскоўцаў. 474 жыхары 10 вёсак Горскага сельсавета (тэрыторыя калгаса імя Свярдлова) загінулі ў баях з гітлераўцамі. На ўшанаванне памяці зямлякоў у 1967 г. у цэнтры вёскі ўстаноўлены помнік. 538 воінаў Савецкай Арміі загінулі ў баях за вызваленне вёскі ў 1943 г. і ў баях 1943—44 гг. на тэрыторыі раёна. Пахаваны ў цэнтры вёскі. З 1944 г. адноўлены калгас, Горская МТС (працавала да 1958 г.), з 1950 г. Горы — цэнтр узбуйненага калгаса «Чырвоны Сцяг», з 1954 г. — калгаса імя Н. С. Хрушчова; з 1957 г. калгас названы імем Свярдлова; з 1960 г. Горы — цэнтр сучаснага калгаса, СГА «Гарское». У вёсцы размешчаны выканком сельсавета, праўленне СГА «Гарское», клуб, бібліятэка, бальніца, аптэка, сярэдняя школа, дзіцячы сад, аддзяленні сувязі і ашчаднага банка, сталовая,

магазін, жывёлагадоўчая ферма, млын, гаспадарчы двор.

Вёска — радзіма першага старшыні Анадырскага рэўкома (Чукотка) М. С. Мандрыкава (1888 г.— 2.02.1920 г.). Помнік на радзіме ўстаноўлены ў 1984 г.

ДОБРАЯ, вёска, цэнтр Добраўскага сельсавета (з 18.02.1972 г.) і калгаса «Праўда». У 1785 г.— вёска, 36 дв., 249 жых., у складзе Горы-Горацкага маёнтка Чавускага павета Магілёўскай губерні, уладанне графіні Н. Л. Салагубавай. У 1897 г.— 44 дв., 312 жых., Гарадзецкая воласць Чавускага павета, школа граматы. У 1909 г.— 54 дв., 395 жых., працавала школа граматы. З 26.04.1919 г. у Гарадзецкай воласці Чавускага павета Гомельскай губерні, з 4.05.1922 г. у Горацкім павеце, з 27.07.1922 г. Смаленскай губерні РСФСР, з 18.02.1923 г. у Горацкай воласці, з 20.08.1924 г. у Панкратаўскім сельсавеце Горацкага раёна Аршанскай акругі БССР (да 26.07.1930 г.), з 20.02.1938 г. Магілёўскай вобласці. У 1926 г.— вёска, 54 дв., 281 жых. і хутары, 13 дв., 82 жых. У 1931 г. арганізаваны калгас «Пэўны шлях». У ліпені 1941 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. З кастрычніка 1941 г. да лістапада 1942 г. у вёсцы дзейнічала падпольная група пад кіраўніцтвам Д. Ф. Вайстровай. Вызвалена 26.06.1944 г. 263 жых. з вёсак Добраўскага сельсавета загінулі ў вайне. На ўшанаванне іх памяці ў 1978 г. каля будынка Дома культуры пастаўлена стэла. З 1960 г.— цэнтр калгаса «Праўда». Тут размешчаны майстэрні па рамонту сельскагаспадарчай тэхнікі і сталярна-плотніцкая, лесанарыхтоўчае прадпрыемства, жывёлагадоўчая ферма, магазін, Дом культуры, дзіцячы сад-яслі, аддзяленне сувязі, сталовая, фельчарска-акушэрскі пункт, аўтаматычная тэлефонная станцыя, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва, бібліятэка.

Вёска — радзіма аднаго з кіраўнікоў партызанскага руху ў Магілёўскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, камісара партызанскай брыгады 61-й Дз. Ф. Вайстрова.

ЗУБРЫ, вёска ў Саўскім сельсавеце, чыгуначная станцыя на лініі Орша — Крычаў. У 1785 г.— вёска, 27 дв., 179 жых., уладанне графа І. А. Салагуба, Копыскі павет Магілёўскай губерні. У 1897 г.— 41 дв., 227 жых., у Саўскай вол. Горацкага павета. У 1910 г.— 48 дв., 356 жых., працаваў млын, дзейнічала школа граматы (з 1905 г.), у якой ў 1907 г. вучыліся 32 хлопчыка і 6 дзяўчынак. З мая 1917 г. на працягу 5 месяцаў працаваў лесапільны завод, які належаў Маканоўскаму і Лейтману. З 27.04. 1919 г.— вёска Гомельскай, з 27.07.1922 г. Смаленскай губерні РСФСР, з 18.02. 1923 г. у Горацкай вол., з 20.08.1924 г. у Рудкаўшчынскім сельсавеце Аршанскага раёна і акругі (да 26.07.1930 г.), з 5.04. 1935 г. Горацкага раёна, з 20.02.1938 г. Магілёўскай вобласці, з 26.06.1954 г. у Саўскім сельсавеце. У 1926 г.— 59 дв., 308 жых.; завод і млын, 15 дв., 43 жых.; хутары: 21 дв., 122 жых. і 9 дв., 30 жых. У 1934 г. вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «XX МЮД». З ліпеня 1941 г. да 26.06. 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У 1944—58 гг. на тэрыторыі вёскі размяшчалася Зубраўская МТС. З 1954 г. у складзе калгаса імя І. В. Мічурына. Тут размешчаны чыгуначны вакзал, пачатковая школа, аддзяленне сувязі, дзве крамы, фельчарска-акушэрскі пункт, лясніцтва, жывёлагадоўчая ферма.

Вёска — радзіма генерал-лейтэнанта авіяцыі Н. Э. Глушанкова (14.03.1902— 20.12.1959 гг.).

КОПЦЕЎКА — вёска, цэнтр сельсавета (з 19.01.1960 г.) і саўгаса «Копцеўскі». У 1765 г.— сяло Копцеўскага староства Мсціслаўскай правінцыі, уладанне Лапацінскага. З 1772 г.— у складзе Расійскай імперыі. У 1785 г.— сяло, цэнтр маёнтка Мсціслаўскага павета, 15 дв., 91 жых., уладанне Ушаковай. Тут знаходзіліся царква (раней была уніяцкая), гаспадарскі дом, млын. З 1814 г. працавала сукнавальня. У 1860 г.— уладанне Цеханавецкіх, 2045 дзес. зямлі, 2 млыны, сукнавальня. У 1885 г.— сяло, 8 дв., 30 жых., Шамаўская воласць Мсціслаўскага павета. У 1909 г. сяло, 8 дв., 71 жых. і фальварак, 27 жых., уладальнік Цеханавецкі, працавалі млын, лесапільня, сукнавальня. З 1913 г. да 1915 г. працаваў вінакурны завод. У 1925 г. саўгас «Копцеўка» арганізаваны на базе маёнтка, меў 197,25 дзес. зямлі, дзейнічалі вадзяны млын, піваварня, з 1925 г.— вінакурны завод. З 26.04.1919 г. у Смаленскай губерні РСФСР, з 3.03.1924 г. у складзе БССР, з 20.06. 1924 г. у Калінінскім павеце, з 20.08. 1924 г. у Чурылаўскім сельсавеце Дрыбінскага раёна Аршанскай акругі (да 26.07. 1930 г.), з 8.07.1931 г. Горацкага раёна, з 12.02.1935 г. Дрыбінскага раёна, з 20.02. 1938 г. Магілёўскай вобласці, з 1959 г. у Горацкім раёне. У 1926 г.— сяло, 16 дв., 66 жых. і вёска, 14 дв., 30 жых. У 1931 г.

арганізаваны калгас «1-е Мая», у тым жа годзе арганізаваны яшчэ адзін калгас — «Пралетарый». З ліпеня 1941 г. да кастрычніка 1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У брацкай магіле, каля будынка выканкома сельсавета, пахаваны 24 воіны, якія загінулі ў баях з гітлераўцамі пры вызваленні вёскі. 531 жыхар з вёсак сельсавета не вярнуліся з палёў вайны, у т. л. 54 жыхары в. Копцеўка. На ўшанаванне іх памяці ў 1968 г. каля будынка канторы саўгаса пастаўлены абеліск. У вёсцы размешчаны машынны двор з рамонтнай майстэрняй, спіртзавод, млын, піларама, комплекс па адкорму буйной рагатай жывёлы, гандлёвы цэнтр, сярэдняя школа, сталовая, бібліятэка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, клуб, аддзяленні сувязі і ашчаднага банка, аўтаматычная тэлефонная станцыя, дзіцячы сад.

ЛЕНІНА (да 10.1918 г. Раманава), вёска, цэнтр сельсавета і племзавода «Леніна». Вядома з XVI ст., упамінаецца ў Дагаварной грамаце 1523 г. аб перамір'і паміж Маскоўскай дзяржавай і Вялікім княствам Літоўскім, падпісанай Васілём III і каралём Сігізмундам, Аршанскі павет Віцебскага ваяводства. У 1529 г. Раманава купіў князь Астрожскі, пазней аддаў яго ў пасаг дачцы Кацярыне. У 1647 г. — мястэчка, 56 дв., гаспадарскі двор, фальварак, вінакурня, млын, сукнавальня, карчма, царква. У час Паўночнай вайны ў верасні 1708 г. тут размяшчаліся атрады рускіх войск. У 1741 г. маёнтак Раманава, уладанне Радзівілаў, 407 дв., у 1777 г. — 395 дв. З 1772 г. — у складзе Расійскай імперыі, мястэчка Аршанскай правінцыі, потым Аршанскага павета Беларускай, з 1802 г. Магілёўскай губерні. У чэрвені 1773 г. пасля адмовы ўладальніка Карла Радзівіла прысягнуць на вернасць імператрыцы Кацярыне II мястэчка з 34 вёскамі ўзята ў казённае кіраванне, а ў 1774 г. пажалавана імператрыцай ва ўладанне князям Дандуковым-Корсакавым. У 1785 г. — памешчыцкае ўладанне, 38 дв., 219 жых. У 1797 г. працавала цаглянае прадпрыемства, а ў 1809—16 гг. — суконна-талесная мануфактура, на якой у 1809 г. працавалі 86 прыгонных сялян і вольнанаёмны майстар. У 1821 г. заснавана вінакурня (працавала да 1914 г.), з 1895 г. дзейнічала паравая машына, у 1880 г. — 11 рабочых. У 1812 г. мястэчка і маёнтак захоплены арміяй Напалеона і разрабаваны. 8.11.1812 г. тут размяшчалася галоўная кватэра М. І. Кутузава. У 1860 г. — 492 жых. У 1880 г. — цэнтр вол., 728 жых., меліся вадзяны млын, бальніца, паштовая станцыя (мела 5 коней), мураваная царква, яўрэйская малітоўная школа, вінакурня і сукнавальня (заснавана ў 1819 г.). У 1862 г. у склад маёнтка Раманава, уладанне кн. Дандуковых-Корсакавых, уваходзілі мяст. Раманава, вёскі Собалева, Стараселле, Логавіны, Майсеева, працавалі вінакурня, два млыны, карчма. У 1895 г. у маёнтку заснаваны вінакурна-рэкціфікацыйны завод. У 1897 г. у мястэчку 958 жых., гарбарны і клеяварны заводы, 7 кузняў, царкоўнапрыходская школа (дзяржаўная) і народнае вучылішча (прыватнае), фельчарскі пункт, паштовае аддзяленне, 21 лаўка, піцейны дом, царква, 2 малітоўныя дамы, 4 разы на год праводзіліся кірмашы, па нядзелях — таржкі. У 1902 г. у народным вучылішчы (Сяргееўскае прыватнае народнае вучылішча) вучыліся 53 хлопчыкі і 4 дзяўчынкі, у 1905/06 навучальным годзе — 50 хлопчыкаў і 30 дзяўчынак, працаваў адзін настаўнік. З 1898 г. дзейнічала пажарная дружына (38 членаў), было 2 пажарныя машыны і трубы, 4 бочкі, 2 лесвіцы. У 1909 г. у мястэчку — 754 жых., у маёнтку — 110. У кастрычніку 1917 г. быў створаны Раманаўскі валасны Савет рабочых і сялянскіх дэпутатаў. Старшыня — С. А. Філіпаў. Была арганізавана партыйная ячэйка, якая ў жніўні 1918 г. аб'ядноўвала 12 членаў РКП(б). З 26.04.1919 г. — вёска ў Гомельскай, з 27.07.1922 г. Смаленскай губерні РСФСР, з 20.08.1924 г. — цэнтр сельсавета Горацкага раёна Аршанскай акругі БССР (да 26.07.1930 г.), з 20.02.1938 г. Магілёўскай вобласці. У 1918 г. было вырашана на базе былога маёнтка арганізаваць саўгас, а таксама назваць яго і мястэчка імем Леніна. У 1926 г. у вёсцы 765 жых. У 1929 г. арганізаваны калгас «Новае жыццё», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 75 гаспадарак. У 1937 г. арганізавана Ленінская МТС. У 1940 г. — 335 жых. У ліпені 1941 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні і снежні 1943 г. поўнасцю спалена гітлераўцамі, загублена 186 жых. На франтах вайны загінулі 16 вяскоўцаў. Вызвалена 2.10.1943 г. 12—13.10.1943 г. у баі каля вёскі атрымалі баявое хрышчэнне воіны 1-й Польскай дывізіі імя Т. Касцюшкі (камандзір З. Берлінг). На ўшанаванне памяці гэтых падзей у вёсцы ў 1968 г. адкрыты Мемарыяльны комплекс. Пасля вызвалення вёска і калгас адноўлены. З 1951 г. Леніна — цэнтр узбуйненага калгаса імя

Кірава (3 вёскі), з 1954 г.— імя К. Я. Варашылава (6 вёсак), з 1957 г.— саўгаса «Леніна», цяпер племзавод.

У вёсцы размешчаны выканком сельсавета, дырэкцыя племзавода, аддзяленне сувязі, Дом быту, Дом культуры, гандлёвы цэнтр, рэстаран, гасцініца, амбулаторыя з пунктам хуткай дапамогі, сярэдняя і музычная школы, бібліятэка, Музей савецка-польскай баявой садружнасці. З 1975 г. працуе Горацкае педвучылішча, якое рыхтуе настаўнікаў пачатковых класаў. Сярод гаспадарчых пабудоў — свінагадоўчы комплекс, ферма буйной рагатай жывёлы, машынны двор.

У сувязі з 25-годдзем баёў пад Леніна 10.10.1968 г. Ленінскі с/с узнагароджаны ордэнам «Крыж Грунвальда» 2-й ступені.

ЛЮБІЖ — вёска ў Аўсянкаўскім сельсавеце, цэнтр сельсавета з 20.08.1924 г. да чэрвеня 1992 г. Вядома з XVI ст., сяло Аршанскага павета Вялікага княства Літоўскага. З 1772 г. у складзе Расійскай імперыі, Копыскі, Горацкі павет Магілёўскай губерні. У 1875 г.— 57 дв., 418 жых., уладанне С. Г. Зорыча, меліся царква, млын. У 1880 г.— 75 дв., 314 жых. Частка вяскоўцаў займаліся вырабам бытавых рэчаў з лыка і кары, бандарным промыслам. У 1885 г.— 65 дв., 436 жых., царква. У 1879 г. маёнтак Любіж ва ўладанні Былеўскіх, 2147 дзес. зямлі, вадзяны млын. У 1909 г.— 106 дв., 694 жых., млын, магазін, царква, царкоўнапрыходская школа. З 26.04.1919 г.— у Горацкім павеце Гомельскай, з 27.07.1922 г. Смаленскай губерні РСФСР, з 20.08.1924 г.— цэнтр сельсавета Горацкага раёна Аршанскай акругі БССР (да 26.07.1930 г.), з 20.02.1938 г. Магілёўскай вобласці. У 1926 г.— 160 дв., 824 жых. У 1931 г. арганізаваны калгас «Адраджэнне», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 28 гаспадарак. У вёсцы працавалі ветраны млын, магазін, кузня. З ліпеня 1941 г. да 26.06.1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У цэнтры вёскі, у дзвюх брацкіх магілах пахавана 11 савецкіх воінаў і 6 партызан. 35 вяскоўцаў загінулі на франтах вайны. Цяпер вёска ў складзе калгаса «Аўсянка». Тут размешчаны ферма буйной рагатай жывёлы, магазін, бібліятэка, клуб.

Вёска — радзіма Героя Савецкага Саюза М. Ф. Шындзікава.

МАСЛАКІ, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса «Шлях Леніна». У сярэдзіне XVII ст. вёска, шляхецкае ўладанне, у Казловіцкім войтаўстве Шклоўскага графства. У 1785 г.— сяло, 65 дв., 586 жых., уладанне С. Г. Зорыча, Копыскі павет Магілёўскай губерні. У 1830 г.— у фальварку Маслакі, уладанне Г. Цукаты, заснавана сукнавальня, працаваў млын. У 1885 г.— сяло, цэнтр воласці Горацкага павета, 99 дв., 558 жых., знаходзіліся валасное праўленне, бальніца, царква, хлебны магазін, школа (з 1875 г.). Жыхары выраблялі абутак, драўляны посуд, вырабы з лыка і кары, займаліся бандарным, кавальскім і іншымі промысламі. У 1889/90 навучальным годзе ў Маслакоўскім аднакласным вучылішчы вучыліся 43 хлопчыкі, 2 дзяўчынкі, у 1905/06 навучальным годзе— 24 хлопчыкі і 29 дзяўчынак, у 1907/08 навучальным годзе — 76 хлопчыкаў, 28 дзяўчынак. У 1898 г. пачало дзейнічаць добраахвотнае пажарнае таварыства (50 членаў, 1 пажарная машына і труба). З 1905 г. працавала казённая вінная лаўка. У 1910 г.— 152 дв., 994 жых., цэнтр вол., дзе знаходзіліся паштовая станцыя, народнае вучылішча, бальніца, хлебны магазін, казённая вінная лаўка. У аднайменным маёнтку было 4 дв., 7 жых. У 1908 г. у сяле адчынены лесапільны завод, які працаваў да 1913 г. У 1918 г. выбраны Маслакоўскі валвыканком, першым старшынёй якога быў абраны А. Драздоў. З 26.04.1919 г.— цэнтр воласці Гомельскай, з 27.07.1922 г. Смаленскай губерні РСФСР, з 3.03.1924 г.— у складзе БССР, з 20.08.1924 г.— цэнтр сельсавета Копыскага раёна Аршанскай акругі (да 26.07.1930 г.), з 8.07.1931 г. Горацкага раёна, з 20.02.1938 г. Магілёўскай вобласці. У 1926 г.— сяло, 215 дв., 1113 жых., і хутары, 18 дв., 89 жых. У 1929 г. вяскоўцы стварылі калгас «Камінтэрн», дзе працавала кузня па рамонту сельскагаспадарчага інвентару. У 1932 г. калгас аб'ядноўваў 65 гаспадарак. У 1939 г. у вёсцы адчыніўся медпункт, дзе працавалі ўрач, фельчар і стаматолаг. Медпункт абслугоўваў 20 калгасаў Маслакоўскага сельсавета. З ліпеня 1941 г. да 27.06.1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У цэнтры вёскі ў скверы пахаваны 2 савецкія воіны і 3 партызаны. За гады вайны загінулі 337 жых. Маслакоўскага сельсавета. У 1983 г. на ўсходняй ускраіне вёскі, на могілках, на ўшанаванне іх памяці ўстаноўлены помнік. З 1957 г.— вёска, цэнтр калгаса «Шлях Леніна» (з 1954 г. калгас імя Маленкова). Тут знаходзяцца 2 жывёлагадоўчыя фермы, млын, лесапільня, машынны двор з рамонтнай майстэрняй, збож-

жаток, Дом культуры, бібліятэка, бальніца, аптэка, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва, сярэдняя школа, дзіцячы сад-яслі, ветэрынарная лячэбніца, аддзяленні сувязі і ашчаднага банка, гандлёвы цэнтр, сталовая, гасцініца, аўтаматычная тэлефонная станцыя, радыёвузел.

ПАЛЁНКА, вёска, у Аўсянкаўскім сельсавеце, цэнтр сельсавета (з 20.08.1924 г. да 21.08.1925 г.; з 24.09.1926 г. да 1931 г.; з 6.07.1954 г. да чэрвеня 1992 г.). З 1772 г. у складзе Расійскай імперыі, Копыскі, з 1861 г. Горацкі павет Магілёўскай губерні. У 1785 г. — вёска маёнтка Сялец, памешчыцкае ўладанне, 26 дв., 273 жых. У 1909 г. вёска Маслакоўскай вол., 35 дв., 278 жых. З 26.04.1919 г. у Горацкім павеце Гомельскай, з 27.07.1922 г. Смаленскай губерні РСФСР, з 20.08.1924 г. цэнтр сельсавета Горацкага раёна Аршанскай акругі (да 26.07.1930 г.), з 21.08.1925 г. да 24.09. 1926 г. і з 1931 г. у Ліхачоўскім сельсавеце, 6.07.1954 г. цэнтр сельсавета, з 20.02.1938 г. Магілёўскай вобласці, з чэрвеня 1992 г. у Аўсянкаўскім сельсавеце. На вясковых могілках пахаваны 4 члены вясковага камітэта беднаты, забітыя бандытамі ў час сялянскага сходу 21.07.1924 г. У 1926 г.— 71 дв., 423 жых. У 1930 г. вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Барацьбіт», мелася кузня па рамонту сельскагаспадарчага інвентару. У 1936 г. каля вёскі была арганізавана Ліхачоўская МТС, працавала да ліпеня 1941 г. У 1940 г.— 92 дв., 447 жых. З ліпеня 1941 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. З кастрычніка 1941 г. да лістапада 1942 г. у вёсцы дзейнічала група падпольшчыкаў пад кіраўніцтвам Ф. М. Дзям'янава. У сакавіку і верасні 1943 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску, загубілі 21 жых. Пасля вайны адбудавана. У цэнтры вёскі ў брацкай магіле пахавана 15 савецкіх воінаў. У час вайны 56 вяскоўцаў загінулі. Вызвалена 26.06.1944 г. Цяпер вёска ў складзе калгаса «Аўсянка». Размешчаны магазін, аддзяленне сувязі, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва.

ПАРШЫНА, вёска, цэнтр сельсавета і племсаўгаса імя В. П. Чкалава. Вядома з XVI ст., сяло Аршанскага павета, шляхецкая ўласнасць. З 1772 г.— у складзе Расійскай імперыі, Чавускі павет. У 1785 г.— вёска ў складзе маёнтка Горы, уладанне Н. Л. Салагубавай, 39 дв., 261 жых. У 1909 г.— вёска Горскай воласці Чавускага павета, 69 дв., 510 жых., меліся млын, народнае вучылішча. З 26.04.1919 г. у Гомельскай, з 27.07.1922 г. Смаленскай губерні РСФСР, з 20.08.1924 г. цэнтр сельсавета Горацкага раёна Аршанскай акругі БССР (да 26.07.1930 г.), з 20.02.1938 г. Магілёўскай вобласці, з 6.07.1954 г. у Будскім сельсавеце, з 20.06.1966 г.— цэнтр сельсавета. У 1926 г.— 49 дв., 257 жых. У 1929 г. вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас «Прамень». У 1940 г. вёска налічвала 97 дв., 350 жых. З ліпеня 1941 г. акупіравана гітлераўцамі. У верасні 1943 г. карнікі поўнасцю спалілі вёску, забілі 2 жых. Вызвалена 26.06. 1944 г. У цэнтры вёскі пахавана 114 савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў 1944 г. 259 вяскоўцаў-землякоў загінулі ў гады вайны. На ўшанаванне іх памяці на ўсходняй ускраіне вёскі ў 1968 г. пастаўлена стэла. З 1965 г. вёска — цэнтр племсаўгаса імя В. П. Чкалава. Тут размешчаны фермы буйной рагатай жывёлы і свінагадоўчая, лесапільня, майстэрня па рамонту тэхнікі, машынны двор, клуб, 2 магазіны, дзіцячы сад-яслі, аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, сярэдняя школа, фельчарска-акушэрскі пункт.

РУДКАЎШЧЫНА, вёска, цэнтр сельсавета (з 20.08.1924 г.). У 1785 г. Рудкаўшчына — сяльцо маёнтка Горы-Горкі, 7 жых., уладанне Н. Л. Салагубавай, у Аршанскім павеце. У час вайны 1812 г. французы абрабавалі фальварак Рудкаўшчына, вінакурны завод, млын і карчму. Агульныя страты склалі 4250 руб. У 1844 г. у склад фальварка ўваходзілі 5 вёсак; тут было ворыва і сенакоснай зямлі 165 дзес. 2300 саж., у сялян — 728 дзес. зямлі. У 1875 г. маёнтак набыў М. М. Іскра, 158 дзес. зямлі. У Рудкаўшчыне размяшчалася паштовая станцыя на тракце з Горак у Оршу. У 1909 г.— калонія Рудкаўшчына, 4 дв., 29 жых., мелася казённая вінная лаўка, у Саўскай воласці Горацкага павета. З 26.04.1919 г.— у Гомельскай, з 27.07.1922 г. Смаленскай губерні РСФСР, з 18.02.1923 г. у Горацкай воласці, з 20.08.1924 г.— цэнтр сельсавета Аршанскага раёна Аршанскай акругі БССР (да 26.07. 1930), з 5.04.1935 г. Горацкага раёна, з 20.02.1938 г. Магілёўскай вобласці. У 1926 г. хутары Рудкаўшчына, 9 дв., 46 жых., і Сталыпінскі хутар (с. Рудкаўшчына), 19 дв., 92 жых. У 1932 г. арганізаваны калгас «Чырвоная Рудкаўшчына». У 1940 г.— 103 дв., 618 жых. У ліпені 1941 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі

захопнікамі. За гады вайны ворагі спалілі 13 дв., загубілі 32 жых. Вызвалена 26.06. 1944 г. На паўднёвай ускраіне вёскі, каля шашы, у брацкай магіле пахавана 12 савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1944 г. На франтах вайны загінулі 53 вяскоўцы. Каля будынка выканкома сельсавета на ўшанаванне памяці 112 землякоў з вёсак Рудкаўшчына, Валаўцы, Казлы, якія загінулі ў баях з гітлераўцамі ў гады вайны, у 1968 г. пастаўлены абеліск. Цяпер вёска — у складзе калгаса імя У. І. Леніна. Размешчаны паляводчая брыгада, машынны двор, фермы буйной рагатай жывёлы і свінагадоўчая, магазін, аддзяленне сувязі, 8-гадовая школа, бібліятэка, клуб, фельчарска-акушэрскі пункт.

РЭКТА, вёска, цэнтр сельсавета (з 21.08. 1925 г. да 24.09.1926 г. і з 1931 г.) і аграгандлёвага прадпрыемства «Горацкае». Вядома з XVI ст., сяло Аршанскага павета, шляхецкая ўласнасць. З 1772 г. — у складзе Расійскай імперыі, Аршанскі павет. У 1785 г. — 46 дв., 360 жых., у складзе маёнтка Горы-Горкі, уладанне Н. Л. Салагубавай. У час вайны 1812 г. вёска абрабавана французскімі войскамі. З 1829 г. — уладанне Магілёўскай казённай палаты. У 1909 г. — вёска Саўскай воласці Горацкага павета, 80 дв., 617 жых., працавалі царкоўнапрыходская школа, млын. З 26.04.1919 г. у Саўскай воласці Горацкага павета Гомельскай, з 27.07.1922 г. Смаленскай губерні РСФСР, з 17.07.1924 г. у Горацкім раёне Аршанскай акругі (да 26.07.1930 г.), з 20.02.1938 г. Магілёўскай вобласці. У 1926 г. на месцы вёскі — хутары, 103 дв. 574 жых. У 1929 г. арганізаваны калгас «Чырвоны асветнік». З ліпеня 1941 г. да 26.06.1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У цэнтры вёскі, каля школы, пахавана 10 савецкіх воінаў і 3 партызаны. Цяпер тут размешчаны машынны двор, жывёлагадоўчая ферма, бібліятэка, магазін, фельчарска-акушэрскі пункт, клуб, 8-гадовая школа, аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, дзіцячы сад, школа мастацтваў.

САВА, вёска, цэнтр сельсавета (з 6.07. 1954 г.) і калгаса імя І. В. Мічурына. Вядома з XVI ст., сяло Аршанскага павета, шляхецкая ўласнасць. З 1772 г. — у складзе Расійскай імперыі, Аршанскі павет. У 1785 г. — сяло маёнтка Горы-Горкі, уладанне Н. Л. Салагубавай, мелася карчма. У час вайны 1812 г. сяло і фальварак Сава разрабаваны французскімі войскамі. У гэты час каля вёскі дзейнічаў партызанскі атрад Д. Давыдава. З 1829 г. сяло і фальварак у падпарадкаванні Магілёўскай казённай палаты. У 1844 г. у склад фальварка ўваходзілі 2 вёскі, 204 дзес. 590 саж. зямлі, у сялян было 884 дзес. У 1885 г. сяло — цэнтр воласці Горацкага павета, 43 дв., 280 жых., меліся царква, вадзяны млын, народнае вучылішча, у якім у 1889/90 навучальным годзе займаліся 22 хлопчыкі і 7 дзяўчынак; у 1902/03 навучальным годзе — 64 хлопчыкі, 5 дзяўчынак. У 1909 г. на месцы вёскі: калонія Сава, дзе размяшчалася валасное кіраванне; выселак, 3 дв., 32 жых., і сяло, 71 дв., 525 жых., дзе працавалі казённая вінная лаўка, хлебны магазін, млын, школа, мелася царква. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі выбраны валасны Савет рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў. З 26.04.1919 г. у Гомельскай, з 27.07.1922 г. Смаленскай губерні РСФСР, з 20.08.1924 г. у Сенькаўскім, з 21.08.1925 г. у Шарыпскім сельсавеце Горацкага раёна Аршанскай акругі (да 26.07.1930 г.), з 20.02.1938 г. Магілёўскай вобласці. У 1926 г. хутары Сава, 134 дв., 660 жых.; выселкі, 12 дв., 50 жых., і калонія, 8 дв., 31 жых. У 1929 г. арганізаваны калгас «Пяцігодка». З ліпеня 1941 г. да 26.06.1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. На ўсходняй ускраіне вёскі ў брацкай магіле пахаваны 3 воіны Савецкай Арміі і 3 партызаны, што загінулі ў 1943—44 гг. Цяпер вёска — цэнтр калгаса імя І. В. Мічурына. Тут размешчаны механічны двор, Дом механізатара, 2 жывёлагадоўчыя фермы, сярэдняя школа, клуб, аддзяленні сувязі і ашчаднага банка, бібліятэка, магазін, дзіцячы сад.

Вёска — радзіма пісьменніка В. П. Каваля (4.08.1907—29.10.1937 гг.).

ХАМІНІЧЫ, вёска, у Рудкаўшчынскім сельсавеце, цэнтр калгаса імя У. І. Леніна. З 1772 г. у складзе Расійскай імперыі, Копыскі, Горацкі павет Магілёўскай губерні. У 1785 г. — вёска, 31 дв., 309 жых., уладанне С. Г. Зорыча. У 1880 г. — у Маслакоўскай вол., 56 дв., 282 жых. Частка сялян вёскі займаліся бандарным промыслам, вырабам бытавых рэчаў з лыка і кары. У 1907 г. адчынена царкоўнапрыходская школа. У 1909 г. — 81 дв., 552 жых. З 26.04. 1919 г. у Маслакоўскай вол. Горацкага павета Гомельскай, з 27.07.1922 г. Смаленскай губерні РСФСР, з 20.08.1924 г. у Маслакоўскім сельсавеце Копыскага раёна Аршанскай акругі (да 26.07.1930 г.), з 3.07.1931 г.

Горацкага раёна, з 20.02.1938 г. Магілёўскай вобласці. У 1926 г. — вёска, 80 дв., 370 жых., і аднайменныя хутары, 37 дв., 193 жых. У 1930 г. вяскоўцы стварылі калгас «Шлях сацыялізму». Дзейнічала лесапілка. Працавалі клуб, школа-сямігодка. У 1940 г. — 180 дв., 601 жых. У ліпені 1941 г. акупіравана гітлераўцамі. Акупанты спалілі 17 дв., усе калгасныя пабудовы, разрабавалі маёмасць. Вызвалена 26.06. 1944 г. У вайну загінулі 72 вяскоўцы. На ўшанаванне памяці загінуўшых у вайну 133 жых. вёсак Хамінічы, Калінаўка, Ермалоўка, Кустоўка ў цэнтры вёскі каля будынка праўлення калгаса ў 1968 г. пастаўлены абеліск. У вёсцы знаходзяцца машынны двор з майстэрняй, лесапільня, сталярна-плотніцкая майстэрня, 2 фермы буйной рагатай жывёлы, 8-гадовая школа, аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, бібліятэка, магазін, дзіцячы сад-яслі, Дом культуры.

Без-Корнилович М. О. Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии с присовокуплением и других сведений к ней же относящихся. Спб., 1855.

Белоруссия в эпоху феодализма. Т. 3. Мн., 1961.

Белоруссия и Литва. Исторические судьбы Северо-Западного края. Спб., 1890.

Болбас М. Ф. Промышленность Белоруссии 1860—1900. Мн., 1978.

Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии. Мн., 1957.

Войстров Д. Ф. В Горецком редколесье. Мн., 1986.

Волости и важнейшие селения Европейской России. Спб., 1886.

Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Магілёўская вобласць. Мн., 1986.

Городские поселения Российской империи. Т. 3 Спб., 1863.

Давыдов Д. Надежда Дурова. М., 1987.

Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской. Вып. 23. Витебск, 1892.

КБелСЭ. Т. 1. Мн., 1978.

Любавский М. Областное деление и местное управление Литовско-русского государства ко времени издания первого Литовского Статута. М., 1892.

Мелешко В. И. Очерки аграрной истории Восточной Белоруссии. Мн., 1975.

Нацистская политика геноцида и «выжженной земли» в Белоруссии. Мн., 1984.

Обзор Могилевской губернии за 1901 г. Могилев, 1902.

Опыт описания Могилевской губернии. Кн. 2, 3. Могилев, 1884.

Памятная книжка Могилевской губернии на 1905 г. Могилев, 1905.

Памятная книжка Могилевской губернии на 1907 г. Могилев, 1907.

Памятная книжка Могилевской губернии на 1909 г. Могилев, 1909.

Памятная книжка Могилевской губернии на 1910 г. Могилев, 1910.

Памятная книжка Могилевской дирекции народных училищ на 1889—1900 учебный год. Могилев, 1889.

Памятная книжка Могилевской дирекции народных училищ на 1902—1903 учебный год. Могилев, 1903.

Памятная книжка училищ Могилевской дирекции за 1905—1906 учебный год. Могилев, 1905.

Памятная книжка училищ Могилевской дирекции за 1907—1908 учебный год. Могилев, 1908.

Прамысловыя прадпрыемствы дарэвалюцыйнай Беларусі. Мн., 1988.

Тельпуховский Б. С. Северная война. М., 1946.

Список населенных мест Могилевской губернии. Могилев, 1910.

Спіс прамысловых прадпрыемстваў БССР. Вып. 1. Мн., 1935.

Спіс прамысловых прадпрыемстваў БССР (дробная прамысловасць). Мн., 1935.

Список церковно-приходских школ и школ грамоты в Могилевской епархии.

Список фабрик и заводов Европейской России/Под ред. В. Варзара. Спб., 1903.

Список фабрик и заводов Российской империи/Под ред. Кондаурова. Спб., 1914.

Труды БСХА. Т. XXXIII. Горки, 1960.

Турчинович Ф. Обозрение истории Белоруссии с древнейших времен. Спб., 1857.

Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 1. Мн., 1993.

M. Topolska. Dobra Szklowskie.

«Ленінскі шлях». 3.01.1936; 26.02.1936; 5.06. 1936; 5.12.1939; 1.01.1940; 2.10.1947; 1.09.1981; 22.04.1982; 9.07.1983; 4.08.1983; 20.03.1984.

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, ф. 2001, воп. 1, спр. 23, 24, 247; КМФ-5, воп. 1. спр. 3550.

Беларускі дзяржаўны архіў, ф. 30, воп. 2, спр. 6139, 6148; ф. 48, воп. 1, спр. 4930; ф. 338, воп. 1, спр. 323.

Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў, ф. 1290, воп. 11, спр. 1347, 1375, 1538.

Расійскі дзяржаўны архіў старажытных актаў, ф. 1355, воп. 1, спр. 716, 724, 732.

В. Князева.

Браты-нарадавольцы

Бычкоў Яўген Іванавіч. Нарадзіўся ў 1858 г. у Горках. Вучыўся ў Горным інстытуце і Кіеўскім пяхотным вучылішчы, арганізоўваў ваенныя гурткі нарадавольцаў. 30 сакавіка 1881 г. арыштаваны і сасланы пад нагляд паліцыі ў Падольскую губерню, адкуль падтрымліваў сувязь з ваеннай арганізацыяй «Народнай волі». У студзені 1884 г. прыцягнуты да следства па справе забойства жандарскага падпалкоўніка Судзейкіна — фактычнага кіраўніка тайнага палітычнага вышуку ў Расіі. Памёр у Жытоміры.

Бычкоў Уладзімір Іванавіч. Нарадзіўся ў 1861 г. у Горках. У рэвалюцыйны рух уключыўся ў 1878 г. у Кіеўскім універсітэце. У 1879 г. арганізаваў тэрарыстычны гурток, які прыняў праграму «Народнай волі». Вёў прапаганду сярод рабочых, вайскоўцаў, вучнёўскай моладзі, падрыхтаваў замах на жандарскага падпалкоўніка Судзейкіна. Арыштаваны 30 сакавіка 1881 г. і сасланы на пяць гадоў ва Усходнюю Сібір. 19 снежня 1882 г. уцёк з турмы, вёў рэвалюцыйную дзейнасць, пасля арышту В. М. Фігнер узначальваў Харкаўскую групу нарадавольцаў. Улетку 1883 г. паехаў у Томск, каб наладзіць уцёкі ссыльных. Быў выдадзены правакатарам. Пры арышце (18 жніўня 1883 г.) аказаў супраціўленне паліцыі і застрэліўся.

Друкуецца па кн.: Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 2. Мн., 1994. С. 152.

Рэвалюцыянер і журналіст

У дарэвалюцыйных газетах і часопісах даволі часта можна было сустрэць матэрыялы з подпісам «Белорусов». Гэта псеўданім нашага земляка Бялеўскага Аляксея Сцяпанавіча.

Нарадзіўся А. С. Бялеўскі ў вёсцы Шэды 17 сакавіка 1859 г. У 1869—76 гг. вучыўся ў гімназіі спачатку ў Магілёве, затым у Полацку.

У 1876 г. стаў студэнтам Пятроўска-Разумоўскай земляробчай і лясной акадэміі. Удзень ён старанна вывучаў земляробчую справу, а па вечарах разам з сябрамі прысутнічаў на сходках народніцкага гуртка, займаўся распаўсюджваннем рэвалюцыйнай літаратуры. У 1879 г. ім зацікавілася царская паліцыя. Вынік гэтага інтарэсу — ссылка пад галосны нагляд у Валагодскую губерню.

А. С. Бялеўскі

У паўночнай губерні Бялеўскі шмат працаваў над сваёй самаадукацыяй, вывучаў сельскагаспадарчыя навукі і ў 1886 г. экстэрнам здаў экзамены ў Пятроўска-Разумоўскай акадэміі і абараніў працу на ступень магістра сельскагаспадарчых навук. Не застаецца А. С. Бялеўскі ўбаку і ад рэвалюцыйнай дзейнасці. Вядома, што ў 1887 г. ён актыўна працаваў у маскоўскай групе «сацыялістаў-фэдэралістаў», быў рэдактарам двух нумароў газеты «Самоуправление», якія ўбачылі свет у Жэневе.

У красавіку 1889 г. царская жандармерыя зноў прыцягвае яго да адказнасці па справе газеты «Самоуправление». Яму было забаронена жыць у Маскве. Аляксей Сцяпанавіч вяртаецца на радзіму, працуе некаторы час выкладчыкам батанікі і садаводства ў Го-

рацкім земляробчым вучылішчы. Але аб гэтым даведалася жандармерыя, і Бялеўскі быў звольнены. Да мая 1893 г. ён жыў у роднай вёсцы Шэды, затым у Рэчыцкім павеце.

З 1894 г. А. С. Бялеўскі зноў працуе ў Пецярбургу і ўваходзіць у групу нарадавольцаў. Як адзначаецца ў кнізе «Деятели революционного движения в России» (т. III, вып. I. М., 1933 г.), «з'яўляўся галоўным тэарэтыкам і галоўнай літаратурнай сілай, вёў барацьбу з тэрарыстычнымі тэндэнцыямі, меў нахільнасць да марксізму». У гэты час ён — рэдактар і аўтар важнейшых артыкулаў «Летучего листка группы народовольцев».

Па даручэнню нарадавольцаў у маі 1896 г. Бялеўскі зняў дачу ў пасёлку Лахбе пад Пецярбургам, дзе стварыў партыйную друкарню. Але паліцыя хутка знайшла яе, і Бялеўскі быў арыштаваны. Амаль год ён знаходзіўся ў Петрапаўлаўскай крэпасці. А потым Бялеўскі быў сасланы ў Якуцію тэрмінам на 8 гадоў.

Першая руская рэвалюцыя вызваліла рэвалюцыянера, і ён пачаў актыўна займацца літаратурнай працай у газетах і часопісах «Наша жизнь», «Русские ведомости», «Вестник Европы» і іншых. Пасля паражэння першай рускай рэвалюцыі Бялеўскаму прыйшлося эмігрыраваць за мяжу. Там ён працаваў карэспандэнтам «Русских ведомостей» у Турцыі і Францыі. У 1917 г. вяртаецца на радзіму. Памёр Аляксей Сцяпанавіч у 1919 г. у Іркуцку.

У. Ліўшыц.

Лідэр паўстаўшых

Іван Іванавіч Стаўскі нарадзіўся ў 1877 г. у вёсцы Аршані Горацкага павета ў беднай сялянскай сям'і. Аб адукацыі і думаць не даводзілася. Толькі закончыў пачатковую школу, як пайшоў працаваць па найму. Пасвіў у заможных сялян кароў, свіней. Аднойчы пачуў, што можна ўладкавацца на вялікі завод у горадзе.

У далёкі горад бацькі вырашылі накіраваць двух братоў — Івана і Пятра.

Непрыветліва сустрэў беларускіх падлеткаў Растоў. Разразілася непагадзь. Недзе было спыніцца. На другія суткі 16-гадовага Івана прынялі вучнем слесара ў галоўныя майстэрні Уладзікаўказскай чыгункі, буйнейшага прадпрыемства на Паўночным Каўказе.



І. І. Стаўскі

Асвойваць прафесію слесара Івану Стаўскаму дапамагалі Сямён Глазкоў, Іван Козін, Пётр Стральцоў — члены сацыял-дэмакратычнага гуртка.

У 1894 г. у майстэрнях адбылася масавая стачка, на якой сацыял-дэмакраты заклікалі рабочых змагацца за свае правы. Яна зрабіла на Стаўскага моцнае ўражанне, аказала вялікі ўплыў на фарміраванне яго палітычных поглядаў. Але не можа быць змагара без ведаў, без падрыхтоўкі.

Стаўскі захапляецца кнігамі, шмат чытае, у тым ліку нелегальную літаратуру, цікавіцца палітычнымі пытаннямі, выконвае даручэнні сацыял-дэмакратычнага гуртка. Але нечаканая павестка ў армію змяніла наладжаны лад жыцця. Іван звольніўся з майстэрняў, аднак па стану здароўя не быў прызваны на службу. Вярнуцца на ранейшае месца не давялося. Вымушаны быў пайсці працаваць у чыгуначнае дэпо ў суседнім Батайску.

Амаль кожны вечар Іван Стаўскі ездзіў у Растоў, дзе сустракаўся з сябрамі-рэвалюцыянерамі. У хуткім часе яму пашанцавала ўладкавацца на працу на растоўскі завод «Джон Марцін» разметчыкам. Гэта пасада дазваляла яму свабодна перамяшчацца па цэхах, выходзіць на іншыя прадпрыемствы, наладжваць канспіратыўныя сувязі.

Вясной 1900 г. з-за мяжы ў горад прыйшла пракламацыя, якая заклікала адзначыць першамайскае свята. Актывісты Спі-

рыдон Мялешка, Іван Стаўскі, Павел Сакалоў выпусцілі на гектографе пракламацыю і распаўсюдзілі яе па ўсіх фабрыках і заводах. Многія бачылі, як Стаўскі раскідваў лістоўкі.

Паліцыя распачала пошук тых, хто распаўсюджваў лістоўкі. І. Стаўскі быў арыштаваны. Яго заключылі ў растоўскую турму, дзе ён прабыў больш месяца і быў адпушчаны пад асобы нагляд паліцыі. Таварышы пераправілі яго ў Керч на металургічны завод. Потым ён быў вымушаны перабрацца на поўнач, у Яраслаўль, дзе працягваў рэвалюцыйную барацьбу: стаў кіраўніком рабочага гуртка на ткацкай фабрыцы Ганшына. Восенню 1900 г. Стаўскі зноў быў арыштаваны і прыцягнуты да дазнання, але рэвалюцыянер змог уцячы і даехаць да Растова. Тут яго чакала непрыемная навіна: яго сябры-аднадумцы былі арыштаваны.

Усе свае сілы ён аддае аднаўленню арганізацыі, наладжванню канспіратыўных сувязей з рабочымі, распаўсюджванню ленінскай «Іскры», якая рэгулярна паступала ў горад і ў якой пад псеўданімам «Іван» друкаваўся і Стаўскі. У першай палове 1902 г. Іван Стаўскі зноў быў арыштаваны і пасаджаны ў Новачаркаскую турму. У няволі ён імкнуўся папоўніць свае веды, многа чытаў. Толькі ў жніўні ён апынуўся на свабодзе.

У лістападзе 1902 г. у Растове адбылася стачка кацельшчыкаў чыгуначных майстэрань, да якой са спачуваннем аднесліся працоўныя ўсёй Расіі. Даведзеныя да адчаю жорсткімі паводзінамі майстроў, сістэматычным зніжэннем імі расцэнак, кацельшчыкі запатрабавалі ад адміністрацыі звольніць зарваўшыхся майстроў. Адміністрацыя не згадзілася. Гэта была апошняя кропля, якая перапоўніла чашу цярпення рабочых. Яны пачалі стачку.

Раніцай у майстэрнях адбыўся мітынг, на якім ад імя Данскога камітэта РСДРП выступіў І. Стаўскі. Яго прамова была страснай і палымянай. Ён выклаў эканамічныя і палітычныя патрабаванні рабочых, выказаўся за правядзенне стачкі.

На другі дзень сход чыгуначнікаў стаў больш масавым. Да іх далучыліся сем'і, рабочыя іншых прадпрыемстваў.

Паліцыя спрабавала збіць полымя народнага гневу, але стачка працягвалася. Бадай, самай масавай яна была 10 лістапада, калі ў лагчыне сабралася больш за 30 тыс. гараджан. Стаўскі з дапамогай перадавых рабочых стараўся надаць ёй найбольш рэвалюцыйны характар. У сваёй прамове ён аб'явіў, што на сустрэчы з прадстаўнікамі рабочых атаман прапанаваў выдаць паліцыі зачыншчыкаў, і тады патрабаванні рабочых будуць задаволены. Выкрываючы крывадушша ўлад, ён пераконваў, што рабочыя павінны выйграць стачку і дабіцца перамогі для ўсіх.

На наступны дзень улады прымянілі ўсе сілы, каб паралізаваць стачку. У Растоў прыбылі войскі, горад аб'явілі на асадным становішчы. У лагчыне адбылася рукапашная бойка з паліцыяй, у якой загінула шэсць рабочых, 23 чалавекі былі паранены.

На дваццаць трэці дзень растоўская стачка спынілася. Пачаліся арышты. Стаўскі вымушаны быў бегчы з горада. Ніколі не думаў ехаць за граніцу, ды яшчэ нелегальна, але давялося. Цяжкі быў яго шлях у Швейцарыю, нямала выпрабаванняў ён пераадолеў, перш чым апынуўся сярод вопытных рэвалюцыянераў.

Стаўскі сумаваў у эміграцыі. Атрымаўшы яўку ў Кіеве, ён накіраваўся ў Расію. Але на граніцы быў затрыманы і пасаджаны ў турму. Амаль два гады таварышы па барацьбе нічога не ведалі пра яго лёс.

У Растове Стаўскі з'явіўся, калі пачалася першая руская рэвалюцыя. Загартаваная гвардыя — А. І. Белянец, К. П. Багданаў, М. Ф. Васільчанка, В. А. Друцкі — цёпла прынялі Стаўскага ў сваю сям'ю. Разам яны праводзілі сходкі, мітынгі, вялі барацьбу з меншавікамі...

У ноч на 13 кастрычніка ў горадзе пачаліся масавыя арышты. У ліку 23 сацыял-дэмакратаў Стаўскі быў пасаджаны ў растоўскую турму. Абураныя ганебным царскім маніфестам, гараджане дружна выйшлі на палітычную дэманстрацыю. Рабочыя накіраваліся да турмы з патрабаваннямі вызваліць палітзняволеных. 18 кастрычніка 1905 г. былі выпушчаны на свабоду Стаўскі, Друцкі і іншыя бальшавікі.

Каб зноў не трапіць у рукі паліцыі, Іван Іванавіч вандраваў па розных гарадах. Здавалася, ён добра абасноўваўся ў Адэсе, сустрэўся са сваімі старымі знаёмымі Сяргеем Гусевым, Канкордзіяй Самойлавай, але хутка быў вымушаны пераехаць у Луганск, дзе яго выдаў правакатар. Два месяцы Стаўскі правёў у турме, а ў красавіку 1906 г. быў высланы ў ссылку ў Табольскую губерню. Праз два тыдні ён далучыўся да

групы ссыльных, з якімі восенню 1907 г. паспхова дабраўся да Пецярбурга. Але затрымлівацца ў сталіцы было небяспечна. Стаўскі атрымаў канспіратыўны адрас у Маскве, дзе і ўладкаваўся рабочым трамвайнага парка. З дапамогай Сяргея Гусева ён пазнаёміўся з маскоўскімі рэвалюцыянерамі Ц. С. Баброўскай, К. Н. Ляпідзеўскім і іншымі. Стаўскі працаваў у нелегальных гуртках, прапагандаваў ленінскія ідэі рэвалюцыі. У снежні 1908 г. восьмы раз быў арыштаваны і высланы з горада.

Пасля кастрычніка 1917 г. І. Стаўскі працаваў у Вышэйшым Савеце Народнай гаспадаркі, дырэктарам некаторых маскоўскіх заводаў. За выдатныя заслугі перад рэвалюцыяй з выпадку 30-годдзя растоўскай стачкі І. І. Стаўскі быў узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

І. І. Стаўскі памёр у 1957 г. у Маскве.

Э. Карніловіч.

Вязень Шлісельбургскай крэпасці

У снежні 1911 г. палітычныя зняволеныя, якія знаходзіліся ў Пскоўскай турме, аб'явілі галадоўку. Іх патрабаванні былі задаволены. Але тых, на каго пала падазрэнне ў кіраўніцтве галадоўкай, пастроілі на двары. Іх вырашылі перавесці ў турмы больш суровага рэжыму і строгай ізаляцыі.

— Муравін Рыгор Майсеевіч, з мяшчан, 1883 года нараджэння, ураджэнец горада Горкі Магілёўскай губерні, — грамавым голасам аб'явіў начальнік турмы, — у Шлісельбургскую крэпасць.

Змрочныя дні чакання пераводу. Будучыя цяжкасці не палохалі рэвалюцыянера. У Муравіна ў 28 год за спіной быў ужо вялікі вопыт класавай барацьбы.

У семнаццаць гадоў Рыгор стаў вучнем земляробчага вучылішча. Удзень ён слухаў лекцыі, працаваў на вучэбнай ферме, а вечарамі наведваў сходы групы іскраўцаў, якая выросла затым у арганізацыю РСДРП, чыталі падпольную літаратуру, друкавалі пракламацыі.

1 мая 1903 г. у Зарэцкім лесе больш за 90 вучняў і рабочых правялі маёўку. Сярод удзельнікаў была распаўсюджана лістоўка «1 мая». На другі дзень навучэнцы аб'явілі забастоўку з прад'яўленнем палітычных і эканамічных патрабаванняў. Найбольш актыўных удзельнікаў забастоўкі выключылі з вучылішча. Сярод іх быў і Рыгор Муравін.

21 чэрвеня 1903 г. у лазарэце вучылішча з-за таго, што не была аказана своечасовая медыцынская дапамога, памёр вучань другога класа рамеснага вучылішча Мікалай Клявін. Пасля яго пахавання адбыўся мітынг і дэманстрацыя, у якой удзельнічалі Сцяпан Фабрыстаў, Фёдар Смірноў, Давід Ратнер, Сямён Бычкоў, Рыгор Муравін і іншыя.

16 студзеня 1905 г. Р. Муравін прымаў удзел у дэманстрацыі пратэсту, дзе загінулі яго таварышы — Пётр Бруцэр і Фама Ерафееў. А ў жніўні 1905 г. з «воўчым білетам» — без права паступлення ў навучальныя ўстановы Расіі — ён паехаў да сваякоў у Екацярынаслаў. Школа класавай барацьбы, атрыманая ў Горках, не прайшла дарэмна. У кастрычніцкія дні 1905 г. Муравін змагаецца на барыкадах Екацярынаслаўскага камітэта РСДРП, удзельнічае ў арганізацыі пабегу таварыша Арцёма.

Каб пазбегнуць нагляду паліцыі, Р. Муравін у 1906 г. пераехаў у Самару, дзе 23-гадовага рэвалюцыянера выбіраюць сакратаром камітэта РСДРП.

Затым Муравін быў прызваны ў царскую армію. Служыў у Фінляндыі. У 1907 г. за прыналежнасць да Выбаргскай арганізацыі РСДРП і рэвалюцыйную прапаганду сярод салдат быў арыштаваны. У 1908 г. па судоваму працэсу «32 салдат Выбаргскай крэпасці» быў прыгавораны да 10 год катаржных работ з далейшай высылкай на вечнае пасяленне ў Сібір.

Да суда Муравіна як актыўнага члена групы РСДРП царскія жандары ізалявалі ў адзіночнай камеры. 16 месяцаў трымалі на гаўптвахце без права выхаду на прагулку і тры месяцы ў падзямеллі Выбаргскай крэпасці. Потым адбываў пакаранне ў Фінляндыі і Пскове. 26 студзеня 1902 г. яго прывозяць у Шлісельбургскую крэпасць.

У крэпасці Р. М. Муравін пазнаёміўся з С. Арджанікідзе, які адбываў тут пяцігадовы тэрмін. Пад яго ўплывам, як потым успамінаў Муравін, ён пачаў больш працаваць над сваім тэарэтычным узроўнем.

У студзені 1917 г. скончыўся тэрмін знаходжання Муравіна ў крэпасці і яго па этапу адправілі ў бестэрміновую ссылку ў Сібір. Але 3 сакавіка 1917 г. вызвалілі з Іркуцкай турмы: адбылася лютаўская рэвалюцыя. Муравін зноў уключаецца ў рэвалюцыйную барацьбу.

У лютым 1917 г. — ён дэлегат Першага Архангельскага губернскага з'езда Савета сялянскіх, рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Як вязень Шлісельбурга, карыстаецца правам рашаючага голасу.

У сакавіку 1917 г. Р. М. Муравін быў выбраны членам камітэта, а 2 мая — членам Часовага губернскага камітэта РСДРП(б). У верасні 1917 г. яго выбіраюць дэлегатам II Усерасійскага з'езда Саветаў.

У лютым 1918 г. Р. М. Муравін увайшоў у састаў Першага губвыканкома ад Архангельскай арганізацыі РСДРП і ў сакавіку 1918 г. быў назначаны спачатку камісарам кантрольнага аддзела, а затым камісарам фінансаў.

З верасня 1918 г. па студзень 1925 г. Р. М. Муравін вучыўся ў сацыялістычнай акадэміі грамадскіх навук у Маскве, працаваў на прафсаюзнай і грамадскай рабоце ў Архангельску і Волагдзе.

У далейшым Муравін быў на гаспадарчай рабоце ў Маскве. У гады культа асобы Сталіна Рыгор Майсеевіч быў рэпрэсіраваны. З 1938 г. знаходзіўся ў лагерах і ссылках і толькі ў кастрычніку 1955 г. быў поўнасцю рэабілітаваны. Яму была назначана пенсія саюзнага значэння. Р. М. Муравін памёр у Маскве ў 1968 г.

У. Ліўшыц.

Жыццё ў барацьбе

Гарбачоў Яфім Васільевіч нарадзіўся 5 сакавіка 1889 г. у Горках Магілёўскай губерні ў сям'і сталяра. Член РСДРП з 1907 г., эсэр. Вучыўся ў рамесным вучылішчы. Удзельнік рэвалюцыі 1905—07 гг., распаўсюджваў нелегальную літаратуру. У 1907 г. быў у баявой дружыне партыі эсэраў у Смаленску, захоўваў і распаўсюджваў нелегальную літаратуру, арыштаваны і пасаджаны ў турму. У тым жа годзе Маскоўскай судзебнай палатай асуджаны да 3 гадоў турмы. Пасля вызвалення вёў актыўную рэвалюцыйную работу ў Магілёве, у баявым атрадзе Паўночна-Заходняй вобласці, пазней быў арыштаваны і пасаджаны ў турму. 12 лістапада 1909 г. зрабіў замах на забойства магілёўскага паліцмайстара Радзіёнава. За гэта Я. В. Гарбачова прыгаварылі да пакарання смерцю, але потым замянілі гэты прыгавор на 20 гадоў катаргі. Пакаранне адбываў у Арлоўскім цэнтрале. Пасля лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. вярнуўся ў Горкі. 10 сакавіка выступіў на маніфестацыі рабочых і студэнтаў. Удзельнічаў ва ўстанаўленні Савецкай улады ў горадзе. Дэлегат Усерасійскага з'езда Саветаў ад Горацкага павета (ліпень 1918). Далейшы лёс невядомы.

Э. Карніловіч.

Рэвалюцыйныя падзеі ў Горацкім павеце — вачыма сведак

А. Я. Аболін. Падзеі 9 студзеня 1905 г. у Пецярбургу боллю адгукнуліся ў сэрцах навучэнцаў вучылішчаў г. Горкі. Было вырашана ў нядзелю, 16 студзеня, наладзіць дэманстрацыю пратэсту.

На дэманстрацыю сабраліся раніцай 16 студзеня каля вучылішча. Акрамя навучэнцаў земляробчага і таксатарскага вучылішчаў былі і вучні рамеснага вучылішча. Яны асобна ад нас таксама абмяркоўвалі пытанне аб арганізацыі дэманстрацыі.

Калонай з рэвалюцыйнымі песнямі мы рушылі па Аршанскай вуліцы. У горадзе да нас далучылася гарадская моладзь. Наперадзе калоны лунаў чырвоны сцяг. На нашым вучэбным полі мы правялі мітынг пратэсту супраць крывавай расправы з рабочымі і арганізавана пайшлі назад у горад.

Перад самым горадам дарогу нам загарадзіла каманда гарадавых, якія былі ўзброены шашкамі і рэвальверамі. Каманда «Стаяць!» нас не спыніла, тады па загаду памочніка спраўніка гарадавыя пачалі страляць. Былі забіты навучэнец земляробчага вучылішча Пётр Бруцэр, вучань рамеснага вучылішча Фама Ерафееў, 5 чалавек былі паранены.

А. Я. Аболін

На наступны дзень мы ў знак пратэсту аб'явілі забастоўку і падалі пісьмовую заяву дырэктару вучылішча. Пад ёй падпісалася 116 навучэнцаў, свае подпісы не паставілі ўсяго каля сарака чалавек. Сабраўся педагагічны савет і, напэўна, з санкцыі Пецярбурга вынес пастанову аб выключэнні 116 вучняў і часовым спыненні заняткаў.

Труну з целам Бруцэра мы вывезлі ў Оршу і ў суправаджэнні яго землякоў-латышоў адправілі па чыгунцы ў Латвію, на радзіму. Там ён і пахаваны.

Мы раз'ехаліся па дамах. А ў канцы лютага я, як і іншыя выключаныя, атрымаў ад дырэктара вучылішча пісьмо з прапановай вярнуцца ў вучылішча, куды нас зноў прынялі, але з рознымі абмежаваннямі. Я, напрыклад, быў выключаны з пансіяната.

І. П. Хмуровіч. Аб расстрэле дэманстрацыі ў Пецярбургу 9 студзеня мы, навучэнцы рамеснага вучылішча, даведаліся на другі дзень пасля гэтых жудасных падзей. Паведамленне было нечаканым і ўспрымалася неаднолькава. У размовах чулася незадаволенасць, агульнае абурэнне паводзінамі ўрада.

У знак пратэсту вырашана было арганізаваць дэманстрацыю. 15 студзеня ў суботу вечарам усе члены партыі, якія працавалі на заводзе, сабраліся на сход. У назначаны час я прыйшоў на кватэру Ажыгінава, навучэнца земляробчага вучылішча, які жыў побач з домам майго бацькі, у доме Малашонкава Пятра па Гарыстай вуліцы. Сабралася нас чалавек 15. Было вырашана заўтра выйсці на дэманстрацыю пратэсту з лозунгам «Далоў самадзяржаўе».

Нядзеля. 16 студзеня. Надвор'е стаяла бязветранае, тэмпература не больш 10° марозу. Ярка свяціла сонца... Мы пастроіліся ў калоны. Над калонай калыхалася чырвонае палотнішча з надпісам «Далоў самадзяржаўе». Яго трымалі навучэнец 4-га класа рамеснага вучылішча Фама Ерафееў і навучэнец земляробчага вучылішча Пётр Бруцэр.

Але дарогу дэманстрантам перагарадзіла паліцыя. У выніку налёту коннай паліцыі былі забіты Фама Ерафееў і Пётр Бруцэр.

Аб тым, што забілі Ерафеева, тэрмінова паведамілі яго бацькам, якія жылі ў вёсцы каля Горак. Па сына прыехалі бацька Фамы і бліжэйшыя родзічы. Труну вырабілі ў сталярнай майстэрні завода, дзе ён вучыўся рамяству. Праводзіць Фаму прыйшлі жыхары горада. Труна была пакладзена на падводу. Жалобнае шэсце расцягнулася амаль на вярсту, ішлі па горадзе, па Слабадзе да самага выхаду ў поле. Паліцыя не адважылася разагнаць і прымяніць зброю да гэтай незапланаванай дэманстрацыі, якая рухалася за труной.

Сярод нас пасля дэманстрацыі была нейкая разгубленасць. Мы не маглі арганізаваць рамеснікаў нават старэйшых класаў для таго, каб калектыўна праводзіць свайго загінуўшага сябра. Усе баяліся быць арыштаванымі, і, сапраўды, паехаць у вёску на пахаванне азначала вынесці сабе прысуд да турмы. Але я вырашыў паехаць, праводзіць таварыша ў яго апошні шлях.

Каля 12 гадзін апоўдні сабралася амаль усё насельніцтва вёскі. Вынеслі труну і паціху рушылі на могілкі. Апошнія развітанні, плач родных, суседзяў — труна паціху апусцілася ў магілу. Так пахавалі нашага сябра Фаму Ерафеева.

Дакументы сведчаць

ПІСЬМО ВУЧНЯ АДНАГО З ГАРАДСКІХ ВУЧЫЛІШЧАЎ, У ЯКІМ ЁН ПАВЕДАМЛЯЕ АБ ПАХАВАННІ ЗАБІТЫХ НА ДЭМАНСТРАЦЫІ

15 студзеня 1905 г.

Сначала их не позволяли хоронить открыто, так как они политические преступники, но ученики всех наших училищ, в числе около 500, отправились в полицию отнимать тела, чтобы похоронить самим. Полиция, конечно, вся попряталась, а из полицейского дома вышел наш директор и сказал, что послана в Могилев телеграмма о разрешении похоронить открыто. Ученики начали караулить поочередно, чтобы убитых не похоронили как-нибудь ночью.

Разрешение от могилевского губернатора пришло, и сегодня тела убитых отправлены на родину при большом стечении народа. Была подписка среди учеников и интеллигенции на расходы по перевозке тел: в земледельческом училище собрали 100 рублей, таксаторском 65 и горецкая публика пожертвовала 45 рублей. Теперь все ученики в глубоком трауре, а полиция, штат которой увеличен до 30 человек, прячется по закаулкам, открыто не показывается. Помощнику исправника послано письмо с извещением скорой его смерти, так как он убил Бруцера и товарищи убитых поклялись жестоко отомстить. Теперь все ученики — социал-демократы.

Искра. 1905 г., № 88.

ПІСЬМО ВУЧНЯЎ ГОРАЦКАГА ЗЕМЛЯРОБЧАГА ВУЧЫЛІШЧА

26 кастрычніка 1905 г.

Русское общество чересчур долго стонало под гнетом самодержавной опеки; много времени было ему предоставлено для критики старого политического режима, и наконец оно проснулось для новой жизни, ясно осознав свои цели.

Почти все прогрессивные элементы его увидели, что конечный пункт развития народоправления, при котором не будет места политике, выгодной для одной лишь, часто незначительной части населения, заключается в Демократической Республике, они и потребовали скорейшего установления таковой.

Мы учащиеся Горецкого земледельческого училища, находя себя вполне солидарными с мнением прогрессивных сил общества, требуем: Созыва учредительного собрания на основании всеобщего для всех, достигших 20-летнего возроста лиц, независимо от пола и национальности, равного, прямого и тайного голосования. Скорейшего проведения в жизнь полной гражданской свободы, свободы слова, печати, собраний и союзов, свободы совести, неприкосновенности личности и жилищ, свободы стачек, передвижения и промыслов.

Полной амнистии всем пострадавшим за политические и религиозные убеждения.

Но кроме нашего желания быть истинными гражданами своей родины, мы, как ученики подавленной бюрократическим режимом школы, наиболее сильно чувствуем на своей спине гнет старого порядка и обращаемся к обществу с требованием обратить внимание на неестественное положение Русской средней школы, совершенно несоответствующее своему назначению.

Имея в виду, как пример, нашу среднюю сельскохозяйственную школу, мы находим неотложным: введение автономии училища и отделение такового от церкви.

Коренную переделку всей системы преподавания, как теоретических так и практических знаний.

Находя неосновательными привилегии некоторых типов перед другими касательно приема в высшие учебные заведения путем свободного доступа всем окончившим среднюю школу в высшую независимо от типа последних.

Желая сделать среднюю школу действительно народной, на средства которого она содержится, мы требуем свободного доступа в среднюю школу всем желающим, независимо от максимума возраста, пола и национальности, а также допущения вольнослушателей. В частности для наших с.-х. школ требуем уничтожения экзаменов при приеме окончивших низшие с.-х. школы.

Ввиду невозможности, живя в обновленной России, продолжать занятия в старой школе, режим которой умерщвляет все светлое, живое, коверкает и ломает наши души, готовя из нас сухих, односторонних чиновников, слепых слуг капитала — мы решили употребить все усилия, чтобы способствовать скорейшей замене его новым, и ввиду этого на нашей ученической сходке постановили большинством 128 против 21 объявить забастовку.

Просим солидарных с нами товарищей к нам присоединиться.

Горки, Могилевской губ. Ученики Горецкого Земледельческого училища

26 октября 1905 г.

Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі, ф. 102, воп. 1881, спр. 32, ч. 4, л. 232.

ЛІСТОЎКА ГАРАЦКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ РСДРП

1905 г.

Братья крестьяне! До каких пор вы будете терпеть непосильные налоги? До каких пор вы будете терпеть огромную нехватку земли? Долго вы ждали царских милостей, но вас кормили обещаниями и постоянно повышали налоги.

Правительство не хочет передать власть народу и хочет остановить народное движение незначительными уступками. Оно обещает созвать Государственную думу и освободить крестьян от выкупных платежей. Народ знает, что в думу попадут люди богатые, что дума ничего не сделает, что отмена выкупных платежей не искоренит всех крестьянских бед и что может остаться только одними обещаниями. Потому все эти уступки не остановят народного движения, еще больше его усилят.

Каждый день приносит известия о новых и новых крестьянских выступлениях. Неужели вы, братья, будете по-прежнему гнуть спину перед вашими угнетателями в то время, когда ваши братья по всей России вступили с ними в последний бой.

Мы, социал-демократы, призываем вас присоединиться к восставшим.

Договаривайтесь друг с другом и отказывайтесь платить налоги. За это царские приспешники будут продавать вашу собственность, но можно сделать так, что никто не будет покупать ее.

Долой царское правительство!

Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Украіны, ф. 318, спр. 1264, л. 17.

Першыя дні лютаўскай рэвалюцыі ў Горках

3-го марта Горки жили в полном неведении о происшедшем в столицах и армии. Жизнь шла спокойно, хотя и тревожно из-за трехдневного отсутствия газет. 4-го утром получили через разносчика Московские газеты за 2-е марта. В 12 ч. дня в зале сельхоз. училища «Русское слово» с начала и до конца было прочитано в присутствии всех учеников и учителей. После чтения газеты были прочитаны телеграммы, переданные из Орши по телефону ученику С. об отречении от престола Николая II и Михаила. Чтение газеты и телеграмм прошло при сравнительном спокойствии. На следующий день, т. е. 5 марта в воскресенье, собрались некоторые представители г. Горок в доме городского старосты К. Поздзерского для обсуждения мероприятий в связи с происшедшим. Решено было созвать вечером в клубе различных представителей для организации исполнительного комитета. Утром же по Б. Оршанской начали дефилировать большие группы учащихся: было предположение устроить манифестацию, передавали, что уже готов красный флаг, но манифестация встретила возражения со стороны некоторых лиц, указывавших на вооруженную полицию, хотя нигде ни одного городового видно не было. Передавали, что на каланче приготовлен пулемет, но это оказалось вздором. В 7 часов вечера состоялось довольно многолюдное собрание различных представителей в клубе. Председателем был избран суд. след. Казимирский, секретарями Волчков и Розен-

вальд. Собрание началось речью Белильникова, предложившего почтить вставанием погибших борцов за свободу. Очень много говорил предводитель дворянства Трусов, сидевший рядом с исправником Лорченковым. Трусов говорил о невозможности возврата к прежнему, о невозможности вручения старой полиции охраны жизни и имущества горожан и населения уезда. Против доверия полиции, боровшейся с «внутренним» врагом, выступили Н. Успенский и Цитович и др. Во время речей Ашенбренером была открыта провокационная попытка полиции, поддержанная исправником Лорченковым, вызвать недовольствие учащихся сельхоз. и зем. агрон. училищ. Лорченков просил у воинского начальника Лейтнера охраны казначейства от будто бы предполагавшегося разгрома учащимися. Эта дикая мысль была энергично отвергнута Кулешей, учеником земл.-агр. училища.

Никто из собрания Трусова не поддержал. В самый разгар речей получили «Русское слово» за 3-е Марта. Цитовичем были прочитаны состав министерства и его декларация. Чтение декларации было встречено восторженными аплодисментами. Затем единогласно было решено организовать исполнительный комитет из 15 лиц, из них 3 по должности — председатель земской управы, городской староста и воинский начальник, а 12 здесь были избраны путем подачи записок. Всего было подано 95 записок: избранными оказались: Цитович, Мечинский, Гинзбург, Казимирский, Розенвальд, Волчков, Аристов, Ашенбренер, Белильников, Пуйде, Красиков, Челкевич. Ввиду отсутствия среди избранных крестьян решено было пополнить комитет двумя представителями, стоявшими в порядке, — Воробьевым и Масленым. За отказом Челкевича вступил в комитет Креер. Несмотря на настойчивость некоторых из присутствовавших ввести в комитет Трусова, он оказался забаллотированным. На следующий день передавали, что многие на собрание не допускались, что в действительности и имело место, чем же руководствовались недопускавшие, установить не удалось.

На следующий день 6 марта исполнительный комитет имел свое первое заседание в доме Поздзерского. В председатели комитета был предложен и открытым голосованием избран Цитович, товарищем председателя Гинзбург, секретарями — Волчков и Розенвальд. На собрание явились представители от учащихся и настаивали на включении их представителей в комитет. Подполк. Лейтнер произнес речь, указывая на заслуги учащихся перед родиной: многие ушли добровольцами и погибли. Решено было допустить по 2 представителя от имеющихся в Горках 3-х учебных заведений Мин. Земл. Таким образом комитет уже состоял из 21 члена. Затем была послана приветственная телеграмма Исполнительному комитету Государственной Думы с просьбой прислать инструкции для нашего комитета (ответа на нее не получилось). Но самым острым вопросом был вопрос о полиции. Исправник Лорченков еще накануне поздно вечером получил от губернатора телеграмму о передаче своей власти лицу, на которое укажет общественный комитет. Лорченков, присутствовавший в комнате, смежной с заседанием, попросил разрешения дать ему свои объяснения комитету. Комитет разрешил. Лорченков с драматизмом в голосе и почти со слезами указал на верность своей службы по охране населения, что такая же верность им будет вестись и при новом строе, если это потребуется и просил разрешить подать прошение губернатору об отставке. Комитет в присутствии Лорченкова обсудил его заявление и решил Лорченкова отстранить от власти, охрану же города и бывшую полицию поручить здесь же избранному начальнику милиции Ашенбренеру совместно с начальником гарнизона Лейтнером. В отношении подачи прошения Лорченкову была предоставлена свобода действий. Во время заседания получилась телеграмма от Мин. Земл. Шингарева через Могилевского уполномоченного по продовольствию о реквизиции запасов хлеба у имеющих не менее 50 десятин запашки, у торговых предприятий и банков. Решено было произвести ревизию в тот же день, а вечером некоторые члены комитета отправились в намеченные пункты и опечатали запасы. Уполномоченным от Горок на Могилевское совещание по продовольствию был избран Н. Гинзбург. На собрании было решено осведомлять население о деятельности комитета через известия, и на следующий день были выпущены известия — воззвание «Исполнительный комитет призывает всех граждан г. Горок сохранить единение, порядок и ни на минуту не прерывать текущей работы и оказывать всемерное содействие организованному комитету».

В этот же день полиция сдала вооружение Ашенбренеру и Лейтнеру и стала организовываться милиция по преимуществу из учащихся. Несмотря на сильную снежную метель, на многих пунктах города уже стояли вооруженные ученики.

Еще в известиях исполнительного комитета 6 марта предлагалось крестьянам избрать своих представителей в комитет.

12 марта — воскресенье тоже носило характер праздника свободы. Весеннее солнышко ласкало и пригревало массы толпящегося люда по Б. Оршанской ул. и по базару. В этот день исполнительным комитетом был организован кружечный сбор в пользу жертв революции. Было выпущено 12 кружек для сбора. Сбор был очень удачен.

Понятно, каждому опускающему в кружку хотя бы копейку интересна судьба ее. Мне представляется возможность дать хотя и запоздалый отчет о сборе.

Кружечный сбор дал	1022 р. 22 к.
Сбор по подписке	243 р. 54 к.
Итого	1263 р. 76 к.
Расход по сбору	27 р. 85 к.
Итого чистого сбору:	1237 р. 91 к.

Распределилась эта сумма следующим образом:

Горбачеву, по постановлению исполнительного комитета в середине марта 500 р. и ему же в конце апреля 100 р.; Ерофееву-Долженкову, отцу упомянутого ученика ремесленного училища Фомы Ерофеева, убитого в 1905 г. — 200 р., Котикову — амнистированному политическому — 200 руб. и передано представителю исполнительного комитета Аристову 8 мая — 237 р. 91 к.

Кружечный сбор был проведен в тот же день вечером в присутствии казначея горецкого казначейства Беляцкого.

В тот же день 12-го в 4 час. дня состоялся первый многолюдный митинг в землемерно-агрономическом училище, устроенный Цитовичем, сделавшим доклад на тему: «Государственный переворот и война». Кроме Цитовича выступил Колосков, рассказавший, как ему в 1905 г. после митинга пришлось прятаться, чтобы избежать жандармской руки. Протасевич говорил о необходимости усовершенствований в хозяйстве, о необходимости просвещения. Павлов указал на преимущество республики перед монархией.

Митинг прошел при переполненном зале и прилегающем коридоре и в присутствии большого числа крестьян. Во время митинга был произведен шапочный сбор на пасхальные подарки солдатам в окопы. Сбор дал 112 р. 20 к. Эти деньги были отправлены во Всероссийский союз городов, пересылавших в окопы подарки.

Таким образом первый идейный сбор в нашем захолустье дал почти 1400 рублей, сумму, которую вероятно никогда не давали на благотворительные спектакли, концерты, на многочисленные кружечные сборы. Сердце горецкого гражданина горячо и искренне отозвалось на весеннее солнышко свободы.

20 марта было довольно бурное заседание исполнительного комитета. В начале заседания был прочитан тов. Председателя Н. Гинзбурга мотивированный отказ Цитовича его председательствования в комитете. Сущность отказа сводится к следующему. Красиков, избранный в то время начальником милиции вместо отказавшегося Ашенбренера, как секретарь комитета протестовал против экстренного создания комитета по предложению комиссара и угрожал Цитовичу арестом и затем поставил Цитовичу на выбор — или отказ от председательствования в комитете или выход его Красикова из комитета и из начальников милиции, не имея возможности спокойно работать при таких условиях. Цитович отказался от председательствования в исполн. комитете. После замечания некоторых членов комитета по адресу Красикова, последний заявил о своем уходе из комитета и ушел. Уход Красикова вызвал большое волнение среди публики, главным образом среди учащихся, настолько сильное волнение, что комитет постановил направить к Красикову делегацию с просьбой вернуться. Делегация из членов комитета отправилась к нему, и Красиков возвратился и вступил в комитет. Председателем комитета был избран Аристов, 22 марта были выборы комиссара. К этому дню приехал в Горки С. Н. Прокопович. Многие называли его кандидатом в горецкие комиссары, но уже тогда, из бесед с ним обнаружилось, что он кандидат в министры (маленькая разница) и в министры труда. Министерство труда было тогда еще в проекте, и составление записки об организации его, между прочим, было поручено Прокоповичу.

В 4 часа дня в земл.-агр. училище было назначено предвыборное собрание перед избранием комиссара. На это собрание прибыл С. Н. Прокопович. Публики было сравнительно мало, так как весть о прибытии Прокоповича не успела распространиться. Прокопович сделал небольшой доклад о том, как прошел переворот в Москве. Он рассказал, как бескровно протекали в Москве дни с 27 февр. по 5 марта, какую роль сыграл командующий Московским военным округом Грузиков, как с 6 марта Москва стала жить

нормальной жизнью, указал на грандиозную демонстрацию 12 марта. После доклада Прокоповичу была устроена овация. В уездные комиссары была выдвинута кандидатура Красикова. Вечером, при переполненном зале земл.-агр. училища публикой и членами исполнительного комитета, которых вместе с уездными набралось больше 100, под председательством Прокоповича были проведены выборы комиссара. Из 90 приблизительно поданных записок около 70 было за Красикова. Избрание Красикова комиссаром и приветствие Прокоповича «гражданину комиссару» сопровождались аплодисментами.

На выборах комиссара участвовали, кроме сорокачленного городского исполнительного комитета, представители по 2 от волости, по 1 от кооператоров и др. организаций. Между прочим, было отвергнуто участие в выборах комиссара главных Уездного Земства.

С. Ц.

«Горецкий вестник». 1917. № 23, 27, 30, 33.

Па старонках газет

«МОГИЛЕВСКИЕ ГУБЕРНСКИЕ ВЕДОМОСТИ»

1865 г.

№ 4

6 января в Горках крестный ход на Иордань на речке Поросица совершен был из Троицкой и Успенской Церкви; народу было очень много, церемонию сопровождали городские власти, жандармы и квартирующие войска. При водоосвящении сделано было несколько ружейных залпов бывшей при церемонии ротой солдат.

№ 6

Общественные удовольствия в Могилевской губернии

...В Горках был дан один из спектаклей с благотворительной целью 6 января. Сыграны были водевили: «Иван Иванович Иванов», «Смесь языков», «Школьный учитель» и «Ямщики». Театр был полон: первые ряды заняты были горецкими чиновниками и их семействами, а дальнейшие ряды гражданами и больше гражданками города Горок. Оркестр музыки состоял из 6 или 7 евреев. Публики собралось до 200 асоб и в кассу собрано до 60 руб... Играли ученики земледельческого училища, один гимназист и один бывший студент института до того удовлетворительно, что публика с видимым удовольствием пробыла во все время спектакля с $5^1/_2$ до 11 часов.

1870 г.

№ 35

Педагогический совет Горецких учебных заведений доводит до сведений господ землевладельцев, желающих ознакомиться с правильной обработкой земли и употреблением некоторых земледельческих орудий и машин, что в течение нынешнего лета на Горецкой учебной ферме, при обработке полей, посевах и уборке сена будут употребляться следующие орудия:

При подъеме почвы на пару: плуги Аббея, Говарда, Грипьонский и Гогенчеймский с почвоуглубителями Рида и Бажанова.

При бороновании: бороны Говарда, Альтона (цепная) и другие.

При уборке сена: сенокосилка Вуда, сеноворотилка Говарда и конные грабли.

При посеве хлебов: сеялка Робильяра и рядовая сеялка Гаррета.

Удобнейшим временем для ознакомления с работами совет полагает для уборки сена с 20 по 30 июня, для пахоты, бороньбы и озимых посевов время между 10 и 20 августом.

1871 г.

№ 26

От Горецкой дворянской опеки объявляется, что имение Каменка наследников Ватацы, состоящее в ведении опеки, отдается в арендное содержание на один год, с 1 мая 1871 г. по 23 апреля 1872 г. Срок торгам назначен на месте в имении Каменка 15 апреля 1871 года. Имение это состоит в двух станах Горецкого уезда.

1875 г.

№ 37

Горецкая городская дума объявляет, что в присутствии ея назначен срок торга 3 будущего июня с узаконенною чрез три дня переторжкою, на отдачу в шестилетнее содержание 5 городских мясных лавок с двумя погребами. Желающие участвовать в торгах приглашаются в думу на означенный срок с узаконенными залогами.

№ 77

Горецкая городская дума Могилевской губернии объявляет всем тем евреям Горецкого уезда, кои подлежат освидетельствованию в летах по наружному виду, чтобы они до поступлении срока призыва в сем году, т. е. до 1 ноября, явились в Горецкое уездное по воинской повинности Присутствие для освидетельствования их в летах по наружному виду.

1877 г.

№ 46

Горецкое уездное полицейское управление объявляет: по неплатежу землевладельцем Горецкого уезда Александром Михайловичем Звягинцевым Графу Георгию Михайловичу Цукатто 4000 руб. серебром с процентами и неустойкой назначено в продажу на 6-ое число июля сего года движимое имущество, находящееся в фольварке Козьянах Горецкого уезда, заключающееся в рогатом и нерогатом скоте, птицах, экипажах, рухляди, мебели, зерновом хлебе, винокуренными принадлежностями и прочее, оцененное в 4314 руб. 50 коп. Торги будут производиться на месте, в ф. Козьянах, с аукциона.

1904 г.

№ 68

М. Романово

Наша пожарная дружина заслуживает самого лестного отзыва за свою энергичную и самоотверженную работу на пожаре. На первый удар зловещего набата дружинники немедленно собираются на месте пожара и начинают усердно работать и почти не было ни одного пожарного случая, чтобы загоревшиеся строения сгорели до тла: мигом строение разбрасывается, а пламя потухает. Пожарная дружина много обязана бывшему начальнику ея, покойному князю В. М. Дондукову-Корсакову, который своими щедрыми пожертвованиями много помог устройству команды.

П. Шницер.

1905 г.

№ 95

20-го июля, в день храмового праздника в деревне Аниковичи Маслаковской волости Горецкого уезда праздновалось открытие чайной Могилевского попечительства о народной трезвости, устроенной в этой деревне стараниями Горецкого уездного комитета попечительства и местного землевладельца в должности гофмейстера Высочайшего Двора Эммануила Александровича Ватаци...

Открытие чайной состоялось при огромном стечении народа, прибывшего из многих соседних деревень. Священник Аниковичей отец Четыркин сказал прочувствованное слово...

Кроме чая, крестьяне будут пользоваться прекрасно обставленной для их нужд библиотекой и несколькими газетами...

1906 г.

№ 17

После долгого затишья жизнь начала проявляться и в г. Горки. Так, 2 февраля в помещении общественного собрания, по почину Н. И. Деньгига, был устроен танцевальный вечер, который прошел весьма оживленно, а 9 февраля в том же помещении любителями сценического искусства дан был спектакль в пользу местного вольнопожарного общества. Спектакль возник по инициативе начальника вольнопожарной дружины А. К. Поздзерского и его помощника В. Е. Робцера. Ставились: комедия в 2-х действиях и фарс в 1 действии. Спектаклю предшествовал концерт. Как концерт, так и спектакль прошли вполне удовлетворительно, с незначительными минусами, но в общем в такой глуши, которую представляют из себя Горки, публика осталась довольна. Сбор от спектаклей получился полный и тесное помещение клуба битком было набито публикой. Будем надеяться, что хороший почин и достойный подражания пример привлечет больше инициаторов и развеет скучную, однообразную сонливость, в которую впали жители Горок.

Ш. Ярмолик.

1908 г.

№ 69

В настоящее время приглашенными земством мастерами из новгородской губернии производится в уездах Горецком и Рогачевском устройство глиносоломенных несгораемых крыш у крестьян-владельцев, пожелавших устроить таковыя на своих строениях.

1913 г.

№ 79

Обязательное постановление об очистке земского мощения в г. Горках

Очистка от сора, грязи и снега замощенных улиц г. Горок Большой Оршанской и Институтской возлагается на обязанность прилегающих к мощению домовладений и земельных участков в длину и в пределах границ каждого владения, и в ширину до середины мощения.

Виновные в неисполнении сего постановления подвергаются законной ответственности.

Настоящее обязательное постановление вступает в законную силу через две недели со времени опубликования его.

Могилевский губернатор А. Пильц.

«ГОРЕЦКИЙ ВЕСТНИК»

1917 г.

№ 23

К выборам в волостное земство

13 августа было днем выборов по Горецкому уезду в волостное земство — эту первоначальную самоуправляющуюся единицу, бывшую для многих передовых земцев мечтой.

Нельзя сказать, чтобы эти выборы на самых демократических началах протекли гладко и дружно. В № 12 «Горецкого Вестн.» указывалось, что Горецкой Уездной Земской Управой посылалась губернскому комиссару телеграмма о переносе выборов на 8 сентября, вследствие отвлечения населения полевыми работами и получения дополнительных правил 26 июля. Сущность правил 26 июля (опубликованных в «Вестнике Временного Правительства» от 4 Августа) заключается в том, что рядом с мажоритарной системой выборов (т. е. по большинству голосов) могут быть произведены по разрешению Уездной Земской Управы, пополненной представителями местных общественных организаций, и с согласия Губернского Комиссара и пропорциональные выборы — как напр., были произведены выборы во все городские думы. Понятно, переход от одной системы к другой не обязателен.

И можно утверждать, что прежняя система (мажоритарная) более отвечает интересам крестьянства, что она скорей покажет подлинный голос крестьянства, могущего наметить местным кандидатам из своей среды, а не голосующего по чужой указке. И ссылка Горецкой Уездной Земской Управы в телеграмме Губернскому Комиссару на правила 26 июля нам представляется несущественной. Может быть важнее ссылка на отвлечение населения полевыми работами. В этом отношении очень любопытная телеграмма председателя Дубровенской избирательной комиссии Князькова, что выборы волост. гласных не состоятся. Почему? Или Дубровенская воласть решила перейти на пропорциональные выборы, вопреки точному смыслу правил 26 июля, или помешали полевые работы, или недоставало организационных сил — или еще что?

В настоящее время еще не представляется возможным сказать что-либо определенное о выборах по всему Горецкому уезду до получения сведений от всех волостей. В предыдущем № «Гор. Вестн.» приведена справка об одном округе Горецкой волости, где из 351 избирателя явилось 134, т. е. всего 38 %, процент слишком малый. Видимо, избирательные кампании в различные комитеты крестьянам попросту приелись и в то же время они не сознают всей важности волостных земств. В передовой статье «Г. В.» от 4 августа указывалось, что «Земская Управа» делает все возможное для успешного проведения выборов: намечен выезд членов существующих общественных организаций.

Отвлечение ли населения полевыми работами, простой ли индифферентизм (уклонение) избирателей, недостаточная ли подготовка и организация выборов или же удовлетворительность выборов — покажут сведения с мест.

ЭН.

№ 25

Правление Общества Распространения образования в г. Горках и его уезде настоящим сообщает, что в предстоящем учебном году открывается 6-й класс женской гимназии и что паевые взносы принимаются казначейством Правления Н. С. Гинзбургом ежедневно.

Правление

№ 27

На всех мельницах уезда с 31 августа по постановлению Уездного Продовольственного Комитета вводится десятинный сбор за помол ржи и виновные в невыполнении этого постановления будут привлечены к ответственности.

№ 30

14 сентября состоялось заседание Уездного Продовольственного Комитета. Обсуждалось собственно только 2 вопроса: об совершенной отмене десятинного сбора при помоле на мельницах и выборы председателя и двух членов вместо отказавшихся. Заседание носило весьма бурный характер.

* * *

Винокурение в уезде принимает все большие и большие размеры, в особенностях в Романовской и Баевской волостях. В настоящее время спирт получается уже довольно хорошего качества, причем по своим качествам винокуры различают: первый отгон самый лучший, второй хуже и третий — последний сорт. Пуд хлеба при выкурке на спирт оплачивается в 60 руб.

№ 31

Заседание гласных Горецкой Городской Думы 16-го сентября

Заседание, назначенное в 8 часов вечера, едва открылось в 10 часов ночи: для законности заседания пришлось многих гласных приглашать особыми приглашениями. Согласно телеграмм исполняющего обязанности губернского Комиссара Певзнера избрание председателя думы и его заместителя признано вступившим в силу. Поэтому 16 сентября были произведены выборы городского головы, членов управы и городского секретаря. Избранными оказались: городским головой — А. И. Креер (13 избирательных против 3), членами Управы — Минкин и Иванов, городским секретарем — Кожуро.

№ 32

20 сентября в помещении Земской Управы состоялось совещание волостных комиссаров и секретарей по вопросу о выборах в Учредительное собрание. На совещании присутствовал Уездный Комиссар и Председатель Крестьянских Депутатов. Совещание было созвано по инициативе Земской Управы и ознаменовалось крупными инцидентами.

* * *

Ремонт здания, предназначенного для гимназии, не успел к 16 сентября, поэтому занятия в гимназии предположительно начать 2-го октября. 2-го же октября будет молебствие пред началом учебных занятий в училищах Министерства Земледелия.

№ 34

О заседании первого Горецкого Волостного Земского Собрания 26 сентября 1917 г.

Горецкое Волостное Земское Собрание было при 19 гласных в помещении волостного правления открыто в половине второго председателем Волостной избирательной комиссии Коробовым Я. А. при секретаре С. Е. Мавцевиче.

При открытии собрания председательствующий ознакомил гласных со ст. 42—62 Временного положения о волостном земском собрании, а затем согласно ст. 45 и 46 того же положения было предложено собранию выбрать председателя и его заместителя на 1917 год. При сем Председателем Волостного Земского Собрания оказался избранным Я. А. Коробов, а его заместителем — И. С. Зотов...

№ 35

Волостное земство

С образованием волостных земств вводится новая должность волостного сборщика, на обязанности которого будет лежать взыскание разных повинностей, налогов и сборов. По этому поводу на совещании представителей уездных земств, бывшем в Могилеве 3 сентября, высказано было предположение, что для Горецкого уезда следует установить 6 участковых сборщиков...

№ 38

От Могилевской Окружной по делам о выборах в Учредительное Собрание комиссии

Настоящим доводится до всеобщего сведения список кандидатов в Члены Учредительного Собрания от Могилевского избирательного Округа, заявленный 5-го октября в 6 часов вечера.

№ 1

Могилевский Губернский Совет Крестьянских Депутатов
и Губернская Организация партия Социалистов-Революционеров

Хрисаненков Лукьян Афанасьевич, гор. Горки Могилевской губернии.

«СВОБОДНОЕ СЛОВО»

1917 г.

№ 2

От редакции

Газета «Свободное слово», защищая интересы трудового народа, издается на скромные гроши этого народа. Редакция просит всех сочувствующих направлению газеты оказать ей помощь как деньгами, так и привлечением подписчиков и распространителей «Свободного

слова». Редакция просит крестьян, у кого имеются какие-нибудь вопросы, требующие разъяснения, присылать их в редакцию и редакция на страницах газеты будет давать ответы на эти вопросы. Редакция также убедительно просит жителей уезда присылать заметки и статьи с изложением происшествий и событий, которые имеют у них место. Эти заметки редакция охотно поместит на страницах «Свободного слова»...

Товарищи крестьяне! Всеми силами поддерживайте свою крестьянскую газету «Свободное слово»!

№ 3

23-го июля состоялось первое собрание новой Городской Думы. Городским Головой 14 голосами против 6 избран А. И. Креер. Членами Иванов и Зильберман, секретарем Кожуро. Жалованье назначено Городскому Голове — 2000 р., членам Управы по 1200 р., секретарю — 1800 р.

№ 6

Местная жизнь

1-го августа закончился прием прошений в местные учебные заведения. В 1-й приготовительный класс землемерно-агрономического училища подано около 110 прошений, в 1-й класс среднего сельскохозяйственного училища приблизительно столько же. Вакансий 30.

По ходатайству группы родителей в гимназии Успенской открывается 6 класс.

Местным отделением помощи жертвам войны в г. Горках открывается училище для беженцев.

№ 15

31 августа состоялось заседание Горецкого Совета рабочих депутатов совместно с комиссаром и революционными организациями. Обсуждался текущий момент и вынесена резолюция о всемерной поддержке Временного правительства в борьбе с Корниловым. Решено выпустить воззвание к населению.

В закрытой части заседания обсуждались вопросы, имеющие местный характер.

№ 19

26 сентября в здании землемерно-агрономического училища состоялось собрание представителей всех существующих в Горках общественных, политических и профессиональных организаций, на котором обсуждался вопрос о создании в Горках «Народного университета».

На 15 октября решено созвать Общее собрание для рассмотрения Устава общества и для записей членов.

* * *

С 27 сентября Городская Дума и Управа вступила в исполнение своих обязанностей.

№ 20

1 октября по инициативе Совета крестьянских депутатов и комитета партии «социалистов-революционеров» был устроен на открытом воздухе возле помещения Совета митинг. По случаю ярмарки собралось много народу, особенно крестьян. Тов. Ильницкий изложил на общедоступном языке программу партии «социалистов-революционеров». Крестьяне слушали с большим вниманием...

После митинга было роздано собравшимся «Обращение Совета крестьянских депутатов и комитета партии социалистов-революционеров», содержащее в себе призыв голосовать за партию «социалистов-революционеров».

Надо отметить, что крестьяне с большой охотой получали эти воззвания: есть у крестьян стремление читать и поэтому необходимо в этом отношении идти им навстречу.

№ 21

С 1 октября начались занятия в Горецких Учебных заведениях. Город значительно оживился. Тяжелые условия жизни, дороговизна побудила учеников создать свой коопера-

тив. Согласно разработанному проекту членами его могут быть учащиеся всех учебных заведений г. Горок, паевой взнос предлагается в 10 рублей. Вступительный взнос один рубль.

№ 22

7 октября в здании землемерно-агрономического училища местным литературно-музыкально-драматическим кружком был поставлен спектакль «Волки и овцы» Островского.

№ 23

Учащиеся Горецких Учебных Заведений соорганизовали агитаторские группы перед выборами в Учредительное Собрание. Задача интеллигенции самая насущная и неотложная — это побудить крестьян идти голосовать, подавать голоса.

Падрыхтавалі М. Студнева, С. Кротава.

З гісторыі горацкіх сельскагаспадарчых навучальных устаноў

УКАЗ ЦАРА МІКАЛАЯ І СЕНАТУ ВЫКАНАЦЬ ПАЛАЖЭННЕ АБ АДКРЫЦЦІ ГОРЫ-ГОРАЦКАЙ ЗЕМЛЯРОБЧАЙ ШКОЛЫ

24 красавіка 1836 г.

Изыскивая способы к постепенному усовершенствованию земледелия в Империи Нашей, яко главнейшаго источника богатства частного и общего, учредили МЫ, для открытия ближайших к тому средств, особый Комитет, по заключениям коего разныя мероположения приведены уже в действие, но как главный способ к достижению столь желаемой цели состоит в распространении нужных сведений и приготовлении практических людей, для введения лучших метод сельского хозяйства, то ко предначертанию того Комитета ПОВЕЛЕЛИ МЫ Министру Финансов приступить неотлагательно к учреждению Земледельческой Школы с образцовым сельским хозяйством и коренною овчарнею. Одобрив ныне окончательныя предположения того Комитета о сем заведении, МЫ утвердили прилагаемое при сем Положение о Горы-Горецкой Земледельческой Школе, и дав Министру Финансов нужныя повеления по прочим предметам, до сего дела относящимся, ПОВЕЛЕВАЕМ Правительствующему Сенату вышеозначенное Положение привести в надлежащее исполнение.

Николай

С. Петербург

24 Апреля 1836

Министр финансов

Получ. *16 Апреля 1836 г.*

З фондаў музея гісторыі БСГА.

У першай палове XIX ст. на значнай частцы тэрыторыі царскай Расіі былі частыя неўраджаі, лютаваў голад. Сельская гаспадарка была ў заняпадзе, не хапала спецыялістаў. У гэтай сувязі ў лістападзе 1833 г. на пасяджэнні Камітэта міністраў было прынята рашэнне заснаваць асобы камітэт, які б займаўся пытаннямі ўдасканальвання земляробства ў Расіі. Гэты камітэт рашыў выдаваць «Земледельческую газету», друкаваць агранамічную літаратуру і адкрыць земляробчую школу з двума разрадамі — вышэйшым і ніжэйшым. Летам 1835 г. была выслана спецыяльная камісія для абследавання і выбару фальваркаў, якія б падыходзілі для стварэння школы. Камісія спынілася на Горы-Горацкім маёнтку.

24 красавіка 1836 г. быў выдадзены указ Сената аб заснаванні Горы-Горацкай земля-

робчай школы. На працягу 1837—40 гг. пад кіраўніцтвам італьянскага архітэктара А. Кампіоні для школы было ўзведзена 35 будынкаў: 3 цагляныя трохпавярховыя корпусы, майстэрні, аранжарэі, жылыя дамы для выкладчыкаў, лазня, лазарэт і іншыя гаспадарчыя пабудовы. Царскі ўрад выдзеліў на будаўніцтва ўсяго 296 тыс. руб.

Урачыстае адкрыццё земляробчай школы адбылося 15 жніўня 1840 г. Яна мела 2 разрады: першы (ніжэйшы) і другі (вышэйшы) з тэрмінам навучання ў кожным 3 гады. Першы разрад павінен быў рыхтаваць «земледельческих учеников» і даваць ім асновы агранаміі. Камплектаваўся ён у асноўным з дзяцей дзяржаўных і прыгонных сялян. Прымалі юнакоў 16—20-гадовага ўзросту, ад якіх патрабавалі ўменне чытаць, пісаць і ведаць чатыры дзеянні арыфметыкі. У першым разрадзе вывучалі земляробства, жывёлагадоўлю, гадоўніцтва, лесаводства, агульнаадукацыйныя навукі, вучні выконвалі практычныя работы. Паспяхова скончыўшыя першы разрад, акрамя дзяцей прыгонных сялян, залічваліся ў другі, які рыхтаваў аграномаў. Навучэнцы другога — вышэйшага — разрада вывучалі агранамію, лесаводства, гісторыю і статыстыку сельскай гаспадаркі, хімію, заалогію, батаніку.

Усе навучэнцы жылі ў пансіёне, увесь час насілі форму. За імі вялі нагляд інспектары, наглядчыкі з унтэр-афіцэраў. Апошнія пільна сачылі за паводзінамі юнакоў, забаранялі ім чытаць кнігі, «коих чтение могло иметь вредное влияние на нравственность». Навучэнцаў каралі розгамі і саджалі ў карцэр. Іх на працягу трох гадоў не адпускалі дадому нават на канікулы.

19 студзеня 1842 г. была зацверджана дадатковая пастанова да палажэння Горы-Горацкай земляробчай школы. Згодна з ёй другі разрад быў рэарганізаваны ў самастойную навучальную установу — Вышэйшую сельскагаспадарчую школу. У яе прымалі дзяцей дваран і разначынцаў, якія скончылі гімназію і вытрымалі экзамен, неабходны для паступлення ва універсітэт. У 1843 г. тэрмін навучання ў Вышэйшай сельскагаспадарчай школе быў скарочаны да двух гадоў. У гэтай школе вывучалі хімію, фізіку, батаніку, агранамію, лесаводства, статыстыку, архітэктуру, мінералогію, ветэрынарыю, механіку, геадэзію і іншыя дысцыпліны. З мэтай вывучэння практычнага вопыту вядзення сельскай гаспадаркі праводзіліся агранамічныя падарожжы.

У 1845 г. пры школе пачала дзейнічаць вучэбная ферма, якой былі перададзены зямля і асноўныя гаспадарчыя пабудовы. На ферме вучылі вядзенню гаспадаркі і рыхтавалі вучняў да паступлення ў ніжэйшы разрад земляробчай школы. Тэрмін навучання складаў чатыры гады.

За 1840—48 гг. абодва разрады школы і ферму скончылі 162 навучэнцы. Адначасова з вучэбнымі заняткамі ў Горы-Горацкай земляробчай школе пад кіраўніцтвам прафесара Б. А. Цалінскага і ад'юнкт-прафесара Б. Г. Міхельсона праводзіліся навуковыя даследаванні. Для гэтага выкарыстоўвалася спецыяльнае доследнае поле ў дваццаць дзесяцін зямлі ў Горацкім фальварку і ўчастак у батанічным садзе. У галіне раслінаводства вывучаўся ўплыў розных угнаенняў на ўрадлівасць пшаніцы, ячменю, аўса, бульбы, ільну. За 1841—47 гг. выпрабавана 47 гатункаў бульбы, 23 гатункі пшаніцы, ячменю, аўса і канюшыны. У жывёлагадоўлі даследавалася эфектыўнасць кармоў розных відаў. Праводзіліся выпрабаванні сельскагаспадарчых машын і прылад, спосабы захавання сельскагаспадарчых прадуктаў. У 1848 г. ніжэйшы разрад быў пераўтвораны ў земляробчае вучылішча з 6-гадовым тэрмінам навучання.

30 чэрвеня 1848 г. шляхам рэарганізацыі вышэйшага разраду Горы-Горацкай земляробчай школы пачаў працаваць Горы-Горацкі земляробчы інстытут з 4-гадовым тэрмінам навучання. Яго выпускнікі атрымлівалі званне вучонага памочніка ўправіцеля, а праз шэсць гадоў працы па спецыяльнасці — атэстат вучонага ўправіцеля. У інстытут прымалі выпускнікоў гімназій без экзаменаў і асоб, якія здалі экзамены за гімназічны курс. У розныя гады ў ім навучалася ад 100 ад 200 студэнтаў, пераважна дзяцей дваран, мяшчан, купцоў, духавенства з усіх губерняў Расіі, а таксама з Германіі і Францыі. На працягу чатырох гадоў студэнты вывучалі фізіку, хімію, батаніку, заалогію, паляводства, лугаводства, жывёлагадоўлю, лесаводства, бухгалтэрыю, архітэктуру, геадэзію, з 1859 г. пачалі вывучаць палітэканомію. Амаль чвэрць вучэбнага часу адводзілася вывучэнню гуманітарных навук — рускай мовы, гісторыі рускай літаратуры, замежнай мовы, права, логікі і іншых. Пасля заканчэння інстытута маладыя людзі атрымлівалі дыплом агранома ці сапраўднага студэнта агранаміі.

У летнія месяцы студэнты пад кіраўніцт-

План маёнтка, які належаў Горы-Горацкай земляробчай школе ў 1840—44 гг. (трохвугольнікам пазначаны фальваркі).

вам выкладчыкаў ажыццяўлялі агранамічныя падарожжы ў іншыя губерні Расіі. Адной з форм навучання была пастаноўка перад студэнтамі конкурсных задач, адказы на якія даваліся ў выглядзе сачыненняў, лепшае сачынне адзначалася залатым медалём.

У 1859 г. пры земляробчым інстытуце пачала дзейнічаць новая навучальная ўстанова — класы прыватных каморнікаў і таксатараў з тэрмінам навучання два гады. Прымалі ў гэтую навучальную ўстанову шаснаццацігадовых юнакоў «усіх свабодных станаў», але ўсё ж такі перавага аддавалася дзецям дваран. Навучэнцам выкладалі ніжэйшую геадэзію, нівеліраванне, таксацыю, чарчэнне, іншыя спецыяльныя прадметы.

У 1909 г. горацкія каморніцка-таксатарскія класы былі пераўтвораны ў каморніцка-агранамічнае вучылішча з тэрмінам навучання 6 гадоў. Гэта была адзіная ў Расіі навучальная ўстанова такога профілю.

Студэнты і выкладчыкі інстытута прымалі актыўны ўдзел у сельскагаспадарчых з'ездах і выставах, якія праводзіліся пры Горы-Горацкім інстытуце.

Пры інстытуце дзейнічалі завод па вырабу цэглы і дрэнажных труб, майстэрня сельскагаспадарчых машын, сыраварня, вучэбная пасека, музеі: заалагічны, анатамічны, сельскагаспадарчых машын, у апошнім знаходзілася вялікая калекцыя замежных і айчынных сельскагаспадарчых прылад і тэхнікі, батанічны сад (калекцыя налічвала больш за 3870 раслін), бібліятэка, у фондзе якой у канцы 50-х гадоў XIX ст. налічвалася звыш 7 тыс. кніг.

У Горы-Горацкім сельскагаспадарчым інстытуце праводзіліся навуковыя даследаванні: вапнаванне глебы, удасканальванне ільняной вытворчасці, кормавытворчасці; вывучэнне эфектыўнасці ўгнаенняў, розных тыпаў севазвароту, абарона раслін ад шкоднікаў, канструяванне сельскагаспадарчых машын, асушэнне зямель закрытым дрэнажом і іншыя. Была выведзена парода танкарунных авечак, прыстасаваных да кліматычных умоў сярэдняй паласы Расіі. У інстытуце выкладалі прафесары А. А. Гінцаль, Э. Ф. Рэга, Б. А. Цалінскі, К. Д. Шмідт, выпускнікі інстытута А. М. Бажанаў, С. С. Касовіч, А. В. Саветаў, І. А. Сцебут. Сярод выпускнікоў інстытута — вядомыя вучоныя ў галіне сельскагаспадарчай навукі А. П. Людагоўскі, І. М. Чарнапятаў, Е. С. Фалькоў, У. І. Палімпесаў, Ю. Ю. Жабенка, А. Н. Казлоўскі і іншыя.

За ўдзел студэнтаў і выкладчыкаў у паўстанні 1863—64 гг. заняткі ў інстытуце былі спынены, а ў 1864 г. ён быў пераведзены ў Пецярбург. За 16 гадоў свайго існa-



Будынак фізіка-хімічнага корпуса.

вання ў інстытуце было падрыхтавана 499 аграномаў вышэйшай кваліфікацыі.

Значную ролю ў станаўленні адукацыі ў Горках адыгралі і сярэднія сельскагаспадарчыя навучальныя ўстановы, размешчаныя ў горадзе, якія за перыяд з 1840 па 1864 г. выпусцілі 604 спецыялістаў сярэдняй кваліфікацыі. Больш 600 чал. скончылі каморніцка-таксатарскія класы, вучэбную ферму і школу авечнікаў.

«Одой в честь сахалинского плодородия» назваў працу выпускніка Горы-Горацкага земляробчага інстытута М. С. Міцуля пісьменнік А. П. Чэхаў. Імя Міцуля і сёння носяць горны хрыбет на захад ад Паўднёва-Сахалінска, перавал і горны пік, два сялы ў Сахалінскай вобласці — Міцулёўка і Міхайлаўка.

З 1851 па 1853 год у інстытуце вучыўся П. А. Бахмецеў, прататып галоўнага героя рамана М. Г. Чарнышэўскага «Что делать?».

Сярод беларускіх літаратуразнаўцаў існуе версія аб тым, што студэнт Горы-Горацкага земляробчага інстытута з'явіўся аўтарам вядомай беларускай паэмы «Тарас на Парнасе».

Нягледзячы на закрыццё земляробчага інстытута, Горкі як цэнтр сельскагаспадарчай адукацыі Расіі захаваў сваё значэнне. Асноўнай навучальнай установай у Горках стала земляробчае вучылішча. Да 1864 г. яно знаходзілася ў падпарадкаванні інстытута і ўзначальвалася яго дырэктарам. Выкладчыкамі вучылішча былі прафесары інстытута. Пасля закрыцця інстытута вучылішчу быў нададзены асобны штат. Зацверджаны пасады дырэктара, шасці настаўнікаў, інспектара, законавучыцеля і двух наглядчыкаў.

У вучылішча прымалі юнакоў усіх саслоўяў ва ўзросце 16—20 гадоў, якія вытрымалі ўступныя экзамены. Пры паступленні ў вучылішча таксама ўлічвалася класавая і рэлігійная прыналежнасць. Пераважай карысталіся дзеці, бацькі якіх належалі да маёмных класаў, і праваслаўныя. Руская мова была абавязковай для ўсіх вучняў. Навучанне працягвалася чатыры гады, а з 1870 г. — пяць.

Пры пераходзе з аднаго класа ў другі вучні былі павінны здаваць экзамены па ўсіх прадметах, якія вывучалі ў адпавед-

Будынак рамеснага вучылішча.

ным класе, акрамя гэтага, у ліпені і жніўні вучні старэйшых класаў экзаменаваліся ў час праходжання імі сельскагаспадарчай практыкі. У канцы навучання праводзіліся выніковыя экзамены, пасля чаго вучні размяркоўваліся на практыку ў прыватныя маёнткі або казёныя фермы ў розныя губерні Расіі, часцей за ўсё Магілёўскую, Смаленскую, Мінскую, Палтаўскую, Віцебскую, Чарнігаўскую, Пецярбургскую.

Пасля заканчэння практыкі кожны вучань быў павінен зрабіць справаздачу педагагічнаму савету аб сваёй рабоце.

Выпускнікі вучылішча атрымлівалі званне «учебного управительского помощника», а праз шэсць гадоў працы ў сельскай гаспадарцы — атэстат на званне «ученого управителя». Большасць былых вучняў працавалі ў якасці аканомаў у прыватных маёнтках.

Па палажэнню ў вучылішчы было 40 казённых стыпендый па 100 руб. у год кожная, а з 1872 г. — па 125 руб. Такая колькасць казённых стыпендый захавалася да 1911 г., калі земляробчае вучылішча было пераўтворана ў сярэдняе сельскагаспадарчае. Тыя, хто карыстаўся гэтымі стыпендыямі, павінны былі пасля заканчэння вучобы працаваць ва ўстановах, якія належалі Міністэрству дзяржаўных маёмасцей столькі гадоў, колькі яны атрымлівалі стыпендыю.

У 1879—1910 гг. Горацкае земляробчае вучылішча было адным з буйнейшых сярэдніх сельскагаспадарчых навучальных устаноў. У розныя гады ў ім набывалі веды ад 132 да 212 вучняў. Гэта былі юнакі з усіх губерняў Расіі. Так, у 1902 г. з 204 вучняў з Магілёўскай губерні было 53 чал., Ліфляндскай — 37, Мінскай — 10, Курляндскай — 7, Чарнігаўскай — 7, Віцебскай — 6, Курскай — 6, Санкт-Пецярбургскай — 4, Калужскай — 4, Ковенскай — 4, Ніжагародскай — 4, з іншых — 30 чал. З 1840 па 1890 г. вучылішча скончылі 621 чал., якія сталі спецыялістамі сельскай гаспадаркі сярэдняй кваліфікацыі. З 1901 па 1910 г. вучылішча скончылі 254 чал.

У 1911 г. на падставе «Палажэння аб сельскагаспадарчай адукацыі», якое было прынята Міністэрствам дзяржаўных маёмасцей, пачалася перабудова земляробчых вучылішчаў у чатырохкласныя сельскагаспадарчыя

вучылішчы. У Горацкім вучылішчы гэта перабудова была праведзена ў 1911—15 гг. Згодна з новым Палажэннем асобы, якія скончылі вучылішча, атрымлівалі званне агранома.

У 1911—17 гг. у Горацкім сельскагаспадарчым вучылішчы працавалі: Е. М. Безсонаў, Н. В. Найдзёнаў, М. М. Высоцкі, А. Э. Пуйдэ, І. І. Красікаў, М. М. Міхайлаў, П. С. Ларыёнаў і іншыя.

Неабходнасць падрыхтоўкі майстроў па вырабу, абслугоўванню, рамонту сельскагаспадарчых машын і прылад выклікала адкрыццё пры Горацкім земляробчым вучылішчы на базе механічнага завода рамеснага вучылішча. Палажэнне аб рамесным вучылішчы было зацверджана 18 лютага 1872 г., а заняткі пачаліся з першага верасня гэтага ж года. У гэта вучылішча прымалі юнакоў ва ўзросце 16 гадоў, моцнага целаскладу, якія маглі пісаць, чытаць, ведалі тры дзеянні арыфметыкі. Курс навучання ў вучылішчы працягваўся пяць гадоў. Два дні ў тыдзень вучні праходзілі тэарытычны курс, чатыры дні — практычныя заняткі па 8—10 гадзін у дзень.

У пачатку XX ст. Горацкае рамеснае вучылішча мела вялікае значэнне ў сістэме сельскагаспадарчай адукацыі Расіі. Аднак узнікла неабходнасць прывесці навучанне ў вучылішчы ў большую адпаведнасць патрабаванням тэхнічнай адукацыі таго часу. У сувязі з гэтым 12 сакавіка 1901 г. Дзяржаўны савет прыняў рашэнне аб пераўтварэнні рамеснага вучылішча, згодна з якім былі дакладна акрэслены ўмовы прыёму вучняў, тэрмін і аб'ём навучання, правы і абавязкі асоб, якія скончылі вучылішча, зацверджаны штат вучылішча, дадзены вядомыя правы яго служачым.

Вучні, якія паспяхова скончылі поўны курс навучання, атрымлівалі званне сельскага майстра-механіка і пасля выканання воінскай павіннасці карысталіся правамі скончыўшых курс навучальных устаноў другога разраду.

У 1911 г. Горацкае рамеснае вучылішча было пераўтворана ў сельскагаспадарчае рамеснае вучылішча. Тэрмін навучання быў скарочаны да трох гадоў. У 1912—17 гг. у вучылішчы набывалі веды ад 66 да 92 чал. у год.

За гады першай сусветнай вайны колькасць вучняў скарацілася, так як маладыя людзі прызыўнога ўзросту былі мабілізаваны ў армію, але тыя вучні, якія засталіся ў навучальных установах, паспяхова працягвалі авалодваць сельскагаспадарчымі ведамі.

Белорусская сельскохозяйственная академия. 150 лет. Краткий очерк истории и деятельности. Мн., 1990.

Высшее сельскохозяйственное образование в России и за границей. Спб., 1893.

Журнал сельского хозяйства. 1857. № 11.

Записки Горы-Горецкого земледельческого института. Кн. 1, Спб., 1852; кн. 3, Спб., 1854.

Литературное наследство. Т. 57. М., 1959.

Сборник сведений по сельскохозяйственному образованию. Вып. III. Спб., 1900.

Цитович С. Г. Горы-Горецкий земледельческий институт — первая в России высшая сельскохозяйственная школа. Горки, 1960.

Чехов А. П. Собр. соч. Т. 10. М., 1956.

Энциклопедический словарь Брокгауза и Ефрона. Т. 28.

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, ф. 2260.

У. Ліўшыц, М. Дзюбакова, З. Зябкіна.

Першыя даследаванні эфектыўнасці дрэнажных сістэм

Выключна важнае месца ў гісторыі развіцця земляробства і меліярацыі займаюць класічныя вопыты асушэння зямель закрытым дрэнажом пры Горы-Горацкім земляробчым інстытуце, праведзеныя ў 1856—63 гг. пад кіраўніцтвам Аляксандра Мікалаевіча Казлоўскага. А. М. Казлоўскі нарадзіўся ў 1832 г. у сям'і збяднелага шляхціца Магілёўскай губерні. У 1852 г. ён скончыў Горы-Горацкі земляробчы інстытут. У 1856 г. быў накіраваны ў Горы-Горацкі інстытут для арганізацыі работ па асушэнню зямель, а ў 1860 г. стаў прафесарам сельскагаспадарчай механікі і архітэктуры ў гэтым жа інстытуце.

А. М. Казлоўскі дасканала вывучыў вопыт прымянення дрэнажу ў Заходняй Еўропе і Прыбалтыцы. Гэты вопыт ён творча прымяніў пры правядзенні меліярацыйных работ і залажэнні закрытага дрэнажу пры Горы-Горацкім інстытуце.

Пабудаваная ў Горках пад кіраўніцт-

вам А. М. Казлоўскага меліярацыйная сістэма атрымала ў гісторыі навукі назвы «первого русского дренажа», «первого дренажа в России». Аднак з пункту гледжання гістарычных фактаў з гэтымі назвамі можна не згадзіцца, так як па сведках Дэпартамента сельскай гаспадаркі за 1851 г. на тэрыторыі Расійскай імперыі ўжо праводзілася асушэнне зямель закрытым дрэнажом у Курляндыі, Эстляндыі, Ліфляндыі і інш.

У той час дрэнажныя работы пры Горы-Горацкім інстытуце трэба разглядаць як першыя вялікамаштабныя навуковыя даследаванні па вывучэнню эфектыўнасці дрэнажных сістэм у розных глебамеліярацыйных умовах для мэт сельскай гаспадаркі і будаўніцтва. А. М. Казлоўскі ў кнізе «Дренажные работы при Горы-Горецких учебных заведениях» (1860 г.) пісаў: «Дрэнажаванне зямель пры Горы-Горацкіх навучальных установах у выглядзе вопыту ў малым маштабе было пачата ў 1853 г., а з 1856 г. яно ўжо набыло вялікія памеры. Дрэнажаванне зямель пры Горы-Горацкіх навучальных установах заслугоўвае ўвагі з боку дапытлівага гаспадара і спецыяліста па дрэнажу».

Дрэнаж пры Горы-Горацкім інстытуце быў найбольш дэталёва абследаваны А. Д. Дубахам у 1921—23 гг., калі па выяўленай дакументацыі былі праведзены раскопкі, якія дазвалялі аднавіць гісторыю работ і на месцах знайсці ўсе выкананыя ў 1856—63 гг. дрэнажныя сістэмы, высветліць іх стан і падрабязна апісаць. У наступныя гады абследаванне дрэнажу праводзілася Б. І. Якаўлевым у 1947—48 гг. і В. І. Кліпертам у 1957—58 гг.

Вынікі гэтых абследаванняў дрэнажу, закладзенага ў 1856—63 гг. пры Горы-Горацкім інстытуце, можна звесці да наступнага: агульная плошча дрэніраваных зямель каля 200 га (было абследавана каля 100 га), асушаліся мінеральныя глебы і тарфянікі, дрэнажныя сістэмы былі закладзены пад лугапашавымі ўгоддзямі, палявымі і агародніцкімі севазваротамі, дрэнаж таксама прымяняўся для асушэння зямель пры правядзенні будаўніцтва. Вынікі абследаванняў сведчаць аб тым, што дрэнажныя работы пры Горы-Горацкім інстытуце былі першымі унікальнымі навуковымі даследаваннямі па вывучэнню эфектыўнасці асушэння зямель закрытым дрэнажом.

В. Нямыкін.

Славутыя выпускнікі Горы-Горацкіх земляробчых навучальных устаноў

Бажанаў Аляксей Міхайлавіч (1820—89) у 1851 г. скончыў Горы-Горацкі земляробчы інстытут і стаў выкладаць сельскую гаспадарку ў Маскоўскай семінарыі. З 1863 г. пачаў працаваць у Горы-Горацкім земляробчым інстытуце. Ён напісаў кнігу «Что можно заимствовать у иностранцев по части земледелия?» (Спб., 1863), у якой абагульніў вынікі сваіх назіранняў у час замежнай камандзіроўкі ў 1861 г. у Англію, Бельгію, Германію, Францыю і Швейцарыю. А. М. Бажанаў у артыкуле «Об искусственно возделываемых лугах» (Журнал Министерства государственных имуществ. 1863, ч. 82) адным з першых апісаў геабатанічныя заканамернасці размяшчэння лугавых фітацэнозаў, іх структур і дынаміку развіцця. А. М. Бажанаў першым распрацаваў экалагічныя аспекты падбору травасумесі для лугавой кормавытворчасці, біялагічныя асновы агратэхнікі апрацоўкі лугавых траў.

Пасля пераводу ў 1864 г. земляробчага інстытута ў Пецярбург А. М. Бажанаў працаваў там прафесарам, затым быў дырэктарам Нова-Аляксандрыйскага інстытута сельскай гаспадаркі і лесаводства. Ён зрабіў рускі пераклад кнігі В. Бурмейстра «О разведении, содержании и употреблении домашних животных» (1865, 1867), напісаў кнігу «Руководство к разведению крупного рогатого скота, применительно к климатическим и сельскохозяйственным условиям России» (Спб., 1867), якія былі аднымі з першых дапаможнікаў па жывёлагадоўлі ў Расіі.

* * *

Іваноў Міхаіл Фёдаравіч нарадзіўся 21 верасня 1871 г. у Ялце. Яго бацька працаваў настаўнікам садаводства ў школе пры Нікіцкім батанічным садзе. У дзяцінстве Міхаіл вельмі любіў праводзіць час на авечкагадоўчай ферме, дзе банітаванне статка вёў выкладчык Горацкага земляробчага вучылішча Н. П. Сініцкі, які час ад часу прыязджаў сюды, што і вырашыла лёс хлапчука. У 1885 г. Міхаіл Іваноў паступіў у гэта вучылішча і паспяхова скончыў яго ў 1891 г. Потым ён скончыў яшчэ дзве навучальныя ўстановы: у 1893 г. баніцёрскую школу пры земляробчым вучылішчы ў Дзяркачах, што пад Хар-

кавам, і Харкаўскі ветэрынарны інстытут, дзе быў адным з лепшых студэнтаў. Сваю працоўную дзейнасць М. Ф. Іваноў пачаў у г. Кромы Арлоўскай губерні на пасадзе земскага ветэрынарнага ўрача. Потым у Харкаўскім ветэрынарным інстытуце чытаў курс жывёлагадоўлі. У 1903 г. ён абараняе магістэрскую дысертацыю на тэму «К вопросам об изменении азотистых веществ в плесневелых кормах». Яго зацвярджаюць прафесарам, затым загадчыкам кафедры жывёлагадоўлі. Потым М. Ф. Іваноў працаваў у Пятроўскай сельскагаспадарчай акадэміі, Маскоўскім заатэхнічным інстытуце і ў Камуністычным універсітэце імя Я. М. Свярдлова. Ён арганізаваў у дзяржаўным запаведніку «Асканія-Нова» фелецыя-племянную заатэхнічную станцыю. М. Ф. Іваноў — аўтар больш за дзвесце навуковых прац па пытаннях жывёлагадоўлі. У 1929 г. М. Ф. Іванову было прысвоена званне заслужанага дзеяча навукі і тэхнікі СССР, у 1934 г. без абароны прысуджана вучоная ступень доктара сельскагаспадарчых навук. У 1934 г. на VII Усесаюзным з'ездзе Саветаў ён быў выбраны членам ЦВК СССР. Памёр 29 верасня 1935 г.

* * *

Людагоўскі Аляксей Пятровіч (1840—82) у 1861 г. скончыў Горы-Горацкі земляробчы інстытут, дзе пад кіраўніцтвам І. А. Сцебута напісаў сваю першую навуковую працу «О костяном удобрении и способах его применения». Гэта была першая ў Расіі навуковая праца на гэту тэму. У 1861—65 гг. А. П. Людагоўскі працаваў у Маскоўскай земляробчай школе, склаў «Материалы для сельскохозяйственного описания Московской губернии», якія ўвайшлі ў «Сборник материалов для изучения Москвы и Московской губернии» (1864 г.). У 1865 г. А. П. Людагоўскі быў запрошаны на пасаду прафесара кафедры земляробства ў Пецярбургскі земляробчы інстытут, дзе абараніў магістэрскую дысертацыю «Подсолнечник. Принятие, распределение и движение минеральных питательных веществ в связи с образованием органического вещества» (1869 г.), якая была другой (пасля І. А. Сцебута) працай у Расіі па аграхімічных даследаваннях. У 1870 г. А. П. Людагоўскі быў выбраны па рэкамендацыі І. А. Сцебута прафесарам і загадчыкам кафедры эканомікі Пятроўскай земляробчай і лясной акадэміі, дзе напісаў першае ў Расіі кіраўніцтва па эканоміцы сельскай гаспадаркі — «Основы сельскохозяйственной экономии и сельскохозяйственного счетоводства» (1875 г.), удзельнічаў у стварэнні першай арыгінальнай сельскагаспадарчай экспедыцыі «Настольная книга для русских сельских хозяев» (1875—76 гг., т. 1—2).

* * *

Міцуль Міхаіл Сямёнавіч нарадзіўся 8 лістапада 1836 г. у сяле Малашэй Ціраспальскага павета Херсонскай губерні ў сям'і дзяржаўнага селяніна. Пасля заканчэння Адэскага вучылішча садаводства ён працаваў у батанічным садзе Горы-Горацкага земляробчага інстытута, потым быў прыняты ў гэты інстытут як стыпендыят Вольнага эканамічнага таварыства. Пасля заканчэння інстытута М. С. Міцуль служыць у дэпартаменце сельскай гаспадаркі Міністэрства дзяржаўных маёмасцей. У 1869 г. абіраецца членам Вольнага эканамічнага таварыства. У гэты час ён актыўна займаецца навуковай дзейнасцю і публікуе некалькі сваіх прац. У 1870 г. яму прапанавалі месца агранома ў экспедыцыі на востраў Сахалін. На востраве ён усебакова вывучаў расліны, глебу, прыроду. У выніку абагульнення навуковых даследаванняў ім была напісана кніга «Очерки истории Сахалина в сельскохозяйственном отношении», якая звярнула на сябе ўвагу А. П. Чэхава і атрымала яго высокую адзнаку. Памёр М. С. Міцуль 27 красавіка 1883 г. на Сахаліне.

* * *

Неручаў Міхаіл Васілевіч. Унёс значны ўклад у справу выдання літататуры па праблемах сельскай гаспадаркі. У 1867—69 гг. ён быў загадчыкам вучэбнай фермы Пятроўскай земляробчай акадэміі. Разам з І. А. Сцебутам прыняў непасрэдны ўдзел у стварэнні часопіса «Русское сельское хозяйство». Выданне гэтага часопіса, які рэдагаваў да 1876 г. выпускнік Горы-Горацкага земляробчага інстытута М. В. Неручаў, мела вялікае значэнне для распаўсюджвання і папулярызацыі дасягненняў сельскагаспадарчай навукі.

У 1870 г. М. В. Неручаў быў зволены з Пятроўскай акадэміі за апублікаванне некралога А. Н. Герцэну і да 1879 г. працаваў упраўляючым Бутырскім хутарам Маскоўскага грамадства сельскай гаспадаркі, потым дырэктарам Херсонскага земляробчага вучылішча. М. В. Неручаў напісаў значную колькасць работ па пытаннях сельскай гаспадаркі, выпусціў шэраг перакладаў замежных кніг, толькі за 1874—76 гг. ён апублікаваў больш за 100 артыкулаў і кніг у выданнях Маскоўскага грамадства сельскай гаспадаркі. У сваіх працах М. В. Неручаў асвятляў пытанні земляробства і жывёлагадоўлі, механізацыі і эканомікі сельскай гаспадаркі, у аглядах аналізаваў перспектывы развіцця сельскагаспадарчай адукацыі. Значную ўвагу ён удзяляў удасканальванню прылад для асноўнай апрацоўкі глебы, стварыў спецыяльныя плугі для апрацоўкі стэпавай глебы, напісаў шэраг артыкулаў аб асаблівасцях устройвання і прымянення розных плугоў і іншых сельскагаспадарчых прылад і машын. Асобае месца займаюць яго працы па вывучэнню прычын і метадаў барацьбы з засухай.

* * *

Саветаў Аляксандр Васілевіч нарадзіўся 15 лістапада 1826 г. у сяле Гульнева Дзмітрыеўскага

павета Маскоўскай губерні ў сям'і святара. Пачатковую адукацыю атрымаў у Дзмітрыеўскім духоўным вучылішчы. Потым вучоба ў Віфанскай семінарыі. У 1846 г. Сінод накіраваў А. В. Саветава на вучобу ў вышэйшы разрад Горы-Горацкай земляробчай школы. У 1850 г. А. В. Саветаў павінен быў вярнуцца ў духоўную семінарыю, але вучоны савет вырашыў пакінуць яго ў інстытуце і рыхтаваць да выкладчыцкай дзейнасці. Спачатку ён выкладаў сельскагаспадарчую тэхналогію, а затым асновы сельскай гаспадаркі і хіміі. У Маскоўскім універсітэце ў 1859 г. паспяхова абараніў магістэрскую дысертацыю «О разведении кормовых трав на полях». Яна была выдадзена асобнай кнігай і за дваццаць гадоў вытрымала чатыры выданні. У студзені 1859 г. А. В. Саветава зацвердзілі на пасаду ад'юнкт-прафесара, а ў канцы лістапада перавялі ў Санкт-Пецярбургскі універсітэт, дзе ён пачаў чытаць лекцыі па агранаміі, узначаліў агранамічны кабінет і кафедру сельскай гаспадаркі, стаў старшынёй сельскагаспадарчага аддзялення Вольнага эканамічнага таварыства, апублікаваў шэраг навуковых прац, у тым ліку кнігу «О системах земледелия», якая ўбачыла свет у 1867 г. На гэтую ж тэму ён паспяхова абараніў доктарскую дысертацыю і 16 студзеня 1867 г. атрымаў дыплом доктара сельскагаспадарчых навук — першы ў Расіі. У 1888 г. быў назначаны дэканам фізіка-матэматычнага факультэта. Памёр А. В. Саветаў 25 лістапада 1901 г.

* * *

Сцебут Іван Аляксандравіч нарадзіўся 12 лютага 1833 г. у сям'і аптэкара ў горадзе Вялікія Лукі Пскоўскай губерні. У 1843 г. паступіў у другую Пецярбургскую гімназію і ў 1850 г. скончыў яе з правам паступлення ва універсітэт. Аднак Іван Аляксандравіч вырашыў прадоўжыць сваю адукацыю ў Горы-Горацкім земляробчым інстытуце, дзе ён і вучыўся з 1850 па 1854 год. Потым працаваў памочнікам упраўляючага вучэбнай фермай, зрабіў агранамічнае падарожжа ў Прыбалтыйскія губерні, вывучаў развіццё сельскай гаспадаркі ў Германіі, Англіі, Шатландыі, Францыі. З 1860 г. зноў працуе ў Горы-Горацкім земляробчым інстытуце, дзе чытае курс земляробства, укараняе новыя формы выкладання ў выглядзе гутарак і семінараў. Пасля пераводу ў 1864 г. Горы-Горацкага земляробчага інстытута ў Санкт-Пецярбург І. А. Сцебут пераязджае туды і працуе над магістэрскай дысертацыяй на тэму: «Известкование почвы». Абарона адбылася на вучоным савеце Пецярбургскага універсітэта. З імем І. А. Сцебута звязана ўзнікненне ў Расіі жаночай сельскагаспадарчай адукацыі. З 1857 г. ён апублікаваў больш за 250 навуковых прац па самых разнастайных пытаннях земляробства і раслінаводства. Ім быў створаны першы сістэматычны курс раслінаводства. І. А. Сцебут удзельнічаў у рабоце Маскоўскага таварыства сельскай гаспадаркі, у рэдагаванні часопіса «Русское сельское хозяйство». І. А. Сцебут памёр 2 лістапада 1923 г.

* * *

Чарнапятаў Ілля Мікітавіч (1822—79). Вядомы сваімі працамі ў галіне заатэхнікі і агранаміі. І. М. Чарнапятаў скончыў вышэйшы разрад Горы-Горацкай земляробчай школы ў 1846 г. у ліку першых выпускнікоў (да 1846 г. вышэйшы разрад Горы-Горацкай школы закончыла ўсяго 2 чалавекі) і пачаў працаваць тапографам. У 1851 г. вытрымаў экзамен на званне агранома ў Горы-Горацкім земляробчым інстытуце. З 1853 г. працаваў выкладчыкам Пецярбургскага ляснога (з 1864 г. — земляробчага) інстытута. Тут ён падрыхтаваў свае першыя навуковыя манаграфіі — «Руководство к торфяному хозяйству», «Руководство к орошению разных земельных угодий», апошняя праца стала яго магістэрскай дысертацыяй. У 1863 г. І. М. Чарнапятаў вытрымаў экзамен на званне магістра сельскай гаспадаркі і лесаводства і з 1865 г. стаў працаваць прафесарам Пятроўскай земляробчай акадэміі, дзе кіраваў кафедрай жывёлагадоўлі. Вялікае значэнне для развіцця жывёлагадоўлі мелі працы І. М. Чарнапятава ў вобласці заатэхніі. Ён адным з першых указаў, што ў фарміраванні высокай прадукцыйнасці жывёлы вялікае значэнне мае паўнацэннае кармленне цялят, якое «должно начаться со времени его утробной жизни». На падставе вывучэння стану жывёлагадоўлі і заатэхнічнай навукі І. М. Чарнапятаў упершыню навукова абаснаваў тэорыю і асноўныя метады ўдасканальвання парод буйной рагатай жывёлы малочнага напрамку, ён падыходзіў да азначэння пароды і яе стварэння з прыродна-гістарычнага пункту гледжання, зазначаў, што не пароды мясцовай буйной жывёлы (яраслаўская, кастрамская і інш.) з'яўляюцца дрэннымі, а эканоміка сялянскіх гаспадарак не дазваляе павысіць іх прадукцыйнасць. І. М. Чарнапятаў напісаў шэраг прац па авечкагадоўлі, якія былі першымі аглядамі гэтай галіны жывёлагадоўлі. Ім быў напісаны раздзел па жывёлагадоўлі ў вядомай «Настольной книге для русских сельских хозяйств», у якой ён выклаў прагрэсіўныя для свайго часу погляды на развіццё жывёлагадоўлі і заатэхнічнай навукі.

У. Ліўшыц, В. Нямыкін.

Яны аддавалі свае веды моладзі

У 1899 г. у Горкі пасля заканчэння Маскоўскага сельскагаспадарчага інстытута быў накіраваны **Дзмітрый Дзмітрыевіч Арцыбашаў** (1873—1942), тут ён працаваў выкладчыкам і ўпраўляючым Горацкім рамесным вучылішчам. У Горках Дз. Дз. Арцыбашаў пачаў сваю плённую працу па акліматызацыі драўняных культур і дэкаратыўнаму садоўніцтву, напісаў шмат прац па прыкладной батаніцы і сельскагаспадарчаму машыназнаўству. Пасля Дз. Дз. Арцыбашаў працаваў у сельскагаспадарчым вучоным камітэце Міністэрства земляробства, з 1906 г. выкладаў на Сцебутаўскіх вышэйшых жаночых аграномічных курсах у Пецярбургу.

Дз. Дз. Арцыбашаў быў адным з нямногіх спецыялістаў па інтрадукцыі і акліматызацыі дэкаратыўных, драўняных і травяністых раслін у розных рэгіёнах СССР на доследных станцыях і акліматызацыйных гадавальніках. У Маскве ён праводзіў эксперыментальныя даследаванні ў асабістым садзе. Свой 40-гадовы вопыт у вобласці прыкладной батанікі, пачатак якога быў пакладзены яшчэ ў Горках, Дз. Дз. Арцыбашаў абагульніў у кнізе «Декоративное садоводство» (М., 1941), шэрагу артыкулаў па выніках вывучэння акліматызацыі рада раслін, даследаванняў у кветкаводстве і садоўніцтве.

* * *

У 1854—58 гг. выкладчыкам сельскагаспадарчай механікі ў Горы-Горацкім земляробчым інстытуце працаваў **Філіп Мікалаевіч Каралёў** (1821—94), вядомы вучоны ў галіне сельскагаспадарчай навукі і тэхнікі. Ф. М. Каралёў пасля заканчэння Харкаўскага універсітэта і абароны дысертацыі па механіцы на ступень магістра матэматыкі быў абраны ад'юнкт-прафесарам матэматыкі і механікі ў Горы-Горацкі земляробчы інстытут, дзе пачаў свае даследаванні па сельскагаспадарчай механіцы і будаўніцтву. У Горы-Горацкім інстытуце ў той перыяд была сабрана вялікая колькасць сельскагаспадарчых прылад працы і машын, набытых у 1852 г. у Англіі і Амерыцы, вывучэннем і ўдасканальваннем якіх заняўся Ф. М. Каралёў. В «Записках» (Т. 6. Спб., 1857) быў апублікаваны артыкул Ф. М. Каралёва «Об извести, как строительном материале, и преимущественно об оршанской», у якім ён разгледзеў склад розных вапнавых матэрыялаў у прымяненні да будаўніцтва, рэсурсы вапнякоў каля Оршы. Па словах А. В. Саветава, Ф. М. Каралёў палюбіў будаўнічую справу, удзельнічаў у будаўніцтве новых будынкаў Горы-Горацкага інстытута.

* * *

У 1871—74 гг. у Горацкім земляробчым вучылішчы выкладаў раслінаводства А. К. Краўзэ.

Б. А. Міхельсон

Аляксандр Карлавіч Краўзэ нарадзіўся ў 1847 г. у Прыбалтыцы. У 1869 г. ён скончыў Пецярбургскі земляробчы інстытут са званнем кандыдата сельскай гаспадаркі і лесаводства і ў 1871 г. быў назначаны старшым настаўнікам у Горы-Горацкае вучылішча, дзе разам з выкладчыцкай работай займаўся навуковымі даследаваннямі па вывучэнню біяхімічнага складу клубняў бульбы, распрацоўваў пытанні лесаводства, вывучаў эфектыўнасць вядзення рубак і яловых пасадак пры натуральным лесааднаўленні.

* * *

У 1840—60 гг. упраўляючым Горы-Горацкай вучэбнай фермай працаваў вядомы аграном і педагог **Барыс Андрэевіч** (Бернард Генрыхавіч) **Міхельсон** (1812—87). Пад яго кіраўніцтвам вучэбная ферма стала адной з узорных гаспадарак, ён таксама загадваў доследным полем і тэхнічнымі ўстановамі, працаваў ад'юнкт-прафесарам Горы-Горацкага земляробчага інстытута, праводзіў практычныя заняткі па сельскай гаспадарцы на вучэбнай ферме, разам з Б. А. Цалінскім кіраваў правядзеннем сельскагаспадарчых доследаў, складаў справаздачы аб стане і дзеянні Горы-Горацкай вучэбнай фермы па вучэбнай, гаспадарчай і доследнай частках, якія, па водгуках «Журнала сельского хозяйства», былі «справочным листком для сельских хозяев и самым верным и надежным руководителем в деле ведения хозяйства». Б. А. Міхельсон у сваіх працах адзначаў, што прыгоннае земляробства перашкаджае развіццю сельскай гаспадаркі. Ён бачыў выйсце з гэтага становішча расійскага земляробства ў адмаўленні ад прыгоннай працы і пераходзе да вольнанаёмнай, прадукцыйнасць якой ён вызначаў у два разы вышэй, чым прыгоннай. З аграномічнага пункту гледжання ён рэкамендаваў увядзенне ў земляробства так званых выгонных севазваротаў як часовай меры, якая паляпшае глебу і падрыхтоўвае яе да ўвядзення плодазменнай сістэмы. Б. А. Мі-

Рытаў М. В. з навучэнцамі.

хельсон апублікаваў таксама шэраг работ па праблеме вырошчвання цукровых буракоў і па іншых пытаннях сельскай гаспадаркі.

* * *

У 1841 г. у Горы-Горацкую земляробчую школу быў накіраваны ветэрынарным урачом і выкладчыкам заалогіі і ветэрынарыі **Павел Аляксандравіч Раздольскі** (1815—81), які закончыў Маскоўскую медыка-хірургічную акадэмію. Тут, у Горках, П. А. Раздольскі пачаў свае даследаванні ў галіне ветэрынарнай медыцыны. У артыкуле «Наблюдения над болезнями домашнего скота в 1846 году в Горы-Горецкой земледельческой школе» П. А. Раздольскі апісаў больш за 40 захворванняў коней, буйной рагатай жывёлы, авечак і свіней, прывёў этыялогію, патагенез і дыягностыку гэтых захворванняў, іх хірургічнае лячэнне, лекавую тэрапію і прафілактыку. Будучы адначасова выкладчыкам Горы-Горацкага земляробчага інстытута і ветэрынарным урачом, П. А. Раздольскі з 1849 г. загадваў конным заводам пры інстытуце, у 1853 г. арганізаваў у Горках першую ў Беларусі ветэрынарную клініку. За поспехі ў галіне ветэрынарнай медыцыны ў 1854 г. быў узнагароджаны сярэбраным медалём Міністэрства дзяржаўных маёмасцей. У 1864 г. за ўдзел у паўстанні 1863 г. у Горках П. А. Раздольскі быў звольнены з Горы-Горацкага земляробчага інстытута.

* * *

Больш за сорак гадоў адпрацаваў у Горацкім земляробчым вучылішчы **Міхаіл Васільевіч Рытаў.** Ён нарадзіўся 17 студзеня 1845 г. у горадзе Новаміргарадзе Херсонскай губерні ў сям'і інжынера-хіміка. Пасля заканчэння гімназіі Міхаіл Рытаў працягвае вучобу на юрыдычным факультэце, потым на прыродазнаўчым аддзяленні фізіка-матэматычнага факультэта Маскоўскага універсітэта. Пасля абароны магістэрскай дысертацыі ў 1879 г. М. В. Рытаў прыязджае працаваць у Горкі. Ён выкладае батаніку, фізіялогію раслін, фізіку і мінералогію, а праз некаторы час — агародніцтва, пладаводства і мінералогію.

Першыя навуковыя доследы Міхаіл Васілевіч праводзіць на вядомым «Сцебутаўскім агародзе», а затым, з дапамогай навучэнцаў быў расчышчаны ўчастак уздоўж рэчкі Капылкі, дзе быў закладзены батанічны гадавальнік. У 1889 г. ён за ўласныя сродкі набывае зямельны ўчастак, стварае на

Р. Э. Траўтфэтар

ім яшчэ пладовы гадавальнік для правядзення доследаў з пладовымі культурамі. Даследаванням вучонага прысвечаны тысячы артыкулаў, якія былі надрукаваны ў часопісах «Вестник садоводства, плодоводства и огородничества», «Русское садоводство», «Сад и огород», «Прогрессивное садоводство и огородничество». М. В. Рытаў быў шырока вядомы і як аўтар падручнікаў і кніг па агародніцтву і пладаводству, якія выходзілі ў Пецярбургу ў 1895—1901 гг. і якія некалькі разоў перавыдаваліся. Яго цікавілі таксама эканамічныя праблемы прамысловага садаводства. Працэс развіцця гандлёвых зносін у прамысловасці садаводства і агародніцтва атрымаў развіццё ў працы М. В. Рытава «Агляд рускага агародніцтва», якая была надрукавана ў зборніку «Вытворчыя сілы Расіі» (1886 г.).

У 1896 г. М. В. Рытава выбіраюць членам-карэспандэнтам Расійскага таварыства пладаводства. У тым жа годзе Акадэмія навук зацвердзіла яго карэспандэнтам Галоўнай фізічнай абсерваторыі.

М. В. Рытаў упершыню паказаў вялікае значэнне мясцовых сартоў пладовых культур, магчымасць вегетатыўнай гібрыдызацыі. Шырока вядомы агурок, выведзены Рытавым. Ён быў і цудоўным вынаходнікам. Агароднікі дагэтуль карыстаюцца рытаўскімі маркерамі для пікіроўкі агародніны, нажамі для абрэзкі пры пікіроўцы пладовых сеянцаў без перасадкі, машынкай для прышчэпкі і абрэзкі чаранкоў. Рытаў адстойваў і прапагандаваў тэорыю Дарвіна. Ён падняў голас супраць утойвання тэарэтычных і практычных прац І. В. Мічурына.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі М. В. Рытава выбіраюць прафесарам Петраградскага сельскагаспадарчага інстытута, але пераехаць туды ён не змог па стану здароўя. Калі ж у 1919 г. быў адноўлены Горацкі сельскагаспадарчы інстытут, М. В. Рытаў быў абраны загадчыкам кафедры батанікі. Ён актыўна пачаў рыхтаваць да друку курс лекцый. Аднак захварэў і 17 красавіка 1920 г. памёр.

* * *

У 1860—64 гг. дырэктарам Горы-Горацкага земляробчага інстытута працаваў **Рудольф Эрнеставіч Траўтфэтар** (1809—89), вядомы айчынны батанік, доктар прыродазнаўчых навук.

Па прыезду ў Горкі Р. Э. Траўтфэтар трапіў у асяроддзе выкладчыкаў і рэвалюцыйна настроеных студэнтаў Горы-Горацкага інстытута. Вучоны аказаўся захопленым хваляй вызваленчых ідэй і праявіў сябе ў адміністрацыйна-педагагічнай дзейнасці як ліберал.

У час нацыянальна-вызваленчага паўстання (1863 г.) ён выступіў супраць распаўсюджвання гарадской паліцэйскай улады на Горы-Горацкі інстытут, а на следстве аб удзеле выкладчыкаў і студэнтаў інстытута ў паўстанні выступіў у іх абарону разам з А. І. Сцебутам.

У час работы Р. Э. Траўтфэтара дырэктарам змяніўся накірунак вучэбнай і навуковай дзейнасці Горы-Горацкага інстытута, якая стала насіць больш практычны, прыкладны характар, служыць інтарэсам сялян.

У 1864 г. быў назначаны дырэктарам Пецярбургскага батанічнага сада, дзе ён працаваў да канца свайго жыцця. Заслугі Р. Э. Траўтфэтара былі ацэнены Акадэміяй навук, якая выбрала яго ганаровым членам Пецярбургскага батанічнага саду ў 1875 г., а за даследаванні рускай флоры ў 1885 г. ён быў узнагароджаны ганаровым залатым медалём К. М. Бэра.

* * *

Багдан Андрэевіч Цалінскі (1812—66), вядомы аграном і педагог, першы прафесар і дэкан (інспектар) Горы-Горацкага земляробчага інстытута, лаўрэат Дзямідаўскай прэміі (1863) — «награды за лучшие по разным частям сочинения в России» — па паходжанню з латвійскіх сялян. У 1835 г. ён скончыў філасофскі факультэт Дэрпцкага універсітэта, потым вучыўся ў Практычнай навучальнай установе сельскай гаспадаркі (Акультгофскі інстытут). У 1841 г. абараніў у Дэрпцкім універсітэце магістэрскую дысертацыю і быў накіраваны ў Горкі, дзе працаваў дваццаць тры гады (1841—64) — спачатку ў земляробчай школе, а затым з 1848 г. — у земляробчым інстытуце і быў самым дзейным арганізатарам і педагогам як вышэйшай сельскагаспадарчай школы, так і іншых горацкіх сельскагаспадарчых навучальных устаноў. Вучэбныя планы, якія ён складаў для сельскагаспадарчых устаноў, уключалі вывучэнне не толькі спецыяльных дысцыплін, але і цэлы шэраг прыродазнаўчых, тэхнічных, эканамічных і агульна-палітычных прадметаў.

У Горы-Горацкім земляробчым інстытуце Б. А. Цалінскі выкладаў земляробства і арганізацыю гаспадаркі. Па курсу земляробства ім было складзена «Руководство для преподавания земледелия в духовных семинариях» (Спб, 1860), якім карысталіся як дапаможнікам і ў сельскагаспадар-

чых навучальных установах, і ў рабоце аграномы-практыкі.

Пасля падзей 1863 г. у Горках Б. А. Цалінскі быў назначаны выконваючым абавязкі дырэктара Горы-Горацкай земляробчай школы, абараняў выкладчыкаў, якія абвінавачваліся ва ўдзеле ў паўстанні, дабіўся адмены секвестра, які быў накладзены на маёмасць і зарплату выкладчыкаў у час іх арышту і высылкі з Горак. Пасля пераводу земляробчага інстытута ў Пецярбург Б. А. Цалінскі быў назначаны прафесарам агранаміі Пецярбургскага земляробчага інстытута, дзе пасля выхаду ў адстаўку яму было прысвоена званне заслужанага прафесара.

* * *

У 1857—62 гг. у Горы-Горацкім земляробчым інстытуце працаваў **Іван Артамонавіч Цютчаў** (1834—93), вядомы рускі хімік і крышталограф, паплечнік і таварыш Дз. І. Мендзялеева. З імем І. А. Цютчава звязаны пачатак хімічных даследаванняў у Беларусі, станаўленне хімічнай навукі на Украіне.

У Горках І. А. Цютчаў працягваў работу па арганізацыі хімічнай лабараторыі Горы-Горацкага інстытута, пачатак якой быў пакладзены ў 40-х гадах вядомым рускім хімікам К. Д. Шмідтам. Гэта хімічная лабараторыя — першая ў Беларусі, была добра абсталявана і дазваляла праводзіць не толькі хімічны практыкум для студэнтаў, але і выконваць шырокія навуковыя даследаванні.

Адначасова з вялікай арганізатарскай работай І. А. Цютчаў працягваў даследаванні па арганічнай хіміі, пачаў цікавіцца праблемамі аграхіміі і мінералогіі. У 1862 г. апублікаваў фундаментальную працу «Введение к изучению кристаллографии», якая атрымала станоўчы водгук у навукоўцаў.

* * *

Вялікая роля ў развіцці хімічнай навукі ў Беларусі належыць **Канстанціну Данілавічу Шмідту** (1817—72). К. Д. Шмідт пасля абароны магістэрскай дысертацыі ў 1843 г. быў назначаны ў Горы-Горацкую земляробчую школу, дзе стварыў добра абсталяваную вучэбную лабараторыю, якая дазваляла праводзіць дэманстрацыйныя эксперыменты на лекцыях і выконваць неабходныя хімічныя даследаванні. У час працы ў Горы-Горацкім інстытуце К. Д. Шмідт напісаў некалькі кніг, якія адыгралі немалаважную ролю ў развіцці выкладання хіміі ў Расіі ў мінулым стагоддзі. К. Д. Шмідт быў шырока эрудыраваным педагогам. Акрамя хіміі, ён чытаў курс фізікі і метэаралогіі, прыродазнаўства, лекцыі для жыхароў Горак.

Вялікі ўплыў К. Д. Шмідт аказаў на станаўленне навуковых поглядаў А. В. Саветава і І. А. Сцебута ў галіне аграхіміі. У 1858 г. К. Д. Шмідт быў вымушаны на час пайсці ў адстаўку па стану здароўя.

У 1863 г. К. Д. Шмідт зноў вяртаецца ў Горкі і працуе ў земляробчым інстытуце, але ў 1864 г. у сувязі з пераводам установы ў Пецярбург працаваць туды пераязджае і вучоны. У 1866 г. К. Д. Шмідт ідзе ў адстаўку і вяртаецца ў Горкі.

В. Нямыкін, І. Нямыкіна,
У. Ліўшыц, М. Сядун.

«Записки Горы-Горецкого земледельческого института»

У сярэдзіне XIX ст. для распаўсюджвання і папулярызацыі сельскагаспадарчай навукі і адукацыі ўзнікла неабходнасць у стварэнні спецыяльных друкаваных прац сельскагаспадарчай школы. Гэтымі працамі сталі «Записки Горы-Горецкого земледельческого института» — першае ў Расійскай імперыі перыядычнае выданне сельскагаспадарчай школы. У 1850 г. Міністэрства дзяржаўных маёмасцей дазволіла Горы-Горацкаму земляробчаму інстытуту выдаваць свае працы па адной кніжцы ў год і ў 1852 г. выйшаў у свет першы том «Записок Горы-Горецкого земледельческого института». Усяго з 1852 па 1857 год выйшла шэсць тамоў «Записок», аднак з 1858 г. іх выданне было спынена з-за выдавецкіх цяжкасцей і прыдзірак цэнзуры. Нягледзячы на кароткачасовасць выдання, «Записки» адыгралі значную ролю ў развіцці тэорыі і прыктыкі сельскай гаспадаркі, прапагандзе сельскагаспадарчай навукі, паказалі Горы-Горацкі земляробчы інстытут як сапраўды вышэйшую сельскагаспадарчую школу таго часу, часткова, ва ўмовах царскай цэнзуры, адлюстравалі перадавыя дэмакратычныя погляды, якія ў 60-х гадах мінулага стагоддзя ярка праявіліся ў Горы-Горацкім інстытуце, і, апісваючы становішча сельскай гаспадаркі сярэдзіны XIX ст., адлюстравалі важны гістарычны матэрыял.

Кожны том «Записок» складаўся з двух

аддзелаў: справаздачнага і спецыяльнага, дзе былі змешчаны навуковыя артыкулы і актавыя прамовы выкладчыкаў інстытута, у ліку якіх былі выдатныя вучоныя А. В. Саветаў і І. А. Сцебут. Справаздачны аддзел складаўся з афіцыйных дакументаў, асноўнай мэтай якіх была прапаганда навукова-педагагічнай дзейнасці інстытута як цэнтра сельскагаспадарчай адукацыі Расійскай імперыі.

Справаздачы і артыкулы ў «Записках» адлюстроўвалі стан сельскагаспадарчай вытворчасці ў сярэдзіне XIX ст. і таму з'яўляліся каштоўнай крыніцай для вывучэння гісторыі сельскай гаспадаркі. Многія выкладчыкі Горы-Горацкага інстытута, сабраўшы фактычны матэрыял, які адлюстроўваў становішча ў земляробстве, спрабавалі раскрыць прычыны ўпадку прыгоннай гаспадаркі і ў сваіх друкаваных працах рабілі шэраг прапаноў па ўдасканальванню земляробства. Таму «Записки» ўтрымоўваюць не толькі фактычны матэрыял аб становішчы сельскай гаспадаркі, але і выражаюць погляды і адносіны выкладчыкаў Горы-Горацкага інстытута — прадстаўнікоў дваранскага лібералізму — да прыгоннага ладу.

«Записки» могуць служыць гістарычнай крыніцай пры вывучэнні станаўлення вышэйшай і сярэдняй сельскагаспадарчай адукацыі ў сярэдзіне XIX ст. Асноўныя даведкі па гэтаму пытанню змешчаны ў прадмове да першага тома «Записок» і справаздачах па Горы-Горацкаму земляробчаму інстытуту і вучылішчу. Гэтыя матэрыялы адлюстроўваюць дзейнасць Горы-Горацкага інстытута — першай у Расійскай імперыі вышэйшай сельскагаспадарчай вучэбнай установы і Горы-Горацкага земляробчага вучылішча — адной з вядучых сярэдніх сельскагаспадарчых вучэбных устаноў. Аб вышэйшым узроўні вучэбна-педагагічнай дзейнасці гэтых устаноў сведчыць рэцэнзія на справаздачны аддзел «Записок» «Журнала сельского хозяйства», у якім адзначалася, што «таков и должен быть ход занятий в образцовом земледельческом заведении».

У «Записках» змешчаны справаздачы Горы-Горацкай вучэбнай фермы, якія адлюстроўваюць перадавыя дасягненні сельскагаспадарчай навукі таго часу, даюць уяўленне аб пастаноўцы сельскагаспадарчай вопытнай справы, змяшчаюць звесткі аб узроўні развіцця земляробства ў сярэдзіне XIX ст. Аб тым, што справаздачы вучэбнай фермы Горы-Горацкага земляробчага інстытута адлюстроўвалі перадавыя дасягненні сельскай гаспадаркі таго часу, сведчыць рэцэнзія «Журнала сельского хозяйства», у якім справаздачы называюцца «справочным листком для сельских хозяйств и самым надежным руководителем в деле ведения хозяйства».

Цікавы гістарычны матэрыял, які характарызуецца дасягненнямі сельскагаспадарчай навукі і практыкі ў Беларусі ў сярэдзіне XIX ст., змешчаны ў «Записках» у выглядзе справаздачы аб сельскагаспадарчых з'ездах і выстаўках пры Горы-Горацкім земляробчым інстытуце. Аб іх значнасці для вывучэння гісторыі сельскай гаспадаркі сведчыць выкарыстанне матэрыялаў «Записок» у даследаваннях Інстытута гісторыі Акадэміі навук Беларусі. (Чепко В. В. Сельское хозяйство Белоруссии в первой половине XIX века. Мн., 1966). У «Записках» змешчаны справаздачы аб чатырох сельскагаспадарчых з'ездах пры Горы-Горацкім інстытуце ў 1853—56 гг., прычым гэта былі першыя на тэрыторыі Расійскай імперыі сельскагаспадарчыя з'езды. У рабоце з'ездаў, якія «имели целью посредством совещаний и обмена мыслей между хозяевами способствовать развитию и улучшению сельского хозяйства», прымалі ўдзел памешчыкі і сельскія гаспадары, у асноўным з Магілёўскай губерні, выкладчыкі і супрацоўнікі Горы-Горацкага інстытута, дзякуючы якім гэтыя з'езды сталі эфектыўным сродкам уздзеяння на мясцовую сельскую гаспадарку. Круг пытанняў, якія абмяркоўваліся на сельскагаспадарчых з'ездах, быў разнастайным: земляробства і жывёлагадоўля, меліярацыя і эканоміка, вялікая ўвага ўдзялялася развіццю сялянскіх гаспадарак. «Журнал Министерства государственных имуществ» адзначаў, што «в числе 19 вопросов, предложенных членами съезда (1853 г.) на разрешение, многие важны не только для Белорусского края, но и для всей средней полосы. У 1854 г. у «Записках Горы-Горецкого земледельческого института» была змешчана справаздача аб выстаўцы сельскіх вырабаў, на якой экспанавалася 1432 экспанатаў (у тым ліку з Магілёўскай губерні — 555) сельскагаспадарчай прадукцыі, земляробчых прылад і машын, саматужных вырабаў, сярод якіх значнае месца займалі экспанаты з сельскіх гаспадарак.

Вялікую цікавасць для вывучэння гісторыі сельскай гаспадаркі ўяўляюць справа-

здачы аб агранамічных падарожжах выкладчыкаў і студэнтаў Горы-Горацкага інстытута, надрукаваныя ў «Записках», дзе апісваецца стан сельскагаспадарчай вытворчасці ў сярэдзіне XIX ст. у многіх губернях Расійскай імперыі, у т. л. і ў беларускіх губернях, і ў шэрагу краін Заходняй Еўропы. Так, дадзеныя справаздач аб агранамічных падарожжах у 1851—53 гг. пад кіраўніцтвам Э. Ф. Рэга дазвалялі даволі поўна ўявіць узровень развіцця садаводства і агародніцтва ў цэнтральных, беларускіх і ўкраінскіх губернях. У гэтых справаздачах даецца апісанне вядомых садоў і паркаў — помнікаў садова-паркавага мастацтва, у т. л. Э. Ф. Рэга прыводзіць першыя апісанні сада І. Ф. Паскевіча ў Гомелі і сада А. І. Бенкендорфа ў Прапойску.

У «Записках» змешчаны навуковыя артыкулы і прамовы выкладчыкаў Горы-Горацкага інстытута на ўрачыстых актах, прысвечаных пачатку заняткаў у інстытуце. Гэтыя матэрыялы даволі поўна адлюстроўваюць стан сельскагаспадарчай навукі і па асобных пытаннях — стан сельскай гаспадаркі ў сярэдзіне XIX ст. Так, у прамове П. А. Раздольскага ўтрымліваецца гісторыя развіцця і сучасны стан ветэрынарнай медыцыны, у артыкуле І. Савініча «Мочальный промысел поселян Могилевской губернии» прыводзяцца дадзеныя аб упадку гэтага промыслу з прычыны нерацыянальнага выкарыстання лясных рэсурсаў і г. д.

У цэлым «Записки Горы-Горецкого земледельческого института» як крыніца гістарычных звестак аб стане сельскагаспадарчай адукацыі, навукі і прамысловасці з'яўляюцца прадметам спецыяльных даследаванняў як з пункту гледжання гістарычнай навукі, так і сельскагаспадарчай, біялагічнай і педагагічнай.

В. Нямыкін, У. Ліўшыц.

Батанічны сад у Горках

Гісторыя стварэння аднаго са старэйшых батанічных садоў звязана з імем вядомага батаніка і садавода Эдуарда Фёдаравіча Рэга (нар. у 1816). У 1843 г. ён стаў працаваць прафесарам батанікі ў Горы-Горацкай земляробчай школе (з 1848 г. — Горы-Горацкі земляробчы інстытут) і прыняў самы актыўны ўдзел у арганізацыі Горацкага батанічнага сада, праца па стварэнню якога на базе аранжарэі земляробчай школы пачалася ў 1841 г. Пад кіраўніцтвам Э. Ф. Рэга ў 1848 г. быў заснаваны дэндрарый пад першапачатковай назвай «драўняны пітомнік», які ўвайшоў як адна з галоўных частак у Горацкі батанічны сад. Праект закладкі дэндрарыя быў распрацаваны вядомым архітэктарам А. Кампіоні. Цэнтральная частка дэндрарыя была спраектавана ў строгім, геаметрычным, стылі з характэрным круглым партэрам, ад якога веерападобна разыходзяцца радыяльныя і кальцавыя маляўнічыя алеі. Апрача гэтага, было прадугледжана фарміраванне паркавых і лесапаркавых маляўнічых участкаў і спецыялізаванага рэзервата. Па ініцыятыве Э. Ф. Рэга ў склад дэндрарыя была ўключана дуброва на беразе р. Капылкі. Плошча непасрэдна дэндрарыя павінна была складаць каля 90 га, да яго прымыкаў лясны масіў (урочышча Дабрэннае) плошчай каля 150 га як лясны запаведнік. У 1849—63 гг. пад кіраўніцтвам Э. Ф. Рэга ў Горках была сабрана вялікая калекцыя драўняна-хмызняковых раслін, створаны дэндралагічны парк, які з'яўляецца помнікам прыроды Беларусі. У Горацкім батанічным садзе сабрана унікальная для таго часу калекцыя сельскагаспадарчых культур.

Дэндрарый уяўляў сабой унікальны аб'ект паркавай культуры з высокімі мастацкімі якасцямі. Э. Ф. Рэга стварыў 12 унікальных па жывапісу паркавых ландшафтаў. Граматна трактуючы магчымасці рэльефу мясцовасці і дэкаратыўную каштоўнасць раслін, ён у кампаноўцы экспазіцыі дэндрарыя прымяняў розныя стылі і выкарыстоўваў класічны прынцып чаргавання закрытых і адкрытых участкаў.

Спалучэнне свабодных ландшафтных пасадак дрэў і кустарнікаў з рэгулярнымі, іх чаргаванне з адкрытымі прасторамі (узлескамі, палянамі, газонамі) і творчы падыход Э. Ф. Рэга да падбору спалучэння парод драўняна-хмызняковых раслін стварылі непаўторны каларыт дэндрарыя Горацкага батанічнага сада, яго высокую жывапісную каштоўнасць, прыгажосць яго непаўторных пейзажаў, якія часта змяняліся.

Э. Ф. Рэга ўдзельнічаў у стварэнні унікальнай калекцыі сельскагаспадарчых куль-

тур. Усяго было сабрана каля 800, у тым ліку яравой пшаніцы было 56 гатункаў, азімага жыта — 20, аўса — 33, гароха — 26 гатункаў. У Горацкім батанічным садзе Э. Ф. Рэга сабраў да 1863 г. вельмі рэдкую калекцыю бэзу, якая налічвала 87 відаў, форм і гатункаў. Э. Ф. Рэга адным з першых у Беларусі пачаў навуковыя даследаванні па дэндралогіі і інтрадукцыі. У Горацкім батанічным садзе ён вывучаў эколага-біялагічныя асаблівасці мясцовых і экзатычных драўняных раслін, магчымасці іх культуры ва ўмовах Беларусі. У вялікім інтрадукцыйным пітомніку расло мноства каштоўных хваёвых і лісцевых драўняных пародаў, пладовых, арэхаплодных і ягадных драўняна-хмызняковых раслін, дэкаратыўных культур. У Горацкім батанічным садзе былі прадстаўлены акацыі, каштаны, арэхі, бэз, рабіны, яблыні, грушы, слівы, піхты, кедры, сосны, дугласіі і інш. Э. Ф. Рэга вывучаў асаблівасці цвіцення, плоданашэння і магчымасцей інтрадукцыі разнастайных драўняных экзотаў, ён быў ініцыятарам закладкі лесапрамысловых пасадак з лістоўніц (польскай, еўрапейскай і сібірскай) на Зубраўскай лясной дачы, на Прылукскай дачы — з бархата амурскага, на Магілёўскай дачы — з сосен (Мурэя, Веймута). Гэтыя даследаванні, асабліва па інтрадукцыі хваёвых экзотаў, былі актуальнымі для Беларусі, флора якой бедная хваёвымі пародамі, хаця прыродныя ўмовы спрыяльныя для іх росту.

Э. Ф. Рэга быў ініцыятарам вывучэння мясцовых і інтрадуцыраваных драўняна-хмызняковых культур як лекавых раслін. На матэрыялах вялікай калекцыі садова-ягадных культур Горацкага батанічнага сада ён з 50-х гадоў пачаў даследаванне лекавых якасцей груш, іргі, рабіны, парэчкі, маліны, яблынь і інш. Э. Ф. Рэга сабраў вялікі батанічны гербарый мясцовых раслін, у 1860 г. ён склаў «Естественную историю растительного царства, преимущественно в применении к русской флоре средних губерний», якая выкарыстоўвалася ў якасці вызначэння і ўключала больш за тысячу апісанняў відаў раслін. Э. Ф. Рэга адзначаў, што ў Магілёўскай губерні садаводствам займаюцца пераважна памешчыкі. У той жа час Э. Ф. Рэга пісаў, што ў наваколлі Горак сяляне купляюць прывіўкі пладовых культур у пітомніку Горы-Горацкага земляробчага інстытута і пачынаюць закладваць у сябе сады.

В. Нямыкін.

Адзін з заснавальнікаў аграхіміі

У другой палове XIX ст. пачалася распрацоўка навуковых асноў арганічнай хіміі, глебазнаўства і фізіялогіі раслін. Сярод заснавальнікаў гэтых навук адметная роля належала П. С. Касовічу, памяць якога аднолькава шануюць аграномы і аграхімікі, глебазнаўцы і фізіёлагі.

Пётр Самсонавіч Касовіч нарадзіўся 28 верасня 1862 г. у Горках Магілёўскай губерні. Яго бацька, Самсон Сямёнавіч Касовіч (1830—98) пасля заканчэння ў 1853 г. Горы-Горацкага земляробчага інстытута выкладаў у ім геадэзію і чарчэнне, а з 1859 г. — матэматыку ў Горы-Горацкім земляробчым вучылішчы. У 1870 г. С. С. Касовіч з сям'ёй пераехаў у Маскву, дзе да 1890 г. працаваў дырэктарам земляробчай школы, упраўляючым Бутырскім хутарам Маскоўскага таварыства сельскай гаспадаркі. Маці П. С. Касовіча была сястрой І. А. Сцебута, які, па ўспамінах В. С. Касовіча, «вельмі ўважліва адносіўся да свайго пляменніка П. С. Касовіча».

Пасля заканчэння гімназіі ў 1883 г. П. С. Касовіч паступіў на прыродазнаўчае аддзяленне фізіка-матэматычнага факультэта Маскоўскага універсітэта, дзе разам са сваім аднакурснікам Д. Н. Пранішнікавым вялікую ўвагу ўдзяляў заняткам па хіміі, апублікаваў ў 1887 г. сваю першую работу па біяхіміі раслін. У тым жа годзе ён быў узнагароджаны залатым медалём Маскоўскага універсітэта за работу «Паходжанне азоту ў раслінах». Яна стала пачаткам плённай працы П. С. Касовіча па вывучэнню працэсаў біялагічнай фіксацыі малекулярнага азоту раслінамі.

Пасля заканчэння Маскоўскага універсітэта ў 1887 г. П. С. Касовіч разам з Д. Н. Пранішнікавым паступілі на трэці курс Пятроўскай земляробчай і лясной акадэміі, дзе займаліся даследаваннямі ў галіне фізіялогіі раслін пад кіраўніцтвам І. А. Сцебута. Пасля заканчэння акадэміі ў 1889 г. П. С. Касовіч быў пакінуты пры кафедры земляробства. У 1891 г. чытаў

курс «Біялагічныя працэсы ў глебе» ў Маскоўскім універсітэце, а з 1892 г.— курс аграхіміі. У 1892 г. ім было ўпершыню даказана, што клубяньковыя бактэрыі звязваюць азот атмасферы, які паступіў не праз карэнне, а праз лісты бабовых раслін. У 1882—94 гг. П. С. Касовіч быў у Германіі і Францыі, дзе правёў рад даследаванняў па вывучэнню засваення азоту багавіннямі і бактэрыямі. У 1895 г. ён абараніў у Маскоўскім універсітэце магістэрскую дысертацыю, у якой абагульніў вынікі сваіх даследаванняў па азотафіксацыі.

З 1894 г. П. С. Касовіч працаваў дацэнтам, а з 1902 г.— прафесарам кафедры глебазнаўства ў Пецярбургскім лясным інстытуце.

Тут П. С. Касовіч арганізаваў доследную лабараторыю ў той час, калі «был упразднен курс агрономической химии и вытравлено даже самое название этого предмета из учебного плана». Д. Н. Пранішнікаў у далейшым пісаў, что «только это и позволило не дать погаснуть в глухую пору 1894—1905 гг. делу агрохимических исследований в России, подготовить основы для разрешения вопросов удобрения к моменту, когда страна предъявит соответственные запросы, и сохранить от вымирания самый тип агронома, работающего в области соприкосновения химии и физиологии с земледелием».

З 1895 г. П. С. Касовіч узначальваў Бюро па земляробству і глебазнаўству навуковага камітэта Міністэрства земляробства, арганізаваў пры ім лабараторыю па даследаванню глебы і музей глебы. У 1897 г. ён быў выбраны членам навуковага камітэта Міністэрства земляробства, арганізаваў пры ім і кіраваў сельскагаспадарчай хімічнай лабараторыяй, якая адыграла вялікую ролю ў аграхімічным даследаванні глебы краіны. П. С. Касовіч прымаў актыўны ўдзел у працы камісіі па доследнай справе: аказаў значны ўплыў на арганізацыю сеткі сельскагаспадарчых доследных устаноў, напрамак іх дзейнасці. У 1900 г. ён заснаваў і выдаваў (першыя дзесяць гадоў за ўласны кошт) «Журнал опытной агрономии», які выходзіў да 1931 г. і адыграў значную ролю ў станаўленні і развіцці айчыннай аграномічнай навукі. П. С. Касовіч выдаў і адрэдагаваў 8 тамоў «Трудов сельскохозяйственной химической лаборатории», больш чым 20 выпускаў «Сообщений Бюро по земледелию и почвоведению».

Сярод навуковых інтарэсаў П. С. Касовіча ў галіне фізіялогіі раслін былі пытанні вывучэння праблем харчавання раслін, іх азотнага абмену, выкарыстання раслінамі цяжкараствары мых фасфатаў, значэння пры гэтым каранёвых выдзяленняў. Ён цікавіўся таксама пытаннямі ўплыву тэмпературных умоў і воднага рэжыму на рост і развіццё раслін.



С. С. Касовіч

П. С. Касовіч

Вялікае значэнне мелі працы П. С. Касовіча ў галіне глебазнаўства, дзе ён з'яўляўся адным з заснавальнікаў эксперыментальнага вывучэння фізічных, хімічных і аграхімічных уласцівасцей глебы. Ён распрацаваў найбольш разгорнутую для свайго часу генетычную класіфікацыю глебы. П. С. Касовіч быў прадстаўніком Расіі на II Міжнароднай аграгеалагічнай канферэнцыі ў 1910 г., дзе зрабіў даклад аб асновах класіфікацыі глебы. Яго даследаванні па вывучэнню кругавароту серы і хлору ў прыродзе не страцілі свайго значэння і для сучаснай біягеахіміі.

У галіне аграхіміі П. С. Касовіч вывучаў пытанні прымянення фосфарных, азотных, арганічных і бактэрыяльных угнаенняў. Ён распрацаваў метады ацэнкі даступнасці элементаў харчавання глебы і патрэбнасці ва ўгнаеннях сельскагаспадарчых культур, іх групіроўку па здольнасцях да засваення цяжкараствары мых фасфатаў і адчуванне да вапнавання, даследаваў значэнне мікраэлементаў у развіцці раслін і арганічных угнаенняў у працэсах дэнітрыфікацыі ў глебе. Вялікае народнагаспадарчае значэнне мелі даследаванні П. С. Касовіча па вывучэнню харчавання раслін, прымянення ў земляробстве фасфарытаў. Ён навукова абгрунтаваў палажэнне аб актыўнай ролі карнявой сістэмы ў растварэнні па-

жыўных рэчываў глебы, у тым ліку і фасфатаў. Гэтыя даследаванні адчынілі дарогу вялізным залежам нізкапрацэнтных фасфатаў на мільёны гектараў кіслых глеб, дзе іх прымяненне аказалася эфектыўным. Для распрацоўкі біялагічных асноў земляробства вялікае значэнне мелі работы П. С. Касовіча па вывучэнню азотфіксуючых мікраарганізмаў. Ён даказаў уласцівасць вышэйшых раслін засвойваць аміячны азот без пераходу яго ў нітраты, што падцвярджала і развівала тэорыю азотнага харчавання Д. Н. Пранішнікава. П. С. Касовіч распрацаваў пытанні прымянення бактэрыяльных угнаенняў ў залежнасці ад іх спецыфічнасці і актыўнасці для розных раслін і глебы, абгрунтаваў прымяненне цыаміду кальцыю як азотнага ўгнаення, шэраг новых для таго часу арыгінальных метадаў правядзення эксперыментаў, вегетацыйных і палявых доследаў.

Яму належыць унікальная методыка і тэхніка доследаў па вывучэнню ізаляванага харчавання раслін, адным з першых стаў прымяняць вегетацыйны метад у аграхімічных даследаваннях.

Сучаснікі, характарызуючы вучонага, адзначалі і незалежнасць яго меркаванняў, выключную працавітасць, патрабавальнасць да сябе і да іншых. «Сярдзіты Касовіч», якім ён часта здаваўся людзям па першаму ўражанню, быў, па словах Г. Ф. Марозава, чалавекам надзвычайнай дабрыні і чуласці.

Памёр П. С. Касовіч 26 жніўня 1915 г. і пахаваны ў с. Сястрына Смаленскай губерні.

В. Нямыкін.

Літаратурныя скрыжалі

ХТО АЎТАР?

На тэрыторыі Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі ёсць узгорак, які з даўніх часоў завецца «Парнас». З ім звязана версія аб напісанні ў Горках вядомай беларускай паэмы «Тарас на Парнасе».

Гэта паэма ўпершыню была надрукавана 16 мая 1889 г. у газеце «Минский листок», і з той пары літаратуразнаўцы спрачаюцца аб аўтары гэтага бессмяротнага твора. «Тараса» прыпісвалі В. І. Дуніну-Марцінкевічу, А. Вярыгу-Дарэўскаму, Г. Марцінкевічу, А. Крупеньку, К. В. Вераніцыну і іншым. У кожнай версіі ёсць свае «за» і «супраць». Але ж мы спынімся на адной з іх — горацкай.

Упершыню яе выказаў вядомы беларускі этнограф і краязнаўца Е. Р. Раманаў. У 1896 г. у рукапісе «Проба пяра» ён пісаў: «Во коли, дякуй богу, дождались мы, што й нашего «Тараса» увяли у книжку! Ужо годов боли як сорок (зачеркнуто: пятьдесят) белоруськая байка ета стала усим вядома у трох губерниях: Могилевской, Витебской и Минской... Говоруть, што яго написали у Горках студенты, тогды, як там была, до мятежа, большая школа. И ето, можа, больш усяго пахожа на правду».

У 1900—02 гг. паэма была надрукавана асобнымі выданнямі ў Магілёве. Перагарнём старыя старонкі і ва ўступах прачытаем (іх пісаў таксама Е. Р. Раманаў): «Более вероятным надо признать мнение, что «Тарас» написан в г. Горках, в начале пятидесятых или в конце сороковых годов минувшего столетия, именно в первые годы существования горецкого земледельческого института, бывшего в то время высшим учебным заведением».

У 1896 г. Е. Р. Раманаў выказаў думку аб тым, што «Тараса» напісалі студэнты. Дацэнт Магілёўскага педінстытута імя А. А. Куляшова, кандыдат філалагічных навук М. Абабурка мяркуе, што Е. Р. Раманаў лічыў «Тараса» калектыўным творам, які напісалі студэнты Горы-Горацкага інстытута. Для абгрунтавання гэтага ён прыводзіць і такі аргумент: «Думаецца, што падабенства данай паэмы з «Энеідай» якраз і з'яўляецца неабвержным доказам калектыўнага аўтарства, таму што адзін аўтар не запазычваў бы не толькі вобразы і малюнкі, але і суцэльныя выказванні з-за боязі агульнага абвінавачвання яго ў плагіятстве. Ды і ў некаторых спісах (варыянтах) паэмы ёсць канцоўка, што непасрэдна ўказвае на аўтарскі калектыў:

Пісаў Хімка, пісаў Яўтух,
Пісалі б болей, але агонь
патух.

Дык ці быў «Тарас» калектыўным творам? Наўрад! У ім жа выразна праслежва-

ецца геніяльная індывідуальнасць, самабытнасць аўтара. Іншая справа, што шматлікія дэталі твора абмяркоўваліся, шліфаваліся пры непасрэдным удзеле іншых (аб гэтым мы скажам ніжэй).

Тым больш, што Е. Р. Раманаў у 1900 г. удакладняе і піша ўжо не «студэнты», а проста «у Горках». Магчыма, гэта былі і студэнты інстытута або навучэнцы земляробчага вучылішча ці фермы, выкладчыкі ці проста жыхары Горак.

Е. Р. Раманаў выказвае думку адносна часавых рамак напісання паэмы. Ён лічыць, што паэма напісана «в первые годы существования горецкого земледельческого института». Як вядома, інстытут існаваў да 1864 г. — усяго 16 гадоў. Калі гаварыць аб першых гадах існавання інстытута, то хутчэй за ўсё гэта — 1848—54 гг.

Горацкай версіяй зацікавіўся і ўраджэнец Горак Барыс Ісакавіч Іофе. Ён нарадзіўся 23 лістапада 1918 г. У 1937 г. паступіў на філалагічны факультэт Ленінградскага універсітэта. Загадцы напісання вядомай беларускай паэмы «Тарас на Парнасе» ён прысвяціў артыкул «Паэма "Тарас на Парнасе"» (аб часе і месцы напісання і гістарычна-літаратурным значэнні), які быў надрукаваны ў часопісе «Полымя рэвалюцыі» ў 1940 г. У артыкуле Б. І. Іофе ўпершыню вылучыў версію аб месцы напісання паэмы. «На тэрыторыі Горацкага сельскагаспадарчага інстытута (у 1940 г. так называлася сённяшняя акадэмія. — У. Л.), — пісаў Іофе, — паблізу ад фундаментальнай бібліятэкі ёсць узгорак, які студэнты з даўніх часоў і дагэтуль называюць Парнасам. Насупраць узгорка, як частка надзвычай маляўнічага месца, уздымаецца так званая Пятрова Горка. Тут зараз размешчаны леспрамгас, а даўней было ляснiцтва. На той жа горцы, недалёка ад «Парнаса» былі і лазні. На тэрыторыі інстытута знаходзіцца невялікае возера. Яго мусіць і пільнаваў Тарас. Ці не гаворыць гэта аб напісанні паэмы ў Горках? Ва ўсякім выпадку, студэнты з любога вучэбнага будынка маглі бачыць усе памянёныя ў паэме месцы, размешчаныя ў парку інстытута ці блізка да яго».

У сваёй кнізе «Разыскивается классик. Историко-литературная дилогия» Г. В. Кісялёў прысвячае горацкай версіі цэлы раздзел, які назваў «Городок в Могилевской глуши». Даследчык на працягу многіх гадоў распрацоўвае горацкую версію. Па-першае, ён добра апісаў атмасферу ў Горках таго часу. А як бачна з гісторыі, яна была даволі творчай. Чатырохгадовы вучэбны план інстытута ўключаў у розныя гады да 40 прадметаў, з якіх прадметы гуманітарнага напрамку займалі 24 % вучэбнага часу. Г. В. Кісялёў знайшоў успаміны студэнтаў горацкага інстытута аб іх удзеле ў літаратурных гуртках і вечарах. Вось сведчанне былога студэнта, ураджэнца вёскі Расна (Дрыбінскага раёна) Ф. Сурына: «...мы среди гомона, смеха и самого развесёлого разговора, ждали начала чтения. Предметом же его бывали прежде всего местные рукописные газетенки, редактировавшиеся безымянно и рассылавшиеся в запечатанных конвертах. Больше всего в них привлекали текущие местные горецкие дела или полемика о более важных вещах, по общественным вопросам, порой конспект и оценка какого-нибудь более серьезного исторического труда, а часто стишок или оригинальный рассказ».

Беларускіх літаратуразнаўцаў здзіўляюць у паэме дакладныя характарыстыкі пісьменнікаў і паэтаў. Цікава, што як раз у першы перыяд існавання Горы-Горацкага земляробчага інстытута, тут вучыліся студэнты, якія добра ведалі літаратуру і асабіста вядомых пісьменнікаў.

Да гэтага трэба дадаць, што, як вядома з гісторыі акадэміі, студэнты і навучэнцы шмат чыталі мастацкай літаратуры. Акрамя інстытуцкай, мелася яшчэ грамадская бібліятэка, а шматлікія студэнты мелі шмат і асабістых кніг. Адным словам, атмасфера была творчай, і тут, у Горках, былі даволі добрыя ўмовы для мастацкай творчасці.

Генадзь Кісялёў у згаданай намі кнізе спрабуе вызначыць імя магчымага аўтара таямнічай паэмы. Ён зноў прыводзіць успаміны Феліцыяна Сурына, які ў далейшым з захапленнем займаўся краязнаўствам, вывучаў беларускі фальклор. І ў сваіх успамінах аб Горках Сурын называе імя горацкага паэта. Вось як гучыць гэта мясціна: «Кушалеўскі спрабаваў свае сілы ў лірычных вершах і быў гэта сапраўдны талент. Пазнейшыя вершы яго, поўныя чуллівай меланхоліі і пранізлівага болю, паўсюдна цаніліся на Беларусі, і вельмі шкада, што ён не стаў вядомым больш шырокаму колу, друкуючы свае творы...» Такім чынам, перад намі яшчэ адзін таленавіты прадстаўнік горы-горацкага Парнаса — паэт Кушалеўскі. Але Кісялёў, улічваючы паходжанне Кушалеўскага (Валынь, а не Усходняя Беларусь), не ўпэўнены ў яго дачыненні да паэмы.

У Дзяржаўным гістарычным архіве Літвы Г. Кісялёў знайшоў лісты Чудоўскага да Кіркора, пана, які меў маёнтак каля Горак і добра ведаў мясцовых студэнтаў. У лісце ад 10 лютага 1857 г. ён паведамляе аб пошуках карэспандэнта для часопіса «Тэка виленьска», які рэдагаваў Кіркор: «Поскольку сам не могу быть теперь в Горках для подыскания корреспондента, направляю туда по этому делу двоих, а именно одного весьма порядочного молодого человека Яна Менжинского, окончившего в том году Горы-Горецкий институт, и своего приятеля Януша Коссаковского, который из самих Горок на пишет тебе о результатах своих шагов и пере говорах, если найдет кого-нибудь в корреспонденты, в чем, однако, не сомневаюсь, поскольку из нынешних учеников есть двое довольно способных, а о третьем тоже слышал, что с необыкновенным поэтическим талантом пишет по-белорусски».

Аб кім ідзе размова, Г. Кісялёў не высветліў. Але той факт, што паэт вучыўся ў Горках, натхняе на новыя пошукі.

ПРАТАТЫП РАХМЕТАВА

Апоўдні 1 верасня 1857 г. на борт англійскага кліпера «Акаста» падняўся былы студэнт Горы-Горацкага сельскагаспадарчага інстытута Павел Аляксандравіч Бахмецеў. Да гэтага ён быў у Пецярбургу, дзе «правёў ноч з Чарнышэўскім, гуляючы на набярэжнай Фантанкі». Апошнім, хто бачыў П. А. Бахмецева — прататыпа героя рамана М. Г. Чарнышэўскага «Что делать?» быў А. І. Герцэн, да якога той заехаў у Лондан.

Мала што вядома аб жыцці Паўла Бахмецева: сын багатага саратаўскага памешчыка, у пятнаццаць гадоў паступае ў Саратаўскую гімназію.

Пісьменнік Д. Л. Мардоўцаў, які ведаў яго асабіста, у артыкуле «Аб Рахметаве» («Северный курьер», № 164 за 1900 год) пісаў: «Я яго ведаў вельмі добра, таму што ў канцы саракавых гадоў вучыўся з ім у адной гімназіі ў Сарататве. Жыў з ім на кватэры побач. Здольнасці Бахмецева былі не бліскучыя, і я часта дапамагаў яму рашаць матэматычныя задачы, перакладаць з латыні цяжкія месцы. Але тое, што засвоіў з цяжкасцю, трымалася ў яго пераканаццях настолькі моцна, што і абцугамі не выцягнеш». У доме-музеі М. Г. Чарнышэўскага захоўваецца атэстат на імя П. А. Бахмецева, выдадзены 11 ліпеня 1851 г. Сярод подпісаў настаўнікаў і подпіс М. Г. Чарнышэўскага.

У Дзяржаўным архіве Саратаўскай вобласці ёсць спіс вучняў VII класа гімназіі з назвай месц, куды яны пасля заканчэння курса жадаюць паступаць. У спісе ўказана: «Павел Бахмецеў заявіў аб жаданні паступаць у Горы-Горацкі сельскагаспадарчы інстытут». Чаму ў сельскагаспадарчы інстытут? Ды таму, што да гэтага часу ён цвёрда рашыў будаваць сельскагаспадарчую камуну на сацыялістычных прынцыпах. Ехаць у Горкі яму мог параіць і М. Г. Чарнышэўскі, які добра ведаў пра гэты інстытут ад І. В. Палімсестава, таварыша па Саратаўскай гімназіі, да гэтага часу ён закончыў інстытут і ў далейшым стаў вядомым аграномам-педагогам.

Восенню 1852 г. Павел Бахмецеў паступіў у Горы-Горацкі сельскагаспадарчы інстытут. У бібліятэцы Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі захоўваецца 3-я кніга «Записок Горы-Горецкого земледельческого института» за 1854 год. Тут у справаздачы за 1852/53 навучальны год мы знаходзім сярод прозвішчаў студэнтаў і прозвішча знаёмага нам П. Бахмецева. Цікава, што ў справаздачы сказана: «падвяргаліся іспытам 46 студэнтаў, з якіх пераводзяцца на другі курс 42 у наступным па старшынству парадку...» Бахмецеў лічыўся трэцім па старшынству (г. зн. па поспехах). Аднак мяркуючы па справаздачы за 1853/54 навучальны год, ён пакінуў інстытут, не скончыўшы другі курс. Тут дарэчы нагадаць, што і Рахметаў скончыў вучобу на другім курсе.

Пра жыццё П. Бахмецева ў 1853—56 гг. мы нічога не ведаем.

Пісьменнік Раман Белавусаў у кнізе «Аб чым прамаўчалі кнігі» расказвае: «У адзін з летніх вечароў 1857 г. Мікалай Гаўрылавіч працаваў у сваім кабінеце. Раптам з'явіўся госць. Мікалай Гаўрылавіч пазнаў у ім земляка, саратаўскага памешчыка Паўла Аляксандравіча Бахмецева. Прыселі да стала. Спачатку размова не вязалася. І раптам Бахмецеў разгаварыўся. Ён стаў гаварыць аб сваёй гарачай любві да Радзімы, яе народа, але тут жа прызнаўся, што нягледзячы на гэта, прыняў рашэнне назаўсёды пакінуць Радзіму.

І ён расказаў, што прадаў сваё памесце, што на руках сума ў пяцьдзесят тысяч рублёў. Грошы ж ён рашыў выкарыстаць для патрэб чалавецтва. А для гэтага збіраецца

адправіцца на Маркізскія астравы для заснавання земляробскай калоніі, нейкага ідэальнага грамадства тыпу камуны, дзе праца будзе крыніцай радасці.

Павел Бахмецеў добра запомніўся Чарнышэўскаму. У ім Мікалай Гаўрылавіч убачыў чалавека дзеяння, натуру асаблівага складу, характару, які склаўся ў выніку нястомнага самавыхавання».

У жніўні 1857 г. Павел Бахмецеў едзе ў Лондан, дзе сустракаецца з А. І. Герцэнам. У сёмай частцы кнігі «Былое и думы» ў главе «Маладая эміграцыя» Герцэн піша: «Аднойчы раніцай я атрымаў запіску, вельмі кароткую, ад нейкага незнаёмага рускага: ён пісаў мне, што «мае неабходнасць мяне бачыць», і прасіў назначыць час сустрэчы.

Я ў гэты час ішоў у Лондан, а таму замест усялякага адказу зайшоў сам у «Саблан'-ер» — атэль і спытаў пра яго, ён быў дома. Малады чалавек з выглядам кадэта, сарамлівы, вельмі невясёлы і з асаблівым знешнім выглядам, маўклівы... бачна было, што ў яго на душы нешта, але ён не дайшоў да магчымасці выказаць гэта.

Я пайшоў, запрасіўшы яго дні праз два-тры абедаць...»

Далей А. І. Герцэн піша, што ён сустрэў яго выпадкова на вуліцы. Яны разгаварыліся, і П. А. Бахмецеў прапанаваў Герцэну 20 тысяч франкаў на справу рэвалюцыйнай прапаганды, жадаючы зрабіць што-небудзь карыснае для пакідаемай Радзімы. Герцэн не адразу прыняў прапанову, таму што яго выдавецтва ў гэты перыяд не адчувала фінансавых цяжкасцей. Нарэшце ён уступіў, але паставіў Бахмецеву свае ўмовы: Герцэн заявіў, што без крайняй патрэбнасці грошы на мэты прапаганды не возьме, а будзе берагчы іх да магчымага вяртання Бахмецева з Маркізскіх астравоў.

1 верасня 1857 г. Павел Бахмецеў адплываў на Маркізскія астравы. «...На другі дзень, — піша Герцэн у рамане «Былое і думы», я абяцаў прыйсці да яго развітацца. Ён быў зусім гатовы. Маленькі кадэцкі або студэнцкі чамаданчык, шынель, перавязаны папругай і ... трыццаць тысяч франкаў золатам, завязаныя ў тоўстым футляры так, як завязваюць фунт агрэсту ці арэхаў.

Так паехаў гэты чалавек на Маркізскія астравы».

Праз некалькі гадоў у Аляксандраўскай катаржнай турме Мікалай Гаўрылавіч расказваў паліткатаржаніну С. Г. Стахевічу аб сваёй паездцы ў 1859 г. у Лондан, да Герцэна. Чарнышэўскі ўспамінае і пра гутарку Бахмецева з Герцэнам.

Заключныя словы Мікалая Гаўрылавіча былы катаржанін памятаў з поўнай дакладнасцю:

— У сваім рамане я назваў асаблівага чалавека Рахметавым у гонар іменна вось гэтага Бахмецева.

Сляды Бахмецева губляюцца з таго вераснёўскага дня 1857 г., калі Герцэн праводзіў яго на параход.

ПІСАЎ КАБЗАР У ГОРКІ

«В семье вольной, новой...» — гэтыя словы вялікага Кабзара, якія адлюстроўваюць яго мару аб усенародным аб'яднанні ў свабоднай краіне, з удзячнасцю памятаюць у Горках. Асаблівыя адносіны да іх звязаны з тым, што Тарас Рыгоравіч Шаўчэнка быў у перапісцы з выкладчыкамі Горы-Горацкага інстытута.

Яшчэ ў 1935 г. у «Литературном наследии» былі апублікаваны два нявыдадзеныя лісты Шаўчэнкі Піліпу Мікалаевічу Каралёву і канверт ад трэцяга ліста, які не дайшоў да нас.

У прадмове да публікацыі гэтых лістоў літаратуразнаўца І. Айзенштак пісаў, што «...не удалось обнаружить каких-либо сведений аб адресате писем». Напэўна, ён не звярнуў увагі, што на канверце трэцяга пісьма напісана «Его высокоблагородию Филиппу Николаевичу Королеву. Профессору Горы-Горецкого института в местечке Горки Могилевской губернии». На паштовым штэмпелі значыцца месца, адкуль ліст быў адпраўлены: Ахтырка, Харкаўскай губерні, і дата — 14 жніўня 1846 г.

Хто ж ён, горкаўскі адрасат Т. Шаўчэнкі? Нарадзіўся П. М. Каралёў у Харкаўскай губерні ў сям'і селяніна ў 1821 г. Яму пашанцавала скончыць фізіка-матэматычны факультэт Харкаўскага універсітэта, пасля чаго працаваў настаўнікам матэматыкі ў Харкаўскай гімназіі. З 1844 г. ён у Горках. Як адзначае С. Т. Цітовіч у кнізе «Горы-Горецкий земледельческий институт», Каралёў вядзе заняткі па матэматыцы, сельскай архітэктуры і прыкладной механіцы.

Аб чым гаварылася ў гэтых пісьмах? Перш за ўсё яны з'яўляюцца вялікай каштоўнасцю пры вывучэнні біяграфіі паэта. Так, у гэтых пісьмах ён упершыню паведамляе аб паездках у Швецыю і Данію, аб дакладнай даце напісання паэмы «Гамалія». З тых жа лістоў можна ўстанавіць і гіста-

рычныя крыніцы, якімі карыстаўся паэт пры напісанні гэтай паэмы. Гэта даслаы П. М. Каралёвым збор запарожскіх песень і дум «Запорожская старина». Т. Р. Шаўчэнка расказвае аб сваіх выдавецкіх справах, аб тым, што ў цяжкую хвіліну яму давялося прадаць правы на выданне ўсіх сваіх твораў. У лістах адчуваецца глыбокая асабістая дружба Тараса Рыгоравіча і Піліпа Мікалаевіча, іх узаемная прыхільнасць. Так, у першым лісце Шаўчэнка піша: «Спасибо тебе, добрый человек, за ласковое слово, за гроши...» У другім лісце: «Спасибо тебе, мой голубь, что хоть ты меня не забываешь. Прочитал я твое ласковое письмо...»

Магчыма, з 1847 г. сувязь сяброў абарвалася, так як паэт за ўдзел у дзейнасці Кірыла-Мяфодзьеўскага таварыства быў арыштаваны і сасланы радавым у асобны Арэнбургскі корпус. У 1858 г. Т. Р. Шаўчэнка вяртаецца ў Пецярбург, а П. М. Каралёў выязджае з Горак у Маскву. Аб іх далейшай сувязі і перапісцы пакуль што нічога невядома.

ДА СЯБРОЎ, У ГОРКІ І ГОРЫ

З Горацкай зямлёй звязана імя вядомага рускага паэта Гаўрылы Раманавіча Дзяржавіна. Некаторыя свае вершы, напрыклад «Горы», «Горки», «Мельник», «Виши», ён напісаў у Горках і ў вёсках Горацкага маёнтка ў 1799 г., калі паэт па даручэнню Кацярыны II прыязджаў у Шклоў, дзе разбіраў скаргу мяшчан Шклова на прыгнёт С. Г. Зорыча, былога фаварыта Кацярыны II.

Уладальнік Горы-Горацкага маёнтка граф І. А. Салагуб быў знаёмы Гаўрылу Раманавічу. Ён быў жанаты на дачцэ знаёмага Дзяржавіна А. А. Нарышкіна, вядомага вяльможы XVIII ст., папулярнага ў пецярбургскім свеце дзякуючы сваёй дасціпнасці і таварыскасці.

Цікава, што граф І. А. Салагуб быў дзедам вядомага ў першай палове XIX ст. пісьменніка В. А. Салагуба. Аб гэтым ён пісаў у сваіх «Воспоминаниях».

Дзяржавін наведаў Горкі 12 чэрвеня 1799 г. Гэта быў дзень нараджэння жонкі Л. А. Нарышкіна — Марыны Восіпаўны, якая знаходзілася ў Горках. Паэта ўгаварылі застацца пагасцяваць. І за святочным сталом Гаўрыла Раманавіч прачытаў толькі што складзены верш «Горки»:

Сегодня мы твое рожденье
Пируем в Горках и Горах;
За здравие пьем и в восхищенье
Тебе желаем всяких благ,
А тож и твоему супругу,
Чтоб долго и приятно жить,
И недругу давать и другу
Пиры, забавы — есть и пить.

Літаратуразнаўца С. У. Букчын піша, што потым Дзяржавін пераязджае ў вёску Горы. Па дарозе ў Горы ён сустракаецца з дзяўчынай-яўрэйкай, якая прапанавала яму купіць некалькі ўпаляваных бакасаў. Дзяржавін пазнаў у пераапранутай дзяўчыне дачку І. А. Салагуба — Кацярыну. Гэты выпадак ён адлюстраваў у вершы «Горы».

Свае ўражанні ад прыгажосці беларускай прыроды Дзяржавін выказаў у вершы «Виши»:

Сей день усыпали цветами
Младые девы ложе мне
И тихих песен голосами
Восхитили мой дух во сне.
Казалося, за ними следом
Я по лугам, лесам ходил
И, с лип златым питаясь мёдом,
Благоуханный воздух пил,
Близ вод жил в поле елисейском,
Веселостей вкушая тьму;
Но, встав, увидел: в милом сельском
Твоем, Жуковский, я дому.

Гэты верш быў напісаны пасля наведвання памешчыка Жукоўскага, які меў маёнтак у маленькай вёсцы Вішы. Зараз гэтай вёскі няма ў Горацкім раёне. Нічога пакуль што невядома і аб памешчыку Жукоўскім, які ведаў Дзяржавіна.

Исторические рассказы и анекдоты из жизни русских государей и замечательных людей XVIII и XIX столетий. Спб., 1885. С. 272—281.

Соллогуб В. А. Повести. Воспоминания. Спб., 1888. С. 346.

БУДЗЬ ЗАЎСЁДЫ СУМЛЕННЫМ І ГОДНЫМ

Такія словы сказаў пісьменнік Іван Сяргеевіч Тургенеў свайму прыгоннаму селяніну, калі адпраўляў яго вучыцца ў Горацкую земляробчую школу. Як гэта адбылося, сведчаць пісьмы пісьменніка, адрасаваныя ў Горкі, у Горы-Горацкі земляробчы інстытут.

Сын прыгоннага селяніна, ён сябраваў з Іванам Сяргеевічам, чытаў кнігі з яго бібліятэкі, дапамагаў перапісваць творы пісьменніка, вёў гаспадарчыя запісы.

Увесну 1859 г. І. С. Тургенеў прыехаў у свой маёнтак і прапанаваў Фядоту ехаць вучыцца ў Горкі. Хлопец згадзіўся.

15 жніўня Ф. Бізюкін адправіўся ў Горкі і паступіў у школу.

А ці цікавіўся Іван Сяргеевіч лёсам Фядота ў час яго вучобы? Так. Аб гэтым сведчаць пісьмы, якія ён пісаў Е. Я. Калбасіну (1831—85 гг.), белетрысту і гісторыку літаратуры. Вядома яго 39 пісьмаў, і ў двух з іх, якія былі дасланы з Парыжа, Тургеневу успамінае Фядота.

13(24) лістапада 1860 г.: «P. S. Навошта ж Вы будзеце плаціць за Фядота? Напішыце ад майго імя Аненкаву і вазьміце з яго выдадзеныя Вамі грошы. У яго ёсць мае грошы на такія выпадкі».

14(25) снежня 1860 г.: «Пра Бізюкіна я напісаў сёння ж да дзядзькі энергічны ліст — і справа будзе зроблена».

Па ўсёй верагоднасці, гаворка ідзе аб плаце за вучобу Фядота Бізюкіна, якую, мабыць, упраўляючы нерэгулярна высылаў у Горкі.

Ці перапісваліся яны ў гэты час? Пакуль аб гэтым невядома. Але ў чэрвені 1861 г., як успамінае Бізюкін, яго выклікаў дырэктар школы Б. А. Цалінскі і паведаміў, што «Івану Сяргеевічу пажадана, каб я атрымаў вольную, прычым аддаў мне і само пісьмо». Вось яго змест:

«Ласкавы пане, Багдан Андрэевіч, маю гонар паведаміць Вам, што, як відаць, вольнаадпускная Фядота Бізюкіна да яго не дайшла — дык я, на падставе Палажэння, загадаў напісаць яму новую, якая паслязаўтра (з прычыны святаў) будзе засведчана і тэрмінова адпраўлена ў Горы-Горацкую школу. Дазвольце падзякаваць Вам ад душы за аказаную Вамі ласку і спадзяюся, што Бізюкін дастойны яе. У той жа час прашу прыняць запэўненне ў поўнай павазе, з якой застаюся

Ваш пакорны слуга
Ів. Тургенеў

С. Спаскае.
30 мая 1861 г.»

У 1863 г. Ф. Бізюкін скончыў курс навук і атрымаў пасведчанне на званне памочніка вучонага ўпраўляючага. У асабістай справе Ф. Бізюкіна, якая захоўваецца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі, ёсць яго справаздача аб рабоце з 1863 па 1870 гг. Яна была прадстаўлена 2 студзеня 1870 г. у педагагічны савет вучылішча на атрыманне правоў вучонага аканома. Тут жа знаходзіцца і копія атэстата Ф. Бізюкіна.

У. Ліўшыц.

ГОРЫ-ГОРКІ

Так называется маленький белорусский городок, в котором я родился и прожил большую часть своего детства.

...Город начинался незаметно, исподволь, от старой Оршанской дороги — шляха, обсаженного огромными, еще екатерининских времен березами. Почти двести лет эти деревья являлись объектом тиранства городских мальчишек, весной безжалостно изрезавших их ножами для добычи сладкого березового сока... И деревья снисходительно относились к этим ежегодным истязаниям. Летом, покрытые многочисленными рубцами и шрамами, с корой, еще розовой от высохшего сока, они стояли незыблемые, высокие — величественные свидетели почти всей истории города. Впрочем, город был намного старше берез на шляху. В нем еще сохранились следы Петровской эпохи: под Горками во время русско-шведской войны стояли большим лагерем русские войска, и за городом до сих пор тянется длинный вал — остатки укреплений русской армии. Осевший, заросший желтой акацией вал стал любимым местом прогулок горожан, а узенькая тропка вдоль вала вела к Бабьему броду — излюбленному месту мальчишеских купаний. А на кладбище, в самой старой церкви города — деревянной, с гонтовым шатровым куполом — хранилось Евангелие, которое, по преданию, читал здесь сам Петр.

Два кладбища — русское и еврейское, расположенные одно напротив другого, как бы выполняли роль городских ворот: от них начиналось предместье. Если верно, что кладбище является выражением духа религии, то трудно было бы найти лучшее подтверждение этому, чем два соседних горецких кладбища. Русское было уютным, веселым, совсем не страшным: приземистые могильные холмики заросли густой травой, нехитрыми полевыми цветами. Все здесь бы-

ло округлым, улыбающимся: невысокие березы, густая сирень, нарядные памятники. По воскресеньям и в летние теплые ночи оттуда всегда доносились смех, визг девушек, шепот парочек. И похоронное шествие, медленно двигающееся к кладбищу, не вызывало у нас, детей, страха. Казалось, совсем не страшно лежать в земле в этой веселой, зеленой роще, где на Пасху катают яйца, а летом мальчишки делают из стручков акации пронзительные свистульки.

Еврейское кладбище совсем не походило на своего соседа — даже зеленью. Щербатая кирпичная стена кладбища была обсажена высокими пирамидальными тополями. Их вершины качались и мрачно шумели всегда — даже в безветренные солнечные дни. И само кладбище, заросшее лопухами и колючками, тесно уставленное плоскими исписанными надгробными камнями и досками, было мрачно и безнадежно. Здесь не пели песен, не играли дети. Не пение, а вой и причитания женщин сопровождали мрачную и быструю церемонию еврейских похорон. И мы невольно бросались к воротам своих домов, увидев спешащую, почти бегущую похоронную процессию: черные носилки, на которых под черным покрывалом угадываются очертания зашитого в саван мертвеца. Служка похоронного братства идет впереди носилок, стучит в медную кружку и пронзительно провозглашает: «Здоке таце лымовес» — предложение жертвовать в пользу братства.

Для меня долгое время началом и концом города был перекресток, у которого стоял дом Минкиных, где мои родители снимали квартиру. Дом стоял в начале главной улицы города — Большой Оршанской. Окна его выходили на другую широкую улицу, скорее напоминавшую разъезженную сельскую дорогу. Перед домами и на задах были большие огороды, неподалеку виднелись деревья институтской рощи, от которой начинался Романовский шлях — шоссейная дорога в Романово — имение князей Дондуковых-Корсаковых.

Большая Оршанская имела все отличительные черты главных улиц российских уездных городов. Большинство домов на ней было обшито тесом и имело высокие крылечки с обязательными лавочками. Чем ближе к городской площади — тем улица становилась наряднее и приобретала все более городской вид. Деревянные тротуары делались шире, изредка появлялись кирпичные дома, принадлежащие богатым еврейским купцам, и, наконец, улица переходила в городскую площадь — центр всех материальных и духовных интересов горожан, в особенности мальчишеского населения города. Напротив Базарной площади стоял длинный каменный дом — единственное двухэтажное здание в городе, если не считать тюрьмы и института. В этом доме помещались Дворянское собрание, городской ресторан, библиотека, местный театр — словом, почти все культурно-увеселительные учреждения. На Рождество в зале Дворянского собрания устраивалась елка, в один из дней сюда приглашали детей мелких служащих, приказчиков, даже рабочих немногочисленных предприятий города. Один раз и меня отец повел на елку, и много лет после этого никакие другие впечатления не могли вытеснить воспоминания об огромной елке, обвешанной золочеными орехами, блестящей канителью и стеклянными игрушками, потрясшими детское воображение. Забыть это было невозможно, и даже несколько орехов да небольшой ватный ангелочек, врученные мне толстой дамой с широченным ртом, набитым зубами, не успокоили сердце, распаленное недоступной прелестью елочных украшений.

От Дворянского собрания начиналась Базарная площадь — самое веселое и интересное место в нашем городе. Правую часть площади занимали две большие деревянные церкви, стоящие рядом и обнесенные узорчатой кирпичной оградой. Налево от церквей — пожарная каланча с вышкой и большим флагштоком, на котором вывешивались пожарные сигналы. Различать эти сигналы в обязательном порядке должны были все мальчишки, начиная с четырех лет.

Вдоль всей площади тянулись несколькими линиями торговые ряды. В бесчисленных мелких лавчонках продавались, главным образом, бублики, сладкие лепешки — кухоны и разнообразная, неопределенная мелочь, именуемая бакалеей. Ассортимент такой «бакалеи» состоял из нескольких бутылочек с уксусом, баночки с перцем, спичек, большой жестяной коробки леденцов «Ландрин и К^0» да еще любимого лакомства детворы — рожков: коричневых твердых стручков, прельщавших не столько сладостью, сколько экзотичностью происхождения — мы знали, что они из каких-то жарких, полусказочных стран. Торговый оборот этих полунищих лавчонок был ничтожен, и трудно было понять, что же заставляет еврейских старух просиживать в них целый день. Старый еврейский анекдот про торговку, которая утверждала,

будто каждый день торгует себе в убыток и едва сводит концы с концами лишь потому, что в субботу ее предприятие закрыто, почти точно определял экономический базис подобной торговли.

Захватывающе интересна была Базарная площадь в воскресные и праздничные дни, заполненная людьми, заставленная возами с высоко задранными к небу оглоблями. На возах, на ряднах и рогожах, навалены самые разнообразные товары: цветастые горшки и глечики, блещущие глазурованными боками; берестовые сита, полные земляники и малины; груды яблок, груш и слив; лубочные картинки, яркие сытинские книжки, иконы и медные крестики. Толпа на площади так густа, что продвигаться в ней можно с трудом, продавливаясь одним плечом. И тем не менее — в этой толпе цыгане продают лошадей, страшно крича, непрерывно хлопая грязными смуглыми ладонями о ладонь растерянного покупателя. Рядом, при активном участии соседей и просто любопытствующих, еврейка покупает корову. Нищие у церковной ограды на одной ровной и безнадежной ноте выводят не то псалмы, не то подобие песни, в которой больше стонов, чем слов. Над большой площадью стоит гул, слитый из человеческих голосов, мычания скота, звона колоколов, пронзительного свиста глиняных свистулек.

В этой толпе немного страшно, но очень интересно. Интереснее всего, конечно, постоять у воза, на котором продаются книги, портреты царя — отдельно и в окружении его многочисленного семейства. Ловкий продавец надрывается, выхваляя свой товар. Стоит только какому-нибудь зеваке проявить интерес к любой книге, как перед его глазами начинают мелькать картинки, переворачиваться страницы. Офеня впивается в покупателя с такой силой, что избавиться от него можно, только купив какую-нибудь нелепую картинку о том, как солдат Петра I спас. Или наоборот, царь солдата. На нас, мальчишек, продавец почти не обращает внимания, и за час-другой мы можем совершенно бесплатно налюбоваться всеми богатствами, которые он разложил на возу.

Между пожарной каланчой и богадельней, приткнувшись к углу Базарной площади, проходит узенький и короткий переулок. Стоит лишь войти в него — и сразу стихает базарный гомон. Через несколько домов переулок кончается, и перед глазами возникает большая пустынная площадь. Всего несколько десятков шагов отделяют ее от базара, но она настолько другая, что кажется перенесенной с чужой планеты, даже почва иная — не мягкая пыль или чвакающая под ногами грязь базара, а жесткий, крупный песок с булыжниками и валунами. Площадь окружена длинными, почерневшими от времени деревянными зданиями. Над широкими окнами, над нарядными крыльцами укреплены ажурные, вырезанные из дерева шестиконечные звезды — Могендовид. Это — синагоги. И песчаный пустырь называется Синагогальной площадью. Прямо от нее круто катится вниз улица. Деревянные тротуары здесь сломаны, проезжая незамощенная часть улицы напоминает дно оврага, размытого потоками, с ревом несущимися после каждого дождя. Почти на всех домах этой улицы висит заржавленная вывеска, гласящая о том, что в доме «варшавский портной принимает заказы, а также шьет офицерам и стацким». В окнах видны сгорбленные фигуры с поджатыми ногами, сидящие на столах, с мелькающей иглой в руках, и облупленный манекен в глубине комнаты выглядит обезглавленным трупом. Все эти портные «варшавские», хотя родились и безвыездно прожили всю жизнь в Горках. Когда я уже научился читать и встречал в газетах или книжке слово «Варшава» — мне долго представлялся огромный город, весь состоящий из таких вот покосившихся домов, где в каждом у окна сидит чахлый портной в ермолке и шьет, шьет, шьет...

Но портные, жившие на этой улице, были аристократами среди других ремесленников города. Внизу, у самой Поросицы, на ее вязких илистых берегах примостилось множество домов, не пытавшихся даже сгруппироваться в подобие улиц. Это место называлось Глинище. Жила здесь самая отчаянная городская беднота — сапожники, жестянщики, люди со странными и печальными профессиями — обмывальщики мертвецов, плакальщицы, городские нищие, городские сумасшедшие. Последнее занятие считалось в городе тоже профессией — почти ничем не хуже любой другой. Бугристая, никогда не просыхающая почва Глинища была завалена обрывками кожи, вываренными костями, внутренностями животных, дохлыми кошками — все это раскисало, разлагалось, распространяло какую-то особую вонь, которой настолько пропахли все жители Глинища, что их легко было опознать по одному этому запаху.

От моста через Поросицу начиналась Сло-

бода. Вместе с другим предместьем — Заречьем — она составляла русскую часть города.

В Горках были и другие места и улицы — разные по своему характеру, назначению и населению. Была обычная в каждом уездном городе Дворянская улица, заселенная не столько дворянами, сколько состоятельными евреями; была Солдатская слободка у маленькой каменной тюрьмы; был городской бульвар с кинематографом. И, наконец, украшение и гордость города — старинный сельскохозяйственный институт, стоявший в глубине огромного красивого парка. Много интересного было в этом городе, который я открывал постепенно, шаг за шагом, с каждым месяцем и годом моей жизни...

Друкуецца па кн.: Разгон Л. Позавчера и сегодня. Москва — Тель-Авив, 1995.

Назвы зямлі горацкай

У спадчыну ад мінулых часоў нам засталася вялікая колькасць назваў вёсак, урочышчаў, гор, гаёў, палёў, рэк і азёр. Усе гэтыя назвы імянуюць тапонімамі. У назвах кожнага кутка горацкай зямлі ўвасоблены геаграфічныя, прыродна-кліматычныя асаблівасці гэтай мясціны, яго дэмаграфічныя рысы.

Аднак вёскі па розных прычынах знікаюць, знікаюць і іх назвы. Толькі за пасляваенны перыяд зніклі вёскі Верашчакі, Цяплухі, Бася, Іванова. А ў апошняй, напрыклад, у 1840 г. было 1115 жыхароў. Зараз няма ніводнага! Таму нам неабходна вывучаць тапаніміку, захоўваць гэтыя сведкі гісторыі.

Частка назваў населеных месцаў звязана з размяшчэннем ці асваеннем прыродных рэсурсаў, такіх як падземныя воды (Студзянец), карысныя выкапні (Каменка, Пясочня), а таксама з асаблівасцямі рэльефу (Горы, Горкі, Халмы, Курганне).

У нашым раёне шмат тапонімаў «раслінага» паходжання (Чарнічны, Вішня, Альхавец, Дубовы Вугал) і фауністычнага паходжання (Сава, Зубры, Мядзведаўка, Барсукі, Зайцава, Лебедзева).

Сярод тапонімаў ёсць і тыя, што маюць дачыненне да развіцця кустарных промыслаў. На горацкай зямлі ў старажытнасці людзі дабывалі балотную руду. Так з'явілася назва вёскі Рудня. Асобна былі распаўсюджаны ганчарныя вырабы. Адсюль назва — Кукшынава. У былыя часы значныя плошчы лясоў адводзіліся для паташнага промыслу. Адсюль назва — Паташы. Некалькі населеных пунктаў раёна носяць назву Буда. У старажытнасці словамі буда, будка называлі прадпрыемствы для смолакурэння, гонкі дзёгцю, пасёлкі для будаўнікоў.

Імёны людзей пакінулі таксама вельмі глыбокі след у тапаніміцы Горацкага раёна. Да іх адносяцца Міхайлавічы, Стафанова, Ермакі, Ермалоўка, Мікадзімава, Панкратаўка і інш.

Акрамя тапонімаў, вялікую ролю адыгрываюць мікратапонімы — назвы ўзгоркаў, гаёў, паркаў, палеткаў і г. д. Толькі ў г. Горкі мы ведаем мікратапонімы: Пятрова Горка, гара Мазепы, Мар'ін гай, Зарэцкі лес...

Аднак мы ведаем вельмі-вельмі мала пра назвы нашага горацкага краю. Напрыклад, чаму вёскі завуцца Сахараўка ці Турышчава, Блажкі ці Стрыкілі? Наогул назвы многіх вёсак пакуль што мы не можам расшыфраваць.

У. Ліўшыц.

Воіны-землякі, якія загінулі ў час руска-турэцкай вайны 1877—78 гг.*

АКСЁНАЎ Антон, рад. 117-га пяхотнага Яраслаўскага палка, загінуў.

БУСЛІНАЎ Іван Рыгоравіч, рад. 13-га грэнадзёрскага Эрыванскага Яго Вялікасці палка, загінуў

ГАРЛАВІЦКІ Гаўрыла Гаўрылавіч, рад. 13-га грэнадзёрскага палка, прапаў без вестак.

ГАЎРЫЛАЎ Фёдар Гаўрылавіч, унтэр-афіцэр 62-га пяхотнага Суздальскага палка, загінуў.

НІКІЦІН Мікіта Мікітавіч, унтэр-афіцэр 62-га пяхотнага Суздальскага палка, загінуў.

* Спіс складзены на падставе «Именного списка нижних чинов, убитых в сражении с неприятелем» па Магілёўскай губерні, што быў змешчаны на старонках газеты «Могилевские губернские ведомости» за 1877 і 1878 гг.

Воіны-землякі, якія загінулі ў гады руска-японскай вайны 1904—05 гг.*

ВОЛЬФ Лайзар, рад. 140-га пяхотнага Зарайскага палка, прапаў без вестак 25.2.1905 каля г. Мукдэн.

ГЛІКІН Рувім, н. у Горацкай вол., рад. 161-га Аляксандрапольскага пяхотнага палка, прапаў без вестак 25.2.1905 каля г. Мукдэн.

ДЗМІТРЫЕЎ Іван, н. у Раманаўскай вол., яфр. 161-га Аляксандрапольскага пяхотнага палка, прапаў без вестак 25.2.1905.

ДОЛЬНІКАЎ Пётр, н. у Маслакоўскай вол., рад. 161-га Аляксандрапольскага пяхотнага палка, прапаў без вестак 24.2.1905 каля в. Сантайцзы.

ЖМУДАЎ Андрэй, н. у Маслакоўскай вол., ст. унтэр-афіцэр 161-га Аляксандрапольскага пяхотнага палка, прапаў без вестак 25.2.1905 каля г. Мукдэн.

ЖУРАЎЛЁЎ Акім, н. у Маслакоўскай вол., рад. 161-га Аляксандрапольскага пяхотнага палка, прапаў без вестак 25.2.1905 каля г. Мукдэн.

ЗАНЕЎ Кляменцій, н. у Маслакоўскай вол., рад. 161-га Аляксандрапольскага пяхотнага палка, прапаў без вестак 18.2.1905 каля в. Тафашынь.

ЗЯМЦОЎ Андрэй, рад. 161-га Аляксандрапольскага пяхотнага палка, загінуў 22.2.1905 каля в. Цаохетунь.

ІВАНОЎ Сямён, н. у Маслакоўскай вол., рад. 161-га Аляксандрапольскага пяхотнага палка, прапаў без вестак 18.2.1905 г. каля в. Тафашынь.

КАВАЛЁЎ Рыгор, рад. 161-га Аляксандрапольскага пяхотнага палка, загінуў 18.2.1905 каля в. Тафашынь.

КАЖУРЫН Барыс, н. у Маслакоўскай вол., яфр. 161-га Аляксандрапольскага пяхотнага палка, прапаў без вестак 25.2.1905 каля г. Мукдэн.

КАПІТОНАЎ Міхаіл, н. у Маслакоўскай вол., рад. 161-га Аляксандрапольскага пяхотнага палка, прапаў без вестак 22.2.1905 каля в. Сантайцзы.

КАПЫТОЎСКІ Селівестар, рад. 161-га Аляксандрапольскага пяхотнага палка, загінуў 23.2.1905 каля в. Падзядзы.

КРАЎЦОЎ Мартын, рад. 161-га Аляксандрапольскага пяхотнага палка, загінуў 22.2.1905 каля в. Цаохетунь.

КУЗНЕЦ Біпіямін, н. у Маслакоўскай вол., рад. 161-га Аляксандрапольскага пяхотнага палка, прапаў без вестак 25.2.1905 каля г. Мукдэн.

КУКАЛКА Іван, рад. 3-га пяхотнага Сібірскага Нерчынскага палка, прапаў без вестак 21.2.1905 каля в. Цагоу.

КУПЧЫН Мікіта, н. у Маслакоўскай вол., рад. 161-га Аляксандрапольскага пяхотнага палка, загінуў 25.2.1905 каля г. Мукдэн.

КУХАРОНАК Кузьма, н. у Маслакоўскай вол., рад. 161-га Аляксандрапольскага пяхотнага палка, прапаў без вестак 25.2.1905 каля г. Мукдэн.

ЛІПІНСКІ Давыд, н. у Саўскай вол., яфр. 161-га Аляксандрапольскага пяхотнага палка, прапаў без вестак 23.2.1905 каля в. Падзядзы.

ЛЫСЕНЯЎ Аляксандр, н. у Саўскай вол., рад. 161-га Аляксандрапольскага пяхотнага палка, прапаў без вестак 23.2.1905 каля в. Падзядзы.

ЛЯВОНАЎ Астап, н. у Маслакоўскай вол., рад. 161-га Аляксандрапольскага пяхотнага палка, прапаў без вестак 25.2.1905 каля г. Мукдэн.

МАРОЗАЎ Аляксей, н. у Маслакоўскай вол., рад. 161-га Аляксандрапольскага пяхотнага палка, прапаў без вестак 23.2.1905 каля в. Падзядзы.

МАРТЫНЕНКА Даніла, н. у Маслакоўскай вол., яфр. 161-га Аляксандрапольскага пяхотнага палка, прапаў без вестак 24.2.1905 каля в. Сантайцзы.

МАЦВЕЕЎ Карней, н. у Маслакоўскай вол., рад. 161-га Аляксандрапольскага пяхотнага палка, прапаў без вестак 25.2.1905 каля г. Мукдэн.

МІРОНАЎ Авакум, рад. 161-га Аляксандрапольскага пяхотнага палка, загінуў 18.2.1905 каля в. Тафашынь.

МІЧЫНЬ Пётр, н. у Гарадзішчанскай вол., рад. 161-га Аляксандрапольскага пяхотнага палка, прапаў без вестак 25.2.1905 каля г. Мукдэн.

МІШУЛЬСКІ Фёдар, ст. унтэр-афіцэр 161-га Аляксандрапольскага пяхотнага палка, загінуў 22.2.1905 каля в. Цаохетунь.

МІШЧАНОК Цімафей, н. у Маслакоўскай вол., рад. 161-га Аляксандрапольскага пяхотнага палка, прапаў без вестак 23.2.1905 каля в. Падзядзы.

НАУМАЎ Пётр, яфр. 161-га Аляксандрапольскага пяхотнага палка, загінуў 23.2.1905 каля в. Падзядзы.

ПАГОДЗІН Яфім, н. у Раманаўскай вол., ст. унтэр-афіцэр 161-га Аляксандрапольскага пяхотнага палка, прапаў без вестак 23.2.1905 г. каля в. Падзядзы.

ПАНАСЁНАК Ціт, н. у Горацкай вол., рад. 161-га Аляксандрапольскага пяхотнага палка, прапаў без вестак 25.2.1905 каля г. Мукдэн.

ПАРАЖЫНСКІ Афанасій, рад. 161-га Аляксандрапольскага пяхотнага палка, прапаў без вестак 24.2.1905 каля в. Сантайцзы.

ПІНЧАКОЎ Фёдар, н. у Маслакоўскай вол., рад. 161-га Аляксандрапольскага пяхотнага палка, прапаў без вестак 22.2.1905 каля в. Сантайцзы.

ПУЗЫРЭЎСКІ Герасім, рад. 161-га Аляксандрапольскага пяхотнага палка, загінуў 22.2.1905 каля в. Цаохетунь.

РАБЦАЎ Фёдар, н. у Маслакоўскай вол., рад. 161-га Аляксандрапольскага пяхотнага палка, прапаў без вестак 22.2.1905 каля в. Сантайцзы.

---

* Спіс складзены на падставе «Списка нижних чинов, убитых, раненых и пропавших без вести в делах с японцами» па Магілёўскай губерні, што быў змешчаны на старонках газеты «Могилёвские губернские ведомости» за 1906 г.

РАДЗЬКОЎ Васіль, фельчар 41-ай артылерыйскай брыгады, прапаў без вестак 25.2.1905.

СЕНАКОС Станіслаў, рад. 161-га Аляксандрапольскага палка, загінуў 24.2.1905 каля в. Сантайцзы.

СІВЯКОЎ Карп, н. у Горацкай вол., яфр. 161-га Аляксандрапольскага палка, прапаў без вестак 25.2.1905 каля г. Мукдэн.

СІДАРАЎ Кандрат, н. у Гарадзішчанскай вол., яфр. 161-га Аляксандрапольскага пяхотнага палка, прапаў без вестак 23.2.1905 каля в. Падзядзы.

СНАРОК Якаў, яфр. 161-га Аляксандрапольскага пяхотнага палка, загінуў 23.2.1905 каля в. Падзядзы.

ТАЛКАЧОЎ Цімафей, рад. 161-га Аляксандрапольскага пяхотнага палка, загінуў 22.2.1905 каля в. Цаохетунь.

ХАРАШОНАК Васіль, н. у Маслакоўскай вол., рад. 161-га Аляксандрапольскага пяхотнага палка, прапаў без вестак 25.2. 1905 каля г. Мукдэн.

ЦЁПЛЫ Кузьма, рад. 161-га Аляксандрапольскага пяхотнага палка, загінуў 24.2.1905 каля в. Сантайцзы.

ЧУМАКОЎ Канстанцін, ст. унтэр-афіцэр 161-га Аляксандрапольскага пяхотнага палка, загінуў 22.2.1905 каля в. Цаохетунь.

ШАРАШЭВІЧ Лявон, н. у Маслакоўскай вол., рад. 161-га Аляксандрапольскага пяхотнага палка, прапаў без вестак 25.2.1905 каля г. Мукдэн.

ШЫДЛОЎСКІ Яфрэм, н. у Саўскай вол., рад. 161-га Аляксандрапольскага пяхотнага палка, прапаў без вестак 18.2.1905 каля в. Тафашынь.

ЮФАРА Мойша, н. у г. Горкі, рад., прапаў без вестак 22.2.1905 каля в. Юхуантунь.

ЯЎСЕЕЎ Сцяпан, н. у Маслакоўскай вол., рад. 161-га Аляксандрапольскага пяхотнага палка, прапаў без вестак 25.2.1905 каля г. Мукдэн.

ЯЦКОЎ Андрэй, н. у Саўскай вол., рад. 161-га Аляксандрапольскага пяхотнага палка, прапаў без вестак 18.2.1905 каля в. Тафашынь.

Воіны-землякі, якія загінулі ў час першай сусветнай вайны*

АЛЕНІК Станіслаў Восіпавіч, н. у Любініцкай вол., рад., католік, жанаты, прапаў без вестак 5.11.1914.

АМЯЛЬЯНАЎ Агафон Цімафеевіч, н. у Маслакоўскай вол., мал. унтэр-афіцэр, праваслаўны, жанаты, загінуў 20.10.1914.

АФАНАСЬЕЎ Сцяпан Апанасавіч, н. у Маслакоўскай вол., улан, праваслаўны, халасты, прапаў без вестак.

БЕЛАВУСАЎ Фядул Фаміч, н. у Маслакоўскай вол., яфр., праваслаўны, жанаты, прапаў без вестак 30.8.1914.

БОНДАРАЎ Васіль Ануфрыевіч, н. у Маслакоўскай вол., рад., праваслаўны, халасты, прапаў без вестак 30.8.1914.

БРАГІН Сільвестр, рад., праваслаўны, халасты, загінуў 1.11.1914.

БУРДА Міхаіл, рад., праваслаўны, халасты, прапаў без вестак 1.9.1914.

ВАЙНІЦКІ Мойша Рувімавіч, н. у Раманаўскай вол., рад., іудзей, халасты, прапаў без вестак 9.10.1914.

ВАРАБ'ЁЎ Іван, фельчар, праваслаўны, прапаў без вестак 1.11.1914.

ВАРАБ'ЁЎ Уладзімір Акімавіч, н. у Маслакоўскай вол., рад., праваслаўны, халасты, загінуў 6.10.1914.

ВАРЭННІКАЎ Пракоп Сямёнавіч, рад., праваслаўны, халасты, прапаў без вестак 20.10.1914.

ГАКОНАЎ Міхаіл Амвросьевіч, мал. унтэр-афіцэр, праваслаўны, жанаты, прапаў без вестак 16.10.1914.

ГАЛАГАНАЎ Яўсей Макаравіч, фельчар, праваслаўны, халасты, прапаў без вестак 30.8.1914.

ГАЛАЧКІН Міхаіл Сцяпанавіч, яфр., праваслаўны, халасты, прапаў без вестак.

ГАЛЬПЕР Лейба, мал. унтэр-афіцэр, іудзей, халасты, прапаў без вестак 30.8.1914.

ГАРБАТОЎСКІ Ціхан Іванавіч, абозны рад., праваслаўны, халасты, прапаў без вестак 30.8.1914.

ГАЎРЫЛАЎ Ермалай, рад., праваслаўны, халасты, прапаў без вестак 30.8.1914.

ДЗЯМ'ЯНАЎ Георгій Міхайлавіч, рад., праваслаўны, халасты, загінуў 30.8.1914.

ЖУРАЎЛЁЎ Апанас Пятровіч, абозны рад., праваслаўны, халасты, прапаў без вестак 30.8.1914.

ЗАРОЎСКІ Іларыён, рад., праваслаўны, халасты, прапаў без вестак 31.8.1914.

КАВАЛЁЎ Іван Патапавіч, грэнадзёр, праваслаўны, жанаты, прапаў без вестак 16.8.1914.

КАЛІНІН Мікалай Сямёнавіч, ст. унтэр-афіцэр, праваслаўны, жанаты, прапаў без вестак 8.11.1914.

КАМАРОЎ Яфім Мікалаевіч, н. у Саўскай вол., рад., праваслаўны, жанаты, загінуў 24.8.1914.

КОРСАКАЎ Сільвестр Пятровіч, мал. унтэр-афіцэр, праваслаўны, халасты, прапаў без вестак 30.8.1914.

---

* Спіс складзены на падставе «Именного списка убитым, раненым и без вести пропавшим нижним чинам Могилевской губернии», што быў змешчаны на старонках газеты «Могилевские губернские ведомости» за 1915 г.

КРУКАЎ Васіль, н. у Маслакоўскай вол., рад., праваслаўны, халасты, прапаў без вестак 21.10.1914.

КРЭСАЎ Антон Андрэевіч, мал. унтэр-афіцэр, праваслаўны, халасты, прапаў без вестак 21.11.1914.

КУЛЯШОЎ Спірыдон Андрэевіч, фельчар, праваслаўны, халасты, прапаў без вестак 30.8.1914.

ЛАБАЦЭВІЧ Нічыпар Піліпавіч, фельчар, праваслаўны, халасты, прапаў без вестак 30.8.1914.

ЛАКАВЕНКАЎ Якаў, рад., праваслаўны, жанаты, прапаў без вестак 31.8.1914.

ЛІШАНКОЎ Нічыпар, ст. унтэр-афіцэр, загінуў 15.9.1914.

МАЛАШАНКА Герасім Ермалаевіч, мал. унтэр-афіцэр, праваслаўны, халасты, прапаў без вестак 11.11.1914.

МАРКОВІЧ Гірэм, рад., іудзей, жанаты, прапаў без вестак 7.11.1914.

МЕЛЯШКОЎ Кандрат Іванавіч, н. у Маслакоўскай вол., праваслаўны, халасты, прапаў без вестак 21.11.1914.

МЫШАЛАЎ Мацвей, н. у Саўскай вол., рад., праваслаўны, халасты, прапаў без вестак 1.11.1914.

НЕСЦЯРЭНКА Мітрафан Лявонавіч, рад., праваслаўны, жанаты, прапаў без вестак.

НІКІЦІН Іван Мікітавіч, н. у Маслакоўскай вол., рад., праваслаўны, жанаты, прапаў без вестак 20.10.1914.

ПРОХАРАЎ Захар Лаўрэнавіч, рад., праваслаўны, халасты, прапаў без вестак 5.11.1914.

РАМАНАЎ Залман, рад., іудзей, жанаты, прапаў без вестак 1.11.1914.

РАМАНАЎ Свірыд Цімафеевіч, рад., праваслаўны, халасты, прапаў без вестак, 6.11.1914.

РАШКЕВІЧ Пракоп Васільевіч, фельчар, праваслаўны, халасты, прапаў без вестак 30.8.1914.

САДАВЫ Іван, рад., праваслаўны, жанаты, загінуў 4.8.1914.

СІЎЧЫК Рыгор Рыгоравіч, н. у Любіжскай вол., праваслаўны, жанаты, загінуў 7.8.1914.

СКОБЕЛЕЎ Васіль Піліпавіч, н. у Раманаўскай вол., яфр., праваслаўны, халасты, прапаў без вестак 21.11.1914.

СТУПАК Пётр Адамавіч, рад., праваслаўны, халасты, прапаў без вестак 30.8.1914.

СЦЯМПКОЎСКІ Пётр Амбросьевіч, рад., праваслаўны, жанаты, прапаў без вестак 30.8.1914.

ТАТКА Іосіф Калістратавіч, н. у Саўскай вол., рад., праваслаўны, халасты, прапаў без вестак 31.10.1914.

ТУРКАЎ Іван Піліпавіч, н. у Раманаўскай вол., рад., праваслаўны, халасты, прапаў без вестак 1.11.1914.

ФАЛЬКОВІЧ Архіп Якаўлевіч, яфр., праваслаўны, халасты, прапаў без вестак.

ФІЛІПАЎ Яфім Парфёнавіч, н. у Раманаўскай вол., унтэр-афіцэр, праваслаўны, халасты, загінуў 8.11.1914.

ХОРТАЎ Піліп Васільевіч, рад., праваслаўны, халасты, прапаў без вестак 30.8.1914.

ЦЫГАНАЎ Іван Самсонавіч, яфр., праваслаўны, халасты, загінуў 20.10.1914.

ЧАРПАКОЎ Васіль Герасімавіч, мал. унтэр-афіцэр, праваслаўны, халасты, прапаў без вестак 8.11.1914.

ШПАЕР Іосіф Гільевіч, мал. унтэр-афіцэр, іудзей, халасты, прапаў без вестак 30.8.1914.

Падзеі, факты, лічбы

1497 г.	У «Літоўскай метрыцы» ўпершыню ўпамінаецца в. Горы.
1544 г.	Упершыню ўпамінаюцца Горкі.
1675 г.	Уладальніца Горак і маёнтка Ізабэла Сапега аддала Горкі ў арэнду шляхціцу Скрэбеню за 1000 талераў у год.
1676 г.	У Горках было заснавана праваслаўнае брацтва, пры ім брацкая школа.
1678 г., 24 сакавіка.	Горкі наведаў пасол Рэчы Паспалітай у Маскоўскай дзяржаве Б. Танер. У сваіх запісках адзначаў багатае ўбранства праваслаўнай царквы.
1695 г.	Уладальнік Горак граф Юрый Сапега даў прывілей яўрэям на права мець свае сінагогі, абіраць рабіна, мець лазні, гандляваць.
1709 г.	Уладальнік маёнтка Сапега заснаваў касцёл на свае сродкі.
1711 г., 11 сакавіка.	Пётр I разам з імператрыцай праязджаў праз Горкі і адправіў з Горак 2 пісьмы.
1745 г.	Горацкія сяляне, якія перахрысцілі дзяцей у праваслаўнай царкве, былі пасаджаны ў турму па загаду ўладальніка графа Салагуба, які нядаўна набыў маёнтак.
1748 г., 5 кастрычніка.	Уладальнік маёнтка граф Салагуб выдаў грамату жыхарам на пабудову праваслаўнай царквы.

1750 г. Заснавана талесная фабрыка купцоў Сахаравых.

1754 г. Іезуітамі пабудаваны касцёл.

1783 г. Складзены атлас і карта Аршанскага павета Магілёўскай губерні, у якіх пазначаны Горкі.

1795 г. Заснавана суконная вытворчасць графа Л. Салагуба.

1799 г., 12 чэрвеня. У Горкі ў маёнтак графа Л. Салагуба прыехаў паэт Г. Р. Дзяржавін.

1804 г. Горкі наведаў падарожнік акадэмік У. М. Севяргін.

1805 г. Уладальнік мястэчка граф Салагуб выгнаў яўрэяў з лавак і забараніў ім займацца гандлем.

1809 г. Была заснавана суконная мануфактура з фарбавальняй. Працавалі гарбарны і вінакурны заводы.

1833 г. Пачала працаваць дробная гарбарная вытворчасць.

1839 г. Горацкі каталіцкі касцёл быў капітальна адрамантаваны і адноўлены.

1840 г. У Горках пачала працаваць паштовая станцыя і аптэка.

1841 г., 24 снежня. На аснове ўказа Дзяржаўнага Савета Расійскай імперыі людзі свабоднага саслоўя, якія перасяляюцца ў Горкі, карыстаюцца ільготамі, як і ў іншых гарадах Магілёўскай губерні.

1844 г. Міністэрствам дзяржаўнай маёмасці прынята пастанова аб будаўніцтве ў Горках «ежегодно по 15 новых хат с выдачей для этого селянам заимообразно строительного леса».

Як паведамлялі «Могилевские губернские ведомости» збор з публічных відовішчаў у Горках склаў 50 руб.

1846 г. Пачало дзейнічаць народнае вучылішча.

1847 г. Адчынена Горацкае Казіміраўскае народнае вучылішча.

1848 г. Праз раку Проня пабудаваны плаціна і мост на палях.

1859 г. Пры Горы-Горацкім земляробчым інстытуце пабудаваны дзяржаўны чыгуналіцейны завод, які меў паравую машыну. Працавала 27 чалавек, выпрацоўвалася ад 700 да 1000 пудоў металу ў год.

Пры Горы-Горацкім земляробчым інстытуце адчынена механічная майстэрня па вытворчасці сельскагаспадарчых машын і прылад.

1861 г., 15 верасня. Горацкія студэнты наладзілі дэманстрацыю ў мясцовым касцёле са спевамі нацыянальнага польскага гімна.

Пачала дзейнічаць маслабойня мешчаніна В. Мордуха.

1864 г. Горацкі павятовы казначэй Сліжкоў за выдатныя поспехі ў справе аховы казённай маёмасці ў час нападу мяцежнікаў на Горкі быў узнагароджаны ордэнам Св. Станіслава 3-й ступені.

31 кастрычніка. Быў урачыста асвечаны помнік, які пастаўлены на месцы пахавання воінаў, што загінулі ў час мяцяжу ў г. Горкі.

У вялікай зале галоўнага корпуса былога Горы-Горацкага земляробчага інстытута абсталяваны тэатр.

1866 г. Працавала адна бальніца на 18 ложкаў.

1869 г., 1 лютага. Прынята рашэнне аб стварэнні пры Горацкім земляробчым вучылішчы рамеснага вучылішча для падрыхтоўкі майстроў па вырабу, абслугоўванню і рамонту сельскагаспадарчых машын.

1871 г., 20 лютага. Прыстаў 1-га стана Магілёўскага павета Астроўскі назначаны памочнікам Горацкага павятовага спраўніка.

1873 г. У час археалагічнай разведкі ў адной чвэрці вярсты ад горада ў напрамку да сяла Кацялёва на ўзвышаным месцы, за дарогай было знойдзена гарадзішча даўжынёй 7 сажняў і шырынёй 5 сажняў.

Заснавана крупадзёрка Гаўрылава.

1878 г. Заснавана крупадзёрка Гурэвіча.

1880 г. У Горках працуюць два гарбарныя заводы, адзін дражджавы, 4 крупадзёркі і 5 маслабойняў.

1881 г. У Горках пачала дзейнічаць тэлеграфная станцыя.

На паштовых дарогах праз рэкі Парасіца і Капылка на земскія грошы пабудаваны 2 масты.

1882 г., 6 і 15 мая. Пажары знішчылі ў Горках 92 жылыя дамы, паштовую станцыю, будынак народнага вучылішча, 3 яўрэйскія малітоўныя школы, вайсковыя казармы. Страты ад пажараў склалі 128 тыс. руб.

1883 г. Пры Успенскай царкве заснавана аднакласная царкоўнапрыходская школа.

Даход горада склаў 3998 руб.
У Горках 93 гандлёвыя ўстановы з гадавым абаротам 115 тыс. руб.

Механічны завод пры Горацкіх сельскагаспадарчых вучэбных установах вырабіў: малатарняў — 4, веялак вялікіх — 5, саломатрасаў малых — 2, саломатрасаў вялікіх — 3, прывадаў для малатарняў — 2, таксама плугі і іншы інвентар. Усяго на 5400 руб.

1884 г. Барон С. І. Нолькен ахвяраваў сялянцы Горацкага павета Феакцісце Бразгуновай, якая нарадзіла чацвёра дзяцей адначасова — трох дзяўчынак і аднаго хлопчыка, тры рублі.

1885 г. У Горках было 10 прамысловых устаноў, на якіх працавалі 67 рабочых.
Паштовае аддзяленне аб'яднана з тэлеграфным.

Пры Вазнясенскай царкве адчынена аднакласная царкоўнапрыходская школа.

Пры горацкіх цэрквах дзейнічалі тры багадзельні.

20 жніўня. У вёсцы Задарожжа Горацкай воласці пажарам было знішчана 17 двароў і 10 сушняў. Страты склалі 8950 руб.

1886 г. Механічны завод пры Горацкіх сельскагаспадарчых навучальных установах пераўтвораны ў механічныя майстэрні.

1887 г., 17 мая. На палях сялян Гарадзецкай воласці вёсак Панкратаўка і Добрая град знішчыў азімыя пасевы хлеба на плошчы 144 дзес. Страты склалі 1851 руб. 25 кап.

На Усерасійскай выставе ў Харкаве Горацкае земляробчае вучылішча было ўзнагароджана ганаровай граматай за навуковыя і вучэбныя калекцыі агароднага насення і пладоў.

1891 г., 12 мая. У Горках згарэла 205 дамоў, у тым ліку павятовае паліцэйскае ўпраўленне і іншыя ўстановы са ўсімі справамі, кнігамі за 1891 г., справамі мінулых гадоў. Страты склалі 33 842 руб.

Зацверджаны Статут пажарнага таварыства і дружыны ў Горках.

Пры Горацкім земляробчым вучылішчы пачалі функцыяніраваць курсы для настаўнікаў народных школ, аматараў садаводства і агародніцтва, для падрыхтоўкі агранамічных стараст.

1892 г. На Усерасійскай выставе ў Маскве Горацкае земляробчае вучылішча за калекцыю насення, узоры глебы, садовыя прылады, план драўнянага пітомніка ўзнагароджана залатым медалём.

1897 г., 27 мая. Заснавана друкарня Хайкіна.

У Горацкім земляробчым вучылішчы адбыўся літаратурны вечар, прысвечаны 100-годдзю А. С. Пушкіна. На тэрыторыі вучылішча быў устаноўлены бюст паэта.

1899 г. У горадзе працавалі чатыры царквы: Свята-Троіцкая, драўляная і пры ёй царкоўнапрыходская школа; Успенская — драўляная; Вазнясенская, мураваная, пры ёй школа граматы; Мікалаеўская, мураваная, пры Горацкіх навучальных установах.

Яўрэйскае насельніцтва Горак налічвала 4659 чал.

Пачало працаваць таварыства дапамогі бедным жыхарам хрысціянскага веравызнання.

1900 г. Узнікла прыватная бібліятэка Вольфа.

1901 г., 12 сакавіка. Прынята рашэнне аб рэарганізацыі Горацкага рамеснага вучылішча. Устанаўліваўся пяцігадовы тэрмін навучання. Выпускнікі атрымлівалі званне сельскага майстра-механіка па рамонту сельскагаспадарчых машын.

1902 г. Майстэрнямі пры Горацкіх сельскагаспадарчых установах было зроблена: плугоў — 1326 шт., барон-акучнікаў — 119, веялак і сарціровак — 60, малатарняў — 5 і іншыя сельскагаспадарчыя прылады.

1904 г. Пры павятовым камітэце Чырвонага Крыжа пачаў працаваць жаночы камітэт. Яго старшынёй была абрана М. А. Дзеньгіна, членамі сталі М. А. Мартынава, А. Л. Рытава і Я. А. Вейс. Паступіла на карысць Чырвонага Крыжа: па Горацкаму камітэту з 15 па 22 сакавіка было 477 руб. 48 кап., паступіла 135 руб. 90 кап., палатна больш за 400 аршын і некаторае гатовае адзенне.

Сяляне Горскай воласці з 1 па 16 лютага 1905 г. ахвяравалі Горацкаму казначэйству: Нікіфар Яфрэмаў 4 руб. 31 кап., Марка Антонаў 1 руб. 60 кап., Сямён Кандратаў 1 руб. 20 кап., Сяргей Аўдзееў 1 руб., Яўмень Якаўлеў 1 руб., Леў Ярафееў 4 руб. 5 кап., усяго 13 руб. 16 кап. Гэтыя грошы былі пераведзены ў Санкт-Пецярбургскую кантору Дзяржаўнага банка на ўмоўны бягучы рахунак № 31369 камітэта на ўзмацненне ваеннага флоту.

У ноч з 20 на 21 ліпеня ў Горках пажарам поўнасцю знішчаны дом, які належаў ветэрынарнаму фельчару З. Пачкаеву. У гэтым доме знаходзіўся горацкі сялянскі прыёмны пакой.

1907 г. У ноч з 26 на 27 сакавіка пажарам знішчана памяшканне Горацкага павятовага з'езда з усімі дакументамі.

У Горках і павеце праводзілася 13 ярмарак. Гадавы абарот склаў 122 000 руб.

1908 г., сакавік. Адбылася сесія акружнога суда па справе аб яўрэйскім пагроме ў Горках у 1904 г. Прыцягнута да адказнасці 27, асуджана 11 чал.

Адчынена спажывецкае таварыства.

1909 г., 19 красавіка. Прынята рашэнне аб пераўтварэнні Горацкіх каморніцка-таксатарскіх класаў у каморніцка-аграномічнае вучылішча з шасцігадовым тэрмінам навучання. Гэта было адзінае ў Расіі вучылішча такога профілю.

1911 г. Узнікла Горацкае сельскагаспадарчае таварыства.

Пачала дзейнічаць прыватная прагімназія.

1913 г., 1 чэрвеня. Адчынена змешанае вышэйшае пачатковае вучылішча.

Пачало дзейнічаць другое крэдытнае таварыства.

1914 г. Пачалося будаўніцтва чыгуначнай лініі Орша — Унеча, якая праходзіла праз Горкі.

1917 г., 16 ліпеня. Выйшаў першы нумар газеты «Свободное слово». Рэдактар — член партыі эсэраў Л. А. Хрысаненкаў.

27 жніўня. У будынку каморніцка-аграномічнага вучылішча адбылося пасяджэнне другога сялянскага з'езда, які быў скліканы Горацкім павятовым Саветам сялянскіх дэпутатаў.

Верасень. Адчынена яўрэйская пачатковая школа.

1917

1941

У ГАДЫ ВЫПРАБАВАННЯЎ

26 кастрычніка 1917 г. у Горках і павеце стала вядома аб перамозе ўзброенага паўстання ў Петраградзе. Але Горацкі Савет, у якім былі ў асноўным прадстаўнікі партый меншавікоў і эсэраў, доўгі час не прызнаваў перамогу бальшавікоў у Петраградзе. Горацкія бальшавікі даручылі былому салдату царскай арміі С. Дз. Пагодзіну арганізаваць чырвонагвардзейскі атрад, у які ў першыя дні ўступіла больш за 80 чалавек. Улічваючы перавагу ў ваеннай сіле, Горацкі Савет вымушаны быў назначыць С. Дз. Пагодзіна ваенным камісарам, а намеснікамі — бальшавікоў А. Ф. Фабрыстава і С. Н. Шчура.

Абапіраючыся на чырвонагвардзейскі атрад, бальшавіцкая арганізацыя, якую падтрымлівалі рабочыя мясцовых майстэрняў і будаўнікі, рэвалюцыйна настроеныя навучэнцы горацкіх земляробчых установ, дабілася палітычнай перамогі. У канцы 1917 г. на першым павятовым з'ездзе Саветаў рабочых, чырвонагвардзейскіх і сялянскіх дэпутатаў большасць атрымалі бальшавікі. У Горках перамагла Савецкая ўлада.

У студзені 1918 г. быў створаны новы апарат Савецкай улады, пачаліся першыя пераўтварэнні. Ажыццяўляўся Дэкрэт Савецкага ўрада ад 17 лістапада аб нацыяналізацыі суконнай фабрыкі «Якаўлевічы» Горацкага павета, Дэкрэт аб зямлі.

Але мірнае будаўніцтва было спынена нападам войск кайзераўскай Германіі. Калі фронт прыблізіўся да мяжы Горацкага павета, савецкія органы з горада былі эвакуіраваны ў вёску Баева. Ваенны аддзел выканкома і чырвонагвардзейскі атрад пад камандаваннем С. Дз. Пагодзіна перадыслацыраваўся ў вёску Собалева, бліжэй да лініі фронту. У Горках застаўся Камітэт абароны.

14 сакавіка 1918 г. апазіцыі ўдалося арыштаваць членаў Камітэта абароны і захапіць уладу ў Горках. 15 сакавіка, калі атрад пад кіраўніцтвам С. Дз. Пагодзіна вызваляў арыштаваных членаў Камітэта абароны, ваенком быў смяротна паранены.

З воінскімі ўшанаваннямі пахавалі чырвонагвардзейцы свайго камандзіра ў яго роднай вёсцы Гушчына. У памяць аб загінуўшым атрад быў названы імем С. Дз. Пагодзіна.

Горкі былі цэнтрам абароны Магілёўскай губерні. Да 1 красавіка 1918 г. у Чырвоную Армію ў горадзе запісалася больш за тысячу чалавек.

У 1920 г. у сувязі з наступленнем палякаў Горкі зноў аказаліся ў прыфрантавой паласе. У павеце быў арганізаваны Ваенна-рэвалюцыйны камітэт, які падпарадкоўваўся Рэўваенсавету 16-й арміі. Старшынёй рэўкома назначылі М. С. Новікава.

Удзельнікі грамадзянскай вайны.

У дапамогу Чырвонай Арміі рэўком сфарміраваў спецыяльны ўзброены атрад — каравульную роту. Яна складалася з 210 чалавек.

Нягледзячы на грамадзянскую вайну, у павеце і горадзе працягвалася будаўніцтва новага жыцця. Навучальныя ўстановы былі рэарганізаваны ў адзіную працоўную школу. У школах горада і павета ў 1920 г. займалася амаль 17 тыс. дзяцей. Для дарослых працавала 20 курсаў ліквідацыі непісьменнасці. Для дзяцей, якія страцілі бацькоў, адкрыліся 5 дзіцячых дамоў. Дзейнічала 43 хаты-чытальні, 2 клубы.

Пры павятовым камітэце РКП(б) быў арганізаваны жансавет пад кіраўніцтвам В. Гольберга, які адкрыў чытальню, дзіцячыя яслі, курсы па ліквідацыі непісьменнасці. Для жанчын чыталіся лекцыі на палітычныя, эканамічныя і бытавыя тэмы.

Па ініцыятыве павятовай партыйнай арганізацыі ў верасні 1919 г. у Горках прайшоў першы камуністычны суботнік, у якім удзельнічала 35 камуністаў. Працавалі на аднаўленні згарэўшага Горацкага завода сельскагаспадарчых машын.

Высокі працоўны ўздым адрозніваў і Усерасійскі суботнік, які адбыўся 1 мая 1920 г. У Горках працавала ўсё дарослае насельніцтва.

Але ж менавіта ў гэты час ішло ўзмацненне палітычнага рэжыму, парушэнне правоў чалавека. На аснове дэкрэта аб працоўнай павіннасці ўсё працаздольнае насельніцтва павета прыцягвалася да бясплатнай абавязковай працы. Па харчразвёрстцы ў сялян забіралі лішкі прадукцыі. Усё гэта прыводзіла да такіх падзей, якія адбыліся ў Горацкім павеце 26 мая 1919 г. Члены харчатрада Уладзімір Арэф'еў, Міха-

іл Стрэпетаў, Рыгор Шумілаў, Арцём Гобрыкаў, Залман Міркінд, Іван Хліманкоў, Ошэр Лібкінд, Іона Дымшыц, Максім Чуба, Плотнікаў былі акружаны ў вёсцы Шэды і забіты. Целы загінуўшых перавезлі і пахавалі ў Горках. На магіле быў устаноўлены помнік.

Калектыў выкладчыкаў і навучэнцаў Горацкіх сельскагаспадарчых навучальных устаноў падняў пытанне аб аднаўленні дзейнасці Горы-Горацкага земляробчага інстытута. Рашэннем калегіі Народнага камітэта па асвеце РСФСР ад 7 красавіка 1919 г. сельскагаспадарчы інстытут быў адноўлены. Да канца 1920 г. у інстытуце вучылася 260 студэнтаў.

Пасля грамадзянскай вайны краіна Саветаў прыступіла да аднаўлення разбуранай гаспадаркі. За гады вайны зменшылася колькасць рамесных прадпрыемстваў, рэзка скараціліся пасяўныя плошчы, знізілася ўраджайнасць, пагалоўе жывёлы.

13 верасня 1921 г. адбылася канферэнцыя беспартыйных рабочых, сялян і чырвонаармейцаў Горацкага раёна, якая «...адобрыла лінію, узятую Савецкай уладай у галіне эканамічнай палітыкі ў напрамку ўсёй рэарганізацыі народнай гаспадаркі».

У пачатку лістапада 1921 г. старшынёй Горацкага павятовага выканкома быў выбраны М. М. Галадзед, які пазней стаў сакратаром ЦК КПБ і Старшынёй Савета Народных Камісараў. Ён паставіў задачу: рэарганізаваць павятовы выканком, «зрабіць яго больш гібкім, менш колькасным і больш працаздольным».

У гэты час у Горках ствараюцца прафсаюзы харчавікоў, будаўнікоў, работнікаў дзяржаўных органаў, асветы і аховы здароўя.

У 1921—22 гг. у павеце асобная ўвага



Першы суботнік у Горках. 1919 г.

ўдзялялася аказанню дапамогі галадаючаму насельніцтву Паволжа. Арганізоўваліся зборы грошай і каштоўнасцей, праводзіліся суботнікі і нядзельнікі, а заробак пералічваўся ў фонд галадаючых. Некалькі дзесяткаў дзяцей былі прыняты ў дзіцячыя дамы Горак і павета.

Горацкі павятовы РКСМ звярнуўся да камсамольцаў і моладзі горада і павета з заклікам збіраць сродкі для галадаючых. Пры кожнай камсамольскай ячэйцы была арганізавана камісія па аказанню дапамогі галадаючым. Камсамольцы горада і павета (а іх тады было 275) збіралі харчаванне, грошы, адзенне.

Павятовы камітэт РКСМ у гэты перыяд узначальваў Мацвей Паўлючкоў, ураджэнец вёскі Валынцава. У 1920 г. пасля заканчэння школы 2-й ступені (такую назву мела сярэдняя агульнаадукацыйная школа ў першыя гады пасля рэвалюцыі) ён стаў студэнтам першага набору Горацкага сельскагаспадарчага інстытута. У канцы 1921 г. ён захварэў на туберкулёз. У 1924 г. Мацвея Паўлючкова не стала.

Першы павятовы з'езд камсамола адбыўся летам 1919 г. у Горках. Сюды з'ехаліся дэлегаты з Дуброўна, Копысі, Лядаў, Раманава. Усяго прысутнічала 25 дэлегатаў.

У 1922—23 гг. аднавілі працу нацыяналізаваныя ў 1918 г. лесапільныя прадпрыемствы ў вёсках Ліхачова, Зубры, лесапільнае і мукамольнае прадпрыемства ў в. Цімохаўка, вінакурні ў былых маёнтках Копцеўка і Раманава (Леніна).

Да канца 1923 г. аднавілі 186 прамысловых і рамесных прадпрыемстваў, дзе працавала 885 чалавек. Развіццю эканомікі Горак садзейнічала заканчэнне будаўніцтва чыгуначнай лініі Орша — Унеча. У трох кіламетрах ад горада была пабудавана чыгуначная станцыя — Беларускія Горкі, якой пазней прысвоілі імя С. Дз. Пагодзіна.

У Горках і павеце працавала 240 школ 1-й ступені і 13—2-й, усяго навучалася каля 17 тыс. вучняў, 3 дзіцячыя сады на 150 месц і 5 дзіцячых дамоў на 127 чалавек. Для дарослых былі адкрыты 2 вячэрнія школы.

Новае жыццё наладжвалася і ў вёсцы. Для сялян адкрыліся аграпункты з шасцю доследнымі ўчасткамі і 13 пракатных станцый. Дзейнічала 28 камун і арцелей, 10 саўгасаў. Адным з першых на тэрыторыі павета быў саўгас «Леніна», арганізаваны ў 1918 г. на базе былога маёнтка Раманава. У 1923 г. у якасці шэфскай дапамогі ад У. І. Леніна сюды быў прысланы трактар «Фардзон», які стаў першым у Горацкім павеце. У 1934 г. саўгас налічваў 6 трактароў. У 1926 г. у раёне працавалі саўгасы «Леніна», «Горкі», «Іванова».

З ліпеня 1922 г. Горкі і павет уваходзілі ў склад Смаленскай губерні. З сакавіка 1924 г. быў выдадзены дэкрэт аб перадачы БССР 16 паветаў Віцебскай, Гомельскай і Смаленскай губерняў. Горацкі павет увайшоў у склад Аршанскай акругі.

Да гэтага часу працоўныя Горак дабіліся значных поспехаў у аднаўленні народнай гаспадаркі. Стала даваць ток электрастанцыя. У дамах загарэлася электрычнае святло. Пачаў дзейнічаць цагельны завод, прадукцыя якога была вельмі патрэбна гораду. Па пуцёўцы камсамола на прадпрыемства прыйшоў працаваць Іван Якубоўскі — будучы маршал, двойчы Герой Савецкага Саюза. Аб гэтым перыядзе свайго жыцця ён успамінае ў кнізе «Земля в огне».

Горацкі раён утвораны 17.7.1924 г. у Аршанскай акрузе (да 26.7.1930 г.). З 15.1.1938 г. у Магілёўскай вобласці. 20.8.1924 г. падзелены на 12 сельсаветаў: Горацкі, Гарадзецкі, Горскі, Кацялёўскі, Красулінскі, Ленінскі, Любіжскі, Паленскі (Паленкаўскі), Панкратаўскі, Паршынскі Сенькаўскі, Чашніцкі. 2.1.1925 г. Гарадзецкі сельсавет перайменаваны ў Ходараўскі. 21.8.1925 г. утвораны Казіміраўскі, Каменкаўскі (Каменскі), Асталопаўскі сельсаветы; ліквідаваны Горацкі сельсавет; перайменаваны сельсаветы: Кра-

Удзельнікі 2-га з'езда прафсаюзаў Горацкага павета.

сулінскі — у Шарыпскі, Паленскі (Паленкаўскі) — у Ліхачоўскі, Сенькаўскі — у Рэкценскі (Ракцянскі), Чашніцкі — у Макараўскі, 24.9.1926 г. зноў перайменаваны сельсаветы: Ліхачоўскі — у Паленскі (Паленкаўскі), Рэкценскі (Ракцянскі) — у Сенькаўскі. У 1931 г. гэтым сельсаветам зноў вернуты іх назвы. У 1927 г. ліквідаваны Ходараўскі сельсавет; 25.3.1931 г. Казіміраўскі сельсавет уключаны ў Горацкую гарадскую мяжу, 11.7.1931 г. сельсавет ліквідаваны. 8.7.1931 г. да раёна далучаны Бельскі (Кішчыцкі), Гасподаўскі (Трылесінскі), Гарадзецкі, Дрыбінскі, Кледнявіцкі, Карэбскі, Пакуцьенскі, Чурылаўскі (Студзянецкі) сельсаветы ліквідаванага Дрыбінскага раёна, Маслакоўскі сельсавет ліквідаванага Копыскага раёна, Пячонкаўскі сельсавет ліквідаванага Раснянскага раёна. 25.7.1931 г. далучаны Чэрнеўскі сельсавет Чавускага раёна, Пячонкаўскі сельсавет перададзены Мсціслаўскаму раёну. 5.9.1931 г. далучаны Жданавіцкі сельсавет Чавускага раёна. 20.11.1934 г. Асталопаўскі сельсавет перайменаваны ў Варашылаўскі. 12.2.1935 г. Бельскі (Кішчыцкі), Гарадзецкі, Гасподаўскі (Трылесінскі), Дрыбінскі, Жданавіцкі, Карэбскі, Кледнявіцкі, Пакуцьенскі, Чэрнеўскі, Чурылаўскі (Студзянецкі) сельсаветы перададзены зноў утворанаму Дрыбінскаму раёну.

15 ліпеня 1924 г. на 2-й сесіі ЦВК БССР быў пакладзены пачатак беларусізацыі як афіцыйнай дзяржаўнай палітыцы. У дзяржаўных, прафсаюзных, кааператыўных і навучальных арганізацыях Горацкага раёна пачалася праца па пераходу на беларускую мову.

З архіўных матэрыялаў вядома, што ўжо ў 1925 г. партыйныя і савецкія органы пачалі весці справаводства на беларускай мове, на ўсіх установах з'явіліся шыльды на беларускай мове.

Паспяхова праходзіла беларусізацыя ў навучальных установах. Ужо ў 1927 г. больш чым палова агульнаадукацыйных школ раёна працавалі на беларускай мове.

Асабліва вялікія поспехі былі зроблены ў Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі, дзе ў 1925 г. была створана кафедра беларускай мовы, літаратуры і гісторыі. З 1 лютага 1926 г. яе ўзначальваў пісьменнік М. І. Гарэцкі. Ра-

Аграномічны гурток у Горках. 1924 г.

зам з ім працавалі Ю. П. Гаўрук, у будучым вядомы паэт і перакладчык, і П. В. Мядзёлка, заслужаная дзяячка культуры Беларусі. Ю. П. Гаўрук у «Запісках Беларускай дзяржаўнай акадэміі сельскай гаспадаркі» пісаў, што заняткі па беларускай мове, літаратуры і гісторыі праводзіліся на двух першых курсах усіх факультэтаў. На першых курсах выкладалася беларуская мова, літаратура і гісторыя, на другіх чытаўся курс лекцый па новай (паслякастрычніцкай) літаратуры.

Выкладчыкі гэтай кафедры рэдагавалі навуковыя «Запіскі акадэміі», якія выходзілі на беларускай мове, кіравалі тэрміналагічнымі камісіямі, што былі створаны на кожным факультэце, рэцэнзіравалі дыпломныя работы, напісаныя па-беларуску. Пры кафедры плённа працаваў гурток беларускай культуры і хор. Вялікая бібліятэчка беларускай літаратуры была створана пры кабінеце кафедры.

Напружаная праца кафедры на чале з М. І. Гарэцкім пачала даваць добры плён. У справаздачы рэктара акадэміі М. Ц. Козырава за 1927 г. адзначалася, што амаль 60 % прафесараў і дацэнтаў і 90 % асістэнтаў вялі заняткі па-беларуску. На беларускую мову было пераведзена ўсё справаводства. Планавалася ўвесці і дзяржаўныя экзамены па беларускай мове і літаратуры.

Вялікая праца па беларусізацыі праводзілася філіяй «Маладняка», шырокае развіццё атрымала краязнаўства.

Такім чынам, у сярэдзіне 1920-х гадоў прыхільнасць да беларускай мовы лічылася за гонар. Але ў 1930-я гады гэта трансфармавалася ў сваю процілегласць. Неабгрунтавана рэпрэсіраваны былі М. Гарэцкі, Ю. Гаўрук, асудзілі таксама і С. Фаміна.

У 1925 г. у Горках быў арганізаваны камбінат, які аб'ядноўваў электрастанцыю, жывёлабойню і млын. Працавалі два лесапільныя і адзін скураны заводы, на тэрыторыі раёна дзейнічала Якаўлевіцкая суконная фабрыка, у той час адзіная ў Беларусі.

Адраджаліся традыцыйныя промыслы: шавецкі, сталярны, ганчарны. У 1925 г. тут працавалі ўжо 83 прадпрыемствы. Вырабы горацкіх рамеснікаў экспанаваліся на кустарнай сельскагаспадарчай выставе, у якой прынялі ўдзел усе саюзы саматужнікаў і 435 сялянскіх гаспадарак.

Паступова развіваўся прыватны і ка-

Хата-чытальня. У гуртку лікбеза.

аператыўны гандаль. У горадзе і павеце было створана больш за 100 кааператываў.

У 1930 г. працавалі торфараспрацоўчая арцель «Сысоўка» (в. Сысоева), торфзавод «Чапялінка», Самадумскі лесапільны завод, Шарыпскі льнозавод, маслазаводы ў в. Любіж, мяст. Горы, мяст. Леніна, піваварнае прадпрыемства ў в. Леніна. З 1924 г. дзейнічаў Ліхачоўскі льнозавод. У 1935 г. у раёне на тэрыторыі калгасаў і саўгасаў працавалі 39 млыноў, 74 кузні па рамонту сельскагаспадарчага інвентару, 2 бандарныя і 1 шавецкая майстэрні.

Да пачатку 40-х гадоў дала ток першая гарадская электрастанцыя, быў пабудаваны новы цагельны завод. Да 1934 г. у раёне дзейнічала 8 заводаў і 6 прамысловых арцелей, дзе працавала 5700 чалавек. У 1940 г. гэтымі прадпрыемствамі было выраблена 2,5 млн штук цэглы, 27 тыс. тон торфу, 7130 пар абутку, 5319 т хлебабулачных вырабаў.

Фарсіраванне тэмпаў індустрыялізацыі каштавала неверагоднага напружання сіл рабочых горада і раёна. Адным з метадаў уцягнення рабочых у фарсіраваную індустрыялізацыю было сацыялістычнае спаборніцтва за датэрміновае выкананне пяцігадовых планаў. Яно ахапіла ўсе прадпрыемствы, прамысловыя арцелі і ўстановы. Раённая газета «Ленінскі шлях» друкавала прозвішчы ўдарнікаў працы. Увесь раён ведаў І. А. Вярбіцкага — рабочага цэха цагельнага завода, А. В. Котава — лесаруба, М. Н. Кунцакову — работніцу швейнай арцелі, Н. К. Бальцава — рабочага хлебазавода.

Пачалася калектывізацыя. Яна праходзіла ў складаных абставінах. З аднаго боку, былі парушаны прынцыпы добраахвотнасці, каля тысячы сялян былі падвергнуты раскулачванню незаконна. У час раскулачвання, пад якое часта траплялі і сераднякі, забіраўся жывы і мёртвы інвентар, да новых калгасаў бясплатна пераходзіла жыллё і вытворчыя будынкі. З другога боку, некаторыя заможныя сяляне не здавалі паставак сельскагаспадарчай прадукцыі і сыравіны, нават забівалі вясковых актывістаў.

У калгас вёскі Ермалоўка ўступіла спачатку 10 чалавек, старшынёй выбралі 25-гадовага Ігната Лосева. За чатыры гады сяляне стварылі калгас, які быў адным з перадавых. Ігнат вучыў грамаце непісьменных сялян. Аднак у 1935 г. Ігнат Антонавіч і яго жонка Алена Данілаўна Мядзведская былі забітыя па-зверску. Выпадкова засталіся жывымі дзеці — сядзелі пад сталом.

Тым не менш калектывізацыя ў раёне працягвалася. І калі ў маі 1931 г. у раёне налічвалася 106 калгасаў, то ў 1934 г. іх лічба складала 250. Амаль усе сяляне былі ўцягнуты ў калгасы.

У гэты час на горацкія палі прыйшлі трактары. У лістападзе 1930 г. у Горках была створана МТС. Да лютага 1931 г. у ёй было 40 трактароў і іншая сельскагаспадарчая тэхніка. МТС абслугоўвала 76 калгасаў і сельскагаспадарчых камун 8 сельсаветаў. Пазней у раёне былі створаны (1935—36 гг.) Ленінская, Горская, Паленкаўская (Ліхачоўская) МТС (ліквідаваны ў 1957—58 гг.). На курсах маладых рулявых навучалася 114 калгаснікаў, 16 % з іх былі жанчыны. Пры МТС працавалі курсы па падрыхтоўцы брыгадзіраў. Палітаддзел станцыі выпускаў газету «За бальшавіцкія калгасы».

Некаторыя калгасы даказвалі сваю перавагу перад уласнымі гаспадаркамі. Напрыклад, гадавы даход бедняка да ўступлення ў калгас «Таварыш» вёскі Жаўлачоўка складаў 175 руб., серадняка — 350, а калі была арганізавана гаспадарка, даход калгасніка склаў 437 рублёў.

Як і ў горадзе, масавая агітацыя і прапаганда партыі садзейнічала разгортванню ў вёсцы сацыялістычнага спаборніцтва.

10 чэрвеня 1933 г. адбыўся першы раённы злёт калгаснікаў-ударнікаў, які падвёў вынікі сацыялістычнага спаборніцтва і намеціў шляхі яго далейшага развіцця. Пасланцы Горацкага раёна прымалі ўдзел у рэспубліканскім з'ездзе калгаснікаў-ударнікаў у Мінску.

У тую пару на ўвесь раён было шырока вядома імя Д. С. Каравосавай, якая ўстанавіла ў 1934 г. рэкорд па цярабленню льну. Першай у раёне яна была ўзнагароджана ордэнам «Знак Пашаны».

Актыўна ў пераўтварэннях вёскі ўдзельнічала горацкая моладзь. 20 членаў ЛКСМБ сталі старшынямі калгасаў, 96 брыгадзірамі, 46 — загадчыкамі малочнатаварных фермаў. Камсамольцы былі ініцыятарамі стварэння калгасаў «Чырвоная змена» вёскі Асінаўка і «Калгаснік Беларусі» ў Міхайлавічах.

Вясной 1931 г. у горадзе была адкрыта маладзёжная доследная сельскагаспадарчая станцыя. Яна заклала ў калгасах 8 доследных дзялянак пад яравыя культуры.

У ходзе калектывізацыі змянялася сялянская псіхалогія. З аднаго боку, пачалі фарміравацца калектыўныя адносіны да працы. З другога — пачаўся працэс адчужэння сялян ад зямлі, ад сялянскай працы.

Адбываліся змены і ў культурным жыцці горада і раёна. Перш за ўсё адкрываліся новыя школы і хаты-чытальні, бібліятэкі. У 1924 г. у горадзе і павеце працавала 2 сямігодкі, 32 пачатковыя школы, 4 бібліятэкі. У горадзе адчыніліся дзіцячыя яслі і сады, дзіцячая амбулаторыя. У павеце выдавалася газета. Спачатку яна называлася «Известия», затым «Луч Интернационала». З 1925 па 1929 г. газета ў Горках не друкавалася і зноў пад назвай «Ленінскі шлях» пачала выходзіць з 1930 г.

Развіваўся сельскагаспадарчы інстытут, які ў жніўні 1925 г. быў ператвораны ў акадэмію. На ўрачыстым сходзе прысутнічалі народныя паэты Беларусі Янка Купала і Якуб Колас, выступілі перад будучымі спецыялістамі сельскай гаспадаркі.

Далейшае развіццё атрымала ахова здароўя. Горацкая раённая бальніца лічылася адной з лепшых у Магілёўскай вобласці. У 1940 г. галоўнаму ўрачу раёна А. І. Татарскай адной з першых у рэспубліцы было прысвоена ганаровае званне «Заслужаны ўрач БССР».

У 1940 г. у Горках і раёне працавалі 50 пачатковых, 10 сярэдніх і 11 сямігадовых школ.

30-я гады. З аднаго боку — поспехі ў эканоміцы, культуры, з другога — бюракратызацыя грамадска-палітычнага жыцця, масавыя рэпрэсіі. Пад іх

Выпускнікі Горацкага лікбеза. 1929 г.

колы трапілі многія жыхары Горацкага раёна. Сярод іх былы рэвалюцыянер А. Фабрыстаў, рабочы М. Гладкі, пісьменнік В. Каваль, калгаснік М. Цельпухоўскі, святар Ф. Глінскі, студэнтка БСГА М. Прэс, выкладчык БСГА В. Аксельрод і інш.

Ніхто не адчуваў сябе ў поўнай бяспецы. Ніхто, кладучыся спаць, не ведаў, ці можа пазбегнуць начнога арышту. Нікому не было літасці. Герой рэвалюцыі і яе вораг, стары бальшавік і беспартыйны, калгасны селянін і народны камісар, рабочы і інтэлігент, — усе былі роўныя перад дэспатызмам улады.

Вясной 1935 г. НКУС былі арыштаваны шэсць студэнтаў аграхімфака сельгасінстытута. Яны абвінавачваліся ва ўдзеле ў віктарыне, пераказах палітычных анекдотаў, амаральных учынках. Але недаказанасць віны і палітычная галадоўка аднаго з арыштаваных выратавала іх ад пакарання.

Сярод крымінальных спраў значную частку складалі так званыя сялянскія справы. Калі на адказных партыйных і савецкіх работнікаў, военачальнікаў улікі фабрыкаваліся больш-менш дасканала, то на радавых «ворагаў народа» супрацоўнікі НКУС гэтым сябе не абцяжарвалі. Парушэнне норм закона было звычайнай з'явай. Большасць крымінальных спраў, звязаных з «контррэвалюцыяй», не ўзбуджаліся, людзей арыштоўвалі без усякіх санкцый і адразу ж прад'яўлялі абвінавачванне.

Летам 1937 г. была раскрыта «контрэвалюцыйная трацкістская арганізацыя», у якую ўваходзілі восем жыхароў Горацкага раёна. У віну ім ставілася тое, што яны ў размове паміж сабой

шкадавалі аб расстрэле «ворагаў народа» Тухачэўскага і Убарэвіча. Траім гэта размова каштавала жыцця, пяцёра былі пазбаўлены волі на 10 год кожны.

1941 год. Матэрыялы раённай газеты «Ленінскі шлях» ад 22 чэрвеня адлюстроўвалі мірную стваральную працу рабочых, калгаснікаў і служачых. Перадавы артыкул заклікаў арганізавана і своечасова правесці падрыхтоўку да новага навучальнага года ў школах. Газета расказвала аб поспехах меліяратараў раёна, аб калгасе «Шлях сацыялізму».

А ўдзень 22 чэрвеня жыхары горада і раёна даведаліся аб тым, што пачалася вайна.

У. Ліўшыц.

Дакументы сведчаць

ПАВЕДАМЛЕННЕ ГОРАЦКАГА ІНФАРМАЦЫЙНАГА БЮРО ГАЛОЎНАКАМАНДУЮЧАМУ АРМІЯМІ ЗАХОДНЯГА ФРОНТУ АБ АРГАНІЗАЦЫІ ПАВЯТОВЫМІ САВЕТАМІ МАГІЛЁЎСКАЙ ГУБЕРНІ БАРАЦЬБЫ З НЯМЕЦКІМІ АКУПАНТАМІ

30 сакавіка 1918 г.

С занятием Могилева немцами губернский исполнительный комитет фактически не существует.

Руководство местной жизнью перешло в руки местных уездных Советов. Горецкий Совет организует оборону Могилевской губ., собирает оставшиеся силы и закрепляет связь с ближайшими местностями.

По всем уездам организованы партизанские отряды для борьбы с германскими бандами, переходящими демаркационную линию в целях грабежа.

Борьба с обеих сторон беспощадная. Пленных не берут. Из германского тыла к нам приходят группами и поодиночке наши там оставшиеся солдаты, приводя нередко с собою пленных германцев или легионеров, пулеметы и оружие.

Железная дорога до Орши со ст. Копысь и Шклов занята немцами.

Информационное бюро.

Комитеты бедноты Белоруссии. Мн., 1958, с. 50.

АБ КАНТРОЛІ КАМБЕДА ЗА РАБОТАЙ ШАРЫПСКАГА ЦАГЕЛЬНАГА ЗАВОДА

14 лістапада 1918 г.

Кирпичный завод оставить в ведении гражданина Онуфрия Кузовкова с установлением на заводе контроля совнархоза через Шарипский сельский комитет бедноты.

Отпуск кирпича производить под строгим контролем названного комитета бедноты по цене 20 руб. за сотню лицам неимущим, доставившим удостоверения своих комитетов бедноты о бедном их состоянии, и 30 руб. за сотню — лицам, материально обеспеченным.

За каждую сотню отпущенного с завода кирпича 20 руб. поступает в пользу Кузовкова, а 10 руб. с сотни кирпича, который будет отпускаться по 30 руб. сотня — в распоряжение Шарипского сельского комитета бедноты.

Предложить Онуфрию Кузовкову немедленно приступить к обжигу не обоженного еще кирпича, а в случае отказа Кузовкова весь кирпич конфисковать.

Шарипский комитет бедноты в деле распоряжения кирпичом обязан подробно отчитываться перед Горецким уездным советом народного хозяйства.

Комитеты бедноты Белоруссии. Мн., 1958. С. 466.

ПІСЬМО ПРАФЕСАРУ М. В. РЫТАВУ АБ ВЫСЯЛЕННІ З УЛАСНАГА ДОМУ

9 снежня 1919 г.

Гражданину Рытову

По приказанию уполномоченного чрезвычайной тройки предлагаем Вам в 2-дневный срок освободить занимаемое Вами помещение в здании уездвоенкома, т. к. частная квартира не может быть совместима с военными учреждениями и занимаемое Вами помещение предлагается очистить без всяческих в дальнейшем оговорок.

Уполномоченный чрезвычайной тройки — подпись

Предкомдезертир — подпись

Делопроизводитель — подпись

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 2260, воп. 1, спр. 4233, л. 196.

Невядома, ці быў выселены вядомы вучоны са свайго дому. Але ў заяве ў акадэмію яго жонка пісала, што памёр ён у чужым куце — заўвага *У. Ліўшыца.*

НАСЕЛЕНЫЯ ПУНКТЫ ГОРАЦКАГА РАЁНА

1924 г.

Яковлевичский с/с (Копысский район): Кустовка (род населенного пункта — околица; число хозяйств — 23; число жителей — 124), Черное (деревня; 64; 425), Клин (д.; 18; 135), Застенки (д.; 11; 119), **Маслаковский с/с:** Михайловичи (д.; 89; 520), Ферма (д.; 17; 102), имение Аниковичи (д.; 15; 80), Бася (д.; 15; 76), Варьково (д.; 82; 472), Аниковичи (село; 103; 582), Стрикили (д.; 130; 708), Маслаки (с.; 200; 1164), Напрасновка (д.; 48; 292); Шепелевка (д.; 86; 520); Хоминичи (д.; 137; 698). **Паршинский с/с:** Паршино (д.; 102; 544), Ревячино (д.; 31; 178), Кузовино (д.; 102; 560), Королевка (д.; 62; 338), Пуплы (д.; 13; 84), Сапрыки-Озаровичи (д.; 40; 245), Иваново (фольварок), Нивищи (д.; 67; 416), Телешовка (д.; 18; 109), Осада-Телешовка (д.; 23; 145), Поляшицы (д.; 116; 679), Тосна (д.; 42; 260), Волколаки (д.; 38; 202). **Панкратовский с/с:** (Горецкий район), Панкратовка (д.; 81; 521), Балбечино (д.; 86; 483), Сахаровка (д.; 59; 280), Стан (д.; 124; 749), Тушково (д.; 94; 535), Голышино (д.; 68; 378), Ермаки (д.; 35; 198), Добрая (д.; 77; 499), Добрый Двор (хутор; 5; 26), Матюты (д.; 64; 334).**Чашниковский с/с:** Чашники (д.; 55; 358), Куртасы (д.; 85; 531), Зайцево (д.; 22; 145), Макаровка (д.; 13; 82), Шведы (д.; 6; 42), Андрюхи (д.; 39; 269), Шелухановка (д.; 24; 135), Антропенки (д.; 6; 42), Волковщина (д.; 49; 286), Конюхи (д.; 62; 350), Блажки (д.; 47; 261), Андеколово (д.; 101; 668), Луки (д.; 54; 359), Жевлачевка (д.; 13; 83), Шимановка (д.; 40; 205), Нежково (д.; 118; 814). **Котелевский с/с:** Котелево (с.; 47; 282), Задорожье (д.; 126; 724), Суравцово (д.; 18; 113), Славики (д.; 60; 325), Буда (д.; 78; 413), Квартяны (д.; 68; 356), Никулино (д.; 55; 279), Большое Морозово (д.; 56; 287), Турищево (д.; 67; 411), Котелево (д.; 117; 658), Малое Морозово (д.; 63; 305), Тормаль (д.; 12; 93). **Горской с/с:** Горы (местечко; 81; 399), Никодимово (д.; 43; 273), Лебедево (д.; 144; 799), Горская Слобода (д.; 113; 612), Закомчинское общество (д.; 92; 447), Запрудское общество (д.; 54; 298), Курганское общество (д.; 82; 405), Соколово (д.; 66; 452), Мальки (д.; 28; 159), Шавнево (д.; 83; 477), Ольховец (д.; 23; 128), Окушки (д.; 49; 326), Оршани (д.; 83; 439), Высоцкие (д.; 62; 324), Волынцево (д.; 137; 642), Быстринское общество (д.; 79; 405). **Красулинский с/с:** Красулино (д.; 74; 404), Малые Шарипы (с.; 92; 543), Большие Шарипы (д.; 104; 596), Колотилы (д.; 48; 323), Юрково (д.; 48; 308), Верещаки (колония; 54; 269), Поташи (д.; 45; 311), Пьяньково (д.; 34; 217), Широкие (д.; 31; 187), Теплухи (д.; 18; 118), Лугины (д.; 28; 155), Филиппово (д.; 47; 296). **Сеньковский с/с:** Сеньково (д.; 55; 304), Ректа (д.; 120; 680), Попковка (д.; 39; 215), Шеваровка (д.; 45; 252), Ульяшино (д.; 59; 343), Глиньково (д.; 59; 279), Шишево (д.; 95; 543), Холмы (д.; 61; 372), Масалыки (д.; 103; 564), Саса (с.; 117; 602), Выселки Сава (с.; 14; 78), Орлы (д.; 13; 77), Орловщина (д.; 10; 64), **Любижский с/с:** Любиж (с.; 146; 880), Сальники (фольварок; 25; 145), Осиповичи (д.; 66; 360), Гулидовка (д.; 72; 475), Любижский (фольварок; 35; 206), Чепелинка (д.; 91; 488), Ходоровка (д.; 73; 416), Овсянка (д.; 82; 445), Кривцы (д.; 54; 288), Тимоховка (д.; 59; 376), Душки (д.; 74; 407), Душки

(фольварок; 1; —). **Ленинский с/с:** Ленино (местечко; 168; 4138), Тригубово (д.; 71; 407), Моисеево (д.; 55; 336), Сысоево (д.; 51; 326), Пузики (д.; 62; 388), Логовино (д.; 70; 423), Ботвиньево (д.; 45; 275), Коровяки (д.; 53; 354), Старина (д.; 54; 237), Чистики (д.; 48; 273), Николенка (д.; 27; 174), Староселье (д.; 75; 465), Ползухи (д.; 47; 287). **Ходоровский с/с:** Ходоровка (д.; 82; 335), Асталопово (д.; 36; 200), Скаковщина (д.; 33; 187), Климатичи (д.; 34; 214), Гущино (д.; 53; 355), Каменка (д.; 54; 303), Сорокопуды (д.; 51; 308), Стефаново (фольварок; 31; 201), Городец (с.; 89; 481), Полишино (д.; 65; 326), Першино (д.; 96; 499), Межевичи (д.; 13; 72), Новоселки (д.; 13; 97), Буда (д.; 65; 351). **Паленский с/с:** Паленки (д.; 70; 407), Селец (с.; 108; 591), Старый Селец (фольварок; 3; 176), Полна (д.; 37; 222), Ташевая (д.; 54; 295), Лихачево (д.; 39; 200), Гривец (д.; 41; 258), Кукшиново (д.; 32; 199). **Городской с/с:** Горки (город; 470; 4458), Слобода Казимировская (314; 1530), Заречье (208; 1611), Особняки (29; 162). **Рудковщинский с/с** (Оршанский район): Рудковщина (д.; 28; 133), Валовцы (д.; 60; 365), Ермаловка (д.; 86; 508), Козлы (д.; 44; 199), Радионовка (д.; 62; 359), Харьковка (д.; 39; 224), Зубры (д.; 78; 447), Зубры (ж.-д. ст.), Лысая Слобода (д.; 42; 205).

Беларускі дзяржаўны архіў, ф. 30, воп. 2, спр. 6016, л. 16, 18—21, 42. Прадставіла В. Князева.

КАЛГАСЫ ГОРАЦКАГА РАЁНА

21 сакавіка 1932 г.

Маслакоўскі с/с: «Камінтэрн», Маслакі (колькасць гаспадарак 65; колькасць усёй зямлі 635 дзес.), «Авангард», Кустаўка (25; 367), «Чырвоная Ферма», Ферма (21; 156), «Чырвонае звяно», Варкава (58; 596), «Чырвоны Клін», Н. Стрыкілі (19; 212), «Новае жыццё», Напраснаўка (13; 131), «Чырвоная Альхоўка», Альхоўка (15; 141), «Чырвоная Каменка», Каменка (13; 117), імя Варашылава, Тудараўка (30; 274), «Звязда», Чэпелеўка (44; 453), «Прасвет», Трасное (33; 390), «Савецкая Беларусь», Бася (13; 102), «Чырвоны Зімнік», Зімнік (28; 286), «Барсукі», Барсукі (10; 113). **Пакуцянскі с/с:** «Чырвоная звязда», Пічаўка (18/1; 187), VI Раз'езд, Галалобаўка (31/1; 393), «Ленінскі прызыў», Цёмны Лес (16/1; 195), «Пабеда», Шаблавое (31; 281), «Чырвоны куст», Гантоўля (13; 148), «Майская кветка», Еськаўка (23; 178), «Чырвоны ўдарнік», Патошня (17; 210), **Гарадзецкі с/с:** «Майскае утра», Язычкава (13/1; 96), «Полымя», Гарадзец (31/3; 245), «Чырвоны ўдарнік», Ярыгі (19/1; 148), «Пражэктар», Крукаўшчына (21/9; 233), «Міхееўка», Міхееўка (12/1; 80), «Чырвоная змена», Асінаўка (34; 221). **Кледнявіцкі с/с:** «Чырвоны ўсход», Мядзведзеўка (15; 151), «Чырвоная горка», Нікольск (54/5; 477), «Пралетперамога», Мядзведзеўка (36; 363), «Чырвоная кветка», Мядзведзева (40/2; 293), «III-ці рашаючы», Кледнявічы (20; 172), «Колас № 1», Нікольск 4 (17/5; 172). **Гаспадаўскі с/с:** «Рассвет», Жэвань (32; 355), «Майскі дзень», Трылесіна (32; 262), «Чырвоны багатыр», Сласцёны (12; 154), «Зерня», Губіна (24; 281), «Чырвоны сад», Бір (14; 226), «Бальшавік», Барадзенкі (31/4; 154), «Чырвоная змена», Гасподы (13/2; 238), «Чырвоны гай», Навасёлкі (5; 44), «Камінтэрн», Жэвань (8; 107). **Чурылаўскі с/с:** «Новы свет», Чурылава (50/12; 610), «Іскра», Студзянец (60/4; 658), «Чырвоны луч», Ходаравічы (14/1; 468), «Новы шлях», Рудня (34; 260), «Першага», Пнеўшчына (52; 378), «Новы быт», Галенкі (56; 454), «Садок», Студзянец (21; 295), «Новае жыццё», Пясочня (34; 370), «Аганёк», Буда (47/2; 360), «Гарадок», Чапляеўка (31; 195), «Ярцаўка», Ярцаўка (28; 304), «Лянполле», Лянполле (14; 208), «Першага Мая», Копцеўка (20; 124), «Пралетары», Копцеўка (20; 119). **Карэбскі с/с:** «Чырвоны луч», Халіпы (15/1; 183), «Колас № 2», Карэбы (35; 316), «Першага Мая», Бестрынь (40; 303), «Вольны труд», Панеча (23; 274), «Камбайн», Палоскі (6/1; 79), «Новая сіла», Ляскаўка (10; 49). **Дрыбінскі с/с:** «Зарава», Лядзешня (32/2, 387), «III-ці рашаючы», Новае Прыбужжа (24/2; 162), «Шлях Ільіча», Дрыбін (28/5; 359), «Чырвоны стралок», Стары Дрыбін (40/10; 296), «Чырвоны пахар», Старакожаўка (38/3; 313), «Прагрэс», Старое Прыбужжа (14; 115). **Бельскі с/с:** «Праўда» (камуна), Кішчыцы (24; 224), «Чырвоны баявік», Рабкі (48; 571), «Зарава», Кішчыцы (39; 310), «Чырвоны ўсход», Засценкі Белыя (23; 275), «Ударнік», Чартоўшчына (23; 134), «Чырвоны сцяг», Белая (12; 181). **Кацялёўскі с/с:** «Вясёлае жыццё», Сураўцова (24; 262), «Праўда», Кацялёва (34/1; 459), «Сацыялізм», Турышчава (60/4; 527), «Бальшавік», Мікуліна (25; 223), імя Будзённага, Задарожжа (76; 660), «Труд», Славікі (33; 281), «Чырвоная Беларусь», Кварцяны (50/1; 435), «Спартак», Буда (27; 360), «Чырвоны Кастрычнік», Кацялёва (43; 426), «За ўладу Саветаў», Малое Марозава (35; 272), імя Леніна, Вялікае Марозава (47/1, 565). **Горацкі гарсавет:** «Шлях сацыялізму», Горнае (50/7; 344), «Чырвоны ўсход», Зарэчча (123/4; 652),

імя с/г Акадэміі, Слабада (80; 481), **Ракцянскі с/с:** «Чырвоны асветнік», Рэкта (48/3; 457), «Культура», Шышава (87/7; 645), імя Молатава, Сенькава (62/3; 490), «Новае жыццё», Ульяшына (17; 129), «Чырвоны сад», Глінькава (24/5; 211), імя Варашылава, Шэвароўка (44; 225), «Чырвоны трактар», Халмы (21; 181), «Чырвоны пахар», Папкоўка (18; 130), «Чырвоны партызан», Чапялінка (59/4; 455), **Ліхачоўскі с/с:** «Чырвоны батрак», Сялец (75; 883), «Ударнік», Паўна (Пална) (34; 329), «Маяк», Грывец (30; 290), «Заветы Ільіча», Ліхачова (35; 277), «Чырвоная зорка», Арлоўшчына (12; 157), «Камуністычны шлях», Ташэвая (17; 169), «Варашылавец», Дыбоўскія (19; 138), «Барацьба», Паленка (13; 126). **Любіжскі с/с:** «Чырвоны барацьбіт», Шэды (36; 198), «Чырвоная перамога», Ходараўка (54; 575), «Чырвоны шлях», Сальнікі (22; 257), «Вазраждзеніе», Любіж (28; 280), «Чырвоны партызан», Крыўцы (33; 243), імя Варашылава, Гулідаўка (34; 168), «Авангард», Душкі (52; 519). **Паршынскі с/с:** «Красавік», Каралёўка (13/1; 142), «Серп і молат», Пуплы (35; 335), «Чырвоны Кастрычнік», Паляшэвіцы (90/1; 894), імя Кастычніцкай рэвалюцыі, Азаравічы (32/2; 357), «Звяно камуны», Целяшоўка (22; 145), «Прамень», Паршына (29/1; 287), «Новы Свет», Кузавіна (14; 151), «Адказ шкоднікам», Нівішчы (59/1; 646), **Панкратаўскі с/с:** імя Варашылава, Тушкава (15/1; 111), «Праўда», Рэкатка (22/1; 166), «Першага», Галышына (19/1; 186), «Пэўны шлях», Добрае (16; 132), «Чарны», Чарны (10; 99), «Бальшавік», Панкратаўка (24/4; 176), «Гошч», Гошч (8; 41), «Чырвоны партызан», Стан (10; 89), «Чырвоная зорка», Балбечына (10, 133). **Шарыпскі с/с:** імя Красіна («Серп і молат»), Калацілы (30/1; 244), «Шлях волі», Шарыпы (48; 432), «Авангард», Шарыпы (67; 624), «Камінтэрн», П'янькава (63; 427), «Новы шлях», Верашчакі (17; 157), «Сталінскі прызыў», Масалыкі (20; 197), «Максім Горкі», Паташы (53/1; 315), «Чырвоны луч», Юркава (47; 479), «Пяцігодка», Сава (22; 212), «Рассвет», Красуліна (55/1; 599), «Чырвоны камбайн», Маралеўка (21; 193). **Ленінскі с/с:** «Новае жыццё», Леніна (75; 530), «Таварыш», Жаўлачоўка (46/2; 657), «Зара», Маісеева (42; 479), «Ясная раніца», Трыгубава (57; 547), «Надзея», Старына (28; 430), «Пабеда», Каравякі (16; 270), «Зорка сацыялізму», Сысоева (30; 367), «Маяк», Пузікі (39; 552), «Новы будаўнік», Логавіна (52; 656), «Рабочы шлях», Ніколенка (16; 242), імя Сталіна, Старасселле (63; 783), «Сталінец», Бацвіннева (17; 183), «Авангард», Чысцікі (5/1; 88), «Свабода», Паўзухі (26/1; 310). **Асталопаўскі с/с:** «Камунар», Канюхі (94/4; 783), «Ленінскі шлях», Андзекалава (115; 1456), «Колас», Гарадзец (72; 719), «Пабедзіцель», Асталопава (64; 565), «Чырвоны маяк», Буда (20; 270), «Камінтэрн», Скакоўшчына (30; 335), «Варашылавец», Лукі (48/2; 410). **Каменскі с/с:** імя Молатава, Палішына (46; 574), «Клім Варашылаў», Ходараўка (60; 681), «Чырвоны ўсход», Альхавец (27; 349), «Першамайскі № 2», Першына (40/4; 434), «Барацьба», Гушчына (26; 435), «Шлях Леніна», Каменка (27; 325), імя Парыжскай Камуны, Саракапуды (16; 148), імя Калініна, Малькі (14/2; 146), «Новы шлях», Шаўнева (46/3; 548), «Барэц за пяцігодку», Аршань (11/4; 107), «Чырвоны марак», Акушкі (28/2; 403). **Макараўскі с/с:** «3-ці Інтэрнацыянал», Воўкаўшчына (34; 372), імя Сталіна, Шалаханаўка (20; 227), «Пабеда», Нежкава (68; 794), «Камінтэрн», Андрухі (48; 527), імя Молатава, Шырокія (29; 438), «Чырвоны трактарыст», Чашнікі (44; 603), «Новы шлях», Філіпава (44; 563), «Ленінскі», Лугіны (34; 290), «Першамайскі № 3», Цяплухі (14/1; 138), імя Пагодзіна, Куртасы (33; 456), «Звязда», Зайцава (18; 370), «Кааператыўны шлях», Шыманоўка (24; 198), «Арлы», Арлы (19; 153). **Горскі с/с:** «Першамайскі № 1», Нікадзімава (55/1; 434), «Барэц Аршаншчыны», Лебедзева (43/2; 517), «Дзям'ян Бедны», Лебедзева (17; 202), «Раннія ўсходы», Валынцава (76; 732), імя Сталіна, Высоцкія (17; 174), «Кастрычнік», Быстрыя (32; 406), «Запруддзе», Запруддзе (32; 300), «Шлях сацыялізму», Сакалова (34/1; 315), «Новая Слабада», Слабада (41/2; 607), «Новае Курганне», Курганне (88; 839).

Беларускі дзяржаўны архіў, ф. 338, воп. 1, спр. 323, л. 15–18. Прадставіла В. Князева.

З ПАВЕДАМЛЕННЯ СТАРШЫНІ СНК БССР М. М. ГАЛАДЗЕДУ

1933 г.

В октябре 1933 года Райтройка: зам. предРИКА Городецкий, начальник Горецкого ГПУ Вольфсон, райпрокурор Дыкман сообщили Председателю Совнаркома БССР тов. Голодеду, что по Горецкому району репрессировано хозяйств с конфискацией имущества с 1931 по октябрь 1933 года, семьи и отдельные члены их семей, которые проживают на территории Горецкого района: а) кулацких хозяйств 88, б) зажиточных 25, в) середняцких 11, г) бедняцких 1. Всего 125 хозяйств.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 205, воп. 1, спр. 390, л. 210.

Помнік С. Дз. Пагодзіну.

Іх выклікаў час

У віхуры бурных гістарычных падзей нараджаюцца героі, вартыя людской памяці. Нялёгкае, поўнае барацьбы жыццё пражылі гэтыя людзі. Яны верылі ў ідэалы рэвалюцыі і, не шкадуючы сябе, змагаліся за іх ажыццяўленне. С. Дз. Пагодзіну бальшавікі даручылі арганізацыю атрада Чырвонай гвардыі. З першых дзён у ваеннае фарміраванне ўступілі А. Фабрыстаў, І. Ларчанка, І. Ганчароў, М. Шумоўскі, М. Чуба, Ф. Маслоўскі, К. Доманаў, І. Хліманкоў і інш.

ЛАРЧАНКА Іван Макаравіч, н. у 1898 г. у Горках. З сялян. У 1913 г. працаваў у майстэрні Горацкага рамеснага вучылішча, у 1916 г. прызвалі ў царскую армію на румынскі фронт. Пасля рэвалюцыі ў Петраградзе прыехаў у Горкі, уступіў у атрад Чырвонай гвардыі. У 1919 г. разам з атрадам чырвонагвардзейцаў накіраваны ў армію на барацьбу з Дзянікіным. У 1920 г. быў паранены і дэмабілізаваны. З пачатку 1921 г. у Горацкай павятовай Надзвычайнай камісіі, у 1924 г. на гаспадарчай рабоце, з 1935 г. па 1941 г. інструктар пажарнай аховы ў акадэміі. У гады Вялікай Айчыннай вайны служыў у пажарных часцях. Пасля вайны працаваў начальнікам пажарнай аховы.

МІРОНАЎ Дзмітрый Кірылавіч, н. 23.9.1895 г. у в. Ордаць Горацкага павета Магілёўскай губерні — 26.10.1923, удзельнік барацьбы за Савецкую ўладу ў Магілёўскай губерні. З рабочых. Член партыі з 1918. З 1914 у арміі. З 1916 г. вёў рэвалюцыйную работу сярод студэнтаў у Горках, у 1917 г. адзін з кіраўнікоў устанаўлення Савецкай улады ў Горацкім павеце. У 1918 г. удзельнік падаўлення контррэвалюцыйнага мяцяжу ў Горках, потым старшыня Горацкага павятовага выканкома. З 1922 г. старшыня Гомельскага губернскага саюза спажывецкай кааперацыі і член губкома РКП(б). Яго імем названа вуліца ў Магілёве.

ПАГОДЗІН Сцяпан Дзям'янавіч, н. у 1890 г. у в. Гушчына Горацкага павета Магілёўскай губерні — 15.3.1918, удзельнік барацьбы за ўладу Саветаў на Беларусі. З сялян. Рэвалюцыйную дзейнасць пачаў у Данбасе, удзельнік дэманстрацый і забастовак шахцёраў Юзаўкі. У першую сусветную вайну ў арміі, вёў рэвалюцыйную прапаганду. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Горках. Адзін з арганізатараў атрада Чырвонай гвардыі (80 чалавек), які ўстанаўліваў Савецкую ўладу ў павеце, павятовы ваенком. У сакавіку 1918 г. у час барацьбы з контррэвалюцыяй у Горках забіты. Пахаваны на радзіме. Яго імем названы чыгуначная станцыя, вуліца ў Горках, калгас.

ФАБРЫСТАЎ Антон Фёдаравіч, н. у 1892 г. у Горках — 1937 г. З сялян. З 1915 г. на фронце, з 1918 г. у ваенным камісарыяце ў Горках. З сярэдзіны 1919 г. зноў на фронце. Працаваў на гаспадарчай рабоце. З 1930 г. у Горацкім Асаавіяхіме. Быў рэпрэсіраваны, рэабілітаваны ў 1958 г.

ЦЫРКУНОЎ Фама, ураджэнец Горацкага павета. Працаваў у Горацкім ваенным камісарыяце. З лета 1918 г. у павятовым земаддзеле. Працаваў

А. Ф. Фабрыстаў.

старшынёй выканкома Чавускага павета. Калі пачалася польская інтэрвенцыя, добраахвотнікам уступіў у Чырвоную Армію. 8 ліпеня 1920 г. у баі пад мястэчкам Далгінава загінуў смерцю храбрых.

МІХАІЛ СЯРГЕЕВІЧ МАНДРЫКАЎ

Міхаіл Мандрыкаў вучыўся ў Горацкім рамесным вучылішчы. Але за ўдзел у дэманстрацыі 16 студзеня 1905 г. аказаўся ў ліку выгнаных з вучылішча. Пошукі работы прывялі яго ў Пецярбург, дзе ўладкаваўся на Пуцілаўскі завод. Неўзабаве падышоў тэрмін прызыву на ваенную службу. Мандрыкаў трапіў на флот і быў залічаны на мінаносец «Грамавой». У хуткім часе яго перавялі на крэйсер «Алег» механікам машыннага аддзялення.

Пасля дэмабілізацыі прыехаў дадому ў мястэчка Горы. Бацька марыў, што сын застанецца працаваць у кузні. Але М. Мандрыкаў паехаў на Далёкі Усход. Наведваў нядзельныя чытанні, лекцыі, канцэрты, якія праходзілі ў Народным доме. Там вялася і нелегальная работа. Уступіў у рабочы кааператыў «Эканаміст» і хутка стаў членам праўлення, а затым і першым старшынёй саюза прыамурскіх кааператываў.

18 ліпеня 1916 г. адзін з правакатараў данёс ахранцы пра першую сходку, якую арганізавалі сацыял-дэмакраты 17 ліпеня.

У канцы 1916 г. ахраннае аддзяленне вырашыла расправіцца з членамі РСДРП. Быў зроблены «спіс асоб, якія падлягаюць ліквідацыі». Але да Уладзівастока дакацілася рэха лютаўскай рэвалюцыі.

У кастрычніку 1917 г. М. С. Мандрыкаў прыехаў у Петраград. Ён прымаў удзел у рабоце III Усерасійскага з'езда Саветаў. А ў ліпені 1918 г. зноў працуе ва Уладзівастоку. Аднак у жніўні 1918 г. яго арыштавалі і кінулі ў канцлагер. У дажджлівую жнівеньскую ноч 1919 г. Мандрыкаў з таварышамі ўцяклі з канцлагера. Нейкі час ён хаваўся ва Уладзівастоку. А потым невялікі параход «Табольск» накіраваўся на поўнач Далёкага Усходу. Сярод пасажыраў знаходзіліся Сяргей Яўстаф'евіч Бязрукаў і Дзмітрый Марцінавіч Хваан. Пад гэтымі імёнамі хаваліся Міхаіл Сяргеевіч Мандрыкаў і яго новы знаёмы — Аўгуст Марцінавіч Берзін, латыш з горада Цесіс.

Праз некалькі дзён яны пачалі працаваць. Мандрыкаў уладкаваўся прыказчыкам на прадуктовым складзе і хутка стаў адным з кіраўнікоў падпольнай групы. Група вырашыла захапіць уладу і абвясціць перамогу Савецкай улады. Выступаць вырашылі ў ноч з 15 на 16 снежня.

Раніцай 16 снежня 1919 г. над будынкам былой павятовай управы лунаў чырвоны сцяг. У Анадыры перамагла Савецкая ўлада. Быў выбраны першы рэвалюцыйны камітэт Чукоткі. У яго ўвайшлі прадстаўнікі розных нацыянальнасцей. Старшыня Міхаіл Мандрыкаў — беларус, сакратар Міхаіл Куркуцкі — чуваш, яго намеснік Аляксандр Булат — літовец, камісар народнай аховы А. Берзін — латыш, камісар радыёстанцыі В. Цітоў — рускі, член рэўкома Якуб Мальсагаў — асецін, Сямён Грынчук — украінец, Мікалай Каліноўскі — камчадал і Арэнс Вольтар — нарвежац.

У канцы студзеня 1920 г. Анадыр апусцеў. Паляўнічыя пайшлі ў тундру на промысел пясца, а рыбакі адправіліся на падлёдную лоўлю. У гэты час контрэвалюцыйныя сілы арганізавалі контрэвалюцыйную групу.

Раніцай 31 студзеня, калі рэўкому стала вядома аб змове, было прынята рашэнне аб увядзенні асаднага становішча ў Анадыры. У час экстранага пасяджэння рэўкома раздаліся выстралы, адна з куль трапіла ў галаву Цітова, паранілі яшчэ двух таварышаў. М. С. Мандрыкаў, бачачы, што супраціўленне немагчыма, вырашыў здацца, каб выйграць час. А магчыма, ён думаў, удасца ўцячы з-пад арышту. Арыштаваных зачынілі ў цёмны хлеў, дзе пратрымалі двое сутак без ежы і вады.

2 лютага 1920 г. рэўкомаўцам аб'явілі што іх хочуць перавесці ў турму, якая знаходзіцца на другім беразе ракі Казачкі. Калі арыштаваныя ступілі на лёд, варта хутка разбеглася ў бакі, а з акон берагавых будынкаў пачалася страляніна.

Расправіўшыся з рэўкомам, бандыты зрабілі засаду і сталі чакаць вяртання групы Берзіна. 8 лютага яны былі схоплены і расстраляны. У Анадыры быў створаны белагвардзейскі «савет», аднак ён праіснаваў нядоўга. У чэрвені 1920 г. над Анадырам зноў узняўся чырвоны сцяг. Пасёлак быў вызвалены атрадам чырвонагвардзейцаў.

Імя М. С. Мандрыкава носяць вуліцы ў г. Анадыры і г. Горкі, залатыя прыскі. У Анадыры і ў в. Горы ўстаноўлены помнік.

У. Ліўшыц.

Арганізоўвалася моладзь

5 сакавіка 1917 г. у Горках быў выбраны першы Савет рабочых і сялянскіх дэпутатаў, арганізаваны выканаўчы камітэт з 15 чалавек. Як паведамляла газета «Горецкий вестник» (№ 24 за 1917 г.), 6 сакавіка 1917 г. на мнагалюдным сходзе навучэнцаў і моладзі Горак было вырашана патрабаваць уключыць у выканком прадстаўнікоў моладзі. На наступны дзень 6 навучэнцаў былі ўключаны ў састаў выканкома. З рэвалюцыйнай моладзі была сфарміравана міліцыя. 10 сакавіка 1917 г. студэнты арганізавалі маніфестацыю ў Мар'іным гаі. Выступіў былы палітзняволены Гарбачоў. На маніфестацыі арганізавалі збор грошай на карысць ахвяр рэвалюцыі.

Увосень 1918 г., у перыяд арганізацыі камітэтаў беднаты сталі стварацца Саюзы моладзі і клубы сельскай моладзі.

У сакавіку 1919 г. войскі буржуазна-памешчыцкай Польшчы пачалі наступленне на Літву і Беларусь. 20 мая 1919 г. ЦК камсамола Літвы і Беларусі звярнуўся да ўсіх камсамольцаў і моладзі рэспублікі стаць на абарону Савецкай Радзімы.

У першыя дні пасля мабілізацыі камсамольская арганізацыя Горак паслала на фронт 19 камсамольцаў. Аўтару вядомы імёны двух. Гэта А. С. Новікаў і І. І. Шміт.

Горацкія камсамольцы прымалі ўдзел у кампаніях па аказанню дапамогі фронту і інш.

У. Ліўшыц.

Па старонках газет

«ГОРЕЦКИЙ ВЕСТНИК»

2 января 1918 г.

28 декабря в помещении уездного съезда по инициативе председателя Совета Крестьянских Депутатов Хрисаненкова состоялось собрание представителей 26 различных общественных организаций...

Вначале выступили с небольшими докладами Фабристов и Хоцкий, бывшие на белорусском съезде в Минске...

Единодушия среди выступавших не было: в то время как одни — Кулеша, Иоффе, Цитович — склонялись к мысли о необходимости образования белорусской краевой власти, другие — Харкевич, Мильшин — указывали, что единственный выход из тяжких испытаний общероссийское единение. Резолюции никакой собрание не приняло. В конце Хрисаненков говорил о Ленине, как о производящем опыты над Россией и не признающем Учредительного Собрания.

* * *

Хрисаненков Лукьян Афанасьевич, крестьянин Горецкого уезда, Романовской волости избран кандидатом в Учредительное собрание от крестьян Горецкого уезда. Учился в Киевском коммерческом институте. Окончил Горецкие землемерно-таксаторские классы, после чего работал как землемер в Минской, Смоленской губерниях, в 1905 году примкнул к партии Социалистов-Революционеров. Четыре раза был арестован. После последнего ареста был сослан в Вологодскую губернию. Председатель Горецкого уездного Совета Крестьянских Депутатов и Уездного Земельного Комитета.

«ЛУЧ ИНТЕРНАЦИОНАЛА»

Борьба с неграмотностью

Отделом Наробраза в последнее время развивается усиленная деятельность по ликвидации неграмотности. В Горках открывается школа для неграмотных. Разосланы также по уезду инструктора для налаживания внешкольного образования в деревне и точного учета неграмотных.

«РАБОЧИЙ ПУТЬ»

1922 г.

№ 279

Помогите!

(Письмо горецкого рабкоровца)

Нас бросили сюда учиться, накоплять знания, а о нашем материальном положении не позаботились. Паек получается не вовремя и в мизерном количестве, но и это еще не беда. Главное, что каждого из нас волнует и тревожит — это отсутствие обуви. По снегу, при сильном морозе шагаем мы на лекции или обедать на своих собственных подошвах, натянув сверху остатки сапога.

Простуживаемся, заболеваем, отрываемся от занятий.

Но без сапог, без хлеба, сидя в неотопленной комнате, мы говорим себе:

— Я послан сюда учиться, и буду делать это до тех пор, пока кое-как хватает сил.

Эй, помогите!

Из нас выйдут люди, которые закончат эту гигантскую работу строения коммунистического общества.

Вы, начальники и заведывающие хозяйственными и промышленными органами, вы, имеющие средства, прислушайтесь к этому крику, ибо только нужда и отчаяние вызвали его.

Рабкоровец.

№ 287

В Горках совершенно отсутствуют театры и кинематограф, и служащие и рабочие свободные вечера проводят в пивных да бильярдных. Нардом, ввиду ветхости здания, накануне ремонта, а в сельскохозяйственном институте редко что бывает.

Горецким Угоркоммунотделом производится сейчас ремонт старого кинематографа и через полтора месяца предполагают открыть таковой: аппарат и фильмы уже имеются: это будет единственное развлечение в Горках.

«КАМУНІСТЫЧНЫ ШЛЯХ»

19 лістапада 1925 г.

В сельскохозяйственную академию поступило 8 человек из зарубежной Белоруссии. Работники академии провели сбор в пользу эмигрантов. Поступило 48 р. 50 к. деньгами и некоторое количество одежды.

13 снежня 1925 г.

Вучні Горацкіх асветных курсаў ухвалілі прапанову да 1 снежня гэтага года ўсе школьныя вучнёўскія арганізацыі перавесці на беларускую мову на 100 %, насценгазету на 50 %. Гэта ўхвала ўжо ажыццяўляецца.

12 мая 1928 г.

Пры Горацкай беларускай сямігодцы арганізавана ячэйка «Прыхільнікаў дзяцей». Запісалася ў ячэйку 60 вучняў і 20 настаўнікаў. Праца ячэйкі праходзіць пад лозунгам «Усе на дапамогу беспрытульным дзецям».

І. Сцяпанаў

17 жніўня 1928 г.

Аканчваецца пабудова ветэрынарнай лячэбніцы ў Горках. Пабудова лячэбніцы абыдзецца ў 1000 руб., што складае суму менш асігнаванай на 3500 руб. Гэта дасягнута новай канструкцыяй пабудовы.

Беларуская секцыя вучняў горацкіх сельскагаспадарчых школ

Успаміны М. М. Ганчарыка

ГАНЧАРЫК Міхаіл Мікалаевіч скончыў у 1924 г. Горацкі сельскагаспадарчы інстытут, член-карэспандэнт АН Беларусі, доктар біялагічных навук, прафесар.

Пасля закрыцця ў 1863 г. першай у Расіі вышэйшай агранамічнай школы — Горы-Горацкага інстытута, у Горках засталіся тры сельскагаспадарчыя ўстановы: сярэдняя сельскагаспадарчая, каморніцка-агранамічная школы і сельскагаспадарчае вучылішча.

Атрымаць агранамічныя веды сюды ехалі з Прыбалтыкі, Польшчы, Украіны, Карэліі і інш. З 28 вучняў, прынятых у 1917 г. у першы клас Горацкай сярэдняй сельскагаспадарчай школы, было чатыры латышы, два палякі, адзін карэец, адзін яўрэй, тры ўкраінцы, восем рускіх і дзевяць беларусаў. Прыкладна такі склад вучняў па нацыянальнасці быў і ў іншых класах дзвюх сярэдніх агранамічных школ.

Увосень 1917 г. з'явіўся гурток пад назвай «Беларуская секцыя вучняў горацкіх сельскагаспадарчых школ». Гурток меў статут, які быў зацверджаны Горацкім выканкомам, ён будаваў і праводзіў сваю работу пад кіраўніцтвам павятовага аддзела народнай адукацыі. З самага пачатку дзейнасці гурток праяўляў вялікую актыўнасць у розных напрамках. Вучнёўскі клуб быў забяспечаны беларускай літаратурай, для чытання лекцый запрашаліся маскоўскія прафесары, была выпушчана лістоўка «Як чытаць па-беларуску», дзе даваліся асноўныя асаблівасці беларускай мовы і яе маўлення.

Але найбольш шырокая дзейнасць гуртка праявілася ў тэатральнай справе. Была арганізавана тэатральная група, якая пачала рыхтаваць камедыю Крапіўніцкага «Пашыліся ў дурні». Артысты, пастаноўшчыкі, мастакі і рэжысёры — калектыў з 18 чалавек. Гурткоўцы ведалі, што першая ў Горках пастаноўка на беларускай мове, да якой многія адносіліся адмоўна, павінна быць цудоўнай, бо толькі так можна было прыпыніць тых, хто крычаў, што ніякай беларускай мовы няма, ёсць толькі мужыцкае маўленне рускай мовы. І тэатральны гурток прыклаў вялікія намаганні, каб пастаноўка прайшла паспяхова.

Для многіх было нечаканым тое, што беларуская мова прыгожая і на ёй можна выказваць усе свае пачуцці.

Праз Беларускае аддзяленне Народнага камісарыята гурток атрымліваў з Масквы розную літаратуру на беларускай мове і ў перакладзе на рускую мову, газету «Дзянніца», а з Мінска — газету «Савецкая Беларусь» і інш. У вучнёўскім клубе заўсёды можна было пачытаць свежыя газеты і кнігі на беларускай і рускай мовах.

П'есу «Апошняе спатканне» паставілі ў 1919 г. Потым падрыхтавалі яшчэ шэраг п'ес і сярод іх — «Ганка» У. Галубка.

За перыяд з 1917 па 1925 г. вучнямі, а затым студэнтамі ў Горках было пастаўлена каля 25 спектакляў на беларускай мове.

У 1919 г. Горы-Горацкі інстытут быў адноўлены. Большасць вучняў з «Беларускай секцыі» сталі студэнтамі, і таму секцыя пачала называцца «Беларускай секцыяй студэнтаў Горацкага сельгасінстытута».

Беларуская секцыя студэнтаў Горацкага сельскагаспадарчага інстытута

15 кастрычніка 1919 г. быў зацверджаны статут, паводле якога Беларуская секцыя студэнтаў Горацкага сельскагаспадарчага інстытута мела задачы «пашыраць свядомасць паміж беларусамі, знаёміць з літаратурай, тэатральнымі творамі, гісторыяй, культурным і эканамічным становішчам Беларусі і дапамагаць беларускаму нацыянальнаму руху захопліваць шырэйшыя народныя праслоі». Ініцыятарамі стварэння секцыі былі Г. Гарэцкі, С. Журык, Я. Чарняўскі. Пры секцыі існавалі аддзелы: гісторыка-эканамічны, літаратурны, музычны, чыстага мастацтва. Члены драматычнага аддзела (кіраўнік І. Каяла) інсцэніравалі паэму «Тарас на Парнасе», ставілі п'есы Ф. Аляхновіча, У. Галубка, В. Дуніна-Марцінкевіча, Я. Купалы і інш. Заснавалі беларускія драматычныя гурткі ў навакольных вёсках. Сябры секцыі выступалі перад сялянамі

Горацкага павета па беларускім нацыянальным пытанні, наладжвалі культурныя і навуковыя мерапрыемствы. У 1918 г. выдалі лістоўку для сялян «Як чытаць па-беларуску», у 1919 г. займаліся ўкладаннем беларускай тэрміналогіі па сельскай гаспадарцы, апрацоўкай і перакладам на беларускую мову сельскагаспадарчай літаратуры для сялян, у пачатку 1920-х гадоў сябры секцыі складалі «Беларускі батанічны слоўнік». У 1918—20 гг. палітычная платформа секцыі ў асноўным супадала з платформай Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў. 8.4.1920 г. зарэгістравана ў Горацкім павятовым аддзеле народнай асветы, 8.7.1921 г. — у кіраўніцтве інстытута. У 1918 г. кантактавала з Беларускім нацыянальным камісарыятам, у 1920-я гады з Беларускім Цэнтральным Бюро пры Народным камісарыяце асветы РСФСР, з Інбелкультам.

У 1920—22 гг. супрацоўнічала з гурткамі «Беларуская моладзь» у Мінску, «Асвета» ў Магілёве, разам з беларускай культурна-навуковай асацыяцыяй пры Пятроўскай сельскагаспадарчай акадэміі рыхтавала да друку часопіс «Беларускі гаспадар». Летам 1922 г. прадстаўнікі секцыі ўдзельнічалі ў канферэнцыі пралетарскага студэнцтва БССР у Мінску. З 1922 г. старшыня секцыі — М. Ганчарык, сакратар — Я. Грушэўскі. Вясной 1923 г. па заданні павятовага аддзела асветы распрацоўвала план-сетку па пераводзе некаторых школ Горацкага павета Смаленскай губерні на беларускую мову навучання. Супрацоўнічала з перыядычнымі выданнямі Горак, Мінска, Вільні. На працягу ўсяго існавання рабоце секцыі перашкаджалі рускія вялікадзяржаўныя шавіністы і асобы, якія варожа ставіліся да беларускага нацыянальнага адраджэння. Непрыхільную пазіцыю займалі мясцовыя партыйныя, камсамольскія і савецкія органы. Ранні перыяд дзейнасці секцыі адлюстраваў М. Гарэцкі ў аповесці «Дзве душы» ў вобразах Міколы Канцавога, Сухавея, Іры Сакавічанкі. Спыніла існаванне пасля далучэння Горацкага павета да БССР, бо паводле тагачаснага заканадаўства БССР дзейнасць створаных па нацыянальнай прыкмеце арганізацый не дазвалялася.

Ю. Васілеўскі.

Друкуецца па кн.: Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 1. Мн., 1993. С. 414.

З гісторыі Горацкага краязнаўчага таварыства

7 снежня 1924 г. у Горках было ўтворана раённае таварыства краязнаўства. У аўдыторыі імя Фрунзе акадэміі сабраліся на свой устаноўчы сход краязнаўцы. Праз год у таварыстве налічвалася ўжо 363 сябры: 15 прафесараў, 18 выкладчыкаў, 220 студэнтаў і 110 настаўнікаў[1].

16 красавіка 1925 г. з раённага таварыства вылучылася новая арганізацыя пад назвай «Навуковае таварыства па вывучэнню Беларусі», якая, як навукова-даследчая ўстанова, увайшла ў склад Інбелкульта. Але яе шматлікія сябры прадаўжалі працаваць і ў раённай краязнаўчай арганізацыі.

Раённыя краязнаўцы пад кіраўніцтвам прафесара П. Ц. Салаўёва за 1925—27 гг. правялі 17 сходаў таварыства, дзе заслухалі 39 навуковых дакладаў, прысвечаных вывучэнню прыроды, эканомікі і гісторыі раёна. Свае матэрыялы яны друкавалі ў газетах «Звязда», «Савецкая Беларусь», часопісе «Наш край».

Найбольш значныя артыкулы друкаваліся ў «Працах навуковага таварыства па вывучэнню Беларусі». Так, у першым томе (1925 г.) былі змешчаны артыкулы А. Ц. Савельева «Вапна і матыльковыя расліны на глебах Горацкага раёна», С. Журыка «Быдла Горацкага раёна», С. П. Мельніка «Стары парк пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі сельскай гаспадаркі».

Вывучэнню гісторыі этнаграфіі, эканомікі, прыроды Горацкага павета цалкам быў прысвечаны трэці том, што выйшаў у 1927 г. Тут былі змешчаны артыкулы Д. Васілеўскага «Кароткі нарыс гісторыі Горацкага раёна і Горак», «Народная асвета ў Горацкім раёне», М. Сраговіча «Яўрэйскае насельніцтва ў Горацкім раёне», Н. Пелехава «Аб становішчы сялян Горацкага раёна ў першай палове мінулага стагоддзя». Цікавыя матэрыялы аб глебах, геалагічнай пабудове, фауне і флоры, лясах Горацкага раёна надрукавалі Ф. Люнгэрзгаўзен, Н. Пелехаў,

Г. Несцярчук, П. Салаўёў, У. Васількоў і інш.[2] Сярод аўтараў былі як навуковыя супрацоўнікі, так і настаўнікі школ раёна. Краязнаўчыя матэрыялы друкаваліся і ў пятым — восьмым тамах таварыства. Праца раённых краязнаўцаў атрымала высокую адзнаку ў Мінску і Маскве. У прывітанні Цэнтральнага Бюро краязнаўства РСФСР, якое было падпісана акадэмікам М. Я. Марам, адзначалася: «Цэнтральнае Бюро краязнаўства РСФСР з вялікай цікавасцю сочыць за поспехамі працы Горацкага таварыства, якое па вестках яго старшыні, прафесара П. Ф. Салаўёва, з'яўляецца сталым карэспандэнтам ЦБК, паведамляючы аб поспехах краязнаўчай працы на Беларусі...»[3]

Аднак у хуткім часе краязнаўчая праца была згорнута. Было распушчана ў Мінску Цэнтральнае бюро краязнаўства, у 1933 г. перастаў выходзіць часопіс «Савецкая краіна» (так з 1930 г. называўся часопіс «Наш край»). Горацкае краязнаўчае таварыства было таксама ліквідавана.

[1] Запіскі Беларускай дзяржаўнай акадэміі сельскай гаспадаркі. Т. 6. Горкі, 1928. С. 84.
[2] Працы навуковага таварыства па вывучэнню Беларусі. Т. 3. Горкі, 1927.
[3] Запіскі Беларускай дзяржаўнай акадэміі сельскай гаспадаркі. Т. 6. Горкі, 1928. С. 84.

У. Ліўшыц.

Горацкія маладнякоўцы

У Оршы існавала філія «Маладняка». Аб тым, як яна стваралася, расказаў М. М. Ганчарык, які пасля вучобы ў Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі быў прызначаны загадчыкам Аршанскага акруговага аддзела народнай асветы: «Не памятаю дакладна, але, здаецца, у сакавіку, да мяне прыехалі К. Крапіва і У. Дубоўка. З імі я ўжо быў знаёмы па паездках у Мінск і па наведванню рэдакцыі газеты «Советская Белоруссия», дзе я сустракаўся з З. Жылуновічам, М. Чаротам, З. Бядулем і інш.

Крапіва і Дубоўка звярнуліся да мяне з прапановай — арганізаваць філію «Маладняка». Такія філіі ўжо былі ў некаторых акругах, і ім было даручана арганізаваць такую ж у Оршы. У гэты час у Оршы працаваў рабфак, якім кіраваў Акулік, загадчыкам вучэбнай часткі быў Сташэўскі. Я звязаўся з імі. Мы пагутарылі са студэнтамі, сярод якіх быў «знойдзены» Тодар Кляшторны і два-тры хлопцы, якія пажадалі ўдзельнічаць у будучым «Маладняку». Кіраўніцтва было сфарміравана ў саставе членаў праўлення Сташэўскага і Кляшторнага. Мяне прызначылі старшынёй філіі. Было вырашана выдаць і першы нумар часопіса «Аршанскі маладняк» (1925 г.). Праз тры месяцы літаратурныя матэрыялы для першага нумара былі гатовы і надрукаваліся за кошт сродкаў аддзела народнай адукацыі. Мной у гэтым нумары былі напісаны нарыс «Аб творчасці М. Багдановіча» і верш «Усміхаючыся сонцу ў вочы» пад псеўданімам Я. Савец. Амаль усё астатняе было напісана У. Дубоўкам, акрамя байкі «Не будзе горшай» К. Крапівы.

Да пачатку 1926 г. я вярнуўся на працу ў Горкі ў якасці асістэнта кафедры фізіялогіі раслін. І ўся асноўная літаратурная работа па гуртку была перанесена ў Горкі. Часопіс «Аршанскі маладняк» друкаваўся ў друкарні БСГА. З'явіліся і новыя аўтары — члены філіі Ю. Гаўрук, В. Каваль, У. Прыбыткоўскі, А. Вечар і інш.»

У горацкі перыяд філіі «Маладняка» пачаліся рэгулярныя літаратурныя сходы, друкаваліся новыя работы маладнякоўцаў.

Выйшла ўсяго сем нумароў часопіса «Аршанскі маладняк». У горацкі студэнцкі гурток аршанскай філіі «Маладняка» ўваходзілі: Вечар, Мурашка, Чыжанок, Прыбыткоўскі, Каляда, Мятко, Сяргейчык, Ганчарык (кіраўнік), Каваль, Гаўрук, Дземідовіч і інш.

З апошняга, сёмага нумару за 1928 г. мы даведаліся, што 12 лютага 1928 г. у Горках адбылася акруговая канферэнцыя аршанскай філіі «Маладняка». Прадстаўнік часовага кіраўніцтва Васіль Каваль зрабіў даклад аб стане маладнякоўскага руху на Беларусі. Было вырашана падтрымаць ідэю аб уваходзе «Маладняка» ва Усесаюзную Асацыяцыю пралетарскіх пісьменнікаў.

У. Ліўшыц.

Горацкі павет у 1924 г.

Горацкі павет быў адным з самых заселеных паветаў тагачаснай Беларусі. На 1 квадратную вярсту тут прыходзілася ў сярэднім 58,15 чал. (па другіх даных нават 63 чал.), у той час як у сярэднім па БССР да 1924 г. было 32,76 чал. Па гушчыні насельніцтва ён уступаў толькі Мінскаму. Таму на адну сялянскую гаспадарку прыходзілася ў сярэднім толькі 9,5 дзес. зямлі. І, відаць, па гэтай прычыне да сярэдзіны 1924 г. у Горацкім і Мсціслаўскім раёнах было распрацавана 55,4 % зямель. Гэта быў самы высокі паказчык на Беларусі. Па інтэнсіўнасці земляробства Горацкі павет прыраўноўваўся да Мінска-Слуцкага, аднак сялянства не магло пазбавіцца ад хранічнага малазямелля і невыпадкова інспектары народнага камісарыята фінансаў Беларусі, якія ў лютым 1924 г. абследавалі Горацкі павет, зрабілі выснову, што, знаходзячыся ў аднаасобным выкарыстанні, землі не забяспечвалі элементарныя патрэбы пасяленцаў, і звярталі ўвагу кіраўніцтва рэспублікі на «незабяспечанасць земляроба зямлёю», на «маларосласць сялянскага каня, убогасць яго збруі, цалкам вяровачнай і часцяком нават зусім без шляі і да т. п.» Таму і сельскагаспадарчы падатак у 1923/24 гаспадарчым годзе сяляне выконвалі вельмі марудна.

Падчас вяртання Горацкага павета ў склад Беларусі узровень развіцця прамысловасці быў невысокі. Аднак усё-такі тут дзейнічала 80 прадпрыемстваў. Гэта былі ў асноўным саматужныя промыслы: бандарныя, вуглепальныя, смалакурныя, і іншыя, звязаныя з апрацоўкай драўніны, а таксама цагельныя, гарбарныя, маслабойныя, кавальскія, шавецкія, мукамольныя, крупадзёрныя, валёначныя і інш. Акрамя таго, дзейнічалі дзве мануфактурныя фабрыкі (так у дакуменце — **А.К.**) — у мястэчку Дуброўна і сяле Якаўлевічы — і два кафляныя заводы ў Копысі, 1 піваварня і 2 спіртагонныя. Усяго на 1 тыс. жыхароў павета выходзіла ў сярэднім 6,7 рознага роду прадпрыемстваў, у тым ліку 1,5 прамысловых, 3,4 асабістых і 3,6 гандлёвых. Колькасць апошніх была бóльшая, чым у павеце Мінскай губерні, але яны былі меншымі па велічыні. Так, 60 % з іх уяўлялі сабой перасовачныя гандлёвыя пункты і дробныя ларкі.

Бюджэт Горацкага павятовага выканкома за 1923 г. складаўся з адлічэнняў ад дзяржаўных падаткаў, працэнтнай надбаўкі да гэтых падаткаў, а таксама з мясцовых падаткаў і розных збораў. Усяго існавала 25 падаткаў, у тым ліку «з веласіпедаў і самаходных экіпажаў», «з відовішч і забаў», «з плакатаў і афіш», і, як адзначалася ў матэрыялах фінансавай інспекцыі, «у самых нязначных і глухіх гарадах Горках і Рагачове» прапісачны збор даваў за год адпаведна 298 і 687 руб., у той час як у Оршы — толькі 62 руб. Разам з тым, у адрозненне ад іншых паветаў, у Горацкім на першым месцы расходнай часткі бюджэту знаходзіліся расходы на народную адукацыю, на другім — на ахову здароўя, у той час як амаль ва ўсіх паветах першае — другое месца займалі адміністрацыйныя расходы.

З развіццём новай эканамічнай палітыкі набірала моц дзейнасць таварыстваў сялянскай узаемадапамогі і другіх кааператыўных аб'яднанняў. На пачатак 1924 г. дзейнічалі 1 гарадскі, 3 местачковых і 15 сельскіх спажывецкіх кааператываў з 45 аддзяленнямі пры іх. Толькі кааператывам сяла Леніна было ахоплена 55 000 чал. Характэрным для дзейнасці спажыўкааперацыі было тое, што кааператывы забяспечвалі сялян дэфіцытнымі таварамі і прадавалі іх па цэнах амаль заўсёды ніжэй рыначных. Пайшчыкі карысталіся скідкай на 5 % на тавары ў кааперацыі і кааператыўных магазінах горада і павета, а сельскагаспадарчыя прадукты прымаліся па цэнах значна ніжэй за рыначныя, беднякам давалася растэрміноўка ўступнага паю і г. д.

Нягледзячы на гэта, Горацкі павет у 1924 г. адзначаўся як павет, дзе жыхары распараджаліся самымі дробнымі даходамі, а Горкі былі ў ліку тых гарадоў, аб якіх гаварылася, што «жыццё гарадскіх паселішчаў, далучаных да Беларусі паветаў, не адзначана бойкасцю; нават былы губернскі асяродак Магілёў выглядае мёртвым».

Соха и молот. 1924. 9 февраля.
Соха и молот. 1924. 20 июня.
Камуністычны шлях. 1925. 4 кастрычніка.
Беларускі дзяржаўны архіў, ф. 15, воп. 1, спр. 628, л. 21, 28.
Тамсама, ф. 93, воп. 3, спр. 109, л. 7—9, 13, 14, 16, 20, 21, 23, 24.
Тамсама, ф. 332, воп. 1, спр. 1949, л. 9, 10, 50, 52.

А. Каданчык, Г. Каданчык.

Як ствараліся першыя камуны і арцелі

Першыя калектыўныя гаспадаркі і саўгасы ў Горацкім павеце стварыліся адразу пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Адным з іх быў саўгас «Раманава» (цяпер саўгас «Леніна»). Гаспадарка ў той жа час мела 949 дзес. зямлі, невялікі цагельны завод, дзве сукнавальні, сталярню. Узначальваў саўгас спачуваючы партыі бальшавікоў П. Е. Пінчук.

Для кіраўніцтва работай па арганізацыі саўгасаў пры павятовым выканкоме была арганізавана асобая камісія па культурных гаспадарках у саставе І. С. Анюхоўскага і агранома Б. К. Чахоўскага. Камісіяй у 1918 г. у павеце былі арганізаваны саўгасы «Зубры», «Собалева», «Леўкі», «Арловічы», «Халоўе», «Смятаніна».

Першыя саўгасы былі слабыя. Так, саўгас «Халоўе» меў 325 дзес. зямлі і ўсяго 16 коней, 24 плугі і 18 барон. На жывёлагадоўчай ферме налічвалася 21 карова. Нягледзячы на гэта, ураджаі ў саўгасе былі вышэйшыя, чым у сялянскіх гаспадарках. У 1918 г. сабралі ў саўгасах з дзесяціны па 100 пудоў жыта, у той час як у сялянскіх гаспадарках — 6. Гэта гаварыла аб перавагах калектыўнага земляробства.

Паведамленні аб арганізацыі калектыўных гаспадарак у Горацкім павеце друкаваліся ў цэнтральных газетах. «Известия ВЦИК» паведамлялі: «6 жніўня зарэгістравана камуна ў фальварку Коннік Горацкага павета Магілёўскай губерні. У камуну ўваходзяць былыя батракі. Яна абсталявана, мае свайго агранома».

У Горацкім павеце ў 1918 г. было арганізавана 9 камун і арцелей.

У. Ліўшыц.

Горацкі раён у пачатку 30-х гадоў

У склад раёна ўваходзяць 23 сельсаветы і 1 гарсавет. На поўначы Горацкі раён мяжуецца з Дубровенскім і Аршанскім раёнамі, на захадзе з Шклоўскім, на поўдні з Чавускім і Мсціслаўскім і на ўсходзе з РСФСР. Агульная тэрыторыя раёна 164 268 га. Пад землямі сельскагаспадарчага прызначэння 82,5 %, пад лясамі 17 %. Усяго насельніцтва ў раёне 94 752, нацыянальны склад якога ў працэнтах: беларусаў 95,45, яўрэяў 2,29, палякаў 0,06, рускіх 1,18, літоўцаў 0,02, латышоў 0,01, іншых 0,99.

Па тытульнаму спісу 1931 г. у раёне налічвалася 54 прадпрыемствы з агульнай колькасцю рабочых 748. Сярод прадпрыемстваў было: электрастанцый 1, тарфяны завод 1, кавальскіх арцеляў 5, смалакураная арцель 1, цагельных заводаў 2, арцеляў па выпрацоўцы цэглы 1, ільнозавод 1, ткацкая арцель 1, фарбенная 1, шавецкіх 3, кравецкіх 3, друкарня 1, вадзяных млыноў 7, паравых 2, нафтавы млын 1, млыноў 5, жывёлабойня 1, цукеркавая арцель 1, крухмальны завод 1, броварны завод 1, тарфяных арцеляў 3.

Асноўнымі прамысловымі прадпрыемствамі раёна ў 1932 г. з'яўляюцца: электрастанцыя ў г. Горкі з лікам рабочых у сярэднім за паўгоддзе 23, валавая прадукцыя за гэты ж час у цэнах 1926—27 г.— 68,34 тыс. р.; тарфяны завод «Чапялінка» ў вёсцы Чапялінка з лікам рабочых 64 і валавой прадукцыяй 22 тыс. р., майстэрня пры МТС пры с. Пагодзіна з лікам рабочых 43 і валавой прадукцыяй 33,27 тыс. р., два цагельныя заводы ў г. Горкі з лікам рабочых 32 і 87 і валавой прадукцыяй 7,80 тыс. р. і 22,80 тыс. р.; лесапільны завод на ст. Цімохаўка з лікам рабочых 37 і валавой прадукцыяй 94,21 тыс. р.; лесазавод «Зорка» ў г. Горкі з лікам рабочых 25 і валавой прадукцыяй 91 027 тыс. р.; лесазавод «Чырвоны Баявік» на ст. Бабкі з лікам рабочых 33 і валавой прадукцыяй 40,61 тыс. р.; арцель «Беларускі паясок» у в. Высацкі з лікам рабочых 45 і валавой прадукцыяй 9,35 тыс. р., ваўначоска ў г. Горкі з лікам рабочых 48 і валавой прадукцыяй 70,40 тыс. р.; абутковая арцель «Камінтэрн» у г. Горкі з лікам рабочых 38 і валавой прадукцыяй 45,86 тыс. р., швейная арцель «Прагрэс» у г. Горкі з лікам рабочых 56 і валавой прадукцыяй 70,15 тыс. р.; друкарня ў г. Горкі з лікам рабочых 16 і валавой прадукцыяй 23,72 тыс. р., вінзавод у в. Копцеўка з лікам рабочых 22 і валавой прадукцыяй 85,56 тыс. р., цагельны завод у с. Шатыны з лікам рабочых 7 і валавой прадукцыяй 7,14 тыс. р.

Спажыўкааперацыя раёна мае 23 сельпо з гандлёвай сеткай у 57 адзінак. Пайнікаў спажыўкааперацыі налічваецца 19 918 чал.

У раёне знаходзяцца наступныя карысныя выкапні: гліны — ур. Грышанаўка, ур. Зарэчча, ур. Слабада; гліны-даламіты і даламітызаваныя вапнякі — в. Палоскі; крэйда — в. Палоскі, маргелі розныя — в. Халіпы, Валаво.

Сельская гаспадарка раёна спецыялізуецца ў льно-малочным напрамку.

У раёне ёсць 5 наступных саўгасаў: Дрыбін — са свінагадоўчай спецыялізацыяй і з плошчай сенапахаці 820,35 га, з агульным лікам рабочых 101; «Прагрэс» — са свінагадоўчай спецыялізацыяй і з плошчай сенапахаці 445 га, з агульным лікам рабочых 39, з пагалоўем жывёлы: буйной рагатай 65, свіней 369, коней 36; Леніна-Гарадзец — з насенаводнай спецыялізацыяй і з плошчай сенапахаці 972,60 га, з агульным лікам рабочых 114, трактароў 4, буйной рагатай жывёлы 291, свіней 6, коней 79; Чапялінка — з ільнаводнай спецыялізацыяй і з плошчай сенапахаці 1827 га, з агульным лікам рабочых 18; «№ 56 Племхоз» — з ільнаводнай спецыялізацыяй і плошчай сенапахаці 14,84 га.

У калгасах раёна ёсць наступныя фермы: свінагадоўчых 24, з агульнай колькасцю пагалоўя на 20.9.1932 г. 940, малочнатаварных ферм 24, з пагалоўем на 10.11.1932 1437; па вырошчванні маладняку і цялят 45, з пагалоўем на 10.9.1932 г. 1136; каняводчых 2, з пагалоўем 40.

У калгасах раёна ёсць наступная колькасць складаных сельскагаспадарчых машын: сенакасілак 58, конных грабляў 96, жняярак-самакасілак 151, снопавязалак 17, бульбакапалак 9, сеялак радковых 102, трактароў 3, складаных малатарняў 25. У МТС складаных малатарняў 23, ільнотрапалак 76, сеялак 24, радковых 3.

Пасяўная плошча раёна ў 1932 г. складала 81,851 га, у тым ліку збожжавых 64,4 %, бульбы 13 %, тэхнічных культур 13,6 %, траў 7,1 %.

Сетка навучальных устаноў па раёну на 1.10.1932 г.: ВНУ 5, лік студэнтаў 1414; тэхнікумаў 2, лік студэнтаў 480; рабфакаў 2, студэнтаў 527; ШКМ 26, вучняў 3159, настаўнікаў 174; 4-годак 97, настаўнікаў 253, вучняў 12 859. Працэнт пісьменнасці: дарослых 70 %, вучняў 98 %.

Партарганізацыя раёна складаецца з 53 ячэек з агульнай колькасцю камуністаў 610, з іх членаў КП(б)Б 389 і кандыдатаў 221. Камсамольская арганізацыя складаецца з 130 ячэек з лікам камсамольцаў 1917.

У раёне працуе палітаддзел, які арганізаваны пры Горацкай МТС.

У раёне выдаецца газета «Ленінскі шлях».

Друкуецца са скарачэннямі па кн.: Усе раёны БССР. Мн., 1933. С. 283–285.

Аб арганізацыі калгаса ў вёсцы Міхайлавічы

З успамінаў Ф. Д. Мядзведскага

Звыш пяці гадзін праходзіў камсамольскі сход, на якім абмяркоўвалася пытанне аб арганізацыі ў нашай вёсцы калгаса. У прынятай пастанове было сказана: «Лічыць наспеўшым пытанне аб арганізацыі калгаса ў вёсцы Міхайлавічы. Усім камсамольцам першымі запісацца і ўцягнуць свае сем'і ў калектыўную гаспадарку».

Бурным быў агульны сход сялян. Першымі падалі заявы ў калгас камсамольцы М. Макееў, К. Дашкевіч, Андрэй Клімаў і інш. За імі пайшлі яшчэ 65 сялян. Калгас быў названы «Калгаснік Беларусі». У склад праўлення калгаснікі выбралі мяне і яшчэ двух камсамольцаў, старшынёй калгаса — бедняка Сцяпана Лабусава.

Першая перамога акрыліла людзей. Калгаснікі добра дагледзелі пасевы, своечасова ўбралі ўраджай. З кожнага гектара калгас атрымаў па 14 цэнтнераў збожжавых і па 80 цэнтнераў бульбы. У той час гэта быў вялікі ўраджай. Калгаснікі сталі з павагай адносіцца да камсамольцаў. Праўленне калгаса, падводзячы вынікі сельскагаспадарчага года, прэміравала іх.

У 1932 г. райком камсамола накіраваў мяне на вучобу. Пасля заканчэння працаваў у Горацкім райкоме камсамола. Спачатку прапагандыстам, затым сакратаром райкома. У той час у раёне не хапала вопытных кадраў, якія б маглі кіраваць буйной гаспадаркай. Райком камсамола накіраваў у калгасы звыш ста пісьменных камсамольцаў, якія працавалі старшынямі і брыгадзірамі ў калгасах. Камплектавалі кадры жывёлаводаў, стваралі камсамольска-маладзёж-

ныя звенні па вырошчванню тэхнічных культур, арганізоўвалі брыгады па нарыхтоўцы і вывазцы ўгнаенняў.

Кадры механізатараў у большасці сваёй камплектаваліся з ліку камсамольцаў і моладзі. Пасля закліку «Камсамольцы — на трактар!» звыш ста юнакоў і дзяўчат пайшлі на курсы трактарыстаў. Камсамольцы ўзначалілі рух маладых механізатараў за высокую прадукцыйнасць у выкарыстанні тэхнікі.

Звыш 500 юнакоў і дзяўчат з нашага раёна выехалі па камсамольскіх пуцёўках у шахты Данбаса, на будаўніцтва Днепрагэса, Урала-Кузнецкага камбіната, Камсамольска-на-Амуры. Горача адгукнулася моладзь раёна на камсамольскі заклік «Кожны камсамолец павінен стаць ударнікам».

Актыўны ўдзел у правядзенні ўсіх мерапрыемстваў прымалі члены бюро райкома камсамола, актывісты В. Прохараў, І. Якубёнок, І. Пліско, Ф. Сурганаў, Л. Наймарк, Т. Падгурская, В. Ізотава, П. Каравосаў, І. Мядзведскі і інш.

Першая ардэнаноска

Яшчэ падлеткам Домна Сцяпанаўна Каравосава працавала ў калгасе «Новы шлях». Як самую кемлівую і працавітую ў 1934 г. адпраўляюць яе ў Горкі на 3-месячныя курсы льноцерабільшчыкаў, якія былі створаны пры МТС. Пасля заканчэння курсаў далі льноцерабілку, машыну «ВНПЛ-5», трактар, на якім працаваў Міхілёў Фёдар. Калі першы раз яны выехалі на поле, сабраліся малыя і старыя, бо такога дзіва яшчэ ніхто не бачыў. Працавала Домна ва ўсіх калгасах Макараўскага сельсавета. Акрамя гэтага, быў у яе доследны ўчастак лёну, які яна даглядала. Першыя прызы — хустка і карункі — былі атрыманы за перамогу ў конкурсе па трапленню льну. Потым іх будзе шмат — грамат, прызоў, за якімі былі недаспаныя ночы, калі бегла на працу досвіткам, вярталася на змярканні. Былі ахвота, спрыт у руках.

У 1935 г. Домна Сцяпанаўна прымае ўдзел у нарадзе перадавікоў сельскай гаспадаркі ў Мінску, а ў 1936 яе адпраўляюць у Маскву, на з'езд калгаснікаў. Збіралі ўсёй сям'ёй: не было чаго абуць, апрануць.

Ордэн «Знак Пашаны» ўручыў М. І. Калінін. У адказ на ўзнагароду абяцала працаваць яшчэ лепш.

А потым былі падрыхтоўчыя курсы ў Ціміразеўскую акадэмію — за год атрымала сярэднюю адукацыю і паступіла на аграномічны факультэт, перайшла на другі курс. Але ўсё пераблытала вайна.

Усю вайну Домна Сцяпанаўна была ў роднай вёсцы, жыла ў сям'і сястры, дзе было пяцёра дзяцей, і толькі дзякуючы таму, што часта яе выдавалі за маці малодшай сястрыной дачкі, удалося мінуць Германіі.

Дачакаліся вызвалення, пачалі памалу ўладкоўваць, прыводзіць да ладу гаспадарку, калгас. Зноў праца зранку да вечара, без выхадных, без адпачынкаў.

Былі і радасныя хвіліны — вярнуўся з вайны Павел Хомчанка, той, якога яна чакала і ўжо баялася не дачакацца. Больш яны не расставаліся: усё жыццё разам. Прыбавілася клопату пра дзяцей, трэба было падымаць на ногі чатырох дачок.

Нялёгкае жыццё было ў гэтай жанчыны, але ніводнага разу не пайшла яна супраць свайго сумлення.

М. Студнева.

Прамысловыя прадпрыемствы

Цагельны завод № 10 — ст. Пагодзіна, заснаваны ў 1931 г., 36 рабочых (цэгла-сырэц 1134 тыс. шт., цэгла паленая 1146 тыс. шт.).

Кантора Белплодагародніны — ст. Пагодзіна, заснавана ў 1931 г., 4 рабочых (перапрацоўка плодагародніны).

Электрастанцыя с.-г. інстытута — ст. Пагодзіна, заснавана ў 1931 г., 23 рабочых, электраэнергіі 327 тыс. кВт · гадз.

Механічная майстэрня — ст. Пагодзіна, заснавана ў 1917 г., 7 рабочых, гаспадарча-бытавы рамонт.

Сталярная майстэрня — ст. Пагодзіна, заснавана ў 1917 г., 5 рабочых.

Льнозавод № 22 — ст. Пагодзіна, заснавана ў 1930 г., 70 рабочых.

Друкарня с.-г. інстытута — ст. Пагодзіна, заснавана ў 1919 г., 19 рабочых.

Кузня саўгаса № 6 — 4 рабочых, рамонт сельскагаспадарчага інвентару.

Маслазавод саўгаса № 6 — заснаваны ў 1917 г., 4 рабочых.
Цагельны завод № 1 — Прафесарскі завулак № 1, заснаваны ў 1932 г., 4 рабочых.
Кузня — вул. Інстытуцкая, заснавана ў 1931 г., 3 рабочых, гаспадарча-бытавы рамонт.
Лесапілка — вул. Інстытуцкая, заснавана ў 1933 г., 7 рабочых.
Вадзяны млын і сукнавалка, заснаваны ў 1917 г., 5 рабочых.
Кузнечная майстэрня арцелі «Чырвоная Зара», заснавана ў 1930 г., 15 рабочых (гаспадарча-бытавы рамонт).
Трыкатажная майстэрня арцелі «Калгас», заснавана ў 1930 г., 52 рабочых.
Кравецкая майстэрня арцелі «Прагрэс», заснавана ў 1928 г., 46 рабочых.
Абутковая майстэрня арцелі «Камінтэрн», заснавана ў 1928 г., 26 рабочых.
Вытворчая арцель «Харчсмак», заснавана ў 1930 г., 6 рабочых.
Сталярна-бандарная майстэрня арцелі «Чырвоны бандар», заснавана ў 1932 г., 10 рабочых.
Лесапілка арцелі «Зара», заснавана ў 1931 г., 31 рабочы.
Вытворчая арцель «Інвалідаў», заснавана ў 1931 г., 25 рабочых.
Маслазавод, заснаваны ў 1928 г., 31 рабочы.
Хлебазавод, заснаваны ў 1929 г., 14 рабочых.
Скотабойня, заснавана ў 1928 г., 3 рабочых.
Вадзяны млын, заснаваны ў 1917 г., 4 рабочых.
Вадзяны млын калгаса «Шлях да сацыялізму», заснаваны ў 1917 г., 2 рабочых.

Друкуецца па кн.: Спіс прамысловых прадпрыемстваў БССР. Мн., 1935. С. 128, 129.

З гісторыі акадэміі

7 красавіка 1919 г. калегія Наркамасветы РСФСР пераўтварыла Горацкія сярэднія сельскагаспадарчыя навучальныя ўстановы ў вышэйшую навучальную ўстанову — сельскагаспадарчы інстытут. На першым арганізацыйным сходзе, які адбыўся 25 красавіка 1919 г., тайным галасаваннем быў створаны аргкамітэт інстытута з 25 чалавек. Старшынёй быў абраны У. І. Кіркор, намеснікам старшыні — І. К. Хрысценка, сакратаром — Ф. І. Шэкіна, намеснікам сакратара — В. М. Лубяка. Першымі выкладчыкамі былі У. І. Кіркор, І. К. Хрысценка, С. М. Басаў, І. І. Красікаў, Л. В. Горскі, С. П. Міхайлаў, Б. У. Чапкевіч, М. В. Высоцкі, М. В. Найдзёнаў, Л. П. Розанаў, А. І. Турышчын, А. І. Чараповіч, Ю. А. Вейс, А. Д. Дубах, А. І. Кайгарадаў, А. К. Кедраў-Зіхман, П. А. Хадаровіч, Л. І. Яшноў. Былі зацверджаны загадчык гаспадаркі інстытута, загадчык фінансавага аддзела, кіраўнік канцылярыяй і інш. З 1 чэрвеня пры інстытуце былі адкрыты падрыхтоўчыя курсы.

У чэрвені — ліпені 1919 г. была абрана гаспадарчая камісія з трох чалавек, а таксама было вырашана запрасіць прафесара М. В. Рытава загадчыкам кафедры батанікі і фізіялогіі раслін і залічыць выкладчыкамі прафесараў І. К. Богаяўленскага і М. Я. Якабсона, якія прыехалі з Масквы і Петраграда. Прафесар Дз. М. Пранішнікаў быў абраны прафесарам-кансультантам інстытута. У канцы 1919 г. часовы савет інстытута завяршыў падрыхтоўчую работу па стварэнні пастаяннага савета. У савет увайшлі прадстаўнікі ад прафесарска-выкладчыцкага саставу (16 чалавек), ад партыйных і савецкіх арганізацый і ўстаноў павета і губерні (5 чалавек) і студэнтаў (11 чалавек). На першым пасяджэнні савета (12 верасня 1919 г.) рэктарам быў абраны У. І. Кіркор, прарэктарам — М. Я. Якабсон, сакратаром — А. А. Веялко.

На гэтым жа пасяджэнні быў абраны прэзідыум савета інстытута ў саставе рэктара, прарэктара і сакратара, створаны гаспадарчы камітэт у саставе рэктара (старшыня), прарэктара, дэканаў факультэтаў, кіраўніка фермай, загадчыка гаспадаркі, прадстаўніка Дзяржкантролю і прадстаўнікоў ад рабочых, служачых і студэнтаў (члены камітэта). Было вырашана залічыць студэнтамі інстытута 75 выпускнікоў 1919 г. былых сельскагаспадарчага і каморніцка-агранамічнага вучылішчаў. Савет прыняў рашэнне запрасіць для арганізацыі пры інстытуце даследчай станцыі У. У. Вінера.

У 1919 г. у бібліятэцы інстытута было 10 тыс. 850 тамоў. Да канца 1923/24 навучальнага года — 60,3 тыс. тамоў, у тым ліку больш за 7,2 тыс. у замежным аддзеле.

30 верасня 1919 г. савет інстытута прыняў рашэнне пачаць 3 кастрычніка заняткі на двух факультэтах: сельскагаспадарчым і культуртэхнічным (189 чалавек).

У. І. Кіркор.

18 снежня 1919 г. савет абраў прарэктарам інстытута прафесара Р. П. Спарро, культуртэхнічны факультэт быў перайменаваны ў інжынерна-меліярацыйны. Былі створаны курсы павышэння кваліфікацыі і аднагадовыя курсы па паляводству і сельскагаспадарчаму машынабудаванню.

У ліпені 1920 г. пры інстытуце быў адкрыты рабфак з трохгадовым тэрмінам навучання (65 чалавек). Улетку студэнты першага і другога курсаў усіх факультэтаў праходзілі абавязковую практыку па кожным прадмеце. Многія студэнты ўступалі ў працоўную арцель.

У пачатку 1921 г. інстытуту быў перададзены фальварак у Дрыбіне, дзе было створана трэцяе даследчае поле. На вучэбнай ферме ў Горках і ў фальварках Іванава і Дрыбін вырошчвалі сартавыя зернявыя культуры, бульбу і шматгадовыя травы, быў уведзены шматпольны севазварот, вырошчвалі племянную жывёлу — кароў, свіней, коней. Іх колькасць да 1924 г. дасягнула 365 галоў. У фальварку Іванава зямлю апрацоўвалі трактарам, які інстытут атрымаў па распараджэнні Наркамзема РСФСР у пачатку 1921 г. Ферма і фальваркі былі вучэбнай базай для студэнтаў, шырока выкарыстоўваліся ўсімі спецыяльнымі кафедрамі інстытута, забяспечвалі сельскую гаспадарку раёнаў сартавым насеннем, пародзістай жывёлай, з'яўляліся паказальнымі гаспадаркамі для сялян.

У двух лясных дачах у 1924 г. — Горацкай і Дрыбінскай — налічвалася больш за 19 тыс. дзесяцін леса, частка якога выкарыстоўвалася для вучэбна-даследчай справы.

Побач з Горацкім лясніцтвам на тарфяным балоце пад кіраўніцтвам прафесараў А. Д. Дубаха і Р. П. Спарро была закладзена трохкіламетровая асушальная магістраль, а ў верасні 1922 г. была створана буйнейшая ў Заходняй зоне краіны даследча-меліярацыйная арганізацыя (станцыя), якая стала базай навукова-даследчых работ па розных галінах меліярацыйнай навукі.

У 1922/23 навучальным годзе замест чатырох факультэтаў было створана два: сельскагаспадарчы з аддзяленнямі раслінаводства і прамысловых культур і лясной гаспадаркі, земле-агранамічны з аддзяленнямі сельскагаспадарчай меліярацыі і сельскагаспадарчага машынабудавання. Працягваў сваю дзейнасць рабочы факультэт.

ЦК КП(б)Б і Саўнарком БССР у ліпені — жніўні 1924 г. прынялі рашэнне адкрыць землеўпарадкавальны факультэт, другі курс меліярацыйнага аддзялення расфарміраваць, яго слухачам прапанаваць перайсці на землеўпарадкавальны факультэт, трэці курс меліярацыйнага аддзялення аставіць да заканчэння інстытута да кастрычніка 1925 г., аддзяленне машыназнаўства зачыніць, слухачоў лясного аддзялення перавесці ў Мінскі сельскагаспадарчы інстытут.

У інстытуце на кафедрах, у аддзелах і ўстановах працавала 26 прафесараў, 13 выкладчыкаў, 16 асістэнтаў і 21 навуковы супрацоўнік.

1 чэрвеня 1923 г. была створана кафедра грамадска-палітычных навук. Узначаліў яе прафесар А. Н. Грыгор'еў. Пры кафедры былі адкрыты вучэбны кабінет і бібліятэка. Курс палітэканоміі чытаў А. Н. Грыгор'еў, гістарычны матэрыялізм — А. І. Кайгарадаў, асновы Савецкай канстытуцыі — З. Х. Ошэраў, капіталізм і пралетарская рэвалюцыя — А. К. Кедраў-Зіхман.

У інстытуце штогод праходзілі з'езды і нарады па даследчай справе, распаўсюджванні сельскагаспадарчых ведаў, агранаміі, глебазнаўству, меліярацыі і іншыя, працавалі розныя курсы.

З 1921 г. працавала навуковае таварыства. У маі 1925 г. было створана навуковае таварыства па вывучэнні Беларусі.

Базай навукова-даследчай работы ў інстытуце з'яўляліся таксама садовыя прадпрыемствы. Да вясны 1924 г. сады былі адноўлены. Быў створаны гадавальнік, у якім мелася да 15 тыс. пладовых дрэў і кустовых раслін, адноўлены памалагічны сад, пабудавана цяпліца, адрамантаваны дапаможныя памяшканні, праведзены асушальныя работы.

Выкладчыкі Горацкага сельскагаспадарчага інстытута.

З 1920 г. у інстытуце функцыяніравала майстэрня дакладных прыбораў.

Глебавая лабараторыя пад кіраўніцтвам прафесара Я. І. Афанасьева праводзіла даследаванні па класіфікацыі глебаў у Горках, Гомельскай і Бранскай губернях.

Аддзел жывёлагадоўлі сельскагаспадарчай даследчай станцыі, які ўзначальваў М. В. Найдзёнаў, даследаваў кармавыя нормы для цялят, што звязана з ростам маладняку, кармленнем малочных кароў і інш.

Работнікі аддзела садоўніцтва даследчай станцыі на чале з М. І. Бурштэйнам абследавалі сады Беларусі і сумежных абласцей РСФСР, выявілі перспектыўныя сарты яблынь народнай селекцыі, якія пазней увайшлі ў асартымент памалагічнага сада інстытута.

На базе аддзела машынавыпрабавання даследчай станцыі даследаваліся розныя тыпы і канструкцыі плугоў, сеялак і іншыя машыны пад кіраўніцтвам прафесара Ю. А. Вейса. Вывучалася дэфармацыя глебаў пад уздзеяннем адвалаў розных тыпаў, вызначаліся структура і фізічныя ўласцівасці глебаў, розныя прынцыпы сартыроўкі зерня і інш. Вынікі дэманстраваліся на ВСХВ.

Аграхімічная лабараторыя разам з кафедрай аграхіміі пад кіраўніцтвам А. К. Кедрава-Зіхмана вяла навукова-даследчыя работы па пяці тэмах. Сістэматычна вялася навукова-даследчая работа балотнай вопытнай станцыі разам з кафедрай меліярацыі пад кіраўніцтвам прафесара А. Д. Дубаха.

З 1920 па 1924 г. было апублікавана 135 значных работ, прафесарамі 106 работ, выкладчыкамі 25, навуковымі супрацоўнікамі 4 работы. У 1923 і 1924 гг. інстытут выпусціў першы і другі тамы «Записок Горецкого сельскохозяйственного института», «Труды Горецкой сельскохозяйственной опытной станции». Выдавецтва інстытута мела сваю друкарню і літаграфію.

7 красавіка 1924 г. інстытут адзначаў пяцігадовы юбілей сваёй дзейнасці пры Савецкай уладзе. Гэтаму быў прысвечаны спецыяльны нумар часопіса «Голос революционного студенчества».

5 жніўня 1925 г. СНК БССР прыняў

пастанову аб зліцці Беларускага інстытута сельскай гаспадаркі і Горацкага сельскагаспадарчага інстытута і ўтварэнні ў Горках Беларускай дзяржаўнай акадэміі сельскай гаспадаркі імя Кастрычніцкай рэвалюцыі.

У 1925/26 навучальным годзе былі прыняты новыя вучэбныя планы факультэтаў, якія былі разлічаны на чатырохгадовы тэрмін навучання.

У 1926—28 гг. у акадэміі былі пабудаваны вучэбны корпус, пяць жылых дамоў, тры студэнцкія інтэрнаты, клуб-тэатр на 820 месцаў, пераабсталявана памяшканне пад друкарню. Была рэканструявана энергетычная база акадэміі: пабудавана электрастанцыя з магутным рухавіком, упарадкавана электрычная сетка і інш. Праведзены работы па добраўпарадкаванні, створаны новыя кветнікі, скверы.

У 1929—30 гг. быў пабудаваны гідрамеліярацыйны факультэт, закончана пераабсталяванне бібліятэкі.

Вучэбная ферма была пашырана, агульная зямельная плошча складала 933 га.

На 1 кастрычніка 1930 г. у бібліятэцы налічвалася 134 тыс. кніг. Выходзіла шматтыражная газета «За пролетарские кадры», першы нумар выйшаў 4 кастрычніка 1929 г.

Цэнтрам культурна-асветнай работы быў клуб-тэатр акадэміі. Тут працавалі розныя гурткі мастацкай самадзейнасці. З 1925 па 1930 г. працаваў літаратурны гурток, у які ўваходзілі пісьменнік Ю. П. Гаўрук, заслужаная дзеячка культуры БССР П. В. Мядзёлка, пісьменнік Васіль Каваль і інш.

Вынікі даследаванняў, якія праводзіліся ў акадэміі, друкаваліся ў навуковых працах пад назвай «Записки Белорусской сельскохозяйственной академии». К 1931 г. выйшла 12 тамоў, дзе было надрукавана звыш 200 работ. Выходзілі таксама «Труды научного общества по изучению Белоруссии» (7 тамоў), «Труды Горецкой сельскохозяйственной опытной станции» (4 тамы), «Труды лесной опытной станции» (4 тамы) і інш.

Да пачатку 30-х гадоў захапіліся стварэннем дробных навучальных устаноў з вузкім профілем падрыхтоўкі спецыялістаў. Меркавалася з увядзеннем вузкай спецыялізацыі скараціць тэрміны падрыхтоўкі спецыялістаў. У сувязі з гэтым у 1930 г. на базе лясного факультэта БСГА быў створаны і пераведзены ў Гомель лесатэхнічны інстытут. Праз год было створана яшчэ 10 асобных інстытутаў. Асноўныя з іх (аграхіміі і глебазнаўства, буйной рагатай жывёлы, меліярацыі, прадзільных культур, аэрафотагеадэзічны камбінат, кармавых культур) засталіся ў Горках. Іншыя інстытуты былі пераведзены ў Мінск, Віцебск, Лошыцу.

Раздзяленне БСГА прывяло да ліквідацыі адзінага выкладчыцкага калектыву. Была раздроблена вучэбная і вытворчая база акадэміі. У яе памяшканнях размясцілася 7 навучальных устаноў, якія не мелі ні сваіх выкладчыкаў, ні неабходнай матэрыяльна-вучэбнай базы. Частка абсталявання і літаратуры была вывезена інстытутамі ў іншыя гарады. З Горак выехала ў іншыя навучальныя ўстановы значная частка прафесарска-выкладчыцкага саставу, у тым ліку прафесары В. В. Далініна-Іванскі, В. М. Лубяка, К. К. Кісялёў і інш.

Рэарганізацыя, як у хуткім часе паказаў вопыт, знізіла ўзровень вучэбнай работы.

У жніўні 1933 г. СНК БССР прыняў пастанову аб аб'яднанні ўсіх Горацкіх інстытутаў у адзін — Беларускі сельскагаспадарчы інстытут. З 1 кастрычніка 1933 г. студэнты сталі атрымліваць 600 грамаў хлеба ў дзень, 600 грамаў цукру ў месяц, стыпендыя была павялічана на 15 руб. З 1 студзеня 1934 г. пры амбулаторыі БСГІ адкрыўся стацыянар для хворых на 25 ложкаў. Пачаў фарміравацца калектыў выкладчыкаў. Пасля рэарганізацыі ў Горках засталіся прафесары Ю. А. Вейс, А. К. Кедраў-Зіхман, І. І. Красікаў, Ц. М. Годнеў.

У БСГІ пачалі прыбываць новыя спецыялісты, якія былі накіраваны ЦК КП(б)Б, Наркамземам БССР. Асаблівая ўвага была звернута на ўмацаванне саставу выкладчыкаў-грамадазнаўцаў. Па накіраванні ЦК КП(б)Б у 1933/34 навучальным годзе прыбылі дацэнты Левін і Герман, В. С. Аксельрод і інш.

У БСГІ было створана пяць асноўных факультэтаў: раслінаводства (пазней стаў называцца агранамічным), заатэхнічны, арганізацыі тэрыторыі (землеўпарадкавальны), аграхіміі і глебазнаўства, эканамічнай палітыкі і планавання (эканамічны). У снежні 1933 г. дэканамі факультэтаў былі прызначаны прафесары Ц. М. Годнеў, Ю. З. Уман, В. В. Папоў, І. І. Красікаў. У 1934 г. з Лошыцы быў пераведзены зноў у Горкі садова-агародны інстытут. Ён стаў аддзяленнем, а потым плодаагародніннным факультэтам БСГІ.

Да канца 1933/34 навучальнага года прафесарска-выкладчыцкі калектыў налічваў каля 100 чалавек. У іх ліку 20 прафесараў, 29 дацэнтаў.

Былі адкрыты сталовыя для студэнтаў і супрацоўнікаў інстытута, дзіцячыя сад і яслі, адрамантаваны студэнцкі клуб.

У сярэдзіне 30-х гадоў працавала 24 кафедры, пры іх 67 лабараторый і вучэбных кабінетаў.

У 1934—36 гг. БСГІ выпусціў 576 спецыялістаў. У 1938/39 навучальным годзе інстытут па паспяховасці заняў 1-е месца сярод сельскагаспадарчых ВНУ краіны.

У 1941 г. у кніжным фондзе бібліятэкі налічвалася больш за 600 тыс. тамоў.

Для ацяплення ўсіх памяшканняў інстытута штогод нарыхтоўвалася ў канцы 30-х гадоў 70 тыс. кубаметраў торфа і 6 тыс. кубаметраў дроў.

Адмоўна адбілася на дзейнасці інстытута частая змена кіраўніцтва. З 1933 па 1941 г. змянілася пяць рэктараў. Акрамя таго, тры чалавекі прызначаліся часова выконваючымі абавязкі. На пасадзе рэктара працавалі Барысевіч, Г. З. Пелікан, П. С. Шастапал, С. І. Цішкоў і інш.

Па выніках навуковых даследаванняў кафедры БСГІ давалі рэкамендацыі вытворчасці, дзяржаўным органам БССР. Навуковыя супрацоўнікі інстытута пастаянна ўдзельнічалі ў рабоце Дзяржплана, НКЗ, АН БССР, прадстаўлялі даклады і даведкі па пытаннях развіцця сельскай гаспадаркі ў ЦК КП(б)Б і інш.

З 1931 па 1941 г. было выдадзена больш за 20 тамоў навуковых прац і запісак інстытута, апублікавана каля 300 навуковых і навукова-папулярных артыкулаў. На навуковых канферэнцыях зроблена 220 дакладаў. Навуковыя супрацоўнікі БСГІ сканструявалі 20 і выпрабавалі 89 розных сельскагаспадарчых машын і прылад працы, склалі 613 глебавых карт для калгасаў, саўгасаў і раёнаў БССР.

Трагічная з'ява ў жыцці грамадства ў 30-я гады не абышла і калектыў БСГІ. У выніку беспадстаўных паклёпаў былі рэпрэсіраваны 17 прафесараў і дацэнтаў. У іх ліку першы рэктар інстытута У. І. Кіркор, прафесары, загадчыкі кафедрамі Я. М. Афанасьеў, М. М. Ганчарык, У. У. Вінер, К. Г. Рэнард і інш. Усе яны ў 50-я гады былі рэабілітаваны.

У пачатку 30-х гадоў у інстытуце было рэзка скарочана прадстаўніцтва студэнтаў у органах кіраўніцтва. Выбарнасць рэктара, прарэктараў і дэканаў была заменена іх прызначэннем. Нават размеркаванне стыпендый студэнтаў было перададзена ў распараджэнне адміністрацыі, студэнцкае самакіраванне было абмежавана выхаваўчымі функцыямі.

У інстытуце вялася ваенная падрыхтоўка студэнтаў. Жадаючым было дазволена паступаць у ваенные вучылішчы. Былі арганізаваны курсы падрыхтоўкі медсясцёр (70 чалавек). У сакавіку 1941 г. курсы скончылі 32 дзяўчыны. Д. Бярозкіна, Н. Бондарава, Г. Гульбіс, Л. Зуева, А. Канавалава, Т. Кісялёва, А. Савянкова, Н. Лазарэнка, М. Лядава, В. Семяненка скончылі курсы з адзнакай. Усе яны пайшлі на фронт у першыя дні вайны.

Разгарнулася спаборніцтва за лепшую пастаноўку абаронна-масавай работы. Яе арганізатарамі былі камсамольцы. Працавала школа падрыхтоўкі авіятараў. У першым корпусе быў устаноўлены вучэбны самалёт, мелася неабходная літаратура. Заняткі вялі лётчыкі-інструктары Аршанскага аэраклуба. Школу наведвалі 45 чалавек. У 1940 г. яе скончылі 20 студэнтаў. У інстытуце ішла актыўная падрыхтоўка планерыстаў, вадзіцеляў, матацыклістаў.

Мастацкую самадзейнасць інстытута ўзначальваў артыст К. Я. Рэкала. У 1937 г. у драматычным гуртку было 50 чалавек, у харавым — 46, музычным — 42, мастацкім — 24 чалавекі. Працавалі шахматна-шашачны гурток — 250 чалавек, фота — 200, радыё — 81 чалавек.

У снежні 1940 г. інстытут адзначыў 100-гадовы юбілей. Гісторыя яго развіцця і дзейнасці была прадстаўлена на юбілейнай выставе ў чатырох залах бібліятэкі.

Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР узнагародзіў БСГІ ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Ордэны і медалі былі ўручаны старэйшым работнікам.

Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР узнагародзіў 14 работнікаў інстытута Ганаровымі граматамі, 17 — граматамі Вярхоўнага Савета БССР. Быў выраблены юбілейны значок інстытута. На святкаванні прысутнічала больш за 100 гасцей.

Адбылася юбілейная навуковая сесія. Было заслухана 20 дакладаў аб перспектывах развіцця сельскай гаспадаркі, яе механізацыі, асваенні новых зямель. У юбілейным зборніку прац БСГІ апублікаваны артыкулы 30 навуковых супрацоўнікаў.

За перадваенны час БСГІ даў краіне больш за 2 тыс. спецыялістаў. Сярод іх Ф. А. Сурганаў, У. Е. Лабанок, С. Г.

Скарапанаў, С. Н. Іваноў, М. Дз. Мухін, П. Я. Пракопаў, Я. К. Дубоўскі, І. А. Лебедзеў, А. Т. Цяглоў, С. Р. Хомчанка і інш.

Калектыў інстытута вёў вялікую работу па прапагандзе навуковых ведаў і ўкараненні перадавога вопыту ў сельскагаспадарчую вытворчасць. Навуковыя работнікі выдалі 25 падручнікаў для сельскагаспадарчых ВНУ і тэхнікумаў, больш за 30 манаграфій і брашур.

М. Дзюбакова, І. Кажамякаў, П. Кавалёў.

Аддавалі талент і веды

АЛЯКСЕЕЎ Яўген Кузьміч (22.2.1884, с. Вісімауткінск Екацярынбургскай губерні — 1972), беларускі аграном. Акадэмік АН БССР (1940), доктар сельскагаспадарчых навук (1936). У 1928—59 прафесар сельскагаспадарчых ВНУ (Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі, працаваў загадчыкам кафедры агульнага земляробства, Маскоўскага заатэхнічнага інстытута пушнафутравай гаспадаркі; Усесаюзнага сельскагаспадарчага інстытута завочнай адукацыі і інш.). Загадчык аддзела лубіну і сідэрацыі Беларускага НДІ земляробства (1940—1959). Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», медалямі.

АФАНАСЬЕЎ Якаў Мікітавіч (21.10.1877, г. Балашоў Саратаўскай губерні — 25.12.1938), глебазнавец. Акадэмік АН БССР (1931). Скончыў Пецярбургскі універсітэт (1901), працаваў выкладчыкам на Галіцкіх жаночых курсах у Маскве. У 1913 член Глебавага камітэта Маскоўскага таварыства сельскай гаспадаркі. З 1921 прафесар і загадчык кафедры глебазнаўства ў Горацкім сельскагаспадарчым інстытуце. У 1931 узначаліў Беларускі НДІ аграглебазнаўства і аграхіміі. Пад яго кіраўніцтвам праведзены даследаванні глебаў БССР і складзена першая глебавая карта рэспублікі. Стаў ахвярай рэпрэсій перыяду культа асобы Сталіна.



Я. М. Афанасьеў.



Г. І. Гарэцкі.

БУРШТЭЙН Майсей Ісакавіч (5.4.1889, г. Смаргонь Віленскай губерні), беларускі вучоны ў галіне садоўніцтва. Доктар сельскагаспадарчых навук (1944), прафесар (1922). Скончыў Нова-Александрыйскі інстытут сельскай і лясной гаспадаркі (Люблінская губерня). Загадваў кафедрай Горацкага сельскагаспадарчага інстытута (1922). Выяўляў каштоўныя мясцовыя сарты пладовых культур для закладкі калектыўных садоў, вывучаў уплыў прышчэпы на прышчэпак, падбіраў прышчэпы для закладкі гадавальнікаў.

ВЕЙС Ювеналій Аляксандравіч (5.1.1878, Екацярынбург — 12.12.1950), беларускі вучоны ў галіне машыназнаўства і механізацыі сельскай гаспадаркі. Акадэмік АН БССР (1940), доктар тэхнічных навук (1937), прафесар (1909), заслужаны дзеяч навукі БССР (1940). У 1899 скончыў Нова-Александрыйскі інстытут сельскай і лясной гаспадаркі (Люблінская губерня). У 1920—41 загадчык кафедры механізацыі сельскай гаспадаркі Горацкага сельскагаспадарчага інстытута (Беларуская сельскагаспадарчая акадэмія). З 1947 дырэктар і загадчык лабараторыі па вывучэнні фізіка-механічных уласцівасцей раслін Інстытута механізацыі сельскай гаспадаркі АН БССР. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі. Устаноўлена мемарыяльная дошка на вучэбным корпусе № 3.

ГАРЭЦКІ Гаўрыла Іванавіч (10.4.1900, в. Малая Багацькаўка Мсціслаўскага павета Магілёўскай губерні, цяпер в. Багацькаўка Мсціслаўскага раёна — 20.11.1988), беларускі геолаг, географ, эканаміст, статыстык, дэмограф, дзеяч беларускага нацыянальна-культурнага руху. Акадэмік АН БССР (1928), доктар геолага-мінералагічных навук (1946). Заслужаны дзеяч навукі БССР (1972). Брат М. Гарэцкага. Скончыў Пятроўскую (Цімірязеўскую) акадэмію (1924). У 1917—19 супрацоўнічаў з Беларускай секцыяй студэнтаў Горацкага сельскагаспадарчага інстытута. У верасні 1922 арыштаваны органамі АДПУ у Маскве, праз месяц вызвалены. Старшыня Беларускай культурна-навуковай асацыяцыі пры Пятроўскай сельскагаспадарчай акадэміі (1920—22). Адзін з ініцыятараў і аўтараў зборніка «Маладая Беларусь» (1922, выйшаў 1 нумар). У 1924/25 навучальным годзе выкладаў эканамічную геаграфію на беларускім сектары Камуністычнага універсітэта нац. меншасцей Захаду ў Маскве.

З 1925 дацэнт кафедры эканамічнай геаграфіі Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі. З 1927 дырэктар Беларускага НДІ сельскай і лясной гаспадаркі імя Леніна пры СНК БССР. Незаконна арыштаваны ў 1930, пазбаўлены звання акадэміка АН БССР, засуджаны ў 1931 да высылкі за межы Беларусі. У 1931—41 працаваў у інжынерна-геалагічных экспедыцыях Гідрапраекта СССР. Датэрмінова вызвалены ў 1934. Быў арыштаваны ў 1937 і 1938. У 1941—42 галоўны геолаг абарончых работ у Ржэве і Чарапаўцы. У 1943—68 намеснік галоўнага геолага, галоўны геолаг у арганізацыях Гідрапраекта. Рэабілітаваны ў 1958. У 1965 адноўлены ў званні акадэміка АН БССР. У 1969—85 загадчык аддзела (з 1977 лабараторыі) Інстытута геахіміі і геафізікі АН БССР.

ГАРЭЦКІ Максім Іванавіч (18.2.1893, в. Малая Багацькаўка Мсціслаўскага павета Магілёўскай губерні, цяпер в. Багацькаўка Мсціслаўскага раёна — 10.2. 1938), класік беларускай літаратуры, празаік, крытык, літаратуразнавец, фальклярыст, лексікограф, відны прадстаўнік беларускай думкі. Брат Г. Гарэцкага. Скончыў Горацкае каморніцка-агранамічнае вучылішча (1913). У імперыялістычную вайну быў на фронце. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі супрацоўнічаў у «Известиях Смоленского Совета рабочих, солдатских и крестьянских депутатов», у газеце «Звезда», з рэдакцыяй якой у 1919 пераехаў у Вільню. Займаўся выдавецкай, навуковай і выкладчыцкай дзейнасцю. Меў сувязі з віленскімі камуністамі, за што ў 1922 трапіў у Лукішскую турму. У Горацкую акадэмію накіраваны Пастановай наркома асветы БССР ад 25 студзеня 1926. З 1 лютага 1926 працуе на кафедры беларускай мовы, літаратуры і гісторыі. З сярэдзіны верасня 1928 у Мінску ў Інбелкульце, АН БССР. 19.7.1930 арыштаваны на падставе сфабрыкаванага абвінавачвання ў прыналежнасці да т. зв. «Саюзу вызвалення Беларусі». У красавіку — маі 1931 асуджаны на 5 гадоў высылкі ў Вятку, дзе працаваў чарцёжнікам, на іншых работах. У 1935 у пас. Пасочня Смаленскай вобласці, выкладаў рускую мову і літаратуру ў школе. 4.11.1937 зноў арыштаваны, расстраляны ў г. Вязьма Смаленскай вобласці па рашэнні «тройкі» НКУС. Рэабілітаваны 15.11.1957.

З успамінаў Ю. Гаўрука

Гарэцкі вельмі любіў выкладаць мову. А прынцып выкладання ў нас быў такі. Тэарэтычныя ўступы, тлумачэнні, азнаямленне з катэгорыямі, правіламі беларускай граматыкі. Практыка ж зводзілася да наступнага. У той час выходзіла вельмі многа сельскагаспадарчых брашур па самых розных пытаннях земляробства, жывёлагадоўлі. Усе яны ў значнай колькасці траплялі ў сельгасакадэмію. Студэнты перакладалі гэтыя брашуры з рускай мовы і тым самым засвойвалі тэрміналогію і набывалі практыку перадачы думак па-беларуску.

П. П. Кабека.

ГАЎРУК Юрка (Юрый Паўлавіч; 6.5.1905, Слуцк — 1979), беларускі перакладчык і паэт. Скончыў Вышэйшы літаратурна-мастацкі інстытут імя Брусава (1925). Дацэнт кафедры беларускай мовы і літаратуры Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі (1925—31, пасля ад'езду М. І. Гарэцкага ўзначальваў кафедру), Магілёўскага педагагічнага інстытута (1931—35). За думку «Няма на свеце большага гвалту, як адабраць ад таленту права на яго творчасць» Юрку Гаўрука аб'явілі нацдэмам. Пад многімі вершамі, змешчанымі ў кнізе «Узвіхрыцца ветразь» (Мн., 1990), стаяць даты з 1938 па 1953 і месца напісання — станцыя Урульга, станцыя Унта Комі АССР. Пасля вызвалення ў 1957—67 загадчык літаратурнай часткі тэатра імя Я. Купалы.

ГОДНЕЎ Ціхан Мікалаевіч (5.4.1893, г. Задонск Варонежскай губерні), беларускі фізіёлаг раслін і біяхімік, стваральнік школы даследчыкаў біясінтэзу хларафілу. Акадэмік АН БССР (1940, член-карэспандэнт 1935). Доктар біялагічных навук (1935), прафесар (1926), заслужаны дзеяч навукі БССР (1944). Скончыў фізіка-матэматычны факультэт Маскоўскага універсітэта (1916). З 1927 працаваў у Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі, з 1935 — у БДУ і АН БССР. Працы пра ўтварэнне і стан хларафілу ў раслінах. Прэмія АН СССР імя Ціміразева (1967). Узнагароджаны 2 ордэнамі Леніна, 3 іншымі ордэнамі, медалямі.

ЗУБРЫЦКІ Іван Васільевіч (17.2.1898, Рэчыца — 25.11.1963), беларускі геадэзіст. Прафесар (1960). Скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (1926). З 1930 дацэнт кафедры геадэзіі БСГА, у 1942—47 працаваў у Новасібірскім інстытуце інжынераў геадэзіі, у 1947—63 загадчык кафедры геадэзіі БСГА.

КАБЕКА Павел Паўлавіч (11.6.1897, Вільня — 1954). Член-карэспандэнт АН СССР (1943). Скончыў Мсціслаўскую гімназію (1917), працаваў настаўнікам, лектарам у бюро школьных работнікаў Мсціслаўскага паветвыканкома. У 1921—24 вучыўся і быў супрацоўнікам пры кафедрах арганічнай і агранамічнай хіміі і асіс-

А. К. Кедраў-Зіхман.

тэнтам пры кафедры фізікі Горацкага сельскагаспадарчага інстытута. З 1925 у Ленінградскай фізіка-тэхнічнай лабараторыі. Доктар тэхнічных навук (1935), прафесар (1936). У жніўні 1941 фізіка-тэхнічны інстытут быў эвакуіраваны ў Казань, а частка супрацоўнікаў пад кіраўніцтвам П. П. Кабекі вяла даследаванні па абароннай тэматыцы. З 1952 загадчык лабараторыі механічных і фізічных уласцівасцей палімераў у Інстытуце высокамалекулярных злучэнняў. Узнагароджаны ордэнам Леніна.

КАРАТКОЎ Канстанцін Мікалаевіч (1890—1954), хімік-арганік. Член-карэспандэнт АН БССР (1947). Заслужаны дзеяч навукі (1949). Акадэмік АН БССР (1950). Скончыў Горацкі сельскагаспадарчы інстытут (1924). Дацэнт БСГА (1925—30). Прафесар і загадчык кафедры хіміі Беларускага лесатэхнічнага інстытута ў Гомелі (1930—41). Загадчык кафедры хіміі Уральскага лесатэхнічнага інстытута ў Свярдлоўску (1941—44). Загадчык кафедры Беларускага лесатэхнічнага інстытута імя С. М. Кірава (1945). Дырэктар Інстытута хіміі АН БССР (1949—52). З 1952 загадваў лабараторыяй гэтага інстытута.

КЕДРАЎ-ЗІХМАН Аскар Карлавіч (31.12.1885, Курляндская губерня — 12.2.1964), беларускі аграхімік. Акадэмік АН БССР (1931), акадэмік УАСГНІЛ (1935). Заслужаны дзеяч навукі БССР (1940). Скончыў Кіеўскі універсітэт (1913). Удзельнік грамадзянскай вайны. У 1923—30 прафесар Горацкага сельскагаспадарчага інстытута і Маскоўскай сельскагаспадарчай акадэміі імя Ціміразева (1930—41). Кіраўнік лабараторыі вапнавання глебы Усесаюзнага НДІ ўгнаенняў і аграглебазнаўства (1931—63). Узнагароджаны ордэнам Леніна, двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга і ордэнам «Знак Пашаны».

КРАСІКАЎ Інакенцій Ільіч (27.11.1875, Томск — 27.2.1943), беларускі хімік, прафесар (1925). З 1896 вучыўся ў Пецярбургскім лясным інстытуце, выключаны за ўдзел у рэвалюцыйным руху. У 1909 скончыў Томскі тэхналагічны інстытут. З 1910 працаваў у каморніцка-агранамічным вучылішчы ў Горках. У 1925—40 загадчык кафедры неарганічнай і аналітычнай хіміі ў Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі. Навуковыя працы па хіміі і хімічнай тэхналогіі. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі.

ЛУПІНОВІЧ Іван Сцяпанавіч (6.7.1900, мяст. Шацк Ігуменскага павета Мінскай губерні — 9.10.1968), беларускі вучоны ў галіне глебазнаўства і аграхіміі. Акадэмік АН БССР (1947). Доктар сельскагаспадарчых навук (1944). Прафесар (1953). Заслужаны дзеяч навукі БССР (1951). Скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (1925), працаваў навуковым супрацоўнікам Беларускай вопытнай агранамічнай станцыі. У 1934—38 загадчык кафедры агульнага земляробства Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі. У 1938—47 у АН СССР. Віцэ-прэзідэнт АН БССР (1947—56). Прэзідэнт Акадэміі сельскагаспадарчых навук БССР (1957—61). З 1950 загадчык кафедры глебазнаўства БДУ. Узнагароджаны ордэнам Леніна, трыма ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам Чырвонай Зоркі і «Знак Пашаны».

МЕЛЬНІК Сцяпан Паўлавіч (13.8.1883—1943), беларускі вучоны ў галіне батанікі і лесаводства. Член-карэспандэнт АН БССР (1936). Доктар біялагічных навук (1935), прафесар (1923). Скончыў Пецярбургскі лясны інстытут (1911). У 1914—19 выкладчык Харкаўскага інстытута сельскай і лясной гаспадаркі. Прафесар кафедры агульнага лесаводства Горацкага сельскагаспадарчага інстытута (з 1923), дырэктар Цэнтральнай лясной доследнай станцыі БССР (1926—30). У 1933—38 дырэктар батанічнага саду АН БССР. Асноўныя працы ў галіне лесаводства, дэндралогіі і феналогіі раслін. У 1938 быў рэпрэсіраваны, арыштаваны і пазбаўлены звання члена-карэспандэнта. С. П. Мельнік рэабілітаваны і адноўлены ў званні члена-карэспандэнта АН Беларусі.

МЯДЗЁЛКА Паўліна Вікенцьеўна (8.12.1893, мяст. Будслаў Віленскага павета Віленскай губерні — 1974), заслужаная дзяячка культуры БССР (1966). Скончыла агульнаадукацыйныя курсы ў Пецярбургу (1914). Удзельніца Віленскага музычна-драматычнага гуртка (1914), Першага таварыства беларускай драмы і камедыі (1917—18, 1920). Адна з першых выканала ролю Паўлінкі ў аднайменнай п'есе Я. Купалы (1913); стварыла харавыя і драматычныя гурткі ў Дзвінскай беларускай гімназіі (1922—25), Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі (1927—30).

ПАПОЎ Васіль Васілевіч (7.2.1887, в. Няўзорава Скапінскага павета Разанскай губерні — 29.11.1955), беларускі геадэзіст. Акадэмік АН БССР (1950), член-карэспандэнт (1940). Доктар тэхнічных навук (1936), прафесар (1939). Заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі БССР (1954). Скончыў Маскоўскі межавы інстытут (1911). У 1912—24 у машынабудаўнічым тэхнікуме ў Пензе. З 1928 прафесар Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі. У 1942—49 загадчык кафедры вышэйшай геадэзіі Новасібірскага інстытута інжыне-

раў геадэзіі, аэрафотаздымкі і картаграфіі. З 1949 у Беларускім лесатэхнічным і політэхнічным інстытутах. Адначасова (з 1951) акадэмік-сакратар Аддзялення фізіка-матэматычных і тэхнічных навук АН БССР. Арганізатар прац па здымцы гарадоў Беларусі і РСФСР, па пракладванню прэцызійных траверсаў у СССР. Узнагароджаны ордэнам Леніна, 2 іншымі ордэнамі, медалямі.

ФАМІН Сяргей Уладзіміравіч (29.4.1906, в. Пепелеўка Мсціслаўскага павета — 4.12.1941), беларускі паэт. Скончыў Магілёўскі педтэхнікум (1925), працаваў настаўнікам на Барысаўшчыне. Пасля заканчэння БДУ прыехаў у Горкі (1930), працаваў выкладчыкам беларускай мовы і літаратуры. Пісаў вершы, кіраваў літаратурным гуртком студэнтаў пры шматтыражнай газеце «За пролетарские кадры». 4.1.1935 арыштавалі ўсіх гурткоўцаў. Абвінавацілі ў арганізацыі контррэвалюцыйнай групы. Па сведчанні аднаго з гурткоўцаў М. Стэльмашука, іх арыштавалі па лжываму даносу студэнта-стукача. Фаміна асудзілі на 10 гадоў. Зняволенне адбываў у Комі АССР. Працаваў у тапаграфічнай партыі, пісаў вершы. 29.9.—2.10.1941 адбыўся другі суд. Зноў паэта абвінавацілі ў стварэнні контррэвалюцыйнай арганізацыі. Прыгаварылі да выключнай меры пакарання. У 1957 і 1958 абодва прыгаворы адменены, С. У. Фамін рэабілітаваны.

ШКАТЭЛАЎ Уладзімір Віктаравіч (19.5.1861, Пецярбург — 7.10.1940), беларускі хімік, заснавальнік лесахіміі ў БССР. Акадэмік АН БССР (1929). Доктар хімічных навук (1889), прафесар (1893). Заслужаны дзеяч навук БССР (1938). Скончыў Маскоўскае вышэйшае тэхнічнае вучылішча (1884). З 1923 прафесар Беларускага інстытута сельскай і лясной гаспадаркі ў Мінску, з 1925 у БСГА. У 1930 дырэктар НДІ хіміі АН БССР. З верасня таго ж года ў Гомелі, кіраўнік лесахімічнай групы Інстытута хіміі, з 1938 загадчык лабараторыі лесахіміі таго ж інстытута ў Мінску.

ЯШНОЎ Леанід Іванавіч (1860—1936). Адзін з заснавальнікаў вучэння аб лесе, ім распрацавана лесатыпалагічная класіфікацыя лясных раслін і пасадак. У 1921—26 у Горацкім сельскагаспадарчым інстытуце. Напісаў падручнікі «Курс общего лесоводства» (Горки, 1922), «Технические свойства древесины, фауты и сортименты» (Горки, 1924), «Курс лесной статики; конспект лекций» (Горки, 1923) і інш. Ініцыятар і арганізатар Горацкай лясной даследчай станцыі (1922). Многа зрабіў у галіне лясной гаспадаркі Татарыі, Чувашыі, Удмуртыі і іншых раёнах Паволжа.

Падрыхтавана паводле даных, змешчаных у БелСЭ (т. 1—11), Энцыклапедыі гісторыі Беларусі (т. 2), звестак, прадстаўленых В. Нямыкіным, У. Ліўшыцам.

Па старонках раённай газеты «Ленінскі шлях»

9 мая 1936 г.

Сёння ў раёне

90 старшынь калгасаў з 150 у раёне маюць свае веласіпеды. 40 брыгадзіраў калгасаў набылі веласіпеды восенню мінулага года за прададзены хлеб дзяржаве.

7 лістапада 1937 г.

Па нашаму раёну на сённяшні дзень ёсць 28 грузавых і 8 легкавых аўтамашын. Гэта ў той час, калі 10 год назад у раёне не было ні адной аўтамашыны.

* * *

Па нашаму раёну ёсць 91 школа, у якіх навучаецца 12 628 дзяцей працоўных раёна.

* * *

Працоўныя нашага раёна на лістапад месяц выпісваюць 8682 экземпляры газет 89 выданняў.

* * *

Толькі з адной вёскі Маслакі Маслакоўскага сельсавета працуе 42 спецыялісты розных спецыяльнасцей, сярод якіх настаўнікаў 15 чалавек, медработнікаў 4 чалавекі, ветработнікаў 3, аграномаў — 2, шафёраў 7 чалавек, трактарыстаў 5 чалавек, навучаецца ў сярэдніх і вышэйшых установах 20 чалавек.

* * *

У нашым раёне з кожным годам расце тэлефонная сець па калгасах, установах, прадпрыемствах і сельсаветах. Усяго па раёну ёсць ужо 164 тэлефонных апараты.

11 мая 1939 г.

Узнагароджанне асоба вызначыўшыхся настаўнікаў сельскіх школ

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР за выдатныя поспехі ў справе школьнага абучэння і савецкага выхавання дзяцей у сельскіх школах, за выдатную пастаноўку вучэбнай работы і актыўны ўдзел у грамадскім жыцці вёскі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі Саюза ССР 4331 асоба вызначыўшыхся настаўнікаў сельскіх школ, у тым ліку па нашаму раёну:

Ордэнам Леніна

Малышаў Радзівон Якаўлевіч — загадчык Быстранскай пачатковай школы Горскага сельсавета.

Ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга

Грыгор'ева Аляксандра Паўлаўна — настаўніца Нівішчанскай пачатковай школы Паршынскага сельсавета.

Дамарацкі Мікалай Рыгоравіч — настаўнік Маслакоўскай няпоўнай сярэдняй школы Маслакоўскага сельсавета.

Медалём «За трудовую доблесть»

Шумейка Анна Сцяпанаўна — настаўніца Горскай сярэдняй школы Горскага сельсавета.

Медалём «За трудовое отличие»

Сямёнаў Севасцян Іванавіч — дырэктар Панкратаўскай няпоўнай сярэдняй школы, Панкратаўскага сельсавета.

7 лістапада 1940 г.

Лічбы і факты

У горадзе і вёсках раёна зараз працуе 62 пачатковых, 13 няпоўных сярэдніх і 8 поўных сярэдніх школ. У школах навучаецца 13 128 чалавек. Апрача гэтага, у горадзе ёсць сельскагаспадарчы інстытут, калгасны тэхнікум імя Леніна, землеўпарадкаваўчы тэхнікум, школа медсясцёр.

У раёне зараз працуе 4 бальніцы, у якіх налічваецца 160 коек, 2 амбулаторыі, венерычны і туберкулёзны пункты, дзіцячая кансультацыя. У сельскай мясцовасці арганізавана 5 урачэбных і 9 фельчарска-акушэрскіх пунктаў. Усяго працуе 27 урачоў і 85 чалавек сярэдняга персанала.

Лёс вырашылі за 15 хвілін

«Дело № 10898 С по обвинению гр-на Коваля Василия Петровича по ст. 58-10, 58-11, 58-7, 58-8, ЦК РСФСР». У «Протоколе закрытого судебного заседания выездной сессии Военной коллегии Верховного суда Союза ССР от 28 октября 1937 г.» пазначана: пасяджэнне адкрыта ў 12 гадзін. Скончылася ў 12.15. Сведкі не выклікаліся. Не выклікаўся і сам падсудны.

За 15 хвілін справа была разгледжана і прынята рашэнне прыгаварыць Каваля Васіля Пятровіча «...к высшей мере наказа-

ния — расстрелу с конфискацией всего лично принадлежащего ему имущества. Приговор окончательный и обжалованию не подлежит и на основании Пост. ЦИК СССР от 1 декабря 1934 г. подлежит немедленному исполнению».

В. Каваль аўтар асобных кніг «Як вясну гукалі!» (1927), «На загонах» (1928), «Крыніцы» (1929), «Выбраныя творы» (1932), а таксама аповесцей для дзяцей «Санька-сігналіст» (1936). Друкаваўся ён у рэспубліканскіх часопісах і газетах.

Аднак творчы працэс быў прыпынены: у ноч на 2 лістапада 1936 г. у кватэру па адрасу: Мінск, вул. Маякоўскага, д. 3-2, кв. 4, пастукалі і В. Каваль быў арыштаваны.

В. Каваль скончыў два курсы Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Ён сябраваў і сустракаўся з многімі беларускімі пісьменнікамі — М. Зарэцкім, А. Дударам, В. Сташэўскім, М. Гарэцкім, Ю. Гаўруком, У. Дубоўкам, Т. Кляшторным, А. Астапенкам, М. Чаротам, М. Лужаніным, А. Вольным, В. Мараковым, У. Харыкам. Многія з іх потым сталі вязнямі Гулага ці загінулі ў Курапатах.

Разам з беларускімі пісьменнікамі В. Каваль многа ездзіў па краіне. У 1927 быў у Кіеве — Днепрапятроўску — Харкаве, у 1928 — у Маскве, у 1930 — у Адэсе і Харкаве, у 1933 — зноў у Харкаве. Як потым было сфармулявана ў пратаколах, усе гэтыя паездкі былі неабходны для контррэвалюцыйнай нацыянальна-дэмакратычнай дзейнасці за мяжой Беларусі. І дзе б ні жыў ці працаваў В. Каваль, усюды ён быў звязаны з «контрреволюционными подпольными организациями». Ці то былі Мінск, Горкі, Магілёў, ці то родная вёска Сава, дзе ён «...по заданию Гаврука пропагандировал контрреволюционные идеи в деревне». Нават у арміі, дзе ён спачатку, з 1931 г., служыў у якасці камандзіра ўзвода 4-га стралковага палка, потым карэспандэнтам, а затым адказным рэдактарам газеты «Красноармейская правда». Дарэчы, В. Каваль у гэты час быў выключаны з радоў камсамола і дэмабілізаваны як класава чужы за сувязь з бацькам, які ў гэты час (1932 г.) быў выключаны з калгаса за ўдзел у развале калгаснага ладу. У спісах рэпрэсіраваных у гады таталітарнага рэжыму, што змешчаны ў гэтай кнізе, значыцца Кавалёў Пётр Кліменцьевіч з вёскі Сава. 12 лістапада 1937 г. ён быў расстраляны ў Оршы.

«Васіля Каваля і яго жонку Паліну, — успамінае А. Звонак, — я добра ведаў па сумеснай літаратурнай працы. Спачатку разам уваходзілі ў аб'яднанне «Маладняк», потым разам вучыліся ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Гэта быў таленавіты пісьменнік.

Я чуў, што ён быў арыштаваны. І вось у маі 1937 г. мяне прывялі на допыт у кабінет следчага. Там ужо сядзеў Васіль Каваль. Ён быў вельмі бледны, нервова курыў цыгарку з махоркі, якую яму, відаць, нядаўна далі. Выгляд у яго быў вельмі стомлены, ён стараўся не глядзець у вочы.

Спачатку нас спыталі, ці ведаем мы адзін аднаго. Мы гэта пацвердзілі. Потым следчы патрабаваў, каб мы пацвердзілі сваю контррэвалюцыйную дзейнасць. Я адмовіўся. Спачатку следчы мяне ўгаворваў, а потым пачаў пагражаць... Калі я заўважыў, што яшчэ адзін пачаў закасваць рукавы, я ўзяў паперку і напісаў, што я не займаўся контрэвалюцыйнай дзейнасцю. Не чытаючы паперу, мяне таўханулі ў плечы і вывелі з кабінета. Выходзячы, я заўважыў на вачах В. Каваля слёзы. З Васілём Кавалём я сустракаўся яшчэ раз, калі ў кастрычніку 1937 г. нас судзілі і ён выклікаўся як сведка».

27 верасня быў вынесены прысуд.

«В. Коваль обвиняется в том, что:

а) являлся активным участником объединенной антисоветской террористической, шпионско-диверсионной организации, связанной с польразведорганами;

б) был связан с членом Московского троцкистско-зиновьевского террористического центра Гессеном, участвовал при встречах с ним, где обсуждались вопросы совместной борьбы троцкистов и нацфашистов Советской власти;

в) являлся сторонником вооруженного восстания и военной интервенции против СССР со стороны фашистских государств Польши и Германии;

г) принимал активное участие на нелегальных нац. фашистских собраниях;

д) вербовал и обрабатывал в контрреволюционную организацию антисоветски настроенную молодежь;

е) по заданию организации установил связь с к-р. нацфашистской организацией на Украине;

т. е. в преступлениях, предусмотренных

ст. ст. 72-76, 69, 22-70 УК БССР (58-11, 58-8 УК РСФСР)».

28 кастрычніка адбыўся вельмі кароткі суд: бязвіннага чалавека прыгаварылі да расстрэлу. «Приговор о расстреле Коваля Василия Петровича приведен в исполнение в г. Минске 29.X.1937 г.»

24 верасня 1957 г. Ваенная калегія Вярхоўнага суда СССР пастанавіла адмяніць прыгавор і справу спыніць.

У. Ліўшыц.

Выпадак з партрэтам маршала Блюхера

Да вайны я вучыўся на рабфаку пры Беларускім сельскагаспадарчым інстытуце.

7 лістапада 1938 г. студэнты інстытута, рабфака і землеўпарадчага тэхнікума павінны былі выйсці на дэманстрацыю з нагоды 21-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі. Перад выхадам на дэманстрацыю камендант нашага барака-інтэрната Фруза Гайдаманава ўручыла нам партрэты кіраўнікоў партыі і ўрада, транспаранты і другую нагляднасць.

З раніцы паваліў мокры снег, шугаў халодны пранізлівы вецер. Увагнуўшы галовы ў каўняры стракатых адзежын, студэнты неслі сваю нагляднасць не ў высока ўзнятых руках, а апусціўшы іх долу.

Перад нашай калонай з'явіўся маладзенькі лейтэнант.

— Узняць транспаранты! — звонкім голасам скамандаваў ён.

Угару ўзняліся сцягі, лозунгі, партрэты. Глянуўшы ўверх, лейтэнант падскочыў да невысокага каржакаватага юнака ў абцягнутым сукном кажушку, ударыў яго кулаком па твары, злосна прагаварыў.

— Ты каго гэта, контра, прынёс?

Лейтэнант вырваў з рук юнака дрэўка з партрэтам маршала Блюхера, бразнуў яго на мокрую зямлю і прыняўся таптаць нагамі. Я стаяў непадалёку ад юнака. Гэта быў стараста нашай групы Башлыкоў.

— Марш адсюль! — злосна пракрычаў лейтэнант.

З таго дня мы больш не бачылі свайго старасту. Бясследна знікла за ім і камендант.

Маршал Блюхер быў расстраляны роўна праз два дні пасля выпадку з яго партрэтам у Горках — 9 лістапада 1938 г.

М. Якушэвіч.

Народная газета. 1993. 4 лістапада. Друкуецца са скарачэннем.

Восстановить доброе имя прокурора

С июня 1934 г. я занимал должность заместителя директора Белорусского сельхозинститута по научно-исследовательской работе. Директором был А. Борисевич, заместителем по учебной части П. Шестернев.

Наша работа началась в сложных условиях. Вместо существовавшей в 1931 г. Горецкой сельхозакадемии было создано 8 мелких, искусственно оторванных один от другого сельскохозяйственных вузов, нам не раз приходилось обращаться в республиканские организации за содействием. Не получая помощи со стороны руководящих органов БССР, директор института и его заместители решили написать в ЦК ВКП(б) письмо с описанием действительного положения. Оно было направлено на имя Сталина и Кагановича в декабре 1934 г. Однако без рассмотрения по существу его отправили в Центральный Комитет Компартии Белоруссии, в адрес руководителей которого высказывались критические замечания.

В одну из своих поездок в Минск я встретил инструктора орготдела ЦК Компартии Белоруссии Тавакальяна. Он сказал, что если работники сельхозинститута будут ставить вопросы, дискредитирующие руководителей БССР, то «сломают себе шею».

В постановлении бюро ЦК КП(б)Б от 11 января 1935 г. сказано: «Расследование установило, что заявление дирекции тт. Борисевича, Иезуитова, Шестернева в ЦК ВКП(б) является сплошной ложью и имеет одну цель — прикрыть антипартийную деятельность этих лиц в институте. Исходя из этого бюро ЦК КП(б)Б постановляет:

1. т.т. Борисевича, Иезуитова, Шестернева за обман партии, за полную потерю классовой бдительности, привлечение бывших троцкистов, изгнанных из ряда организаций и советских учреждений, к работе института, за безуспешные, бюрократические отношения к студентам, за провал учебы по ряду дисциплин и полный провал научно-исследовательской работы — исключить из партии...

7. Поручить прокуратуре командировать в Горецкий институт тов. Меерзона для выявления подсудно-криминальных дел в административно-хозяйственной части института и привлечения виновных к ответственности».

Спустя несколько дней в Горецкий институт приехал помощник прокурора БССР Меерзон. В это время я находился в Горках под домашним арестом. В конце января Меерзон вызвал меня и сказал, что он допросил по делу десятки людей — преподавателей, студентов, технических работников института и что собранные им материалы не дают оснований возбуждать уголовное дело. Меерзон отменил мой домашний арест и дал совет ехать в Москву и добиваться восстановления в партии.

После того как Меерзон доложил бюро ЦК КП(б)Б о своем отказе искусственно создавать уголовное дело, его сразу же исключили из партии, внесли в списки «врагов народа». Он многие годы находился в районах вечной мерзлоты в лагерях.

Расследование поручили другому работнику прокуратуры. За несколько месяцев он создал фальсифицированное уголовное дело против авторов заявления в ЦК ВКП(б).

БЕЛЯНКОЎ Якаў Ігнацьевіч, н. у 1898, урач ваеннага шпіталю ў Смаленску, арыштаваны 28.12.1934, рэабілітаваны ў 1989.

ЛЕЎКІН Мяфод Архіпавіч, н. у 1909, калгаснік, 5.5.1935 асуджаны да 10 гадоў ППЛ, рэабілітаваны ў 1961.

ЛОСЕЎ Яўсей Тарасавіч, н. у 1890, 5.6.1935 асуджаны да 10 гадоў ППЛ, рэабілітаваны ў 1960.

ПАПОЎ Карней Васілевіч, н. у 1900, калгаснік, 5.6.1935 асуджаны да 10 гадоў ППЛ, рэабілітаваны ў 1966.

ЦЯРЭНЦЬЕЎ Раман Ларывонавіч, н. у 1891, калгаснік, 27.11.1937 прыгавораны да расстрэлу, рэабілітаваны ў 1959.

ШЫЦІКАЎ Яфрэм Мартынавіч, н. у 1897, калгаснік, 25.11.1937 прыгавораны да расстрэлу, рэабілітаваны ў 1959.

ХАЛЮКОЎ Цімафей Яфімавіч, н. у 1881, 27.9.1937 прыгавораны да расстрэлу, расстраляны ў Оршы, рэабілітаваны ў 1989.

ВЁСКА КАЗЛЫ

АЎРАМЕНКА Аўрам Аксёнавіч, н. у 1880, 25.11.1937 прыгавораны да расстрэлу, рэабілітаваны ў 1989.

ВАСАРАЎ Сафрон Яўсеевіч, н. у 1891, 21.4.1934 асуджаны да 3 гадоў ППЛ, 15.5.1945 — на 15 гадоў катаргі, рэабілітаваны ў 1965 і 1989.

КАБАНАЎ Дзямід Патапавіч, н. у 1862, 5.3.1933 прыгавораны да расстрэлу, расстраляны ў Мінску, рэабілітаваны ў 1956.

КАЗЛОЎ Савелій Іванавіч, н. у 1880, 27.9.1937 прыгавораны да расстрэлу, рэабілітаваны ў 1989.

ШАБУНІН Леў Рыгоравіч, н. у 1898, працаваў лесніком, 28.8.1937 прыгавораны да 10 гадоў ППЛ, рэабілітаваны ў 1962.

ШМУР'ЕЎ Фёдар Трафімавіч, н. у 1866, 15.9.1937 прыгавораны да расстрэлу, расстраляны ў Оршы, рэабілітаваны ў 1989.

ВЁСКА КУСТОЎКА

ПІСТАЛЕНКА Іван Фёдаравіч, н. у 1876, 9.1.1933 прыгавораны да расстрэлу, рэабілітаваны ў 1989.

ВЁСКА РУДКАЎШЧЫНА

ВАРАНКОЎ Фауст Іванавіч, н. у 1892, арыштаваны 18.1.1945, рэабілітаваны 9.8.1945.

ІЗМАЙЛОВІЧ Леанід Пракопавіч, н. у 1925, 16.7.1943 асуджаны да 10 гадоў ППЛ, рэабілітаваны 13.12.1957.

ІНТАРЭСАЎ Васіль Іванавіч, н. у 1894, у 1932 раскулачаны, 19.3.1933 прыгавораны да расстрэлу, рэабілітаваны ў 1962.

ІНТАРЭСАЎ Парфір Іванавіч, н. у 1872, 5.3.1938 прыгавораны да расстрэлу, расстраляны ў Мінску, рэабілітаваны ў 1956.

ІНТАРЭСАВА Яўгенія Васілеўна, рэпрэсіравана ў 1932, рэабілітавана ў 1992.

КАВАЛЕЎСКІ Пракоп Трыфанавіч, н. у 1893, 5.3.1933 прыгавораны да расстрэлу, расстраляны ў Мінску, рэабілітаваны ў 1956.

КАВАЛЕЎСКІ Яфрэм Трыфанавіч, н. у 1897, 5.3.1933 асуджаны да 10 гадоў ППЛ, рэабілітаваны ў 1956.

МАКАЎЦОЎ Сямён Клімавіч, н. у 1886, 5.3.1933 асуджаны да 10 гадоў ППЛ, рэабілітаваны ў 1956.

ТАЛАШОЎ Міхаіл Васілевіч, н. у 1905, 5.3.1933 асуджаны да 10 гадоў ППЛ, рэабілітаваны ў 1956.

ЧАРВІНСКІ Аўрам Міхайлавіч, н. у 1883, 12.10.1938 прыгавораны да расстрэлу, расстраляны ў Оршы, рэабілітаваны ў 1989.

ЧАРВІНСКІ Барыс Апанасавіч, н. у 1882, 5.12.1932 прыгавораны да расстрэлу, расстраляны ў Мінску, рэабілітаваны ў 1962.

ЧАРВІНСКІ Іван Варфаламеевіч, н. у 1902, 5.3.1933 прыгавораны да расстрэлу, рэабілітаваны ў 1956.

ШУТАЎ Уладзімір Іванавіч, н. у 1914, 5.3.1933 асуджаны да 10 гадоў, рэабілітаваны ў 1956.

ВЁСКА ХАМІНІЧЫ

БЕРАСНЕВА Агнеса Іванаўна, н. у 1900, арыштавана 11.2.1945, рэабілітавана ў верасні 1945.

БЕРАСНЕЎ Васіль Ціханавіч, н. у 1905, у 1931 раскулачаны і высланы ў Комі-Пярмяцкую акругу, рэабілітаваны ў 1992.

БЕРАСНЕВА Насця Сцяпанаўна, н. у 1903, у 1931 раскулачана, выслана ў Комі-Пярмяцкую акругу, рэабілітавана ў 1992.

БЕРАСНЕЎ Ціхан Майсеевіч, у 1931 раскулачаны і высланы ў Комі-Пярмяцкую акругу, рэабілітаваны ў 1992.

БУЛАСАЎ Кірыл Лявонавіч, н. у 1901, калгаснік калгаса «Шлях да сацыялізму», 25.11.1937 прыгавораны да расстрэлу, расстраляны ў Оршы, рэабілітаваны ў 1960.

БУЛАСАЎ Павел Лявонавіч, н. у 1882, 27.10.1937 прыгавораны да 10 гадоў ППЛ, рэабілітаваны ў 1989.

КАРЖУЕЎ Ігнат Савельевіч, н. у 1871, калгаснік калгаса «Шлях да сацыялізму», 25.11.1937 прыгавораны да расстрэлу, расстраляны ў Оршы, рэабілітаваны ў 1960.

КАРЖУЕЎ Яфрэм Савельевіч, н. у 1873, арыштаваны 28.1.1945, рэабілітаваны ў жніўні 1945.

ЛЯТУЧЫ Давыд Пракопавіч, н. ў 1874, 25.11.1934 прыгавораны да расстрэлу, расстраляны ў Оршы, рэабілітаваны ў 1960.

РАМАНОЎСКАЯ Раіса Давыдаўна, н. у 1896, арыштавана 4.2.1945, рэабілітавана ў красавіку 1945.

УРОДА Іван Андрэевіч, н. у 1867, 25.11.1937 прыгавораны да расстрэлу, расстраляны ў Оршы, рэабілітаваны ў 1960.

ЦАПКОВА Феадосія Савельеўна, н. у 1898, 29.4.1945 выслана ў Краснаярскі край, рэабілітавана ў 1991.

САСУНОЎ Аўдзей Яфрэмавіч, н. у 1884, калгаснік, 4.10.1937 прыгавораны да расстрэлу, рэабілітаваны ў 1959.

САЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА ВІШНЯ

ТУЗКОЎ Юрый Мілетавіч, н. 6.1.1883, рабочы завода «Сельмаш» у г. Разань, 7.7.1935 высланы ў Краснаярскі край па абвінавачванню ў антысавецкай дзейнасці, рэабілітаваны ў 1983.

ВЁСКА ВЯЛІКІЯ ШАРЫПЫ

ГАЛАВАЧОЎ Якаў Васілевіч, н. у 1877, 29.8.1937 асуджаны да 10 гадоў ППЛ, рэабілітаваны ў 1962.

ЗУЕЎ Мікалай Сямёнавіч (КРАЎЦОЎ Панфіл Мікітавіч), н. у 1907, 10.5.1931 асуджаны да 10 гадоў ППЛ, рэабілітаваны ў 1989.

ІВАНОЎ Іван Паўлавіч, н. у 1888, 30.10. 1934 асуджаны да 3 гадоў ППЛ, рэабілітаваны ў 1989.

КАСЬЯНАЎ Савелій, у 1932 асуджаны і раскулачаны, рэабілітаваны ў 1992.

КУЗАЎКОЎ Ануфрый Кузьміч, н. у 1856, 9.3.1930 высланы ў Сібір, рэабілітаваны ў 1989.

КУЗАЎКОЎ Арцём Ануфрыевіч, н. у 1887, 27.9.1937 асуджаны да 10 гадоў ППЛ, рэабілітаваны ў 1989.

ПЕТРУСЕНКА Елісей Міронавіч, н. у 1882, 10.4.1930 асуджаны да 5 гадоў ППЛ, рэабілітаваны ў 1989.

ВЁСКА ЗУБРЫ

БЫНЬКОЎ Якаў Сідаравіч, н. у 1896, 13.10.1937 прыгавораны да расстрэлу, рэабілітаваны ў 1989.

КАСЯКОЎ-ПЫШКОЎ Сяргей Герасімавіч, н. у 1905, 12.10.1937 прыгавораны да расстрэлу, рэабілітаваны ў 1989.

ПАЎЛОЎСКІ Юрый Аляксандравіч, н. у 1903, табельшчык на чыгунцы, 16.9.1927 асуджаны да 3 гадоў высылкі, рэабілітаваны ў 1957.

ПЕЛІКАЎ Герасім Самуілавіч, н. у 1877, 25.11.1937 асуджаны да 10 гадоў ППЛ, рэабілітаваны ў 1957.

СКАРАХОДАЎ Сяргей Лявонавіч, н. у 1895, 25.11.1937 прыгавораны да расстрэлу, рэабілітаваны ў 1969.

ШТУКІН Іван Сямёнавіч, н. у 1902, 25.11.1937 прыгавораны да расстрэлу, рэабілітаваны ў 1959.

ШЧЭРЫН Фока Іванавіч, н. у 1875, 29.8.1937 прыгавораны да 10 гадоў ППЛ, рэабілітаваны ў 1960.

ВЁСКА КАЛАЦІЛЫ

ЦІМОШЧАНКА Лука Агафонавіч, н. у 1874, 19.11.1937 прыгавораны да 10 гадоў ППЛ, рэабілітаваны ў 1959.

ВЁСКА КРАСУЛІНА

БАРАДОЎСКІ Іван Яфімавіч, н. у 1875, 26.12.1932 высланы на 3 гады ў Паўночны край, рэабілітаваны ў 1989.

ВІШНЕЎСКІ Яўціх Епіфанавіч, раскулачаны ў 1932, рэабілітаваны ў 1992.

ПРЫВАЛІНСКІ Яфім Кірылавіч, н. у 1878, 7.2.1933 высланы ў Паўночны край на 3 гады, рэабілітаваны ў 1989.

ВЁСКА КУРТАСЫ

БАРЫСОЎСКІ Савелій Цітавіч, н. у 1892, 29.4.1932 асуджаны да 5 гадоў канцлагера, рэабілітаваны ў 1989.

БІРУНДА Міхаіл Аляксеевіч, н. у 1893, 1.9.1933 асуджаны да 5 гадоў ППЛ, 23.9.1937 прыгавораны да расстрэлу, рэабілітаваны ў 1965 і 1989.

КАРПІЦКІ Іван Нічыпаравіч, н. у 1891, 29.6.1932 высланы на 3 гады ў Казахстан, рэабілітаваны ў 1989.

КАРПІЦКІ Павел Анісімавіч, н. у 1878, асуджаны і раскулачаны ў 1933, рэабілітаваны ў 1992.

КАРПІЦКІ Ягор Нічыпаравіч, н. у 1878, 29.6.1932 прыгавораны да 3 гадоў канцлагера, рэабілітаваны ў 1989.

ЛАГУНОЎ Пётр Андрэевіч, н. у 1892, 15.11.1937 прыгавораны да расстрэлу, рэабілітаваны ў 1989.

ПРЫГАРОЎСКІ Ілья Васілевіч, н. у 1889, 11.3.1931 прыгавораны да 3 гадоў канцлагера, рэабілітаваны ў 1989.

СЕРАФІМОВІЧ Іван Міхайлавіч, н. у 1894, 1.2.1933 асуджаны да 5 гадоў ППЛ, 23.9.1937 прыгавораны да расстрэлу, рэабілітаваны ў 1965 і 1989.

СЕРАФІМОВІЧ Яўмен Міхайлавіч, н. у 1899, 1.2.1933 асуджаны да 7 гадоў ППЛ, рэабілітаваны ў 1965.

ЯКУБОЎСКІ Кандрат Герасімавіч, н. у 1891, 15.6.1932 высланы ў Сібір на 3 гады, рэабілітаваны ў 1989.

ЯКУБОЎСКІ Мікалай Герасімавіч, н. у 1889, 28.6.1932 высланы ў Паўночны край на 3 гады, рэабілітаваны ў 1989.

ЯКУБОЎСКІ Сямён Герасімавіч, н. у 1888, 29.6.1932 заключаны ў канцлагер на 3 гады, рэабілітаваны ў 1989.

В. П. Кавалёў.

ВЁСКА ЛУГІНЫ

ФОМЧАНКА Архіп Ігнатавіч, н. у 1880, рэпрэсіраваны 25.7.1938, рэабілітаваны 7.2. 1939.

ВЁСКА МАЛЫЯ ШАРЫПЫ

КРАЎЦОЎ Мікіта Апанасавіч, у 1927 разам з жонкай Еўдакіяй Емяльянаўнай і сынамі Тарасам (1912 г. н.), Панфілам (1909) раскулачаны і высланы ў Сібір, рэабілітаваны ў 1992.

ВЁСКА МАСАЛЫКІ

ХАРУЖЭНКА Акім Васілевіч, н. у 1913, рэпрэсіраваны 10.11.1938, рэабілітаваны 2.6. 1939.

ВЁСКА ПАТАШЫ

КУДРАЎЦАЎ Іван Ермалаевіч, н. у 1880, 7.2.1933 прыгавораны да 5 гадоў ППЛ, рэабілітаваны ў 1989.

КУДРАЎЦАЎ Іван Мікітавіч, н. у 1901, рахункавод калгаса «Авангард», 25.11.1937 асуджаны да 10 гадоў ППЛ, рэабілітаваны ў 1940.

КУДРАЎЦАЎ Іларыён Елісеевіч, н. у 1904, 7.2.1933 асуджаны да 5 гадоў ППЛ, рэабілітаваны ў 1989.

ВЁСКА РАДЗІВОНАЎКА

ЦЫРКУНОЎ Сямён Піліпавіч, н. у 1895, 5.3.1933 асуджаны да 10 гадоў ППЛ, рэабілітаваны ў 1956.

ВЁСКА САВА

КАВАЛЁЎ Васіль Пятровіч (псеўд. **В. Каваль**), н. у 1907, пісьменнік, 29.10.1937 прыгавораны да расстрэлу, расстраляны ў Мінску, рэабілітаваны ў 1957.

КАВАЛЁЎ Пётр Кліменцьевіч, н. у 1885, у 1937 г. прыгавораны да расстрэлу, рэабілітаваны ў 1989.

КАЗЛОЎ Лазар Рыгоравіч, н. у 1890, 20.1.1934 асуджаны да 3 гадоў ППЛ умоўна, рэабілітаваны ў 1989.

КАЗЛОЎ Фама Іпалітавіч, н. у 1878(83), 20.1.1934 асуджаны да 3 гадоў ППЛ умоўна, 27.9.1937 прыгавораны да расстрэлу, расстраляны ў Оршы, рэабілітаваны ў 1961 і 1989.

НОВІКАЎ Ксенафонт Патапавіч, н. у 1887, 20.1.1931 асуджаны да 3 гадоў ППЛ умоўна, рэабілітаваны ў 1989.

РАДЧАНКА Навум Мікалаевіч, н. у 1885, 3.1.1939 прыгавораны да 3 гадоў канцлагера, рэабілітаваны ў 1989.

ФЕДАРОВІЧ Уладзімір Мінаевіч, н. у 1912, арыштаваны 1.12.1951, рэабілітаваны ў 1952.

ЦЫРКУНОЎ Арцём Маркавіч, н. у 1890, асуджаны 15.10.1938, рэабілітаваны 23.7.1957.

ЦЫРКУНОЎ Варфаламей Патапавіч, н. у 1883, 25.11.1937 асуджаны да 10 гадоў ППЛ, рэабілітаваны ў 1989.

ЦЫРКУНОЎ Фадзей Мамантавіч, н. у 1869, 27.11.1937 асуджаны да 10 гадоў ППЛ, рэабілітаваны ў 1989.

ЧЭРНІКАЎ Ніканор Лазаравіч, н. у 1891, у 1937 асуджаны да 1 года пазбаўлення волі, у 1945 — да 6 гадоў ППЛ, у 1951 — на 10 гадоў ППЛ, рэабілітаваны ў 1955.

ВЁСКА СЛАБАДА

МАСЛЯКОЎ Якаў Якаўлевіч, н. у 1863, 25.11.1937 асуджаны да 10 гадоў ППЛ, рэабілітаваны ў 1960.

УГНАЧОЎ Арцём Яўціхеевіч, н. у 1886, 14.8.1937 расстраляны, рэабілітаваны ў 1989.

УГНАЧОЎ Кузьма Яўціхеевіч, н. у 1894, 15.11.1937 асуджаны да 10 гадоў ППЛ, рэабілітаваны ў 1989.

УГНАЧОЎ Лука Іванавіч, н. у 1874, 5.3.1933 прыгавораны да расстрэлу, расстраляны ў Мінску, рэабілітаваны ў 1956.

УГНАЧОЎ Цімафей Яўціхавіч, н. у 1890, калгаснік калгаса «Верны шлях», 25.11.1937 асуджаны да 10 гадоў ППЛ, пакаранне адбываў у г. Улан-Удэ, рэабілітаваны ў 1960.

ХАМЯКОЎ Павел Пятровіч, н. у 1885, 25.11.1937 асуджаны да 10 гадоў ППЛ, рэабілітаваны ў 1989.

ШЧАРБАКОЎ Уладзімір Кандратавіч, н. у 1890, 9.3.1933 прыгавораны да расстрэлу па абвінавачванню ў антысавецкай дзейнасці, расстраляны ў Мінску, рэабілітаваны ў 1956.

ШЧАРБАКОЎ Якаў Кандратавіч, н. у 1874, 5.3.1933 прыгавораны да расстрэлу па абвінавачванню ў антысавецкай дзейнасці, расстраляны ў Мінску, рэабілітаваны ў 1956.

ВЁСКА ФІЛІПАВА

ІЛЬЯНАЎ Ксенафонт Яфімавіч, н. у 1886, калгаснік калгаса «Новы шлях», 27.9.1937 прыгавораны да расстрэлу, расстраляны ў Оршы, рэабілітаваны ў 1973.

НОВІКАЎ Гаўрыла Іванавіч, н. у 1899, рахункавод сельпо, рэпрэсіраваны 25.7.1938, рэабілітаваны 9.2.1939.

НОВІКАЎ Іван Аўтаномавіч, н. у 1879, 27.9.1937 асуджаны да 10 гадоў ППЛ, рэабілітаваны ў 1973.

НОВІКАЎ Якаў Максімавіч, н. у 1912, 17.5.1931 высланы ў Сібір, рэабілітаваны ў 1989.

НОВІКАЎ Якаў Рыгоравіч, н. у 1881, 29.8.1937 прыгавораны да расстрэлу, рэабілітаваны ў 1968.

ЦЫКУНОЎ Васіль Кузьміч, н. у 1919, 5.4.1941 асуджаны да 7 гадоў ППЛ, рэабілітаваны ў 1956.

ШЧАМЯЛЁЎ Васіль Паўлавіч, н. у 1865, 12.3.1930 высланы ў Паўночны край, рэабілітаваны ў 1989.

ШЧАМЯЛЁЎ Іван Піліпавіч, н. у 1891, 17.5.1931 высланы, рэабілітаваны ў 1981.

ШЧАМЯЛЁЎ Міна Васілевіч, н. у 1901, 12.3.1930 высланы ў Паўночны край, рэабілітаваны ў 1989.

ШЧАМЯЛЁЎ Мірон Васілевіч, н. у 1908, 27.9.1930 заключаны ў канцлагер на 3 гады, рэабілітаваны ў 1989.

ШЧАМЯЛЁЎ Селіван Антонавіч, н. у 1884, 29.8.1934 прыгавораны да расстрэлу, рэабілітаваны ў 1965.

ШЧАМЯЛЁЎ Селівестр Антонавіч, н. у 1899, рэпрэсіраваны 3.8.1932, рэабілітаваны 17.12. 1933.

ШЧАМЯЛЁЎ Сямён Антонавіч, н. у 1886, 17.5.1931 высланы, рэабілітаваны ў 1989.

ВЁСКА ХАРКАЎКА

АВЯР'ЯНАЎ Васіль Антонавіч, н. у 1917, 14.8.1937 прыгавораны да 10 гадоў ППЛ, рэабілітаваны ў 1989.

УТКІН Максім Іванавіч, н. у 1908, 17.4.1937 асуджаны да 10 гадоў ППЛ, рэабілітаваны ў 1989.

УТКІН Мацвей Мікалаевіч, н. у 1879, 27.9.1937 прыгавораны да 10 гадоў ППЛ, рэабілітаваны ў 1989.

ЧЭРНІКАЎ Васіль Лазаравіч, н. у 1893, у 1933 раскулачаны і высланы ў Мурманскую вобл., рэабілітаваны ў 1991.

ВЁСКА ЦЯПЛУХІ

АРЛОЎСКІ Герасім Фядосавіч, н. у 1872, 27.9.1937 прыгавораны да расстрэлу, рэабілітаваны ў 1989.

ПУХОЎСКІ Іван Піменавіч, н. у 1884, рэпрэсіраваны ў 1937, рэабілітаваны ў 1992.

ВЁСКА ШЫРОКІЯ

БЕЛКІН Кандрат Юр'евіч, н. у 1896, 16.4.1931 высланы разам з сям'ёй, рэабілітаваны ў 1965.

БЕЛКІН Трафім Аляксеевіч, н. у 1901, 22.3.1946 асуджаны да 6 гадоў ППЛ, рэабілітаваны ў 1978.

ВАЙЦЯХОЎСКІ Сямён Пракопавіч, н. у 1890, 16.4.1931 высланы з сям'ёй, рэабілітаваны ў 1965.

КАВАЛЁЎ Андрон Лаўрэнавіч, н. у 1892, 16.4.1931 высланы ў Пермскую вобл., рэабілітаваны ў 1965.

ПРАНЖЫЛА Дзяніс Аўрамавіч, н. у 1884, 16.4.1931 высланы з сям'ёй, рэабілітаваны ў 1965.

ПРАНЖЫЛА Сяргей Майсеевіч, н. у 1904, 16.4.1931 высланы з сям'ёй у Пермскую вобл., рэабілітаваны ў 1965.

СНЫТКОЎ Восіп Мікалаевіч, н. у 1894, 17.5.1931 высланы, рэабілітаваны ў 1959.

ХАДЗЯНКОЎ Міхаіл Сцяпанавіч, н. у 1884, 16.4.1931 высланы з жонкай Марыяй Нілаўнай, дзецьмі Сяргеем, Мікітам, Андрэем, Ульянай, Марыяй у Пермскую вобл., рэабілітаваны ў 1992.

ЦІТОЎ Ілья Канстанцінавіч, н. у 1899, 16.4.1931 высланы з сям'ёй, рэабілітаваны ў 1965.

ЦІШКОЎ Іван Піліпавіч, н. у 1894, 16.4.1931 высланы з сям'ёй, рэабілітаваны ў 1965.

ШЛЯХЦІЦАЎ Сямён Восіпавіч, н. у 1884, 16.4.1931 высланы з сям'ёй ў Пермскую вобл., рэабілітаваны ў 1965.

Воіны-землякі, якія загінулі ў савецка-фінляндскую вайну 1939—40 гг.

АНІХОЎСКІ Аляксандр Дзмітрыевіч, н. у 1919 у в. Леніна, вучыўся ў Ленінградскім караблебудаўнічым інстытуце, у 1939 пайшоў добраахвотнікам у Чырвоную Армію, загінуў 22.2.1940 на Карэльскім перашыйку.

АСЮЦІН Фёдар Еўсцігнеевіч, н. у 1906

П. А. Зубкоў.

Ц. І. Харужэнка.

у в. Добрая, працаваў старшынёй калгаса «Верны шлях», у Чырвонай Арміі з 1939, загінуў у лютым 1939 на Карэльскім перашыйку.

БАЛАБОСАЎ Максім Яфімавіч, н. у 1910, прапаў без вестак у 1940.

БАРАШКОЎ Якаў Ільіч, н. у 1912 у в. Арлоўшчына.

ВАСІЛЕНКА Фёдар Паўлавіч, н. у в. Азаравічы, прапаў без вестак у сакавіку 1940.

ГАРАВЫ Кузьма Нічыпаравіч, н. у 1908 у в. Глінькава, прапаў без вестак у студзені 1940.

ГЛЕБКІН Дзяніс Іванавіч, н. у 1909 у в. Вялікае Марозава, прапаў без вестак у сакавіку 1940.

ГУДЫНСКІ Пётр Данілавіч, н. у г. Горкі, загінуў 18.2.1940.

ДАРАШКЕВІЧ Пётр Кузьміч, н. у 1919, у в. Палішына, загінуў у 1939.

ДРОБЫШАЎ Апанас Несцеравіч, н. у 1907 у в. Кацялёва.

ЖАЛЯЗОЎСКІ Карней Арцёмавіч, н. у в. Ходараўка, загінуў у 1940.

ЖАРЫКАЎ Антон Васілевіч, н. у 1905 у в. Панкратаўка, загадчык фермы калгаса «20 год Кастрычніка», у Чырвонай Арміі з 1939, сярж., кам. аддз., прапаў без вестак 23.2.1940.

ЖАРЫКАЎ Піліп Аўрамавіч, н. у 1902 у в. Стан, калгаснік, у Чырвонай Арміі з 1939, загінуў у 1940.

ЖУКОЎСКІ Прохар Паўлавіч, н. у 1907 у в. Цяплухі, прапаў без вестак у сакавіку 1939.

ЗУБКОЎ Пракоп Аляксеевіч, н. у 1905 у в. Стан, загінуў у 1940.

ЗУЕЎ Фядот Сямёнавіч, н. у 1909 у в. Вялікія Шарыпы, загінуў 16.2.1940.

ІВАНОЎ Якаў Данілавіч, н. у 1916 у в. Маслакі, загінуў 20.2.1940.

КАВАЛЁЎ Мікіта Восіпавіч, н. у 1902, прапаў без вестак 9.3.1940.

КАМАСАЎ Цярэнцій Емяльянавіч, н. у 1902 у в. Балбечына, працаваў у лясніцтве, у Чырвонай Арміі з 1939, загінуў 4.3.1940.

КАМКОЎ Мікалай Севасцьянавіч, н. у 1908 у в. Буда, загінуў 12.2.1940.

КАНАЎКОЎ Фядос Ніканавіч, н. у 1905 у в. Мядзведзева, калгаснік, у Чырвонай Арміі з 1939, рад., загінуў у 1939.

КАНАПЛЁЎ Кузьма Міхайлавіч, н. у 1906 у в. Анікавічы, памёр ад ран 16.2.1940.

КРУГЛЯКОЎ Нічыпар Фёдаравіч, н. у 1918 у в. Аршань, прапаў без вестак у сакавіку 1940.

КУЛЯШОЎ Пётр Васілевіч, н. у 1912 у в. Равячына, загінуў 22.2.1940.

КУРТАСАЎ Васіль Фролавіч, н. у 1909 у в. Паташы, прапаў без вестак у лютым 1940.

ЛАЗАВЫ Карп Аляксеевіч, н. у г. Горкі, загінуў 25.9.1939.

ЛАСТОЎСКІ Андрэй Паўлавіч, н. у 1910 у в. Сахараўка, рабочы, у Чырвонай Арміі з 1939, загінуў у 1939.

МАНЕЦКІ Панас Паўлавіч, н. у 1910 у в. Сахараўка, рабочы, у Чырвонай Арміі з 1939, загінуў у 1939.

МАЦВЕЕЎ Андрэй Фаміч, н. у 1913 у в. Варкава, загінуў у сакавіку 1940.

НЕМЦАЎ Павел Іванавіч, н. у 1915 у в. Добрая, у Чырвонай Арміі з 1937, лейт., загінуў у сакавіку 1940.

НОВІКАЎ Рыгор Лаўрэнцьевіч, н. у 1901 у в. Сахараўка, калгаснік калгаса імя Куйбышава, у Чырвонай Арміі з 1939, загінуў у 1939.

ОСІПАЎ Рыгор Пятровіч, н. у 1912, загінуў у 1940.

ПАДБЯРОЗКІН Кірыла Яфімавіч, н. у 1910 у в. Целяшоўка, загінуў 22.2.1940.

САХАРАЎ Ціт Паўлавіч, н. у 1910 у в. Палзухі, загінуў у 1939.

СВІРЫДЭНКА Фёдар Раманавіч, н. у 1904 у в. Валынцава, загінуў у 1940.

СІМАКОЎ Ігнат Яфрэмавіч, н. у 1924 у в. Шышава, у Чырвонай Арміі з 1930, ст. лейт., загінуў 12.03.1940.

СЛІВАНКОЎ Емяльян Малахавіч, н. у 1908 у в. Тормаль, працаваў на цагельным заводзе ў г. Горкі, у Чырвонай Арміі з 1938.

СТАЛЬЧАНКА Апанас Мацвеевіч, н. у 1911, памёр ад ран 12.2.1940.

ТУЗКОЎ Фадзей Ціханавіч, н. у 1908 у г. Горкі, прапаў без вестак у сакавіку 1940.

ФЕСІН Сяргей Іванавіч, н. у в. Сакалова.

ХАРУЖЭНКА Цімафей Іванавіч, н. у в. Чапялінка, у Чырвонай Арміі з 1939, загінуў у верасні 1939.

ЧАРНАМОРДЗІК Іван Яўсеевіч, н. у в. Асіповічы, прапаў без вестак 24.2.1940.

ШЭКІН Фядос Фёдаравіч, загінуў 22.2.1940.

ШУПЛАЎ Тарас Сямёнавіч, н. у 1909 у в. Тушкава, загінуў 25.2.1940.

Падзеі, факты, лічбы

1917 г., снежань. У Горках і павеце перамагла Савецкая ўлада.

1918 г., жнівень. Пачала выходзіць газета «Известия Горецкого уездного Совета рабочих, крестьянских и солдатских депутатов».

1919 г., 7 красавіка. Рашэннем калегіі Наркамасветы РСФСР горацкія сярэднія сельскагаспадарчыя ўстановы рэарганізаваны ў Горацкі сельскагаспадарчы інстытут.

1919 г., 25 мая. Пастановай 1-га Гомельскага губернскага з'езда г. Горкі і павет уключаны ў склад Гомельскай губерні.

1919 г., 27 верасня. Адбыўся першы камуністычны суботнік. Працавала 35 чалавек на ачыстцы тэрыторыі згарэўшага завода сельскагаспадарчых машын.

1919 г. Пачала выходзіць газета «Луч Интернационала».

1920 г., 26 мая. У Горках вайсковая і грамадзянская ўлада перайшла да Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта, які падпарадкаваўся Рэўваенсавету 16-й арміі.

1921 г., лістапад. Старшынёй Горацкага павятовага выканкома выбіраецца М. М. Галадзед, будучы сакратар ЦК КПБ, старшыня СНК БССР.

1921 г., снежань. Праведзены месячнік дапамогі галадаючым Паволжа.

1921 г. Пачаў працаваць чыгуначны ўчастак дарогі Орша — Крычаў, які прайшоў праз Горкі і павет.

1922 г., ліпень. Прэзідыум ВЦВК РСФСР пастанавіў Горацкі павет і г. Горкі ўключыць у склад Смаленскай губерні.

1922 г., 1 верасня. Пры Горацкім сельскагаспадарчым інстытуце створана Заходняя доследна-меліярацыйная арганізацыя.

1923 г., красавік. Раённая газета пачала выходзіць пад назвай «Горецкие известия» — орган павятовага РКП, павятовага выканкома Савета рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў і прафбюро.

1923 г., верасень. Каморніцка-таксатарскія курсы, якія працавалі пры Горацкім сельскагаспадарчым інстытуце, былі рэарганізаваны ў землеўпарадкавальны тэхнікум.

1923 г. Выйшаў першы том «Запісак Горацкага сельскагаспадарчага інстытута».

1924 г., люты. Заснаваны раённы Саюз спажывецкіх таварыстваў.

1924 г., 3 сакавіка. Прынята пастанова ВЦВК «О передаче Белоруссии районов с преобладающим белорусским населением». Горкі і павет увайшлі ў склад БССР.

1924 г., 17 ліпеня. Утворана Аршанская акруга. Горкі і павет увайшлі ў яе склад.

1924 г., 1 жніўня. У горадзе працуе 4 пачатковых школы, 1 сямігодка, 3 дзетдамы, 1 дзетсад, 1 прафшкола, школа для дарослых, 2 лікпункты, 2 бібліятэкі, у якіх налічваецца 52 тыс. кніг, бібліятэкі наведвае 2845 чытачоў.

1924 г. Пабудаваны будынак чыгуначнай станцыі «Беларускія Горкі», з 1930 г. — «Пагодзіна».
У Горках пражывае 7761 жыхар.

1925 г., 6 чэрвеня. Горкі наведаў Я. Купала. Ён удзельнічаў у літаратурным вечары, які адбыўся ў парку на гары «Парнас».

1925 г., 5 жніўня. СНК БССР прыняў пастанову аб зліцці Беларускага інстытута сельскай гаспадаркі (г. Мінск) і Горацкага сельскагаспадарчага інстытута і ўтварэнні Беларускай акадэміі сельскай гаспадаркі імя Кастрычніцкай рэвалюцыі.

1925 г., 28 лістапада. Я. Купала і Я. Колас прысутнічалі на ўрачыстым сходзе, які быў прысвечаны пераўтварэнню сельскагаспадарчага інстытута ў акадэмію.

1925 г. БСГА наведаў М. І. Вавілаў для выбару месца пад філіял Інстытута прыкладной батанікі ў Беларусі. У Горках быў створаны апорны пункт гэтага інстытута.

У Горках арганізаваны камбінат, які аб'яднаў электрастанцыю, бойню і млын. Працавалі таксама два лесапільныя і адзін гарбарны заводы, друкарня.

1926 г., люты. У Горках працуе бальніца, дзве амбулаторыі, дзіцячая кансультацыя.

1926 г., 17 снежня. Паводле перапісу ў раёне 56 829 чал., з іх мужчын 27 804, жанчын 29 025. У Горках 8527 чал., 1262 дамы.

1927 г., 24 красавіка. У клубе БСГА адбылася сустрэча з Я. Коласам.

1927 г., 1 мая. Пры БСГА адкрыты першы ў СССР нядзельны двухгадовы універсітэт для сялян. У 1930 г. рэарганізаваны ў калгасны універсітэт.

1927 г. У Горках працавала 83 саматужныя прадпрыемствы.

1928 г., люты. Прыязджалі пісьменнікі Я. Купала, Ц. Гартны, М. Зарэцкі, А. Александровіч.

1928 г., 26 красавіка. У памяшканні клуба адбыліся гастролі Першага Беларускага Дзяржаўнага тэатра.

1929 г., 4 кастрычніка. Выйшаў першы нумар шматтыражнай газеты БСГА «За пралетарскія кадры»

1929 г. У Горках пражывала 8928 жыхароў. Жылая плошча ў горадзе ў 1925 г. складала 40 859 кв. метраў, у 1928 г. — 44 223 кв. метраў. Дзяржаве належала 4856 кв. метраў, прыватнаму сектару — 39 367 кв. метраў.

У Горацкім прамысловым камбінаце працавала 23 рабочых.

1930 г., вясна. У актавай зале БСГА адбылася сустрэча з Я. Коласам.

1930 г., 22 кастрычніка. Выйшаў першы нумар раённай газеты «Ленінскі шлях».

1930 г., лістапад. Створана машынна-трактарная станцыя.

1931 г., 1 лістапада. Дала ток гарадская электрастанцыя.

1931 г., лістапад. Пушчаны ў строй Горацкі льнозавод з магутнасцю перапрацоўкі 9 тыс. тон сухой трасты ў год.

1934 г. Працуюць ільнозавод, крухмальны завод, хлебазавод, 2 лесапільныя заводы, пункт па апрацоўцы дрэва Белдзяржбуда, электрастанцыя, 6 арцелей прамкааперацыі.

1935 г., май. Выйшаў тысячны нумар газеты «Ленінскі шлях».

1937 г., верасень. Ажыццяўляўся збор сродкаў у фонд дапамогі працоўным Іспаніі.

1939 г. У Горках 12,3 тыс. жыхароў.

1940 г., 17 снежня. Беларускі сельскагаспадарчы інстытут у сувязі са 100-годдзем з дня заснавання ўзнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. 14 супрацоўнікаў інстытута ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі СССР.

1941

1945

ІШЛА ВАЙНА СВЯШЧЭННАЯ

У першыя дні

22 чэрвеня 1941 г. у Горках, на плошчы, размешчанай супраць клуба Беларускага сельскагаспадарчага інстытута, адбыўся мітынг. Рабочыя і служачыя горада, выкладчыкі і студэнты заявілі аб сваёй рашучасці стаць на абарону Радзімы. Многія ўдзельнікі мітынгу адразу ж накіраваліся ў райваенкамат з просьбай адправіць іх на фронт. Пайшлі ў дзеючую армію афіцэры запаса, тыя, хто меў мабілізацыйнае прадпісанне. На другі дзень вайны праводзілі на фронт 27 студэнтак, якія атрымалі ў інстытуце кваліфікацыю медыцынскіх сясцёр. У горадзе паявіліся бежанцы. Інстытут рыхтаваўся да эвакуацыі. Студэнты старэйшых курсаў былі мабілізаваны на будаўніцтва аэрадрома.

Для барацьбы з варожымі лазутчыкамі і парашутыстамі ў Горках быў створаны знішчальны батальён. Яму была даручана ахова чыгункі і шасэйнай дарогі Орша — Горкі.

На ўскраіне Горак узводзіўся абарончы рубеж. Тысячы жыхароў горада і навакольных вёсак капалі процітанкавыя равы. Людзі працавалі па 14—16 гадзін у суткі.

У Горках не было буйных прадпрыемстваў, тым не менш, пачынаючы з 27 чэрвеня, горад падвяргаўся налёту фашысцкай авіяцыі. Былі разбураны гарадок механізацыі сельскай гаспадаркі, музей сельскагаспадарчай тэхнікі, гаражы трактароў і аўтамабіляў, іншыя аб'екты інстытута.

Раённыя ўстановы, прадпрыемствы, інстытут падрыхтавалі больш каштоўнае абсталяванне і маёмасць да эвакуацыі. Аднак вывезці яго не ўдалося — транспарт быў перагружаны перавозкай войск, узбраення, абсталявання буйных прамысловых прадпрыемстваў. 3 і 6 чэрня ад станцыі Пагодзіна адправіліся на ўсход два чыгуначныя эшалоны, эвакуіравалася каля 2 тысяч жыхароў горада.

12 ліпеня ўсе ваеннаабавязаныя па ўказанні Горацкага райваенкамата пешшу накіраваліся на сборны пункт, дзе ўліліся ў воінскія падраздзяленні. У горадзе засталася частка знішчальнага батальёна. У гэты ж дзень фашысцкія войскі занялі Горкі. У хуткім часе быў акупіраваны ўвесь Горацкі раён.

Абарона

Нягледзячы на гераічнае супраціўленне, часці Заходняга фронту не змаглі затрымаць ворага ў прыгранічнай зоне і з цяжкімі баямі адступалі на ўсход.

Камандаванне нямецка-фашысцкіх войск прыняло рашэнне акружыць савецкія падраздзяленні, што абаранялі рубеж Заходняй Дзвіны і Дняпра, авалодаць раёнам Орша — Віцебск — Смаленск і адкрыць самы кароткі шлях на Маскву. Да канца першай дэкады ліпеня танкі праціўніка выйшлі да Дняпра ў раёне Орша — Шклоў — Магілёў. Войскі Заходняга фронту адбілі ўсе спробы ворага фарсіраваць Днепр з ходу.

10 ліпеня нямецка-фашысцкія часці аднавілі наступленне: 2-я танкавая група Гудэрыяна масіраванымі ўдарамі на вузкіх участках зламала супраціўленне савецкіх войск. 24-ы танкавы корпус праціўніка пераправіўся праз Днепр паміж Быхавам і Магілёвам і наносіў удар у напрамку Слаўгарад — Рослаў. 46-ы матарызаваны корпус фарсіраваў раку ў раёне Шклова і наступаў на Горкі — Пачынак — Ельня. 47-ы матарызаваны корпус фарсіраваў Днепр у раёне Копысі ў ноч на 11 ліпеня і накіраваўся на Смаленск.

Савецкае камандаванне прыняло рашэнне спыніць наступленне ворага. 1-я Маскоўская мотастралковая дывізія, якой камандаваў Я. Р. Крэйзер, атрымала загад пераправіцца на ўсходні бераг Дняпра і разам з 61-м стралковым корпусам нанесці ўдар на Копысь і адкінуць праціўніка за Днепр. Дывізія перайшла праз мост у Оршы на ўсходні бераг Дняпра і рушыла на паўднёвы ўсход, напярэймы ворагу, які рухаўся на Горкі. У гэты час перадавыя нямецкія часці прасоўваліся да ракі Бася, іх разведка снавала ўздоўж шашы Орша — Горкі. Над раёнам Копысі, прыкрываючы фарсіраванне Дняпра асноўнымі сіламі ворага, баражыравалі «месершміты». Нямецкія самалёты з малых вышынь бамбілі нашы адыходзячыя часці.

Камандзір дывізіі Я. Р. Крэйзер вырашыў нанесці ўдар па нямецкіх калонах: адным палком уздоўж шашы Сава — Горкі, другім — на Казловічы. Але здзейсніць гэты намер не ўдалося. Я. Р. Крэйзер папаў пад налёт варожай авіяцыі, асколкам бомбы быў паранены і адпраўлены ў шпіталь. Камандаванне дывізіяй прыняў палкоўнік Глуздоўскі.

175-ы мотастралковы полк гэтай дывізіі атакаваў аўтакалону праціўніка з пяхотай, якая рухалася ад Казловічаў на Добрынь і падыходзіла да шашы Орша — Горкі, і разбіў яе. Але поспех быў часовы.

6-ы мотастралковы полк стрымліваў праціўніка ў раёне вёскі Сава, на шашы Орша — Горкі. Падыходзячыя нямецкія калоны, якія сустракалі ўпартае супраціўленне, пакідалі заслоны і абыходзілі полк бокам, працягваючы рух на Горкі. У напрамку горада наступала 10-я нямецкая дывізія 46-га матарызаванага корпуса 2-й танкавай групы нямецкіх войск. Часці 61-га стралковага корпуса, што абараняліся ў раёне Копысі, не вытрымалі ўдару нямецкіх танкаў і авіяцыі, пачалі адыходзіць у напрамку рэк Бася, Проня.

1-я Маскоўская мотастралковая дывізія апынулася ў тыле ворага. Яе спробы прабіцца ў напрамку на Ляды ці Чырвонае поспеху не мелі. 16 ліпеня камандзір дывізіі прыняў рашэнне прарвацца ў напрамку Магілёва. Пачаўся цяжкі паход па тылах ворага. Рухаліся ў напрамку Сава — Зубры — Палёнка — Арлоўшчына — Любіж. На зыходзе 25 ліпеня дывізія падышла да Магілёва, дзе злучылася з войскамі, што абаранялі горад.

Ад Шклова ў напрамку Горак па палявых дарогах на Маслакі — Чапялінку адыходзіў 2-і стралковы корпус: 100-я і 161-я стралковыя дывізіі, 151-ы кар-

пусны артылерыйскі полк і іншыя часці.

161-я стралковая дывізія палкоўніка А. І. Міхайлава атрымала загад: да раніцы 12 ліпеня заняць абарону на захад ад Горак на рубяжы Папкоўка — Мацюты — Стан. У ноч на 12 ліпеня дывізія пачала адыход на ўказаны рубеж. На досвітку і на працягу дня варожыя самалёты неаднаразова бамбілі і абстрэльвалі з паветра калоны дывізіі. Некаторыя падраздзяленні, што рухаліся па лясных дарогах, адхіліліся ад зададзеных маршрутаў. Таму на ўказаны рубеж дывізія выйшла толькі раніцай 13 ліпеня.

Да гэтага часу гітлераўскія часці, што абышлі савецкія войскі справа і злева, 12 ліпеня ўступілі ў Горкі. 161-я стралковая дывізія і іншыя часці 2-га стралковага корпуса і яго штаб апынуліся ў тыле ворага ў раёне вёсак Гулідаўка, Чапялінка.

Ацаніўшы абставіны, камандаванне дывізіі прыняло адпаведнае рашэнне (гл. артыкул «Дзейнічалі рашуча»).

100-я стралковая дывізія генерала Русіянава адыходзіла ад Дняпра па свайму маршруту, прайшла праз Горацкі раён, выйшла ў Манастыршчанскі раён Смаленскай вобласці і там злучылася з дзеючымі савецкімі войскамі.

100-я і 161-я стралковыя дывізіі 2-га стралковага корпуса ў першыя дні вайны паказалі прыклады мужнасці, гераізму і арганізаванасці. Яны ў ліку першых былі перайменаваны ў гвардзейскія: 100-я стала называцца 1-й гвардзейскай, 161-я — 4-й гвардзейскай стралковымі дывізіямі. Гвардзейскай стала і 1-я Маскоўская мотастралковая дывізія, якая пазней атрымала назву 1-я гвардзейская Маскоўска-Мінская стралковая дывізія.

У сярэдзіне ліпеня 1941 г. 57-я танкавая дывізія атрымала загад затрымаць наступленне гітлераўцаў на Смаленск. Мотастралковы полк маёра Асокіна і прыдадзеныя яму танкавыя падраздзяленні з баямі адыходзілі па дарозе Копысь — Горкі. Не даходзячы да Горак, у раёне вёсак Пална — Палёнка — Тушавая — Ліхачова занялі абарону.

Раніцай 17 ліпеня з'явілася калона варожых аўтамашын, якая рухалася пад аховай танкаў і матацыклістаў. Танкісты нанеслі ёй сакрушальны ўдар (гл. артыкул «Атакавалі калону»).

Вечарам, згодна з загадам, мотастралковы полк з прыдадзенымі яму танкамі адышоў у лес і ўзяў кірунак на пасёлак Чырвоны Смаленскай вобласці, дзе асноўныя сілы дывізіі стрымлівалі немцаў, што рваліся да Смаленска.

Акупацыйны рэжым

Горацкі раён быў акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі 12 ліпеня 1941 г. У адміністрацыйным плане ён уваходзіў у вобласць армейскага тылу групы армій «Цэнтр».

Кантроль над акупіраванай тэрыторыяй раёна забяспечваўся сістэмай нямецкіх гарнізонаў і паліцэйскіх участкаў. У горадзе акупанты стварылі камендатуру, магістрат. У клубе інстытута размясцілі лагер ваеннапалонных, гестапа заняло першы корпус, аўдыторыю № 81 ператварылі ў камеру смяротнікаў.

З першых дзён акупацыі раёна фашысты пачалі ствараць так званы «новы парадак» — жорсткі рэжым беззаконня, гвалту, грабяжу і крывавага тэрору. Уся паўната ўлады належала фашысцкім ваенным і цывільным акупацыйным уладам. Насельніцтва было пазбаўлена элементарных грамадзянскіх правоў, былі ўведзены надзвычайнае становішча, сістэма заложнікаў.

Асаблівая жорсткасць праяўлялася да яўрэйскага насельніцтва. Яго сабралі ў межах вуліц Мсціслаўскай, часткі Інтэрнацыянальнай, дзе і ўтварылі

горацкае гета. Голад, цяжкая праца і пабоі рабілі невыносным жыццё тых, хто там знаходзіўся. 7 кастрычніка 1941 г. у раёне в. Задарожжа, па расказах сведкаў, было расстраляна больш за 2 тыс. чалавек. Яўрэйскае насельніцтва было знішчана ў мястэчку Раманава, вёсках Горы, Леніна, Рудкаўшчына, Верашчакі (гл. дакумент «Акт Горацкай раённай камісіі...).

Абапіраючыся на сістэму ваенных і паліцэйскіх гарнізонаў, акупанты праводзілі падатковую палітыку, накіраваную на выкачванне з насельніцтва як мага большай колькасці сельскагаспадарчых прадуктаў, жорсткі рэжым паднявольнай працы і бесчалавечная эксплуатацыя таксама ўваходзілі ў паняцце «новага парадку». Сельскае насельніцтва абкладвалася непасільнымі падаткамі, паборамі, пастаўкамі, працоўнымі павіннасцямі, якія неабмежавана мог назначыць і павялічыць любы прадстаўнік акупацыйнай адміністрацыі.

Мэтай акупацыйнай палітыкі гітлераўцаў было планамернае знішчэнне насельніцтва. Гэтаму служыла сістэма лагераў смерці, турмы, карныя аперацыі.

Фронт у тыле ворага

Жорсткімі расправамі над насельніцтвам акупанты імкнуліся запалохаць людзей, зламаць волю да барацьбы і веру ў перамогу. Але савецкія людзі не скарыліся ворагу, яны ўзняліся на барацьбу. У першыя дні прыходу немцаў у Горкі камсамольцы Файкін, Леўшуноў і Салодкі падпалілі прадуктовыя склады. Акупанты жорстка расправіліся з маладымі патрыётамі. Яны кінулі Салодкага жывым у агонь, а Файкіна і Леўшунова расстралялі. Але пажары працягваліся. Згарэў хлебазавод, гарэлі бальніца, магазіны і грамадскія будынкі — патрыёты дзейнічалі.

Камуністы і камсамольцы, беспартыйныя, воіны, якія трапілі ў акружэнне, аб'ядноўваліся для барацьбы з акупантамі. Узніклі патрыятычныя падпольныя групы. «Выросла сеть патриотического подполья в Горецком районе. Зародившись зимой 1941/42 г., к маю подпольные группы действовали на многих предприятиях и в учреждениях Горок, в ряде других населенных пунктов. Советские патриоты сумели внедриться в горецкий магистрат, местную комендатуру, полицейскую школу, солдатское казино. Они вели массово-политическую и организаторскую работу среди рабочих кирпичного, деревообрабатывающего, маслодельного и льняного заводов, на электростанции, в городской кузнице и МТС, а также среди жителей Губино, Овсянки, Ольховки, Паленки, Чепелинки и других деревень»*.

Актыўны ўдзел у стварэнні падпольнай арганізацыі ў Горках прымалі П. І. Яцун, С. І. Вараб'ёў, П. Н. Савінаў, А. П. Кузняцоў, П. Х. Кажура, В. М. Філіпеня, Н. В. Аляхновіч і іншыя. На адной з сустрэч В. М. Філіпеня пазнаёміў падпольшчыкаў з Л. Дз. Нярушкіным, які да вайны працаваў дырэктарам Чэрнеўскай МТС, і супрацоўнікам сельгасінспекцыі Н. В. Аляхновічам. Дамовіліся, што Нярушкін будзе падбіраць людзей для барацьбы з акупантамі ў Дрыбіне, а ў Горках

* Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны. Мн., 1983. Т. 1. С. 265.

разгорнуць гэту барацьбу В. М. Філіпеня і Н. В. Аляхновіч.

17 снежня 1941 г. у доме А. П. Кузняцова сустрэліся С. І. Вараб'ёў, П. Х. Кажура, П. Н. Савінаў і П. І. Яцун. Вырашылі стварыць падпольныя групы ў горадзе, на льнозаводзе, на цагельным заводзе, Горацкай МТС.

Горацкую падпольную групу ўзначаліў П. Х. Кажура. У яе склад увайшлі дачка Пятра Хрысанавіча Вольга, А. С. Магазіншчыкаў, М. Я. Шыпілін, П. І. Яцун.

Падпольнай групай на льнозаводзе, у якую ўваходзілі М. І. Грамакоўскі, М. К. Дурнеў, М. І. Колакалаў, А. П. Кузняцоў, кіраваў П. Н. Савінаў.

А. І. Трэмба ўзначаліў падпольшчыкаў на цагельным заводзе, сярод якіх былі І. С. Марчанка, В. М. Махлаёў, І. В. Махлаёў, К. В. Махлаёў.

У Горацкай МТС групу арганізаваў С. І. Вараб'ёў. У яе склад увайшлі В. І. Вараб'ёва, Е. І. Вараб'ёва, С. І. Дзенісенка, С. П. Сарокін, П. А. Філімонаў, В. М. Філіпеня.

Кіраваў групамі Горацкі падпольны цэнтр: П. І. Яцун, А. П. Кузняцоў, С. І. Вараб'ёў, П. Н. Савінаў, П. Х. Кажура, А. І. Трэмба.

Падпольшчыкі ратавалі людзей ад выгану ў Германію, збіралі зброю. Яны перадалі партызанам каля 95 вінтовак, два ручныя кулямёты, больш за 160 гранат, 15 000 патронаў. На іх рахунку дыверсіі на электрастанцыі, цагельным заводзе, яны спалілі хлебазавод, зерне ў былым саўгасе «Горкі», нямецкае казіно, якое было размешчана ў вучэбным корпусе сельскагаспадарчай акадэміі.

Дзейнічалі патрыёты не толькі ў горадзе. Падпольную групу ў вёсцы Добрая ўзначальвала Д. Ф. Вайстрова, у склад уваходзіла яе сястра Л. Ф. Вайстрова, М. І. Мацуеў, І. П. Немцава, П. А. Рыжкоў.

Старшыня калгаса В. К. Асюцін арганізаваў падпольную групу ў вёсцы Аўсянка. Усе яе члены — А. П. Грыгор'еў,



А. С. Магазіншчыкаў.

І. В. Махлаёў.

А. А. Свістуноў, Я. М. Шардулева, В. Р. Шураў загінулі.

У Альхоўцы работу вялі В. В. Быкаў, Е. М. Жарыкаў, І. М. Лебедзеў, М. Л. Міркін, Я. Я. Папсуеў, І. П. Шарснёў. Актыўна дзейнічалі браты Уладзімір і Васіль Мацюшэнкі, іх сястра Рая.

З камсамольцаў А. З. Васільева, І. М. Воранава, І. М. Дзям'янава, В. М. Дзям'янава, С. В. Ісакава, А. К. Кузьміна, С. М. Арлова, І. А. Панцялеева, Ц. К. Шыцікава складалася група ў вёсцы Палёнка. Узначальваў яе Ф. М. Дзям'янаў.

Раённая падпольная арганізацыя налічвала 78 чалавек, аб'яднаных у 12 груп.

Больш падрабязныя звесткі захаваліся пра дзейнасць падпольных груп у вёсках Рэкатка, Тудараўка, Чапялінка.

Вёска Рэкатка размяшчалася сярод вялікага лясного масіву. Да вайны тут налічвалася 70 двароў. Ужо ўвосень 1941 г. у вёсцы пачала дзейнічаць падпольная група, якой кіраваў Я. Е. Дзмітрыеў. Нарадзіўся ён у 1924 г. Перад вайной паспеў скончыць дзевяць класаў сярэдняй школы ў Горках. Група ўстанавіла сувязь з падпольшчыкамі горада. Яўген Дзмітрыеў і Мікалай Ануфрыеў некалькі разоў прыходзілі ў Горкі да П. І. Яцуна, атрымлівалі ад яго ўказанні, прывозілі зброю, узрыўчатку, бікфордаў шнур. У доме

В. М. Шчарбатавай пісалі ад рукі лістоўкі, распаўсюджвалі іх па вёсках.

Патрыётам дапамагалі жыхары вёскі. Калі з акружэння вярнуўся дадому Ф. А. Вараб'ёў, падпольшчыкам удалося вылучыць яго на пасаду старасты вёскі. Праз сваю жонку Елізавету Сямёнаўну і сына Жэню ён паведамляў падпольшчыкам аб небяспецы альбо на вуглу яго пуні вывешваўся белы ручнік — умоўны знак. Калі па даносу здраднікаў каго-небудзь арыштоўвалі, за яго паручаўся староста Ф. А. Вараб'ёў. Немцы даведаліся аб тым, што ён аказвае дапамогу падпольшчыкам, і арыштавалі. З жніўня 1942 г. пасля жорсткіх допытаў Ф. А. Вараб'ёў быў расстраляны. Расправіліся акупанты і з яго братам Фядотам. Жонка Ф. А. Вараб'ёва, трынаццацігадовы сын і бацька пайшлі ў партызаны. 5 жніўня ў час блакады бацька быў схоплены карнікамі і расстраляны. 1 мая 1944 г. загінуў у баі і яго сын Жэня.

У верасні 1942 г. моладзь Рэкаткі пайшла ў лес, улілася ў партызанскую брыгаду «Звязда».

У заходняй частцы Горацкага раёна, на самай мяжы са Шклоўскім, ёсць вёска Тудараўка. У пачатку вайны лёс закінуў сюды чырвонаармейцаў Вагана Агаджаняна, Барыса Шыманоўскага, Віктара Андрэева, Івана Нямыкіна, Іосіфа Жытнікава. Пазней аказаўся тут і Ф. І. Чабыкін. Добрыя людзі далі прытулак салдатам, прынялі як родных. Ваган Агаджанян і Барыс Шыманоўскі вырашылі арганізаваць у Тудараўцы падпольную групу. Іх падтрымалі астатнія акружэнцы. Удзельнічаць у барацьбе з ворагам выказалі жаданне маладыя хлопцы Тудараўкі — Фёдар Гульцоў, Цімафей Галазубаў, браты Іван і Мікалай Дуцько, Пётр Ларыёнаў і іншыя.

Пачалі з лістовак, у якіх прызывалі насельніцтва не верыць фашысцкай прапагандзе, пераконвалі, што савецкі народ пераможа. Пісалі іх Агаджанян і Шыманоўскі, Мікалай Дуцько перапісваў і размнажаў, Іван Дуцько і Цімафей Галазубаў раскідвалі іх па вёсцы.

Віктар Андрэеў цудоўна іграў на гармоніку, Іван Нямыкін хораша танцаваў. Маючы добрага гарманіста, падпольшчыкі пачалі наладжваць вечарынкі ў Тудараўцы, потым у Зімніках, Трасным, Анікавічах і іншых вёсках. Туды збіралася ўся моладзь, прыходзілі людзі старэйшага ўзросту. Падпольшчыкі знаёміліся з імі, расказвалі аб становішчы на франтах, зверствах захопнікаў. Былі ўстаноўлены сувязі з падпольшчыкамі Шклоўскага раёна. У сярэдзіне 1942 г. В. Агаджанян і Ф. І. Чабыкін пайшлі ў партызаны.

У вёсцы Чапялінка таксама дзейнічала падпольная група, якой кіраваў І. Ф. Вінаградаў. Яна была цесна звязана з Горацкім падполлем. І. Ф. Вінаградаў часта бываў у П. І. Яцуна, аднаго з членаў цэнтра. Сувязь з ім падтрымлівалася праз Лаўдзікава, які вазіў хлеб для рабочых торфазавода. Потым яго фашысты расстралялі. Па загаду П. І. Яцуна ў доме Е. Г. Ленчыкава была схавана рацыя разведчыка Смелава. У Чапялінку па суботах хадзілі разведчыцы Яўгенія Сарокіна і Аляксандра Гарбузова і перадавалі ў Маскву сабраныя за тыдзень звесткі аб руху варожых часцей. Немцы даведаліся аб гэтым. Яны прыехалі ў Чапялінку, акружылі дом Е. Г. Ленчыкава, але нікога там не знайшлі. Гаспадар з жонкай, а таксама Лагімахаў, Сарокіна, Гарбузова і іншыя пайшлі ў партызанскі атрад.

У ліпені 1942 г. Горацкай падпольнай арганізацыі, якая трапіла ў поле зроку палявой паліцыі, быў нанесены цяжкі ўдар. У горадзе і раёне гітлераўцы арыштавалі 75 чалавек. Расправа над патрыётамі працягвалася каля месяца. 11 ліпеня быў расстраляны член падпольнага цэнтра горада А. П. Кузняцоў, 12 ліпеня карнікі павесілі кіраўніка П. І. Яцуна, падпольшчыкаў І. С. Марчанку, В. М. Махлаёва,

С. І. Дзенісенку, А. С. Магазіншчыкава.

Пакаранне было публічным, у скверы інстытута. У якасці шыбеніц былі выкарыстаны старыя ліпы. Сведкі расказвалі, што падпольшчыкі вялі сябе мужна. Павел Яцун сам надзеў на шыю пятлю і крыкнуў: «Нашы прыйдуць...» Выстралам ў патыліцу фашыст абарваў жыццё героя.

Пасля масавага пакарання падпольшчыкаў барацьба з акупантамі працягвалася. Той, хто застаўся ў жывых, вёў барацьбу і ў горадзе і на сяле.

ГОРАЦКІ ПАДПОЛЬНЫ РАЙКОМ КП(б)Б

Организован 28 августа 1943 года уполномоченным Могилевского подпольного обкома КП(б)Б. Секретарем райкома партии утвержден П. О. Тишков. Базировался в партизанской бригаде № 17 Н. И. Китаева (комиссар П. С. Ревяков).

Состав подпольного райкома КП(б)Б.

Секретарь Тишков Павел Осипович (28.8.1943—2.12.1943).

Члены райкома: Овсянников Андрей Александрович (28.8.1943—2.12.1943), Ревяков Петр Сильвестрович (28.8.1943—2.12.1943), Коршунов Михаил Федорович (28.8.1943—2.12.1943), Шульгин Алексей Васильевич (28.8.1943—2.12.1943).

Друкуецца па кн.: Подпольные партийные органы компартии Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (1941—1944). Мн., 1975. С. 192.

ГОРАЦКІ ПАДПОЛЬНЫ РАЙКОМ ЛКСМБ

До создания подпольного райкома ЛКСМБ комсомольской работой в районе руководил уполномоченный ЦК ЛКСМБ С. Е. Янченко (8.1942—1.1943).

Подпольный райком комсомола приступил к работе 5 января 1943 года. Его основная база находилась в 17-й партизанской бригаде (командир Н. И. Китаев, комиссар П. С. Ревяков) и 35-й бригаде (командиры П. И. Савчук, И. Г. Прохоренко, комиссары С. А. Шовин, А. К. Соломатин) в Горецком районе.

САСТАЎ ПАДПОЛЬНАГА РАЙКОМА ЛКСМБ

Секретари: Янченко Степан Ефимович (5.1.1943—18.9.1943), Черняков Борис Павлович (18.9.1943—28.10.1943, погиб), Моряков Михаил Николаевич (28.10.1943—2.12.1943), секретарь по пропаганде (1.7.1943—28.10.1943). Члены райкома: Васильев Афанасий Захарович (5.1.1943—18.9.1943), Ховренкова Зинаида Филипповна (5.1.1943—18.9.1943), Матюшенко Владимир Федорович (5.1.1943—18.9.1943), Бабурский Юрий Андреевич (18.9.1943—2.12.1943), Глеков Григорий Яковлевич (18.9.1943—2.12.1943), Дмитриев Евгений Евдокимович (18.9.1943—2.12.1943).

Друкуецца па кн.: Подпольные комсомольские органы Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (1941—1944). Мн., 1976. С. 233—234.

ПАРТЫЗАНСКІЯ ФАРМІРАВАННІ, ЯКІЯ ДЗЕЙНІЧАЛІ НА ТЭРЫТОРЫІ ГОРАЦКАГА РАЁНА Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ*.

Бригада «Звезда» — создана в августе 1942 г. в Горецком районе. Весной 1942 г. в Горецком районе начался массовый выход подпольщиков в лес. Еще раньше, в феврале, приступила к партизанским действиям патриотическая группа, руководимая А. В. Шульгиным — Д. Ф. Войстровым. В июне, после присоединения к ней подпольщиков во главе с П. Н. Савиновым, С. И. Воробьевым и другими, группа оформлена в Горецкий отряд (командир — Войстров Д. Ф., комиссар — Савинов П. Н.). В середине лета он численно вы-

* Друкуецца па кн.: Партизанские формирования Белоруссии в годы Великой Отечественной войны 1941—1944. Мн., 1983. С. 571, 573, 574, 579, 583, 595.

М. І. Іўлеў.

Д. І. Тамашэўскі.

рос за счет подпольщиков Горецкого и восточной части Шкловского районов. В августе сюда же из советского тыла по заданию ЦК КП(б)Б прибыл небольшой отряд «Победа». 8 августа на общем собрании партизан Горецкий отряд разделен на 2 самостоятельных. На базе этих отрядов сформирована бригада «Звезда». Вскоре в ее составе организованы еще 2 отряда. В октябре 1942 г. в условиях начавшейся карательной экспедиции противника решением командования бригада была рассредоточена на мелкие группы и отряд, который возглавил Д. Ф. Войстров (с апреля 1943 г.— Н. И. Китаев). Группы действовали самостоятельно в Горецком и Шкловском районах, не порывая связи между собой и головным отрядом. Весной 1943 г. несколько групп влились в отряд. В апреле отряд перебазировался в Чаусский район, где в начале 1943 г. вошел 4-м батальоном в состав полка «Тринадцать».

Бригада действовала в Горецком, Шкловском, Дрибинском районах Могилевской, Оршанском, Дубровенском — Витебской областей.

Численный состав на август 1942 г.— 370 партизан. Командиры бригады: Ивлев Михаил Игнатьевич (август 1942 — сентябрь 1942), Войстров Дмитрий Федорович (сентябрь 1942 — октябрь 1942). Комиссар — Савинов Павел Никифорович (август 1942 — сентябрь 1942). Начальник штаба — Томашевский Даниил Иванович (август 1942 — сентябрь 1942).

47-я бригада «Победа» — в июне 1942 г. в советском тылу по решению ЦК КП(б)Б из слушателей Особого белорусского сбора сформировали отряд «Победа» (с мая 1943 г.— 47-й «Победа»). В составе 43 партизан в конце июля он прибыл в Горецкий район, осенью перебазировался в Пропойский, а с октября 1942 по март 1943 г. действовал в Краснопольском и Чечерском районах в составе группы отрядов М. Н. Иванова.

Соединился с частями Красной армии 1 октября 1943 г. После выхода в советский тыл отряд приказом БШПД определен 47-й бригадой «Победа» с марта 1943 г. На день соединения насчитывалось 554 партизана. Из них мужчин — 527, женщин — 27, белорусов — 377, русских — 138, украинцев — 19, других национальностей — 20, членов ВКП(б) — 16, кандидатов — 32, членов ВЛКСМ — 96, беспартийных — 410. Командиры: Перепечкин Михаил Петрович (июнь 1942 — май 1943), Липкин Федор Павлович (май 1943 — октябрь 1943), и. о. Комиссары: Орловский Вячеслав Константинович (июнь 1942 — январь 1943), Калимулин Хайрула (январь 1943 — октябрь 1943). Начальники штаба: Горловенко Антон Владимирович (май 1943 — август 1943), Лосев Александр Николаевич (август 1943 — октябрь 1943).

35-я бригада — в тудоровском лесу Шкловского района в сентябре 1942 г. образовалось 5 разрозненных партизанских групп, отставших в период боев с карателями от основных сил отряда Ф. И. Чебыкина (см. отдельный 2-й отряд). В апреле 1943 г. они объединились в отряд, который действовал самостоятельно в Горецком, Дрибинском и Шкловском районах, а в сентябре перебазировался в Белыничский район, где был включен в Белыничскую ВОГ 35-м отрядом.

После соединения отряда с частями Красной Армии Белорусский штаб партизанского движения определил его 35-й партизанской бригадой с января 1944 г.

На день соединения, 30 июня 1944 г., насчитывала 554 партизана.

Из них: мужчин — 486, женщин — 48, белорусов — 265, русских — 231, украинцев — 17, других нац.— 21, членов ВКП(б) — 24, кандидатов — 37, членов ВЛКСМ — 125, беспартийных — 348.

Демографические данные на 20 человек не установлены. Командиры бригады: Савчак Петр Иванович (апрель 1943 — май 1943), погиб, Прохоренко Иван Григорьевич (май 1943 — июль 1944). Комиссары: Шонин Степан Алексеевич (апрель 1943 — июль 1943), Думчев Григорий Ильич (июнь 1943 — июль 1943, апрель 1944 — июнь 1944), Соломатин Андрей Константинович (июль 1943 — апрель 1944). Начальник штаба — Мамонов Изот Николаевич (июль 1943 — июнь 1944).

115-я Горецкая бригада — в октябре 1943 г. из разрозненных партизанских групп 17-й бригады и других формирований, вышедших из блокады в Горецкий и смежные с ним районы, организовался отряд 35-а (8 февраля 1944 г. переименован в 115-й Горецкий). Отряд сформировал в своем составе 4 роты, распространил влияние на второй отряд (позже 112-й Горецкий) и с ноября 1943 г. выполнял функции головной организации. Это объединение партизанских отрядов в разное время именовалось «гарнизоном», бригадой «Звезда», «84-м соединением». В мае 1944 г. 112-й Горецкий отряд приказом Могилевской (областной) военно-оперативной группы выделен в самостоятельный.

115-й Горецкий отряд действовал в Горецком,

Шкловском, Дрибинском районах Могилевской и Дубровенском, Оршанском — Витебской областей.

Соединился с частями Красной армии 26 июня 1944 г. общей численностью 801 партизан. Из них: мужчин — 705, женщин — 96, белорусов — 453, русских — 286, украинцев — 24, других национальностей — 38, членов ВКП(б) — 22, кандидатов — 32, членов ВЛКСМ — 174, беспартийных — 573.

После выхода отряда в советский тыл БШПД определил его 115-й Горецкой бригадой с октября 1943 г. Командир — Ленчиков Георгий Григорьевич (октябрь 1943 — июнь 1944). Комиссары: Логимахов Иван Иванович (октябрь 1943 — май 1944), Поликарпов Алексей Фролович (май 1944 — июнь 1944).

2-й отдельный отряд — начал организовываться в июле 1942 г. в Шкловском и Горецком районах. Окончательно сформировался в сентябре 1942 г.

Отряд действовал в Шкловском, Горецком, Чериковском, Пропойском, Краснопольском районах.

На день соединения с частями Красной Армии, 29 сентября 1943 г., насчитывалось 97 партизан. Из них: мужчин — 92, женщин — 4, белорусов — 36, русских — 54, украинцев — 5, других национальностей — 1, членов ВКП(б) — 3, кандидатов — 8, членов ВЛКСМ — 18, беспартийных — 67.

Демографические данные на 1 человека не установлены. Командиры отряда: Чебыкин Федор Иванович (сентябрь 1942 — апрель 1943), Кириллов Евгений Петрович (апрель 1943 — сентябрь 1943). Комиссары: Кириллов Евгений Петрович (сентябрь 1942 — апрель 1943), Проскурин Семен Захарович (апрель 1943 — сентябрь 1943).

3-й отдельный отряд — создан в сентябре 1942 г.

В январе 1942 г. около д. Лозицы Шкловского района образовалась группа (8 чел.) во главе с И. В. Кононыхиным. В июне 1942 г. она влилась в бригаду «Чекист». В августе 1942 г. по приказу командования бригады группа перешла в Шкловский и Горецкий районы, численно выросла и в сентябре оформилась в отряд. С 6 октября 1942 г. по март 1943 г. он входил в состав группы отрядов М. Н. Иванова в Чечерском районе.

Отряд действовал в Шкловском, Горецком, Дрибинском, Кричевском районах Могилевской, а также в Чечерском районе Гомельской областей.

На день соединения с частями Красной Армии, 2 октября 1943 г., насчитывал 214 партизан. Из них: мужчин — 209, женщин — 5, белорусов — 89, русских — 89, украинцев — 14, других национальностей — 22, членов ВКП(б) — 8, кандидатов — 20, членов ВЛКСМ — 48, беспартийных — 138.

Командир отряда — Конаныхин Иван Васильевич (сентябрь 1943 — октябрь 1943), комиссар — Мартыненко Яков Илларионович (сентябрь

Г. Р. Ленчыкаў.

І. І. Лагімахаў.

В. Д. Шараў.

1942 — октябрь 1943). Начальник штаба — Тенищев Иван Иванович (сентябрь 1942 — октябрь 1943).

17-я бригада — создана в августе 1943 г. В июне 1943 г. на основании приказа по полку «Тринадцать» на базе Горецкого отряда (см. бр. «Звезда») сформирован 4-й батальон (командир — Китаев Н. И., комиссар — Ревяков П. С., начальник штаба — Савинов П. Н.). В соответствии с распоряжением БШПД и решением уполномоченного Могилевского подпольного обкома КП(б)Б по Северо-Восточной зоне 4-й батальон в августе 1943 г. выделен из полка и развернут в 17-ю бригаду в составе 123, 124, 125-го отрядов. Позднее сформированы 122-й и 124-й отряды.

Бригада действовала в Чаусском, Дрибинском, Пропойском и Быховском районах.

Соединилась с частями Красной Армии 1 октября и 2 декабря 1943 г. общей численностью 457 партизан. Командир бригады — Китаев Николай Иванович (август 1943 — декабрь 1943). Комиссар — Ревяков Петр Сильвестрович (август 1943 — октябрь 1943). Начальник штаба — Сергеев Борис Алексеевич (август 1943 — октябрь 1943).

112-й отдельный Горецкий отряд — организован в сентябре 1943 г. в Горецком районе из разрозненных групп 17-й бригады, вышедших из бло-

кады, и инициативной группы В. Д. Шарова, которая была направлена в Дубровенский район Витебским подпольным обкомом КП(б)Б. До мая 1944 г. входил 2-м отрядом в 115-ю Горецкую бригаду, затем выделился в самостоятельный.

Отряд действовал в Горецком, Шкловском районах Могилевской и Дубровенском, Оршанском Витебской областей.

На день соединения с частями Красной Армии, 26 июня 1944 г., насчитывал 681 партизана. Из них мужчин — 579, женщин — 102, белорусов — 415, русских — 232, украинцев — 22, других национальностей — 12, членов ВКП(б) — 28, кандидатов — 17, членов ВЛКСМ — 133, беспартийных — 503.

Командир отряда — Шаров Василий Данилович (октябрь 1943 — июнь 1944), комиссары: Бурлаев Владимир Захарович (ноябрь 1943 — январь 1944), Ревяков Петр Сильвестрович (январь 1944 — июнь 1944), погиб. Начальник штаба — Кучмий Сергей Титович (октябрь 1943 — июнь 1944).

Вызваленне

У жніўні — верасні 1943 г. войскі Заходняга фронту правялі Смаленскую наступальную аперацыю. У выніку гэтага былі вызвалены гарады Смаленск і Рослаў. Праціўнік, страціўшы гэтыя важныя вузлы абароны на подступах да Дняпра, імкнуўся стрымаць наступленне савецкіх войск на прамежкавых рубяжах. Аднак войскі Чырвонай Арміі, наносячы моцныя ўдары па ворагу, вызвалілі Чырвоны, Мсціслаў, Крычаў і да 2 кастрычніка 1943 г. выйшлі на рубеж Ляды — Леніна — Дрыбін і далей па рацэ Проня.

Але ў гэтым раёне нашы войскі сустрэлі арганізаванае супраціўленне праціўніка. Спробы развіць наступленне на аршанскім і магілёўскім напрамках поспеху не мелі. Савецкія войскі занялі абарону на дасягнутым рубяжы. 2 кастрычніка Смаленская наступальная аперацыя была завершана, у выніку яе ўсходняя частка Горацкага раёна была вызвалена. А з поўначы на поўдзень па тэрыторыі раёна пралегла лінія фронту. Яна праходзіла праз вёскі Бацвіннева, Леніна, Лукі, Клімацічы, Турышчава, Нікуліна, Паляшчыцы, Мядзвёдаўка. Гэтыя і ўсе іншыя населеныя пункты, што размяшчаліся на ўсход ад іх, былі вызвалены да 2 кастрычніка 1943 г.



Нямецкія войскі ўмацаваліся на рубяжы Палзухі — Трыгубава — Андзекалава — Блажкі — Конюхі — Кацялёва — Кварцяны — Целяшоўка — Пуплы — Кледнявічы — Старакожаўка і далей па правым беразе ракі Проня. Усе населеныя пункты раёна, што былі на захад ад гэтай лініі, знаходзіліся яшчэ доўгіх дзевяць месяцаў пад акупацыяй нямецка-фашысцкіх войск.

Усходнюю частку раёна вызвалялі 21-я, 33-я і 49-я арміі. У раён Баева — Леніна выйшлі 21-я армія і 5-ы механізаваны корпус, а таксама рухомая група фронту (камандзір генерал Аслікоўскі) у складзе 3-га кавалерыйскага і 2-га танкавага гвардзейскіх карпусоў. На ўсход ад Горак дзейнічалі 33-я армія і 6-ы гвардзейскі кавалерыйскі

корпус, у раёне Дрыбіна да Проні выйшла 49-я армія.

Першай уступіла на тэрыторыю раёна 153-я стралковая дывізія палкоўніка Краснова. У яе састаў уваходзілі 557-ы, 563-і, 566-ы стралковыя палкі. Былы камандзір 557-га стралковага палка палкоўнік Ф. С. Фядотаў у сваёй кнізе «Полк продолжает бой» пісаў: «да раніцы 26 верасня полк заняў вёскі Палянкі, Лучынкі, Лапцева, Данігубава, Бытава, Поўзікі і выйшаў да Вялікалесся. Пасля пяцігадзіннага бою, узаемадзейнічаючы з іншымі палкамі і кавалерыйскім корпусам, мы прарвалі абарону ворага. У ноч на 27 верасня 1943 г. батальёны ўварваліся ў вёскі Пусталессе і Каравяк»*. Вёска Каравяк была вызвалена першай у раёне.

Працягваючы наступленне, 557-ы полк вызваліў Бацвіннева, з ходу фарсіраваў Мярэю. Але за гэтай ракой у праціўніка аказаліся тры лініі добра абсталяваных траншэй, а вёскі Казлы, Азарава і Асташкавічы гітлераўцы ператварылі ў моцныя апорныя пункты. Роты сустрэлі шчыльны артылерыйска-мінамётны агонь і вымушаны былі адысці на ўсходні бераг ракі. Толькі першы ўзвод першай роты пад камандаваннем лейтэнанта Ялуніна захапіў могілкі каля вёскі Казлы, на заходнім беразе Мярэі і замацаваўся там.

Полк Ф. С. Фядотава заняў абарону на захад ад Бацвіннева, а яго штаб размясціўся ў гэтай вёсцы. Калі 12 кастрычніка пачалося наступленне пад Леніна, палку было загадана атакаваць пярэдні край праціўніка і авалодаць вёскай Казлы раніцой 13 кастрычніка.

Такім чынам, самую паўночную частку раёна, вёскі Каравяк і Бацвіннева, вызвалілі 27 кастрычніка 1943 г. воіны 557-га стралковага палка 153-й Смаленскай стралковай дывізіі (камандзір палка Ф. С. Фядотаў, намеснік камандзіра па палітчастцы А. П. Горбік — загінуў 13 кастрычніка ў Бацвінневе, начальнік штаба Р. Я. Янчук).

Дз. Р. Юркоў.

Лявей 153-й дывізіі ў напрамку на Буды, Пузікі, Маісеева наступала 95-я стралковая дывізія. Тут вызначыўся камандзір узвода 241-га стралковага палка лейтэнант Юркоў. Гэта быў першы савецкі воін, удастоены звання Героя Савецкага Саюза за баі на тэрыторыі Горацкага раёна (гл. матэрыял «Героямі сталі на Горацкай зямлі»).

У напрамку непасрэдна на Леніна наступала 222-я Смаленская стралковая дывізія, якая ў ноч з 2 на 3 кастрычніка 1943 г. вызваліла гэты населены пункт. 23 чэрвеня 1944 г. гэта дывізія прарвала абарону нямецкіх войск на Проні ў вёсцы Галавічы. У баі вызначылася шмат воінаў, больш за дзесяць з іх удастоены звання Героя Савецкага Саюза, у тым ліку камандзір дывізіі палкоўнік А. М. Юрын.

У раёне вёсак Гарадзец — Сцяфанава — Ходараўка вяла баі 247-я Рослаўская стралковая дывізія. Тут загінуў намеснік камандзіра батальёна на палітчастцы 920-га стралковага палка лейтэнант Рабінкін.

290-я стралковая дывізія пасля баёў на Смаленшчыне ў канцы верасня 1943 г. уступіла на тэрыторыю Горацкага раёна, вызваліла мястэчка Горы. Затым яна ажыццявіла марш і выйшла ў раён на ўсход ад Леніна. 12 кастрычніка сумесна з польскай пяхотнай дывізіяй уступіла ў бой з ворагам. У чэрвені 1944 г. дывізія ўдзельнічала ў пра-

* Цяпер называецца Дружная.

рыве абароны нямецкіх войск на Проні. У баях тут вызначыўся Герой Савецкага Саюза Ю. М. Двужыльны.

Лявей 290-й наступала 70-я стралковая дывізія. У апошняй дэкадзе верасня 1943 г. яна вызваліла Копцеўку, Нікольскае і шэраг іншых вёсак Горацкага раёна. 1 кастрычніка дывізія выйшла да Проні супраць Кледнявіч і Старакожаўкі. 252-і стралковы полк пад камандаваннем падпалкоўніка А. Т. Яцэнкі авалодаў чыгуначным раз'ездам, сялом Нікольскае, але з ходу фарсіраваць раку Проню яму не ўдалося. 2 кастрычніка гэты полк сумесна з 1293-м палком 160-й стралковай дывізіі наступаў у напрамку вёскі Кледнявічы. Баі працягваліся да 7 кастрычніка, а ў гэты дзень 252-і полк і іншыя часці 70-й дывізіі былі перакінуты ў раён вёсак Лукі, Гушчына, Турышчава, Нікуліна, Лебедзева, дзе занялі абарону. Калі 12 кастрычніка пачалося наступленне пад Леніна, гэты полк падтрымліваў атаку суседніх часцей, вёў баі ў напрамку на Андзекалава. Побач з 252-м стралковым палком змагаўся 227-ы артылерыйскі полк гэтай жа дывізіі. 12 кастрычніка ў час аднаго з налётаў нямецкіх самалётаў на вёску Гушчына ад прамога пападання бомбы ў памяшканне, якое займаў штаб артпалка, загінулі начальнік штаба палка капітан Парфенаў і 14 салдат, сяржантаў і афіцэраў.

У сярэдзіне кастрычніка 1943 г. 352-я стралковая дывізія вяла баі ў раёне вёскі Лукі, падтрымлівала дзеянні савецкіх і польскай дывізій у раёне Леніна, затым да лютага 1944 г. удзельнічала ў абарончых баях на рубяжы Баева — Леніна. Гэты рубеж абароны воіны дывізіі зрабілі непрыступным для ворага.

Часці 344-й Рослаўскай стралковай дывізіі 1 кастрычніка вызвалілі мястэчка Расна і шэраг іншых населеных пунктаў у паўднёвай частцы Дрыбінскага раёна. Адгэтуль дывізія была перакінута ў раён Леніна і знаходзілася ў рэзерве, калі там ішлі баі.

Такім чынам, у вызваленні ўсходняй часткі раёна прымалі ўдзел 70-я, 95-я, 153-я, 222-я, 247-я, 290-я, 344-я, 352-я стралковыя дывізіі і шэраг іншых асобных часцей і падраздзяленняў войск Заходняга фронту.

1 верасня 1943 г. пад Разанню закончыла фарміраванне і навучэнне Першая польская пяхотная дывізія імя Т. Касцюшкі і ў той жа дзень адбыла на фронт. 12 кастрычніка пад мястэчкам Леніна адбылося яе баявое хрышчэнне.

Войскі 33-й арміі Заходняга фронту, у састаў якой увайшла Першая польская дывізія, спыніліся перад рубяжом абароны праціўніка на подступах да Віцебска, Оршы, Магілёва. Гітлераўскае камандаванне імкнулася ўтрымаць гэтыя населеныя пункты — важныя вузлы камунікацый. Рубеж трэба было прарваць. Гэта задача ўскладалася на 33-ю армію. Яна атрымала загад наступаць у аршанскім напрамку і захапіць плацдарм на заходнім беразе Дняпра. Меркавалася ліквідаваць варожую абарону імгненным ударам на ўчастку, які далучаўся да Леніна з поўначы. Паласа наступлення працягвалася шэсць кіламетраў.

Для выканання задачы 33-я армія на ўчастку намечанага прарыву размясцілася ў два эшалоны: у першым — 42-я стралковая дывізія, Першая польская дывізія, 290-я стралковая дывізія, у другім — 164-я і 222-я стралковыя дывізіі. Да арміі быў далучаны 2-і механізаваны і 6-ы гвардзейскі кавалерыйскія корпусы.

42-я стралковая дывізія займала зыходны рубеж паміж вёскамі Собалева, Сысоева, Польская пяхотная дывізія — паміж вёскай Сысоева і мястэчкам Леніна, 290-я стралковая дывізія — у мястэчку Леніна.

Размяшчэнне больш вопытных савецкіх дывізій на флангах, як адзначаў былы начальнік аператыўнага ўпраўлення Генеральнага штаба С. М. Штэменка, было выклікана тым, што ў пала-

се 42-й дывізіі знаходзілася ўмацаваная праціўнікам вышыня 217,6, а ў паласе 290-й дывізіі была складаная мясцовасць з вышынямі і нізінамі, моцна забалочанымі ручаямі, што ўпадалі ў непраходную для танкаў раку Мярэю, якая працякала перад абаронай праціўніка. Меркавалася, што гэтыя дывізіі змогуць хутка пераадолець на сваім шляху перашкоды, прасунуцца ўперад і забяспечыць паспяховае дзеянне Першай польскай дывізіі. Касцюшкаўцам жа трэба было збіць гітлераўцаў з важнай вышыні 215,5, прарваць абарону праціўніка, а затым развіваць наступленне ў заходнім напрамку і падрыхтавацца да фарсіравання Дняпра на поўдзень ад Оршы. Поспех дывізій намячалася забяспечыць, кінуўшы ўперад 5-ы механізаваны корпус.

Раніцай 12 кастрычніка была праведзена разведка боем сіламі па батальёну ад кожнай дывізіі. Адна рота 42-й стралковай дывізіі перайшла раку Мярэю і залягла перад пярэднім краем праціўніка. Батальён Першай польскай дывізіі таксама залёг, толькі невялікая частка змагла ўварвацца ў першую траншэю. Батальён 290-й стралковай дывізіі змог захапіць першую траншэю праціўніка.

У 9 гадзін 20 мінут залп «кацюш» абвясціў аб пачатку артпадрыхтоўкі. У 10.30 паднялася ў атаку пяхота. Пад прыкрыццём артылерыйскага агню з траншэй каля вышыні 215,5 выйшлі байцы 1-га батальёна. Побач цягнуліся ланцугі перадавых батальёнаў 1-га і 2-га пяхотных палкоў. Яны хутка прасоўваліся ўперад, каб да канца артпадрыхтоўкі, пад прыкрыццём вогненнага вала, падысці да нямецкіх акопаў. Наступаючыя фарсіравалі Мярэю, апынуліся на заходнім беразе ракі і рушылі на штурм варожай траншэі.

Гітлераўцы люта супраціўляліся. З вёскі Палзухі і вышыні 217,6 яны вялі моцны агонь. 2-і пяхотны полк наступаў на Трыгубава, яго 1-ы батальён уварваўся ў вёску і пасля кароткага бою заняў яе.

У. Высоцкі.

Пры падтрымцы танкаў немцы пачалі контратакі. 1-ы батальён 1-га пяхотнага палка не вытрымаў націск і пачаў адыходзіць на заходнія схілы вышыні 215,5. Падышлі 2-і і 3-і батальёны і заляглі пад агнём ворага. Тады капітан Высоцкі з заклікам: «За Радзіму!» пайшоў у атаку (гл. артыкул «Прарываў абарону»). Палякі зноў уварваліся ў Трыгубава, але з прычыны моцнага агню немцаў заляглі. Некаторыя роты і ўзводы пачалі адступаць і панеслі вялікія страты. Абяскроўленыя батальёны 1-га пяхотнага палка пачалі адыходзіць ад Трыгубава. На перадавой з'явіўся намеснік камандзіра дывізіі палкоўнік Баляслаў Каневіч. Ён прыпыніў адыход байцоў і арганізаваў абарону ў 350 метрах ад Трыгубава. 2-і пяхотны полк умацаваўся на ўсходняй ускраіне вёскі Палзухі.

Становішча Першай польскай дывізіі ўскладнялася тым, што суседнія фарміраванні, абяскроўленыя ў папярэдніх баях, не змаглі дабіцца істотнага поспеху. Наступленне 42-й дывізіі было адбіта. Яна, хаця і «ўчапілася» ў вышыню 217,6, але не змагла яе ўзяць. Воіны 290-й дывізіі пераадолелі балоцістую пойму ручая на захадзе ад Леніна і авалодалі Трыгубавам. Гітлераўцы контратакавалі і выбілі іх на ўсходнюю ўскраіну вёскі. Бой працягваўся, але руху ўперад і тут не было.

У другой палове дня праціўнік, падцягнуўшы значныя сілы, правёў серыю

жорсткіх контратак. Пад яго ўраганным агнём абарона 1-га польскага палка пахіснулася. Але ў гэты момант артылерысты 67-й савецкай гаўбічнай брыгады абрушылі на праціўніка ўсю моц агню. Гітлераўцы панеслі вялікія страты і сталі адступаць. Да гэтага часу падышло некалькі польскіх танкаў. 1-ы пяхотны пайшоў у атаку і зноў захапіў усходнюю ўскраіну Трыгубава і безыменную вышыню.

Тады гітлераўцы кінуліся ў контратаку на 2-і польскі полк, які трымаў абарону каля вёскі Палзухі, і ён пачаў адыход на паўднёвую ўскраіну вёскі. І зноў, як пад Трыгубавам, становішча выратавалі артылерысты. Іх агонь накрыў гітлераўцаў, яны не змаглі зрабіць ні кроку ўперад. Абодва бакі акапаліся.

Пасля новай контратакі немцаў у раёне Трыгубава польскі полк адышоў на 300 метраў ад вёскі. Праціўнік яшчэ некалькі разоў спрабаваў контратакаваць пры падтрымцы танкаў, каб адкінуць палякаў за Мярэю. Цэлы дзень дзейнічала яго авіяцыя. Нямецкія самалёты бамбілі перадавыя падраздзяленні, пойму Мярэі, агнявыя пазіцыі і тылы савецкіх і польскіх войск.

Пад вечар 1-ы пяхотны полк страціў баяздольнасць, яго месца заняў 3-і. Разам з 2-м ён атрымаў загад рыхтавацца да наступлення. У ноч з 12 на 13 кастрычніка асобная разведрота дывізіі зрабіла смелы рэйд у тыл ворага, дайшла да вёскі Трыгубава, знішчыла штаб батальёна, захапіла дакументы. 3-і пяхотны полк наступаў таксама ў гэтым напрамку. Праціўнік сустрэў яго моцным агнём. На досвітку полк яшчэ раз перайшоў у наступленне і выйшаў да ўсходняй ускраіны Трыгубава.

2-і пяхотны полк поўнасцю выбіў немцаў з вёскі Палзухі і ўмацаваўся на яе заходняй ускраіне. На досвітку немцы двойчы контратакавалі, але выбіць палякаў не змаглі.

У першыя суткі бою наступаючыя панеслі вялікія страты. 1-ы пяхотны полк страціў каля трэцяй часткі асабістага саставу. У 290-й стралковай дывізіі выйшла са строю больш за 420 чалавек. У 5-м механізаваным корпусе згарэла 9 танкаў, 18 было падбіта. Цяжкае раненне атрымаў камандуючы танкавымі войскамі 33-й арміі палкоўнік Нікулін. Пры бамбёжцы былі кантужаны камандзір 882-га стралковага палка 290-й дывізіі падпалкоўнік Стэфаненка, замполіт палка маёр Пракоф'еў і начальнік штаба маёр Анісімаў.

Ноччу праз Мярэю пераправілі танкі і самаходныя гарматы.

Раніцай 13 кастрычніка пасля артпадрыхтоўкі перайшлі ў наступленне 2-і і 3-і пяхотныя палкі. Але пасля налёту нямецкай авіяцыі атака захліпнулася. Пяхота залягла, і толькі частка танкаў рухалася ўперад. Нямецкая артылерыя вяла па іх агонь. Зноў пачаўся налёт варожай авіяцыі.

Суседзям таксама не ўдалося дабіцца поспеху. Была ўведзена ў бой 222-я стралковая дывізія. С. М. Штэменка, які апісаў бой пад Леніна ў кнізе «Генштаб в годы войны», адзначаў, што цяжкія абставіны на флангах паласы наступлення арміі не ўдалося змяніць у нашу карысць. Гэта неспрыяльна адбілася і на становішчы Першай польскай дывізіі, якая наступала ў цэнтры. Ёй прыйшлося адбіваць шматлікія контратакі праціўніка, якія падтрымліваліся вялікай колькасцю авіяцыі. Наш 5-ы механізаваны корпус панёс вялікія страты ў танках і не аказаў прыкметнага ўплыву на ход бою. Было адбіта наступленне і ў палосах суседніх армій. Рубеж абароны праціўніка заставаўся моцным.

У канцы дня са штаба арміі паступіла паведамленне: Першую польскую дывізію вырашана вывесці з бою і ноччу замяніць яе часцямі 164-й стралковай дывізіі. Што і было зроблена.

14 кастрычніка бой працягваўся. У першым эшалоне арміі дзейнічалі 42-я, 164-я, 290-я, 222-я стралковая дывізіі, а таксама самаходныя гарматы 5-га механізаванага корпуса. У выніку цяжкіх баёў, якія цягнуліся ўвесь

дзень, удалося выбіць праціўніка з вышыні 217,6 і з тэрыторыі былых хутароў Раманава (у 2-х кіламетрах на паўднёвы захад ад мястэчка Леніна).

У наступныя два дні наступленне працягвалася, у бой была ўведзена яшчэ адна стралковая дывізія. Гітлераўцы па-ранейшаму аказвалі жорсткае супраціўленне, якое не дазволіла дасягнуць поспеху. Тады 33-я армія канчаткова перайшла да абароны і пачала ўмацоўваць свае пазіцыі. Лінія фронту на гэтым участку заставалася нязменнай на працягу васьмі месяцаў.

23 чэрвеня 1944 г. пачалася Беларуская наступальная аперацыя (пад кодавай назвай «Баграціён»), адна з найбуйнейшых стратэгічных наступальных аперацый Чырвонай Арміі ў Вялікую Айчынную вайну. На Магілёўскім напрамку баявыя дзеянні вяла ўзмоцненая 49-я армія 2-га Беларускага фронту. На усход ад Горак у абароне знаходзіліся войскі 33-й арміі таго ж фронту.

З 22 па 25 чэрвеня 1944 г. усе стралковыя палкі першага рубяжа абароны 33-й арміі праводзілі разведку боем. Раніцай 22 чэрвеня 1-й стралковы батальён гвардыі капітана П. П. Рудэнкі з 252-га стралковага палка 70-й стралковай дывізіі нечаканым ударам завалодаў першай, а затым і другой траншэяй праціўніка і замацаваўся на поўнач ад в. Малое Марозава. На працягу трох дзён ішлі ўпартыя баі за гэты рубеж. Пастаўленая перад 70-й стралковай дывізіяй задача не даць праціўніку перакінуць свае войскі ў раён на поўдзень ад Дрыбіна, дзе 49-я армія ажыццяўляла галоўны ўдар, была выканана.

49-я армія, прарваўшы добра замацаваную абарону нямецкіх войск на рацэ Проня на поўдзень ад Дрыбіна, рушыла да Дняпра. Паспяхова наступалі на Оршу войскі 3-га Беларускага фронту. Былі створаны ўмовы для акружэння нямецкіх часцей, размешчаных у раёне Горак. 25 чэрвеня немцы спынілі контратакі і сталі рыхтавацца да адыходу.

У ноч з 25 на 26 чэрвеня 1944 г. праціўнік спешна пакінуў свае пазіцыі. Яго сталі даганяць атрады праследавання. Перадавы атрад капітана Піліпаса раніцай 26 чэрвеня ўвайшоў у Горкі.

Услед за перадавымі атрадамі рушылі і галоўныя сілы. 252-і стралковы полк падпалкоўніка А. Т. Яцэнкі пайшоў на поўнач ад Горак, 329-ы падпалкоўніка В. А. Гусева ўвайшоў у Горкі і, не затрымаўшыся ў горадзе, узяў напрамак на Чапялінку, Гулідаўку і далей да Дняпра.

Да канца дня 26 чэрвеня 1944 г. уся тэрыторыя Горацкага раёна была вызвалена ад захопнікаў.

І. Стальмашонак.

Гартаючы падшыўкі

ПА СТАРОНКАХ ГАЗЕТЫ «ЛЕНІНСКІ ШЛЯХ»

25 чэрвеня 1941 г.

Палкі патрыятызм

Вось што піша ў сваёй заяве старшы выкладчык кафедры асноў марксізма-ленінізма Беларускага сельскагаспадарчага інстытута Круцько Г. Е.

— Пачуўшы выступленне па радыё Намесніка старшыні Саўнаркома СССР і народнага Камісара Замежных Спраў Вячэслава Міхайлавіча Молатава аб нападзе на нашу сацыялістычную Радзіму варожых сіл германскага фашызма і аб уступленні СССР у Айчынную справядлівую вайну, супраць парабашчэння, я, як і ў гады грамадзянскай вайны, з глыбокай свядомасцю і выкананнем абавязкаў перад краінай Саветаў і з нянавісцю да ворагаў, жадаю быць у перадавых радах на фронце вайны. Прашу накіраваць мяне ў адну з часцей Чырвонай Арміі для абароны Радзімы.

Заявы для паступлення ў рады Чырвонай Арміі падаюць не толькі мужчыны, але і жанчыны-патрыёткі. Тэлефаністка-марзістка станцыі Пагодзіна Міхасёва Ніна Іванаўна ў сваёй заяве піша:

— Прашу залічыць мяне ў рады Рабоча-сялянскай Чырвонай Арміі, так як я з усёй адданасцю жадаю абараняць сваю Радзіму.

25 чэрвеня 1941 г.

Абуздаць зарваўшагася агрэсара

Піянеры і школьнікі горада ўключыліся ў спаборніцтва на дапамогу калгасам у правядзенні праполачнай кампаніі. Так, па ініцыятыве настаўніцы Ленінградскай школы, прыехаўшай у адпачынак тав. Шэфтэр Р. М. каля 30 школьнікаў горада выйшлі на праполку ў калгас «Шлях сацыялізма» (Горсавет). На праполцы яны працуюць з выключнай энергіяй, паказваюць высокую прадуктыўнасць працы.

— Мы гатовы ў любую хвіліну, — гавораць піянеры і школьнікі, — замяніць сваіх бацькоў па рабоце на сацыялістычных палях. Бацькі нашы ідуць абараняць ад нападу зарваўшагася агрэсара нашы свяшчэнныя рубяжы, а мы будзем выдатна працаваць на сацыялістычных палях. Дапаможам калгасам у правядзенні праполачнай і ўборачнай кампаніі.

26 чэрвеня 1941 г.

Працуем без перабою

Пачуўшы аб зверскім нападзе фашысцскіх захопнікаў на нашы свяшчэнныя рубяжы, усе работнікі арцелі інвалідаў «Трэці год пяцігодкі» аднадушна заявілі:

— Для таго, каб наша доблесная Рабоча-сялянская Чырвоная Армія паспяхова разграміла да канца фашыстаў, мы павінны працаваць яшчэ з большай энергіяй, выпускаць яшчэ больш тавараў, павышаць іх якасць.

Зараз у арцелі кіпіць творчая работа. Усе цэхі арцелі працуюць бесперабойна, без малейшых прастояў.

Большасць работнікаў арцелі перавыконваюць нормы выпрацоўкі. Па 1,5—2 нормы штодзённа выконваюць работнікі швейнага цэха Бейлінм, Мураўёва, Маскалёва, камсамолец Карпіцкі і інш. Штодзённа перавыконвае нормы 65-гадовы стаханавец тав. Гінзбург.

28 чэрвеня 1941 г.

Жанчыны замяняюць працу мужчын

З вялікім энтузіязмам адносіцца кожны рабочы арцелі да сваіх абавязкаў. Там, дзе працавалі мужчыны, зараз пайшоўшыя ў рады нашай доблеснай Чырвонай Арміі біць фашысцкіх варвараў, іх працу замянілі жанчыны і працуюць выдатна.

Так майстра разіначнага цэха тав. Баркоўскага, пайшоўшага на фронт, замяніла работніца гэтага цэха тав. Эськіна. Яе цэх штодзённа перавыконвае вытворчы план. Тав. Жмачынская замяніла брыгадзіра фарміровачнага цэха. Яна хутка асвоіла сваю работу, цэх працуе нармова, выконвае вытворчы план на 140 %.

Дзейнічалі рашуча

З успамінаў ветэрана 161-й стралковай дывізіі Н. З. Кадырава

В связи с неблагоприятной обстановкой, сложившейся на фронте, командир 161-й дивизии полковник А. И. Михайлов получил приказ к утру 12 июля занять оборону западнее Горок на рубеже Попковки, Стан. В ночь на 12 июля полки выступили из районов сосредоточения. С рассветом и в течение дня вражеские самолеты неоднократно бомбили и обстреливали с воздуха колонны частей. Некоторые подразделения, двигавшиеся лесными дорогами, отклонились от заданных маршрутов. Поэтому на указанный рубеж дивизия вышла лишь утром следующего дня. К этому времени гитлеровцы, обойдя наши части слева и справа, овладели Горками. Дивизия и находившийся в этом районе штаб корпуса оказались в тылу противника.

Полковник А. И. Михайлов, оценив обста-

новку вместе с начальником штаба корпуса полковником Л. А. Пэрном, полковым комиссаром А. И. Орловым и начальником штаба дивизии майором А. И. Мурашовым, решил пробиться на восток через дорогу между населенными пунктами Сахаровка и Тимоховка. 603-й и 542-й полки должны были уничтожить противника в этом районе, обеспечить переход дороги всем частям, штабам и тылам и далее через Рябки и Абраимовку выйти в район урочища Темный Лес. 477-й полк прикрывал их действия с тыла.

С наступлением темноты командиры 603 и 542-го полков выдвинули подразделения на лесную опушку и в рощи, расположенные параллельно дороге, идущей из Тимоховки на Сахаровку. Батальоны 603-го полка младшего лейтенанта И. И. Вавильченко (исполнявшего обязанности комбата) и старшего лейтенанта Ф. А. Корзуна должны были с началом боя перекрыть дорогу (первый — западнее Сахаровки, второй — восточнее Тимоховки) и не допустить врага к месту перехода. 542-й полк обеспечивал прикрытие идущих за ним частей и обозов. Для ведения огня прямой наводкой 45 орудий дивизионной артиллерии и 151-го корпусного артполка заняли огневые позиции по опушке леса у хутора Холмы на участке шириной 2,5 км.

К полуночи подготовка к бою закончилась. Подразделения, приготовившиеся к атаке, ждали установленного сигнала. Неожиданно один из немецких гусеничных бронетранспортеров встал поперек дороги и загородил путь. Скоро в этом месте на сотни метров в несколько рядов скопилось большое количество автомашин, танков, мотоциклов.

Тогда с опушки леса и рощ, прилегающих к дороге с севера, открыли огонь орудия. Пулеметные роты 603-го полка под командованием старшего лейтенанта Д. М. Симакова, лейтенанта А. Н. Щелокова и младшего лейтенанта П. Р. Приймака почти в упор кинжальным огнем уничтожили живую силу врага. Артиллеристы батареи этого же полка младшего лейтенанта Н. Е. Щебельского подожгли танк в середине колоны. Загорелись автомашины и в других местах. Гитлеровцы метались среди охваченной огнем техники, фонтанов земли, поднятой взрывами снарядов.

После 15-минутного шквального огня орудий и пулеметов подразделения 603-го полка и 542-го бросились в атаку, уничтожая на дороге все, что уцелело, и заняли указанные им рубежи.

Всего в боях в районе Сахаровка, Тимоховка 161-я дивизия вывела из строя 48 танков, 30 бронетранспортеров, около 130 автомашин и мотоциклов, уничтожила 350 солдат и офицеров противника.

Пройдя Рябки, Абраимовку, Головичи, хутор Темный Лес, части дивизии во второй половине дня 14 июля сосредоточились в лесу у Еськовки (25 км юго-восточнее Горок). Однако собрались там не все. Подвергаясь воздействию наземного и воздушного противника, тыловые подразделения потеряли связь с впереди идущими и отклонились от установленного маршрута. Руководство ими взяли на себя интендант 2 ранга Г. К. Кирсанов и старший батальонный комиссар А. Г. Михайлов. Они сумели вывести за линию фронта 1059 человек с вооружением. По приказу командующего Западным фронтом этот отряд был направлен в район Гжатска (ныне Гагарин).

Преследуемый превосходящими силами противника батальон 542-го полка (с двумя батареями 632-го артполка) во главе с майором П. И. Шумеевым вынужден был повернуть на юг. Отдельные группы бойцов и командиров этого батальона с боями пробились в Могилев и приняли участие в обороне города.

Друкуецца па кн.: Кадыров Н. З. От Минска до Вены. М., 1985.

Атакавалі калону

З успамінаў Ю. Паграбава, былога камандзіра танкавага ўзвода 57-й танкавай дывізіі.

З першага дня вайны ўступіла ў бой з акупантамі 57-я танкавая дывізія, якой камандаваў палкоўнік В. А. Мішулін. У сярэдзіне ліпеня 1941 г. яна атрымала загад заняць абарону і затрымаць гітлераўцаў на далёкіх подступах да Смаленска.

Мотастралковы полк гэтай дывізіі пад камандаваннем маёра Асокіна і прыдадзеныя яму танкавыя падраздзяленні з баямі адыходзілі па дарозе Копысь — Горкі. У раёне Горак занялі абарону.

Бой разгарэўся раніцай 17 ліпеня, калі нашы танкі накіравалі свой сакрушальны ўдар па калоне варожых аўтамашын, якая рухалася пад аховай танкаў і матацыкліс-

таў. Першымі трапнымі стрэламі экіпаж баявой машыны старшага сяржанта Полазава вывеў са строю і падпаліў Т-3, а лейтэнант Кравец ператварыў у палаючыя факелы дзве фашысцкія аўтамашыны. Тараніў штабную радыёстанцыю і легкавую машыну палітрук Ярохін.

Фашыстаў ахапіла паніка. Яны спрабавалі павярнуць свае машыны назад, але былі сустрэты вінтовачна-кулямётным агнём нашых стралкоў. Трапныя чэргі касілі акупантаў. Толькі кулямётчыкі Бронны і Курбатаў знішчылі тады да двух дзесяткаў захопнікаў. Павялічылася колькасць падпаленых аўтамашын. Са звязкаю гранат падняўся насустрач стальной махіне, якая прарвалася ў наш тыл, старшына камуніст Давыдзенка. Кулямётная чарга абарвала яго жыццё, але і гітлераўскі Т-3 замёр на месцы, а потым пачаў гарэць. Экіпаж танка знішчылі ў рукапашным баі разведчыкі ўзвода старшага сяржанта Чарнавока.

Вызначыліся тады і артылерысты. Агнём «саракапятак» былі спынены тры фашысцкія машыны. Не вытрымаўшы нашага агню, гітлераўцы хутка павярнулі назад, але на змену танкам амаль адразу ж з'явілася нямецкая авіяцыя.

Гітлераўцам удалося прарвацца на агнявыя пазіцыі нашых артылерыстаў, і гарматныя разлікі ўступілі з імі ў рукапашную схватку. Хаця фашыстаў і было ўдвая больш, чырвонаармейцы прымусілі іх адступіць. Вечарам па загаду камандавання дывізіі мы адышлі на новыя рубяжы ў раёне вёскі Краснае, дзе такія ж упартыя баі грымелі яшчэ больш тыдня.

Тыя чорныя дні

З успамінаў М. Капілевіч

Праз два дні пасля пачатку вайны студэнты сельскагаспадарчага інстытута праводзілі на фронт дзяўчат-дружынніц, якія добраахвотна рашылі пайсці змагацца з ворагам. 6 ліпеня пайшлі на фронт сотні рабочых, служачых, калгаснікаў нашага раёна. А раніцай 12 ліпеня камсамольская арганізацыя будучай акадэміі праводзіла на фронт студэнтаў, разам з якімі адправіліся выпускнікі сярэдніх школ і многія дзесяцікласнікі. Пачаліся напружаныя дні. Працавалі ўстановы, супрацоўнікі бальніцы спешна аказвалі першую дапамогу раненым байцам і грамадзянскаму насельніцтву, эвакуіравалі іх у тыл. Увечары гэтага дня вораг захапіў горад.

Свой прыход у Горкі гітлераўцы адзначылі вялізным пажарам. Потым раз'юшаныя бандыты пачалі расправу з моладдзю. Першай іх ахвярай стаў Лёва Леўшуноў, вучань. Убачыўшы, што полымя ахапіла родную школу, ён прыбег на пажар і быў застрэлены як «падпальшчык».

Здзекаваючыся з усяго светлага і дарагога ў жыцці нашага народа, фашысты зрабілі гарадок акадэміі месцам допыту, катаванняў і смерці сумленных людзей.

У скверы інстытута летам 1942 г. гітлераўцы павесілі за ўдзел у партызанскім руху некалькі юнакоў.

У новым вучэбным корпусе ёсць пакой, які з'яўляўся тады «камерай смяротнікаў». Тут загінулі камуністы Баркулаў і Марозаў, настаўнікі Усціновіч, Патапаў, Стамброўская, старшыня калгаса вёскі Славікі т. Карначоў, сем'і партызан Вараб'ёва, Філіпені і іншыя.

Захапілі ўчастак

З успамінаў А. З. Васільева

Васільеў Апанас Захаравіч. Нарадзіўся 1.4. 1923 г. у в. Палёнка Горацкага раёна. Адзін з арганізатараў Палёнкаўскай падпольнай групы, былы камандзір узвода, роты, 2-га атрада 35-й партызанскай брыгады. Пасля вайны быў дырэктарам Краснапольскай, а затым Асвейскай МТС, старшынёй выканкома Палёнкаўскага сельскага Савета. Узнагароджаны ордэнам Леніна, ордэнамі Айчыннай вайны 1-й і 2-й ступеняў, медалямі. Памёр 3.1.1992 г.

Набліжалася гадавіна Кастрычніцкай рэвалюцыі. Напярэдадні гэтай даты камсамольцы і моладзь падпольнай арганізацыі вёскі Палёнка рашылі напасці на Ліхачоўскі нямецка-паліцэйскі ўчастак. Быў распрацаваны план.

Вечарам удзельнікі аперацыі пакінулі вёску і сабраліся ля Валожкаўскага балота, дзе ўзброіліся аўтаматамі, гранатамі. Раздзяліліся на тры групы, якія па сігналу павінны былі пачаць акружэнне ўчастка.

Ф. М. Дзям'янаў яшчэ раз папярэдзіў:

— Будзьце асцярожнымі! Параненых і забітых не пакідаць!

У гэты час пачалася стральба. Усе насцярожыліся. За вёскай Палёнка стральба паўтарылася. Было бачна, што з'явіліся фашысты.

— Мо хто баіцца ісці? — спытаў я ў хлопцаў.

— Такіх няма. Толькі ў бой! — адказалі сябры.

Усе паклялiся, што ніякія здзекі ворага не прымусяць выдаць сваіх таварышаў і тайну маладзёжна-камсамольскай арганізацыі. Пасля гэтага ўсе асцярожна накіраваліся да месца аперацыі.

Нас сустрэлі мой брат Уладзімір і Пётр Шыцікаў.

— Гітлераўцы паехалі ў вёску Маслакі, — сказаў Пётр.

— Паліцаі хадзілі на ўчастак, там вартавы, — дадаў Уладзімір.

Усе разышліся па сваіх месцах і сталі чакаць сігналу.

У прызначаны час мы адкрылі стральбу і з ходу занялі памяшканне ўчастка, але паліцаям удалося ўцячы.

Захапіўшы дакументы і зброю, мы адышлі на ўмоўленае месца да ракі. Трэба было бачыць, як узрадаваў моладзь гэты баявы поспех.

Зброю, захопленую ў час аперацыі, захавалі ля вёскі, каб у любы момант яе можна было ўзяць у рукі.

Дакументы сведчаць

З АДМІНІСТРАЦЫЙНАГА РАСПАРАДЖЭННЯ № 1 КАМАНДУЮЧАГА ГРУПАЙ АРМІЙ «ЦЭНТР»

7 ліпеня 1941 г.

III. Отличительные знаки для евреев и евреек

1. Все евреи и еврейки, находящиеся на занятой русской территории и достигшие 10-летнего возраста, немедленно обязаны носить на правом рукаве верхней одежды и платья белую полосу шириной в 10 см с нарисованной на ней сионистской звездой или же желтую повязку шириной в 10 см.
2. Такими повязками обеспечивают себя сами евреи и еврейки.
3. Евреям категорически запрещается приветствовать.

Нарушители будут строжайше наказываться местным комендантом по месту жительства.

Командующий тылом группы армий «Центр» фон Шенкендорф, генерал инфатерии

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 4683, воп. 3, спр. 952, л. 2.

Падрыхтаваў У. Лемяшонак.

З ПАПЯРЭДЖАННЯ КАМАНДЗІРА 16-га АХОЎНАГА ПАЛКА ЖЫХАРАМ ВЁСАК МАШКОВА, РЭКАТКА І ДОБРАЙ АБ МЕРАХ ПАКАРАННЯ ЗА СУВЯЗЬ З ПАРТЫЗАНАМІ І НЕВЫКАНАННЕ ЗАГАДАЎ АКУПАЦЫЙНЫХ УЛАД

7 кастрычніка 1942 г.

При отступлении войск созвать жителей дер. Мошково, Рекотки и Доброй и через переводчика объяснить им следующее:

...Всякого, кто будет встречен в тылу немецкого фронта с оружием, мы будем считать разбойником или бандитом и беспощадно наказывать. Виновным является всякий, кто помогает бандитам, их командирам и комиссарам, и за это будут наказаны все жители деревни, в которой он проживал.

Известно, что жители вашей деревни кормили бандитов и помогали им. Скот в этой деревне находился в распоряжении бандитов. Они приходили сюда и уходили снова. Точно

установлено, что в Мошкове 2 дня назад они устраивали праздник.

В непосредственной близости от этих деревень, недалеко от Рекотки, располагался лагерь, в строительстве которого принимали участие жители деревни, и поэтому расположение его, безусловно, известно вам.

Ваша деревня, несмотря на распоряжение немецких властей, в противоположность другим населенным пунктам, занятым немецкими войсками, до сего времени не выполнила поставки скота и зерна. Необходимо, чтобы жители рассчитались по ним, потому что Советы проиграли войну, и поставки скота и зерна все равно придется выполнять.

Поэтому прежде всего все коровы в деревне будут собраны и их перегонят в Горки. Как только требуемые поставки будут выполнены, коров возвратят владельцам.

Мужчины, которые состояли в бандах, по военным законам будут расстреляны. Лица, заподозренные в связях с бандитами, будут доставлены в лагерь для военнопленных. Женщины, непосредственно помогавшие бандам, также будут расстреляны.

Ничего не случится с теми, кто сторонится банд и сообщает о них немецкому командованию, а также указывает, кто состоит в бандах, так как немецкие вооруженные силы и полиция, гражданское управление и сельскохозяйственные власти делают все, чтобы обеспечить сельскому населению мирную деятельность.

Сообщения, которые привозятся комиссарами, евреями и агентами из Москвы, являются ложными. Неправда, что немецкий фронт где-то прорван или находится в опасности. Кто этому не верит, пусть съездит в Ленинград, Ржев, Сталинград или Майкоп и там убедится сам, где стоят немецкие войска. Война для Советов проиграна, и здесь, за сотни километров от линии фронта, война не должна чувствоваться. Отдельные нарушения спокойствия в вашем сельском хозяйстве производятся бандитами, и вы должны быть полностью заинтересованы в том, чтобы устранить их.

На этот раз мы вас не тронем, но ставим в известность, что:

если в этой деревне обыск еще раз укажет на существование вооруженной деятельности против немецких войск, а немецкие войска сразу же не будут поставлены в известность об этом, а также если здесь появятся новые члены банд, деревня будет сожжена, а все ее население — расстрелено.

Подполковник и командир полка
Подпись неразборчива.

Друкуецца па кн.: Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии. 1941—1944. Мн., 1965. С. 40, 41.

Рызыкуючы жыццём

З успамінаў былых падпольшчыкаў

Жарыкава В. П. Мой муж Коўшык (Вінаградаў Іван Піліпавіч) у гады акупацыі працаваў на торфазаводзе, дзе ўзначальваў падпольную групу. У нашай хаце часта бывалі П. М. Савінаў, С. І. Вараб'ёў, Д. С. Шупілаў. Сувязь з Горкамі падтрымлівалася праз возчыка хлеба Лаўдзікава з в. Мацюты. Калі фашысты даведаліся аб гэтым, то расстралялі яго.

У ліпені падпольшчыкі торфазавода спалілі пабудовы завода, перабілі ахову і пайшлі ў партызанскі атрад.

На другі дзень у Чапялінку прыбылі на 4 машынах фашысты. Партызаны ўстроілі засаду і знішчылі карацеляў. У гэтым баі мой муж быў паранены.

У атрадзе ён быў камандзірам, загінуў у 1943 г. у жалезінскіх лясах.

Бацькоў маіх Давыда Фёдаравіча Глуздова і Марфу Пятроўну расстралялі. Яны хавалі ў сябе двух параненых лётчыкаў. Іх лячыла медсястра В. А. Хамякова, якая працавала ў нямецкім шпіталі, што знаходзіўся ў Чапялінскай школе. Адтуль яна прыносіла медыкаменты.

Па заданні падпольшчыкаў я не аднойчы хадзіла ў разведку. Пасля адыходу ў атрад выконвала шмат другіх даручэнняў.

Кузняцова А. М. У нашай хаце збіраліся падпольшчыкі П. М. Савінаў, С. І. Вараб'ёў, М. Грамакоўскі, А. Магазіншчыкаў, М. І. Філіпаў і іншыя.

Масла для партызан даваў дырэктар маслазавода Холін. Першы раз мы хадзілі па прадукты з яго жонкай. Прынеслі 2 скрыні па 20 кг да нас на кватэру па вуліцы К. Маркса. Па масла прыязджала В. Е. Сафронава. Другі раз я хадзіла адна і таксама прынесла

20 кг. У гэты раз па яго прыязджала не знаёмая мне дзяўчына. Мы перадавалі партызанам не толькі прадукты, але збіралі і розныя звесткі аб немцах.

10 ліпеня раніцай майго мужа А. І. Кузняцова арыштавалі на льнозаводзе. Муж сядзеў у памяшканні міліцыі. Я пайшла туды, але нічога не даведалася. На другі дзень я бачыла, як са двара павялі майго мужа і яшчэ нейкага мужчыну са звязанымі рукамі на расстрэл. Мне давялося бачыць, як вешалі падпольшчыкаў І. Марчанку, А. Магазіншчыкава, Махлаёва і іншых.

Паліцэйскі М. П. Упаўнаважанага ЦК ЛКСМБ С. Я. Янчанку (Слаўку) я добра ведаў. Першая сустрэча з ім адбылася ў адрыне Лукі Ануфрыева за вёскай. На ёй прысутнічалі Яўген Дзмітрыеў, Аляксандр Дзмітрыеў і я. У той раз С. Я. Янчанка звярнуў нашу ўвагу на канспірацыю, прапанаваў раздзяліцца на тройкі. Затым ён бываў некалькі разоў у нас дома, дапамагаў састаўляць тэксты для лістовак. Аднойчы прысутнічаў на камсамольскім сходзе ў Веры Шчарбатавай. Лістоўкі мы пісалі ў Веры, а затым хлопцы расклейвалі іх па суседніх вёсках.

Мы працавалі ў цеснай сувязі з Фёдарам Вараб'ёвым — старастам вёскі Рэкатка. Праз свайго сына Жэню ён інфармаваў нас аб усім, аб чым даведваўся ў немцаў. Аб небяспецы мы даведваліся па белай анучцы на двары Вараб'ёвых і па адзенню старасты.

Зброю, якую мы збіралі, нам рамантаваў Канон Сафронаў. Ён рабіў прыклады да стрэльбаў. Зброю на рамонт прыносілі Мікалай Ануфрыеў і я.

Хамякова Е. А. Я жыла ў Чапялінцы. Пасля бою ў Чарнічным да нас звярнуліся партызаны са 115-й брыгады, каб мы дасталі для параненых рэваполь — дэзінфіцыруючы сродак для ран. Мая сястра Вольга перад вайной працавала медсястрой. Яна выпісала нам рацэпт, і мы пайшлі з Марусяй Цішковай у Горкі, у аптэку. І калі я падала рацэпт, аптэкарка сказала:

— Для чаго столькі рэваполю? Для партызан? Ідзіце адсюль зараз жа.

Мы спужаліся і амаль бягом кінуліся з аптэкі. Але што рабіць? Лекі ж патрэбны. І тады мы звярнуліся да Д. Марчанкі, якая працавала ў магістраце прыбіральшчыцай. Яна ў сваю чаргу падалася да знаёмага паліцая і сказала, што Маруся Цішкова яе дваюрадная сястра, маці якой упала і разбіла галаву. Паліцай пайшоў разам з намі і пацвердзіў выдуманую версію. Лекі мы атрымалі і перадалі партызанам. Так было не адзін раз.

Хмуровіч В. А. (Хамякова). Пасля адступлення нашых войск у вёсцы Чапялінка заставалася шмат параненых салдат, якіх мы хавалі ў школе, пунях, стараліся аказаць дапамогу. Я, як медсястра, рабіла перавязку. Сярод насельніцтва збіралі мы для іх прадукты харчавання, кармілі, чым маглі. Аднойчы я з М. С. Цішковай (Хамяковай) пайшлі па ягады і знайшлі ў лесе цяжка параненага байца. Я пабегла ў вёску па каня. Пагрузілі салдата на калёсы, павезлі да маёй маці. Накармілі і памясцілі ў школе, дзе былі іншыя параненыя. Па вечарах я хадзіла туды і перавязвала. Летам 1942 г. па заданню Ленчыкава я здабывала медыкаменты для партызан. Калі ў чапялінскім баі быў паранены камандзір атрада І. Ф.Вінаградаў, я хадзіла ў лес і перавязвала яго. Для маскіроўкі брала з сабою граблі і ішла як на сенакос.

Чарняк О. С. У гады Вялікай Айчыннай вайны я жыла ў Горках. Мой муж яўрэй і да мая 1942 г. вымушаны быў хавацца дома. Аб гэтым ведалі падпольшчыкі і давяралі мне. Я стала сувязной паміж імі і Любай Краўцовай, якая працавала ў магістраце.

Любу спачатку мабілізавалі на перапіс насельніцтва, а затым перавялі ў пашпартны стол.

Я трымала сувязь з Аксенціем Патапавым. Па яго заданню хадзіла да Любы Краўцовай і атрымоўвала розныя звесткі аб немцах. Два ці тры разы я прыносіла ад яе пачкі пасведчанняў і пропускаў з подпісамі, пячаткамі і перадавала А. Е. Патапаву ці яго жонцы Кісцянёвай.

Люба Краўцова выратавала Ніну Ласкевіч, якая працавала перакладчыцай і была звязана з партызанамі. Люба даведалася, што Ніну павінны арыштаваць, а тая ў гэты дзень выехала з немцамі. Люба чакала, пакуль яна вярнулася, а потым упусціла яе праз акно ў свой кабінет і схавала за шафай. Вечарам Ніну пераправілі ў партызанскі атрад разам з Вараб'ёвай Валяй. Вядома, што Ніна загінула ў партызанскім атрадзе ў адным з баёў.

Яшчэ раней мой муж таксама пайшоў у партызанскі атрад, куды яго завёў А. Е. Патапаў.

Маці Ніны Ласкевіч схапілі і расстралялі як заложніцу.

Сям'я падпольшчыкаў

Вестка аб вайне застала У. П. Фомчанку ў Панкратаўскай школе, дзе ён працаваў настаўнікам рускай мовы і літаратуры.

Двое сыноў Уладзіміра Пятровіча — васемнаццацігадовы Рыгор і Віктар, якому толькі споўнілася шаснаццаць, пажадалі добраахвотна ўступіць у Чырвоную Армію. Але да Горак не дайшлі. Немцы адрэзалі дарогу на ўсход. Юнакі павярнулі дамоў. Разам з імі былі і Яўген Дзмітрыеў — сакратар камсамольскай арганізацыі Панкратаўскай школы, аднагодкі Мікалай Мельнікаў і Мікалай Ануфрыеў.

Фашыстаў у вёсцы Рэкатка яшчэ не было. Баі прайшлі дзесьці ўбаку, але людзі разумелі, што родную зямлю трэба бараніць. Уладзімір Пятровіч стварыў падпольную групу. Спачатку туды ўваходзілі вучні-камсамольцы Панкратаўскай школы, якіх ён выхоўваў: Яўген Дзмітрыеў, Мікалай Мельнікаў, а таксама сыны.

Падпольшчыкі збіралі зброю, склáдалі, перапісвалі і распаўсюджвалі лістоўкі.

У. П. Фомчанка як мог аберагаў хлопцаў. Разумеў, што група яшчэ не вельмі моцная, не мае баявога вопыту, слаба падрыхтавана да актыўных дзеянняў. Але камсамольцаў цяжка было ўтрымаць.

Па дарозе Панкратаўка — Рэкатка — Машкова ў напрамку Дрыбіна час ад часу паяўляліся групы немцаў колькасцю не больш за ўзвод. Юныя патрыёты вырашылі напасці на іх. Сонечным днём у пачатку кастрычніка яны выбралі месца для засады. У гэты раз падпольшчыкі знішчылі 16 фашыстаў. Затым хлопцы яшчэ больш актыўна пачалі праводзіць дыверсіі — зразалі тэлеграфна-тэлефонныя слупы па дарозе Рэкатка — Горкі, рабілі засады на адзіночныя машыны і невялікія групы акупантаў.

Гітлераўцы ўзмацнілі рэпрэсіі. У час раптоўнага налёту былі арыштаваны сакратар падпольнай камсамольскай арганізацыі Яўген Дзмітрыеў, Рыгор Фомчанка і Мікалай Мельнікаў. Камсамольцы трымаліся мужна і, нягледзячы на катаванні, нікога не выдалі. Прамых доказаў у карнікаў не было. А Мікалай Ануфрыеў увайшоў у давер да немцаў і пераканаў іх у невінаватасці хлопцаў.

Арышт не запалохаў юнакоў. Насупраць, арганізацыя расла, набірала баявы вопыт. Восенню 1941 г. у ёй было ўжо 30 чалавек. Але аб дзейнасці падпольшчыкаў даведаліся фашысты. Зноў пачаліся арышты. Першым схапілі У. П. Фомчанку, затым Васіля Старавойтава, Лізавету Вараб'ёву, Дзмітрыя Афанасьева і Мікалая Мельніка. Іх прывезлі ў Горацкую камендатуру. У вёсцы ніхто не ведаў, куды павезлі арыштаваных. Высветліць усё гэта ўзяўся Віця Фомчанка. Верхам на кані вырашыў паехаць у разведку ў Горкі. Але каля вёскі Галышана карнікі схапілі яго і кінулі ў хлеў бургамістра. На допытах патрабавалі выдаць падпольшчыкаў, але Віця маўчаў. Карнікі распранулі яго і збілі да страты прытомнасці. Вырашыўшы, што ён памёр, немцы паехалі. Жыхары вёскі выратавалі Віктара. З іх дапамогай ён выбраўся з хлева і ўцёк.

А ў гэты час карнікі пачалі допыт падпольшчыкаў. Яны моцна збілі У. П. Фомчанку, патрабуючы выдаць астатніх і прызнаць сябе кіраўніком. У. П. Фомчанку, В. Р. Старавойтава, Дзмітрыя Афанасьева прыгаварылі да пакарання смерцю. Але ім удалося ўцячы. Некаторы час У. П. Фомчанка жыў у вёсках Гліньківка, Панкратаўка, Ярыгі. Затым перабраўся ў Рэкатку і працягваў кіраваць падпольнай групай. Дзейнічаць даводзілася вельмі асцярожна. Паліцаі і нямецкія карнікі ўсё часцей рабілі налёты на вёску.

Быў ліпень 1942 г. За некалькі дзён фашысты схапілі і расстралялі больш як 20 жыхароў Рэкаткі. Вёску поўнасцю спалілі. Цэлыя сем'і Шчарбатавых, Вараб'ёвых, Фомчанкаў, Старавойтавых, усяго 40 чалавек, пайшлі ў партызаны. Хутка аказаліся там і малодшыя сёстры братоў Фомчанкаў.

А. Асмалоўскі.

Дакументы сведчаць

СА СПРАВАЗДАЧЫ ГРУПЫ ГФП № 723 АБ ДЗЕЙНАСЦІ ЗА СТУДЗЕНЬ 1943 ГОДА*

26 студзеня 1943 г.

Группа провела многочисленные проверки, в ходе которых выяснила, что староста деревни Кашино Криштоп Павел поддерживает тесную связь с бандитами.** Так, например, в одной из деревень в октябре прошлого года он созвал антинемецкое собрание, на котором среди прочих присутствовал и выступал с речью известный (позже арестованный группой и расстрелянный) бандит «Валентин», а также Криштоп агитировал за бандитов. Кроме того, он собирал для бандитов зерно и продовольствие... Он был расстрелян.

В периферийную команду в Горках 3-м батальоном 664-й охранной дивизии были доставлены 4 русские, проживающие в дер. Тушевая (14 км западнее Горок), которые обвинялись в связях с бандитами. В ходе следствия подозрения полностью подтвердились. Все арестованные — коммунисты-фанатики систематически укрывали у себя бандитов, снабжали их продольствием и разведматериалами. Они призывали население к саботажу. Все арестованные расстреляны...

* * *

Периферийной командой в Горках был арестован и расстрелян староста деревни Ходоровки (14 км юго-восточнее Горок). Последний все время саботировал выполнение немецких приказов и распоряжений, в особенности приказ о вырубке и очищении от леса полосы вдоль железнодорожной линии. Переданный ему об этом приказ он порвал на глазах у передавшего полицейского службы порядка и отказался от его выполнения. Среди населения он считался враждебно относящимся к немцам...

* * *

Периферийной командой в Горках были арестованы русский Евницкий Филимон и русская Шершнева Евдокия из дер. Черная (14 км западнее Горок). Летом прошлого года они работали на торфзаводе Чепелинка (9 км юго-западнее Горок), а затем уговорили к побегу работающих там 20 военнопленных и бежали вместе с ними. Они были расстреляны...

* * *

Периферийной командой в Горках арестованы два жителя деревни Трегубово (18 км северо-восточнее Горок), которые систематически под угрозой оружия грабили население окрестных деревень. Во время обыска в домах были найдены 2 винтовки. Арестованные расстреляны...

* * *

Периферийной командой в Горках были арестованы и расстреляны как активные бандитские пособники русская Литвинова Ганна и её 18-летний сын Василий из дер. Тушевая. Второй сын Литвиновой Иван, политрук Красной Армии, находится в банде Виноградова. Арестованные сознались в том, что до настоящего времени поддерживали с ним и с бандой связь, добровольно передали бандитам зерно и две коровы с тем, чтобы при отступлении немцы не забрали их...

---

* ГФП (Гейхаймфельдполицай — нем.) — исполнительный орган военной контрразведки в действующей армии гитлеровской Германии, которая занималась борьбой против подполья и партизан. Группа № 723 этого органа действовала в Оршанском, Горецком, Дубровенском, Шкловском, Могилевском районах.

** Пытаясь опорочить и дискредитировать партизанское движение, гитлеровцы именовали партизан и подпольщиков «бандитами», а их боевые формирования — «бандами».

* * *

СА СПРАВАЗДАЧЫ ГРУПЫ ГФП № 723 АБ ДЗЕЙНАСЦІ ЗА МАЙ 1943 ГОДА

26 мая 1943 г.

Во время операции против бандитов «Ток тетеревов» (Биркханбальс), которая предусматривала очищение западной части Горецкого района и лесного массива в восточной части Шкловского района, принимали участие части дивизии, а также секретариата группы в Шклове и Горках каждый одной командой. Этот район являлся территорией оперативного действия банды Мишина, о которой исчерпывающие данные собрал направленный в банду наш разведчик из числа вспомогательных служащих. Сам разведчик группы ГФП, а также другие вспомогательные служащие ГФП участвовали в этой операции. Командами ГФП было прочесано множество населённых пунктов и проверено большое количество жителей, доставленных пленных, всего проверено 250 чел. Из этого числа 39 чел. на месте были разоблачены как бандиты и бандитские пособники и на основании приказа расстреляны. 19 чел. были временно арестованы и доставлены в группу. 16 чел. в целях безопасности направлены в трудовой лагерь. Против остальных 176 чел. компрометирующих материалов не было добыто. Из 19 чел. арестованных 16 чел. на основании дополнительно собранных материалов и свидетельских показаний были разоблачены как активные бандитские пособники, в том числе и староста деревни Тросное Поляков Евдоким, а также Апетова Мария из дер. Тудоровки, которая по сообщению нашего разведчика является женой Мишина (он видел и познакомился с ней во время своего пребывания в банде Мишина). В числе бандитских пособников оказался также один военнопленный, бежавший из шталага Орши, который во время операции пытался выбраться из деревни в женском платье. Указанные выше 16 чел. на основании приказа также были расстреляны.

СА СПРАВАЗДАЧЫ ГРУПЫ ГФП № 723 АБ ДЗЕЙНАСЦІ ЗА ЛІПЕНЬ 1943 ГОДА

27 ліпеня 1943 г.

По приказу секретариата ГФП в Горках был арестован бывший бургомистр дер. Аниковичи Купреев Кирилл, который подозревался в участии в нападении на немецких солдат (см. отчет за май месяц, пункт 8 — совершено нападение на немецкий патруль возле дер. Аниковичи (19 км северо-восточнее Шклова), во время которого были убиты 1 унтер-офицер, 5 солдат и 2 полицейские службы порядка) и даже был зачинщиком нападения. В процессе многочисленных улик, допросов и прежде всего свидетельских показаний бежавших во время нападения полицейских службы порядка он был полностью изобличен в том, что организовал это нападение. На основании приказа он был расстрелян.

3.07 около 19.00 на станции Погодино (непосредственно возле Горок) загорелся и полностью сгорел состав с нефтью одного из складов ГСМ. Состав до этого долгое время без охраны стоял на станции Орша Западная и около 17.00 оттуда ушел в направлении Кричева. И в данном случае предполагается применение магнитной мины с часовым механизмом...

Робраде
Комиссар полевой полиции
и начальник группы

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 4683, воп. 3, спр. 963, л. 6, 9—10, 29, 31, 48—49, 71, 73, 90—91, 110—111, 132—133.

Падрыхтаваў У. Лемяшонак.

Змагалася моладзь

З успамінаў былога ўпаўнаважанага ЦК ЛКСМБ па Горацкаму раёну С. Я. Янчанкі

С. Я. Янчанка.

Да вайны я скончыў Віцебскае педвучылішча. 8 ліпеня 1941 г. прыступіў да работы выхавацелем дзіцячага дома ў в. Ляды Дубровенскага раёна. Затым разам з установай эвакуіраваўся ў Тамбоўскую вобласць.

У маі 1942 г. мяне выклікалі ў Маскву і накіравалі вучыцца ў спецшколу, па заканчэнні якой паслалі ў тыл для разгортвання камсамольскага падполля. Перайшоў лінію фронту ў ноч з 6 на 7 ліпеня 1942 г. У канцы гэтага месяца прыбыў у Горацкі раён. Знаходзіўся спачатку ў атрадзе Перапечкіна, з якім прыйшоў з-за лініі фронту. Партызанскія брыгады летам і ўвосень 1942 г. базіраваліся ў лясным масіве паміж вёскамі Рэкатка і Чапялінка. Пачаў знаёміцца з моладдзю суседніх вёсак — Рэкатка, Машкова, Добрая, Чапялінка, Палёнка і інш.

Моладзь в. Рэкатка выдзялялася сваім патрыятычным настроем, актыўна дапамагала партызанам. У жніўні тут быў праведзены камсамольскі сход, дзе я расказаў аб задачах падпольшчыкаў у тыле ворага, аб формах барацьбы і палітычнай работы сярод моладзі. Сакратаром камсамольскай арганізацыі быў абраны аўтарытэтны сярод моладзі Жэня Дзмітрыеў.

Падпольшчыкі в. Рэкатка вялі вялікую палітычную работу сярод насельніцтва, збіралі і перадавалі партызанам зброю, зрывалі гаспадарчыя мерапрыемствы акупантаў, рыхтавалі моладзь да ўступлення ў партызанскі атрад. Я перадаваў ім зводкі Саўінфармбюро, якія прымаліся па рацыі ў атрадзе Перапечкіна. У верасні ўся моладзь Рэкаткі пайшла ў партызаны.

Пасля карнай экспедыцыі восенню 1942 г. атрад Перапечкіна выйшаў за р. Сож, а я застаўся ў 35-ым атрадзе, які знаходзіўся ў Баронавым лесе. Былі створаны падпольныя групы ў вёсках Альхоўка, Тудараўка, Клін, Шапялёўка і інш.

У жніўні 1943 г. 35-ы атрад перайшоў у Бялыніцкі раён. Для папаўнення атрада ў Горацкім раёне была пакінута невялікая група партызан, якую ўзначалілі намеснік камандзіра атрада Г. Дулічаў і я.

Выканаўшы заданне, мы пайшлі ўслед за 35-ым атрадам у Бялыніцкі раён, дзе я быў абраны сакратаром падпольнага Бялыніцкага райкома камсамола.

Армейскія разведчыкі

19 лютага 1942 г. штабам Заходняга фронту ў Горацкі раён была накіравана разведвальная група з пяці чалавек. У яе ўваходзілі Г. І. Смелаў — камандзір, У. П. Пятроўскі — намеснік камандзіра групы, Я. І. Сарокіна — радыстка, А. В. Гарбузава, Ю. У. Новікаў. Прызямліліся яны недалёка ад вёскі Малькаўка Дрыбінскага раёна. Закапалі парашуты і рацыю. Праз пяць дзён А. В. Гарбузава і радыстка Жэня Сарокіна накіраваліся ў Горкі, каб уладкавацца на працу, знайсці жыллё, а потым да іх павінны былі далучыцца Г. І. Смелаў, У. П. Пятроўскі, Ю. У. Новікаў.

Дакументы былі выдадзены ў Маскве. З імі дзяўчыны прыйшлі ў Горацкую камендатуру. Тут сустрэлі Пятра Краўчанку. Ён уладкаваў іх на працу і дапамог з жыллём. У далейшым сям'я Пятра вельмі дапамагала, асабліва яго маці. Пётр пазнаёміў разведчыкаў з Юрам Купчынавым, Шурай Рубанавай і іншымі, на якіх можна было паспадзявацца ў небяспечнай справе.

Жэня Сарокіна з Шурай Рубанавай працавалі на воўначосцы, а Гарбузава — на розных работах у горадзе.

Гарбузава жыла ў доме Лейтнер Сафіі Фамінічны на Мсціслаўскай вуліцы, Жэня Сарокіна — у пустым яўрэйскім доме.

Трэба было правезці рацыю, якую схавалі ў лесе, дзе прызямліліся. За ёй ездзілі ўтрох: Шура Гарбузава, Пётр Краўчанка і Ягор Купчынаў. Купчынаў ляжаў на санях, у коўдрах, нібы хворы на тыф. Пад ім у саломе і схавалі рацыю. Прыбылі ў Горкі паспяхова. Некалькі дзён рацыя знаходзілася ў развалінах дома Пятра Краўчанкі і ў доме П. Е. Кажарова. Але была небяспека, што яе маглі знайсці немцы або паліцаі. Тады вырашылі пераправіць рацыю ў Чапялінку да Ягора Ленчыкава. Па суботах туды прыходзілі Жэня Сарокіна і Шура Гарбузава і вялі перадачы радыёграм у Маскву.

Былая партызанка 115-й партызанскай брыгады Е. Н. Новікава, якая добра ведала падпольшчыкаў, расказала, што яе муж Ю. У. Новікаў працаваў загадчыкам лазні акадэміі. Туды хадзілі нямецкія салдаты і афіцэры. З іх размоў разведчыкі даведваліся шмат карысных звестак і паведамлялі ў штаб фронту. У зборы дадзеных дапамагалі і горацкія падпольшчыкі.

17 мая 1942 г. немцы зрабілі аблаву. Ж. Сарокіна і Ш. Гарбузава трапілі ў рукі ворага, але ім удалося ўцячы. Яны дабраліся да Чапялінкі, адкуль з групай падпольшчыкаў пайшлі ў партызаны. Потым да іх далучыўся У. П. Пятроўскі. Г. І. Смелаў і Ю. І. Новікаў засталіся ў Горках, пазней і яны пайшлі да партызан.

І. Стальмашонак.

«Летучка» адляталася

З успамінаў Дз. Ф. Вайстрова

Вайстроў Дзмітрый Фёдаравіч нарадзіўся 7.11.1906 г. у в. Добрая Горацкага раёна, адзін з кіраўнікоў партызанскага руху ў Магілёўскай вобласці. З 1930 г. на партыйнай і савецкай рабоце. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны пакінуты ў тыле ворага. У партызанах з кастрычніка 1941 г., з лютага 1942 г. камандзір групы, атрада, у верасні — кастрычніку 1942 г. выконваў абавязкі камандзіра брыгады «Звязда». З кастрычніка 1942 г. па сакавік 1943 г. камандзір галоўнага партызанскага атрада, са жніўня 1943 г. член Мсціслаўскага падпольнага РК КП(б)Б, у студзені — чэрвені 1944 г. камісар партызанскай брыгады 61-й. У 1944—57 гг. на партыйнай, савецкай і гаспадарчай рабоце. Аўтар кнігі «У горацкім рэдкалессі».

Мы пригласили на совещание командиров групп, которые располагались в чепелинском лесу, — Алексея Поликарпова, Петра Ревякова и Бориса Сергеева. Они дали согласие участвовать в рейде и также начали готовиться к операции.

Дз. Ф. Вайстроў.

6 января 1943 года на двадцати с лишним подводах мы выехали из чепелинского леса. Вечером пересекли железную дорогу на кукшиновском переезде между станциями Зубры и Погодино. Остановились на опушке леса невдалеке от поселка Черничный и выслали вперед разведку. В 14 часов разведчики вернулись и доложили, что в поселке пока все спокойно. Мы двинулись вперед.

На дороге из Горок в Оршу движения не было. Мы ехали не спеша. На первых санях — командир взвода Владимир Сергеевич Семенцов, комиссар Иван Иосифович Барков, медсестра Надежда Сергеевна Сойкина. Я находился на первой подводе. Со мной — командир отделения разведки Иван Логимахов, начальник разведки отряда Михаил Шипилин и Дарья Войстрова. Миновали один, второй сарай, стоявшие в поле. До окраины поселка оставалось не более 50 метров. И вдруг ехавшие впереди в снежном тумане заметили фигуры. Это из подворий выбегали гитлеровцы.

— Фашисты! В деревне враги, — крикнула Сойкина.

Шипилин и Логимахов хлестнули коня кнутом, и он помчал сани в посёлок. На других санях следом за нами неслись Василий Матюхин, Сергей Астахов, Исмат Юсупов, Григорий Глеков, Саша Кончев. С криком «ура» бойцы ворвались в поселок.

Это был стремительный налет, что и решило успех боя. Сани с партизанами проноси-

лись мимо домов, а выбегавшие из них фашисты, ошеломленные внезапной атакой, вели редкий и неорганизованный огонь. А в поселок с криком «ура!» въезжали все новые и новые группы партизан.

Паника среди гитлеровцев усилилась. Они начали отступать на другой конец поселка. Партизаны теснили их к заболоченным берегам незамерзающей реки Прони. Огонь велся со всех сторон, потому что наши ребята непрестанно меняли позиции, маскировались за заборами, запорошенными снегом, копнами соломы и сена.

Вслед за первой волной атакующих в поселок ворвались бойцы взвода Сергея Сорокина. Впереди бежал комиссар Иван Астапенко, за ним — партизаны Евгений Дмитриев, Константин Баринов, Василий Воробьев, Михаил Щербатов, Алексей Другаков, Фома Сибирков.

Группа партизан из взвода Сорокина — пулеметчик Константин Антонов, коммунист Терентий Щупляков, комсомольцы Михаил Куриленко, Иван Черников, бойцы Михаил Щербатов, маскируясь за сараями и заборами, по огородам заходили в тыл карателям со стороны деревни Сава. Занимали партизаны позиции и на заболоченных берегах реки, отрезая карателям путь к отступлению к деревне Шарипы через Проню, где проходила зимняя дорога.

А в поселок на полном ходу уже въезжали бойцы Ивана Виноградова и Алексея Поликарпова. Они стремительно атаковали карателей, прижимая их к берегам Прони и отрезая им путь к отступлению в Горки. Следом двигалась группа Петра Ревякова.

Фашистам ничего не оставалось, как залечь на берегу Прони. Яростно бил их пулемет, раздавались автоматные очереди, над головами наших бойцов свистели пули.

Комиссар взвода Иван Астапенко и пулеметчик Константин Антонов, решив уничтожить засевшую под мостом группу карателей, по оврагам спустились на лед реки и стали в упор расстреливать фашистов. Но недолго стрелял наш пулемет. Вражья пуля попала в отважного парня, и умолкли губительные очереди нашего пулемета. Комиссар Астапенко вынес раненого бойца на берег реки. К нему подбежали медсестры Елена Мельникова и Ксения Щербатова. Они сделали перевязку и унесли Антонова с поля боя.

В эту минуту мне сообщили, что ранен в ногу Петр Ревяков. Его тоже унесли бойцы на окраину поселка, где уже развернула работу наша санслужба.

Темнело. Бой затягивался, но фашисты все еще не сдавались. Непрерывно бил их пулемет. На подавление этой огневой точки поползли комсомольцы Михаил Липин, Николай Ануфриев, Николай Мельников, Василий Ивашкевич и Василий Протчев. Их не заметил вражеский пулеметчик, увлекшийся обстрелом партизан, штурмовавших мост, и был уничтожен. Пулемет оказался в руках Михаила Лапина. Он повернул его в сторону фашистов, засевших под мостом. Поддержанные его огнем, партизаны штурмом взяли мост. На льду под его фермами нашли себе могилу около 10 гитлеровцев.

Бой затихал. Перевес был явно на нашей стороне. Но тут мне не повезло. Я получил ранение в правую руку и в живот. Ко мне подбежали Александр Поликарпов, Михаил Шипилин и Иван Логимахов, подхватили под руки и повели к дому Леона Ивановича Платонова. Пока меня перевязывали, хозяйка дома шепнула Поликарпову, что во дворе в их погребе укрылись два немецких солдата. Поликарпов вышел во двор, отбросил крышку погреба и дал туда автоматную очередь, а Шипилин бросил гранату.

В руки наших бойцов попался и довольно интересный документ. Это был приказ горецкой комендатуры о том, что личный состав отряда «Летучка» за прежние «заслуги» отмечен командованием вермахта. Каждый солдат после войны получит по 15 гектаров пахотной земли.

— Дали мы им землицы! Долго будут помнить, — смеялись партизаны.

Друкуецца са скарачэннямі па кн.: Войстров Д. Ф. В горецком редколесье. Мн., 1986. С. 127—132.

На прымусовых работах

З успамінаў жыхароў Горацкага раёна, якія былі вывезены

Жумарына Хрысціна Арцёмаўна. Нарадзілася я 16 кастрычніка 1918 г. у вёсцы Вялікае Кацялёва. З 1936 г. да вайны працавала ў Горках у арцелі «Пищевкус».

У 1942 г. пачалі адпраўляць у Германію. У гэты лік трапіла і я. 2 чэрвеня ў таварняках нас павезлі ў Нямеччыну. Прывезлі нас

у горад Пархім, дзе працавала на кансервным заводзе 6 месяцаў. Кармілі вельмі дрэнна.

Потым мяне разам з іншымі адправілі ў Гамбург на ваенны завод, дзе я прабыла 1 год і 7 месяцаў. Памятаю, што горад моцна бамбіла англійская авіяцыя і хоць было страшна, але мы ўсё роўна радаваліся. Гамбург амаль поўнасцю быў разбураны. Нас перавезлі ў Песніг, што ў Цюрынгіі, дзе мы таксама працавалі на ваенным заводзе. Там жа вызвалялі нас амерыканцы. Потым вывезлі ў рускую зону, дзе працавала на падсобнай гаспадарцы да 7 верасня 1945 г. Вярнулася ў Горкі, працавала ў адноўленай арцелі «Пищевкус», потым у пякарні, у сталовай.

Раемская Ніна Патапаўна. Нарадзілася ў в. Макараўка ў 1924 г. У 1942 г. 27 лістапада нас вывозілі ў Германію. Пасадзілі ў Горках у «цялятнік», у Оршы праходзілі медкамісію.

За дарогу, пакуль даехалі да Берліна, вельмі многа людзей памерла — не хапала вады, не кажучы ўжо пра ежу. Затым адправілі нас у Фоенпостам, дзе 40 дзён трымалі на пахлёбцы і 10 грамах хлеба ў суткі. Потым перавезлі ў Бомбліц, дзе я больш чым год працавала на ваенным заводзе. Затым мяне перавялі на кухню, абіраць бульбу.

Два гады і 7 месяцаў знаходзілася я пад канвоем, пад вартай. Увесь гэты час я не бачыла ў вочы сапраўднага хлеба, нават вады рэдка піла ўволю. Нас ніхто не лічыў за людзей, мы былі толькі бясплатнай рабочай сілай. Я стараюся не ўспамінаць тыя страшныя гады, бо вельмі цяжка робіцца на сэрцы.

У маі 1945 г. нас вызвалілі англічане, пераправілі ў рускую зону, потым я вярнулася ў Горкі. Працавала медсястрой.

Саўчанка Мікалай Рыгоравіч. Нарадзіўся я ў Горках, скончыў 7 класаў Слабадской школы. У Германію быў вывезены ў 1942 г. Закінулі нас у горад Фрыдрыхгаффэн, на бераг Бадэнскага возера, дзе размяшчаўся маторабудаўнічы завод «Майбахматорэнбаум». Лагер, у якім я апынуўся, называўся «Алімпія». Было нас там усіх каля дзвюх тысяч з усёй Еўропы, у асноўным з Усходняй. Працаваў я на разгрузцы вагонаў. Умовы былі жудасныя. На тачцы павінен быў перавозіць груз па 400 кг, а сілы не было зусім. Мы хадзілі, як жывёліны, ні ў кога не было імён, толькі нумары (у мяне $\frac{24}{123}$), ды жоўтыя павязкі, якія потым замянілі жоўтай паласой, што наносілася фарбай. Хацелася толькі аднаго — памерці. Часта ў чалавека не было нават крыві, мы пухлі з голаду. Дома ў 15 гадоў я важыў 64 кілаграмы, а ў Германіі з'ехаў да 44. Кармілі нас бручкай і бульбай, хлеб быў як апілкі. Есці хацелася ўвесь час, а на абед часта нам давалі намяшаную з вадой траву. Каб падняцца па прыступках у сталовую, часта ногі трэба было перастаўляць рукамі — слабасць была страшэнная.

Каралі па любой прычыне. Памятаю, як вешалі хлопца з Магілёва — украў бохан хлеба з кухні...

Сувязі са знешнім светам амаль што не было, толькі па паводзінах немцаў здагадваліся аб тым, што робіцца на франтах. Аб перамозе даведаліся ўжо непасрэдна пасля вызвалення часцямі саюзнікаў.

У 1943 г. у Германію былі вывезены мая маці, Саўчанка Кацярына Патапаўна, а таксама бацька Рыгор Іванавіч і брат Уладзімір, якому было тады ўсяго 6 гадоў. Бацька і брат вярнуліся, а маці памерла.

Страшна ўсё гэта ўспамінаць і не дай Бог такому паўтарыцца.

Сцелікаў Ягор Пятровіч. Нарадзіўся ў 1926 г. у в. Ходаравічы.

У 1943 г. адправілі нас у Горацкую камендатуру, дзе шмат моладзі трымалі пад замком. Потым з чыгуначнай станцыі адправілі на Оршу, а адтуль у таварняк — і ў Германію. Ехалі доўга, часта спыняліся, памятаю, што вельмі хацелася піць. Прывезлі нас у горад Наймарк і ўжо адсюль рассылалі каго куды. Я трапіў у Брайтэнбрук на капанне водаправоду. Было вельмі цяжка. Потым я працаваў у розных гарадах і мястэчках — Нітанаў, Гімал, Штраўбінг. У памяці гэтыя гады засталіся нейкай чорнай плямай, і адзінае, што трымала ў жыцці — гэта толькі надзея на перамогу нашых і вызваленне.

Падрыхтавалі М. Студнева, С. Кротава

Дакументы сведчаць

З ЖУРНАЛА БАЯВЫХ ДЗЕЯННЯЎ 112-ГА АСОБАГА ГОРАЦКАГА АТРАДА

10.10.43 Партизаны 2-й роты Ковалевский А. с группой 6 человек обрезали телефонной связи 800 метров на участке Копысь-Пронцевка. Партизан 3-й роты Матиенко уничтожил 1 пролет 6-ти жильного кабеля по шоссейной дороге Орша — Могилев. Группа разведчиков Цариков И., Гераськов В., Солдатенко В. и Оськин И. произвели налет на немецкую кухню, стоявшую в д. Козловичи 1. В результате чего был убит 1 немец, 1 нем. ранен.

11.10.43 Партизаны Котов С., Цариков В. и Романьков М., обрезали связь по дороге Орша — Могилев 1600 метров.

12.10.43 Партизаны 1-й роты Котов С., Августовский, Барабанов Т., Миночкин В., Махаркин и Елиферовский обрезали связь по дороге Орша — Могилев 300 метров, Зам. ком. 2-й роты Посудновский Т. убил полицейского в д. Сидоровка. Отнята 1 винтовка СВТ. Партизаны 2-й роты Калашников с группой 7 человек сделали засаду на шоссе Орша — Могилев. Была подбита легковая машина, убиты 1 офицер и 1 унтер-офицер, ранен шофер. Ими пойман предатель-фашист Витько В.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 3500, воп. 4, спр. 127, л. 6.

З ДЗЁННІКА РАБОТЫ 115-га ПАРТЫЗАНСКАГА АТРАДА

1. Магистраль Шклов — Горки. У д. Городище уничтожено 2 моста, длиной 1-й 70 м, 2-й — 22 м	17.9.43	1-й взвод ком. Житников	Участвовало 18 чел.
2. Телефонная связь уничтожена на 2 км	17.9.43	1-й взвод ком. Житников	18 чел.
3. В дер. Селец Горецкого р-на уничтожено 2 моста: первый — 18 м, второй — 9 м. Задержано передвижение войск на 1,5 суток	28.9.43	1-й взвод ком. Конев Г. З.	5 чел.
4. В д. Басе Горецкого р-на уничтожен мост на реке Бася длиной 36 м. Задержано передвижение на 1 сутки	19.9.43	1-й взвод ком. Конев Г. З.	6 чел.
5. В д. Сальники Горецкого р-на на р. Бася уничтожен мост длиной 61 м. Задержано передвижение немецких войск на 1,5 суток	19.9.43	1-й взвод ком. Ленчиков, Логимахов	6 чел.
6. Уничтожено телефонной связи на 2 км от д. Сальники до д. Варьково. Горецкий район	19.9.43	1-й взвод ком. Конев Г. З.	6 чел.
7. По магистрали на территории Тушевского леса уничтожен мотоциклет с 3 немецкими разведчиками. При обыске найдены планы с расположением фронта	5.10.43	1-й взвод ком. Ленчиков, Конев	15 чел.
8. По магистрали на территории Тушевского леса была обстреляна автомашина, где было убито 4 немца, 8 немцев ранено	6.10.43	1-й взвод ком. Ленчиков, Конев	8 чел.
9. По магистрали Черневка — Шклов уничтожено 2 автомашины. Взято вооружение и боеприпасы	20.10.43	1-й взвод ком. Конев	18 чел.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 3500, воп. 4, спр. 128, л. 105, 106.

З ЖУРНАЛА БАЯВЫХ ДЗЕЯННЯЎ ПАРТЫЗАНСКАГА АТРАДА № 47 «ПАБЕДА» МАГІЛЁЎСКАЙ ВОБЛ. АБ БАЯВОЙ ДЗЕЙНАСЦІ АТРАДА З 3 ЖНІЎНЯ ПА 26 ВЕРАСНЯ 1942 г.

Месяц	Дата	Описание боевых действий	Участники
Август	3	Спущен воинский эшелон под откос с военным имуществом и боеприпасами, следовавший со стн. Орша на стн. Горки	Нач. группы Горковенко, Андреев, Чуприков, Григорьев
	13	Спущен воинский эшелон под откос в районе Зубры с офицерским составом. Опрокинуто 17 вагонов, убито и ранено 500 чел., в том числе погиб генерал со своей охраной. Эшелон следовал со стн. Орша на стн. Горки	Нач. группы Горковенко, Андреев, Чуприков и Григорьев
	14	Уничтожено 4 автомашины, и в боях на Гулидовском торфоболоте уничтожено 32 фашиста...	
	18	Сожжен лесопильный завод в районе Рябки, Дрибинского района, вырабатывавший пиломатериалы для строительства военных укреплений	
	22	Пущен под откос воинский эшелон, следовавший из Орши на Кричев с техникой	Нач. группы Горковенко, Чуприков, Корачков, Ротобыльский, Вехотка, Якубов...
	с 25 на 26	Спущен воинский эшелон с боеприпасами, техникой и живой силой. Убито 350 чел. Эшелон следовал на фронт из Орши на стн. Кричев. Разбиты паровоз и 13 вагонов с живой силой	Нач. группы Горковенко, Андреев, Резепов, Ротобыльский, Вехотка, Яковлев
	27	Сожжен Самодумский лесопильный завод Горецкого района, распиловочный материал которого шел на строительство дотов	Нач. группы Горковенко, Андреев, Люся, Ротобыльский, Ефременко
	28	Спущен под откос воинский эшелон с неизвестным грузом, следовавший на фронт из Орши на Горки	Вехотка, Якубов, Болашев
Сентябрь	8	Взорваны: ж.-д. труба (мост железобетонный) в районе (дер.) Матюты, Горецкого района, и 50 погонных м ж.-д. полотна	Нач. группы Перепечкин, Корачков, Горковенко, Болашев, Вехотка, Якубов...
	22	В боях в районе дер. Добрая, Горецкого района, уничтожено 13 немцев, 22 полицейских. Взяты трофеи	Старший Тучин
	22	Сожжен мост на грунтовом большаке Шклов в дер. Добрая, Горецкого района	Горки
	26	Спущен воинский эшелон под откос, следовавший из Горок на Оршу, гружёный зерном. Разбиты паровоз, 21 вагон	Нач. группы Горковенко, Андреев, Вехотка, Резепов, Якубов, Болашев, Ротобыльский...

Командир партизанского отряда № 47 «Победа» ст. сержант Липкин
Комиссар партизанского отряда № 47 «Победа» политрук Калимулин
Нач. штаба партизанского отряда № 47 «Победа» сержант Лосев.

Друкуецца па кн.: Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 — июль 1944). Мн., 1967. Т. 1. С. 320—321.

У наступленні і абароне

З успамінаў ветэрана 70-й стралковай дывізіі У. Дз. Коршунава

8 кастрычніка 1943 г. дывізію перакінулі ў раён вёскі Горы. Да 12 кастрычніка яна заняла зыходнае становішча для наступлення на рубеж вышыні 215,0 на паўднёвы захад ад вёсак Лукі, Турышчава, Мікуліна. Раніцой 12 кастрычніка часці перайшлі ў наступленне на Канюхі, Блажкі. Баявымі дзеяннямі дывізія садзейнічала 1-й польскай дывізіі і іншым злучэнням 33-й арміі ў раёне Леніна. Баі на гэтым рубяжы працягваліся да 20 кастрычніка і насілі жорсткі характар.

З 20 кастрычніка часці дывізіі перайшлі да абароны па рубяжы ад вёскі Лукі да вёскі Паляшчыцы. У абароне знаходзіліся да 22 чэрвеня 1944 г. У гэты перыяд палкі дывізіі вялі баі за авалоданне пануючымі высотамі, разведку праціўніка, удасканальвалі сваю абарону. Асабліва вылучыліся ў гэты час нашы разведчыкі і снайперы.

У 252-м стралковым палку была арганізавана школа снайпераў. Заняткі ў ёй праводзіў І. Л. Грыгор' еў. Снайперскаму майстэрству вучылася група дзяўчат. Толькі з 16 лютага да 24 сакавіка снайперы знішчылі 462 фашыстаў. І. Л. Грыгор'еў давёў свой лік да 300 ворагаў, яму першаму ў дывізіі было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

24 красавіка 1944 г. дывізія была ўключана ў састаў войск 33-й арміі. У канцы мая камандаванне дывізіяй прыняў палкоўнік Калеснікаў.

Перад пачаткам наступлення 2-га Беларускага фронту праводзілася дасканальная разведка праціўніка. У ноч з 21 па 22 чэрвеня 1-ы батальён 252-га стралковага палка правёў разведку боем, заняў дзве траншэі праціўніка ў раёне вёскі Малое Марозава. Для таго каб увесці ў зман праціўніка па ўсяму фронту арміі дзейнічалі пошукавыя разведгрупы.

23 чэрвеня 68-ы стралковы полк авалодаў першай і другой траншэямі немцаў на поўнач ад вёскі Малое Марозава і першай траншэяй на ўсходняй ускраіне вёскі Канюхі.

24 чэрвеня 68-ы і 252-і палкі адбілі ўсе контратакі немцаў і ўтрымалі захопленыя рубяжы. 25 чэрвеня праціўнік вёў моцны агонь па нашых баявых пазіцыях.

26 чэрвеня 1944 г. у 3.30 праціўнік пачаў адыход. Нашы войскі пачалі праследаванне. 68-ы і 252-і палкі дзейнічалі на правым флангу дывізіі, да 5.00 завалодалі чацвёртай лініяй траншэй у раёне Малое Марозава — Кварцяны, перадавыя атрады падышлі да Кацялёва.

329-ы стралковы полк пачаў рухацца ад вёскі Паляшчыцы ў накірунку Горак і далей на Мацюты, Чапялінку, Гулідаўку, Арлоўшчыну, Асіповічы. Перадавы атрад пад камандаваннем капітана В. В. Піліпаса першым увайшоў у Горкі 26 чэрвеня, а ў наступны дзень 27 чэрвеня выйшаў да Дняпра, фарсіраваў яго і ўварваўся ў Шклоў. В. В. Піліпасу за гэту аперацыю было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

252-і стралковы полк рухаўся ў накірунку Малое Марозава, Кацялёва, Сураўцова, Задарожжа, Сенькава, Ліхачова, Пална, Дубовы Вугал, Міхайлавічы.

Ратавала дакументы

Анеля Кжывань да апошняга дыхання выконвала свой нялёгкі салдацкі абавязак. 12 кастрычніка 1943 г., калі польскія воіны-касцюшкаўцы вялі наступленне, яна ахоўвала машыну з важнымі дакументамі і раненымі. Варожая авіяцыя некалькі разоў бамбіла размяшчэнне часці. Пры адным з такіх налётаў машына загарэлася. Адважная аўтаматчыца кінулася ў полымя і выратавала аператыўныя дакументы. Гэты подзвіг каштаваў ёй жыцця. 19-гадовай Анелі

А. Кжывань.

Кжывань было пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

У гонар 40-годдзя Вялікай Перамогі савецкага народа на адным з будынкаў вуліцы, якая носіць імя Анелі Кжывань у вёсцы Леніна, урачыста адкрыта мемарыяльная дошка. У горадзе Канску Краснаярскага края на плошчы перад лесапільна-дрэваапрацоўчым камбінатам, на якім працавала Анеля і адкуль пайшла добраахвотніцай на фронт, у яе гонар устаноўлены помнік.

А. Фядосенка

Павёў у бой

Нарадзіўся Юліуш Сямёнавіч Гюбнер у 1912 г., па нацыянальнасці паляк. У Польскую армію прыбыў 15 жніўня 1943 г. з Францыі, дзе знаходзіўся ў канцлагеры для ўдзельнікаў вайны ў Іспаніі.

12 кастрычніка 1943 г. у баі пад Леніна — Трыгубава намеснік камандзіра палка па палітчастцы капітан Ю. С. Гюбнер асабіста камандаваў першым палком. Упэўнены, спакойны, выдатны знаўца сваіх афіцэраў і салдат, ён адным з першых павёў свой полк у наступленне. Асабістым прыкладам падтрымліваў высокі воінскі дух польскіх воінаў.

А калі на адзін з батальёнаў абрушыўся флангавы агонь нямецкіх кулямётаў і батальён залёг, несучы вялікія страты, капітан Ю. Гюбнер хутка ацаніў становішча, першым узняўся з зямлі. З крыкам «Уперад, мсціўцы Варшавы!» кінуўся ён на ворага, падымаючы за сабой салдат і афіцэраў, вывеў іх з-пад лініі агню і штыкавой схваткай выбіў немцаў з займаемай пазіцыі. У гэтым баі вораг страціў каля батальёна салдат.

Пры штурме вёскі Трыгубава капітан Ю. Гюбнер, паранены ў ногі, не дазволіў вынесці сябе з поля бою да заканчэння атакі. Ён працягваў кіраваць наступленнем. І толькі пасля таго, як далажыў камандзіру дывізіі аб выкананні баявой задачы, пакінуў полк.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 11 лістапада 1943 г. капітану Юліушу Сямёнавічу Гюбнеру было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Б. Шалуха.

Прарываў абарону

Высоцкі Уладзіслаў, Герой Савецкага Саюза (1943). Нарадзіўся ў 1908 г. у Польшчы. З мая 1943 г. у Польскай дывізіі імя Т. Касцюшкі. Намеснік камандзіра батальёна капітан Высоцкі вызначыўся ў баях каля в. Леніна. Хуткасць, з якой ён атакаваў, ашаламіла ворага, прымусіла яго адступіць. 12 кастрычніка 1943 г. батальён, якім камандаваў Высоцкі, авалодаў апорным вузлом супраціўлення гітлераўцаў і ўклініўся ў другую лінію абароны непрыяцеля каля в. Трыгубава (цяпер в. Касцюшкава). Апынуўшыся ў акружэнні, Высоцкі, каб не трапіць у палон, пакончыў з сабою.

Атаку вялі танкісты

З успамінаў старшыны запасу Б. Цымбалюка

У баі пад Леніна асабліва вызначыліся танкісты камандзіра ўзвода Героя Савецкага Саюза лейтэнанта І. Я. Бутэнкі. Ідучы ў першым эшалоне, ён агнём сваёй пушкі падбіў два танкі, у тым ліку адзін «тыгр». Праследуючы адступаючага ворага, машына Івана Бутэнкі загрузла на ўскраіне лесу. Нямецкія гарматы, якія стаялі там, адкрылі ўраганны агонь. Танк загарэўся. Бутэнка загадаў экіпажу зняць кулямёты. Экіпаж, выскачыўшы з танка, адкрыў агонь. Тут па гітлераўцах ударыла наша артылерыя. Разам з танкамі ў наступленне пайшла гвардзейская мотастралковая брыгада пад камандаваннем палкоўніка В. Л. Саўчанкі. Мужны экіпаж уліўся ў рады наступаючых мотастралкоў. Недалёка разарвалася міна і асколкам цяжка раніла Івана Бутэнку ў галаву (21 кастрычніка 1943 г. ён памёр).

Бой разгараўся. Уперадзе чорныя фантаны зямлі ад выбухаў, грукат асколкаў па брані. Цяжка арыентавацца. Але Міхайлаў упэўнена вядзе баявую машыну. Нямецкія танкі спрабуюць спыніць наша наступленне. Танк Міхайлава заходзіць у фланг немцам. Заражаючы Баброў толькі паспявае падаваць снарады. Адзін фашысцкі танк загарэўся. Стралок-радыст Міша Чугулёў адкрыў агонь па аўтаматчыках у шэра-зялёнай форме. Яны як падкошаныя падаюць на зямлю. Праціўнік у паніцы.

— Упарад! — камандуе Міхайлаў.

Механік-вадзіцель суседняга танка старшы сяржант Мезенцаў дае поўны газ, і баявая машына накіроўваецца на варожую батарэю, якая падбіла танк Івана Бутэнкі, давіць яе гусеніцамі. Але раптам моцны ўдар патрос машыну. Разбіта гусеніца. Паказаліся два нямецкія танкі.

Міхайлаў разгадаў іх намер і рашыў не падпускаць бліжэй чым на 600 метраў. Два выстралы, і танкі праціўніка заклубіліся дымам. Але загарэлася машына Міхайлава. Уперадзе акопы, а ў іх ворагі. Міхайлаў кідае туды гранаты — некалькі фашыстаў знішчана. З-за павароту траншэі паказаўся нямецкі афіцэр. Міхайлаў застрэліў яго з пісталета. На яго накідваецца нямецкі салдат. Пісталет даў асечку. Аднак Аляксандр Міхайлаў аказаўся пераможцам.

Падтрымлівалі агнём

З успамінаў былога парторга дывізіёна 5-й гвардзейскай Сталінградскай дывізіі А. У. Юшко

У пачатку кастрычніка 1943 г. наш гаўбічны полк тэрмінова перакінулі з іншага ўчастка Заходняга фронту пад Леніна. Артылерысты адразу ж пачалі абсталяванне агнявых пазіцый.

Раніца 12 кастрычніка. Яна выдалася на рэдкасць яснай. Усе на сваіх месцах, ля грозных гаўбіц застылі разлікі. Праціўнік неспакойны: вядзе хаатычны агонь яго артылерыя, мінамёты, цішыню раніцы прашываюць кулямётныя чэргі. І вось жаданая каманда: «Агонь!»

Аглушальны грукат страсянуў паветра, вогненны віхар пранёсся над батарэямі.

Раптоўна спынілася сувязь агнявога рубяжа з назіральным пунктам, дзе знаходзіліся карэктыроўшчыкі. Прыхапіўшы з сабою байца, я перабежкамі накіраваўся на пошукі пашкоджання. Мы неўзабаве выявілі перабіты асколкамі бомбы тэлефонны провад. Праз лічаныя секунды сувязь аднавілася.

Роўна гадзіну грымела кананада. Прагучаў апошні залп артылерыйскай падрыхтоўкі і вось пранеслася ўжо аддаленае «Напшуд!». Яно змяшалася з рускім «ура!». Цяжка перадаць хвалюючае відовішча той атакі. Уся дывізія касцюшкаўцаў паднялася з укрыццяў і шарэнгамі, у поўны рост, пайшла наперад, нягледзячы на агонь ажыўшых варожых пунктаў, разрывы авіябомб.

З АПЕРАТЫЎНАЙ ЗВОДКІ ЗА 26 ЧЭРВЕНЯ 1944 г.

На Могилевском направлении наши войска, успешно продвигаясь вперед, с боем овладели районным центром Могилевской области городом Горки, а также заняли более 450 других населенных пунктов...

Сообщения Советского Информбюро. М., 1945. Т. 7. С. 10.

Вызваляў горад

Старшы лейтэнант Л. К. Крыжыцкі ўдзельнічаў у вызваленні Горацкага раёна і райцэнтра. Ён быў тады камандзірам батальёна 70-й стралковай Верхнедняпроўскай дывізіі. Незадоўга да пачатку летняга наступлення правёў разведку боем. Захапілі сем палонных, высветлілі размяшчэнне агнявых сродкаў праціўніка.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 24 сакавіка 1945 г. старшага лейтэнанта Л. К. Крыжыцкага ўзнагародзілі ордэнам Леніна. Атрымаў ён гэту ўзнагаро-

ду за вялікі ўклад у вызваленне гарадоў Горкі і Шклоў. У прадстаўленні адзначалася, што старшы лейтэнант стаў камбатам у студзені 1944 г. у Горацкім раёне і на сваім участку выдатна арганізаваў абарону.

У Літве камбата яшчэ ўзнагародзілі ордэнамі Чырвонага Сцяга і Аляксандра Неўскага. Пасля вайны ён працягваў службу і звольніўся ў запас падпалкоўнікам.

П. Фралоў.

Данясенні з Млавы

...Вось ужо чацвёртую гадзіну ляціць самалёт. У кабіне, цесна прыціснуўшыся адзін да аднаго, сядзяць разведчыкі. Яны маўчаць. А каля ілюмінатара глядзіць уніз камандзір групы «Неўскі» капітан Іван Чэрнікаў. Дзесьці там, унізе, родная Беларусь, спаленая і стаптаная ботамі фашыстаў. Там родная вёска Сава Горацкага раёна, рэчка і лес, куды разам з братамі Рыгорам і Міхаілам хадзілі лавіць рыбу і па грыбы. Як даўно гэта было... Вучоба ў сямігодцы, якую закончыў у 1935 г. І мара — быць лётчыкам.

З канца лістапада 1938 г. ён — тэхнік дыстанцыі пуці Свярдлоўскага аддзялення чыгункі. А неўзабаве ён быў пасланы для работы ў раёны Заходняй Беларусі.

Пачатак Вялікай Айчыннай Іван сустрэў курсантам Смаленскага ваенна-палітычнага авіяцыйнага вучылішча. І вось у дваццаць два гады ён камісар авіяэскадрыллі. Не хапала лётнага саставу, і Чэрнікаў авалодвае пілатаваннем баявога самалёта. Удзельнічае ў жорсткіх паветраных баях. У верасні 1942 г. быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

У адным з баёў асколак снарада сур'ёзна параніў нагу. Лятаць нельга — такое заключэнне ўрачоў.

А праз некалькі месяцаў, улічваючы выдатнае веданне нямецкай мовы, Івана Чэрнікава накіроўваюць у разведцэнтр. І вось ён ляціць за лінію фронту.

— Падрыхтавацца! Самалёт над цэллю, — падаў каманду пілот. — Адкрыўся люк, і праз некалькі хвілін над Румацкай пушчай раскрыліся белыя купалы парашутаў. Аперацыя «Неўскі» пачалася.

Вакол дрымучы лес. Да ўзлесся падступаюць непраходныя балоты. А побач, усяго *ў трох кіламетрах, гітлераўскі штаб Млаўскага* апорнага пункта. Як зрабіць першыя крокі, каб яны не сталі апошнімі? Да таго ж няма ніводнай яўкі. Усё трэба пачынаць на голым месцы.

Ужо літаральна на наступны дзень група

І. Е. Чэрнікаў.

пачала перадаваць важныя звесткі. У мястэчку Шэранск быў выяўлены замаскіраваны штаб 2-й фашысцкай арміі. Кароткая вестка ў разведцэнтр, і савецкая авіяцыя хутка яго знішчыла.

Гарадскі суддзя Юшкевіч у краязнаўчых запісках, надрукаваных у кнізе «Нарысы па гісторыі горада Млавы» піша: «Добрая палавіна жыхароў Млавы ведала аб дзейнасці савецкай разведвальнай групы, а для гітлераўцаў яна заставалася тайная».

Польскія патрыёты Пётр Гранкевіч і Станіслаў Сакалоўскі з вёскі Завалы былі першымі, хто пазнаёміўся з капітанам Чэрнікавым. Потым да іх далучыўся Яўген Леманскі. Вось што гаворыцца ў даведцы, напісанай рукой І. Е. Чэрнікава: «Леманскаму Яўгену Уладзіслававічу, 1922 года нараджэння, выдадзена ў тым, што ён аказваў актыўную дапамогу ў рабоце спецыяльнай групы Чырвонай Арміі ў перыяд нямецкай акупацыі са жніўня 1944 па студзень 1945 года». Рызыкуючы жыццём польскія патрыёты збіралі для савецкіх разведчыкаў каштоўную інфармацыю аб фашысцкіх войсках, дапамагалі ім ежай, хавалі ад непагадзі.

У канцы лістапада 1944 г., калі выпаў снег і заставацца ў лесе было небяспечна, капітан Чэрнікаў прыняў рашэнне раздзяліць атрад на дзве групы. Адна з іх пад кіраўніцтвам А. Чаклуева пайшла ў напрам-

ку горада Цэханаў, на злучэнне з часцямі Чырвонай Арміі. Капітан І. Е. Чэрнікаў разам з радысткай Лебедзевай вырашыў застацца ў Млаве. Пацяклі дні і тыдні, самыя небяспечныя і цяжкія. Чэрнікаў паранейшаму ў форме нямецкага афіцэра хадзіў па гораду, збіраў звесткі.

Аднойчы ён зайшоў да падпольшчыка, які ўтрымліваў невялікі магазін на ўскраіне горада. Той паведаміў яму цікавую навіну. У вёску Бромберг прыбылі 200 салдат, многа машын і бронетранспарцёраў. Усё строга засакрэчана. Але ў яго доме размясціўся обер-лейтэнант з роты аховы. Лічыў сябе дэмакратам, бо дазваляў сабе пагаварыць з палякам.

— Пагаварыць? — перапытаў Чэрнікаў, — наладзь мне з ім сустрэчу.

Ужо зусім сцямнела, калі капітан са сваім верным сябрам і памочнікам Пятром Гранкевічам падышлі да адасобленага будынка на краі Млавы.

— Прашу про..., — не паспеў дагаварыць вартавы, як упаў, скошаны ўдарам разведчыка. Праз некалькі хвілін капітан гукнуў Пятра. У пакоі з вокнамі, закрытымі шчыльнымі шторамі, ляжаў звязаны дзяжурны афіцэр.

— Дык вось, — працягваў спыненую гутарку Іван Чэрнікаў, — я савецкі разведчык.

— Гэта немагчыма, — прахрыпеў у адказ немец. — Гэта шантаж... старыя штучкі гестапа. Няўжо я паверу вам, што савецкі разведчык у Млаве?

— Як бачыце, магчыма. Але ў нас мала часу. Я гарантую жыццё, калі падрабязна праінфармуеце аб тэхніцы і мэтах вашай часці.

Немец падпарадкаваўся безагаворачна. Адкрыў сейф, паклаў на стол рулоны паперы.

— Ракеты? — запытаў капітан.

— Так, — дрыжачым голасам адказаў немец, — ракеты «фау». Гэта вельмі страшная зброя.

Капітан Чэрнікаў перадаў Пятру фотаапарат «Фэд».

— Не спяшайся, здымкі павінны быць выдатнымі, — сказаў ён.

Ракеты так і не ўзляцелі, іх разбамбіла савецкая авіяцыя.

Быў студзень 1945 года. У Млаве ўжо выразна чуўся гул фронту. У форме гітлераўскага афіцэра Чэрнікаў з'явіўся ў падвал, дзе размяшчаліся штабы Млаўскага апорнага раёна. Спыніўся каля тэлефаністаў, сувязных. А ноччу ў цэнтр ішлі апошнія данясенні...

19 студзеня Саўінфармбюро паведаміла, што войскі 2-га Беларускага фронту «...працягваючы наступленне, авалодалі горадам Млава». Радавалася радыстка Ганна Лебедзева, калі ўбачыла на вуліцы савецкія войскі. Але на душы расла трывога. Абыходзячы явачныя кватэры польскіх таварышаў, яна не знаходзіла там Івана Чэрнікава. І раптам убачыла свайго камандзіра. Ён ляжаў сярод забітых гітлераўскіх афіцэраў.

Так трагічна абарвалася жыццё савецкага разведчыка. Яму было 25 год.

За мужнасць і гераізм пры выкананні баявога задання ў тыле ворага І. Е. Чэрнікаў быў пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 1-й ступені. У 1964 г. Дзяржаўны савет ПНР пасмяротна ўзнагародзіў яго залатым ордэнам «Віртуці мілітары». Яго імя носіць вуліца ў Горках.

У. Ліўшыц.

Героямі сталі на Горацкай зямлі

У баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі на тэрыторыі раёна воіны Чырвонай Арміі праявілі мужнасць і гераізм. Некаторым з іх прысвоена высокае званне.

БАРСУКОЎ Васіль Мікалаевіч. Нарадзіўся 6.8.1922 г. у пас. Грымучы Ручай Бежацкага раёна Цвярской вобласці. У 1941 г. скончыў Чарнігаўскую ваенную авіяцыйную школу лётчыкаў. На фронце Вялікай Айчыннай вайны з ліпеня 1942 г. 12 кастрычніка 1943 г. у баі пад Леніна В. М. Барсукоў збіў нямецкі бамбардзіроўшчык, 15 кастрычніка яшчэ на адну адзінку папоўніў свой баявы рахунак. Камандзір авіяэскадрыллі 18-га гвардзейскага знішчальнага палка 303-й знішчальнай авіяцыйнай дывізіі капітан В. М. Барсукоў да марта 1945 г. здзейсніў 286 баявых вылетаў, удзельнічаў у 44 паветраных баях, асабіста збіў 20 самалётаў праціўніка і 2 у групе. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 19.4.1945 г. Пасля вайны працягваў службу ў арміі. Узнагароджаны ордэнам Леніна, 2 ордэнамі Чырвонага Сцяга, Аляк-

сандра Неўскага, Айчыннай вайны 1-й і 2-й ступені, медалямі.

ЛАХІН Рыгор Радзівонавіч. Нарадзіўся 4.11.1916 г. у пас. Троіцкі Качкоўскага раёна Новасібірскай вобласці. У Чырвонай Арміі з 1940 г. У 1942 г. скончыў паскораныя курсы Томскага артылерыйскага вучылішча. Камандзір батарэі 1309-га знішчальнага супрацьтанкавага палка лейтэнант Р. Р. Лахін вызначыўся ў баях пад Леніна. 13 кастрычніка 1943 г. у час контратакі праціўніка ён стаў каля гарматы, якая засталася без камандзіра і наводчыка, адначасова кіраваў боем. Вораг адступіў. У баі быў цяжка паранены і 26.10.1943 г. памёр у шпіталі. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 29.3.1944 г. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонай Зоркі.

ЮРКОЎ Дзмітрый Рыгоравіч. Нарадзіўся 3.11.1914 г. у в. Дубовае Узлоўскага раёна Тульскай вобласці. На фронце Вялікай Айчыннай вайны з ліпеня 1941 г. У 1942 г. скончыў Маскоўскае ваенна-пяхотнае вучылішча. Камандзір узвода 241-га стралковага палка 95-й стралковай дывізіі малодшы лейтэнант Дз. Р. Юркоў вызначыўся 28.8. 1943 г. пры прарыве абароны праціўніка ў раёне в. Горкі. Яго ўзвод першым уварваўся ў варожыя траншэі. У баі за в. Пузікі 29.9.1943 г. Дз. Р. Юркоў знішчыў з ручнога кулямёта каля ўзвода пяхоты праціўніка. У кастрычніку гэтага ж года ў час разведкі каля в. Леніна шасцёра воінаў на чале з лейтэнантам знішчылі 20 гітлераўцаў, захапілі дакументы і «языка». Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 3.6.1944 г. Пасля вайны жыў у Маскве, працаваў на будоўлях. Узнагароджаны ордэнам Леніна, медалямі. Памёр 26.9.1966 г.

Падрыхтаваў І. Стальмашонак.

Сталёвы таран

Якубоўскі Іван Ігнатавіч. Маршал Савецкага Саюза (1967), двойчы Герой Савецкага Саюза (студзень, верасень 1944), Герой ЧССР (1970). Нарадзіўся 7.1.1912 г. у в. Зайцава. Скончыў Аб'яднаную беларускую ваенную школу імя ЦВК БССР (1934), Ваенную акадэмію Генштаба (1948). У Чырвонай Арміі з 1932 г. Удзельнік паходу ў Заходнюю Беларусь, савецка-фінляндскай вайны. У Вялікую Айчынную вайну на Бранскім, Паўднёвым, Паўднёва-Заходнім, Сталінградскім, Данскім, Цэнтральным і 1-м Украінскім франтах — камандзір танкавага палка, брыгады, намеснік камандзіра танкавага корпуса. Удзельнік абарончых баёў пад Мінскам, Магілёвам, Сталінградскай і Курскай бітваў, вызвалення Украіны, Сандамірска-Сілезскай, Опельскай, Вісла-Одэрскай, Берлінскай і Пражскай аперацый. Вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра і Віслы, вызваленні Фастава. Пасля вайны на адказных пасадах у войсках. З 1957 г. першы намеснік Галоўнакамандуючага і Галоўнакамандуючы Групы савецкіх войск у Германіі. З 1956 г. камандуючы войск Кіеўскай ваеннай акругі, з 1967 г. першы намеснік міністра абароны СССР і Галоўнакамандуючы Аб'яднаных Узброеных Сіл краін Варшаўскага Дагавору. На XXII — XXIV з'ездах КПСС выбраны членам ЦК. Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР 6—9 склада. Узнагароджаны 4 ордэнамі Леніна, 8 іншымі ордэнамі, медалямі, 11 ордэнамі і медалямі замежных краін. Памёр 30.11.1976 г. У г. Горкі ўстаноўлены бюст.

І. І. Якубоўскі.

Біяграфія палкаводца пачалася на беларускай зямлі. «Радзіма мая — зямля беларуская. Год нараджэння — 1912. Дзяцінства, малалецтва і юнацтва непарыўна звязана з вёскай Зайцава Горацкага раёна, што на Магілёўшчыне, — пісаў у адным са сваіх біяграфічных артыкулаў Іван Ігнатавіч. — Сям'я наша была вялікая. Жылі надзвычай бедна, нярэдка голадна, апраналіся ў зрэбнае палатно, насілі лапці. У сям'ю рана прыйшло гора — у 1917 годзе памерла маці, Акуліна Андрэеўна».

Пачатковую школу ён скончыў у п. Куртасы, сямігодку — у Горках.

Пасля заканчэння школы некаторы час працуе ў Горках на цагельным заводзе, а за-

тым па камсамольскай пуцёўцы паступае ў Аршанскі педагагічны тэхнікум, а з 1934 г. пачалася яго ваенная служба.

Вялікую Айчынную капітан Якубоўскі сустрэў пад Мінскам, дзе камандаваў танкавым батальёнам. І першы свой ордэн Чырвонага Сцяга атрымаў за абарончыя баі ў Беларусі.

За 1418 дзён вайны ён удзельнічаў у сотнях бітваў, з баямі прайшоў каля пяці тысяч кіламетраў. Вясной 1943 г. І. І. Якубоўскі фарміруе 91-ю асобную танкавую брыгаду, з якой прайшоў шлях ад Сталінграда да Прагі. Брыгада была ўзнагароджана ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, Суворава і Багдана Хмяльніцкага. 18 яе выхаванцаў удастоены звання Героя Савецкага Саюза.

Танкавая брыгада асабліва вызначылася 7 лістапада пры вызваленні г. Фастава, за што ёй было прысвоена найменне Фастаўская. А камандзіру брыгады І. І. Якубоўскаму за ўмелае кіраўніцтва, асабістую мужнасць і гераізм было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Яго прызначаюць намеснікам камандзіра 6-га гвардзейскага танкавага корпуса.

Мужнасць і бясстрашнасць маладога камандзіра, а часам і пагарда да небяспекі здзіўлялі многіх. Былы воін 6-га гвардзейскага танкавага корпуса Б. Разумаў успамінаў: «Багата на вачах прайшло камандзіраў у розных званнях, але Якубоўскі запомніўся адразу. Крочыць палкоўнік, высокі, стройны, мужны, валявы твар, Герой Савецкага Саюза. А мы, салдаты, ведалі, што Герояў на вайне давалі толькі героям і толькі за подзвіг. Ну, думаем, цяпер наш корпус папрэ, дадзім нямецкім ваякам дыхту. Уяўляеце, нейкі новы прыліў храбрасці і бязбоязнасці невядома адкуль з'явіўся, бо вынослівыя камандзіры, смелыя, валявыя і рашучыя, натхняюць на вайне нават без заклікаў, каманд.»

Як адзначае ў кнізе «Вартавыя стаяць на пасту» пісьменнік А. Первенцаў, «...у бітвах лета 44-га Якубоўскі знаходзіцца ў росквіце сваіх сіл. І гэтыя сілы ён не траціць упустую. Падначаленае яму аб'яднанне становіцца таранным. Хтосьці назваў яго сталёвым таранам генерала Рыбалкі...».

У канцы ліпеня 1944 г. пад яго кіраўніцтвам частка корпуса, без пантоннага моста, фарсіравала раку Віслу і захапіла плацдарм на левым яе беразе, што дазволіла паспяхова фарсіраваць раку ўсяму злучэнню. У гэтай аперацыі ў поўнай меры раскрыўся палкаводчы талент Якубоўскага. 23 верасня 1944 г. яму было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза паўторна.

Пасля вайны І. І. Якубоўскі займаў адказныя пасады ў войсках.

Яго жонка, Зінаіда Фёдараўна, успамінала: «Вельмі любіў Іван Ігнатавіч сваю родную Беларусь. У памяць аб сваёй зямлі ён, дзе б ні жыў — у Германіі, Львове ці ў Падмаскоўі, высаджваў побач з домам тры беластволыныя бярозкі: такія бярозкі раслі ля парога яго роднага дома.

У свой час — ужо генералам — ён марыў вярнуцца ў Беларусь служыць і працаваць... Але лёс распарадзіўся інакш. Ён быў салдатам Айчыны.»

У. Ліўшыц.

За мужнасць і гераізм

У перыяд Вялікай Айчыннай вайны шмат сыноў і дачок — ураджэнцаў Горацкага раёна былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі. Трое з іх Р. У. Дольнікаў, Ф. А. Угначоў і М. Ф. Шындзікаў удастоены высокага звання — Героя Савецкага Саюза.

З ПЛЕЯДЫ АДВАЖНЫХ

Невялічкая вёска Сахараўка Добраўскага сельскага Савета Горацкага раёна. Тут 8 мая 1921 г. у сялянскай сям'і нарадзіўся Рыгор Усцінавіч Дольнікаў.

Вучыўся ў Панкратаўскай васьмігодцы, у 1936—40 гг. у ФЗВ, працаваў слесарам на вагонарамонтным заводзе ў Мінску. Тут займаўся ў аэраклубе, а потым вучыўся ў Батайскай авіяцыйнай школе. Скончыў яе «на выдатна». У службовай характарыстыцы курсанта было запісана: «лятаць любіць, у палёце вынослівы. Актыўна ўдзельнічае ў грамадскім і палітычным жыцці падраздзялення. Мэтазгодна выкарыстоўваць у знішчальнай авіяцыі...»

Аднак трапіць у знішчальнікі Дольніка-

Р. У. Дольнікаў.

ву адразу не ўдалося. Спачатку служыў у 25-м запасным авіяцыйным палку, што базіраваўся ў Азербайджане. Толькі вясной 1943 г. ён накіроўваецца на фронт, у 100-ы гвардзейскі знішчальны авіяцыйны полк, дзе ваявалі знакамітыя лётчыкі, такія як двойчы Герой Савецкага Саюза Д. Глінка, яго брат Б. Глінка, І. Бабак, М. Лявіцкі — Героі Савецкага Саюза.

За жнівень 1943 г. Р. Дольнікаў збіў тры варожыя самалёты. Аднак не мог ведаць ён, якое выпрабаванне рыхтаваў лёс у пяцьдзесят шосты вылет.

30 верасня 1943 г. эскадрылля атрымала загад — не прапусціць ніводнага самалёта да нашых пазіцый у раёне Вялікага Такмака. Шасцёра знішчальнікаў падняліся ў паветра і сустрэліся з больш як 60 нямецкімі штурмавікамі Ю-87. Разгарэўся бой. Р. Дольнікаў наблізіўся да вядучага нямецкай групы і збіў яго. Толькі выйшаў з атакі — у прыцэле яшчэ адзін варожы самалёт. Палец націснуў на гашэтку, але пушка маўчала: скончыліся боепрыпасы. Р. Дольнікаў вырашае пайсці на таран, але ў гэты час фашысцкія лётчыкі падпалілі яго самалёт, і ён ледзь паспеў выкінуцца з парашутам.

Што было з ім потым, можна прачытаць у кнізе Р. У. Дольнікава «Летит стальная эскадрилья». Пасля працяглых допытаў Р. У. Дольнікава кінулі ў канцлагер. Але і тут ён не скарыўся. Увайшоў у падпольны партыйны камітэт. Двойчы арганізоўваў уцёкі. Аднак удалося збегчы толькі ў трэці раз — 2 снежня 1943 г.

А праз некаторы час ён апынуўся ў партызанскім атрадзе «За савецкую Радзіму». Ваяваў радавым, потым быў прызначаны начальнікам узбраення.

Вясной 1944 г., калі партызанскі атрад далучыўся да часцей Чырвонай Арміі, Р. У. Дольнікаў вярнуўся ў свой полк. А там верылі, што ён вернецца — нават лётнай кніжкі ў архіў не здалі.

Зноў пачаў ваяваць і збіў яшчэ 12 варожых самалётаў, зрабіўшы за вайну 160 баявых вылетаў. Фактычна ён заслужваў вышэйшай узнагароды, але ў біяграфіі быў палон...

На працягу многіх пасляваенных гадоў Р. У. Дольнікаву прыйшлося прайсці некалькі праверак НКУС на надзейнасць. У артыкуле Б. Мацкевіча «Пасля першай не закусваю», надрукаваным у «Настаўніцкай газеце», пісалася, што былі і такія моманты ў жыцці Р. Дольнікава, што карцела прыставіць рэвальвер да скроні...

Аднак ён вытрымаў і застаўся ў арміі. Служыў вельмі добра, воінскія званні маёр і палкоўнік яму прысвоены датэрмінова.

У 1955 г. Р. У. Дольнікаў скончыў Ваенна-паветраную акадэмію, у 1965 г. яму было прысвоена званне «Заслужаны ваенны лётчык СССР». Стаў кандыдатам гістарычных навук.

За асабістую мужнасць і адвагу, праяўленыя ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў Вялікай Айчыннай вайне, поспехі ў баявой падрыхтоўцы войск, авалодванні складанай баявой тэхнікай і ў сувязі з 60-годдзем Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту Р. У. Дольнікаву 21 лютага 1978 г. было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

31 мая 1994 г. рашэннем прэзідыума Горацкага гарадскога Савета дэпутатаў Р. У. Дольнікаву прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін г. Горкі».

У. Ліўшыц.

ЗАМЯНІЎ КАМАНДЗІРА

Стаяў зімовы халодны дзень. Воіны Чырвонай Арміі, зламаўшы ўпартае супраціўленне праціўніка, выйшлі на рубеж ракі Одэр. Сярод наступаючых былі воіны 1052-га палка 301-й стралковай дывізіі 1-га Беларускага фронту.

Перад узводам, якім камандаваў малодшы лейтэнант Шорнікаў і дзе служыў старшыной Фёдар Антонавіч Угначоў, была пастаўлена задача — фарсіраваць раку і замацавацца на супрацьлеглым беразе.

Доўгія, пакутлівыя гадзіны перад наступленнем. Успамінаў Угначоў сваю родную вёску Слабада, што размясцілася каля чыгуначнай станцыі Зубры Горацкага раёна. Тут 2 студзеня 1913 г. нарадзіўся ён у сям'і

селяніна, скончыў школу і спачатку працаваў у калгасе, потым дзесятнікам у Горацкім леспрамгасе. У 1935—37 гг. служба ў Чырвонай Арміі. Калі вярнуўся ў родную вёску, то спачатку ўзначальваў паляводчую брыгаду, а затым кіраваў жывёлагадоўчай фермай. Марыў паступіць у Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. Але пачалася вайна.

З першых дзён на фронце, быў двойчы паранены і кантужаны, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 1-й ступені, трыма медалямі. І вось зноў на перадавой...

З задумення Фёдара Угначова вывела чырвоная ракета. Па гэтаму ўмоўнаму сігналу байцы падняліся ў атаку. Фашысты абрушылі шквал кулямётна-аўтаматнага агню. Але спыніць байцоў было ўжо немагчыма, і яны хутка ўварваліся ў варожыя траншэі. Кідаючы зброю, гітлераўцы ў паніцы пабеглі.

У момант схваткі гераічна загінуў камандзір узвода Шорнікаў. І таму прыйшлося Фёдару Антонавічу, як старшыне, узяць на сябе камандаванне.

Пачало світаць. І гітлераўцы, апрытомнеўшы, зноў пачалі наступаць. Першую атаку праціўніка адбілі хутка, і тады пачала біць варожая артылерыя. Зноў атака і так некалькі разоў.

Па рацыі Угначоў папрасіў падтрымкі. У адказ паступіў загад: пратрымацца яшчэ некалькі гадзін. Пазней, калі скончыўся гэты бой, ён даведаўся, што яго падраздзяленне адцягвала ўвагу ворага ў той час, калі асноўныя сілы дывізіі фарсіравалі раку Одэр у другім месцы і занялі населены пункт Ортвых.

Сем гадзін змагаўся з ворагам сцякаючы крывёю ўзвод. У ходзе баёў за плацдарм былі знішчаны тры танкі і бронетранспарцёр, звыш 50 гітлераўцаў. 6 красавіка 1945 г. Фёдару Антонавічу Угначову было прысвоена высокае званне Героя Савецкага Саюза.

Пасля вайны ён вярнуўся дадому, на родную Беларусь. Потым працаваў у Сотрынскім леспрамгасе Свярдлоўскай вобласці. Апошнія гады жыў і працаваў у гарадскім пасёлку Слабадзей, што ў Малдове. Памёр у 1978 г.

АБ УЗНАГАРОДЗЕ НЕ ДАВЕДАЎСЯ

Мікалай Фаміч Шындзікаў нарадзіўся 30 кастрычніка 1925 г. у вёсцы Любіж.

Ф. А. Угначоў.

М. Ф. Шындзікаў.

Скончыў пяць класаў Цімохаўскай сямігадовай школы. У 1939 г. сям'я пераехала на пастаяннае месца жыхарства ў сяло Тэнгулы Марыінскага раёна Кемераўскай вобласці.

Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна бацька Фама Іванавіч пайшоў на фронт і Мікалаю, старэйшаму з пяці дзяцей, давялося ўзяць на сябе ўсе клопаты аб сям'і. Пасля заканчэння сямі класаў ён працаваў падлікоўцам у калгасе «Перамога», затым вучыўся ў школе механізатараў пры Благавешчанскай МТС і стаў трактарыстам.

29 снежня 1943 г. Мікалай Шындзікаў быў прызваны ў Чырвоную Армію. Неўзабаве ён стаў механікам-вадзіцелем танка Т-34.

Ішоў ліпень 1944 г. Войскі 1-га Беларускага фронту, зламаўшы жорсткае супраціўленне ворага, пачалі вызваленне Беларусі. І сярод тых, хто па-геройску змагаўся з фашыстамі, быў Мікалай Шындзікаў.

Палкоўнік запасу Н. Махаў у газеце «Камсамолец Кузбаса» пісаў: «У адным з баёў танк гвардыі малодшага лейтэнанта Паўла Махава, дзе механікам-вадзіцелем быў гвардыі сяржант Мікалай Шындзікаў, першым вырваўся ўперад. Змяў кулямёт, супрацьтанкавую гармату і падышоў да лесу, дзе знаходзіўся дзот, які сваім агнём перашкаджаў наступленню стралковага падраздзялення. Калі разнеслі на кавалкі дзот ворага і рассеяўся пыл, праз вузкую назіральную шчыліну Шындзікаў убачыў сілуэты нямецкіх «тыграў».

— Лейтэнант, «тыгры»! — крыкнуў ён камандзіру танка.

— Бачу... Коля, жмі, — адказаў камандзір.

Яны ўступілі ў паядынак з двума «тыграмі» і пасля гарачай схваткі падбілі іх. Раптам нечаканы моцны ўдар. Прамым трапленнем варожага снарада танк быў выведзе-

ны з бою. Кантужаны, пераадольваючы боль, Шындзікаў адкрыў люк танка, дапамог выбрацца з ахопленай полымем машыны раненаму камандзіру.

У гэты час гітлераўцы беглі да падбітага танка. Мікалай укрыў лейтэнанта, лёг каля танка і з аўтамата даў доўгую чаргу. Свінцовы струмень знішчыў некалькі фашыстаў. Другая, трэцяя і чацвёртая спробы захапіць танкістаў у палон дорага абышліся ворагу.

...Расстрэляны апошні магазін. Вораг зразумеў гэта і зноў кінуўся на танкістаў. Гітлераўцы зусім побач. Вось ранены афіцэр падпоўз да сяржанта, падаў яму свой аўтамат і крыкнуў:

— Я дрэнна бачу... Страляй. А мне дай гранату.

— Рус, здавайся!

— На, вазьмі! — крыкнуў лейтэнант і кінуў гранату ў гітлераўцаў. У гэты час зусім блізка раздалося роднае «ура!»

Праз некалькі дзён механік-вадзіцель гвардыі сяржант Мікалай Шындзікаў апрабаваў новы танк, на якім з баямі прайшоў звыш 500 кіламетраў. Але асабліва цяжкімі былі кіламетры, пройдзеныя воінамі ў Польшчы. Вораг чапляўся за кожны метр зямлі.

16 студзеня 1945 г. М. Ф. Шындзікаў на сваім танку імкліва ўварваўся ў горад Сахачоў. Экіпаж танка знішчыў у тым баі 35 адступаючых аўтамашын з рознымі грузамі, дзве гарматы разам з артылерыйскай прыслугай, 25 павозак з боепрыпасамі і прадуктамі харчавання, 46 салдат і афіцэраў праціўніка.

19 студзеня ў баях за горад Любань гусеніцамі танка была знішчана гармата. Затым, імкліва ўварваўшыся на аэрадром, экіпаж танка знішчыў тры самалёты, якія імкнуліся ўзняцца ў паветра.

У ноч на 22 студзеня батальёну была пастаўлена задача авалодаць горадам Інаўрацлаў. Група ў складзе чатырох танкаў, у якой была і машына Мікалая Шындзікава, першай уварвалася ў горад, захапіла чыгуначную станцыю, тэлеграф, радыёвузел і аэрадром праціўніка. Працягваючы наступленне, танкі перарэзалі дарогу ў заходняй частцы горада і закрылі шлях для адыходу праціўніка. Экіпажам было знішчана 41 аўтамашына, 4 самалёты і 56 фашыстаў.

У гэтым баі гвардыі сяржант М. Ф. Шындзікаў загінуў. За ўзорнае выкананне заданняў камандавання і праяўленыя пры гэтым адвагу і гераізм 27 лютага 1945 г. яму было пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Адважны танкіст быў пахаваны з воінскімі шанаваннямі ў брацкай магіле горада Сахачоў.

Імя Мікалая Фаміча Шындзікава прысвоена школе і піянерскай дружыне сяла Тэнгулы Марыінскага раёна Кемераўскай вобласці.

У. Ліўшыц.

Удзельнік Парада Перамогі

Пуцёўку ў жыццё Дзмітрый Харытонавіч Давыдзенка атрымаў яшчэ да вайны, разам з дыпломам заатэхніка пасля заканчэння Горацкага сельгасінстытута ў 1938 г. А потым былі ўсе чатыры нялёгкія гады ваеннага ліхалецця. Пачаў пад Віцебскам у ліпені сорак першага і закончыў на Эльбе ў сорак пятым. Такі баявы шлях адмерыў франтавік, які прайшоў праз Магілёўшчыну, Віцебшчыну. Вызваляў родную вёску Машкова, што ў Горацкім раёне.

Пасля было нямала баёў. Вось толькі адзін з іх. Пасля ўзяцця Данцыга 49-я армія, у састаў якой уваходзіла 43-я Магілёўская Чырвонасцяжная ордэна Суворава 2-й ступені артылерыйская брыгада, рушыла далей на захад. 14 красавіка пачалося наступленне, аперацыя па фарсіраванню Одэра.

Пойма ракі пры вясновым разліве складала два-тры кіламетры. А за ёй — лес, вышыні, дзе засеў вораг. Артылерысты павінны былі падаўляць агнявыя кропкі фашыстаў, знішчаць рэзервы.

Шостая батарэя старшага лейтэнанта Д. Х. Давыдзенкі была падручнай камандуючага артылерыяй арміі. У час бою генерал знаходзіўся на назіральным пункце. Завязалася дуэль батарэй абодвух бакоў. Падраздзяленні Давыдзенкі прымусілі замоўкнуць тры батарэі ворага.

— Малайцы, хлопцы! — радаваўся за іх камандуючы.

Смелым ударам наша пяхота збіла ворага з важнага рубяжа. Немцы нешматлікімі групамі сталі збірацца ў невялікім гаі. Гэта заўважылі артылерыйскія назіральнікі, якія зорка сачылі за ворагам.

— Да контратакі рыхтуюцца, — зрабілі вывад камандзіры і сталі чакаць.

Хутка немцаў у гаі сабралася не менш за роту.

— Пара, — рашыў старшы лейтэнант Дз. Х. Давыдзенка і перадаў загад на агнявую пазіцыю батарэі.

Грозна загаварылі цяжкія гарматы, аж зямля задрыжала.

Варожая контратака правалілася ў самым сваім «зародку». Так пісаў у франтавой дывізіёнцы 26 лютага 1945 г. чырвонаармеец В. Чурыкаў.

За гэты бой Дзмітрый Харытонавіч быў узнагароджаны ордэнам Аляксандра Неўскага.

Вайну закончыў у Германіі, пад Грабавам, на прытоку Эльбы, дзе нашы войскі сустрэліся з англійскімі. Неўзабаве Дз. Х. Давыдзенку выклікалі ў штаб дывізіёна.

— Мы рэкамендуем цябе для ўдзелу ў парадзе Перамогі, у саставе зводнага палка 2-га Беларускага фронту, — уважліва аглядзеўшы прыбыўшага, сказаў камандзір брыгады палкоўнік Цюрын.

Нарэшце прыйшоў памятны дзень 24 чэрвеня сорак пятага. 7 гадзін раніцы. Зводныя палкі франтоў былі пастроены на Чырвонай плошчы, упрыгожанай партрэтамі, лозунгамі, транспарантамі, і нават імжэўшы дожджык не мог азмрочыць прыўзнятага ва ўсіх настрою.

Дзмітрыю Харытонавічу пашчасціла стаяць у шарэнзе якраз насупраць Маўзалея. Завяршыў свята феерверк. Сталіца салютавала трыццаццю залпамі тысячы гармат. Масква святкавала Вялікую Перамогу.

І. Лапо.

Дакументы сведчаць

СПАЛЕНЫЯ І РАЗБУРАНЫЯ КАЛГАСЫ*

Ленинский сельсовет: Новая жизнь, Им. Сталина, Новый будауник, Маяк, Победа, Зорька 1 Мая, Заря, Свобода, Кирова, Товарищ.

Ворошиловский сельсовет: Коммунар, Ворошиловец, Ленинский шлях, Коминтер, Переможец.

Котелевский сельсовет: Чырвоны Октябрь, Чырвоная Беларусь, За власть Советов, Им. Ленина, Социализм, Большевик, Правда.

Паршинский сельсовет: Звено коммуны, Прамень, Чырвоны Октябрь, Чырвоны будауник.

Горский сельсовет: Им. Куйбышева, Демьян Бедный, Борьба, Коммунистический путь.

Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці, ф. 540, воп. 2, спр. 3, л. 2.

АКТ ГОРАЦКАЙ РАЁННАЙ КАМІСІІ ПА ЎСТАНАЎЛЕННІ І РАССЛЕДАВАННІ ЗЛАЧЫНСТВАЎ НЯМЕЦКІХ ЗЛАЧЫНЦАЎ У ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

Г. Горкі **10 снежня 1944 г.**

Комиссия в составе: председатель комиссии Бычков (председатель исполкома) и члены комиссии т.т. Емельянов И. С. (секретарь КП(б)Б), Селезнев И. И. (начальник РОНКГБ), Протонин В. О. (начальник РОНКВД) Лоханов (райпрокурор), Кириченко В. М. (секретарь РПК) с участием свидетелей и экспертов т. Кривицкой (зав. райздравотделом), Климова (председателя Маслаковского сельского Совета), Штындиковой Валентины и Аханьковой Лидии (очевидцы злодеяний), в присутствии депутата Верховного Совета БССР профессора Захарова Ф. С. составили настоящий акт о причиненных немецко-фашистскими захватчиками и их сообщниками злодеяний над мирным населением и военнопленными красноармейцами на территории Горецкого района Могилевской области за период временной оккупации района немцами с 13 июля 1941 г. по 26 июня 1944.

Из материалов опроса свидетелей-очевидцев массового и одиночного истребления мирного населения и истязания перед смертью, а также из осмотров мест злодеяний, убийств и могил, где зарыты останки трупов безвинных жертв установлено, что немецко-фашистские изверги злоумышленно истребляли поголовно русское население.

* Праз іх тэрыторыю праходзіла лінія фронту.

1. Так в д. Тудоровка Маслаковского сельского Совета 25 мая 1943 г. в 5 часов утра приехали немецкие части численностью около 800 человек, арестовали 19 человек мирных жителей деревни мужчин и женщин, после зверских издевательств, побоев, пыток и надругательств всех их расстреляли на опушке леса в 100 м севернее д. Тудоровка и прикрыли еловыми ветками, приказав под страхом смерти никому не подходить близко к лесу.

Из числа расстрелянных случайно остался в живых раненый гражданин Вакушков Даниил, который пролежал под трупами до ночи и ночью пришел в деревню, рассказал о всех издевательствах пьяной фашистской орды над мирными жителями. Он сказал: «После побоев нас всех выстроили в ряд, а потом офицер скомандовал: «Огонь». Фашисты открыли пулеметный и автоматный огонь. После нас раздели до белья, стянули в одну выемку, накрыли еловыми ветвями и со свистом и руганью уехали в Горки. Ночью я выбрался из-под трупов, сообщил жене и после скрывался в лесу до изгнания фашистов с нашей территории».

Сейчас Вакушков Даниил призван в ряды РККА мстить врагу за слезы и кровь.

2. В январе 1944 г. немецкий карательный отряд 30-й танковой дивизии схватил первых попавшихся 11 человек из д. Тудоровка и Зимник Маслаковского сельского Совета. Вначале их до полусмерти избили, потом свозили в г. Оршу, после, вечером, привезли в д. Зимник закрыли в сарае с соломой и, никого не подпустив, подожгли его. Стража стояла до полного сгорания постройки и трупов. Этим фашистские изверги хотели скрыть следы своих злодеяний.

3. 11 июня 1944 г. 14 граждан из д. Осиповичи, будучи выгнаны из своей деревни немцами за Днепр, вернулись в деревню за картофелем. В это время проезжали немецкие солдаты с офицером и без никакого разбора всех их расстреляли возле бурта с картошкой, после чего со всех сняли верхнюю одежду и обувь.

4. Массовое убийство еврейского населения немецко-фашистские изверги произвели в д. Напрасновка Маслаковского сельского Совета, там осталось восемь ям, где зарыты расстрелянные. Массовый расстрел немцы организовали 22 марта 1942 г., расстреляли 250 евреев. Перед смертью их жестоко избивали, требуя от них откупа золотом. Потом их всех повели на опушку леса, в 200 м западнее д. Напрасновка, и там над ними учинили массовый расстрел. Детей в яму бросали живыми, а наверх бросали расстрелянных взрослых. Массовое убийство еврейского населения немцы произвели в г. Горки.

По приблизительным данным в г. Горки расстреляно свыше 300 евреев.

5. Невиданные злодеяния немецко-фашистские захватчики учинили в г. Горки летом 1942 г. В июле и августе 1942 г. гестаповцы арестовали 30 человек мирных жителей и после диких издевательств 18 человек расстреляли и 12 человек повесили в парке Белорусского сельскохозяйственного института.

6. В г. Горки немцами был устроен лагерь военнопленных, в нем помещалось около 800 человек военнопленных красноармейцев. Военнопленные находились в ужасных антисанитарных и бытовых условиях. В сутки им выдавали один раз так называемой «баланды» — воды с прелой гречкой, порция поллитра. Работать заставляля 18—20 часов в сутки. Побои сопутствовали каждому шагу. В бараке невыносимая теснота и грязь, что способствовало эпидемии тифа.

Побои, голод, непосильный труд и эпидемия тифа, без всякой медицинской помощи, и регулярные беспричинные расстрелы, довели до того, что к осени 1942 года все до единого военнопленные погибли. Всех их закопали в Горках в саду учхоза БСХИ.

На северной окраине города в саду учхоза БСХИ имеется 9 могил размером 6×8 м. В этих ямах-могилах по приблизительным подсчетам лежит около 2000 человек, замученных советских граждан.

Ямы заблаговременно приготавливались глубиной 5—6 м и туда ежедневно немцы водили на расстрел советских граждан, военнопленных и мирных жителей. По мере наполнения расстрелянными, ямы прикрывали землей, маскировали, а в новом месте рыли другие. В то время это место было под охраной и запретом для входа граждан.

Исходя из этого комиссией установлено приблизительное количество замученных и расстрелянных граждан фашистскими оккупантами и их сообщниками — оно составляет 2530 человек.

Это свидетельство о небывалых в истории зверствах над мирным населением, злоумышленном его истреблении фашистскими людоедами, что еще раз подтверждает кровожадную человекоистребительную тактику ведения войны людоедами Гитлера.

В чем и подписали

Депутат Верховного Совета БССР, профессор

Камиссия:

Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці, ф. 306, воп. 1, спр. 10, л. 43.

НАСЕЛЕНЫЯ ПУНКТЫ ГОРАЦКАГА РАЁНА, ЯКІЯ БЫЛІ ЗНІШЧАНЫ З ЧАСТКАЮ НАСЕЛЬНІЦТВА Ў ПЕРЫЯД ФАШЫСЦКАЙ АКУПАЦЫІ І АДНОЎЛЕНЫЯ ПАСЛЯ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

Название населенного пункта	Количество накануне		Количество уничтоженных		Примечание
	дворов	населения	дворов	населения	
1	2	3	4	5	6
Андеколово	61	305	61		сентябрь 1943
Андрюхи	38	159	38	1	сентябрь 1943
Аниковичи	30	156	30	1	сентябрь 1943
Барсуки	31	119	27	13	сентябрь 1943
Бася	29	135	29	3	март 1943
Блажки	39	174	39		октябрь 1943
Большое Морозово	40	189	40	2	октябрь 1943
Буды	64	417	63	2	октябрь 1943
Волковщина	32	163	32		октябрь 1943
Городец	73	336	65	14	сентябрь 1943
Горы	200	530	180	93	сентябрь 1943
Гривец	46	251	46	2	октябрь 1943
Гулидовка	89	421	89	8	октябрь 1943
Дружная	30	156	30		сентябрь 1943
Жевлачевка	57	364	57		октябрь 1943
Завидовка	46	235	46	2	октябрь 1943
Квартяны	61	230	61	3	сентябрь 1943
Климатичи	28	104	28	10	март, октябрь 1943
Козлы	41	84	41	8	октябрь 1943
Конюхи	43	176	43	4	сентябрь 1943
Королевка	65	210	58	4	сентябрь 1943
Костюшково	45	190	45	9	октябрь 1943
Котелево	140	687	138	17	октябрь 1943
Кривцы	55	289	55	5	октябрь 1943
Кукшиново	40	175	40	6	октябрь 1943
Лебедево	150	650	150		сентябрь 1943
Ленино	198	835	198	186	сентябрь 1943
Лихачево	42	194	42	6	октябрь 1943
Луки	52	203	52	7	сентябрь 1943
Малое Морозово	48	198	48	4	сентябрь 1943
Матюты	68	274	68		июль 1941
Медведево	76	374	76	72	сентябрь 1943
Медведовка	70	339	70	50	сентябрь 1943
Моисеево	42	208	42	1	октябрь 1943
пос. Мостовой	61	223	60	29	сентябрь 1943
Никольск	140	672	104	4	сентябрь 1943
Никольск, пос.	40	230	37	18	сентябрь 1943
Овсянка	82	413	82	7	март, сентябрь 1943
Орлы	20	89	19		октябрь 1943
Паленка	92	447	92	21	март, сентябрь 1943
Паршино	97	350	97	2	сентябрь 1943

1	2	3	4	5	6
Переможная	54	365	54		сентябрь 1943
Полна	49	260	49	11	октябрь 1943
Полящицы	120	383	120	5	сентябрь 1943
Пуплы	30	115	30		октябрь 1943
Сафоново	33	162	31	4	март, сентябрь 1943
Светлая	27	148	27		октябрь 1943
Селец	149	611	149	19	октябрь 1943
Скаковщина	12	43	12		октябрь 1943
Славики	48	240	48	2	октябрь 1943
Стрикили	52	263	52	4	октябрь 1943
Суравцово	26	112	25		январь 1944
Сысоево	50	300	50		октябрь 1943
Телешовка	29	92	29		сентябрь 1943
Тимоховка	71	300	71	3	август 1941
Тосна	53	165	51		октябрь 1943
Трасное	42	200	41		сентябрь 1943
Турищево	52	254	52		октябрь 1943
Тушевая	60	250	60	34	март, сентябрь 1943
Ферма	29	143	29	1	март 1943 г.
Харьковка	57	278	54		сентябрь 1943
Ходоровичи	119	543	119	61	март, октябрь 1943
Чепелинка	110	500	110	65	август 1941
Черничный, пос.	42	211	42	2	октябрь 1943
Шатиловка	20	94	20		март, сентябрь 1943

Друкуецца па кн.: Нацистская политика геноцида и «выжженой земли» в Белоруссии 1941—1945. Мн., 1984.

З ПРАТАКОЛА № 1 АБ'ЯДНАНАГА ПАСЯДЖЭННЯ ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА ГОРАЦКАГА РАЁННАГА САВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ І РК КП(б)Б

18 января 1944 г.

1. Слушали: о восстановлении школ и открытии занятий. Докладывал и. о. заведующего районо т. Фомченко.

2. Постановили: 1. Восстановить школы и открыть занятия с 20 января 1944 г. а). 4-х комплектные начальные школы в д.д. Волынцево и Першино. б). 2-х комплектные начальные школы в д.д. Быстрая и Ольховец. в). Н. с. ш. 4-мя классами начальной школы и 1 пятым и 1 шестым классами в д. Каменка. 2. Обязать председателя Горского сельсовета т. Иванова освободить от жильцов школьное помещение в д. Каменка.

2. Слушали: о восстановлении изб-читален. Постановили: Восстановить две избы-читальни при Горском и Каменском сельсоветах, обязать председателей сельсоветов т. Иванова и т. Кажекина предоставить помещения под избы-читальни. Т. Фомченко подобрать заведующих изб-читален и представить на утверждение райисполкома.

Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці, ф. 540, воп. 3, спр. 1, л. 173—174.

З ПРАТАКОЛА № 2 ПАСЯДЖЭННЯ ГОРАЦКАГА САВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

20 августа 1944 г.

3. О развертывании торговли в городе. Слушали: Зав. пищеторга т. Тершичного. Открыта столовая в городе, 2 магазина, завтра начинают ремонт заготовительного ларька. Пекарня будет работать два дня. Прошу Горсовет дать досок для дежек. Выдача пайков идет трудно, потому что нет карточек. С мукой трудно, так как нет наряда из Могилева. Товары есть в Кричеве и Мстиславле, но доставить нельзя так как плохо с транспортом, всего 4 лошади. Завтра начнут заготавливать грибы. База соления на станции Погодино. В настоящее время нет ни ржи, ни муки.

Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці, ф. 1266, воп. 1, спр. 1, л. 2.

З ПРАТАКОЛА № 1 ПАСЯДЖЭННЯ ГОРАЦКАГА САВЕТА НАРОДНЫХ ДЭПУТАТАЎ

19 января 1945 г.

Об оказании помощи особо пострадавшим семьям колхозников хлебом из выделенного горсовету фонда 500 кг зерна.

1. Концевой Палагеи Гавриловне, семье фронтовика, колхознице колхоза «Чырвоныя усходы», имеет 3-х детей, 1 школьного возраста и 2-е малолетних. Назначить 60 килограмм. 2. Позняковой Христине Андреевне, матери фронтовика, колхознице колхоза «Чырвоныя усходы» имеет семью: старуху мать, 2-е детей, 1 школьника и малолетнюю. Назначить 50 кг. 3. Волковой Татьяне Митрафановне, к-це колхоза «Чырвоныя усходы». Имеет 3-х детей от 5-ти до 8 лет. Назначить 45 кг. 4. Дивакову Игнату, семья фронтовика, колхозник к-за «Шлях да сацыялізму», имеет семью: жену и 4 детей. Назначить 55 кг.

Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці, ф. 1266, воп. 1, спр. 2, л. 3.

З ПРАТАКОЛА № 2 ПАСЯДЖЭННЯ ГОРАЦКАГА САВЕТА НАРОДНЫХ ДЭПУТАТАЎ

20 февраля 1945 г.

Утвердить бюджет горсовета на 1945 г. по расходам.

Библиотеки — 68 523, колхозный базар — 57 999. Заречанская школа — 16 161, Русская школа — 34 548, Погодинская школа — 18 389, детсад — 237 400, детясли — 113 222, коммунальный отдел — 58 601, жилуправление — 25 950, гостиница — 36 659, бани — 80 280, инвентарное бюро — 41 028, благоустройство — 1 457 790. Всего — 2 312 689. Всего доходов — 572 042. Дотация — 1 740 647.

Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці, ф. 1266, воп. 1, спр. 2, л. 18—19.

Вяртанне

З успамінаў М. Капілевіча

На далёкі казацкі хутар, які прытуліў у цяжкія ваенныя гады нашу сям'ю, радыё прынесла доўгачаканую радасць: савецкія войскі вызвалілі родныя Горкі...

Так склаліся абставіны, што толькі ў верасні нага ступіла на родную горацкую зямлю, а вочы ўбачылі тое, што засталося ад некалі прыгожага горада.

Пустэча і бур'ян панавалі там, дзе былі вуліцы і стаялі дамы. Толькі на ўскраінах уцалела частка дамоў. Ні машын, ні коней, ні людзей, ні руху.

Войск у горадзе даўно ўжо не было, але напружана працавалі атрады мінёраў. Ня-

лёгка было зрабіць прыгоднай для жыцця былую лінію фронту. Райком КПБ, які размяшчаўся ў адным з дамоў акадэміі, стаў цэнтрам аднаўленчых работ. У невялікіх хатах размясціліся ўстановы. Дэпутаты, выбраныя народам, яшчэ ваявалі з ворагам, і іх месца часова занялі былыя партызаны і дэмабілізаваныя па раненню воіны В. П. Фомчанка, Ф. В. Маразевіч, У. К. Емяльянаў, Тамара Падгурская, Т. Я. Крывіцкая, М. М. Шаргаеў і іншыя. Дзень за днём горад ажываў.

У верасні 1944 г. ужо давалі прадукцыю прамарцель «Прагрэс», сталярны цэх прамкамбіната. Аднаўлялася гаспадарка трох прыгарадных калгасаў. Мне ўспамінаюцца Ефрасіння Люлянкова, Лукер'я Курбасава, Праскоўя Хрысаненка, Вольга Латушкіна — жанчыны з вёскі Слабада. У той час яны, жонкі франтавікоў, насілі на плячах насенне для сяўбы, рыдлёўкамі ўскопвалі глебу, цягалі па полі цяжкую барану...

Брыгады дзяўчат і падлеткаў расчышчалі вуліцы, складвалі цэглу, рамантавалі прыгодныя будынкі і саджалі дрэўцы і кусты ў гонар перамог нашай арміі.

Хлебапякарня і магазін былі абсталяваны ў прыватных дамах на Мсціслаўскай вуліцы. Па картачках жыхары атрымлівалі хлеб, неабходныя прадукты і вопратку. Працавала сталовая. Спецыяльны дзіцячы дом даў прытулак асірацелым дзецям воінаў і партызан.

У невялікай хаціне, дзе часова размясціўся гарсавет, сакратар Вольга Бавыкіна сядзела над стосам пісьмаў. Яны прыходзілі з усіх франтоў. Байцы і камандзіры хваляваліся за лёс сем'яў, пакінутых у Горках у ліпені сорак першага. Што магла адказаць ім дзяўчына? Што хаты іх спалены, маёмасць разрабавана, а бацькі, жонкі і дзеці запоўнілі восем ям на ўскраіне горада? Але і маўчаць было немагчыма.

Раніцай усе сцежкі запаўнялі дзеці. Апранутыя ў што папала — трафейныя кіцелі, салдацкія ватоўкі і белыя панчохі горацкай вытворчасці — яны ішлі на Слабаду, дзе ва ўцалеўшай школе праводзіліся заняткі. Першыя класы ахапілі дзяцей пяці ўзростаў. Настаўнікі А. У. Зянюк, К. С. Тычкова, Е. П. Мачульская рыхтаваліся да 1 кастрычніка пачаць заняткі ў старэйшых класах. У цэнтры горада другі педагагічны калектыў, які ўзначальвала Н. Ф. Знаменская, спешна абсталёўваў адну з уцалеўшых «каробак» для другой школы.

Кожны дзень вярталіся ў горад жыхары і ўключаліся ў працу, атрымлівалі хлебныя картачкі. Сталі ўзнікаць на агародах зямлянкі, саломай і цэглай забіваліся пустыя аканіцы ва ўцалеўшых каробках дамоў, у невялікіх хатах жылі па 3—4 сям'і.

Падзеі, факты, лічбы

1941 г., 22 чэрвеня. На плошчы каля Палаца культуры інстытута адбыўся мітынг рабочых горада, студэнтаў і выкладчыкаў.

Чэрвень. У Горках створана тры знішчальныя батальёны.

30 чэрвеня. Горкі наведаў Я. Купала з сям'ёй. Сустракаўся з дырэктарам бібліятэкі сельскагаспадарчага інстытута Дз. Р. Новікавым.

3, 6 ліпеня. Двума эшалонамі з Горак эвакуіравана больш 2-х тысяч жыхароў горада.

Ліпень-кастрычнік. У клубе Беларускага сельскагаспадарчага інстытута фашыстамі зроблены часовы лагер для ваеннапалонных.

17 снежня. На канспіратыўнай нарадзе ў доме А. П. Кузняцова было вырашана стварыць Горацкі антыфашысцкі цэнтр.

1942 г., студзень. Адбылася другая нарада антыфашысцкага падпольнага цэнтра на кватэры П. Н. Савінава.

19 лютага. Штабам Заходняга фронту ў Горкі была накіравана разведгрупа ў саставе: Г. У. Смялова, В. П. Пятроўскага, Ю. В. Новікава, Е. І. Сарокіна, А. В. Гарбузавай.

10 мая. Падпольны антыфашысцкі цэнтр прыняў рашэнне аб выхадзе падпольшчыкаў у лес і далучэнні іх да партызанскага атрада пад камандаваннем А. В. Шульгіна і Дз. Ф. Вайстрова, які дзейнічаў з сакавіка 1942 г.

Родныя вы нашы.
У смутку вялікім схіліўшы галовы,
стаім перад Вамі.
Вы не скарыліся лютым забойцам
у чорныя дні фашысцкай навалы.
Вы смерць прынялі,
ды полымя сэрцаў Вашай любові
да Савецкай Радзімы
навек незгасальна.
Памяць пра Вас у нас назаўсёды,
як неўміручая наша зямля
і як вечна яркае сонца над ёю!

Загінуўшыя ўдзельнікі антыфашысцкага падполля, партызаны, асобы, якія актыўна садзейнічалі партызанскаму руху і антыфашысцкаму падполлю, члены іх сем'яў, жыхары партызанскіх зон і раёнаў, што падвергліся фашысцкаму тэрору

АЎСЯНКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АРЛОЎШЧЫНА

КУРДУКОВА Вольга Клімаўна, н. у 1916, працавала ў калгасе, у партызанах з 1942, загінула ў 1943 у Тушаўскім лесе, там і пахавана.

ЧУБАРАЎ Іван Арывонавіч, н. у 1905, працаваў у калгасе, расстраляны за сувязь з партызанамі, пахаваны на могілках у в. Арлоўшчына.

ВЁСКА АСІПОВІЧЫ

АНТОНАВА Аксіння Іванаўна, н. у 1910, калгасніца, у партызанах з 1942, загінула ў 1942.

АНТОНАВА Алена Тарасаўна, н. у 1910, калгасніца, у партызанах з 1942, загінула ў 1942.

АНТОНАЎ Макар Іванавіч, н. у 1897, калгаснік, расстраляны ў 1942.

АНТОНАЎ Пётр Аляксеевіч, н. у 1909, калгаснік, у партызанах з 1942, загінуў у 1942 у Тушаўскім лесе.

ГАРБУЗОЎ Якаў Мікалаевіч, н. у 1910, калгаснік, расстраляны ў 1944 за садзейнічанне партызанам, пахаваны ў Тушаўскім лесе.

ГРЭКАВА Ганна Антонаўна, н. у 1920, калгасніца, *расстраляна ў 1942.*

ЧАРНАМОРДЗІК Мар'я Іванаўна, н. у 1907, калгасніца, расстраляна ў 1942.

ЧАРНАМОРДЗІК Надзея Фёдараўна, н. у 1931, расстраляна ў 1942.

ВЁСКА АЎСЯНКА

ГРЫГОР'ЕЎ Арцём Пракопавіч, н. у 1890, загінуў у 1942 у Горках.

ГРЫГОР'ЕЎ Віктар Арцёмавіч, н. у 1923 у г. Магілёў, працаваў на заводзе слесарам, удзельнік падполля з 1941, загінуў у 1943.

СВІСТУНОЎ Аляксей Аляксеевіч, н. у 1926, удзельнік падполля з 1941, пахаваны ў Горках.

ШАРДУЛЁВА Яўгенія Мартынаўна, н. у 1918, працавала настаўніцай, сувязная з 1941, загінула 13.10.1942 у Горках.

ШЧЫРОВА Антаніна Рыгораўна, н. у 1920, загінула 14.10.1942 у Горках.

ШЧЫРОЎ Віктар Рыгоравіч, н. у. 1926, партызан, загінуў у лістападзе 1942.

ШЧЫРОВА Кацярына Рыгораўна, н. у 1922, медсястра, загінула ў лістападзе 1942.

ШЧЫРОЎ Сяргей Рыгоравіч, н. у 1925, загінуў у 1942 у Горках.

ВЁСКА ГРЫВЕЦ

БЕЛАВУСАЎ Фёдар Арсеньевіч, н. у 1918, калгаснік, расстраляны ў 1943.

ЛЕВУСАЎ Іван Сцяпанавіч, н. у 1924, калгаснік, прапаў без вестак.

ВЁСКА ГУЛІДАЎКА

КАСЦЯНІКАЎ Ілья Давыдавіч, н. у 1914, працаваў старшынёй Любіжскага с/с, загінуў у 1942.

КУРАЛЕНКА Ксенія Палікарпаўна.

ЧЭРНІКАВА Марыя Андрыянаўна, н. у 1922, калгасніца, загінула *ў 1943 у Германіі.*

ЧЭРНІКАВА Марфа Сямёнаўна.

ВЁСКА ДУШКІ

АНЦІПЕНКА Барыс Фёдаравіч, н. у 1913, калгаснік калгаса «Авангард», удзельнік падполля з 1941, загінуў у 1942 і пахаваны ў в. Душкі.

ІСАЕЎ Мікалай Сямёнавіч, н. у 1909, вучыўся ў Магілёўскім педінстытуце, удзельнік падполля з 1941, загінуў 18.3.1943, пахаваны ў в. Душкі.

ІСАЕЎ Сяргей Сямёнавіч, н. у 1909, калгаснік калгаса «Авангард», у падполлі з 1941, загінуў 18.3.1942, пахаваны ў в. Душкі.

ВЁСКА КРЫЎЦЫ

БЫЦЬКОВА Еўдакія Дзям'янаўна, н. у 1870 у в. Душкі.

ПАЗНЯКОЎ Мікалай Ануфрыевіч, н. у 1936, забіты за сувязь бацькоў з партызанамі ў 1941 у Горках.

ПАЗНЯКОЎ Пётр Ануфрыевіч, н. у 1927, расстраляны ў 1941 у Горках.

ПАЗНЯКОЎ Уладзімір Ануфрыевіч, н. у 1925, калгаснік, у падполлі з 1941, расстраляны ў 1941 у Горках.

ПАЗНЯКОВА Ульяна Фёдараўна, н. у 1905, партызанка, загінула ў лістападзе 1942.

ШПІТАЛЁВА Елізавета Пятроўна, н. у 1870 у в. Галабурды Шклоўскага р-на, калгасніца, спалілі фашысты ў 1943 за тое, што адмаўлялася выязджаць у Германію.

ВЁСКА КУКШЫНАВА

БЫКАВА Ульяна Л., н. у 1913, калгасніца, закатавана немцамі ў Горках.

МАЦВЕЕВА Вольга Кузьмінічна, н. у 1932, вучаніца, расстраляна ў 1943.

МАЦВЕЕВА Ганна Мікітаўна, н. у 1915, калгасніца, загінула ў 1943.

ЧАРВІНСКІ Лукаш Фёдаравіч, н. у 1900, калгаснік, загінуў у 1943, пахаваны ў брацкай магіле ў Горках.



Помнік загінуўшым землякам у в. Аўсянка.

Я. М. Шардулёва.

М. С. Ісаеў.

С. С. Ісаеў.

ЧАРВІНСКІ Раман Фёдаравіч, н. у 1925, навучэнец, расстраляны ў 1943, пахаваны ў брацкай магіле ў Горках.

ВЁСКА ЛІХАЧОВА

ТАЛІВАНАЎ Макар Осіпавіч, н. у 1915, калгаснік, расстраляны немцамі ў Горках.

УСАЎ Іван Васілевіч, н. у 1913, калгаснік, загінуў у лесе Горацкага р-на ў час блакады.

ШЫДЛОЎСКІ Пётр Максімавіч, н. у 1913, партызан, загінуў 25.12.1943.

ВЁСКА ЛЮБІЖ

КУРЦІН Мацвей Гаўрылавіч, н. у 1889, калгаснік калгаса «Адраджэнне», удзельнік падполля з 1941, расстраляны фашыстамі ў маі 1943 у Горках.

КУРЦІН Мікалай Мацвеевіч, н. у 1926, працаваў у калгасе «Адраджэнне», актыўна садзейнічаў партызанскаму руху з 1941, расстраляны ў 1943 у Горках.

У. П. Васільева.

У. З. Васільеў.

КУРЦІНА Таццяна Мацвееўна, н. у 1919, калгасніца, удзельнічала ў падполлі з 1941, расстраляна ў маі 1943 у Горках.

МОЦЬКІН Адам Міхайлавіч, н. у 1925, калгаснік, актыўна садзейнічаў партызанскаму руху з 1941, расстраляны ў маі 1943 у Горках.

МОЦЬКІН Міхаіл Кузьміч, н. у 1907, калгаснік, удзельнік падполля і партызанскага руху з 1941, расстраляны ў маі 1943 у Горках.

ВЁСКА ПАЛЁНКА

АРЛОВА Аляксандра, н. у 1903, калгасніца, загінула ў лютым 1943.

АРЛОВА Таццяна Максімаўна, н. у 1923, загінула ў ліпені 1941.

ВАСІЛЬЕЎ Захар Навумавіч, н. у 1894, калгаснік, загінуў у кастрычніку 1942.

ВАСІЛЬЕЎ Захар Яфімавіч, н. у 1918, працаваў у органах МУС у Мінску, у партызанах з верасня 1943, загінуў у студзені 1944 у Тушаўскім лесе.

ВАСІЛЬЕВА Ульяна Піліпаўна, н. у 1896, працавала ў калгасе звеннявой па льну, у партызанах з 1942, загінула 18.2.1943.

ВАСІЛЬЕЎ Уладзімір Захаравіч, н. у 1928, навучэнец, загінуў у кастрычніку 1942 у Горках.

ВОРАНАВА Ефрасіння Майсееўна, н. у 1926, навучэнка, загінула ў маі 1944 у Тушаўскім лесе.

ВОРАНАВА Малання Майсееўна, калгасніца, у партызанах з 1943, загінула ў жніўні 1943 у Слаўгарадскім р-не, пахавана ў в. Ліцягі.

ГЛУШАКОЎ Іван Емяльянавіч, н. у 1910, партызан, загінуў у кастрычніку 1942.

ДЗЯМ'ЯНАЎ Васіль Фёдаравіч, н. у 1896, калгаснік, загінуў у жніўні 1942 у Горках.

ІСАКОВА Афанасія Аляксандраўна, н. у 1925, навучэнка, загінула ў 1944, пахавана ў Тушаўскім лесе.

ІСАКОВА Васіліса Аляксандраўна, н. у 1922, калгасніца, загінула ў 1943.

ІСАКОЎ Васіль Сідаравіч, н. у 1890, калгаснік, загінуў у лютым 1943 у Горках.

ІСАКОЎ Рыгор Аляксандравіч, н. у 1928, вучань, загінуў у 1944 у Тушаўскім лесе.

КОНАНАВА Аляксандра Максімаўна, н. у 1922, калгасніца, загінула ў 1943, пахавана ў Горках.

КУЗЬМІН Андрэй Кліментавіч, н. у 1925, калгаснік, партызан, загінуў у маі 1943 у в. Бася.

КУЗЬМІНА Вера Пракопаўна, н. у 1923, калгасніца, загінула ў маі 1944 у Тушаўскім лесе.

КУЗЬМІН Кліменцій Кузьміч, н. у 1870, калгаснік, загінуў у ліпені 1941.

КУЗЬМІН Мацвей Кліменцьевіч, н. у 1910, чыгуначнік, працаваў на ст. Зубры, забіты фашыстамі ў 1942.

Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў і землякоў у в. Палёнка.



КУЗЬМІНА Фядосся Іванаўна, н. у 1865, калгасніца, з 1942 актыўна змагалася супраць фашыстаў, загінула ў 1943 у Тушаўскім лесе, пахавана ў в. Палёнка.

МІЛЮЦІН Леанід Трыфанавіч, н. у 1926, навучэнец, у падполлі з 1942, загінуў у 1943.

ПАНЦЯЛЕЕЎ Антон Мікітавіч, н. у 1893, калгаснік, партызан, загінуў у 1944 у Тушаўскім лесе.

ПАНЦЯЛЕЕЎ Рыгор Антонавіч, н. у 1929, навучэнец, садзейнічаў партызанам, загінуў у 1944 у Тушаўскім лесе.

РАЎКОВІЧ Марыя Пракопаўна, н. у 1908, калгасніца, загінула ў маі 1944 у Тушаўскім лесе.

СПАСІБЕНКА Васіль Аляксеевіч, н. у 1922, калгаснік, загінуў у ліпені 1941.

ШЫЦІКАЎ Пётр Карпавіч, н. 12.7.1927, навучэнец, у партызанах са жніўня 1942, загінуў 25.10.1943 у Боўскім лесе, пахаваны ў в. Жалезенка Слаўгарадскага р-на.

ЯКУШЭВІЧ Рыгор Міхайлавіч, н. у 1908, працаваў рахункаводам калгаса, загінуў у ліпені 1941.

ВЁСКА ПАЛНА

ГАЛКІН Клім Апанасавіч, н. у 1870, калгаснік, загінуў 3.5.1943 у Горках.

ГАЛКІН Стафан Клімавіч, н. у 1923, калгаснік, загінуў у 1943, пахаваны на могілках у в. Пална.

ЖАРЫКАВА Марфа Еўфанаўна, н. у 1907, калгасніца, расстраляна ў 1943 у Горках за сувязь з партызанамі.

ЖАРЫКАЎ Мікалай, н. у 1905, калгаснік, расстраляны ў 1943 у Горках за сувязь з партызанамі.

КЛАПКОЎ Стафан Еўфанавіч, н. у 1918, настаўнік, у партызанах з 1943, загінуў і пахаваны ў Тушаўскім лесе.

КЛІМАЎ Данііл Лукіч, н. у 1882, калгаснік, расстраляны ў 1943 за сувязь з партызанамі.

КЛІМАВА Соня Ігнацьеўна, н. у 1888, калгасніца, загінула 24.12.1943, пахавана ў в. Пална.

КРАСІКАЎ Мікалай Кірылавіч, н. у 1925, калгаснік, партызан, загінуў у 1943, пахаваны ў в. Тударайка Маслакоўскага с/с.

ЛЬВОВА Кацярына Міхайлаўна, н. у 1923, навучэнка, загінула ў 1943 у Тушаўскім лесе.

РУБАНАВА Аніcся Панцялееўна, н. у 1909, калгасніца, загінула ў 1943.

ВЁСКА САЛЬНІКІ

СТАМБРОЎСКІ Фёдар Аляксандравіч, працаваў у лясніцтве, у партызанах з 1942, загінуў у 1943.

Ф. А. Стамброўскі.

Н. Дз. Абакановіч.

П. Дз. Абакановіч.

ВЁСКА СЯЛЕЦ

АБАКАНОВІЧ Кірыл Данілавіч, н. 20.5.1896, працаваў старшынёй калгаса, у падполлі з 1941, загінуў 6.2.1942.

АБАКАНОВІЧ Кірэй Данілавіч, н. у 1912.

АБАКАНОВІЧ Надзея Дзям'янаўна, н. у 1922, навучэнка педтэхнікума, у партызанах з 1942, загінула 4.6.1944 у лесе каля в. Савы.

АБАКАНОВІЧ Пётр Дзям'янавіч, н. у 1924, навучэнец, у партызанах з 1942, загінуў 15.6.1944 у в. Клін.

ЖАРЫКАЎ Іван Аляксандравіч, н. у 1923, служыў у Чырвонай Арміі, у партызанах з 1942, загінуў 24.1.1944, пахаваны ў лесе каля в. Кукшынава.

ЖАРЫКАВА Клаўдзія Аляксандраўна, н. у 1924, навучэнка, у партызанах з 1942, загінула 1.6.1944 у лесе каля в. Клін.

ЖАРЫКАЎ Мікалай Фёдаравіч, н. у 1924, навучэнец, у партызанах з 1942, загінуў 20.3.1944 у лесе каля в. Тушавая.

РАБЦАЎ Пётр Мікітавіч, н. у 1927, калгаснік калгаса «Бальшавік», у партазанах з 1943.

Помнік ахвярам фашызму ў в. Тушавая.

Помнік савецкім воінам і партызанам у в. Тушавая.

ВЁСКА ТУШАВАЯ

ВАСІЛЬЕВА Кацярына Фёдараўна, н. у 1920, калгасніца, расстраляна ў 1943 у Горках.

ВАСІЛЬЕЎ Мірон Карпавіч, н. у 1888, калгаснік, расстраляны ў 1943.

ВАСІЛЬЕЎ Фёдар Карпавіч, н. у 1891, калгаснік, расстраляны ў 1943.

ВАСІЛЬЕЎ Фёдар Савельевіч, н. у 1890, калгаснік, расстраляны ў 1943.

ВЯТКІН Ілья, кам. узвода 115-й партызанскай брыгады, загінуў у Тушаўскім лесе.

ГАРБАТОЎСКАЯ Алена Іванаўна, н. у 1904, калгасніца, расстраляна ў 1943 у Горках.

ГАРБАТОЎСКІ Андрэй Ігнатавіч, н. у 1881, калгаснік, расстраляны ў 1943.

ГАРБАТОЎСКІ Аўрам Ігнатавіч, н. у 1885, калгаснік, расстраляны ў 1943.

ГАРБАТОЎСКІ Сідар Васілевіч, н. у 1889, калгаснік, расстраляны ў 1943.

ГАРБАТОЎСКІ Уладзімір Ціханавіч, н. у 1923, калгаснік, расстраляны ў 1943 у Горках.

ДРАГУНОЎ Фядос, н. у 1882, калгаснік, расстраляны ў 1943 у Горках.

ЖАРЫКАЎ Аляксандр Пракопавіч, н. у 1914, калгаснік, расстраляны ў 1943 у Горках.

ЖАРЫКАЎ Емяльян Мікалаевіч, н. у 1910, калгаснік, расстраляны ў 1943 у Горках.

ЖАРЫКАЎ Мікалай Стафанавіч, н. у 1871, калгаснік, расстраляны ў 1943.

ЖАРЫКАЎ Фама Стафанавіч, н. у 1896, калгаснік, расстраляны ў 1943 у Горках.

КРАПЎНІКАВА Ганна Цімафееўна, н. у 1910, калгасніца, расстраляна ў 1943 у Горках.

ЛІТВІНАЎ Аляксандр Іванавіч, н. у 1897, калгаснік, расстраляны ў 1943 у Горках.

ЛІТВІНАВА Антаніна Цімафееўна, н. у 1921, калгасніца, расстраляна ў 1943 у Горках.

ЛІТВІНАЎ Барыс Яўсеевіч, н. у 1912, калгаснік, расстраляны ў 1943 у Горках.

ЛІТВІНАЎ Васіль Цімафеевіч, н. у 1925, навучэнец, расстраляны ў 1943 у Горках.

ЛІТВІНАВА Ганна Лукінічна, н. у 1903, калгасніца, з 1942 актыўна садзейнічала падполлю і партызанскаму руху, расстраляна ў 1943 у Горках.

ЛІТВІНАВА Ганна Цімафееўна, н. у 1910, калгасніца, расстраляна ў 1943 у Горках.

ЛІТВІНАВА Дар'я Іванаўна, н. 1907, калгасніца, расстраляна ў 1943 у Горках.

ЛІТВІНАЎ Ларывон Іванавіч, н. у 1905, калгаснік, расстраляны ў 1943.

ЛІТВІНАЎ Мікалай Міронавіч, н. у 1887, калгаснік, расстраляны ў 1943.

ЛІТВІНАВА Надзея, н. у 1872, калгасніца, расстраляна ў 1943 у Горках.

ЛІТВІНАЎ Сяргей Раманавіч, калгаснік, расстраляны ў 1943.

ЛІТВІНАВА Ульяна Аўхімаўна, н. у 1907, калгасніца, расстраляна ў 1943 у Горках.

ЛІТВІНАЎ Яўсей Антонавіч, н. у 1871, калгаснік, расстраляны ў 1943.

СІЛАЕЎ Аляксей, кам. узвода 115-й партызанскай брыгады.

СЯЎНІЦКІ Васіль Нічыпаравіч, н. у 1927, калгаснік, расстраляны ў 1943.

СЯЎНІЦКІ Васіль Осіпавіч, н. у 1922, калгаснік, у партызанах з 1942, загінуў 20.6.1943.

СЯЎНІЦКІ Восіп Рыгоравіч, н. у 1881, калгаснік, расстраляны ў 1943.

СЯЎНІЦКІ Міхаіл Восіпавіч, н. у 1918, калгаснік, партызан з 1943, загінуў у 1943.

СЯЎНІЦКІ Філімон Феакціставіч, н. у 1889, калгаснік, расстраляны ў 1943 у Горках.

ХОЛУСЕЎ Іван Рыгоравіч, н. у 1915, калгаснік, расстраляны ў 1943.



В. М. Махлаёў.

З успамінаў жыхаркі в. Тушавая А. М. Жарыкавай

Гэта здарылася 3 кастрычніка 1943 года. Вёску акружыў атрад карнікаў. Яны ўрываліся ў кожную хату і ўсіх выганялі на вуліцу. Людзей сабралі ў канцы вёскі і пад канвоем пагналі ў поле. Калі ўжо адышлі ад вёскі, я азірнулася. Падпаленая з двух бакоў, вёска гарэла. Потым пачулі выбухі. Гэта немцы закідвалі гранатамі скляпы. Дзяцей, жанчын, старых гналі ад вёскі кіламетры два і загадалі спыніцца. З калоны адабралі старых, а таксама хлапчукоў-падлеткаў і адвялі ўбок. Ім далі ў рукі рыдлёўкі, загадалі капаць яму. Калі загад быў выкананы, іх паставілі на ўскрайку і расстралялі. Расстраляна было 16 чалавек. Астатніх пратрымалі да вечара, а затым пад канвоем пагналі ў Шклоў.

ВЁСКА ХОДАРАЎКА

АНТАНЮЖАНКА Алена Фёдараўна, н. у 1918, расстраляна ў 1943 у Горках.

РОТНІКАЎ Віктар Сямёнавіч, партызан, загінуў 2.4.1944.

СОЙКІН Аляксандр Сідаравіч, н. у 1925, працаваў у калгасе, партызан з 1943, загінуў у 1944 у лесе каля в. Чапялінка.

СОЙКІН Іван Якаўлевіч, н. у 1925, кам. аддз. партызанскага атрада, загінуў 12.4.1944 у в. Чапялінка, астанкі перазахаваны на могілках у в. Ходараўка.

ВЁСКА ЦІМОХАЎКА

КУПАЛАЎ Пётр Васілевіч, н. у 1923, калгаснік, партызан з 1942, загінуў у 1943.

БУДСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БУДЫ

АРГУНОЎ Віктар, н. у г. Новасібірск, расстраляны ў 1941 у Горках.

МАРЧАНКА Іван Васілевіч, фашысты павесілі ў парку ў Горках.

МАРЧАНКА Іван Сямёнавіч, н. у 1903 (1905), працаваў на шахтах Данбаса, Юзаўкі, перад пачаткам вайны гасцяваў у сястры Домны Сямёнаўны Елісеенкі, дзе яго і застала вайна. У 1941 пайшоў на фронт, але трапіў у акружэнне і вярнуўся назад у Горкі, стаў членам падпольнай арганізацыі Горацкага цагельнага завода. У ліпені 1942 быў арыштаваны, а 12 ліпеня 1942 — павешаны. Пахаваны ў брацкай магіле ў Горках на тэрыторыі акадэміі.

МАХЛАЁЎ Васіль Міронавіч, н. у 1886, павешаны фашыстамі 12.7.1942 у Горках.

МАХЛАЁЎ Іван Васілевіч, н. у 1921, калгаснік, падпольшчык падпольнай групы Горацкага цагельнага завода, з ліпеня 1942 у партызанах, загінуў 18.10.1942, пахаваны ў в. Кузавіна.

ЦЮХТОЎ Данііл Аляксандравіч, н. у 1885.

ВЁСКА КАЦЯЛЁВА

ШЧУПЛЯКОВА Ефрасіння, расстраляна ў жніўні 1942 у Горках.

ШЧУПЛЯКОЎ Канстанцін Церахавіч, н. у 1927, расстраляны ў 1942 у Горках у двары камендатуры.

ШЧУПЛЯКОВА Кацярына, расстраляна ў жніўні 1942 у Горках.

ШЧУПЛЯКАЎ Пімен Максімавіч, н. у 1912, працаваў ветэрынарам, павешаны фашыстамі ў Горках.

ШЧУПЛЯКОЎ Яфім Піменавіч, ветурач, расстраляны ў жніўні 1942.

ШЧУПЛЯНКОЎ Пімен Піменавіч, н. у 1918, працаваў рахункаводам, расстраляны ў 1942 і пахаваны ў в. Кацялёва.

ВЁСКА МАРОЗАВА ВЯЛІКАЕ

БАЙКОЎ Пракоп Іванавіч, н. у 1905, партызан.

ВЁСКА МАРОЗАВА МАЛОЕ

ІГНАЦЬЕВА Ірына Пятроўна, н. у 1926, расстраляна ў верасні 1942, пахавана ў в. Малое Марозава.

ТАЛКАЧОВА Вольга Ахтанонаўна, н. у 1926, расстраляна ў верасні 1942, пахавана ў в. Малое Марозава.

ВЁСКА МІКУЛІНА

КАВАЛЁЎ Пётр Іванавіч, н. у 1918, у Чырвонай Арміі з 1941, загінуў у 1942 у г. Быхаў.

ВЁСКА СЛАВІКІ

ДРОБЫШАВА Варвара Емяльянаўна, н. у 1890, расстраляна ў 1942 як маці партызана.

ДРОБЫШАЎ Уладзімір Паўлавіч, н. у 1907, калгаснік, загінуў у 1942 у в. Рэкатка.

КАРНАЧОЎ Назар Яфімавіч, н. у 1896, калгаснік, расстраляны ў 1941.

ВЁСКА ТУРЫШЧАВА

ЗАЙЦАЎ Апанас Якаўлевіч, н. у 1916, працаваў трактарыстам, у Чырвонай Арміі з 1941, загінуў пад в. Кледнявічы.

ГОРАЦКІ *СЕЛЬСАВЕТ*

ВЁСКА АНДРУХІ

МАРЧАНКА Парфір Антонавіч, н. у 1914, загінуў 28.7.1941 у Сахараўскім лесе.

ВЁСКА ВАЎКОЎШЧЫНА

БАЛЫШКОЎ Мікалай Ціханавіч, н. у 1919, партызан, прапаў без вестак у канцы 1942.

ВЁСКА ЗАДАРОЖЖА

БЕЛАВУСАЎ І. І., н. у 1909, сувязны, загінуў 27.2.1942.

РАДЗЬКОЎ Даніла Сямёнавіч, н. у 1910, калгаснік, удзельнік падполля з 1941, загінуў у 1942, пахаваны ў в. Чапялінка.

ВЁСКА ЗАЙЦАВА

АВЯР'ЯНАВА Соф'я Карнееўна, н. у 1929, прапала без вестак у студзені 1943.

ВЁСКА МАЦЮТЫ

ТРАФІМЕНКА Еўдакія Усцінаўна, н. у 1906, загінула 20.7.1942.

ХАРУЖЭНКА Фёкла Яфімаўна, н. у 1892, сувязная, загінула ў лістападзе 1942, разам з сынамі Іванам і Сцяпанам.

ВЁСКА СТАН

БАРЫСАВА Алена Яфімаўна, н. у 1928, загінула ў лютым 1944 каля в. Балбечына.

БАРЫСАВА Фёкла Сяргееўна, н. у 1907, калгасніца, загінула ў лютым 1944 каля в. Балбечына.

БАРЫСАЎ Яфім Іванавіч, н. у 1906, калгаснік, загінуў у лютым 1944 каля в. Балбечына.

БЯЗНОСАЎ Пётр Самуілавіч, н. у 1898, рабочы, загінуў 17.7.1942.

ЗУБКОВА Алена Анціпаўна, калгасніца, загінула ў 1943.

ЗУБКОЎ Леанід Пракопавіч, н. у 1937, загінуў у 1943.

ЗУБКОВА Надзея, н. у 1939, загінула ў 1943.

ЛАБУСАВА Еўдакія Мяфодзьеўна, н. у 1929, загінула ў 1944.

ЛАБУСАВА Еўдакія Яфімаўна, н. у 1905, загінула ў 1944.

ЛАБУСАЎ Мяфодзій Антонавіч, н. у 1900, працаваў трактарыстам, загінуў у 1944, сям'я расстраляна.

ЛАБУСАЎ Фёдар Мяфодзьевіч, н. у 1926, загінуў у 1944.

ЛЕНЧЫКАВА Ганна Іванаўна, калгасніца, загінула ў студзені 1944.

МАГІЛЬНЫ Раман Якаўлевіч, калгаснік, загінуў у 1942.

МАЛАШАНКА Панцеляймон Васілевіч.

НАПРЭЕНКА Яфім Піліпавіч, н. у 1887, працаваў пчаляром, партызан з 1943, загінуў у студзені 1944, пахаваны ў в. Стан.

ВЁСКА ТУШКАВА

САРОКІН Мікалай Панцялеевіч, н. у 1925, партызан з 7.8.1942, загінуў 26.11.1943.

ВЁСКА ЧАПЯЛІНКА

АЛЯКСЕЕВА Надзея Васілеўна, н. у г. Орша, партызанка 115-й Горацкай партызанскай брыгады.

БЫЧКОВА Анастасся М., расстраляна ў 1942.

БЫЧКОЎ Антон Мацвееевіч, расстраляны ў 1942.

БЫЧКОВА Ганна Мацвееўна, расстраляна ў 1942.

БЫЧКОЎ Дзмітрый В.
БЫЧКОВА М.
БЫЧКОЎ Мацвей Яфімавіч, расстраляны ў 1942.
БЫЧКОЎ Павел Філіпавіч, сувязны, загінуў у снежні 1942.
БЫЧКОЎ Фёдар Дзямідавіч, н. у 1913, сувязны, расстраляны ў лістападзе 1942, пахаваны ў Горках.
БЫЧКОЎ Фёдар Д.
БЫЧКОЎ Фядот М.
БЫЧКОЎ Якаў В.
ГЛУЗДОЎ Давыд Фёдаравіч, н. у 1899, сувязны, загінуў у лістападзе 1942.
ГЛУЗДОВА Марфа П.
ЛЕНЧЫКАВА Анастасія.
ЛЕНЧЫКАЎ Андрэй Парфенавіч, н. у 1907, партызан, загінуў у лістападзе 1942.
ЛЕНЧЫКАЎ Фёдар Рыгоравіч, н. у 1913, працаваў кавалём, партызан, павешаны немцамі 13.11.1942.
МАГАЗІНШЧЫКАЎ Аляксей (Аляксандр) Сцяпанавіч, падпольшчык, расстраляны ў 1942 у Горках.
МАГАЗІНШЧЫКАЎ Міхаіл Сцяпанавіч, расстраляны летам 1942 у Горках.
МАГАЗІНШЧЫКАВА Надзея Сцяпанаўна, расстраляна летам 1942 у Горках, пахавана ў брацкай магіле на тэрыторыі акадэміі.
МАКСІМАЎ Сцяпан Аляксеевіч, н. у 1925, партызан, загінуў 22.5.1944.
САРОКІН Стафан Іванавіч, н. у 1909, загінуў у лістападзе 1942.
ХАМЯКОЎ Іосіф П.
ХАМЯКОЎ Іван Васілевіч, н. у 1881, сувязны, загінуў у лістападзе 1942.
ХАМЯКОЎ Павел Іванавіч, н. у 1913, сувязны, загінуў у лістападзе 1942.
ХАМЯКОЎ Пётр Іванавіч.
ХАМЯКОЎ Рыгор.
ХАМЯКОЎ Якаў.
ШУМЕЙКА Якаў Сямёнавіч, н. у 1911, сувязны, загінуў у лістападзе 1942.

ГОРАД ГОРКІ

БАЗЫЛЕВА Вольга Пятроўна, н. у 1926, скончыла 7 класаў, у жніўні 1943 выгнана ў Германію, працавала ў фермера. У лютым 1944 захварэла, была перавезена ў г. Кёльн, дзе і загінула.

З пісьма В. Базылевай да родных

Добры дзень, дарагія браты! Хачу вам паведаміць, што я захварэла. Вось ужо 17 дзён я ляжу ў ложку. Тэмпература трымаецца ўвесь час высокая — 38—39 градусаў. Доктар прыходзіць праз 2—3 дні, ён гаворыць што, напэўна, запаленне лёгкіх, а можа, прастудзілася. Не ведаю, як будзе далей, але пакуль што дрэнна.

Ф. Р. Ленчыкаў.

БАБРОЎ Самуіл, настаўнік.
БАРКУЛАЎ.
БАРЫНАЎ Пётр Рыгоравіч, н. у 1888, працаваў бухгалтарам на пошце, загінуў у 1943.
ВАРАБ'ЁВА Валянціна, н. у 1921, партызанка.

Помнік ахвярам фашызму ў г. Горкі.

В. П. Базылева.

П. Х. Кажура.

Е. Ф. Крушава.



А. П. Кузняцоў.

І. Т. Марчанка.

І. І. Мартулёў.

У. М. Муштукова.

А. Е. Патапаў.

ВАРАБ'ЁВА Вольга Іванаўна, н. у 1920, падпольшчыца, расстраляна летам 1942.

ВЕРАБ'ЁЎ Фёдар Андрэевіч, н. у 1904, партызан, загінуў у лістападзе 1942.

ГРАМАКОЎСКІ Фёдар Андрэевіч, партызан.

ГУЦІКАЎ Анатоль Ціханавіч, н. у 1925.

ГУЦІКАЎ Уладзіслаў Ціханавіч, н. у 1915.

ДАНІЛАВА Вольга, н. у 1923, партызанка.

ДЗЕНІСЕНКА С. І.

ДЗЕЎСАЎ Леанід, партызан, расстраляны 23.2.1943 у г. п. Старобін.

ДЗМІТРЫЕВА Ганна Дзмітрыеўна, н. у 1893, сувязная, загінула ў лістападзе 1942.

КАЖУРА Пётр Аляксеевіч, загінуў 7.9.1942.

КАЖУРА Пётр Харысанавіч, н. у 1902, кіраўнік Горацкай падпольнай групы, затым партызан, загінуў у 1942 у в. Кацялёва.

КАРАНЬКОЎ Сяргей Аляксеевіч.

КАРНАЧОЎ.

КРУЧКОЎ Фёдар Мікітавіч, н. у 1899, сувязны, загінуў у чэрвені 1943.

КРУШАВА Е. Ф.

КУЗНЯЦОЎ Аляксандр Пракопавіч, н. у 1912, загінуў 8.8.1942.

КУЛІКОЎ Кузьма.

ЛАПЕЗА Еўдакія Ільінічна, спалена немцамі ў в. Тушавая.

ЛАСКЕВІЧ Ніна, н. у 1922, навучэнка, удзельніца падполля, загінула ў ліпені 1942, яе маці немцы расстралялі як заложніцу.

ЛАТУШКІНА Зоя Іванаўна, н. у 1921, выгнана немцамі ва Усходнюю Прусію, там і памерла 21.1.1944.

ЛЕЎШУНОЎ Леў Трафімавіч, расстраляны 12.7.1941.

МАРОЗАЎ.

МАРЧАНКА І. Т., партызан.

МАРТУЛЁЎ Іван Іосіфавіч, н. у 1914, працаваў аграномам, удзельнік падполля з 1942, загінуў у 1943 у канцлагеры ў Германіі.

МАХЛАЁЎ В. М.

МАХЛАЁЎ Іван Васілевіч, н. у 1923, партызан з ліпеня 1942, загінуў 18.10.1942 у в. Кузавіна.

МУШТУКОВА Ульяна Міхайлаўна, н. 10.6.1887, хатняя гаспадыня, з 1941 па 1942 — сувязная партызан, загінула ўвосень 1942.

ПАЛЬГУЕВА Аляксандра Мяфодзьеўна, працавала настаўніцай, загінула ў Германіі ў 1943.

ПАЛЬГУЕВА Ангеліна Мяфодзьеўна, н. у 1928, вучаніца, загінула ў Германіі ў 1943.

ПАЛЬГУЕВА Васа Міхееўна, н. у 1876, хатняя гаспадыня, загінула ў Германіі ў 1943.

ПАТАПАЎ А. Е.

САЛОДКІ, спалены жывым у агні летам 1941.

ТАПАРКОЎ М. Т.

ТАРАСАВА Лідзія, н. у 1920.

ТАТАРСКАЯ Ганна Ісакаўна, н. у 1884, галоўны ўрач Горацкай райбальніцы, заслужаны ўрач БССР (1940).

ТУЗКОЎ Пётр Яфімавіч, н. у 1923, партызан, прапаў без вестак 11.1.1944.

М. Т. Тапаркоў.

В. Ф. Усцімовіч.

УСЦІМОВІЧ Вера Фёдараўна, н. у 1904, працавала настаўніцай, загінула ў жніўні 1942.

ЯВОРСКІ Анатоль Уладзіміравіч, н. у 1928, забіты 23.6.1944, пахаваны ў в. Суслаўка Дрыбінскага р-на.

ЯЦУН П. І.

Мірныя жыхары, расстраляныя і закатаваныя нямецка-фашысцкімі захопнікамі 7 кастрычніка 1941 г. і пахаваныя ў брацкай магіле ва ўрочышчы Белы Ручай

АЗІМАВЫ, загінула ўся сям'я.

АМНУЭЛЬ Хана Абрамаўна, н. у 1882, працавала поварам у дзіцячым садзе.

АМНУЭЛЬ, сям'я з дзесяці чалавек, чацвёра дзеці.

АРАНСОН Маня Абрамаўна, н. у 1906, хатняя гаспадыня.

АРАНСОН Майсей Айзікавіч, н. у 1926.

АРАНСОН Роза Айзікаўна, н. у 1928.

АРЫЕЛЬ Барыс.

АРЫЕЛЬ Муся Ізраілеўна.

АРЫЕЛЬ Нэля.

БАЕЎСКІ, н. у 1890.

БАЕЎСКАЯ, н. у 1892.

БАЕЎСКАЯ Алена, н. у 1940.

БАЕЎСКАЯ Бейля, н. у 1915, працавала тэхнолагам-кандытарам.

БАЕЎСКАЯ Ліля, н. у 1940.

БЕЙЛІНА Вера Лазараўна, н. у 1924.

БЕЙЛІН Лазар Аронавіч, н. у 1879.

БЕЙЛІНА Хана Аронаўна, н. у 1889.

БРАВІН Гірша, дзве яго дарослыя дачкі.

БРАВІНА Рэйза, хатняя гаспадыня.

БРАЎДЭ Геня Саламонаўна, н. у 1929, школьніца.

БРАЎДЭ Гілій Кусевіч, н. у 1925.

БРАЎДЭ Елізавета Саламонаўна, н. у 1932, школьніца.

БРАЎДЭ Ісак Абрамавіч, н. у 1864, працаваў кавалём.

БРАЎДЭ Рахіль Ісакаўна, н. у 1914, працавала бухгалтарам.

БРАЎДЭ Саламон Ісакавіч, н. у 1895, працаваў бухгалтарам-касірам у сельгасінстытуце.

БРАЎДЭ Сёма Кусевіч, н. у 1938.

БРАЎДЭ Хайгіся Гілеўна, н. у 1903, хатняя гаспадыня.

З успамінаў З. К. Браўдэ, сына Х. Г. Браўдэ

Мая маці была родам з Дрыбіна. У 1920 г. яна выйшла замуж за Браўдэ, які быў патомным кавалём. У першыя ж дні вайны ён пайшоў на

Д. Х. Верабейчык.

І. Х. Верабейчык.

С. Гінесіна.

фронт і загінуў. За дзень да прыходу немцаў у Горкі маці разам з двума сынамі пайшла пехатой у бок в. Горы. Аднак фашысты нагналі іх і вярнулі ў Горкі. Там яны і сустрэлі смерць.

БРАЎДЭ Хайка Айзікаўна, н. у 1883, хатняя гаспадыня.

БРАЎДЭ Цыля Лібензонаўна, н. у 1907, хатняя гаспадыня.

БРАЎДЭ Цыля Паўлаўна, н. у 1893, хатняя гаспадыня.

БРАЎДЭ Эсфір Ісакаўна, н. у 1916.

ВАЛОДЗІНА Ева, н. у 1922, загінула разам з бацькамі.

ВЕРАБЕЙЧЫК Давыд Хоневіч.

ВЕРАБЕЙЧЫК Іда Хонеўна, н. у 1928.

ВЕРАБЕЙЧЫК Крэйна.

ВЕРАБЕЙЧЫК Хоня Шаломавіч.

З успамінаў Ф. Х. Верабейчык, дачкі Х. Ш. Верабейчыка

Бацька быў па прафесіі пекар-кандытар, працаваў саматужна. У свой час маці навучылася кандытарскай справе ў Вільнюсе і навучыла гэтаму свайго мужа. У 1932 г. маці памерла, а праз год бацьку асудзілі на 5 год турэмнага зняволяння. Праз 2,5 гады ён вярнуўся, але ненадоўга. Яго зноў асудзілі на 5 гадоў. Пяцёра дзяцей засталіся без сродкаў на існаванне. Толькі дзякуючы нашаму дзядулю мы выжылі. Перад самай вайной бацька вярнуўся дахаты, але пачалася вайна, а потым трагедыя ў кастрычніку 1941 г. Бацька, яго жонка, мой брат і сястра апынуліся ў адной магіле.

ВІЛЬНЕР Майсей, н. у 1865, працаваў аптэкарам.

ВІЛЬНЕР Сіма Ізраілеўна, н. у 1872.

ШВЯДОЎСКІ Максім Іванавіч, сярж., прапаў без вестак у жніўні 1944.

ШКОЛЬНІКАЎ Каліграт Іванавіч, прапаў без вестак у верасні 1944.

ШКУРАТАЎ Цімафей Фёдаравіч, н. у 1916, загінуў 28.11.1943 у Віцебскай вобл.

ШЛЯХЦІЦАЎ Канстанцін Ігнатавіч, н. у 1904, рад. 434-га ап 156-й сд, прапаў без вестак 16.5.1942 у г. Керч.

ШТЭЎСКІ Фядот Архіпавіч, прапаў без вестак у жніўні 1944.

ШУДРЫКАЎ Міхаіл Іванавіч, н. у 1905, 361-ы сп 156-й сд, прапаў без вестак 18.5. 1942 у г. Керч.

ШУМАКОЎ Аляксандр Дзмітрыевіч, н. у 1903, кам. аддз, 297-га сп 184-й Духаўшчынскай сд, загінуў 17.10.1944 у Літве.

ШУПЛЯКОЎ Лявон Мікалаевіч, прапаў без вестак у жніўні 1944.

ШУРЫНАЎ Уладзімір Якаўлевіч, н. у 1925, рад. 45-га гв. сп, загінуў 13.1.1945 ва Усходняй Прусіі.

ШУРЫНАЎ Яфім Карпавіч, н. у 1913, загінуў 7.10.1944 у Літве.

ШЫДЛОЎСКІ Пётр Барысавіч, прапаў без вестак у верасні 1944.

ШЫЛІН Сямён Сцяпанавіч, прапаў без вестак у жніўні 1944.

ШЫНКАРОЎ Трафім Паўлавіч, прапаў без вестак у жніўні 1944.

ШЫПІНСКІ Дзяніс Еўдакімавіч, прапаў без вестак у жніўні 1944.

ШЫПІНСКІ Іван Піменавіч, прапаў без вестак у жніўні 1944.

ШЫЦІКАЎ Пётр Ільіч, прапаў без вестак у красавіку 1945.

ШЭЙКІН Яфім Мінаевіч, н. у 1922, рад. 371-га сп 130-й сд, загінуў 14.1.1945.

ШЧАМЯЛЁЎ Міхаіл Аляксандравіч, н. у 1904, рад. 781-га сп 124-й сд., загінуў 13.5. 1942 у Харкаўскай вобл.

ШЧАМЯЛЁЎ Феафіл Аляксеевіч, прапаў без вестак у верасні 1944.

ШЧАРБАКОЎ Рыгор, загінуў 2.5.1945.

ШЧОКІН Канстанцін Пятровіч, н. у 1921, прапаў без вестак 19.7.1941.

ШЧАПІНСКІ Фядос Піліпавіч, прапаў без вестак у жніўні 1944.

ЮР'ЕЎ Фёдар Архіпавіч, прапаў без вестак у верасні 1944.

ЮРЧАНКА Якаў Паўлавіч, прапаў без вестак у снежні 1943.

ЮХВІД Восіп Сямёнавіч, н. у 1901, прапаў без вестак у снежні 1943.

ЮШМАНАЎ Фёдар Іванавіч, н. у 1917, прапаў без вестак у кастрычніку 1941.

ЯГОРАЎ Мікалай Цімафеевіч, н. у 1925, стралок 415-га сп, загінуў 14.10.1943 у в. Мысы Чарнігаўскай вобл.

ЯЗЫКОЎ А. П., прапаў без вестак у жніўні 1941.

ЯКАЎЛЕЎ Іван Рыгоравіч, прапаў без вестак у жніўні 1944.

ЯКУБОЎСКІ Мяфодзій Барысавіч, загінуў у жніўні 1941.

ЯКУШАЎ Сяргей Раманавіч, прапаў без вестак у жніўні 1944.

ЯНУСАЎ Барыс Ермалаевіч, прапаў без вестак у верасні 1944.

ЯНЧАНКА Іван Захаравіч, прапаў без вестак у верасні 1944.

ЯРМОЛЕНКА Адам Аляксеевіч, н. у 1903, рад. 584-га сп, памёр ад ран 21.4.1945 у г. Канітца, Польшча.

ЯРМОЛЕНКА Фёдар Сцяпанавіч, н. у 1904, кавалерыст 124-га кп 20-й кд, прапаў без вестак 28.11.1942.

ЯРОМЕНКА Аляксей Харытонавіч, н. у 1917, ст. сярж. 322-га сп 69-й сд, памёр ад ран 31.8.1944 у Польшчы.

ЯЎСЕЕЎ Васіль Цімафеевіч, н. у 1921, артылерыст 86-га сп 180-й сд, прапаў без вестак 17.7.1941 у г. Порлаў.

ЯФІМЕНКА Лявон Цярэнцьевіч, загінуў 27.10.1942.

ЯЦКОЎ А. П., прапаў без вестак у жніўні 1944.

ЯШНОЎСКІ Іван Цімафеевіч, н. у 1919, памёр ад ран 29.3.1942.

1945

ДА НАШЫХ ДЗЁН

У МІРНАЙ ПРАЦЫ

Ліпень 1944 года. Вызваленыя Горкі і раён ляжалі ў руінах. Разбураны былі ўсе прамысловыя прадпрыемствы, культурна-бытавыя і адміністрацыйныя будынкі і ўстановы. Гітлераўцы ўзарвалі і спалілі 166 са 170 дамоў камунальнай гаспадаркі. Карпусы, лабараторыі і жыллёвыя пабудовы сельскагаспадарчага інстытута ператварыліся ў развалiны.

Лепшыя . кнігі бібліятэкі фашысты вывезлі ў Германію. Матэрыяльны ўрон, нанесены толькі інстытуту, склаў 146 мільёнаў рублёў (у цэнах 1940 г.).

Вялікі ўрон нанеслі гітлераўцы гаспадарцы раёна. Яны разрабавалі ўсе калгасы і саўгасы, 2 тыс. гаспадарчых пабудоў, знішчылі 110 вёсак, 5746 жылых дамоў, 50 калгасных клубаў, 2 бальніцы і 13 медпунктаў, усе бібліятэкі.

Але як можна змерыць нязмерныя людскія страты, слёзы матак і сірот? За тры гады акупацыі нямецка-фашысцкія захопнікі расстралялі і па-зверску замучылі тысячы мірных грамадзян, 1375 чалавек вывезлі ў Германію.

Яшчэ ішлі баі на франтах Вялікай Айчыннай вайны, а райком партыі і выканком раённага Савета дэпутатаў працоўных прымалі тэрміновыя меры для аднаўлення жыцця ў вызваленым горадзе. Раённую партыйную арганізацыю ўзначаліў А. Б. Лабанок, выканком райсавета — Д. І. Бычкоў.

Гарсавет звярнуўся да жыхароў з просьбай прыняць актыўны ўдзел у аднаўленчых работах. І гэта знайшло разуменне з боку людзей.

Шырокае распаўсюджванне атрымаў рух чаркасаўцаў (па імені А. Чаркасавай, брыгада якой добраахвотна і бясплатна ў свабодны час працавала на аднаўленні Сталінграда). Ініцыятарамі стварэння такіх фарміраванняў у Горках выступілі рабочыя арцелі «Прагрэс», якія абавязаліся адпрацаваць на аднаўленні горада па 10 дзён кожны. Чаркасаўскія брыгады вызвалілі ад развалін усе вуліцы і двары горада, сабралі 180 тыс. штук цэглы.

У час расчысткі руін былі выяўлены міны, якія пакінуў вораг. Разміраваннем тэрыторыі займалася спецыяльная група. Не абышлося і без ахвяр. Загінулі інжынер-маёр К. І. Цыбульскі, радавыя В. Н. Скварцоў і І. К. Сукач.

Для будаўніцтва горада неабходна была вялікая колькасць цэглы і лесу. У верасні 1945 г. на цагельным заводзе былі адноўлены 2 печы і абпалена 48 тыс. штук цэглы. На далейшае расшырэнне вытворчасці дзяржава выдзеліла прадпрыемству 317 тыс. рублёў.

Раён паспяхова выканаў план па лесанарыхтоўках.

Да канца 1945 г. увайшлі ў строй хлебазавод, прамкамбінат, малочны завод, арцелі «Прагрэс», «Харчавік», раённая друкарня і электрастанцыя.

У райцэнтры пачалі працаваць дзве школы, а таксама бальніца і паліклі-



Вучэбны корпус БСГА, 1944 г.

ніка, Дом сацыялістычнай культуры.

У кастрычніку 1945 г. адкрыўся дзіцячы дом на 130 чалавек. Жыхары горада сабралі для дзяцей-сірот прадукты харчавання і цёплае адзенне. А работнікі Горацкага райкома партыі ў снежні 10 % зарплаты пералічылі ў фонд выхаванцаў дзіцячага дома.

Прымаліся меры для хуткага пад'ёму сельскай гаспадаркі раёна. У першыя ж месяцы пасля вызвалення было арганізавана 160 калгасаў і саўгасаў, машына-трактарная станцыя. У МТС да чэрвеня 1945 г. ужо дзейнічалі майстэрні, гараж, кузня, мелася 22 трактары і 2 грузавыя машыны. Пачалі працаваць курсы па падрыхтоўцы трактарыстаў.

У верасні 1945 г. камсамольцы раёна адпрацавалі ўдарную пяцідзёнку ў гонар юбілею камсамола Беларусі. 93 камсамольска-маладзёжныя брыгады, 112 камсамольскіх пастоў па ахове ўраджаю выйшлі ў поле. Прыклад у працы паказвалі трактарыст Горацкай МТС Тарас Ларковіч (узнагароджаны Ганаровай граматай ЦК ЛКСМБ) і вучаніца 7-га класа Панкратаўскай васьмігадовай школы Ганна Капусціна, якая зжынала штодзённа па 0,25 га жыта. Камсамольцы азелянялі двары і вуліцы, будавалі клубы і бібліятэкі, дамы для тых, хто жыў у зямлянках. Моладзь вёскі Хамінічы пабудавала пасёлак і назвала яго Камсамольскім. За актыўны ўдзел у аднаўленні раёна ў 1945 г. ЦК ВЛКСМ узнагародзіў камсамольскую раённую арганізацыю Ганаровай граматай.

26 мая 1946 г. на будоўлях горада адбыўся суботнік, на якім працавала 337 чалавек. 7 ліпеня прайшоў суботнік па аднаўленню і расшырэнню цагельнага завода.

У горадзе шырокі размах атрымала сацыялістычнае спаборніцтва. Ініцыятарамі рацыяналізатарскага руху сталі працаўнікі льнозавода.

На раённай сельскагаспадарчай выстаўцы, якая адкрылася 15 кастрычніка 1950 г., былі падведзены вынікі развіцця сельскай гаспадаркі за гады чацвёртай пяцігодкі. Адзначалася, што ў выніку павелічэння пасяўных плошчаў і росту ўраджайнасці валавы збор збожжавых культур у 1950 г. дасягнуў 277,7 % ад узроўню 1945 г. Пагалоўе буйной рагатай жывёлы ў параўнанні з 1940 г. вырасла на 65 %, свіней на 166 %, авечак на 146 %. Лепшымі з 59 узбуйненых калгасаў былі прызнаны гаспадаркі «Шлях сацыялізма», «Культура», імя С. М. Кірава, імя С. М. Будзёнага.

Адначасова актыўна вялося будаўніцтва жылля, школ, медыцынскіх і культурных устаноў. У 1950 г. у раёне налічвалася 88 школ, працавалі 444 настаўнікі, 18 урачоў, 22 фельчары, 48 медыцынскіх сясцёр. Дзейнічала 110 бібліятэк, 15 хат-чытальняў, 14 калгасных клубаў, раённы Дом культуры, кінатэатр, пяць кінаперасовак.

У сотні кватэр былі праведзены радыё і электрычнасць. Адразу пасля вайны было прынята рашэнне аднавіць работу Беларускага сельскагаспадарчага інстытута. Для гэтай мэты дзяржава выдзеліла 2 млн рублёў, прыборы, машыны і падручнікі. У канцы 1945 г. на першы курс было прынята 105 чалавек і 100 вярнулася да вучобы.

Студэнты, выкладчыкі, тэхнічны персанал рабілі рамонт у карпусах, інтэрнатах, выраблялі мэблю, вучэбнае абсталяванне. Дзякуючы гэтаму заняткі ў інстытуце пачаліся першага снежня 1945 г.

Першы пасляваенны выпуск налічваў усяго 9 чалавек. Сярод іх быў А. А. Калікінскі, пазней доктар сельскагаспадарчых навук, прафесар, загадчык кафедры. А бібліятэка інстытута сваім адраджэннем была абавязана дырэктару Дз. Новікаву (гл. матэрыял «Адданасць кнізе»).

У кастрычніку 1948 г. сельскагаспадарчы інстытут быў пераўтвораны ў акадэмію. З'явіліся новыя факультэты: гідрамеліярацыйны і эканамічны, завочнае аддзяленне, курсы павышэння кваліфікацыі. У канцы пяцігодкі ў акадэміі вучылася ўжо 1523 студэнты.

У 1954 г., калі пачалося асваенне цалінных і залежных зямель, моладзь раёна не засталася ўбаку.

Лепшыя з пасланцоў Горацкага раёна за асваенне цалінных зямель былі адзначаны высокімі ўзнагародамі Радзімы. Механізатар І. Л. Крупскі быў удастоены высокага звання Героя Сацыялістычнай Працы. Ордэн Леніна атрымаў Б. І. Латушкін, які 10 год працаваў дырэктарам саўгаса.

У 50-я гады значна пашырылася ў Горках капітальнае будаўніцтва. Былі ўзведзены будынкі універмага, гасцініцы, канторы Дзяржбанка, сярэдняй школы № 2, раённага камітэта КПБ, вучэбнага корпуса факультэта механізацыі, інтэрната на 427 чалавек сельскагаспадарчай акадэміі. У горадзе адкрылася некалькі новых магазінаў, будаваліся шматпавярховыя жылыя дамы, развівалася індывідуальная забудова. У 1957 г. у Горках з'явілася 9 новых вуліц. Толькі будаўнікі здалі 18 аб'ектаў.

У 1957 г. у раёне працавалі 82 агульнаадукацыйныя і адна музычная школы. У іх вучылася 6980 вучняў і выкладала больш чым 500 настаўнікаў. У гэтым жа годзе адкрыўся раённы Дом піянераў. У горадзе працавалі дзве бібліятэкі, у вёсках — сорак. У іх фондах налічвалася каля 100 тыс. кніг. Быў пабудаваны кінатэатр «Мір». Усяго ў раёне працавала 6 стацыянарных і 10 перасовачных кінаўстановак.

Здача збожжа дзяржаве. Калгас «Праўда», 1951 г.

Пасвячэнне ў студэнты БСГА.

Неблагія паказчыкі мелі працаўнікі сельскай гаспадаркі. Даход калгасаў у 1957 г. узрос у параўнанні з 1953 г. у 3,3 раза. У раёне працавала 213 трактароў, 102 збожжаўборачныя камбайны, 140 аўтамашын. Горацкая МТС выйшла пераможцай сацыялістычнага спаборніцтва сярод іншых машынна-трактарных станцый.

Актыўна нарошчвала ў пасляваенныя гады вучэбны патэнцыял БСГА (гл. артыкул «З гісторыі акадэміі»).

Паступова мяняўся знешні воблік раённага цэнтра. На галоўнай магістралі горада — вуліцы І. І. Якубоўскага, якую ў самым пачатку перасякае рака Парасіца — разлілося прыгожае возера, паявіліся Дом быту і школа, Дом сувязі, гасцініца, аптэка, універмаг.

Пабудаваны таксама новы мост праз раку Капылку. Цэнтральная вуліца злучана з Вакзальнай, а на месцы былога рынку сфарміраваўся адміністрацыйны цэнтр горада — плошча імя У. І. Леніна. У цэнтральнай частцы Горак сканцэнтраваны адміністрацыйныя, грамадскія, культурна-бытавыя і відовішчныя ўстановы, а таксама шматпавярховыя жылыя дамы. Тут размясціліся Дом Саветаў, Інфармацыйна-вылічальны цэнтр, гастраном, кафэ, бюро падарожжаў і экскурсій, Дом абрадаў.

Уздоўж вуліцы Вакзальнай раскінулася прыгожая алея Перамогі, якая была пасаджана 9 мая 1946 г. На правым баку вуліцы ў апошнія гады вырас новы мікрараён.

З 1983 г. Горкі сталі горадам абласнога падпарадкавання. На 1 студзеня 1991 г. тут пражывала 30,2 тыс. чалавек.

У раёне чыгуначнай станцыі Пагодзіна яшчэ ў гады першых пяцігодак сфарміравалася прамысловая зона. Там былі пабудаваны льнозавод, масласырзавод, прамкамбінат.

У апошнія гады істотна змяніўся Горацкі льнозавод — адзін з буйнейшых у вобласці — на базе якога створана адкрытае акцыянернае таварыства «Горкі — Лён». Тут узведзены новыя карпусы, устаноўлена сучаснае абсталяванне, пачаў дзейнічаць цэх па прамысловаму прыгатаванню трасты з ільносаломкі, дзе ўкаранёна сістэма аўтаматычнага кіравання працэсам. На прадпрыемстве выраслі вопытныя кадры.

Адкрытае акцыянернае таварыства «Горацкі масларобны сыраробны завод» пастаўляе сваю прадукцыю ў Мінск і іншыя гарады.

Больш за восем назваў прадукцыі выпускае Горацкі завод напіткаў. Вырабляюць гэтую салодкую прадукцыю сапраўдныя майстры сваёй справы.

У апошнія гады завод пачаў вырабляць цукеркі, гадаваць рыбу, вырошчваць грыбы, адкрыў фірменную краму.

Значнае месца ў эканоміцы горада займае завод жалезабетонных вырабаў, прадукцыя якога ідзе на будоўлі ўсёй Магілёўскай вобласці.

У кастрычніку 1984 г. на базе Горацкага ўчастка Шклоўскага мэблевага аб'яднання быў створаны камбінат будаўнічых матэрыялаў. Ён выпускае цэглу, дзвярныя і аконныя блокі, тару, камплектуючыя дэталі для аршанскага завода «Легмаш», тавары шырокага ўжытку. Калектыў камбіната састаўля-

На Горацкім масласырзаводзе.



юць у асноўным вопытныя рабочыя, настаўнікі моладзі, якія аддалі прадпрыемству шмат год свайго жыцця. У 11-й пяцігодцы былі здадзены ў эксплуатацыю кінатэатр «Крыніца» на 420 месц, Дом быту па вуліцы Калініна, камбінат грамадскага харчавання, гарадскі стадыён. Значна вырас жыллёвы фонд Горак, які складае 300 тыс. квадратных метраў.

У 1990 г. будаўнічыя арганізацыі горада ўвайшлі ў аб'яднанне «Горкісельбуд».

Паступова рашаюцца пытанні жыллёва-камунальнай гаспадаркі горада, адукацыі, сувязі. На базе кацельняў горада створана аб'яднанне. Гэта дало магчымасць палепшыць забеспячэнне гарачай вадой большасці шматпавярховых дамоў.

Здадзена ў эксплуатацыю сярэдняя школа на 1726 месц, пятая па ліку, гасцініца.

У раёне працуе 16 сярэдніх, 8 няпоўных сярэдніх і 11 пачатковых школ, Дом піянераў, станцыя юных натуралістаў і дзіцяча-юнацкая конна-спартыўная школа.

Пашырылася матэрыяльная база аховы здароўя. Пабудавана новая раённая паліклініка на 375 наведванняў, працуе аддзяленне прафілактыкі. Усеагульнай дыспансерызацыяй ахоплена каля 90 працэнтаў насельніцтва. Раён абслугоўваюць 122 урачы, больш чым 400 фельчараў і медсясцёр.

Развіваецца паштовая сувязь.

Для ўдасканальвання тэлефоннай сувязі ў новым памяшканні пошты змацавана АТС на 4 тыс. нумароў. А пасля ўводу ў строй у Магілёве квазіэлектроннай станцыі «Кварц» усе абаненты Горак атрымалі магчымасць званіць у іншыя гарады нашай краіны і СНД па аўтаматычнай тэлефоннай сувязі.

У 1980—94 гг. значна пашырылася гандлёвая сетка раёна, плошча магазінаў павялічылася больш чым на тысячу квадратных метраў. Горад упрыгожыў новы комплекс «Парнас», які ўключае рэстаран, кафэ і магазін кулінарыі.

У раёне дзейнічае 9 дамоў культуры, 18 сельскіх клубаў, 31 бібліятэка, 8 музычных школ, 3 музеі. Усё гэта стварае неабходныя ўмовы для актыўнага ўдзелу жыхароў раёна ў культурным жыцці, выяўлення народных талентаў.

Папулярнымі ў горадзе і раёне сталі святы вёсак і вуліц, ярмаркі, тэатралізаваныя відовішчы.

Заняткі ў школе мастацтваў.

На святе «Грай, гармонік».

У горадзе, на тэрыторыі сельскіх Саветаў працуюць стадыён, 15 спартыўных залаў, 2 плавальныя басейны, 16 стралковых ціраў, 125 спартыўных пляцовак.

Жыхары раёна могуць карыстацца паслугамі Горацкага бюро падарожжаў і экскурсій. З Горак экскурсійныя маршруты вядуць у Маскву, Санкт-Пецярбург, Мінск і іншыя гарады. Штогод бюро абслугоўвае некалькі тысяч чалавек.

Пасля ўтварэння суседняга Дрыбінскага раёна (1989) у Горацкім засталося 11 калгасаў і 6 саўгасаў. На працягу 1993—95 гг. раён з'яўляецца лідэрам рэспублікі па вытворчасці малака, іншых сельскагаспадарчых культур. Па выніках за 1995 г. Горацкаму раёну прысуджаны тры першыя месцы ў Магілёўскай вобласці — за павялічэнне вытворчасці і продаж дзяржаве збожжа, ільну і бульбы з уручэннем прэмій па 17 мільёнаў рублёў за кожны від прадукцыі.

Сярод гаспадарак вобласці два першыя месцы па вытворчасці малака і кармоў заняў племсаўгас імя Чкалава.

У раёне вядзецца пошук новых форм гаспадарання, якія больш адпавядаюць перыяду пераходу да рыначных адносін. Вучонымі БСГА Э. А. Пятровічам, М. З. Фрэйдзіным, А. М. Каганам, практыкам А. П. Герасімавым распраца-

Святкаванне 125-годдзя Горак.



ваны праекты рэфармавання сельскай гаспадаркі. Пад іх кіраўніцтвам у 1990 г. на базе калгаса імя Свярдлова створана сельскагаспадарчае аб'яднанне, куды ўвайшло пяць сельскагаспадарчых кааператываў, а працаўнікі гаспадаркі сталі акцыянерамі.

Павялічваецца колькасць фермерскіх гаспадарак. У 1993 г. іх было 28, а ў 1995 г. стала 33, і яны апрацоўваюць 1053 га зямлі.

У прамысловасці і будаўніцтве ствараюцца акцыянерныя таварыствы, малыя і арэндныя прадпрыемствы. Калектывы гэтых прадпрыемстваў асвойваюць нетрадыцыйныя віды прадукцыі, шукаюць новыя рынкі збыту, удасканальваюць тэхналогію.

У раёне пачалі працаваць філіялы рэспубліканскіх банкаў «Белбізнесбанка», «Прамбудбанка», «Аграпрамбанка», «Прыорбанка» і банка «Дукат». У горадзе і на вёсцы ўзнікла каля сотні прыватных крам і ларкоў. Некаторыя прадпрыемствы горада, калгасы і саўгасы пачалі таксама адкрываць свае фірменные крамы.

У той ці іншай ступені змены закранулі і другія сферы жыцця.

У Горках, на базе сярэдняй школы № 5 адкрылася першая гімназія з мастацкім ухілам, ліцэйныя класы ў сярэдняй школе № 4. У школе № 1 пачалі працаваць харавы і харэаграфічны класы, пазнавальна-творчыя аб'яднанні «Клуб аматараў мастацтва», «Гартаючы старонкі гісторыі», «Гаспадынька» і іншыя. У 1993 г. адчыніла дзверы станцыя тэхнічнай творчасці. Раённы гісторыка-этнаграфічны музей адчыніў чатыры філіялы ў вёсках Маслакі, Аўсянка, Копцеўка і Леніна. Пры музеі працуюць тры аб'яднанні, якія збіраюць аматараў літаратуры, гісторыі і мастацтва. Лепту ў культурна-нацыянальнае адраджэнне ўносяць таварыствы беларускай мовы, краязнаўчае, навукова-асветніцкае «Рунь» імя М. Гарэцкага.

У пачатку 90-х г. у раёне зроблены першыя крокі на шляху шматпартыйнасці — тут функцыянiруюць партыя камуністаў Беларусі, Беларуская сацыял-дэмакратычная грамада, Беларускі народны фронт, аграрная партыя, Саюз моладзі Беларусі. Гарадскі клуб выбаршчыкаў аб'ядноўвае прыхільнікаў дэмакратычнага накірунку.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё ў перыяд пераходу да рыначнай эканомікі носіць складаны і супярэчлівы характар. Пабудова незалежнай, суверэннай дзяржавы — адказны момант у жыцці народа — адкрывае новую старонку ў шматвекавой гісторыі раёна.

У. Ліўшыц.

Будавалі дамы

З успамінаў М. М. Бранавіцкага, былога сакратара райкома камсамола

Калі горад і раён былі вызвалены ад акупантаў з падрыўнікоў-партызан стварылі групу па размініраванню будынкаў акадэміі і горада. У хуткім часе ў калгасах, на аднаўляемых прадпрыемствах і ва ўстановах былі створаны пярвічныя камсамольскія арганізацыі. Яны мабілізавалі сілы моладзі на аднаўленне разбуранай гаспадаркі. У вёсках раёна больш 4-х тыс. сем'яў жыло ў зямлянках. Камсамольцы і моладзь вёсак Ліхачова, Пална, Палёнка, Тушавая, Сялец выступілі ініцыятарамі стварэння камсамольска-маладзёжных будаўнічых брыгад. У першую чаргу будавалі дамы сем'ям загінуўшых воінаў Чырвонай Арміі і партызан, інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны, франтавікоў. Моладзь вёскі Хамінічы адбудавала пасёлак, які і зараз носіць назву «Камсамольскі».

22 лютага 1945 г. адбылася раённая камсамольская канферэнцыя, першая пасля вызвалення тэрыторыі раёна. Прысутнічала 97 дэлегатаў ад 64 камсамольскіх арганізацый, якія аб'ядноўвалі каля 600 членаў ВЛКСМ. Яна прайшла пад лозунгам: «Працоўнымі подзвігамі азнамянуем канчатковую перамогу над фашызмам».

28 мая 32 члены прамарцелі «Прагрэс», аб'яднаныя ў 4 брыгады, пасля працоўнага дня выйшлі на добраўпарадкаванне роднага горада па прыкладу Аляксандры Чаркасавай. Брыгады працавалі пасля рабочага дня 2 гадзіны. Было выбрана з руін і складзена больш чым 2 тыс. цаглін.

17 чэрвеня на нядзельнік, арганізаваны гарсаветам і РК ЛКСМБ па добраўпарадкаванню брацкіх магіл, дзе пахаваны расстраляныя і замучаныя фашыстамі савецкія людзі, выйшла 150 чалавек. У гэты дзень адбыўся агульнагарадскі мітынг, прысвечаны ўзнагароджанню ВЛКСМ ордэнам Леніна.

Уборка ўраджаю 1945 г. з'явілася новай праверкай арганізаванасці і баяздольнасці арганізацый. Камсамольцы сталі ініцыятарамі стварэння маладзёжных звенняў жней, малацільных і транспартных брыгад. Усяго на ўборцы працавала 93 камсамольска-маладзёжныя звяны жней, у якія ўваходзіла 512 дзяўчат, 46 малацільных і больш за 60 транспартных брыгад, 112 пастоў па ахове ўраджаю.

Па старонках раённай газеты «Ленінскі шлях»

9 лютага 1946 г.

За перыяд пасля вызвалення ад акупацыі калгаснікі Ленінскага сельсавета адбудавалі 164 дамы, 30 грамадскіх пабудоў, нарыхтавалі звыш 600 кубаметраў лесаматэрыялу для будаўніцтва дамоў калгаснікам. 44 сям'і калгаснікаў уселена ва ўноў адбудаваныя дамы ў Ліхачоўскім сельсавеце і заканчваецца яшчэ будаўніцтва 24 дамоў. Акрамя гэтага тут нарыхтавана і вывезена 1153 кубаметры лесаматэрыялу. У калгасе «Чырвоны сцяг» Горскага сельсавета на папялішчах адбудаваны 51 дом і 3 калгасныя пабудовы.

У калгасе «Перамога» будаўнічая брыгада тав. Гарохава адбудавала 15 саманных дамоў для калгаснікаў — сямей воінаў Чырвонай Арміі.

У выніку праведзенай работы ў раёне адбудавана і адноўлена 2432 дамы, у якія ўселена 3560 сямей калгаснікаў, пабудавана 550 грамадскіх пабудоў, зрублена 200 зрубаў, нарыхтавана і вывезена 6126 кубаметраў лесаматэрыялу. 141 будаўнічая брыгада, у якіх працуе 843 плотнікі, прадаўжаюць будаўнічыя работы.

Сотні тысяч рублёў выдана дзяржавай на будаўніцтва двароў калгаснікаў. Сем'і франтавікоў, партызан і інвалідаў ВАВ бясплатна атрымліваюць лесаматэрыял...

28 ліпеня 1946 г.

Каштоўная ініцыятыва трактарыстаў Горскай МТС

Горская МТС, атрымаўшы трактары «наці», не магла поўнасцю выкарыстаць іх магутнасць з-за адсутнасці плугоў, забяспечваюшчых поўную нагрузку машыны. Чатырох-

корпусныя плугі, прызначаныя для калёснага трактара, не даюць поўнай нагрузкі на машыну, што прыводзіць к перарасходу гаручага.

Брыгадзір трактарнай брыгады т. Фралоў, абмеркаваўшы з трактарыстамі гэта пытанне, рашыў сіламі брыгады зрабіць шасцікорпусныя плугі, з 2 мятровым захватам. Праз некалькі дзён дзякуючы напружанай працы трактарыстаў тт. Зайцава і Рэчыцкага і брыгадзіра т. Фралова плугі былі гатовы. Работа гэтымі плугамі паказала, што апрацоўка глебы імі выдатная, пры тым трактар дае вялікую эканомію гаручага.

Ініцыятыву трактарыстаў брыгады т. Фралова падхапілі і іншыя брыгады МТС.

Трактарыст брыгады № 3 т. Мачульскі зрабіў к сваей машыне шасцікорпусны плуг і трактарыст т. Паштовы — пяцікорпусны. Вялікую дапамогу ў гэтай рабоце аказаў трактарыстам старшы механік МТС т. Іваноў.

25 сакавіка 1948 г.

Клопаты аб інвалідах Айчыннай вайны і сем'ях загінуўшых воінаў

Раённы аддзел сацыяльнага забяспячэння выдаў за 1-шы квартал бягучага года 3530 рублёў дапамогі інвалідам Айчыннай вайны і сем'ям загінуўшых воінаў. Калгасныя касы ўзаемадапамогі выдалі гэтым сем'ям 2110 кілаграмаў хлеба.

6 інвалідаў Айчыннай вайны ў гэтым годзе атрымалі пуцёўкі на санаторна-курортнае лячэнне.

1 мая 1948 г.

Падарунак дзецям-сіротам

Калгас «Палітаддзелец» Кацялёўскага сельсавета перадаў у чэсць свята Першага Мая Горацкаму спецдзетдому 400 кілаграмаў бульбы і 32 кілаграмы ячменю. Асабіста калгаснікі правялі збор грошай на падарункі дзецям-сіротам.

1 чэрвеня 1955 г.

Аўтамашыны для калгасаў

За праданую дзяржаве прадукцыю сельскай гаспадаркі калгас «17 партз'езд» набыў у гэтым годзе дзве аўтамашыны. Па адной аўтамашыне набылі сёлета таксама 12 другіх калгасаў раёна. Сярод іх калгасы імя Маленкова, «Звязда», імя Кірава, «Бальшавік», імя Чкалава і другія.

21 лютага 1965 г.

Узнагароды ўручаны

За мужнасць і гераізм, праяўленыя ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны 1941—1945 гг., Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР Указам ад 9 мая 1965 года ўзнагародзіў групу партызан, якія дзейнічалі на тэрыторыі раёна. Гэтымі днямі старшыня райвыканкома тав. Гусеў Г. С. уручыў ордэны і медалі ўзнагароджаным. Ордэн Айчыннай вайны I ступені ўручан на захоўванне былому камандзіру партызанскага атрада А. З. Васільеву. Гэтым ордэнам узнагароджана пасмяротна яго маці — слаўная партызанка Ульяна Піліпаўна Васільева. Былой партызанцы Вользе Ермалаеўне Сафронавай уручаны ордэн Айчыннай вайны 2-й ступені.

5 чалавек узнагароджаны медалём «За адвагу» і 9 чалавек — медалём «За баявыя заслугі».

Падрыхтавалі В. Белавусава, С. Кротава, М. Студнева, Т. Поклад.

Адданасць кнізе



Дз. Р. Новікаў.

Дзям'ян Раманавіч Новікаў нарадзіўся ў 1886 г. у вёсцы Шапялёўка Горацкага павета. У 1913 г. паступіў у Горацкае каморніцка-агранамічнае вучылішча. Пад яго кіраўніцтвам узнік гурток самаадукацыі імя М. Я. Рубакіна — вядомага рускага кнігазнаўцы, бібліёграфа і пісьменніка. Новікаў нават напісаў яму ліст у Лазану з просьбай дапамагчы парадай. Хутка прыйшоў адказ і нават літаратура. Адміністрацыя вучылішча хацела забараніць дзейнасць гуртка Новікова, але пачалася рэвалюцыя.

З 1919 г., моманту адраджэння Горацкага інстытута, дырэктарам яго бібліятэкі становіцца Дз. Р. Новікаў.

У той час у інстытуце выдаваўся часопіс «Голас рэвалюцыйнага студэнцтва». У ім юнак пісаў: «Перш за ўсё асноўная мэта самаадукацыі... зрабіцца чалавекам адукаваным у шырокім сэнсе слова». Дзеля гэтай мэты патрэбна было шмат кніг. І ён нястомна збірае іх, арганізуе бясплатны кнігаабмен не толькі з буйнымі бібліятэкамі Масквы, Ленінграда, але з некаторымі замежнымі. Да 1940 г. у бібліятэцы інстытута было сабрана больш за 650 тысяч тамоў.

У сувязі са стагоддзем Беларускага сельскагаспадарчага інстытута група выкладчыкаў і супрацоўнікаў была адзначана дзяржаўнымі ўзнагародамі. Дзям'яну Раманавічу Новікаву быў уручаны медаль «За працоўную адзнаку».

Вайна перашкодзіла яму абараніць дысертацыю. З першых яе дзён Дз. Р. Новікаў пайшоў на фронт, дзе камандаваў будаўнічым батальёнам, быў намеснікам камандзіра палка.

Улетку 1944 г. ён даведаўся аб тым, што бібліятэку ў Горках эвакуіраваць не ўдалося. Прыехаў нямецкі прафесар, адабраў самыя каштоўныя кнігі. Яны былі складзены ў абабітыя белай бляхай вялікія скрынкі з надпісам «Уласнасць Рэйха». Астатнія было загадана спаліць. Гарэлі яны тры дні і тры ночы. Скураныя пераплёты, нацягнутыя на дубовыя дошкі, тлелі, дыміліся, зляжалыя за стагоддзі сшыткі толькі абсмальваліся і скручваліся. Тады іх аблілі бензінам, а будынак бібліятэкі ўзарвалі.

Калі Дзям'ян Раманавіч даведаўся аб гэтым, то пачаў шукаць сляды вывезеных кніг. Напісаў у некалькі франтавых газет. З цягам часу ў адрас акадэмічнай бібліятэкі пачалі прыходзіць пісьмы і бандэролі. «Пасылаем чатыры пасылкі з вашымі кнігамі, знойдзенымі ў Заходняй Прусіі 8 лютага 1945 года» — пісалі байцы і афіцэры часці пад камандаваннем палкоўніка В. А. Гусева.

Калі полк, у якім ваяваў Дз. Р. Новікаў, змагаўся на нямецкай зямлі, Дзям'яну Раманавічу паведамілі, што ў падвале аднаго буйнога маёнтка знайшлі шмат скрыняў з кнігамі і іншымі каштоўнасцямі, вывезенымі фашыстамі з Беларусі. Дз. Р. Новікаў з салдатамі знайшоў гэты маёнтак. Вялізны падвал быў запоўнены скрынямі. Хвалюючыся раскрыў адну з іх і дастаў кнігу. Знаёмы штамп «Бібліятэка Беларускага сельгасінстытута». Узяў яшчэ адну, потым яшчэ — усе кнігі былі з яго бібліятэкі.

Дзям'ян Раманавіч папрасіў камандаванне, каб каля падвала паставілі варту, а сам напісаў пісьмо ў ЦК КПБ, Прэзідыум Акадэміі навук БССР і Ваенны савет Арміі. Праз некалькі дзён кнігі былі перавезены ў Беларусь, а маёр Дз. Р. Новікаў атрымаў удзячнае пісьмо ад прэзідэнта Акадэміі навук БССР К. В. Горава. На жаль, са знойдзеных кніг у бібліятэку інстытута вярнулася толькі каля 800 тамоў, астатнія размеркавалі ў іншыя бібліятэкі.

У 1946 г. Дз. Р. Новікаў дэмабілізаваўся і вярнуўся ў родныя Горкі. Шмат хто памятае, як ля ўзарванага фашыстамі будынка стаяў малады афіцэр і плакаў. Тут жа ён даў клятву адрадзіць бібліятэку. Дзякуючы яго настойлівасці і старанню ўжо праз год будынак бібліятэкі быў адноўлены і ў ім да 7 лістапада 1947 г. налічвалася каля 100 тыс. тамоў. На асабістыя сродкі

Дз. Р. Новікаў заказваў стэлажы, паліцы, шафы. На працягу некалькіх месяцаў ён працаваў у Дзяржлітфондзе, выбіраў неабходныя кнігі, пасылаў сотні пісем у бібліятэкі розных ВНУ і навуковых устаноў з просьбай падзяліцца фондамі з бібліятэкай інстытута ў Горках.

Прайшло некалькі гадоў і ў цалкам адноўленай бібліятэцы ўжо налічвалася каля мільёна кніг. У 1965 г. Дзям'яну Раманавічу было прысвоена ганаровае званне заслужанага дзеяча культуры БССР.

Аб жыццёвым подзвігу гэтага чалавека напамінае мемарыяльная дошка, устаноўленая ў 1980 г. каля ўвахода ў будынак акадэмічнай бібліятэкі. На ёй адлюстраваны барэльеф Дз. Р. Новікава, кнігі і ружы. Чаму ружы? Нароўні з бібліятэчнай справай гэты чалавек увесь свабодны час аддаваў кветкам — больш паўвека загадваў паркавай гаспадаркай акадэміі.

Памёр Дзям'ян Раманавіч 31 студзеня 1976 г.

У. Ліўшыц.

Героі Сацыялістычнай Працы

АНЮХОЎСКАЯ Аляксандра Антонаўна. Нарадзілася 31.08.1920 г. у в. Клімацічы Горацкага раёна. У 1966—75 гг. даярка саўгаса «Камуніст». Званне Героя Сацыялістычнай Працы прысвоена ў 1966 г. за поспехі ў развіцці жывёлагадоўлі, павялічэнні вытворчасці і нарыхтовак сельскагаспадарчых прадуктаў.

АФІЦЭРАЎ Пётр Іванавіч. Нарадзіўся 18.8.1928 г. у в. Стрыкілі Горацкага раёна. З 1944 г. працаваў у калгасе «Шлях Леніна». У 1966 г. прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы.

БАЛАБАВА Аляксандра Кірылаўна. Нарадзілася 16.4.1928 г. у в. Калінаўка Горацкага раёна. З 1944 г. працавала ў калгасе імя У. І. Леніна, з 1953 г. звеннявая па вырошчванню льну. У 1966 г. за высокія паказчыкі ў вытворчасці і нарыхтоўцы льну прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы.

БЕЛЬСКІ Рыгор Васілевіч. Нарадзіўся 6.8.1929 г. у в. Цярэсіна Бярэзінскага раёна. У 1960 г. скончыў БСГА. З 1953 г. працаваў аграномам Бярэзінскай МТС, калгаса імя Крупскай Бярэзінскага раёна. З 1955 г. у Горацкім раёне: аграном, намеснік старшыні калгаса імя Кірава, кіраўнік аддзялення вучэбна-доследнай гаспадаркі БСГА, затым старшыня калгаса «Запаветы Ільіча». З 1979 г. старшыня Горацкага раённага камітэта народнага кантролю. Званне Героя Сацыялістычнай Працы прысвоена ў 1971 г. за поспехі ў развіцці сельскагаспадарчай вытворчасці.

ГАЛУХІН Якаў Іванавіч. Нарадзіўся 14.8.1930 г. у в. Сахараўка Горацкага раёна. З 1955 г. трактарыст калгаса «Праўда». Заслужаны механізатар БССР (1978). Званне Героя Сацыялістычнай Працы прысвоена ў 1981 г. за поспехі ў сацыялістычным спаборніцтве і працоўную доблесць.

ГАЎРЫЛЕНКА Еўдакія Малахаўна. Нарадзілася 14.8.1915 г. у в. Кварцяны Го-

А. А. Анюхоўская.



П. І. Афіцэраў.

А. К. Балабава.

Р. В. Бельскі.

Я. І. Галухін.

Е. М. Гаўрыленка.

Г. Д. Каліва.

І. І. Мельнік.

рацкага раёна. З 1945 г. старшыня калгаса «Чырвоная Беларусь», у 1947—78 гг. даярка, загадчык фермы, кладаўшчык калгаса імя Жданава Горацкага раёна. Званне Героя Сацыялістычнай Працы прысвоена ў 1966 г. за поспехі ў жывёлагадоўлі, павелічэнні вытворчасці і нарыхтовак мяса і малака. Узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі.

КАЛІВА Ганна Данілаўна. Нарадзілася 25.7.1915 г. у в. Каменка Горацкага раёна. З 1939 г. трактарыстка, у 1950—70 гг. брыгадзір трактарнай брыгады Горацкай МТС, калгасаў «Савецкая Беларусь» і «50 гадоў БССР» Горацкага раёна. Званне Героя Сацыялістычнай Працы прысвоена ў 1960 г. за поспехі ў сацыялістычным спаборніцтве і працоўную доблесць. Выбіралася дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР, заслужаны механізатар сельскай гаспадаркі БССР (1963).

КЛІМАЎ Міхаіл Трафімавіч. Нарадзіўся 3.1.1929 г. у в. Міхайлавічы Горацкага раёна. З 1960 г. працаваў памочнікам майстра Аршанскага льнокамбіната. Заслужаны настаўнік рабочай моладзі (1978). У 1976 г. прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы.

МЕЛЬНІК Іван Ігнацьевіч. Нарадзіўся 21.1.1927 г. у в. Мікулічы Бабруйскага раёна. Скончыў агранамічны факультэт БСГА. З 1959 г. старшыня калгаса «17 партз'езд». Узнагароджаны двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнамі «Знак Пашаны», Кастрычніцкай рэвалюцыі. У снежні 1985 г. удастоены звання Героя Сацыялістычнай Працы і ўзнагароджаны ордэнам Леніна.

Узнагароджаныя ордэнам Леніна

АКУЛЁНАК Ганна Сяргееўна. Нарадзілася ў 1929 г. у в. Стрыкілі Горацкага раёна. Працоўную дзейнасць пачала ў калгасе «Другая пяцігодка» конюхам. З 1950 г. на Аршанскім ільнокамбінаце, з 1952 г. у калгасе «Шлях Леніна» звеннявая па вырошчванню льну, даярка, цялятніца. У 1966 г. узнагароджана ордэнам Леніна. Пераможца Усесаюзнага сацыялістычнага спаборніцтва ў 1977, 1978, 1980 гадах.

АНЮХОЎСКАЯ Аляксандра Самуйлаўна. Нарадзілася ў 1923 г. у в. Клімацічы Горацкага раёна. Працавала даяркай у саўгасе «Камуніст» (цяпер саўгас «Старасельскі»). У 1966 г. узнагароджана ордэнам Леніна.

АНЮХОЎСКАЯ Надзея Антонаўна. Нарадзілася ў 1932 г. у в. Клімацічы Горацкага раёна. Працавала ў калгасе імя Ракасоўскага, саўгасе «Камуніст» (цяпер саўгас «Старасельскі») даяркай. Без адрыву ад вытворчасці закончыла Клімавіцкі зааветтэхнікум і ўзначальвала брыгаду, аддзяленне. Узнагароджана ордэнамі Леніна (1966), Працоўнага Чырвонага Сцяга (1975).

БАСЯКОВА Ефрасіння Мікалаеўна. Нарадзілася 7.11.1927 г. у в. Бася Горацкага раёна. З 1944 г. працавала ў калгасе «Савецкая Беларусь» даяркай, звеннявой пасля аб'яднання гаспадаркі з суседнім калгасам «Шлях Леніна». Затым пераехала ў в. Маслакі і да пенсіі працавала ў жывёлагадоўлі, даяркай. У 1966 г. узнагароджана ордэнам Леніна.

ГАРБАЧЭЎСКІ Віктар Афанасьевіч. Нарадзіўся ў 1930 г. у в. Чысцікі Горацкага раёна. Працаваў у калгасе, з 1957 г. у саў-

гасе «Леніна» механізатарам. Узнагароджаны ордэнам Леніна.

ГУСАРАВА Варвара Канстанцінаўна. Нарадзілася 17.12.1920 г. у в. Валаўцы Горацкага раёна. Працавала ў калгасе «Перамога», пазней ва ўзбуйненым калгасе імя Леніна, пераважна ў жывёлагадоўлі. Узнагароджана ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі.

ГУСЕЎ Гурый Сяргеевіч. Нарадзіўся 25.11.1913 г. у в. Ізвекава Клепікаўскага раёна Разанскай вобласці. У 1932 г. скончыў Курскі пладоваягадны тэхнікум і працаваў аграномам, старшым аграномам, загадчыкам Тумскага райземаддзела, дырэктарам Тумскай МТС. З 1944 г. намеснік загадчыка сельгасаддзела Разанскай вобласці, першы сакратар Чумскага райкома партыі. У 1952—59 гг. першы сакратар Асіповіцкага РК КПБ. З 1959 г. першы сакратар Горацкага РК КПБ, старшыня Горацкага райвыканкома, дырэктар інкубатарнай станцыі. Узнагароджаны ордэнам Леніна (1966), трыма ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, трыма Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР, медалямі.

ДОЛЬНІКАЎ Уладзімір Усцінавіч. Нарадзіўся ў 1924 г. у в. Сахараўка Горацкага раёна. Працаваў старшынёй калгаса «Прагрэс». Узнагароджаны ордэнам Леніна.

ДРАЗДОВА Ганна Яфрэмаўна. Нарадзілася 15.2.1927 г. у в. Панкратаўка Горацкага раёна. Працавала ў калгасе «Праўда» паляводам, звеннявой па ільну. Узнагароджана ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі. Памерла 13.3.1977 г.

ЗАЙЦАВА Ганна Мікітаўна. Нарадзілася ў 1926 г. у в. Хамінічы Горацкага раёна. Працавала ў паляводстве калгаса імя Леніна, апошнія гады ў якасці звеннявой па ільну. Яе поспехі адзначаны медалямі ВДНГ. Узнагароджана ордэнамі Леніна (1973), Працоўнага Чырвонага Сцяга (1966).

ЗАЙЦАЎ Сяргей Тарасавіч. Нарадзіўся 10.77.1927 г. у в. Хамінічы Горацкага раёна. Працаваў прычэпшчыкам, машыністам МК-1100, трактарыстам, брыгадзірам трактарнай брыгады Ліхачоўскай МТС у калгасе імя Леніна. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, «Знак Пашаны» (1975), медалямі.

КАСЦЮШКІНА Надзея Дзмітрыеўна. Нарадзілася ў 1925 г. у в. Шапялёўка Горацкага раёна. З 1940 г. працавала ў калгасе «Звязда» (пазней «Шлях Леніна») ільнаводам, цялятніцай. Узнагароджана ордэнам Леніна (1949), медалямі.

КЛІМАВА Марыя Кліменцьеўна. Нарадзілася ў 1926 г. у в. Бася Горацкага раёна. Працавала жывёлаводам, ільнаводам у калгасах «Савецкая Беларусь», «Шлях Леніна». Узнагароджана ордэнам Леніна (1966), медалямі.

КОРАБАЎ Сяргей Васілевіч. Нарадзіўся 22.7.1924 г. у в. Папкоўка Горацкага раёна. Скончыў школу ФЗН у Горлаўцы Данецкай вобласці. Працаваў бухгалтарам, завочна скончыў Вышэйшую гандлёва-кааператыўную школу пры Цэнтрасаюзе спажывецкай кааперацыі, пазней Жыліцкі сельскагаспадарчы тэхнікум. У 1943—61 гг. галоўны бухгалтар райспажыўсаюза, галоўны бухгалтар калгаса імя Чкалава (Паршына), працаваў старшынёй РПС, старшынёй калгасаў імя Куйбышава, імя Кірава. У чэрвені 1961 г. С. В. Корабава выбралі старшынёй калгаса імя Леніна Горацкага раёна. За 18 гадоў старшынства ў гэтай гаспадарцы С. В. Корабаў быў узнагароджаны двойчы ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга (1966, 1971), ордэнамі Леніна (1973), Кастрычніцкай Рэвалюцыі (1976), медалямі, дзвюма Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР. Выдатнік сельскай гаспадаркі. Выбіраўся членам райкома партыі, дэпутатам райсавета многіх скліканняў.

КУХАРАЎ Мікалай Еўсцігнеевіч. Нарадзіўся ў 1930 г. у в. Паршына Кіраўскага раёна. Працаваў у калгасе імя Чкалава, у вучгасе БСГА, саўгасе імя Чкалава трактарыстам, механікам, брыгадзірам трактарнай брыгады, загадчыкам механізаванага двара, інжынерам, майстрам-наладчыкам. Узнагароджаны ордэнам Леніна (1976), ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі.

ЛАПУНОЎ Трыфан Фролавіч. Нарадзіўся ў 1905 г. у в. Смалькоўская Буда Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобл. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў на партыйнай рабоце, старшынёй калгаса, дырэктарам саўгаса. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Чырвонай Зоркі, медалямі.

ЛАТУШКІН Барыс Іванавіч. Нарадзіўся ў 1920 г. у Горках. Закончыў Омскі сельскагаспадарчы інстытут. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў аграномам Горацкай МТС, дырэктарам саўгасаў «Грудзінаўка» Быхаўскага раёна, «Прырэчанскі» Кустанайскай вобласці, «Дрыбінскі». За асваенне цалінных і залежных

зямель узнагароджаны ордэнам Леніна (1956), медалямі. Памёр у 1981 г.

ЛІТВІНАЎ Міхаіл Паўлавіч. Нарадзіўся 2.3.1923 г. у в. Тушавая Горацкага раёна. У пачатку 1948 г. аднавяскоўцы абралі яго старшынёй калгаса, з 1951 г. брыгадзір трактарнай брыгады ў в. Маслакі. Працаваў галоўным інжынерам калгаса «Шлях Леніна», брыгадзірам трактарнай брыгады калгаса «40 год Кастрычніка», загадчыкам мехмайстэрні калгаса імя Леніна. Выбіраўся дэпутатам сельскага і раённага Саветаў дэпутатаў працоўных. Узнагароджаны ордэнамі Леніна (1966), Айчыннай вайны 2-й ступені (1985), медалямі. Памёр 30.9. 1985 г.

МАКСІМАВА Ганна Пятроўна. Нарадзілася 21.1.1924 г. у в. Клін Горацкага раёна. З 1946 г. працавала ў калгасе «Шлях Леніна» — узначальвала звяно па вырошчванню лёну. Удзельнік ВДНГ СССР. Узнагароджана ордэнамі Леніна (1976), Працоўнага Чырвонага Сцяга (1972). Памерла 3.2.1987 г.

МАЛАШЭЎСКАЯ Вера Рыгораўна. Нарадзілася ў 1919 г. у в. Клімацічы Горацкага раёна. Працавала даяркай у калгасе імя Ракасоўскага (цяпер саўгас «Старасельскі»). Узнагароджана ордэнам Леніна (1966), медалямі. Памерла ў 1970 г.

МАСЦІЦКІ Аляксандр Віктаравіч. Нарадзіўся 15.7.1911 г. у в. Буда Бярэзінскага раёна Мінскай вобласці. У 1935 г. скончыў заатэхнічны факультэт БСГА і працаваў на Суражскім конезаводзе ў Віцебскай вобласці, затым у Горацкім райземаддзеле. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

Пасля вайны працаваў галоўным заатэхнікам вучгаса БСГА, галоўным заатэхнікам райсельгасупраўлення ў Горках, Асіповічах, старшынёй калгаса імя Леніна, заатэхнікам і дырэктарам дзяржплемстанцыі. За ратныя і працоўныя подзвігі ўзнагароджаны ордэнамі Леніна, Айчыннай вайны, медалямі. Памёр 23.9.1991 г.

МАЦВЕЕНКА Сяргей Мікітавіч. Нарадзіўся ў 1928 г. у в. Валынцава Горацкага раёна. Пасля вызвалення вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў працаваў у калгасе. У 1958 г. скончыў Мсціслаўскае СПТВ. З 1972 г. механік калгаса імя Свярдлова, брыгадзір трактарнай брыгады. З 1986 г. працуе начальнікам мехдвара. Узнагароджаны ордэнамі Леніна (1968), Працоўнага Чырвонага Сцяга (1972), «Знак Пашаны» (1966).

МІЗГАРОВА Вольга Апанасаўна. Нарадзілася ў 1926 г. у в. Кацялёва Горацкага раёна. Працавала ў калгасе імя Жданава (цяпер імя Пагодзіна) цялятніцай, амаль дваццаць гадоў даяркай, фуражырам. Узнагароджана ордэнамі Леніна, «Знак Пашаны», Кастрычніцкай Рэвалюцыі.

МІКАЛАЕЎ Мікалай Ягоравіч. Нарадзіўся ў 1932 г. на Смаленшчыне. Працаваў механізатарам, у жывёлагадоўлі. Пераехаў у в. Мікуліна Горацкага раёна. Працаваў у калгасе імя Пагодзіна. Узнагароджаны ордэнам Леніна.

МІРАНКОВА Пелагея Цітаўна. Нарадзілася ў 1926 г. у в. Шапялёўка Горацкага раёна. З 1944 г. працавала ў калгасе «Звязда» (пазней «Шлях Леніна») звеннявой па вырошчванню льну. З 1950 г. на аршанскім заводзе «Барэц», затым на малочным камбінаце. Узнагароджана ордэнам Леніна (1949), медалямі.

ПРУДНІКАВА Ніна Фёдараўна. Нарадзілася ў 1942 г. у в. Душкі Горацкага раёна. Працавала ў калгасе «XVII партз'езд» у жывёлагадоўлі, потым вартаўніком. Узнагароджана ордэнам Леніна.

ПЯТРОВА Марыя Міхайлаўна. Нарадзілася 5.5.1932 г. у в. Гарунькава Манастыршчынскага раёна Смаленскай вобласці. Пераехала ў Горкі і з 1956 г. да выхаду на пенсію працавала даяркай у вучгасе БСГА. Узнагароджана ордэнам Леніна, медалямі.

РАМАНЕНКА Надзея Фёдараўна. Нарадзілася 10.3.1927 г. у в. Трыгубава (цяпер Касцюшкава) Горацкага раёна. Працавала ў паляводстве, потым 28 гадоў даяркай у саўгасе «Леніна» (цяпер племзавод). Выбіралася дэпутатам Ленінскага сельскага і Горацкага раённага Саветаў народных дэпутатаў. Узнагароджана ордэнам Леніна (1966), медалямі.

САМСОНАЎ Фёдар Якаўлевіч. Нарадзіўся 3.6.1924 г. у в. Бася Горацкага раёна. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Дэмабілізаваўшыся, працаваў у Маслакоўскай школе бібліятэкарам, старшынёй Маслакоўскага сельпо. У 1959—79 гг. старшыня калгаса «Бальшавік». Некаторы час працаваў у Горацкім гаркоме партыі, старшынёй партыйнай камісіі пры гаркоме. Узнагароджаны ордэнамі Леніна (1971), Працоўнага Чырвонага Сцяга (1976), «Знак Пашаны» (1966), Айчыннай вайны (1985) і медалямі.

СНЫТКО Лідзія Міхайлаўна. Нарадзілася ў 1924 г. у в. Слабада Горацкага раёна. Працавала даяркай калгаса імя Свярдлова. Узнагароджана ордэнамі Леніна (1966), Працоўнага Чырвонага Сцяга (1975), Кастрычніцкай рэвалюцыі (1977). Памерла 25.11.1991.

СОЙКІНА Ала Амосаўна. Нарадзілася 22.5.1932 г. на Віцебшчыне. Працавала ў калгасе «XVII партз'езд» Горацкага раёна жывёлаводам. Узнагароджана ордэнам Леніна.

ЦЕРАХАЎ Апанас Паўлавіч. Нарадзіўся ў 1894 г. Працаваў рабочым паштова-тэлеграфнай сувязі, агентам Горацкага аддзялення сувязі. У 1954 г. узнагароджаны ордэнам Леніна. Памёр у 1961 г.

ЦЕРАХАЎ Іосіф Аляксеевіч. Нарадзіўся ў 1907 г. у в. Шапялёўка Горацкага раёна. З 1932 г. працаваў старшынёй калгаса «Звязда», старшынёй Маслакоўскага сельскага Савета, намеснікам дырэктара Ліхачоўскай МТС. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1947 г. старшыня калгаса «Звязда» (пазней «Шлях Леніна»). Узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі. Памёр у 1983 г.

ЦІМАНАВА Хрысціна Трафімаўна. Нарадзілася ў 1918 г. у в. Пнеўшчына Горацкага раёна. У 1971 г. узнагароджана ордэнам Леніна.

ЧАРНЯЎСКАЯ Малання Сцяпанаўна. Нарадзілася ў 1920 г. у в. Міхайлавічы Горацкага раёна. З 1937 г. працавала ў калгасе «Калгаснік Беларусі» (пазней «Шлях Леніна») свінаркай. Узнагароджана ордэнам Леніна (1971), медалямі.

ЧАРНЯЎСКІ Іван Фядотавіч. Нарадзіўся ў 1929 г. у в. Альхоўка Горацкага раёна. З 1945 г. працаваў у калгасах «Новае жыццё», імя Маленкова (пазней «Шлях Леніна») рознарабочым, трактарыстам. Узнагароджаны ордэнам Леніна (1973), ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, Граматай Вярхоўнага Савета БССР, медалямі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР. Загінуў у 1984 г.

ШЫЛАЎ Кузьма Васілевіч. Нарадзіўся 3.5.1916 г. у в. Ферма Горацкага раёна. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў старшынёй калгаса у в. Ферма, трыццаць гадоў быў брыгадзірам паляводчай брыгады калгаса «Шлях Леніна». Узнагароджаны ордэнам Леніна.

ЯЦАЎ Леанід Іванавіч. Нарадзіўся 1.7.1926 г. у в. Любіж Горацкага раёна. Працаваў у калгасе «XVII партз'езд» механізатарам. Выбіраўся дэпутатам Любіжскага сельскага Савета народных дэпутатаў. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі, Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР.

Заслужаныя работнікі Рэспублікі Беларусь

ЗАСЛУЖАНЫ АГРАНОМ

БАГАМОЛАЎ Аляксей Міхайлавіч. Кандыдат сельскагаспадарчых навук, дацэнт. Нарадзіўся 19.12.1919 г. у с. Вялікае Іванаўскае Раменскага раёна Маскоўскай вобл. У 1947 г. скончыў БСГА. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1947 г. навуковы супрацоўнік, дырэктар Гродзенскай сельскагаспадарчай станцыі. З 1965 г. загадчык кафедры селекцыі і насенняводства, прарэктар па навуковай рабоце БСГА. Аўтар навуковых прац. Званне прысвоена ў 1960 г.

А. М. Багамолаў.

ЗАСЛУЖАНЫ ВЕТЭРЫНАРНЫ ЎРАЧ

БАЛБУНОЎ Георгій Ігнатавіч. Нарадзіўся ў 1912 г. у в. Каралёўка Горацкага раёна. У 1935 г. скончыў Віцебскі ветэрынарны інстытут. Удзельнік Вялікай Айчын-

Р. Т. Вільдфлуш.

С. С. Захараў.

Ю. Л. Максімаў.

Р. І. Тарануха.

най вайны. З 1946 г. урач-тэрапеўт у райветлячэбніцы. Узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, ордэнамі «Знак Пашаны», Кастрычніцкай Рэвалюцыі, медалямі. Званне прысвоена ў 1966 г.

ЗАСЛУЖАНЫЯ ДЗЕЯЧЫ НАВУКІ

ВІЛЬДФЛУШ Роберт Тэнісавіч. Доктар сельскагаспадарчых навук (1955), прафесар (1956). Нарадзіўся 19.3.1906 г. у в. Мацэвічы Пухавіцкага раёна Мінскай вобл. У 1929 г. скончыў агранамічны факультэт БСГА. У 1924—34 гг. выконваў абавязкі загадчыка кафедры агранаміі і агранамічнай хіміі ў Беларускім садова-агародным інстытуце. З 1934 г. па 1941 г.— дэкан факультэта аграхіміі і глебазнаўства, з 1945 г. па 1972 г. загадчык кафедры аграхіміі БСГА. Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны», медалямі. Аўтар навуковых прац. Званне прысвоена ў 1965 г.

ЗАХАРАЎ Сяргей Сцяпанавіч. Доктар сельскагаспадарчых навук (1958), прафесар (1959). Нарадзіўся 1.10.1901 г. у в. Сямёнкава Пакроўскага павета Уладзімірскай губерні. У 1931 г. скончыў сельскагаспадарчую акадэмію імя Ціміразева. З 1933 г. у БСГА. У 1942—44 гг. дырэктар Інстытута сацыялістычнай сельскай гаспадаркі АН БССР. У 1950—51 гг. дэкан агранамічнага факультэта, у 1951—53 гг. прарэктар па навуковай рабоце, з 1954 г. загадчык кафедры земляробства ў БСГА. Аўтар навуковых прац. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР 1-га склікання. Узнагароджаны ордэнам Леніна, 3 іншымі ордэнамі, медалямі. Званне прысвоена ў 1965 г.

МАКСІМАЎ Юрый Леанідавіч. Доктар біялагічных навук (1970), прафесар (1979). Нарадзіўся 2.8.1925 г. у г. Ульянаўску. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1953 г. скончыў Ульянаўскі сельскагаспадарчы інстытут. З 1973 г. у БСГА загадчык кафедры, дэкан, прарэктар па навуковай рабоце. Аўтар навуковых прац. Званне прысвоена ў 1995 г.

САВІЦКІ Маркел Сцяпанавіч. Нарадзіўся 19.6.1898 г. у с. Расасна Дубровенскага раёна Віцебскай вобл. Доктар сельскагаспадарчых навук (1962), прафесар (1963). У 1924 г. скончыў Маскоўскую сельскагаспадарчую акадэмію імя Ціміразева і да 1935 г. працаваў у навукова-даследчых установах Беларусі. У 1963—74 гг. загадчык кафедры раслінаводства БСГА. Аўтар навуковых прац. Званне прысвоена ў 1965 г.

ТАРАНУХА Рыгор Іванавіч. Доктар сельскагаспадарчых навук, прафесар (1980). Член-карэспандэнт ААН Беларусі (1966). Нарадзіўся 25.9.1933 г. у п. Вазнясенск Клімаўскага раёна Бранскай вобл. У 1962 г. скончыў БСГА, дзе пачаў працаваць з 1966 г. З 1976 г. загадчык кафедры селекцыі і насенняводства. Аўтар навуковых прац. Званне прысвоена ў 1980 г.

ЗАСЛУЖАНЫЯ НАСТАЎНІКІ

АЛЯКСЕЕЎ Аляксандр Мікалаевіч. Нарадзіўся 18.2.1922 г. у в. Жарнеўка Дубровенскага раёна Віцебскай вобл. У 1941 г. закончыў Аршанскі настаўніцкі інстытут, у 1960 г. Магілёўскі педагагічны інстытут. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

З 1946 г. настаўнік, завуч Юркаўскай сярэдняй школы, з 1951 г. дырэктар Горацкай вячэрняй сярэдняй школы, затым настаўнік сярэдняй школы № 2. Узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, ордэнамі Славы 3-й ступені, Айчыннай вайны 2-й ступені. Званне прысвоена ў 1967 г.

ГАРЭЛЕНКАЎ Пётр Майсеевіч. Нарадзіўся 5.2.1922 г. у в. Сахараўка Горацкага раёна. У 1957 г. закончыў Магілёўскі настаўніцкі інстытут. З 1940 г. працаваў настаўнікам у Чавускім раёне. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1946—49 гг. настаўнік Сахараўскай пачатковай школы, у 1953—83 гг. дырэктар, настаўнік Станаўскай сямігадовай школы. Званне прысвоена ў 1965 г.

ДАМАРАЦКІ Мікалай Рыгоравіч. Нарадзіўся ў 1892 г. у в. Палыкавічы Магілёўскага раёна. З 1912 г. працаваў у Маслакоўскай школе настаўнікам пачатковых класаў, загадчыкам школы калгаснай моладзі, дырэктарам дзесяцігодкі. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі. Памёр у 1965 г.

ДЫЛЯНОК Марыя Паўлаўна. Нарадзілася 17.1.1910 г. у в. Валынцава Горацкага раёна. Закончыла Мсціслаўскі педагагічны тэхнікум, у 1952 г. Беларускі дзяржаўны універсітэт. У 1967 г. узнагароджана ордэнам Леніна.

КУЗЕМКІНА Ганна Сямёнаўна. Нарадзілася 11.6.1932 г. у в. Цемналессе Чавускага раёна Магілёўскай вобл. У 1956 г. скончыла Магілёўскі педагагічны інстытут і па накіраванню прыехала ў Горскую сярэднюю школу. Выкладала рускую мову і літаратуру. Званне прысвоена ў 1975 г.

ЛУБЯКА Палагея Сямёнаўна. Нарадзілася ў 1888 г. у Горках. Закончыла двухкласнае народнае вучылішча і настаўніцкую школу. З 1944 г. працавала настаўніцай СШ № 2 г. Горкі. Узнагароджана ордэнам Леніна, медалямі. Памерла ў 1975 г. Званне прысвоена ў 1947 г.

МАСКАЛЁВА Нінэль Васілеўна. Нарадзілася 1.1.1929 г. у в. Мокрадзь Дрыбінскага раёна. У 1948 г. скончыла Магілёўскі настаўніцкі інстытут, у 1965 г. Магілёўскі пединстытут. У 1948—61 гг. працавала настаўніцай мовы і літаратуры ў Шклове, Клімавічах, з 1961 г. настаўніца рускай мовы ў СШ № 1 г. Горкі. З 1965 г. намеснік дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце. Званне прысвоена ў 1967 г.

А. М. Аляксееў.

П. М. Гарэленкаў.

М. П. Дылянок.

Г. С. Куземкіна.

Н. В. Маскалёва.

К. Я. Панамарова.

ПАНАМАРОВА Кацярына Якаўлеўна. Нарадзілася 8.1.1929 г. у в. Галенкі Горацкага раёна Магілёўскай вобл. У 1968 г. скончыла Магілёўскі педагагічны інстытут. Працавала дырэктарам Еськаўскай і Нікольскай сярэдніх школ. У 1974—84 гг.

В. У. Фомчанка.

У. П. Фомчанка.

І. Ш. Гарфінкель.

А. А. Калікінскі.

У. К. Кільчэўскі.

А. М. Конанаў.

загадчык Горацкага РАНА. Званне прысвоена ў 1972 г.

ФОМЧАНКА Віктар Уладзіміравіч. Нарадзіўся 12.4.1925 г. у в. Рэкатка Горацкага раёна. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1944 г. працаваў настаўнікам, завучам, дырэктарам школы ў в. Панкратаўка. Узнагароджаны трыма ордэнамі Айчыннай вайны, медалямі. Званне прысвоена ў 1968 г.

ФОМЧАНКА Уладзімір Пятровіч. Нарадзіўся ў 1890 г. у в. Рэкатка Горацкага раёна. У 1911 г. скончыў Сахараўскую другакласную настаўніцкую школу і з 1912 г. па 1915 г. працаваў настаўнікам Рэкацкай пачатковай школы. Скончыў Вышэйшыя педагагічныя курсы ў Петраградзе, у 1940 г. педінстытут. З 1918 г. — загадчык Рэкацкай, затым Кацялёўскай, Галышанскай пачатковых школ. З 1933 г. настаўнік Панкратаўскай няпоўнай сярэдняй школы. Званне прысвоена ў 1950 г.

ЗАСЛУЖАНЫЯ РАБОТНІКІ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ

БРАГІН Анатоль Міхайлавіч. Доктар сельскагаспадарчых навук (1969), прафесар (1970). Нарадзіўся 22.4.1909 г. у с. Новая Чыгла Талаўскага раёна Варонежскай вобл. У 1936 г. скончыў Варонежскі сельскагаспадарчы інстытут. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1949 г. у БСГА, з 1969 г. загадчык кафедры глебазнаўства. Аўтар навуковых прац. Званне прысвоена ў 1979 г.

ГАРФІНКЕЛЬ Ізраіль Шмэравіч. Доктар эканамічных навук (1969), прафесар (1969). Нарадзіўся 11.2.1910 г. у Варшаве. У 1931 г. скончыў БСГА. У 1936—41 гг. загадчык кафедры Пермскага сельскагаспадарчага інстытута. З 1945 г. загадчык кафедры, з 1978 г. прафесар БСГА. Аўтар навуковых прац. Званне прысвоена ў 1980 г.

КАЛІКІНСКІ Аляксей Арсенавіч. Доктар сельскагаспадарчых навук (1978), прафесар (1979). Нарадзіўся 30.9.1915 г. у с. Закабякіна Любімскага раёна Яраслаўскай вобл. У 1947 г. скончыў БСГА. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1947 г. у БСГА, з 1973 г. загадчык кафедры аграхіміі, адначасова дэкан агранамічнага факультэта. Аўтар навуковых прац. Званне прысвоена ў 1980 г.

КІЛЬЧЭЎСКІ Уладзімір Конанавіч. Кандыдат эканамічных навук (1958), дацэнт (1961). Нарадзіўся 1.2.1921 г. у в. Задуб'е Кармянскага раёна Гомельскай вобл. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1951 г. скончыў БСГА, дзе і працаваў дэканам факультэта землепраектавання, а з 1971 г. па 1984 г. дацэнтам, загадчыкам кафедры. Аўтар навуковых прац. Званне прысвоена ў 1980 г.

КОНАНАЎ Аляксандр Мацвеевіч. Доктар тэхнічных навук (1974), прафесар. Нарадзіўся 10.10.1915 г. у в. Кушэрка Анежскага раёна Архангельскай вобл. Скончыў Ленінградскі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі. У 1951—72 гг. працаваў у БСГА старшым выкладчыкам, дацэнтам, прафесарам кафедры трактароў і аўтамабіляў, загадчыкам гэтай кафедры. Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», медалямі. Аўтар навуковых прац. Званне прысвоена ў 1980 г.

КУРАПАЦЕНКА Фёдар Кузьміч. Прафесар (1961). Нарадзіўся 2.3.1903 г. у в. Малыя Бялевічы Магілёўскага раёна. У 1931 г. скончыў БСГА. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1939 г. у БСГА. У 1949—71 гг. загадчык кафедры землеўпарадкавальнага праектавання. З 1971 г. прафесар гэтай кафедры. Аўтар навуковых прац. Званне прысвоена ў 1973 г.

ШЫТАЎ Мікалай Аляксандравіч. Доктар гістарычных навук (1975), прафесар (1976). Нарадзіўся 2.12.1921 г. у в. Еляхіна Чарапавецкага раёна Валагодскай вобл. У 1948 г. закончыў Чарапавецкі настаўніцкі інстытут, у 1951 г. Ленінградскі дзяржпедінстытут імя Герцэна. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1953 г. працаваў у БСГА выкладчыкам, дацэнтам, загадчыкам кафедры. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны 2-й ступені, Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі. Аўтар навуковых прац. Званне прысвоена ў 1977 г.

Ф. К. Курапаценка.

М. А. Шытаў.

ЗАСЛУЖАНЫ РАБОТНІК ГАНДЛЮ І ГРАМАДСКАГА ХАРЧАВАННЯ

МІРОНЧЫКАЎ Міхаіл Васілевіч. Нарадзіўся 20.8.1937 г. у в. Горы Горацкага раёна. У 1965 г. закончыў Маскоўскі гандлёвы інстытут. У 1960—80 гг. намеснік старшыні Горскага спажывецкага таварыства, дырэктар Горацкай нарыхтоўчай канторы, старшыня Быхаўскага райсаюза. З 1980 г.— дырэктар Горацкага гархарчпрамгандлю. Званне прысвоена ў 1988 г.

М. В. Мірончыкаў.

ЗАСЛУЖАНЫ РАБОТНІК АДУКАЦЫІ

ЛАТЫПАЎ Анварбек Закіравіч. Доктар сельскагаспадарчых навук (1975), прафесар (1978). Нарадзіўся 28.8.1927 г. у г. Петрапаўлаўску. У 1951 г. скончыў Маскоўскую сельскагаспадарчую акадэмію. З 1955 г. працуе ў БСГА асістэнтам, дацэнтам кафедры селекцыі і насенневодства, прарэктарам па навуковай рабоце, загадчыкам кафедры генетыкі. Аўтар навуковых прац. Званне прысвоена ў 1995 г.

А. З. Латыпаў.

ЗАСЛУЖАНЫЯ РАБОТНІКІ НАРОДНАЙ АДУКАЦЫІ

ГОЛЧАНКА Міхаіл Герасімавіч. Кандыдат тэхнічных навук (1971 г.), прафесар (1991). Нарадзіўся 20.4.1943 г. у в. Пля-

М. Г. Голчанка.

М. М. Дабралюбаў.

М. П. Савуноў.

Л. І. Сцешыц.

шчыцы Шклоўскага раёна Магілёўскай вобл. У 1965 г. скончыў БСГА і застаўся там працаваць, стаў дэканам гідрамеліярацыйнага факультэта. Аўтар навуковых прац. Званне прысвоена ў 1990 г.

ДАБРАЛЮБАЎ Мікалай Мікалаевіч. Кандыдат тэхнічных навук (1968), дацэнт (1969). Нарадзіўся 21.3.1931 г. у в. Ніжне-Межаўскае Межаўскага раёна Кастрамской вобл. Скончыў Ленінградскі політэхнічны інстытут ім. М. І. Калініна. У 1954—62 гг. працаваў у будаўнічых прадпрыемствах Кіраўскай вобласці. З 1962 г. у БСГА: дацэнт, загадчык кафедры, дэкан, прарэктар па навучальнай рабоце, першы прарэктар. Званне прысвоена ў 1990 г.

САВУНОЎ Міхаіл Пракопавіч. Нарадзіўся 12.7.1932 г. у в. Сафонава Духаўшчынскага раёна Смаленскай вобл. Кандыдат тэхнічных навук (1971), дацэнт (1972). У 1956 г. скончыў БСГА, дзе і працуе з 1960 г. асістэнтам, старшым выкладчыкам, дацэнтам, загадчыкам кафедры, дэканам факультэта механізацыі сельскай гаспадаркі, прарэктарам па завочнаму навучанню. Аўтар навуковых прац. Званне прысвоена ў 1990 г.

СЦЕШЫЦ Лявон Іосіфавіч. Кандыдат эканамічных навук (1972), дацэнт (1973). Нарадзіўся 4.11.1937 г. у в. Доўгае Салігорскага раёна Мінскай вобл. У 1963 г. скончыў БСГА, дзе працаваў спачатку асістэнтам кафедры бухгалтарскага ўліку, затым галоўным бухгалтарам вучгаса, старшым выкладчыкам, дацэнтам, загадчыкам кафедры бухгалтарскага ўліку, дэканам факультэта бухгалтарскага ўліку. Аўтар навуковых прац. Званне прысвоена ў 1990 г.

ЗАСЛУЖАНЫЯ РАБОТНІКІ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ

ГЕРАСІМАЎ Аляксандр Панфілавіч. Нарадзіўся 28.8.1932 г. у в. Камень Біацкага раёна Смаленскай вобл. Скончыў Гжацкі зааветэрынарны тэхнікум, у 1965 г. БСГА. Працаваў загадчыкам Плоскаўскага заавет-участка Віленскага раёна Смаленскай вобласці. З 1965 г. старшыня калгаса імя Свярдлова Горацкага раёна. Званне прысвоена ў 1991 г.

ДАЗОРЦАЎ Леанід Антонавіч. Кандыдат сельскагаспадарчых навук (1967). Нарадзіўся 12.3.1931 г. у Горках. У 1955 г. скончыў БСГА, дзе і працаваў з 1968 г. дацэнтам, загадчыкам кафедры агародніцтва. Аўтар навуковых прац. Званне прысвоена ў 1990 г.

КУРЫЛОВІЧ Краніт Канстанцінавіч. Кандыдат тэхнічных навук (1973). Нарадзіўся 31.3.1935 г. у в. Рымкі Пастаўскага раёна Віцебскай вобл. У 1962 г. скончыў БСГА. Працаваў галоўным інжынерам, а затым дырэктарам саўгаса «Дрыбінскі» Дрыбінскага раёна. З 1966 г. у БСГА асістэнт, старшы выкладчык, дацэнт, загадчык кафедры сельскагаспадарчых машын. Аўтар навуковых прац. Мае 15 вынаходніцтваў. Аўтар уніфікаваных сеялак для пасеву насення сельскагаспадарчых культур, тры з якіх укаранёны ў вытворчасць. Званне прысвоена ў 1995 г.

МЕДЗВЯДЗЁЎ Ігнат Елісеевіч. Нарадзіўся 2.2.1919 г. у в. Маслакі Горацкага раёна. Скончыў Магілёўскі педінстытут, Інстытут народнай гаспадаркі. У 1934—39 гг. працаваў у сістэме народнай адукацыі. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1956 г. — старшыня калгаса імя Будзённага Горацкага раёна, з 1962 г. — калгаса «Шлях Леніна». З 1990 г. — загадчык фі-

А. П. Герасімаў.

Л. А. Дазорцаў.



К. К. Курыловіч.

І. Е. Медзвядзёў.

І. Ф. Новікаў.

В. А. Папкоў.

Э. А. Пятровіч.

У. Ф. Клімаў.

ліяла Горацкага гісторыка-этнаграфічнага музея. Званне прысвоена ў 1980 г.

НОВІКАЎ Іван Фядосавіч. Нарадзіўся 20.6.1931 г. у в. Нівішчы Горацкага раёна. Працаваў у калгасе імя Чкалава, з 1960 г. — трактарыстам вучгаса. Званне прысвоена ў 1990 г.

ПАПКОЎ Васіль Андрэевіч. Кандыдат эканамічных навук (1971), дацэнт (1987). Нарадзіўся 15.10.1935 г. у в. Малое Шчокатава Дрыбінскага раёна Магілёўскай вобл. У 1963 г. скончыў БСГА. У 1963—65 гг. галоўны эканаміст саўгаса «Вейна» Магілёўскай вобласці. З 1965 г. па 1983 г. на партыйнай рабоце. З 1983 г. прарэктар БСГА па павышэнню кваліфікацыі кіруючых кадраў. Аўтар навуковых прац. Званне прысвоена ў 1990 г.

ПЯТРОВІЧ Эдуард Аляксандравіч. Кандыдат сельскагаспадарчых навук (1973), дацэнт (1974). Нарадзіўся 11.2.1939 г. у г. Жодзіна Смалявіцкага раёна Мінскай вобл. У 1961 г. скончыў БСГА. Працаваў інжынерам-глебазнаўцам, загадчыкам аддзела ўгнаенняў, дырэктарам Магілёўскай абласной аграхімлабараторыі. З 1976 г. на партыйнай і савецкай рабоце, з 1986 г. загадчык кафедры арганізацыі вытворчасці ў сельскагаспадарчых прадпрыемствах БСГА. З 1993 г. прарэктар па навуковай рабоце. Аўтар навуковых прац і вучэбных дапаможнікаў. Званне прысвоена ў 1990 г.

ЗАСЛУЖАНЫЯ ЎРАЧЫ

КЛІМАЎ Уладзімір Фаміч. Нарадзіўся 8.10.1926 г. у г. п. Круглае Магілёўскай вобл. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1953 г. закончыў Мінскі медыцынскі інстытут, працаваў у Горках загадчыкам райздраўаддзела, галоўным урачом раёна, урачом кабінета здароўя ў санэпідэмстанцыі. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай зоркі, Айчыннай вайны 1-й ступені, «Знак Пашаны», медалямі. Званне прысвоена ў 1968 г.

А. Ф. Клімава.

Т. Я. Крывіцкая (Макеева).

Р. У. Фомчанка.

М. З. Фрэйдзін.

І. А. Капусцін.

КЛІМАВА Алена Фамінічна. Нарадзілася 9.1.1921 г. у г. п. Круглае Магілёўскай вобл. Скончыла Мінскі медыцынскі інстытут. У 1945—81 гг. працавала ў Горацкай раённай бальніцы. Узнагароджана медалямі. Званне прысвоена ў 1964 г.

КРЫВІЦКАЯ (МАКЕЕВА) Таццяна Якаўлеўна. Нарадзілася 1.1.1918 г. у в. Цімохава Велікалуцкага раёна Пскоўскай вобл. Скончыла Мінскі медыцынскі інстытут. Удзельніца Вялікай Айчыннай вайны. З 1944 г. урач Горацкай раённай бальніцы. Узнагароджана ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны 2-й ступені, медалямі. Званне прысвоена ў 1960 г.

ТАТАРСКАЯ Ганна Ізрайлеўна. Нарадзілася 5.3.1884 г. у мястэчку Шчэдрын Жлобінскага павета. Скончыла медыцынскі факультэт Бернскага універсітэта. З 1917 г. — урач, з 1924 г. — галоўны ўрач Горацкай раённай бальніцы. З ліпеня па кастрычнік 1941 г. працавала ў падпольным шпіталі ў Барысаве. Расстраляна фашыстамі ў лістападзе 1941 г. Званне прысвоена ў 1941 г.

ФОМЧАНКА Рыгор Уладзіміравіч. Нарадзіўся 5.9.1922 г. у в. Рэкатка Горацкага раёна. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Пасля заканчэння Мінскага медыцынскага інстытута быў накіраваны ў Горацкі раён. З 1953 г. галоўны ўрач амбулаторыі Горацкага льнозавода. Узнагароджаны двума ордэнамі Айчыннай вайны 2-й ступені, трыма Чырвонай Зоркі, медалямі. Званне прысвоена ў 1981 г.

ЗАСЛУЖАНЫ ЭКАНАМІСТ

ФРЭЙДЗІН Марк Залманавіч. Кандыдат эканамічных навук (1965), дацэнт (1966). Нарадзіўся 24.4.1932 г. у Горках. У 1956 г. скончыў БСГА. Працаваў начальнікам планава-фінансавага аддзела Горацкага раённага ўпраўлення сельскай гаспадаркі. З 1966 г. у БСГА, выкладчык, загадчык кафедры аграбізнесу. Аўтар навуковых прац. Званне прысвоена ў 1990 г.

ЗАСЛУЖАНЫ ЮРЫСТ

КАПУСЦІН Іван Аляксандравіч. Нарадзіўся 16.3.1922 г. у в. Мікулічы Бабруйскага раёна Магілёўскай вобл. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1944—61 гг. памочнік пракурора Магілёўскай вобласці па спецсправах, пракурор Магілёўскага, Шклоўскага, Клімавіцкага раёнаў. У 1961—76 — пракурор Горацкага раёна. З 1976 г. выкладчык БСГА. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны 1-й ступені, Чырвонай Зоркі. Званне прысвоена ў 1972 г. Памёр 14.3.1995 г.

ЗАСЛУЖАНЫ ТРЭНЕР СССР

ЦЭЙЦІН Міхаіл Ільіч. Нарадзіўся ў 1920 г. у Горках. Удзельнік савецка-фін-

ляндскай і Вялікай Айчыннай войнаў. У 1947 г. скончыў Мінскі інстытут фізкультуры. Чэмпіён БССР па акрабатыцы ў 1950—53 гг. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 1-й ступені, медалямі, Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР. Званне прысвоена ў 1961 г.

Ганаровыя грамадзяне

ГРЫБКОЎ Мікалай Іванавіч. Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). Нарадзіўся 25.5.1908 г. у г. п. Елацьма Касімаўскага раёна Разанскай вобласці. Працаваў намеснікам рэдактара газеты «Красный маяк» Касімаўскага раёна. У 1943—44 гг. удзельнічаў у баях пад Оршай і Віцебскам. Камандзір стралковай роты старшы лейтэнант М. І. Грыбкоў вызначыўся ў баях за авалоданне апорным пунктам праціўніка ў вёсках Жывань, Чэрнеўка і Углічы на рацэ Бася. Апынуўшыся ў акружэнні танкаў, рота М. І. Грыбкова на працягу 14 гадзін адбівала націск ворага, але захоплены плацдарм на заходнім беразе Басі ўтрымала. Калі са строю выбыў камбат, М. І. Грыбкоў замяніў яго і арганізаваў кругавую абарону плацдарма. Адбіў 6 контратак праціўніка. Пасля вайны да 1961 г. служыў у Савецкай Арміі. У 1962—66 гг. дырэктар Елацьмаўскага харчкамбіната. Узнагароджаны ордэнам Леніна і другімі ордэнамі і медалямі. Памёр 25.1.1989 г.

М. І. Грыбкоў.

А. С. Макарава.

Г. І. Мішына.

ГРЫГОР'ЕЎ Ілья Лявонавіч. Герой Савецкага Саюза (15.6.1944). Нарадзіўся 15.7.1922 г. у в. Селешча Жаркаўскага раёна Калінінскай вобласці. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны з чэрвеня 1941 г. Камандзір узвода снайпераў 252-га стралковага палка 70-й стралковай дывізіі 33-й арміі гвардыі старшына І. А. Грыгор'еў за 1944 г. знішчыў больш за 300 гітлераўцаў. Навучыў снайперскаму майстэрству 130 салдат і сяржантаў. З 1944 г. у запасе. Жыў у Маскве, працаваў старшым інспектарам Галоўтранспраект Міністэрства транспартнага будаўніцтва. Узнагароджаны ордэнамі Леніна і другімі ордэнамі і медалямі.

ДОЛЬНІКАЎ Рыгор Усцінавіч (гл. артыкул «З плеяды адважных»).

МАКАРАВА Аляксандра Сямёнаўна. Нарадзілася 23.2.1921 г. у в. Одрына Карачаўскага раёна Арлоўскай вобласці. У 1940 г. скончыла Карачаўскую школу медыцынскіх сясцёр. Прымала ўдзел у баях на Брагінскім, Сталінградскім, Варонежскім, 1-м Прыбалтыйскім, 3-м Беларускім, 2-м Украінскім франтах, у вайне з Японіяй. Пасля вайны працавала ў г. Анадыр на Чукотцы. З 1946 г. медыцынская сястра Горацкай раённай паліклінікі. Узнагароджана ордэнамі Айчыннай вайны 1-й ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі.

МІШЫНА Ганна Іванаўна. Нарадзілася 7.12.1918 г. у в. Табакова Уракумскага раёна Кіраўскай вобласці. Да 1938 г. працавала наборшчыцай у друкарнях газет «Кіраўская іскра», «Батумскі рабочы». У вольны час займалася ў аэраклубе. Удзельніца Вялікай Айчыннай вайны. Служыла ў санітарнай, з красавіка 1943 г. у цяжкай авіяцыі. Зрабіла 675 баявых вылетаў. З арміі дэмабілізавалася ў 1945 г. У 1951—56 гг. працавала ў Магілёўскім аэраклубе лётчыкам-інструктарам. Узнагароджана ордэнамі Айчыннай вайны 1-й і 2-й ступеняў, двума ордэнамі Чырвонага Сцяга, медалямі. Памерла 25.1.1993 г.

Родам з Горацкага раёна

АБЭЦЭДАРСКІ Лаўрэнцій Сямёнавіч. Доктар гістарычных навук, прафесар (1966), член-карэспандэнт АПН СССР (1968). Нарадзіўся 12.7.1916 г. у Горках. У 1946 г. скончыў БДУ і працаваў там выкладчыкам, загадчыкам кафедры гісторыі СССР, з 1958 г. гісторыі БССР. Адзін з аўтараў «Гісторыі Беларускай ССР (т. 1–2, 1954–61; т. 1–5, 1972–75), аўтар кніг па гісторыі беларуска-рускіх сувязей. Для яго прац характэрна аднабаковае, механістычнае тлумачэнне мінулага. Памёр 6.7.1975 г.

БОЙКА Барыс Барысавіч. Член-карэспандэнт АН БССР (1962), доктар фізіка-матэматычных навук (1965), заслужаны дзеяч навукі БССР (1978). Нарадзіўся 6.8.1923 г. у в. Ходараўка. У 1951 г. скончыў БДУ. Працаваў у Фізіка-тэхнічным інстытуце АН БССР. З 1958 г. у Інстытуце фізікі АН БССР, з 1968 г. загадчык лабараторыі аптычнай электронікі, з 1975 г. дырэктар Інстытута фізікі цвёрдага цела і паўправаднікоў АН БССР. Праводзіў даследаванні ў галіне вымушанай аптычнай анізатрапіі і квантавай электронікі. Распрацаваў тэарэтычныя і эксперыментальныя асновы палярызацыйна-аптычнага метаду вывучэння працэсаў цячэння вязкіх асяроддзяў. Стварыў арыгінальную прыладу для даследавання вымушанай аптычнай анізатрапіі, вынайшаў новы тып рэзанатара для аптычных квантавых генератараў.

БУЛАХАЎ Міхаіл Гапеевіч. Доктар філалагічных навук (1966), прафесар (1967), заслужаны дзеяч навукі БССР (1971). Нарадзіўся 22.7.1919 г. у в. Маслакі. У 1940 г. скончыў Магілёўскі педагагічны інстытут. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1949–51 гг. у Мінскім педагагічным інстытуце, у 1951–65 гг. у Інстытуце мовазнаўства АН БССР, з 1968 г. у БДУ. Саўтар «Граматыкі беларускай мовы (т. 1–2, 1962–66), падручнікаў і дапаможнікаў па беларускай мове для педагагічных вучылішчаў і ВНУ, аўтар артыкулаў па славянскім мовазнаўстве. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі.

ВАСІЛЬЕЎ Васіль Іванавіч. Нарадзіўся 1.6.1927 г. у в. Тушава. У 1952 г. скончыў Вільнюскі дзяржаўны мастацкі інстытут. Удзельнік мастацкіх выставак з 1952 г. З 1960 г. выкладчык Мінскага мастацкага вучылішча. У Горацкім гісторыка-этнаграфічным музеі знаходзіцца калекцыя мастака з 31 карціны.

Л. С. Абэцэдарскі.

Б. Б. Бойка.



М. Г. Булахаў.

ВЕНЯДЗІКТАЎ Аляксей Маісеевіч. Нарадзіўся 17.10.1915 г. у в. Блажкі. У 1937 г. скончыў БСГА. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў старшым навуковым супрацоўнікам Цэнтральнай усесаюзнай навукова-даследчай лабараторыі, у 1953–86 гг. ва Усесаюзным навукова-даследчым інстытуце жывёлаводства. Аўтар навуковых прац.

ГАРБАТОЎСКІ Віктар Ціханавіч. Нарадзіўся 5.5.1936 г. у в. Тушавая. У 1941 г. бацька загінуў на фронце. Маці расстралялі як заложніцу ў 1942 г., і Віктар стаў выхаванцам спецыяльнага дзіцячага дома № 2 у г. Орша, а затым Віцебскага дзіцячага дома № 6. У 1952 г. закончыў сем класаў і працаваў на Аршанскім ільнокамбінаце. У 1959 г. скончыў Віцебскае музычнае вучылішча і з гэтага часу яго лёс звязаны з развіццём народнай творчасці — ён кіруе хорам панчошна-трыкатажнага камбіната ў Віцебску. Калектыў пад яго кіраўніцтвам дасягнуў высокага выканаўчага

майстэрства. Дзесяткі грамат і дыпломаў, ганаровае званне «народны» характарызуюць творчую працу кіраўніка і хору. Музыка В. Ц. Гарбатоўскага ўпрыгожвае сваёй самабытнасцю канцэртныя праграмы. Заслужаны дзеяч культуры БССР В. Ц. Гарбатоўскі з 1966 г. пастаянны кансультант хору ў саўгасе імя Раманава Бешанковіцкага раёна. І вынік адметны — у 1976 г. гэты хор удастоены звання народнага. За час кіраўніцтва хорам В. Ц. Гарбатоўскі падрыхтаваў больш за дваццаць праграм, у тым ліку тэматычныя «Трыпціх аб Радзіме» і «За ваколіцай». Кампазітарам напісана больш за сто песен. За актыўную і плённую працу па развіццю самадзейнай творчасці і мастацтва ўзнагароджаны трыма Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР, а ў 1971 г. ордэнам «Знак Пашаны».

ГЛУШАНКОЎ Нічыпар Эмануілавіч. Нарадзіўся 14.3.1902 г. у в. Зубры. Генерал-лейтэнант авіяцыі (1944). У Чырвонай Арміі з 1921 г. У 1927 г. скончыў пяхотную школу, затым у 1929 г. школу лётчыкаў. Удзельнік нацыянальна-рэвалюцыйнай вайны ў Іспаніі (1936—39). У Вялікую Айчынную вайну знаходзіўся на Крымскім і Закаўказскім франтах. З 1945 г. камандуючы ВПС ваеннай акругі. У 1954—58 гг. працаваў у ваенна-навучальных установах. Узнагароджаны 2 ордэнамі Леніна, 4 іншымі, медалямі. Памёр 20.12.1959 г.

ГРАМЫКА Віктар Аляксандравіч. Беларускі жывапісец, прафесар (1982), заслужаны дзеяч мастацтва БССР (1970). Нарадзіўся 1.1.1923 г. у в. Сенькава. У 1958 г. скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1958 г. выкладчык Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута. Удзельнік мастацкіх выставак з 1947 г. У 1968—73 гг., 1977—82 гг. старшыня праўлення Саюза мастакоў БССР.

ДОЛЬНІКАЎ Рыгор Усцінавіч (гл. артыкул «З плеяды адважных»).

ІВАНОЎ Георгій Фёдаравіч. Доктар медыцынскіх навук, прафесар. Нарадзіўся ў 1883 г. у в. Горы. У 1922 г. скончыў Петраградскую ваенна-медыцынскую акадэмію і працаваў там выкладчыкам з 1925 г. па 1930 г., загадваў кафедрай нармальнай анатоміі Першага Маскоўскага мединстытута. Надрукаваў звыш 90 прац. Памёр у 1955 г.

ІВАНОЎ Сяргей Несцеравіч. Член-карэспандэнт АН БССР (1961), доктар сельскагаспадарчых навук (1958), прафесар (1959), лаўрэат дзяржаўнай прэміі БССР (1976). Нарадзіўся 20.3.1909 г. у в. Валынцава. У 1931 г. скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1938—41 гг. дырэктар Інстытута сацыялістычнай гаспадаркі АН БССР. З 1945 г. загадчык лабараторыі фізіка-хіміі глебаў, з 1955 г. фізіка-хіміі глебаў і радыеактыўных ізатопаў Беларускага НДУ глебазнаўства і аграхіміі, з 1962 г. па 1969 г. дырэктар гэтага інстытута. Распрацаваў новы біялагічны прынцып вызначэння патрэбы раслін ва ўгнаеннях у залежнасці ад колькасці пажыўных рэчываў у глебах. Аўтар навуковых прац. Узнагароджаны ордэнамі, медалямі.

Н. Э. Глушанкоў.

Г. Ф. Іваноў.

КАВАЛЁЎ Васіль Пятровіч (Васіль Каваль, гл. артыкул «Лёс вырашылі за 15 хвілін»).

КОРШУНАЎ Аляксандр Фаміч. Нарадзіўся 4.3.1924 г. у в. Палішына. Літаратуразнавец, кандыдат філалагічных навук (1956), лаўрэат Дзяржаўнай прэміі імя Я. Коласа (1980). Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені, медалямі.

КУЗНЯЦОЎ Фёдар Ісідаравіч. Нарадзіўся 29.9.1898 г. у в. Балбечына. У Арміі з 1915 г. У грамадзянскую вайну на Заходнім фронце, камандзір палка. У 1926 г. скончыў Ваенную акадэмію імя Фрунзе. З 1938 г. намеснік камандуючага войскамі БВА, начальнік Ваеннай акадэміі Генштаба, камандуючы Паўночна-Каўказскай і Прыбалтыйскай ваеннай акругамі. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939—40 гг. У Вялікую Айчынную вайну генерал-палкоўнік Ф. Ф. Кузняцоў камандаваў Заходнім, Волхаўскім, Карэльскім франтамі.

А. Ф. Коршунаў.

Ф. І. Кузняцоў.

У. І. Кумачоў.

І. І. Купчынаў.

У 1945—48 гг. камандуючы войскамі Уральскай ваеннай акругі. Узнагароджаны 2 ордэнамі Леніна, 3 ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнам Суворава 2-й ступені. Памёр 22.3.1961 г. Адна з вуліц Горак носіць яго імя.

КУМАЧОЎ Уладзімір Іванавіч. Доктар тэхнічных навук (1994), прафесар (1994). Нарадзіўся 9.9.1941 г. у Горках. У 1965 г. скончыў БСГА. Працаваў выкладчыкам гідратэхнікума ў г. Кяхта. З 1976 г. у БСГА старшы выкладчык, затым дацэнт, прафесар кафедры гідратэхнічных збудаванняў. Аўтар больш чым пяцідзесяці навуковых артыкулаў.

КУПЧЫНАЎ Іван Іосіфавіч. Доктар тэхнічных навук (1962), прафесар (1963), заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі БССР (1968). Нарадзіўся 30.10.1909 г. у Горках. У 1931 г. скончыў БСГА. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1954 г. у Беларускім інстытуце інжынераў чыгуначнага транспарту. Аўтар навуковых прац і падручнікаў па інжынернай геадэзіі, ураўноўванні геадэзічных сетак, праграмiраванні ўраўняльных вылічэнняў для ЭВМ.

ЛУБЯКА Васіль Мікітавіч. Акадэмік АН БССР (1931), доктар сельскагаспадарчых навук (1931), прафесар (1929), заслужаны дзеяч навукі БССР (1944). Нарадзіўся 26.4.1891 г. у Горках. Пасля заканчэння ў 1925 г. Маскоўскай сельскагаспадарчай акадэміі імя Ціміразева працаваў там жа на заснаванай ім кафедры арганізацыі сацыялістычных сельскагаспадарчых прадпрыемстваў. Адначасова ў 1929—30 гг. дэкан эканамічнага факультэта акадэміі і ў 1940—46 гг. дырэктар Інстытута эканомікі АН БССР. У 1929 г. была выдадзена манаграфія В. М. Лубякі «Руководящие основы для составления организационных планов совхозов», якая трапіла пад рэзкую крытыку з боку «афіцыйнай» навукі. Аўтара абвінавачвалі ў тым, што ён прапаноўваў рабіць выбар культур і галін гаспадаркі пры дапамозе крытэрыю аб'ектыўнай рэнтабельнасці, а не сацыялістычнай. Унёс значны ўклад у распрацоўку тэарэтычных і практычных асноў эканомікі рэспублікі. У даваенны перыяд ён сумесна з віцэ-прэзідэнтам АН Беларусі, дырэктарам Інстытута эканомікі АН рэспублікі акадэмікам Т. Ф. Домбалем вывучаў пытанні паляпшэння арганізацыі ўпраўлення, укаранення прынцыпаў гасразліку, зніжэння сабекошту прадукцыі і павышэння прадукцыйнасці працы ў народнай гаспадарцы Беларусі. У час вайны пад яго кіраўніцтвам былі сабраны матэрыялы аб становішчы сельскай гаспадаркі Гомельскай, Палескай, Магілёўскай і Віцебскай абласцей, аб стане і развіцці энергетычнай гаспадаркі і сыравіннай базы Беларусі. Вучоны займаўся вырашэннем праблем паслявае нага аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі Беларусі, пытаннямі севазвароту і пашырэння пасеваў пшаніцы ў рэспубліцы. Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны». Памёр 16.6.1950 г.

ЛЮХЦІКАЎ Анісім Сцяфанавіч. Нарадзіўся ў 1898 г. у в. Кузавіна. З 1918 г. у Чырвонай Арміі, удзельнік грамадзянскай вайны. Скончыў Ваенную акадэмію, быў начальнікам вучылішча ў Арэнбургу. У 1941 г. камандзір стралковай дывізіі, ваяваў пад Масквой, удзельнічаў у разгроме праціўніка ў Віцебскай вобласці, Літве, Усходняй Прусіі, Кёнігсбергу. Звольніўся ў запас у 1955 г. і пражываў у Маскве. Узнагароджаны дзесяццю ордэнамі, многімі медалямі.

Гэтыя даныя сабралі члены ваенна-гістарычнага гуртка сярэдняй школы № 37 г. Вільнюса. Калі яны збіралі звесткі аб героях баёў у Прыбалтыцы, то натрапілі на прозвішча камандзіра стралковага корпуса генерал-маёра А. С. Люхціка, дывізіі і палкі якога прайшлі праз усю Літву, вызвалілі некалькі гарадоў, шмат вёсак і хутароў. А заслужаны настаўнік Літвы П. Фралоў надрукаваў аб гэтым заметку ў раённай газеце «Ленінскі шлях» за 27 лістапада 1975 г.

МІХЛІН Давыд Міхайлавіч. Доктар біялагічных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі (1948). Нарадзіўся ў 1887 г. у в. Горы. У 1913 г. скончыў юрыдычны факультэт Маскоўскага універсітэта, у 1918 г. Медыцынскі інстытут у г. Юр'еве. З 1919 г. загадчык Горскай школы 2-й ступені, з 1922 г. у Інстытуце біялогіі АН СССР. Займаўся даследаваннямі акісляльна-аднаўленчых ферментаў жывёльнага і раслінага паходжання, сінтэтычным дзеяннем ферментаў. Надрукаваў 93 навуковыя працы, у тым ліку тры манаграфіі. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі. Памёр у 1959 г.

ПАГУЛЯЕЎ Даніла Іванавіч. Доктар геолага-мінералагічных навук (1958), прафесар (1958). Нарадзіўся 10.12.1895 г. у в. Горы. У 1927 г. скончыў Смаленскі універсітэт. З 1930 г. выкладчык у Смаленскім педагагічным інстытуце. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працы па геалогіі Смаленскай вобласці і Беларусі. Узнагароджаны ордэнам Леніна, ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі, 6 іншымі ордэнамі, медалямі.

ПІЛІПЕНКА Павел Ананьевіч. Нарадзіўся 16.12.1897 г. у с. Анікавічы Горацкага павета. Генерал-маёр артылерыі (1945). У Чырвонай Арміі з снежня 1918 г., на Паўднёвым фронце, палітрук. З 1920 г. у войсках Заходняй акругі, БВА. У 1932 г. скончыў Акадэмічныя курсы ўдасканалення камсаставу. З 1941 г. на Закаўказскім, Паўднёва-Каўказскім, Сцяпным, 1-м Украінскім і 1-м Беларускім франтах — начальнік штаба і намеснік камандуючага артылерыі арміі, камандуючы артылерыі корпуса. У 1952 г. выйшаў у запас. Жыў у Кіеве. Узнагароджаны ордэнам Леніна, 8 іншымі ордэнамі, медалямі.

ПІУНОЎСКІ Ігнат Іванавіч. Доктар тэхнічных навук (1992). Нарадзіўся 29.8. 1930 г. у Горках. У 1953 г. скончыў БСГА і працаваў у Інстытуце торфа АН БССР. З 1961 г. у Цэнтральным НДІ механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі. Аўтар навуковых прац.



І. І. Піуноўскі.



А. В. Прохараў.

Л. Э. Разгон.

ПРОХАРАЎ Анатоль Васілевіч. Нарадзіўся 1.7.1949 г. у в. Рудкаўшчына. Працаваў будаўніком-электрыкам. На пенсіі па інваліднасці. Друкуецца ў рэспубліканскіх і абласных перыядычных выданнях. Аўтар кнігі для дзяцей «Буркаток».

РАЗГОН Леў Эмануілавіч. Нарадзіўся ў 1908 г. у Горках. Скончыў сямігодку 2-й ступені і пераехаў у Маскву. Працаваў у першым Доме піянераў, пісаў артыкулы ў «Комсомольскую правду» і адначасова вучыўся на гістарычным факультэце Маскоўскага педагагічнага інстытута імя Леніна. Працаваў у выдавецтвах «Молодая гвардия», «Детгиз», спрабаваў знайсці сябе ў літаратуры. У канцы трыццатых гадоў быў рэпрэсіраваны. Вярнуўся з ссылкі праз 17 гадоў. Як адзначаў пісьменнік А. Ваксберг у «Литературной газете» за 20 чэрвеня 1991 г., «...вырвавшись с ада... он нашел в себе силы написать много добрых и умных книг, с которых самая долгая жизнь уготована несомнен-

но его «непридуманным рассказам», напрочь лишенным, к счастью, озлобления, ненависти и мести». «Непридуманное» — гэта аповесць у апавяданнях. Так вызначыў жанр сам пісьменнік. У кнізе аўтар сабраў нарысы — партрэты людзей, з якімі лёс звёў у Гулагу. Л. Э. Разгон напісаў манаграфіі аб Н. Дубраву, У. Яну, аповесці «Шестая станция», «Один год и вся жизнь», зборнік літаратурных партрэтаў «Живой голос науки» і шмат іншых кніг.

САВІЦКАЯ Маргарыта Захараўна. Нарадзілася 16.4.1928 г. у Горках. У 1959 г. скончыла Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут. Працуе ў жанрах бытавым, пейзажу, партрэту. Сярод твораў «У полі» (1959), «Лета» (1962), «Гімнасткі» (1963), «Хлеб партызанам» (1967), «Восень» (1970, разам з Л. Ізмайлавай), «Дарога на Слонім» (1981), «Раніца на Іслачы» і «Лясное возера» (1985). Аўтар партрэтаў народнага мастака М. Савіцкага (1981), «Дзяўчынка» (1984) і інш. Мастацтва М. Я. Савіцкай адметна вобразным раскрыццём сутнасці з'явы, каларыстычнымі сродкамі.

СІМКІН Якаў Львовіч. Нарадзіўся ў 1921 г. у в. Леніна. Праз некаторы час сям'я пераехала ў Горкі, дзе ён скончыў дзесяцігодку і паступіў у Мінскі педінстытут. Але праз некалькі месяцаў юнак быў прызваны ў рады Чырвонай Арміі, дзе і сустрэў Вялікую Айчынную вайну. Ваяваў з першага да апошняга дня. Я. Л. Сімкін быў механікам у знішчальных авіяпалках. Узнагароджаны медалямі. Пасля вайны жыў у Мінску, затым у Маскве, дзе закончыў філалагічны факультэт Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта. Працаваў лектарам, літаратурным супрацоўнікам газет «Зорька» ў Мінску, «Московский комсомолец» у Маскве. У 1956 г. Я. Л. Сімкін займаўся ў мастацкай студыі пры Доме культуры імя Серафімовіча. У жывапісе ён амаль заўсёды працаваў масціхінам, выкарыстоўваючы пэндзлі толькі ў пачатку малюнка. Памёр у 1978 г. Калекцыя яго твораў падаравана Горацкаму гісторыка-этнаграфічнаму музею жонкай мастака Д. Р. Сімкінай.

СЛУКА Аляксандр Яўгенавіч. Доктар геаграфічных навук (1981), прафесар. Нарадзіўся 26.6.1923 г. у Горках. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1948 г. скончыў Маскоўскі дзяржаўны універсітэт імя Ламаносава і з 1951 г. працуе тут на кафедры геаграфічнага факультэта. Аўтар больш чым 100 навуковых прац.

СТАЛЯРОЎ Парфірый Андрэевіч. Нарадзіўся 23.2.1900 г. у в. Ходараўка. Скончыў два класы настаўніцкай школы, працягваў вучобу ў Горацкім рамесным вучылішчы. У канцы 1918 г. добраахвотна ўступіў у Чырвоную Армію, вучыўся на пяхотных курсах у Маскве, быў пераведзены на 1-я Савецкія ваенна-электратэхнічныя курсы камсаставу РККА, дзе рыхтавалі камандзіраў узводаў сувязі і ваенных радыятэхнікаў. Удзельнік грамадзянскай вайны. У 1928 г. скончыў ваеннае аддзяленне пры Ленінградскім электратэхнічным інстытуце і атрымаў назначэнне на пасаду малодшага інжынера па радыё ў авіяцыі Чарнаморскага флоту. У 1940 г. ваенны інжынер I рангу П. А. Сталяроў назначаецца на работу ў штаб ВПС з мэтай стварэння службы зямнога забеспячэння самалётаваджэння. Ён узначальвае другі аддзел, які ведаў радыёсветамаячнай службай, а потым становіцца першым начальнікам службы зямнога забеспячэння самалётаваджэння ВПС Чырвонай Арміі. П. А. Сталяроў, акрамя мерапрыемстваў па арганізацыі і фарміраванню службы, работ, звязаных з удасканаленнем тэхнікі і метадаў яе прымянення, непасрэдна ўдзельнічаў у падрыхтоўцы і ажыццяўленні службай зямнога забеспячэння самалётаваджэння вялікай колькасці аперацый і бітваў на франтах Вялікай Айчыннай вайны. У вайне супраць Японіі ў саставе галоўнага Штаба кіраўніцтва ажыццяўляў каардынацыю службы зямнога забеспячэння самалётаваджэння трох паветраных армій на ўсіх франтах баявых дзеянняў на Далёкім Усходзе. Пасля вайны працаваў на ўкараненні новых сродкаў і метадаў самалётаваджэння, узначальваў радыётэхнічны факультэт Ваенна-паветранай інжынернай Акадэміі. Узнагароджаны ордэнам Леніна і другімі ордэнамі і медалямі.

УГНАЧОЎ Фёдар Антонавіч (гл. артыкул «Замяніў камандзіра»).

ХМУРОВІЧ Іван Прохаравіч. Нарадзіўся у 1884 г. у Горках. Скончыў рамеснае вучылішча, працаваў слесарам у Маскве, Харкаве, Іжэўску. Быў выбраны старшынёй агульназаводскага камітэта Іжэўскіх сталеліцейных заводаў. У 1919 г. за работу па аднаўленню прадпрыемства быў адзначаны імянной трохлінейнай вінтоўкай сістэмы «Карабін». У перыяд Вялікай Айчыннай вайны працаваў начальнікам аддзела мабілізацыі ўнутранных рэсурсаў іжэўскіх заводаў. У 1944 г. быў узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны». У мірны час працаваў на

аружэйным заводзе, сканструяваў паўаўтаматычны прыцэльны станок, які быў на ўзбраенні Савецкай Арміі. У 1956 г. узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. Памёр у маі 1968 г.

ЦІТОВІЧ Ігар Сяргеевіч. Член-карэспандэнт АН БССР (1974), доктар тэхнічных навук, прафесар (1970), заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі БССР (1972). Нарадзіўся 30.6.1917 г. у Горках. У 1940 г. скончыў Беларускі політэхнічны інстытут. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1946 г. у БПІ, з 1951 г. загадчык кафедры, з 1973 г. дырэктар. З 1978 г. намеснік дырэктара Інстытута праблем надзейнасці і даўгавечнасці машын АН БССР. Навуковыя працы прысвечаны праектаванню асноўных агрэгатаў аўтамабіляў, трактароў і лакаматываў. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі.

ЦІШКОВІЧ Анатоль Васілевіч. Доктор тэхнічных навук (1979), прафесар (1983). Нарадзіўся 3.17.1921 г. у Горках. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1948 г. скончыў БСГА і працаваў у Інстытуце торфу АН БССР. Распрацаваў навуковыя асновы рацыянальнага выкарыстання каўстабіялітаў у сельскагаспадарчай вытворчасці. Узнагароджаны двума ордэнамі і медалямі.

ЧАТЫРКІН Уладзімір Сяргеевіч. Доктар сельскагаспадарчых навук (1940), заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі БССР (1946). Нарадзіўся ў 1899 г. у в. Горы. У 1924 г. скончыў Горацкі сельскагаспадарчы інстытут. Працаваў выкладчыкам у Авінаўшчынскім, затым Сычаўскім сельгастэхнікумах, Горскім заатэхнічным, Саратаўскім зааветтэрынарным інстытутах. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі.

ШАПАВАЛАЎ Пётр Гапеевіч. Нарадзіўся ў 1904 г. у Горках. У 1925—29 гг. вучыўся ў Беларускім сельскагаспадарчым інстытуце ў Горках. У 1930—32 гг. і ў 1933—39 гг. на гаспадарчай рабоце ў Мінску, Оршы, Маскве. У лютым-снежні 1939 г. інструктар ЦК КБ(б)Б, а з снежня 1939 г. сакратар Пінскага абкома КП(б)Б. З ліпеня 1941 г. сакратар Пінскага падпольнага абкома КП(б)Б. Загінуў пры выкананні баявога задання 30.9.1941.

ШЧАРБАТАЎ Георгій Міхайлавіч. Нарадзіўся 7.5.1919 г. у в. Рэкатка. У 1938 г. скончыў Магілёўскае педвучылішча і быў накіраваны на работу ў Паршынскую сямігодку. Працуючы тут, ён актыўна супрацоўнічаў у абласной газеце «Камунар Магілёўшчыны», а з 1939 г. перайшоў туды працаваць карэспандэнтам. З 1940 г. працаваў у рэдакцыі рэспубліканскай газеты «Советская Белоруссия». У пачатку Вялікай Айчыннай вайны Г. М. Шчарбатаў жыў у Куйбышаве, супрацоўнічаў у газеце «Волжская коммуна». 11 жніўня 1942 г. па заданню ЦК Кампартыі Беларусі і ЦК ВЛКСМ 60 камсамольцаў-аўтаматчыкаў перайшлі лінію фронту. Гэта быў партызанскі атрад імя Гастэлы. К канцу верасня яны былі на месцы прызначэння — у штабе Мінскага партызанскага злучэння, якім камандаваў Герой Савецкага Саюза Р. П. Мачульскі. Разам з гастэлаўцамі ў якасці карэспандэнта газеты «Звязда» сюды прыбыў і Г. М. Шчарбатаў.

І. С. Цітовіч.

А. В. Цішковіч.

Г. М. Шчарбатаў.

Працуючы ў рэдакцыі газеты, Георгій Шчарбатаў удзельнічаў у баявых аперацыях партызан, разам з усімі ішоў у атаку на варожы гарнізон у Ламавічах, граміў варо-

жы эшалон на чыгунцы паміж станцыямі Муляроўка і Пціч. Некаторы час ён узначальваў партызанскую агітбрыгаду. У лютым 1944 г. Г. М. Шчарбатаў быў назначаны рэдактарам газеты «Звязда». Пад яго кіраўніцтвам у цяжкіх умовах выйшла 14 нумароў газеты.

Амяллян Шурпач, былы супрацоўнік рэдакцыі газеты «Звязда», успамінае: «Няма паперы, няма чаго есці, ліпучы тыф звалiў усіх супрацоўнікаў. А набліжаецца Першамай. Без газеты ў такі ўрачысты дзень ніяк нельга. А на нагах толькі двое: я ды Шчарбатаў.

— Амяллян, трэба, браце, газету выпусціць.

— Калі трэба, дык выпусцім.

Пачалася работа. Юрка піша, я набіраю па літары тэкст. Чатыры дні працавалі над нумарам. Але затое колькі было радасці ў партызан і насельніцтва, калі яны бралі яшчэ пахнучы тлушчам і сажай (фарбы не было) свежы нумар газеты».

У пасляваенны час, працуючы ў рэдакцыі газеты «Звязда», часопісе «Маладосць», Г. М. Шчарбатаў працягваў літаратурную дзейнасць, якую пачаў у 1939 г. з нарысаў і рэцэнзій. Ён напісаў такія кнігі, як «Партызанскія агні», «Камсамол Беларусі ў баях за Радзіму», «Лясны фронт» і іншыя. Памёр у лютым 1957 г.

ШЫНДЗІКАЎ Мікалай Фаміч (гл. артыкул «Аб узнагародзе не даведаўся»).

ШЫТАЎ Уладзімір Мікалаевіч. Доктар эканамічных навук (1988), прафесар (1990), правадзейны член Міжнароднай акадэміі навук вышэйшай школы (1994), правадзейны член Міжнароднай акадэміі інфарматызацыі (1994). Нарадзіўся 22.4.1951 г. у Горках. У 1973 г. закончыў Маскоўскі дзяржаўны інстытут міжнародных зносін. Аўтар больш за 70 навуковых прац.

ЯКУБОЎСКІ Іван Ігнатавіч (гл. артыкул «Сталёвы таран»).

ЯЎМЕНЕНКА Фелікс Купрыянавіч. Нарадзіўся ў 1908 г. у в. Леніна. У 1930 г. скончыў рабфак пры сельскагаспадарчай акадэміі і паступіў у Маскоўскае мастацкае вучылішча «Памяці 1905 года». Вучыўся ў выдатнага мастака П. В. Кузняцова. З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны Ф. К. Яўмененка стварае серыю малюнкаў аб цяжкіх і гераічных гадах. Мастак рабіў замалёўкі пад абстрэлам, на маршы, на прывалах. Пасля вайны аддае перавагу жывапісу. Шмат работ ён падарыў Ленінскай сярэдняй школе, у Магілёўскай карціннай галерэі ёсць яго калекцыя са 150 карцін, некалькі твораў захоўваецца ў Горацкім гісторыка-этнаграфічным музеі. Памёр у 1978 г.

Падрыхтавалі С. Кротава, У. Ліўшыц, В. Нямыкін, Т. Поклад, М. Студнева.

Створаны пакаленнямі

Старэйшы ў Беларусі Горацкі дэндрарый — гістарычнае месца пачатку інтрадукцыі драўнінна-хмызняковых раслін, якія цяпер з'яўляюцца помнікам прыроды рэспубліканскага значэння. Тут захоўваецца каштоўнейшы генафонд, створаны многімі пакаленнямі людзей (гл. артыкул «Батанічны сад у Горках»).

Вайна многае загубіла ў гэтым прыгожым куточку. З 1978 г. пачаліся актыўныя планамерныя работы па аднаўленню і рэканструкцыі дэндрарыя. Былі праведзены комплексныя пошукі глебы і расліннасці. Выканана ландшафтная таксацыя калекцыйных фондаў, праведзена масавае іх папаўненне. Створаны шэраг цікавых паркавых ландшафтаў, у якія ўключаны новыя інтрадукцыраваныя дрэвы і кустарнікі. Закладзены інтрадукцыйны гадавальнік з мэтай інтэнсіўнага развядзення драўнінна-хмызняковых раслін для рэгулярнага планавага папаўнення ажываючага дэндрарыя.

Далёкаўсходнюю флору ў дэндрарыі прадстаўляюць арэх манчжурскі, чаромха Маака, бархат амурскі, бяроза далёкаўсходняя, айва японская, траскун амурскі, ліcтоўніца даурская, сафора японская, клён манчжурскі, лімоннік кітайскі, аралія манчжурская, кедр карэйскі. Сярод раслін паўночнаамерыканскай дэндрафлоры найбольшую цікавасць прадстаўляюць сосны веймутава, Банкса, Мурэя, елкі калючая і канадская, туя заходняя, гардавіна канадская, бундук канадскі, акацыя белая і клейкая, клён серабрысты, таполя канадская, піхты аднацветная і дугласава, кіпарысавік Лаўсона, лох серабрысты, чаромха віргінская, дуб чырвоны, лістоўніца амерыканская, ірга канадская, ясень пенсільванскі, ліпа амерыканская, сумах аленяро-

гі, воцатнае дрэва. З раслін Еўропы і Сібіры тут ёсць сасна лясная, елкі еўрапейская і польская, сібірская і Сукачова, ядловец звычайны, ціс ягадны, сосны горная і чорная аўстралійская, бук лясны, дубы, клёны, ляшчыны, шыпшыны. Прыжыліся прадстаўнікі дэндрафлоры Крыма і Каўказа: сасна крымская, піхта каўказская, арэх мядзведжы, баярышнікі каўказскі і панційскі, алыча, ліпы крымская і каўказская, дуб Гартвіса і іншыя. Нядрэнна адчуваюць сябе і цудоўная яблыня Нядзведскага з Сярэдняй Азіі, лох вузкалісты, або дзікая масліна, шаўковіцы, клён туркестанскі, абляпіха крушынавая, таполя пірамідальная, тамарыксы і многія іншыя.

Цяпер у калекцыях дэндрарыя больш за 400 відаў і форм раслін, гэта значыць, пасля 1978 г. яго фонд павялічыўся ўдвая.

Дэндрарый усё больш эфектыўна выкарыстоўваецца для вывучэння геабатанікі, дэндралогіі, лесаводства, дэкаратыўнага садаводства, азелянення населеных месц, аховы прыроды. Штогод тут праводзіцца больш за 150 аглядных і тэматычных экскурсій для студэнтаў, школьнікаў, слухачоў факультэта павышэння кваліфікацыі, турыстаў, любіцеляў прыроды. Частымі гасцямі дэндрарыя з'яўляюцца настаўнікі і навучэнцы гарадскіх і сельскіх школ. На тэрыторыі батанічнага сада БСГА праводзяцца выстаўкі кветак.

Г. Маргайлік, Л. Кірыльчык.

Сляды Чарнобыля

Пасля таго як стала вядома, што на Чарнобыльскай АЭС адбылася аварыя, загадчык радыяцыйнай лабараторыі БСГА В. К. Кажушка зарэгістраваў у Горках павышэнне радыяцыі (выпаў радыяцыйны ёд). Жыхарам раёна раздалі лекі, а пры лабараторыі стварылі пункт па праверцы прадукцыі сельскай гаспадаркі.

Больш за 100 жыхароў раёна прынялі ўдзел у ліквадацыі аварыі. Некаторыя з іх сталі потым інвалідамі, а супрацоўнік Горацкага ГРАУС Л. П. Азаранка памёр у росквіце сіл.

На тэрыторыі раёна для перасяленцаў пабудаваны пасёлкі Лазурны і Сонечны каля вёсак Мацюты і Ходараўка. Дамы для пацярпеўшых пабудаваны амаль у кожным калгасе і саўгасе. У іх пераехалі жыхары з Краснаполля, з іншых раёнаў адсялення.

Аб чарнобыльскай трагедыі ўспамінаюць непасрэдныя ўдзельнікі падзей, перасяленцы.

С. В. Табанюхаў, 1956 г. нараджэння, жыхар Горак, вадзіцель ДБУ-27

На ліквідацыю аварыі на ЧАЭС я трапіў 8 ліпеня 1986 г. па прызыву ваенкамата. Спатрэбілася мая армейская спецыяльнасць — хімік-разведчык. Меншай дачушцы быў толькі годзік, але ж трэба было ехаць. Працаваў у Гомельскай вобласці (два тыдні), а ў асноўным у раёнах Магілёўскай у роце хімічнай разведкі. Можна сказаць, што мы першымі выяўлялі ўзровень радыяцыі, па нашых дадзеных праводзілі дэзактывацыю — здымалі верхні слой глебы, мылі спецыяльнымі растворамі школы, дзіцячыя садкі. Успамінаюцца вёскі Касцюковіцкага, Чэрыкаўскага раёнаў — Дзеражня, Самацэвічы, Чудзяны, Вішня, Мокрае, дзе жыць ужо было небяспечна, але людзі там яшчэ былі. Яны вельмі добразычліва і гасцінна заўсёды нас сустракалі. Тады яшчэ не ўсе разумелі, якая бяда звалілася на іх галаву і што менавіта па нашых паказчыках іх вёскі хутка трапяць пад адсяленне.

Праца ў нас, вядома, была не з лёгкіх, і не так фізічна, як псіхалагічна — цяжкавата было амаль заўсёды адчуваць над сабой нейкую небяспеку, бачную толькі на нашых прыборах, якія часам паказвалі такія лічбы, што хацелася ўсё кінуць і ўцякаць. Некаторыя, дарэчы, так і рабілі.

Прабыў я на ліквідацыі 72 дні. Атрымаў за гэты час гастрыт страўніка, бо харчаванне ў нас было, мякка кажучы, не вельмі —

сустракаліся кансервы нават 50-х гадоў. Ніякага подзвігу ў сваіх дзеяннях не бачу, бо лічу, што выконваў, як і тысячы іншых людзей, свой грамадзянскі абавязак.

У. У. Войцік, 1964 г. нараджэння, работнік пазаведамаснай аховы

У Горках жыву з 1987 г. У 1985 г. працаваў вадзіцелем у саўгасе «Нача» Ляхавіцкага раёна Брэсцкай вобласці. 18 лістапада 1986 г. быў прызваны Ляхавіцкім ваенкаматам для ліквідацыі вынікӑў аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

Трапіў я ў Мінскі полк грамадзянскай абароны, база якога знаходзілася ў Брагіне. Былі там салдаты тэрміновай службы і мы, тыя, каго мабілізавалі пасля аварыі. Працаваў 6 месяцаў шафёрам у 30-кіламетровай зоне: рабілі дэзактывацыю вёсак, палівалі дарогі, мылі дзіцячыя сады і школы. Напачатку вельмі ўражвалі пакінутыя вёскі. Гэта проста страшнае, жудаснае відовішча, калі стаяць пакінутыя сялянскія хаты, а навокал ніводнай жывой душы, толькі крычаць і лятаюць вароны. Да такіх карцін нельга прывыкнуць.

Працаваў я і на разбураным рэактары. Вядома ж, разумеў, што гэта небяспечна, ды і наогул пакуль знаходзіўся ў зоне, то адчуваў, што ў паветры нешта ёсць: у горле пяршыла, было цяжка глытаць — радыяцыя была даволі высокай.

У зоне прабыў амаль шэсць месяцаў. Успамінаць аб гэтым не дужа прыемна і радасна. Бяда ёсць бяда.

В. Я. Якіменка, 1939 г. нараджэння

Аб аварыі даведаліся па радыё, потым аб гэтым паведамілі па тэлебачанні. Праз некаторы час аб'явілі, што ў зямлі знойдзены цэзій і стронцый. Трэба было выязджаць. Пакінулі мы сваю вёску Камаровічы, што ў Чэрыкаўскім раёне, і пераехалі ў 1990 г. у пасёлак Лазурны, які пабудаваны ў Горацкім раёне. Абяцалі нам залатыя горы. А на новым месцы не было і работы — шмат хто не працуе. Дом быў у нас добры, а тут хоць і нядрэнны, але сыры. Бясконцыя перабоі з газам, палівам, вада дрэнная. Добра што мы ўсе разам з дзецьмі. Але так хочацца назад у родную вёску.

Падрыхтавалі С. Кротава, У. Ліўшыц, М. Студнева.

З гісторыі акадэміі

Нялёгкі шлях пасляваеннага адраджэння прайшла Беларуская сельскагаспадарчая акадэмія. 30 чэрвеня 1945 г. было прынята рашэнне аб аднаўленні дзейнасці Беларускага сельскагаспадарчага інстытута. Урад Беларускай ССР вызначыў канкрэтныя меры ў гэтым напрамку. Асаблівасцю тых гадоў была тая акалічнасць, што вучэбныя групы на старэйшых курсах былі малалікімі.

Вялікае значэнне для інстытута мела аднаўленне да 1947 г. новага вучэбнага корпуса (пазней корпус № 1) і ўсходняга крыла студэнцкага агульнага памяшкання на 600 чалавек, сталовай на 1000 абедаў у суткі.

З лістапада 1948 г. Беларускі сельскагаспадарчы інстытут быў пераўтвораны ў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. З верасня 1949 г. тут пачало працаваць завочнае аддзяленне, а праз год быў адкрыты эканамічны факультэт. Адпаведна павялічылася і колькасць выкладчыкаў з 30 у 1945/46 навучальным годзе да 121 у 1949/50.

Да 1954 г. быў адноўлены будынак бібліятэкі і яе кніжны фонд склаў 200 тыс. тамоў. 5 снежня 1954 г. выйшаў першы нумар шматтыражнай газеты «Советский студент».

У 1953/54 навучальным годзе на 8 факультэтах акадэміі навучалася 3384 студэнты, з іх 2688 на стацыянары, 546 на завочным аддзяленні.

З 1962 г. акадэмія пачала падрыхтоўку спецыялістаў з краін сацыялістычнай садружнасці.

Значна ўмацавалася навучальна-матэрыяльная база акадэміі ў 1966—75 гг. Да канца гэтага перыяду тут налічвалася звыш 200 лабараторый, кабінетаў, 11 вучэбных карпусоў.

У першай палове 80-х гадоў калектыў акадэміі працягваў распрацоўваць і ажыццяўляць меры па ўдасканаленню навучальнага працэсу, развіццю матэрыяльна-тэхнічнай базы, паляпшэнню навукова-даследчай работы. Прафесарска-выкладчыцкі састаў павя-

лічыўся з 565 чалавек у 1975 г. да 689 у 1985 г.

9 студзеня 1976 г. за вялікія заслугі ў падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў для сельскай гаспадаркі і развіццё сельскагаспадарчай навукі Беларуская сельскагаспадарчая акадэмія была ўзнагароджана ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі.

Вучоны савет акадэміі на пасяджэнні 10 мая 1986 г. адобрыў план развіцця гэтай установы на 1986—90 гг., зацверджаны потым Гасаграпромам СССР.

У 1995 г. у акадэміі было 7 факультэтаў: агранамічны, зоаінжынерны, механізацыі сельскай гаспадаркі, меліярацыі і воднай гаспадаркі, землеўпарадкавальны, эканамічны, бухгалтарскага ўліку, а таксама павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў, завочнае аддзяленне, аспірантура. У 1995/96 навучальным годзе вучылася каля 8 тыс. студэнтаў на 22 спецыяльнасцях і спецыялізацыях: аграхімія; глебазнаўства і ахова раслін; вытворчасць, захаванне і перапрацоўка прадуктаў раслінаводства; пладаводства; селекцыя і генетыка сельскагаспадарчых культур; радыеэкалогія; зоатэхнія; біятэхналогія і селекцыя жывёл; конегадоўля; сельскагаспадарчая і індустрыяльная рыбагадоўля; механізацыя сельскай гаспадаркі; механізацыя меліярацыйных і водагаспадарчых работ; меліярацыя і водная гаспадарка; добраўпарадкаванне сельскіх тэрыторый; землеўпарадкаванне; зямельны кадастр; эканоміка і кіраванне прадпрыемствам аграпрамысловага комплексу; камерцыйная дзейнасць у АПК; міжнародныя эканамічныя зносіны ў АПК; прававое забеспячэнне бізнеса ў АПК; бухгалтарскі ўлік; аналіз і аўдзіт у АПК; фінансы і крэдыт у АПК.

На факультэце павышэння кваліфікацыі штогод праходзяць перападрыхтоўку па 25, 30 спецыяльнасцях і спецыялізацыях з розным тэрмінам навучання каля трох тысяч работнікаў АПК.

За час сваёй дзейнасці (1840—1995 гг.) акадэмія падрыхтавала 73,3 тыс спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй. Выпускнікі акадэміі працуюць ва ўсіх рэгіёнах краін СНД, а таксама ў 58 дзяржавах Еўропы, Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі. Каля 60 % спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, якія працуюць у сферы АПК Рэспублікі Беларусь, з'яўляюцца выпускнікамі акадэміі.

У 1995/96 навучальным годзе на 59 кафедрах працавалі 643 выкладчыкі і каля 1500 чалавек вучэбна-дапаможнага і абслугоўваючага персаналу. Сярод выкладчыкаў 32 дактары навук і прафесары, 297 дацэнтаў і кандыдатаў навук. Акадэміі прадастаўлена права прымаць да абароны доктарскія і кандыдацкія дысертацыі па сельскагаспадарчых, тэхнічных і эканамічных навуках. Яна выдае «Працы» (з 1935), падручнікі, вучэбныя дапаможнікі. Асаблівая ўвага надаецца ўдасканальванню навукова-даследчай работы, павышэнню яе эфектыўнасці. Пашыраны маштабы і зроблены паварот навуковых даследаванняў на найбольш актуальныя накірункі сучаснай сельскагаспадарчай навукі: удасканальванне эканамічных метадаў рэфармавання АПК, распрацоўка біятэхналагічных метадаў у раслінаводстве, стварэнне сартоў у раслінаводстве, стварэнне сартоў інтэнсіўнага тыпу, устойлівых да хвароб, стварэнне новых пародаў жывёл, распрацоўка і ўкараненне інтэнсіўных тэхналогій у раслінаводстве і жывёлагадоўлі, інтэнсіфікацыя кормавытворчасці, механізацыя сельскагаспадарчай вытворчасці, землеўпарадкаванне і меліярацыя сельскагаспадарчых угоддзяў, сацыяльная перабудова сяла. Навукова-даследчая работа з'яўляецца непарыўнай састаўной часткай вучэбнага працэсу. Студэнты прымаюць актыўны ўдзел у выкананні навуковай тэматыкі.

У акадэмічным гарадку размешчана 15 вучэбных карпусоў, 12 студэнцкіх інтэрнатаў, Палац культуры, музей гісторыі акадэміі, спартыўны комплекс з зімовым плавальным басейнам, бібліятэка з кніжным фондам каля 1 млн. тамоў, друкарня, сталовая, дзіцячы камбінат, камбінат бытавога абслугоўвання, паліклініка, бальніца, гандлёвая сетка, жылы мікрараён.

Акадэмія мае буйную вучэбна-доследную гаспадарку, доследную станцыю. Вялікую каштоўнасць прадстаўляе батанічны сад-помнік прыроды рэспубліканскага значэння (Горацкі батанічны сад), дзе расце звыш 500 відаў каштоўных пародаў дрэў і кустарнікаў.

Прафесарска-выкладчыцкі калектыў акадэміі сканцэнтроўвае сваю ўвагу на вырашэнне галоўнай мэты — забеспячэнне высокай якасці падрыхтоўкі спецыялістаў. Распрацаваны і рэалізаваны прапановы па перабудове вышэйшай адукацыі, створаны новыя кафедры, колькасны прыём на 1 курс па спецыяльнасцях і спецыялізацыях праводзіцца з улікам рэальных патрэб АПК рэспублікі.

У. Я. Борматаў.

І. Ф. Гаркуша.

М. М. Каўцэвіч.

С. І. Назараў.

Распрацаваны і рэалізуюцца праграмы камп'ютэрызацыі, гуманітарызацыі вучэбнага працэсу, экалагічнай адукацыі і выхавання студэнтаў. Распрацаваны і зацверджаны новыя вучэбныя планы і праграмы па ўсіх спецыяльнасцях і спецыялізацыях з улікам айчыннага і сусветнага вопыту, істотна павялічаны гадзіны на практычнае навучанне і самастойную вучэбную дзейнасць студэнтаў. Ацэнка работы кафедраў даецца па канчатковым выніку — па ведах студэнтаў. Вучэбны працэс арганізаваны так, каб ён у найбольшай ступені садзейнічаў пераадольванню вузкага прафесіяналізму, тэхнакратычнага падыходу будучых спецыялістаў да развіцця эканомікі, навукова-тэхнічнага і сацыяльнага прагрэсу.

У пасляваенны перыяд тут працавала нямала вядомых вучоных, якія ўнеслі значны ўклад у развіццё сельскагаспадарчай навукі, падрыхтоўку кадраў. Сярод іх і тыя, хто ўзначальваў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію.

БОРМАТАЎ Усевалад Яўстаф'евіч. Член-карэспандэнт АН БССР (1970), доктар біялагічных навук (1968), прафесар (1976). Нарадзіўся 7.11.1928 г. у с. Міцькаўка Клімаўскага раёна Бранскай вобл. У 1952 г. скончыў БСГА. З 1955 г. навуковы супрацоўнік, намеснік дырэктара, загадчык аддзела Інстытута біялогіі АН БССР. З 1963 г. вучоны сакратар, намеснік дырэктара, загадчык лабараторыі Інстытута генетыкі і цыталогіі АН БССР. З 1977 г. рэктар БСГА. З 1980 г. загадчык лабараторыі Інстытута генетыкі і цыталогіі АН БССР. Працы па біялагічных асаблівасцях і селекцыйнай каштоўнасці цукровых буракоў.

ГАРКУША Іван Федасеевіч. Акадэмік АН БССР (1961), акадэмік Акадэміі сельскагаспадарчых навук (1959), доктар сельскагаспадарчых навук (1954), заслужаны дзеяч навукі БССР (1956). Нарадзіўся 29.4.1896 г. у с. Гарадзішча Гарадзішчанскага раёна Чаркаскай вобл. У 1928 г. скончыў Херсонскі сельскагаспадарчы інстытут. З 1933 г. навуковы супрацоўнік Усесаюзнага інстытута ўгнаенняў, агратэхнікі і аграглебазнаўства, адначасова загадчык кафедры глебазнаўства і земляробства Ленінградскай вышэйшай камуністычнай сельскагаспадарчай школы. З 1942 г. дырэктар глебава-агранамічнай лабараторыі Туркестанскага філіяла АН БССР. З 1944 г. прарэктар, у 1952—65 гг. рэктар і адначасова загадчык кафедры глебазнаўства БСГА. Аўтар прац па эвалюцыі дзярнова-падзолістых і тарфянабалотных глеб пад уздзеяннем акультурвання. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны», медалямі, Ганаровымі граматамі Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР. Памёр 6.8.1970 г.

1 верасня 1994 г. на корпусе № 10 БСГА ўстаноўлена мемарыяльная дошка, прысвечаная вучонаму.

КАЎЦЭВІЧ Мікалай Мікалаевіч. Беларускі фізік, заслужаны дзеяч навукі БССР (1949). Нарадзіўся 5.9.1897 г. у г. п. Любча Навагрудскага раёна Гродзенскай вобласці. У 1916 г. скончыў Петраградскі універсітэт. З 1921 г. выкладчык Беларускага політэхнічнага інстытута, Беларускага інстытута сельскай гаспадаркі. З 1925 г. асістэнт кафедры фізікі БСГА, з 1928 г. дацэнт, з 1932 г. прафесар, загадчык кафедры фізікі. Быў дэканам агранамічнага факультэта, першы рэктар у пасляваенны час. Узнагароджаны орданам «Знак Пашаны». Памёр 1.7.1949 г.

НАЗАРАЎ Сяргей Іванавіч. Акадэмік УАСГНІЛ (1988), доктар тэхнічных навук (1972), прафесар (1974), заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі БССР (1981). Нарадзіўся 14.10.1928 г. у в. Барадзіно Дубровенскага раёна Віцебскай вобл. У 1953 г. скончыў БСГА. У 1953—55 гг. выкладчык Лідскага тэхнікума механізацыі сельскай гаспадаркі, у 1958—61 гг. загадчык аддзела механізацыі Магілёўскай абласной сельскагаспадарчай доследнай станцыі, з 1961 г. загадчык аддзела, намеснік дырэктара Цэнтральнага НДІ механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспа-

даркі. У 1980—92 гг. рэктар БСГА. Працы па тэхналогіі і машынах для апрацоўкі глебы, уборкі насення канюшыны, лубіну. Узнагароджаны ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Працоўнага Чырвонага Сцяга.

СОНЦАЎ Канстанцін Міхайлавіч. Акадэмік УАСГНІЛ (1978), доктар сельскагаспадарчых навук (1965), прафесар (1966), заслужаны дзеяч навукі БССР (1973). Нарадзіўся 13.4.1914 г. у с. Соф'іна Раменскага раёна Маскоўскай вобл. У 1938 г. скончыў Пушкінскі сельскагаспадарчы інстытут. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1958 г. загадчык лабараторыі Беларускага НДІ жывёлагадоўлі, з 1964 г. рэктар БСГА. З 1977 г. дырэктар Усесаюзнага НДІ жывёлагадоўлі. Працы па пытаннях мінеральнага, бялковага, вітаміннага кармлення жывёлы. Узнагароджаны ордэнам Леніна, 3 іншымі ордэнамі, медалямі.

ЦЫГАНОЎ Аляксандр Рымавіч. Кандыдат хімічных навук (1981), акадэмік Акадэміі аграрнай адукацыі Расійскай Федэрацыі (1996), дацэнт (1982), лаўрэат прэміі фонда Сораса (1993), Сорасаўскі дацэнт (1995). Нарадзіўся 15.11. 1953 г. у Горках. У 1975 г. скончыў БДУ. З 1978 г. асістэнт, старшы выкладчык, дацэнт, загадчык кафедры, з 1993 г. першы прарэктар, з 1995 г. рэктар БСГА. Аўтар навуковых прац у галіне хіміі, радыялогіі, экалогіі і аграрнай адукацыі.

ШАРШУНОЎ Вячэслаў Аляксеевіч. Член-карэспандэнт ААН Рэспублікі Беларусь (1992), доктар тэхнічных навук (1990), прафесар (1991). Дэпутат Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь 13 склікання. Акадэмік міжнароднай Акадэміі інфармацыйных працэсаў і тэхналогій (1995), акадэмік Акадэміі аграрнай адукацыі Расійскай Федэрацыі (1996). Нарадзіўся 4.5.1949 г. у в. Круглоўка Руднянскага раёна Смаленскай вобласці. У 1971 г. скончыў БСГА, дзе працаваў з 1973 г. асістэнтам, старшым выкладчыкам, дацэнтам, загадчыкам кафедры, у 1992—95 гг. рэктарам. З 1995 г. начальнік галоўнага ўпраўлення кадраў і аграрнай адукацыі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь. Мае навуковыя працы ў галіне механізацыі кормавытворчасці, жывёлагадоўлі і ўборкі сельскагаспадарчых культур.

ШЭМПЕЛЬ Віктар Іванавіч. Акадэмік АН БССР (1950), акадэмік Акадэміі сельскагаспадарчых навук (1957—61), заслужаны дзеяч навукі

К. М. Сонцаў.

А. Р. Цыганоў.

В. А. Шаршуноў.

В. І. Шэмпель.

БССР (1968). Нарадзіўся 6.2.1908 г. у Мінску. У 1929 г. скончыў БСГА. З 1933 г. загадчык аддзела, намеснік дырэктара Інстытута глебазнаўства і ўгнаенняў АН БССР, з 1942 г. вучоны сакратар Прэзідыума АН БССР. У 1949—52 гг. рэктар БСГА. У 1952—75 гг. дырэктар, загадчык аддзела ўгнаенняў Інстытута сельскай гаспадаркі. Працы па пытаннях вапнавання кіслых, дзярнова-падзолістых глеб, эфектыўнага выкарыстання мінеральных і арганічных угнаенняў.

Падрыхтавалі М. Дабралюбаў, У. Ліўшыц, В. Нямыкін, І. Нямыкіна, І. Стальмашонак.

І скарб і душа народа

Найбольш яскрава гісторыя Горацкага краю адбіваецца ў легендах «Бог і ўдава», «Удовіна дачка», «Залатавус і Касьян», «Пра халеру 1871 года», «Пра крыніцу ля м. Баева» (цяпер у Дубровенскім раёне). З іх асабліва цікавая чацвёртая, дзе зафіксаваны унікальны рэгіянальны рытуал абворваць поле і вёску ад няшчасцяў спачатку на голых цнатлівых дзяўчатах, а потым на маладым цнатлівым жарэбчыку. Не менш унікальна і другая, у якой тлумачацца лютаўскія святы Залатавуса (9 лютага) і Касьяна (29 лютага). Апошняе прыпадае адзін раз на чатыры гады за тое, што

Касьян быццам бы у час службы ў царкве дапусціў памылку — падпаліў Залатавусу свечкай вусы.

Вера ў магічную сілу слова, гука, асабліва музычна-песеннага, нарадзіла унікальную рэгіянальную разнавіднасць спеўнай культуры беларусаў — «Гуканне вясны». Гэта натуральная вера ў тое, што калі вясну пагукаем, як у лесе сябра, доўгім, гартанна-фантастычным, выключна працяжным з музычнымі пералівамі гукам «У-у-у-у-у-у...!» — тады птушачкі, якіх таксама гукаюць у вяснянках, прынясуць веснавое цяпло на сваіх крылцах.

У Горацкім раёне «гукаць вясну» пачыналі са Стрэчання (15 лютага), асабліва многа ў апошнюю нядзелю перад Вялікім пастом, на Благавешчанне і да Юр'я (6 мая). З-за таго, што «гуканне» як прыгожы спеў вельмі падабалася, то яго пераносілі і ў песні «Зялёных святак» (6-ы і 7-ы тыдзень пасля Вялікадня), а часам нават у жніўныя і вясельныя песні. Але гэта ўжо было фармальнае перанясенне, бо іх эмацыянальна-воклічныя элементы арганічна адпавядалі ўсё ж веснавому абуджэнню прыроды. У в. Паршына ў 1972 г. ад фальклорнага калектыву запісана такая:

Сядзелі бабы пад вакном — у-у-у...!
Гукалі вясну галаском — у-у-у...!
— Вясна красна, цёплая — у-у?
А што ты нам прынесла — -у-у-у...!
— Старым бабам па кіёчку — у-у...,
Малым дзеткам па яечку — у-у-у...!
Маладзічкам па платочку — у-у-у...!
А хлопчыкам па плужочку — у-у-у...!
А дзевачкам па вяночку — у-у-у...!

Запісана таксама многа жартоўных вяснянак і веснавых карагодаў: «Багаславі, маці, вясну загукаці», «Ды чаму ты, яліначка», «Вясна недалечка», «Ой, сяло, сяло, што не весяло», «З паповае лазні дым казлом». Ёсць сярод веснавых і многія сюжэты валачобных і юраўскіх песень, але самі абрады ў наш час у памяці не захаваліся.

У Горках, Рэкце, Сенькаве, Паршыне, Міхайлавічах добра захаваліся купальскія, а ў Паляшчыцах — пятроўскія песні. Тут найбольш папулярны «А йшла Купала сялом, сялом, каго сустрэне — чалом, чалом», «А йдзі Купала па заселлейку, Начуй Купала ў жыце, жыце: Каб туды змяя не залятала, У жыцечку спору не выбірала»; «Каліна, не садзіся ля сяла Скопліна, а садзіся ля сяла Паляшыцкага, каліна»; «На Івана дзеткі голыя купаліся»; «А ў нашым жыце перапяліца». У наш час на возеры ля вёскі Паляшчыцы штогод святкуюць 12 ліпеня Пятроўку, а з 6 на 7 ва ўсім раёне, асабліва на Ніжнім возеры ў Горках, усю ноч спрадвечна паляць вогнішчы, спяваюць купальскія песні і водзяць карагоды. Сярод іх многа сюжэтаў трагічна-баладнага і драматычна-сямейнага характару, жартоўных і рытуальных.

Вельмі многа ў фальклорным скарбе Горацкай зямлі жніўных песень — выдатна распрацаваных голасам напеўных, працяжных трыоляў — пераліваў, цягучых, як сама летняя жніўная спёка. Як правіла, у высокамастацкіх варыянтах яны запісаны ад таленавітых спявачак старэйшага ўзросту: Просі Гарэцкай і Просі Кацанковай, Лёксы Фаміной і Агаты Панамаровай, Ганны Букланавай і Кацярыны Маскалёвай, Марыны Купчынай і Арыны Бяззубенка. Сярод іх часцей гучаць сюжэты: «Селязенька, галоўка сізенька», «А я ў полі жыта жала» (арыгінальна, што ў ім не свякроўка, а свёкар з печы зваліўся), «А ў полі жыта, не ярыца», «Не спалася, маладзе».

Не адрозніваюцца багаццем сюжэта на Гораччыне калядныя песні і шчадроўкі, больш характэрныя і распаўсюджаныя на поўдні, на Палессі. Але сам абрад калядавання з казой, мядзведзем, пераапранаццем, карнавалізацыяй, тэатралізацыяй, жартоўнымі дыялогамі — патрабаваннямі ўзнагародзіць, ахвяраваць калядоўшчыкаў, варажбой добра вядомы ў Горках, Сенькаве, Паршыне і ў іншых месцах.

Няма сумнення, што найбольш распрацаванай у мастацкіх адносінах з'явай горацкай зямлі з'яўляюцца радзіны, якія вядомы яшчэ тут пад назвай казіны, муравіны. Існуюць тысячы запісаў тэкстаў, сюжэтаў, звязаных з рытуаламі нараджэння дзіцяці.

Найбольш новых сюжэтаў запісана ў вёсках Сенькава, Паршына, Паляшчыцы ад Марыі Рабчанка, Валянціны Багачовай, Ганны Лягчылавай, Ганны Бондаравай, Матруны Куцанковай і Просі Гарэцкай.

«Народнай операй» з хорамі маладога і маладой, аркестрам-музыкамі, дакладна размеркаванымі ролямі паміж усімі ўдзельнікамі, распісаным, па-мастацку распрацаваным па днях і гадзінах, з танцамі, карагодамі, прыпеўкамі выглядае горацкае вяселле. Тут кожны ўдзельнік знае сваё месца, музыка знае, што калі іграць, а спявак — спяваць. Яно напоўнена жартамі, кпінамі, пе-

раапрананнем, рытуальным абліваннем вадой, «падстаўнымі маладымі, цыганкамі-варажбіткамі, перазовамі, пірагамі, гасцяваннем-частаваннем і шмат яшчэ чым іншым.

Ёсць і трагічнейшыя песні — галашэнні на магіле маці перад пачаткам вяселля, калі тая не дачакалася шлюбу дачкі.

Вельмі прыгожай песняй-пажаданнем у в. Сенькава брат праважае сястру ў сямейны шлях:

— Ай, будзь багата, як зямля,
Ай, будзь жа прытка, як рыбка,
Ай, будзь жа прытка, як рыбка,
Ай, будзь жа вясёла, як пчолка.
— Багата зямля — хлеб родзіць.
Пчолка вясёла — мёд носіць.
Ай, прытка рыбка на вадзе,
Ня быць мне такой, маладзе.

Многа шчымліва-лірычных любоўных песень спяваецца ў вёсках Гораччыны: «Думай, думай, дзевачка, пра мяне» (ад Веры Клімавай з Міхайлавіч); «Хадзіў-гуляў добры малойчык» (ад Кацярыны Маскалёвай з Кузавіна), «Ой камарыкі мае» (ад фальклорнага калектыву з Паршына). Сямейныя песні з драматычным канфліктам часта перарасталі ў трагедыйныя балады, дзе часам смерць мужа, жонкі або каго другога з сямейнікаў не матывавана — як гэта часта і бывае ў жыцці.

Жывая, прадуктыўная з'ява нашых дзён сацыяльна-бытавыя песні: «Пра турэцкую вайну», «Тры казакі ў гасцях у дзяўчыны», «Чарнаморац», «Із-пад гор, гары едуць мазуры», «Прыйшлі татары хлопца браці», «Ой, да ты каліниця».

Заканамерна, што песня як эмацыянальны, няўлоўны рух душы стала вядучым жанрам фальклору, але і аб'ектыўная рэальнасць, што сярод іх усё больш і больш шырацца тэксты бяседнага, жартоўнага і нават сатырычнага зместу і тысячы адбіткаў сучаснасці — прыпевак: пра мужа і жонку ў бяседзе, недаростка і няўдаліцу, цешчу, кумоў, дзевяроў, мужа ці жонку п'яніц. Многа чатырохрадковых песенек-прыпевак запісана ў вёсцы Шышава:

Я скачу, весялюся,
Я нікога не баюся,
Ў мяне мужа няма —
Гаспадыня сама.

Творчасць дзяцей і для дзяцей на Горачыне налічвае каля дваццаці разнавіднасцяў калыханак і пацешак, заклічак і скорагаворак, дражнілак і небыліц, «энікаў-бэнікаў» і лічылак. Яна фарміруе будучую духоўную культуру народа, яго светапогляд, мараль, мову.

Фальклор — скарб і душа народа. На Горацкай зямлі ён жыве высокамастацкім жыццём, ва ўстановах культуры і адукацыі, у паўсядзённым побыце людзей.

В. Ліцвінка.

Для памяці нашчадкаў

АБ МІНУЛЫМ І СУЧАСНЫМ

Горацкі гісторыка-этнаграфічны музей быў заснаваны 14.12.1984 г., адчынены 15.2.1989 г. Мае 11 экспазіцыйных залаў агульнай плошчай 890 квадратных метраў, фонды налічваюць каля 3 тыс. адзінак.

У гістарычным раздзеле прадстаўлены археалагічныя знаходкі, дакументы і матэрыялы, прысвечаныя падзеям Паўночнай вайны 1700—21 гг., Айчыннай вайны 1812 г., паўстанню 1863 г. Адлюстроўвае музей і гісторыю Горы-Горацкага земляробчага інстытута — першай у Расіі вышэйшай навучальнай установы.

Шмат матэрыялаў, асабістых рэчаў расказваюць аб актыўных удзельніках першай рускай рэвалюцыі 1905—07 гг., лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый 1917 г.

У экспазіцыі знайшлі адлюстраванне і першыя пераўтварэнні пасля кастрычніка 1917 г., расказваецца аб удзеле ўраджэнцаў Горацкага раёна ў грамадзянскай вайне, аб калектывізацыі і індустрыялізацыі. Асобны стэнд прысвечаны тым, хто быў рэпрэсіраваны ў час культу асобы.

Комплекс матэрыялаў і дыярама прысвечаны Вялікай Айчыннай вайне. Сярод іх значнае месца займаюць экспанаты, якія расказваюць аб жыцці і подзвігах Герояў Савецкага Саюза, земляках.

Дзве залы апавядаюць аб аднаўленні і развіцці народнай гаспадаркі і культуры раёна за пасляваенны час.

Аддзел этнаграфіі музея размешчаны ў асобным драўляным будынку. Яго экспазіцыя знаёміць са старажытнымі землеапрацоўчымі, сталярнымі, цяслярнымі, каваль-

скімі і іншымі прыладамі, адзеннем, посудам, абрадамі і звычаямі жыхароў горацкай зямлі.

У мастацкім аддзеле музея, які таксама знаходзіцца ў асобным памяшканні, экспануюцца творы, падараваныя працаўнікам раёна мастакамі — ураджэнцамі краю — В. І. Васільевым, Я. Л. Сімкіным, Ф. К. Яўмененкам. Тут перыядычна экспануюцца выстаўкі з фондаў дырэкцыі мастацкіх выставак Рэспублікі Беларусь, іншых музеяў рэспублікі, самадзейных мастакоў.

За час існавання музея яго наведала каля 50 тысяч экскурсантаў з усіх куткоў рэспублікі, пабывалі госці з замежных краін.

У 1991 г. адкрыліся філіялы музея ў вёсках Маслакі і Копцеўка, у 1992 г. у Аўсянцы і Леніна.

* * *

Музей гісторыі БСГА быў створаны ў 1968 г. Спачатку ён размяшчаўся ў невялічкім пакоі, а затым у чатырох прасторных залах Палаца культуры. Тут прадстаўлена больш за 2 тыс. экспанатаў, аб'яднаных тэматычна. Яны знаёмяць з гісторыяй БСГА, з развіццём сельскагаспадарчай навукі і яе сувяззю з вытворчасцю. У акадэміі ёсць галерэя Герояў Савецкага Саюза і сацыялістычнай працы — выпускнікоў акадэміі. Аб баявой славе сведчаць многія помнікі, размешчаныя на тэрыторыі акадэмгарадка.

Дырэктар Т. Ц. Бялова і актыў музея вядуць пастаянную пошукавую работу па зборы, вывучэнні і сістэматызацыі дакументаў, экспанатаў. Наладжана цесная сувязь з ветэранамі акадэміі і членамі іх сямей, выпускнікамі, з музеямі, архівамі і іншымі ўстановамі краіны. У 1986 г. музею было прысвоена званне народнага.

* * *

Пачатак музею ў Горскай сярэдняй школе быў пакладзены ў 70-я г. настаўнікам А. С. Маляровым, які сабраў вялікі фактычны матэрыял па гісторыі і быту навакольля. Адкрыццё яго адбылося ў 1986 г. У музеі налічваюцца сотні экспанатаў, якія адлюстроўваюць гісторыю гэтай зямлі. Асаблівую ўвагу прыцягваюць матэрыялы, якія расказваюць пра дзейнасць земляка, старшыні першага рэўкома Чукоткі М. С. Мандрыкава, пра мужнасць жыхароў калгаса ў час Вялікай Айчыннай вайны.

Дырэктар музея Р. Л. Мірончыкава разам з вучнямі школы збірае краязнаўчы матэрыял, праводзіць сустрэчы з вядомымі людзьмі, ветэранамі вайны і працы.

У 1987 г. музею было прысвоена званне народнага.

У. Ліўшыц.

У ГОНАР БАЯВОЙ САДРУЖНАСЦІ

Гэты мемарыяльны комплекс створаны ў 1968 г. у в. Леніна, месцы першага (12—13.10.1943) сумеснага бою часцей Чырвонай Арміі і сфарміраванай у СССР 1-й Польскай пяхотнай дывізіі імя Т. Касцюшкі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Быў адкрыты 15 кастрычніка, у 25-ю гадавіну гэтай падзеі. Цэнтр кампазіцыі комплексу (архітэктары Я. Белапольскі, В. Хавін, скульптар У. Цыгаль) — сіметрычны купальны будынак музея з жалезабетону, шкла і алюмінію, зроблены ў форме каскі (дыяметр 34 м, вышыня 11 м), накрыты невялікімі шчытамі з чорнай бляхі, пакладзенымі на каркас. Лесвічныя вузлы вылучаны блокамі, упрыгожаны барэльефнымі выявамі пяціканцовай зоркі і арла — сімваламі дзвюх краін. Экспанаты адлюстроўваюць гісторыю ўтварэння і фарміравання Войска Польскага. У цэнтральнай частцы памяшкання дыярама «Бітва пад Леніна» (мастакі М. Авечкін і А. Інтазараў), дзе паказаны кульмінацыйны момант бою. Перад шырокім уваходам у музей устаноўлена стэла (бетон, вышыня 8 м), увянчаная выявай сцяга, дрэўка якога трымаюць 2 моцныя рукі. У ніжняй частцы стэлы на польскай і рускай мовах надпіс «СССР — Польшча, 1943 год».

На паўночны ўсход ад музея 2 надмагільныя пліты з лабрадарыту на ўшанаванне памяці загінуўшых савецкіх і польскіх воінаў з надпісамі-прысвячэннямі на польскай, рускай і беларускай мовах. Помнік — 3-мятровы кавалак брані — сімвалізуе загартаваную ў баях савецка-польскую дружбу. Пляцоўка (9×12 м) вакол надмагілляў выкладзена цёмна-чырвоным гранітам, перад надмагіллямі Вечны агонь. На тэрыторыі вёскі на месцы былых баявых пазіцый, за 0,5 км адна ад адной брацкія магілы савецкіх і польскіх воінаў. На брацкай магіле савецкіх воінаў устаноўлены блок з чырвонага граніту, пяціканцовая зорка з надпісам-прысвячэннем на рускай мове. На брацкай магіле польскіх воінаў — сцяна (12 м×3 м) з шэрага граніту з надпісамі-прысвячэннямі на польскай і беларускай мовах. У цэнтры сцяны на бронзавым карту-

шы ў абрамленні прыспушчаных сцягоў даты бітвы пад Леніна і выявы 2 скрыжаваных лаўровых галінак. Пляцоўкі вакол помнікаў забетанаваны і абсаджаны дэкаратыўнымі кустамі.

А. Воінаў, А. Пятросава, Г. Ярмоленка.

Дом рамёстваў

Быў адкрыты паводле рашэння Горацкага райвыканкома ад 1 снежня 1993 г. і з'яўляецца адзінай установай такога тыпу ў Магілёўскай вобласці. Размешчаны ў рэканструяваным былым будынку раённай бібліятэкі.

Асноўныя напрамкі дзейнасці — вывучэнне традыцыйных відаў мастацкіх рамёстваў і навучэнне ў гуртках дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Мае філіялы ў вёсках Аўсянка, Сава, Копцеўка.

З 1 жніўня 1995 г. на базе гурткоў пры Доме рамёстваў створана дзіцячая школа мастацкіх рамёстваў, якая мае пяць аддзяленняў: мастацкая і народная вышыўка, кераміка і ганчарства, разьба па дрэву, пляценне і аплікацыя з саломкі, пляценне з лазы. У школе вывучаюць таксама асновы выяўленчага мастацтва, малюнак, жывапіс, кампазіцыю і гісторыю мастацтва.

Вучні і выкладчыкі школы з'яўляюцца актыўнымі ўдзельнікамі рэспубліканскіх, абласных і раённых выстаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

С. Квач.

Галасы з Парнаса

На горацкай зямлі нарадзіліся, вучыліся і працавалі многія славутыя пісьменнікі — М. Гарэцкі, Ю. Гаўрук, В. Каваль, Л. Разгон, іншыя. Тут расцвілі паэтычныя таленты М. Казакова, А. Тулупавай і Дз. Марозава, якія сталі прафесійнымі літаратарамі — членамі Саюза пісьменнікаў. Пры раённай газеце «Ленінскі шлях» і студэнцкай шматтыражцы БСГА створаны літаб'яднанні

Актыўна літаратурнай дзейнасцю займаюцца журналісты С. Сідараў, М. Уласенка, М. Панкратаў, выкладчыкі акадэміі А. Зарэцкі, І. Стальмашонак, К. Сучкоў, С. Варухіна, В. Зеньковіч, А. Пугач, А. Падцяроб, медсястра С. Цярэшка, будаўнікі А. Прохараў і Л. Самусенка, настаўнік Л. Васільеў, служачыя С. Шатоба і В. Франкоўская, Т. Свірыдзенка, Л. Марчанка і Л. Каліненка. Іх творы часта друкуюцца ў рэспубліканскім, абласным, раённым друку. А ў гонар 50-годдзя з дня Перамогі над нямецка-фашысцкімі захопнікамі творы самадзейных аўтараў увайшлі ў зборнік «Галасы з горацкага Парнаса», што быў выдадзены за кошт сродкаў Горацкага раённага і гарадскога выканаўчых камітэтаў.

Асабліва трэба сказаць пра Н. Дз. Кавалёву, якой наканавана лёсам цяжкае выпрабаванне (з-за хваробы прыкавана да ложка). Але яна здолела знайсці ў сабе сілы і на працягу многіх гадоў радуе чытачоў добрымі вершамі. Яны друкаваліся ў зборніках «Петя Зяблик и его кораблик» (1986 г.), «Первая встреча» (1989 г.), «У кого какие сны» (1991 г.), якія выйшлі ў Мінску. А ў Горках Н. Дз. Кавалёва надрукавала кнігі «Напиток певчих птиц» (1993 г.), «Вода-чудесница» (1944 г.), «Черемуховый лес» (1995 г.).

Н. Дз. Кавалёва.

У. Ліўшыц.

Воіны Савецкай Арміі — ураджэнцы Горацкага раёна, якія загінулі пры выкананні воінскага абавязку

АБАСАЎ Вагіф Муталімавіч. Нарадзіўся 9.3.1956 г. у г. Сумгаіт у Азербайджане. Бацькі Муталім Мусейбавіч і Валянціна Маркаўна, пенсіянеры. У 1973 г. Вагіф скончыў сярэднюю школу ў Горках. У 1974 г. прызваны ў Савецкую Армію Горацкім РВК. Пасля тэрміновай службы скончыў школу прапаршчыкаў. Служыў у Беларускай ваеннай акрузе. 21.4.1987 г. накіраваны ў Афганістан. Прапаршчык В. М. Абасаў загінуў 7.5.1987 г. Пахаваны ў г. Бабруйску. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. У В. М. Абасава сын Сяргей.

АРЛОЎСКІХ Сяргей Віктаравіч. Нарадзіўся 8.3.1964 г. у Горках. Маці, Ніна Цітаўна, рабочая на льнозаводзе, бацька, Віктар Мікітавіч, памёр у 1972 г. У 1981 г. Сяргей скончыў Горацкую сярэднюю школу № 1. Працаваў токарам на Горацкім машынабудаўнічым заводзе. Вясной 1982 г. прызваны ў Савецкую Армію Горацкім АГВК, накіраваны ў Афганістан. Малодшы сяржант С. В. Арлоўскіх загінуў 20.4.1984 г. Пахаваны ў г. Горкі. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

...С. В. Арлоўскіх зрабіў 27 рэйсаў у складзе аўтамабільных калон па розных маршрутах. 20.4.1984 г. калону, што рухалася па маршруце Кундуз — Баграм, у раёне перавалу Саланг абстралялі. Пашкоджаная аўтамашына ўтварыла на дарозе затор. Малодшы сяржант С. В. Арлоўскіх пад інтэнсіўным агнём пачаў ліквідаваць затор, але быў смяротна паранены.

ДАМІКАНАЎ Уладзімір Міхайлавіч. Нарадзіўся 25.6.1965 г. у Горках. Маці, Людміла Аляксандраўна, эканаміст калгаса «Звязда» Смалявіцкага раёна, бацька, Міхаіл Сцяпанавіч, галоўны бухгалтар гэтага ж калгаса. У 1984 г. Уладзімір скончыў Прылепскую сярэднюю школу Смалявіцкага раёна. Працаваў электрыкам на заводзе ацяпляльнага абсталявання ў Мінску. У 1984 г. прызваны ў Савецкую Армію Фрунзенскім РВК Мінска. Служыў у горнастралковым штурмавым батальёне ў роце разведкі ў правінцыі Парван на перавале Саланг. Радавы У. М. Даміканаў загінуў 5.4.1985 г. Пахаваны ў пасёлку Усяж Смалявіцкага раёна. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

...У той дзень група разведчыкаў, у якой быў і Уладзімір, атрымала баявы загад. Калі байцы выйшлі да цясніны горнай рэчкі, яны былі абстраляны з засады. Сем чалавек загінула адразу. Потым загінуў Уладзімір, прыкрываючы двух таварышаў, што засталіся жывымі.

КАЗЛОЎ Міхаіл Іванавіч. Нарадзіўся 11.2.1965 г. у в. Асіповічы Горацкага раёна. Маці, Рэгіна Францаўна, пенсіянерка, бацька, Іван Фёдаравіч, брыгадзір калгаса «Аўсянка». У 1982 г. Міхаіл скончыў Гарадзішчанскую сярэднюю школу Шклоўскага раёна. Працаваў слесарам у калгасе «Запаветы Ільіча» Горацкага раёна. У сакавіку 1983 г. прызваны ў Савецкую Армію Горацкім АГВК. М. І. Казлоў загінуў 13.9.1984 г. Пахаваны ў в. Асіповічы.

КРЫШНЁЎ Міхаіл Васільевіч. Нарадзіўся 11.6.1964 г. у в. Каменка Горацкага раёна. Маці, Антаніна Васільеўна, пенсіянерка, бацька, Васіль Сямёнавіч, памёр у 1973 г. У 1981 г. Міхаіл скончыў Каменскую сярэднюю школу, у 1982 г. — курсы ДТСААФ. Працаваў на Горацкім машынабудаўнічым заводзе фрэзероўшчыкам. У верасні 1982 г. прызваны ў Савецкую Армію Горацкім АГВК, служыў у мотастралковых часцях у Афганістане. Радавы М. В. Крышнёў быў цяжка паранены, памёр 30.1. 1984. Пахаваны ў в. Каменка. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

...15 кастрычніка 1983 г. рота выконвала баявую задачу па рэалізацыі разведданых. Перадавая група, у якой знаходзіўся радавы Крышнёў М. В., трапіла ў акружэнне. Выбраўшы зручную пазіцыю, ён вёў агонь па праціўніку. Асабістым прыкладам падняў групу ў атаку, дзя-

В. М. Абасаў.



С. В. Арлоўскіх.

У. М. Даміканаў.



М. І. Казлоў.

М. В. Крышнёў.

А. Р. Салаўёў.

А. А. Янусаў.

куючы чаму акружэнне было прарвана. У гэтым баі быў цяжка паранены.

САЛАЎЁЎ Аляксандр Рыгоравіч. Нарадзіўся 8.2.1966 г. у Горках. Маці, Марыя Станіславаўна, інвалід 1-й групы, бацька, Рыгор Захаравіч, памёр у 1985 г. У 1984 г. Аляксандр скончыў Горацкую сярэднюю школу № 3. Працаваў рабочым на льнозаводзе. У кастрычніку 1984 г. прызваны ў Савецкую Армію Горацкім АГВК. Служыў у Афганістане ў дэсантных войсках. Радавы А. Р. Салаўёў быў цяжка паранены, памёр 21.4.1986 г. Пахаваны ў Горках. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі (пасмяротна), медалём «За адвагу».

ЯНУСАЎ Аляксандр Аляксеевіч. Нарадзіўся 14.4.1952 г. у Горках. Беларус. Маці, Вольга Пракопаўна, на пенсіі, бацька, Аляксей Барысавіч, памёр. У 1967 г. Аляксандр закончыў сярэднюю школу № 2 у Горках. 12.10.1968 г. быў прызваны ў Савецкую Армію Горацкім РВК. Загінуў у Чэхаславакіі 16.7.1970 г. Пахаваны ў Горках.

Падрыхтавалі С. Кротава, У. Ліўшыц.

Архітэктурнае аблічча горада

Архітэктурна-планіровачнае рашэнне Горак фарміравалася ў адпаведнасці са складаным рэльефам, які спалучае равы, яры, мелкія рэчкі. У аснове горадабудаўнічай кампазіцыі ляжыць прамавугольная сетка вуліц у цэнтральнай частцы і змешаная ў новых мікрараёнах. Асноўныя вуліцы — Якубоўскага, Леніна, Савецкая, Заслонава, Калініна, Вакзальная. Апошні генплан быў распрацаваны ў 1980 г. Беларускім навукова-даследчым праектным інстытутам горадабудаўніцтва. Згодна з ім горад падзелены на тры асноўныя раёны: Паўночны, Паўднёвы і раён Слабада ў поймах рэк Парасіца і Капылка. Перспектыўнае развіццё прадугледжваецца ў паўднёва-ўсходнім і ўсходнім напрамках. Акрамя таго, плануецца стварэнне двух невялікіх вадасховішч на р. Парасіца і парка са спартыўным комплексам.

Адміністрацыйна-грамадскі цэнтр уключае дзве плошчы, злучаныя в. Якубоўскага. Тут размешчаны будынкі Дома культуры, дзяржбанка, гасцініцы, кінатэатра, камбіната бытавога абслугоўвання, гандлёвы цэнтр.

Цэнтральныя вуліцы забудаваны двух- і пяціпавярховымі жылымі дамамі.

Аднак пераважнай забудовай жыллёвага фонду з'яўляюцца індывідуальныя аднапавярховыя дамы прысядзібнага тыпу. Згодна з генеральным планам жылое будаўніцтва вядзецца ў асноўным у цэнтры горада, у раёне шашы, якая злучае чыгуначны вакзал з тэрыторыяй БСГА, якая размешчана ў паўночна-заходняй частцы горада. Карпусы акадэміі з'яўляюцца дамініруючымі ў архітэктурнай кампазіцыі горада. Комплекс уключае шэраг старых будынкаў, рэканструяваных пасля вайны: бібліятэку, корпус № 4, жылыя карпусы прафесарска-выкладчыцкага персанала, таксатарскі, а таксама пабудаваных у 60—80-е гады — галоўны вучэбны корпус, спартыўны, палац культуры, агульнае памяшканне. Усе будынкі размешчаны ў маляўнічым пейзажным парку. Да былога галоўнага корпуса (цяпер № 4) вядзе шырокая ўязная ліпавая алея, уздоўж якой разбіты курціны з пасадкамі елкі і туі, а перад ім размешчаны вялікі партэр з газонамі прамавугольнай формы і клумбамі.

Гэты корпус з'яўляецца дамініруючым элементам комплексу, які быў пабудаваны ў сярэдзіне 19 ст. у класічным стылі. У 1954 г. быў адноўлены са змяненнем унутранай планіроўкі і прадстаўляе сабой трохпавярховы, прамавугольны ў плане будынак з сіметрычным галоўным фасадам, акцэнтаваным васьмікалонным порцікам дарычнага ордэра. Адміністрацыйны, прафесарскі, таксатарскі і фізіка-хімічны карпусы, будынак дзіцячага сада былі пабудаваны ў пачатку 20 ст. з цэглы ў эклектычным стылі. Будынак бібліятэкі прадстаўляе сабой помнік архітэктуры эпохі канструктывізму. Астатнія цагляныя і драўляныя пабудовы з'явіліся ў 1925—80 гг. З усходу маляўнічы парк абмяжоўвае р. Капылка, на якой пабудаваны невялікія штучныя сажалкі «Ніжняе возера» і «Верхняе возера». На паўночна-ўсходняй ускраіне парка знаходзіцца вучэбны пладовы сад рэгулярнай планіроўкі.

У цэнтральнай частцы горада па вуліцах Крупскай і Горкага захаваліся два будынкі з цэглы эпохі эклектыкі, пабудаваныя на рубяжы XIX і XX ст. Абодва яны аднапавярховыя, Г-вобразныя ў плане, двухскатныя стрэхі якіх утвараюць трохвугольныя франтоны. Ваконныя праёмы маюць прамавугольную і лучковую форму, а ў дэкаратыўным упрыгожванні выкарыстаны арматурныя паясы, паясы сухарыкаў, рустоўка, мнагаслойныя карнізы, плоскія лапаткі ў вуглах. Уваходныя часткі выдзелены арачнымі казыркамі.

Па вуліцы Кузняцова знаходзіцца помнік архітэктуры псеўдарускага напрамку эклектыкі — Успенская царква, пабудаваная з цэглы ў канцы XIX ст. Крыжова-мулальны храм замыкае перспектыву вуліцы.

Прамыслова-складавая зона размешчана каля станцыі Пагодзіна ў паўднёвай частцы горада.

Зонай адпачынку з'яўляюцца парк з сажалкамі, разбіты на тэрыторыі горада, маляўнічыя лясныя масівы вакол Горак.

Е. Пятросава.

Акадэміі — 155

1 верасня 1995 г. у акадэміі пачаліся афіцыйныя мерапрыемствы з нагоды яе 155-годдзя. У Палацы культуры адбылося расшыранае пасяджэнне вучонага савета, на

Сустрэча былога выпускніка Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі.

якім рэктар БСГА В. А. Шаршуноў уручыў вялікай групе вучоных медалі і дыпломы Ганаровых дактароў акадэміі. Сярод узнагароджаных былыя рэктары В. У. Борматаў, С. І. Назараў, вучоныя з сельскагаспадарчых устаноў Польшчы, Германіі, іншых краін, што прыехалі ў Горкі.

2 верасня ўрачыстасці працягваліся. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, былы выпускнік акадэміі, А. Р. Лукашэнка выступіў з прамовай, уручыў памятны знак у гонар 155-годдзя з дня заснавання акадэміі, крыштальнаю вазу, узнагароды групе вучоных.

Указам Прэзідэнта званне «Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь» прысвоена загадчыку кафедры К. К. Курыловічу, «Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь» — загадчыку кафедры А. З. Латыпаву. Прафесар Ю. Л. Максімаў удастоены ганаровага звання «Заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь». Групе вядомых вучоных акадэміі А. Р. Лукашэнка ўручыў грашовыя прэміі.

Л. Ганчарова.

Народныя калектывы

Духавы аркестр Горацкага раённага Дома культуры. Створаны ў 1961 г. З 1980 г. мае званне народнага. Кіраўнік Б. Д. Круглікаў (з 1961).

У рэпертуары аранжыроўкі народных мелодый, папулярныя творы савецкіх, у тым ліку беларускіх, кампазітараў: «Радзіма мая дарагая» Алоўнікава, «Канцэртны марш» Я. Глебава і інш.

Калектыў — дыпламант Усесаюзнага фестывалю самадзейнай народнай творчасці.

Ансамбль беларускай песні «Быстрыца» Горскага сельскага клуба. Створаны ў 1957 г., а з 1987 г. мае званне народнага. Кіраўнікі: А. П. Александровіч (з 1957 г.), С. С. Шаўчук, В. С. Гурскі (з 1988 г.).

Ансамбль выконвае творы беларускіх кампазітараў: Э. Ханка «Полька-весялуха», М. Чыркуна «Сена маладое» і інш. У рэпертуары таксама апрацоўкі беларускіх народных песень «Ёсць у полі азярушка», «Ой, а пад Гор-гары», «Шумяць вербы», «Ішлі хлопцы з ярмаркі», «Не белая бярозіца», «Ой, у лесе церамок».

Калектыў — лаўрэат першага занальнага фестывалю беларускай музыкі ў в. Аўсянка (1989). Выступае ў рэспубліцы, выязджаў з канцэртамі ў суседнія раёны Расійскай Федэрацыі.

Ансамбль народнай музыкі «Весялосць» Маслакоўскага сельскага Дома культуры. Створаны ў 1988 г., ганаровае званне народнага атрымаў у 1991 г. Кіраўнік А. У. Клешчанка (з 1988).

Удзельнікі калектыву валодаюць народнымі музычнымі інструментамі: гармонікам, баянам, кантрабасам, ударнымі і шумавымі інструментамі.

У рэпертуары ансамбля беларускія народныя песні «Шэрая лашадка», «Як была я малада», «А я бачыў, бачыў», апрацоўкі народных жартоўных, сватаўскіх і вясельных песень, аранжыроўкі народных мелодый «Лявоніха», «Полька», «Смаленскі гусачок» і інш.

Калектыў — лаўрэат другога занальнага фестывалю беларускай музыкі і песні ў в. Аўсянка (1990), дыпламант рэспубліканскага фестывалю мастацтваў, прысвечанага 500-годдзю беларускага першадрукара і асветніка Францыска Скарыны. Выступае з канцэртамі ў вобласці, а таксама ў суседніх раёнах Расіі.

Эстрадная група «Новая чвэрць» Горацкага раённага Дома культуры. Створана ў 1988 г., з 1991 г. мае званне народнага калектыву. Кіраўнік У. М. Фрэйдзін.

Калектыў выконвае творы беларускіх і замежных кампазітараў. Некалькі твораў напісаў для групы яе кіраўнік.

Група — удзельнік абласных і рэспубліканскіх аглядаў самадзейнай творчасці, лаўрэат Усесаюзнага фестывалю мастацтваў «Віхроўскія зоры» (1990). Выступае з канцэртамі ў рэспубліцы, у суседняй Расіі.

Ансамбль песні і танца «Радасць» Палаца культуры БСГА. Створаны ў 1967 г. у выніку аб'яднання хору і танцавальнага гуртка, з 1987 г. мае званне народнага. Кіраўнікі: В. С. і Р. Я. Макеевы (з 1967), Г. Курнуковіч (з 1981), В. В. Воранаў (з 1985). Балетмайстры: Л. П. Барысенка (з 1967 па 1981 і з 1983 па 1988), А. Міхальчанка (з 1988). Хормайстар С. Патупчык (з 1991).

У рэпертуары калектыву апрацоўкі беларускіх народных песень, беларускія народныя танцы, песні і танцы народаў краін СНД, вакальна-харэаграфічныя кампазіцыі «Добры вечар», «На Івана, на Купалу», «Зарачанскія кавалеры», песні савецкіх, беларускіх кампазітараў.

Калектыў гастралюе па Беларусі, выступаў у Арменіі, Малдове, Літве, Расіі, Балгарыі. Дыпламант ўсесаюзных фестываляў самадзейнай мастацкай творчасці (1977 і 1988).

Жаночы вакальны ансамбль «Рэчанька» Палаца культуры БСГА. Створаны ў 1972 г. Кіраўнік С. М. Калачова.

У рэпертуары ансамбля творы беларускіх, замежных кампазітараў, рамансы, апрацоўкі беларускіх народных песень.

Народны ансамбль «Рэчанька» лаўрэат трэцяга занальнага фестывалю беларускай музыкі і песні ў в. Аўсянка (1991 г.).

Узнагароджаны Ганаровай граматай Саюза кампазітараў Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь.

Ганаровае званне народнага атрымаў у 1987 г.

Фальклорны гурт «Верасень» створаны пры метадычным цэнтры ў 1990. г. Кіраўнік В. М. Каралькоў.

У рэпертуары калектыву народныя песні: «На вуліцы мокра», «Шэрая лашадка», «Гануля», «Прымакі», а таксама апрацоўкі іншых беларускіх народных песень, аранжыроўкі народных мелодый «Лявоніха», «Полька», «Палескі вальс» і інш.

Калектыў — лаўрэат трэцяга занальнага фестывалю беларускай музыкі і песні ў в. Аўсянка, пераможца абласнога агляду-конкурсу агітацыйна-мастацкіх і канцэртных брыгад, вядзе актыўную работу па культурнаму абслугоўванню сельскіх жыхароў Горацкага раёна.

Ганаровае званне народнага атрымаў у 1992 г.

Сенькаўскі этнаграфічны ансамбль існуе пры Сенькаўскім сельскім клубе. Створаны ў 1987 г. Кіраўнік М. В. Рабчанка.

У рэпертуары ансамбля традыцыйныя, а таксама калядныя, вяснянкі, купальскія, жніўныя, сямейна-абрадавыя песні.

Асаблівае месца ў творчасці калектыву займаюць амаль ужо пазабываныя танцы: «Войра», «Нарэчанька», «Шахцёра» і іншыя.

Ансамбль удзельнічаў у рэгіянальным фестывалі танца «Пярэзвы», што праходзіў у Бабруйску. Па выніках яго калектыў узнагароджаны дыпломам Міністэрства культуры Беларусі.

На базе калектыву неаднаразова працавалі фальклорныя экспедыцыі. Абрады «Крысціны», «Муравіны» і «Гуканне вясны» запісаны і паказаны Беларускім тэлебачаннем.

Ганаровае званне народнага калектыў атрымаў у 1992 г.

Аматарскі клуб «Роднае слова». Працуе пры Горацкім гісторыка-этнаграфічным музеі. Створаны ў 1986 г. З 1995 г. мае званне народнага. Кіраўнікі: В. П. Зеньковіч (з 1986 па 1990, з 1995), М. М. Студнева (з 1990 па 1995).

Клуб аб'ядноўвае аматараў беларускай мовы і літаратуры — настаўнікаў школ горада і раёна, выкладчыкаў Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі, навуковых супрацоўнікаў музеяў, журналістаў, пенсіянераў, рабочых і служачых. Ён праводзіць літаратурныя вечары, удзельнічае ў арганізацыі і правядзенні літаратурных выстаў, выданнях кніг і калектыўных зборнікаў, іх прэзентацыях, арганізоўвае сустрэчы з пісьменнікамі, займаецца вывучэннем у архівах і бібліятэках матэрыялаў па гісторыі беларускай літаратуры, збірае матэрыялы для стварэння экспазіцыі музея-кабінета М. Гарэцкага і музея В. Каваля.

Падрыхтаваў П. Емяльянаў.

Населеныя пункты Горацкага раёна*

Горад Горкі.

Аўсянкаўскі сельскі Савет: вёскі Асіповічы, Аўсянка, Грывец, Гулідаўка, Душкі, Крыўцы, Кукшынава, Ліхачова, Любіж, Палёнка, Пална, Сальнікі, Сялец, Тушавая, Ходараўка, Цімохаўка, Шэды. **Будскі сельскі Савет:** вёскі Буды, Вялікае Кацялёва, Вялікае Марозава, Кварцяны, Малое Кацялёва, Малое Марозава, Мікуліна, Славікі, Турышчава. **Горацкі сельскі Савет:** пасёлкі Гошч-Чорнае, вёскі Андрухі, Азаравічы, Ваўкоўшчына, Задарожжа, Зайцава, Лазурная, Макараўка, Мацюты, Стан, Сураўцова, Тушкава, Чапялінка, Чашнікі, Шалаханаўка. **Горскі сельскі Савет:** вёскі Акушкі, Альхавец, Аршані, Быстрая, Валынцава, Высоцкія, Горы, Гушчына, Завідаўка, Запруддзе, Каменка, Курганне, Лебедзева, Малькі, Мікадзімава, Палішына, Першыно, Сакалова, Саракупуды, Слабада, Ходараўка, Шаўнева. **Добраўскі сельскі Савет:** вёскі Балбечына, Галышына, Добрая, Ермакі, Машкова, Панкратаўка, Рэкатка, Сахараўка. **Копцеўскі сельскі Савет:** пасёлак Мікольскі, вёскі Буда, Галенкі, Копцеўка, Лянполле,

* Даныя на 1.1.1995 г.

Мядзвёдаўка, Новая Буда, Пнеўшчына, Пясочня, Рудня, Садок, Студзянец, Ходаравічы, Чапляеўка, Чурылава, Ярцаўка. **Ленінскі сельскі Савет:** вёскі Андзекалава, Бацвіннева, Блажкі, Гарадзец, Дружная, Жаўлачоўка, Канюхі, Касцюшкава, Клімацічы, Леніна, Логавіна, Лукі, Маісеева, Міколенка, Пераможная, Сафонава, Светлая, Скакоўшчына, Старасселле, Старына, Сцефанова, Сысоева, Чысцікі. **Маслакоўскі сельскі Савет:** вёскі Альхоўка, Анікавічы, Барсукі, Варкава, Вялікія Анікавічы, Дубовы Вугал, Зімнік, Клін, Малыя Анікавічы, Маслакі, Міхайлавічы, Напраснаўка, Стрыкілі, Трасное, Тудараўка, Ферма, Шацілаўка, Шапялёўка. **Паршынскі сельскі Савет:** пасёлак Маставы, вёскі Вялікая Каралёўка, Кузавіна, Малая Каралёўка, Мядзведзева, Нівішчы, Паляшчыцы, Паршына, Пуплы, Равячына, Тосна, Целяшоўка. **Рудкаўшчынскі сельскі Савет:** вёскі Валаўцы, Ермалоўка, Казлы, Калінаўка, Кустоўка, Рудкаўшчына, Хамінічы. **Ракцянскі сельскі Савет:** вёскі Арлы, Глінькава, Нежкава, Папкоўка, Рэкта, Сенькава, Ульяшына, Халмы, Шаваройка, Шышава. **Саўскі сельскі Савет:** пасёлак Чарнічны, вёскі Вішня, Вялікія Шарыпы, Зубры, Калацілы, Красуліна, Куртасы, Лугіны, Малыя Шарыпы, Масалыкі, Маралёўка, Паташы, Радзівонаўка, Сава, Слабада, Філіпава, Харкаўка, Шырокія, Юркава.

Населеныя пункты Горацкага раёна, якія выключаны з уліковых даных

Вёскі: Арлоўшчына, Бася, Буда, Верашчакі, Дыбаўскія, Цяплухі, Шведы.

Пасёлкі: Антропенкі, Глінішча, Грабянёўка, Гразіна, Дуброва, Запаложжа, Засценкі, Зялезны, Казіміраўскі, Круты, Мікалаеўскі, Павінскі, Паўдзённы, Рагавы, Ржаўскі, Сябрацкі, Тормаль, Троіцкі, Цёплае, Цвяткоў, Эмігрант.

Хутары: Барэц, Выдрыца, Выжары, Высоцкія, Добры Двор, Дубінец, Закамчынскія, Зарэчча, Іванькава, Кангрэс, Кастрычнік, Мяжэвічы, Навасёлкі, Новыя Душкі, Пасек, Ракіта, Раўкі, Рудня, Сушчак, Таўкачы, Чайкі, Шупілава, Шыманоўка.

Помнікі гісторыі і культуры Горацкага раёна

г. Горкі

Адміністрацыйны будынак (архіт.). Вул. Горкага, 1. Пабудаваны ў канцы XIX — пачатку XX ст. з цэглы. Помнік эклектычнай архітэктуры.

Адміністрацыйны будынак (архіт.). Вул. Крупская, 3. Пабудаваны з цэглы ў канцы XIX ст. Помнік эклектычнай архітэктуры.

Адміністрацыйны корпус акадэміі (архіт.). У цэнтры ансамбля. Пабудаваны ў пачатку XX ст. з цэглы.

Будынак бібліятэкі (архіт.). У паўднёва-ўсходняй частцы ансамбля. Перабудаваны ў 30-я гады з былой царквы ў стылі канструктывізму.

Вучэбны корпус № 4 (былы галоўны корпус № 1) (архіт.). У цэнтральнай частцы ансамбля. Пабудаваны ў сярэдзіне XIX ст. з цэглы ў стылі класіцызму. Разбураны ў Вялікую Айчынную вайну. У 1954 г. адноўлены, унутраная планіроўка часткова зменена.

Галоўны вучэбны корпус акадэміі (архіт.). Вул. Мічурына, 5. Пабудаваны ў 1965 г. з цэглы.

Дзіцячы сад (архіт.). У паўночна-ўсходняй частцы ансамбля. Пабудаваны ў пачатку XX ст. з цэглы.

Жылы дом (архіт.). У паўночнай частцы ансамбля. Пабудаваны ў 1925 г. з дрэва. Тут у 1926—28 гг. жыў беларускі пісьменнік М. Гарэцкі, які працаваў у акадэміі загадчыкам кафедры беларускай мовы.

Вучэбны корпус факультэта гідрамеліярацыі (архіт.). У паўночна-заходняй частцы ансамбля. Пабудаваны ў 1973 г. з цэглы.

Прафесарскі корпус (архіт.). На паўночнай ускраіне ансамбля. Пабудаваны ў пачатку XX ст. з цэглы.

Таксатарскі корпус (архіт.). У паўночна-ўсходняй частцы ансамбля. Пабудаваны ў пачатку XX ст. з цэглы.

Фізіка-хімічны корпус (архіт.). У паўночнай частцы ансамбля. Пабудаваны ў пачатку XX ст. з цэглы.

Брацкая магіла падпольшчыкаў і ахвяр фашызму (гіст.). На тэрыторыі БСГА. Пахаваны савецкія грамадзяне, якіх загубілі нямецка-фашысцкія захопнікі ў 1941—44 гг. Сярод пахаваных — падпольшчыкі, члены іх сем'яў.

